ARCHE Зьмест № 4'04

1. Зьмест / Уводзіны
2. Прэзыдэнт з малой літары. ARCHE 4 (33) 2004.
3. Чаму я галасаваў «за» Аляксандра Лукашэнку (ці «супраць»). ARCHE 4 (33) 2004.
4. Ці зьмянілася Вашае стаўленьне да Лукашэнкі за 10 гадоў? ARCHE 4 (33) 2004.
5. Часта кажуць, што для замежнікаў Беларусь асацыюецца толькі з Чарнобылем і Лукашэнкам. Ці згодныя вы з такім сьцьверджаньнем? ARCHE 4 (33) 2004.
6. ВАЛЕР БУЛГАКАЎ. Загадкі і адгадкі лукашэнкаўшчыны. ARCHE 4 (33) 2004.
7. АНДРЭЙ КАЗАКЕВІЧ. Беларуская сістэма: марфалогія, фізіялогія, генеалогія ARCHE 4 (33) 2004.
8. ВОЛЬФ РУБІНЧЫК. Лукашэнка бяз маскі, або Гульня на паніжэнне. ARCHE 4 (33) 2004.
9. СЛАВОЙ ЖЫЖАК. Лавіце момант: ленінская спадчына. ARCHE 4 (33) 2004.
10. ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ. Прэзідэнт недадуманай нацыі. ARCHE 4 (33) 2004.
11. СЯРГЕЙ ШЫДЛОЎСКІ. Без прэзыдэнта ў галаве. ARCHE 4 (33) 2004.
12. МАКС ШЧУР. Venit, dividit et imperat. ARCHE 4 (33) 2004.
13. АЛЕСЬ АРКУШ. Будаўнік эгіпэцкіх пірамідаў. ARCHE 4 (33) 2004.
14. ПЯТРО ВАСЮЧЭНКА. Беларус вачыма беларуса. ARCHE 4 (33) 2004.
15. АЛЯКСАНДАР НАДСАН. Новая Друя ARCHE 4 (33) 2004.
16. ПАВАЛ АБРАМОВІЧ. Страва бяз солі. ARCHE 4 (33) 2004.
17. АЛЯКСЕЙ ЗНАТКЕВІЧ. Грудзі Курнікавай – канец гісторыі. ARCHE 4 (33) 2004.
18. АЛЕНА ГАПАВА. Што такое «бацька» ARCHE 4 (33) 2004.
19. МІКОЛА ПАЧКАЕЎ. Лукашэнка ў вачох Захаду: пасьля дзесяцігодзьдзя ля ўлады. ARCHE 4 (33) 2004.
20. ПЁТР РУДКОЎСКІ ОП. Замкнёнае грамадства і замкнёны розум. ARCHE 4 (33) 2004.

21. ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ. «Зразумела» і «понятно». ARCHE 4 (33) 2004.
22. ЮРАСЬ ПАЦЮПА. Зьяўленьне героя. ARCHE 4 (33) 2004.
23. АНДЖЭЙ ШЧЫПЁРСКІ. Імша за места Арас. ARCHE 4 (33) 2004.
24. СЯРГЕЙ БАЛАХОНАЎ. Entlarvung адзінокага ў пустэльні. ARCHE 4 (33) 2004.
25. ВІТАЛЬ ЗАЙКА. Няскончаная вайна. ARCHE 4 (33) 2004.
26. УЛАДЗІСЛАЎ БЕЛАВУСАЎ. Троху пра зьмены ў Лукалэндзе. ARCHE 4 (33) 2004.

[image]

A R C H E

П а ч а т а к № 4 (33) - 2004

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

4[image]-[image]2004
"да Зьмяту"
ідэалістыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

[image] [image] [image]
[image]

З ь м е с т

ПРАДМОВА

Прэзыдэнт з малой літары
Чаму я галасаваў «за» Аляксандра Лукашэнку (ці «супраць»)?
Ці зьмянілася Вашае стаўленьне да Лукашэнкі за 10 гадоў?
Часта кажуць, што для замежнікаў Беларусь асацыюецца толькі з Чарнобылем і Лукашэнкам. Ці згодныя вы з такім сьцьверджаньнем?

КРЫТЫКА

ВАЛЕР БУЛГАКАЎ Загадкі і адгадкі лукашэнкаўшчыны
АНДРЭЙ КАЗАКЕВІЧ Беларуская сыстэма: марфалёгія, фізіялёгія, генэалёгія
ВОЛЬФ РУБІНЧЫК Лукашэнка бяз маскі, або Гульня на паніжэньне
СЛАВОЙ ЖЫЖАК Лавіце момант: ленінская спадчына

ЭСЭІСТЫКА

ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ Прэзыдэнт недадуманай нацыі
СЯРГЕЙ ШЫДЛОЎСКІ Без прэзыдэнта ў галаве
МАКС ШЧУР Venit, dividit et imperat
АЛЕСЬ АРКУШ Будаўнік эгіпэцкіх пірамідаў
ПЯТРО ВАСЮЧЭНКА Беларус вачыма беларуса
АЛЯКСАНДАР НАДСАН Новая Друя

ПАВАЛ АБРАМОВІЧ Страва бяз солі

АНАЛІТЫКА

АЛЯКСЕЙ ЗНАТКЕВІЧ Грудзі Курнікавай - канец гісторыі
АЛЕНА ГАПАВА Што такое «бацька» і яго бацькоўскі клопат
МІКОЛА ПАЧКАЕЎ Лукашэнка ў вачох Захаду: пасьля дзесяцігодзьдзя ля ўлады
ПЁТРА РУДКОЎСКІ ОП Замкнёнае грамадзтва і замкнёны розум
ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ «Зразумела» і «понятно»

ЛІТАРАТУРА

ЮРАСЬ ПАЦЮПА Зьяўленьне героя
АНДЖЭЙ ШЧЫПЁРСКІ Імша за места Арас

ПАЛЕМІКА

СЯРГЕЙ БАЛАХОНАЎ Entlarvung адзінокага ў пустэльні

РЭЦЭНЗІІ

ВІТАЛЬ ЗАЙКА Няскончаная вайна
УЛАДЗІСЛАЎ БЕЛАВУСАЎ Троху пра зьмены ў Лукалэндзе

[image]
[image]

№ 4 (33) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2004 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/01/11
[image]

Прэзыдэнт з малой літары

Краіна сёлета спраўляе дзьве ўрачыстыя даты. Пры канцы лета нашаму першаму прэзыдэнту споўнілася 50 гадоў, а троху раней ён жа адсьвяткаваў 10-годзьдзе сваёй прэзыдэнцкай актыўнасьці. Як у нас любяць гаварыць, гэта вяха для яго самога і для ўсёй нацыі.

На жаль, «афіцыйны» бок абмежаваўся з гэтай нагоды казённымі фармулёўкамі. У сёньняшняй Беларусі публічнае абмеркаваньне асобы й дзейнасьці прэзыдэнта з боку ўлады не дапускаецца. Яго кнігі і прамовы таксама знаходзяцца па-за крытыкай і служаць дырэктывамі да дзеяньня. Забарона набліжацца да «бацькі» падкрэсьліваецца фактам, што ніводнаму чыноўніку не дазволена публічна назваць Лукашэнку Лукашэнкам, а ўсё толькі «прэзыдэнтам» або «кіраўніком дзяржавы».

Мы зрабілі гэты нумар, каб падвесьці вынікі дзесяцігодкі Лукашэнкавага кіраваньня. Каб ажыцьцявіць такую экспэртызу (менавіта экспэртызу, а не канчатковы прысуд), «бацьку» давялося паставіць у цэнтар шырокага абмеркаваньня і зацікаўленага дыялёгу.

Яшчэ адна мэта нумару - тэрапэўтычная, г. зн. зрабіць асобу Лукашэнкі бліжэйшай і больш зразумелай для тых, хто адчувае да яго толькі халоднае адчужэньне і расцэньвае яго паводзіны як пазбаўленыя элемэнтарнай лёгікі. Пад гэтай вокладкай

зьмешчана мысьленьне вядомых палітыкаў, інтэлектуалаў, пісьменьнікаў, журналістаў і аналітыкаў, якіх яднае жывое стаўленьне да нашага юбіляра і імкненьне даць рацыянальныя адказы на пытаньне, хто ж такі Лукашэнка.

Дык хто ж такі «бацька»?

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2005/1/12**
[image]

Чаму я галасаваў «за» Аляксандра Лукашэнку (ці «супраць»)

Міхась Баўтовіч, краязнаўца, Полацак

На пачатку кампаніі прэзыдэнцкіх выбараў 1994 году я, як сябра ініцыятыўнае групы, зьбіраў подпісы за кандыдата ў прэзыдэнты Пазьняка. Пазьней, у часе галасаваньня, быў назіральнікам на адным з выбарчых участкаў Полацку.

У часе збору подпісаў часьцяком даводзілася палемізаваць зь людзьмі, і гэта значна замаруджвала сам працэс. Полацак уяўляў тады - а ў нейкай ступені застаецца і цяпер - калі не «чырвоны пас» (скарыстоўваючы расейскую тэрміналёгію), дык, пэўна, «чырвоную стужку» на шапцы краіны - накшталт той, якую насіў некалі дзед Талаш. Таму і сёньня ў горадзе з усіх партыйных суполак самая шматлікая, хаця і ня самая дынамічная, суполка ПКБ. Гэта тлумачыцца вялікай колькасьцю вайсковых гарнізонаў, што былі тутака за савецкім часам, і чыгуначным вузлом, пэрсанал для якога пасьля вайны амаль цалкам быў імпартаваны з Расеі. Ня дзіва, што на прэзыдэнцкіх выбарах 1994 году ў Полацку ў першым туры другое месца пасьля прэм'ера Кебіча заняў лідэр ПКБ Васіль Новікаў. Замыкаў тройку лідэраў правадыр «прыніжаных і зьняважаных» Аляксандар Лукашэнка.

Што да атмасфэры на самім выбарчым участку, дык, паводле яшчэ савецкае завядзёнкі, чальцы камісіі намагаліся ўпіхнуць выбарцам як мага больш бюлетэняў і не пытацца пра пашпарты. Я быў адзіным назіральнікам, які пужаў іх адказнасьцю. Таму мае прапановы ўважліва разглядаліся. Лукашэнку ўсе чальцы камісіі сур'ёзна не ўспрымалі. Яны хінуліся да Кебіча, і мне даводзілася сачыць, каб не зрабілі штось на карысьць дзейнага прэм'ера.

З тых выбараў запомніўся адзін кур'ёзны выпадак. Паехаў разам з чальцамі камісіі і скрыняй да старых і нямоглых, што пажадалі прагаласаваць дома. Заходзім да аднаго вэтэрана вайны. Яму выдаюць бюлетэнь і апавядаюць пра таямніцу галасаваньня. А дзед публічна абвяшчае, што будзе галасаваць за Шушкевіча. Я пытаю яго: «Чаму?» Той адказвае: «Бо Кебіч сволач, а Лукаш**энка**, з увагі на прозьвішча, хахол, а іх я не цярплю, бо сам рускі з Курску». - «А як жа ваша прозьвішча, дзядуля?» На што той з гонарам адказвае: «Таран**енка**!» Мы ледзь не расьсьмяяліся.

Памятаю яшчэ, на ўчастак забег адзін з фанаў Аляксандра Рыгоравіча, няголены, пасьля ўчарашняга. Узяўшы бюлетэнь, прагаласаваў і, матляючы над галавой кулаком, з воклічам «Лукашэнка пераможа!» выбег з залі. Прысутныя трохі пасьмяяліся, а дарма.

Другі тур прайшоў спакойна, я сачыў выключна за захаваньнем законнасьці, бо ня быў прыхільнікам ніводнага з прэтэндэнтаў. На свой участак галасаваць не пайшоў. Дастаткова было паглядзець тэледэбаты, у часе якіх будучы прэзыдэнт на пытаньне візаві, як ён здолее запусьціць заводы, адказаў ляканічна: «А вось так».

Чальцы камісіі былі ўпэўненыя, што Кебіч пераможа. У Полацку так і сталася: перамог Кебіч і савецкі кансэрватызм. Але па Беларусі верх узяў электаральны радыкалізм, вынікі якога аднолькава адчуваюць на сваіх плячох і яго прыхільнікі, і яго апанэнты.

Нэлі Бекус, філёзаф, Амстэрдам

Для ўсіх, хто памятае Савецкі Саюз, не сакрэт, што сама ідэя галасаваньня ў савецкі час здавалася вылегчанай: усім было вядома, што ўладныя колы добра ды надзейна «заізаляваныя» і «абраньнікі народу» былі зусім не ягонымі абраньнікамі.

На фоне гэтага савецкага досьведу «выбараў без усялякага выбару», які тады ўсё яшчэ навісаў над Беларусьсю, паводзіны беларускага народу ўлетку 1994 году выглядаюць радыкальна антысавецкімі. «Голас беларуса» ў нейкі момант «убачыў сябе» ў рыторыцы цяперашняга прэзыдэнта, і само празь сябе галасаваньне за яго можна было назваць менавіта спробай вярнуць выбарам страчаны сэнс - сэнс магчымай самаідэнтыфікацыі з тым, хто гаворыць ад твайго імя. Інакш кажучы, гэта была па-свойму адчайная спроба ўсталяваць адсутную ў савецкім досьведзе сувязь у ланцужку пераадрасоўкі сьветаразуменьня простага чалавека ўладзе. (Пра тое, што прэзыдэнт усяго толькі ўлада «выканаўчая», а ніякая не заканадаўчая, і тады, і тым больш цяпер мала хто згадвае).

Аднак у сытуацыі, калі зусім адсутнічае *досьвед* выбару, лёгіка, што кіруе жаданьнем «выбраць каго хачу» нечакана выбудавалася па аналёгіі з «раблю што хачу». Мне здаецца, што вельмі значная частка беларускага электарату трактавала свой выбар менавіта так. У гэтым неўтаймоўным жаданьні нарэшце зрабіць «ня тое, чаго ад мяне чакаюць», было штосьці ад электаральнага хуліганства. Некаторыя беларусы, як дзеці, вырашылі аднойчы ўзяць дый не зрабіць урокаў, зададзеных існай уладай, і тым самым адправіць яе ў адстаўку. Думаю, што і мне не была чужой гэтая стратэгія «ад супраціўнага» на тых першых у гісторыі краіны рэальных выбарах. Але ў ролі таго, хто будзе прамаўляць ад «майго імя», называючы мяне «сваім электаратам», мне бачыўся палітык больш дасьведчаны ўва ўменьні весьці палітычны дыялёг і знаходзіць кампрамісы.

Міхал Залескі, аналітык, Менск

Не галасаваў я ні за каго. Як належыць анархістаму, забраў

свой бюлетэнь дахаты.

Андрэй Кіштымаў, навуковец, Менск

Мой адказ можа быць кароткім і простым: я не галасаваў і не галасую з часу першых прэзыдэнцкіх выбараў. Але і такі адказ, мусіць, вымагае тлумачэньняў.

Па-першае, яшчэ ў 1994 годзе я аказаўся выбарцам бяз выбару: ні ў водным туры ніводная з кандыдатураў мяне не задавальняла. У маім разуменьні нікому з гэтых людзей проста нельга было даверыць кіраўніцтва краінай. А кандыдат з прозьвішчам «супраць» ні тады, ні цяпер не ўваходзіць у лік маіх знаёмых. Я ўвогуле не давяраю незнаёмым.

Па-другое, у мяне было і застаецца цьвёрдае перакананьне, што новая Беларусь мусіць быць не прэзыдэнцкай, а парлямэнцкай рэспублікай. Менавіта так народы найбольш пасьпяхова разьвітваюцца з таталітарным мінулым. Хочаце прыклад? Калі ласка: Нямеччына, Японія. А ўзяць постсавецкую прастору. Чым мацнейшая прэзыдэнцкая ўлада, тым горш ідуць справы. Краіны Балтыі ўжо ў аб'яднанай Эўропе. А пры сярэднеазіяцкіх «бацьках народаў» народы маюць сірочы выгляд.

Дарэчы, менавіта парлямэнцкая рэспубліка стварыла б, проста вымусіла б стварыць у Беларусі сапраўдную шматпартыйнасьць. Лепшай школы дэмакратыі чалавецтва пакуль не прыдумала. Аднак у Беларусі вырашылі пайсьці іншым шляхам, і ў гэтай рашучасьці і левыя і правыя, і нацыянальныя і інтэрнацыянальныя ўпершыню зьліліся ў адзіным парыве. Занадта сьвежая яшчэ была памяць пра ўсёмагутных генсекаў, занадта вялікая была спакуса для ўсяго спэктру наяўных на той час беларускіх палітычных сіл скарыстаць гэты рычаг у сваіх інтарэсах. У выніку яго скарыстаў усяго адзін чалавек, і ў інтарэсах сваіх уласных.

Па-трэцяе, мяне не задавальняе выбарчая сыстэма, якая цяпер існуе. І ня толькі празь яе палажэньні, так бы мовіць, працэдурнага характару: парадак вылучэньня кандыдатаў,

фармаваньня выбарчых камісіяў, датэрміновае галасаваньне. Я ўвогуле праціўнік усеагульнага выбарчага права. Яно мусіць мець цэнзавы характар. Які павінен быць цэнз або цэнзы - гэта асобная размова. Але толькі пры такім стане рэчаў грамадзянін будзе змагацца за сваё права быць выбарцам і па-сапраўднаму гэтае права цаніць. Цана голасу ўзрасьце, і значна. Прычым і для таго, хто гэты голас будзе мець, і для таго, хто за гэты голас будзе змагацца.

А як жа дэмакратыя? Як быць з правамі, усеагульнымі і сьвятымі? Дэмакратыю гэта толькі ўмацуе. Бо дорага тое, што атрымліваеш, прыклаўшы пэўныя намаганьні, а ня тое, што атрымліваеш аўтаматычна, па дасягненьні n-най колькасьці гадоў. Ня будзем забываць, што ўсе цяперашнія дзяржавы - узоры клясычнай дэмакратыі ў абавязковым парадку прайшлі праз пэрыяд цэнзавай дэмакратыі. Мы ж захацелі, ня скончыўшы яшчэ й пачатковых клясаў дэмакратыі, паводзіць сябе як выпускнікі дэмакратычных унівэрсытэтаў.

Ну, і апошняе. У маім разуменьні, выбары - справа дзяржаўная. Калі дзяржава мяне, як свайго грамадзяніна, на выбары кліча, значыць, цяпер я дзяржаве патрэбны. Аднак людзі ідуць на выбары тады, калі давяраюць сваёй дзяржаве. А я дзяржаве пад назвай РБ не давяраю. І гэта лёгка растлумачыць. Я проста ня ведаю ніводнага кроку мне насустрач, які зрабіла б гэтая дзяржава. У мяне няма даверу да яе фінансаў, дзе грошы сарамліва называюцца разьліковымі білетамі, яе міжнароднай палітыкі, якая не павялічвае колькасьць дзяржаваў, куды я мог бы паехаць бязь візы, яе чыноўнікаў, бо ніводная сустрэча зь імі не прымусіла мяне паверыць, што гэта мой слуга. Пра тое, як ажыцьцяўляецца дзяржаўнае кіраваньне эканомікай, культурай, адукацыяй, аховай здароўя, ня кажучы ўжо пра кіраваньне досыць нядрэнна знаёмай мне сфэрай навукі, магчыма, ёсьць розныя меркаваньні. Аднак калі мы адсячом галасы тых, хто ажыцьцяўляе гэтае кіраваньне, то ў агульным хоры пераможных нотаў чуваць ня будзе. Я ж хачу быць патрэбным сваёй дзяржаве ня толькі раз за некалькі гадоў у якасьці шруба ў гіганцкай машыне галасаваньня.

Мая «негаласавальная» пазыцыя застаецца нязьменнай і сёньня.

Выбары бяз выбару і паводле такіх правілаў мне без патрэбы. Кандыдатура «супраць» - таксама ня выбар. Дакладней, гэта выбар ня мой, а тых, хто мяне бяз выбару пакінуў.

Уладзімер Кунцэвіч, дэмакратычны актывіст, Наваполацак

Прэзыдэнцкія выбары 94-га былі беларускімі й дэмакратычнымі. Праўда, падкрэсьлю, пакуль апошнімі дэмакратычнымі.

За часам тых выбараў упершыню кандыдаты вылучаліся шляхам збору подпісаў. Гэта было яшчэ нязвыкла, як зьбіральнікам подпісаў, так і грамадзянам, якім прапаноўвалася падпісацца. Ніхто дакладна ня ведаў, як трэба правільна весьці гаворку з чалавекам, што адчыніў табе дзьверы, каб залагодзіць яго падпісацца за твайго кандыдата, колькі трэба размаўляць з чалавекам, каб не змарнаваць шмат часу, а з другога боку - не прапусьціць патэнцыйнага прыхільніка. Часам людзі не разумелі, чаму яны павінны за некага падпісвацца, бо прозьвішчы патэнцыйных кандыдатаў былі ўжо вядомыя. Многія на той час яшчэ ня бачылі розьніцы паміж рэгістрацыяй ініцыятыўных групаў і рэгістрацыяй кандыдатаў. Шмат хто пытаўся, ці можна падпісвацца за некалькіх кандыдатаў, бо пакуль яшчэ ня вызначыўся ў прыхільнасьцях.

Я, як кіраўнік наваполацкай Рады БНФ, удзельнічаў у зборы подпісаў за Зянона Пазьняка. Амаль кожны вечар наша каманда абмяркоўвала вынікі чарговага паходу па подпісы. Усімі намі тады была адназначна заўважана адна цікавая тэндэнцыя. Многія нашыя землякі, да якіх мы заходзілі, гатовыя былі падпісацца адразу за двух прэтэндэнтаў: за Пазьняка і Лукашэнку. Пазьней я чуў шмат розных меркаваньняў з гэтае нагоды, але думаю, што проста, нягледзячы на вельмі істотную розьніцу паміж гэтымі людзьмі ды іх пазыцыямі, якраз яны абодва атаясамліваліся зь сіламі, што супрацьстаялі ўладзе. А аўтарытэт улады ў асобе Кебіча з розных прычынаў быў падарваны. Народ імкнуўся да пераменаў. Толькі вартасьці гэтых пераменаў яшчэ не былі

выразна й зразумела сфармуляваныя палітычнымі элітамі й данесеныя да грамадзянаў.

Даводзілася кантактаваць і з прадстаўнікамі іншых ініцыятыўных групаў, акрамя кебічаўскай, бо «прыхільнікі» тагачаснага прэм'ера зьбіралі подпісы крыху іншым спосабам - яны не хадзілі па кватэрах, а зьбіралі подпісы на прадпрыемствах. Кіраўніцтва проста загадвала падначаленым прыйсьці на працу з пашпартамі й расьпісацца ў адпаведным радку. Таму подпісаў, сабраных за Кебіча, было больш за ўсё.

Найбольш часта сустракаліся мы з калегамі зь Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады, што зьбіралі тады подпісы за Шушкевіча. Хаця ён ужо быў не пры пасадзе, яго ўсё яшчэ атаясамлівалі з уладай, а пэўная частка грамадзянаў лічыла яго паўнамоцтвы тоеснымі з паўнамоцтвамі Машэрава і Малафеева. Для мяне тады стала зразумела, што нашыя людзі вельмі цьмяна разумеюць і ведаюць структуру і паўнамоцтвы ўлады. Розьніцу паміж парлямэнтам і ўрадам, гарвыканкамам і гаркамам партыі даводзілася тлумачыць ледзь ня кожнаму трэцяму. Вось тут і думай, ці можа такое грамадзтва рабіць сьвядомы выбар, калі для яго што сьпікер парлямэнту, што прэзыдэнт атаясамліваюцца толькі з найвялікшым начальствам.

У час агітацыйнай кампаніі асабіста мне ўдалося пераканацца, што закон пачынаў дзейнічаць. Недзе тыдні за два да выбараў, ідучы ля тагачаснага цэнтральнага наваполацкага офісу «Беларусбанку», я заўважыў на яго вокнах вялікі каляровы плякат з партрэтам прэм'ера Кебіча. У афіцыйнай паперы зь пералікам месцаў, дзе дазволена вывешваць матэрыялы выбарчай агітацыі, будынак «Беларусбанку» ня згадваўся. Ня доўга думаючы, я скіраваўся да кіраўніка ўстановы. Ім аказалася досыць мілавідная жанчына з выразнай «каманднай» выпраўкай. Наша размова доўжылася хвілінаў дзесяць. Я вельмі карэктна, але настойліва запатрабаваў свайго, а для падмацаваньня сваёй рашучасьці сказаў, што калі каляровы плякат ня будзе зьняты, то напішу адпаведную скаргу ў гарадзкую выбарчую камісію ды пракуратуру. Гэта мела ўзьдзеяньне. Кебіча прапанавалі зьняць мне самому, але я

сказаў, што мне чужога ня трэба.

Пасьля майго заходу ў «Беларусбанк» партрэты Кебіча цягам гадзіны былі зьнятыя па ўсім горадзе, нават з тых месцаў, дзе іх можна было пакінуць.

У гэты ж час я пабываў на дзьвюх сустрэчах кандыдатаў у прэзыдэнты з выбарцамі. Яны адбываліся ў адзін дзень, толькі зь невялічкай разьбежкай у часе.

Першая праходзіла ў Палацы будаўнікоў. На ёй выступаў камуніст Васіль Новікаў. Нічога цікавага й значнага на ёй не гаварылася. Поўная заля народу слухала вядомыя мне тэзы з інстытуцкага курсу навуковага камунізму. Я нават не дачакаў завяршэньня мерапрыемства.

Другая сустрэча ладзілася ў актавай залі Полацкага дзяржаўнага ўнівэрсытэту. А выступаў на ёй змагар з карупцыяй Аляксандар Лукашэнка. На гэтай сустрэчы заля была запоўненая толькі напалову, хоць у ёй прысутнічалі выкладчыкі ды студэнты. Раптам у ёй пагасла сьвятло. Трэба было бачыць, зь якой хуткасьцю Лукашэнка літаральна кінуўся з трыбуны ды схаваўся за кулісамі. Вярнуўся за трыбуну ён толькі пасьля ўключэньня сьвятла. У яго быў палатняна-белы, зь відавочнымі прыкметамі спалоху твар.

...Дзень выбараў падыходзіў да завяршэньня. Настаў самы цікавы момант - падлік галасоў. Паступова стосікі бюлетэняў расклаліся ў адпаведнасьці з набранымі галасамі. Усе сябры камісіі ня верылі сваім вачам. Некаторыя нават кінуліся тэлефанаваць на іншыя ўчасткі - там сытуацыя была тая ж. Першым быў Лукашэнка, другім Кебіч, трэцім Пазьняк, далей, адпаведна, Шушкевіч, Дубко й Новікаў (два апошнія атрымалі лічаныя галасы). На тварах сяброў гарадзкой выбарчай камісіі, сфармаванай у асноўным з намэнклятуры, лёгка чытаўся страх і разгубленасьць. У пакоі, дзе яна месьцілася, быў уключаны тэлевізар. Трансьляваўся футбольны матч чэмпіянату сьвету. Нехта з выканкамаўцаў запытаў: «Хто перамагае?» - «Перамагае Лукашэнка», - вырвалася ў мяне.

Ігар Лялькоў, гісторык, энтузіяст эўраінтэграцыі Беларусі, Менск

Лягчэй за ўсё адказаць на пытаньне, чаму я не галасаваў за Лукашэнку ў 1994-м, адной фразай: з той самай прычыны, зь якой я не галасаваў за яго і ў 2001 годзе і ня буду галасаваць ніколі, бо жыцьцёвыя і палітычныя погляды гэтага чалавека мне заўсёды былі глыбока антыпатычныя. Мне сапраўды цяжка зразумець людзей, якія 10 год таму былі на ягоным баку, а цяпер даводзяць, што тады яны шчыра памыляліся. Не хацеў бы нікога пакрыўдзіць, але выснову магу зрабіць толькі адну: альбо ў гэтых людзей ня ўсё ў парадку з галавой, альбо яны проста хлусяць. Бо, у адрозьненьне ад «маладых ваўкоў», якія калісьці хацелі выкарыстаць «калгаснага гарлапана» ў якасьці «бульдозэра» для расчысткі свайго ўласнага «шляху ўгору», Аляксандар Рыгоравіч Лукашэнка ніколі не хаваў свайго «сапраўднага аблічча».

Ідучы 23 чэрвеня 1994 году на выбарчы ўчастак, любы зацікаўлены выбарца мог згадаць публікацыі СМІ пра нашага героя. Упершыню ў цэнтры ўвагі мэдыяў ён апынуўся ўсяго толькі 3 гады таму, калі на прыклад (а можа, і пры дапамозе) расейскага генэрала Руцкоя зь ягонымі «Камуністамі за дэмакратыю» спрабаваў стварыць у Вярхоўным Савеце БССР фракцыю «Дэмакратычныя рэформы», мэтай якой было зьвярнуць увагу Масквы на новыя, пэрспэктыўныя, учора толькі з камсамолу кадры, якім «не дае ходу» закасьцянелае кіраўніцтва КПБ. Той старт Лукашэнкі да ўлады стаўся фальстартам, бо прасоўваньне пэрспэктыўнага маладога аграрніка па лініі «абноўленай КПСС» было спынена яе развалам. Разам зь ёю, і таксама часова, перастаў прыцягваць увагу журналістаў і будучы прэзыдэнт. Яго ўдзел у 1992 - пачатку 1993 году ў стварэньні Партыі народнай згоды або ягоная актыўнасьць у пракебічаўскім Народным руху Беларусі засталіся прэсай амаль незаўважанымі. Таму ў чэрвені 1994 году мала хто памятаў першае зьяўленьне героя перад шырокай публікай і прымаў яго ў разьлік. Затое ягонага вяртаньня на старонкі газэт і ў тэле- ды радыёэтэр мог не заўважыць хіба толькі чалавек, які зусім не цікавіўся

палітыкай. Той жа, хто меў вочы і вушы, меў усе магчымасьці ўбачыць, пачуць і ацаніць. Давайце ж паспрабуем прыгадаць, як гэта было.

У красавіку 1993 году Лукашэнка горача падтрымлівае далучэньне нашай краіны да Дамовы аб калектыўнай бясьпецы краінаў СНД і апынаецца ў першых шэрагах тых праўрадавых дэпутатаў Вярхоўнага Савету, якія, паводле ацэнак тагачаснай дэмакратычнай грамадзкасьці, «за магчымасьць захаваць свае месцы прыносяць у ахвяру сувэрэнітэт Беларусі». Улетку таго ж году ён вылучаецца сваёй актыўнасьцю ў групе дэпутатаў, якія намагаюцца зьняць з пасады старшыні ВС Станіслава Шушкевіча. Дарэчы, вельмі трапна і вельмі празорліва ахарактарызаваў тады гэтую групу адзін з будучых галоўных «певуноў» лукашэнкавага рэжыму Павал Якубовіч:

Дынамічная і не жадаючая больш чакаць гвардыя нэакамуністаў, маладых людзей, якія ў свой час ужо пакаштавалі на ўзроўні райкамаў смаку ўлады, паправілі ў каламутныя часы фінансавы стан і не прызнаюць ніякай тактыкі, апрача адзінай: абвастрыць становішча, скінуць Шушкевіча і паступова перайсьці да адхіленьня Кебіча (Якубович П. Вискули в Москве. Вторая серия? // Народная газета, 13.07.1993).

Шырокае асьвятленьне ў прэсе атрымала й падзея, што адбылася 16 жніўня 1993 году, калі Лукашэнка разам зь яшчэ трыма дэпутатамі з пракебічаўскай фракцыі «Беларусь» ажыцьцявіў маланкавы візыт у Маскву да старшыні ВС Расеі Руслана Хасбулатава, які акурат тады быў адной з галоўных дзейных асобаў антыельцынскай апазыцыі, абяцаючы яму фарсаваньне працэсаў эканамічна-палітычна-вайсковага аб'яднаньня Беларусі з Расеяй узамен за новыя расейскія крэдыты. Самы хіба хвосткі камэнтар з гэтай нагоды на старонках друкаванага органу Вярхоўнага Савету гучаў так:

Намэнклятурна-камуністычная дэпутацкая група «Беларусь» гатовая замест бела-чырвона-белага ўзьняць здрадніцкі белы сьцяг. Актывіст гэтае групы таварыш Лукашэнка марыць

правесьці сумеснае паседжаньне двух Вярхоўных Саветаў - Беларусі й Расеі. Немагчыма нявольніку жыць па-за калёніяй, так і цягне стацца крамлёўскай падсьцілкай. (Гусак С. Камо грядеши? // Народная газета. 25-27.09.1993.)

«Зоркавым момантам» для Аляксандра Лукашэнкі таго, дапрэзыдэнцкага пэрыяду стаўся ягоны выступ з трыбуны парлямэнту 15 сьнежня 1993 году са справаздачай Часовай камісіі ВС па вывучэньні дзейнасьці камэрцыйных структураў пры органах улады і кіраваньня, якую ён тады ўзначальваў. Менавіта з гэтага трансьляванага на ўсю краіну па тэлебачаньні і цалкам надрукаванага ў многіх газэтах выступу і распачалася прэзыдэнцкая кампанія гэтага саўгаснага дырэктара. Але тады, узімку 1993-га, многія тагачасныя Лукашэнкавы калегі ня ўбачылі ў тым выступе нічога асаблівага. Напрыклад, дэпутат Уладзімер Новік ацаніў яго так:

Я спадзяваўся, што ў гэтым дакладзе атрымаю інфармацыю, колькі камэрцыйных структураў створана пры органах улады і кіраваньня, які абарот прайшоў у сродках, якія аб'ёмы работ выкананыя гэтымі структурамі, якую карысьць атрымала ад гэтага Рэспубліка Беларусь. І, безумоўна, на падставе такіх аналітычных зьвестак мы з вамі маглі б прыняць нейкае рашэньне альбо зрабіць высновы. Але, на вялікі жаль, гутарка пайшла зусім аб іншым.

А пайшла яна ў гэтым «лёсавызначальным» дакладзе вось аб чым:

Камісія лічыць, што ўжо на этапе станаўленьня яе задача была звужаная... «Блаславіўшы» нас толькі на вывучэньне камэрцыйных структураў пры органах улады і кіраваньня, вы, паважаныя дэпутаты, цудоўна разумелі, што аб'ектыўна праблема карупцыі значна шырэйшая. Таму не крыўдуйце: нам даводзілася выходзіць за абмежавальныя рамкі... У сувязі з супрацьдзеяньнем працы камісіі з боку адказных асобаў і

перадусім Старшыні Вярхоўнага Савету, якое ўвесь час нарастала, а таксама адсутнасьцю ўсялякай дапамогі з боку КДБ, мы былі вымушаныя пайсьці на ўласныя расьсьледаваньні. На працягу жніўня-верасьня 1993 г. былі створаныя сем апэратыўных, рэвізорскіх і аналітычных групаў зь ліку работнікаў пракуратуры, МУС, адмыслова падабраных для гэтай справы юрыстаў, фінансістаў і эканамістаў.

Якія ж факты абнародавала гэтая процьма сур'ёзных людзей, сярод якіх былі такія вядомыя ў недалёкай будучыні асобы, як Захаранка, Сьнягір, Капітан, Корбут, Сазонаў, Малумаў, Карпіевіч? Старшыня Часовай камісіі апавядаў пра незаконныя выплаты на дзяцей і на харчаваньне міністру замежных справаў П. Краўчанку і ягонаму намесьніку В. Астапенку, пра тое, што Менгарвыканкам выступіў заснавальнікам 19 камэрцыйных структураў, што ў назіральныя рады камэрцыйных банкаў уваходзілі дзяржслужбоўцы (з дазволу адпаведных выканаўчых органаў улады), што былы ўжо на той момант старшыня Магілёўскага гарвыканкаму Габрусеў актыўна садзейнічаў пераводу дзяржмаёмасьці ў недзяржаўную, што ВС хацеў атрымаць канфіскаваны на карысьць дзяржавы аўтамабіль «Форд», які ўрад выдзеліў гімнасту Шчэрбу («*Давялося нашай камісіі дзейнічаць сілавымі мэтадамі. Шчэрба езьдзіць на «Фордзе...*»), што заключаюцца рызыкоўныя кантракты беларускіх прадпрыемстваў з замежнымі фірмамі, у выніку якіх беларусы недаатрымліваюць прыбытак, што камэрцыйныя банкі часам выдаюць вялікія і танныя крэдыты некаторым прыватным асобам... Найлепшае ж рэзюмэ працы камісіі даў, на маю думку, у сваім выступе на тым самым паседжаньні ВС Станіслаў Багданкевіч: «Вы можаце сабраць зьвесткі, якія абнародаваў я са сваім апаратам, Пракуратура, Кантрольная палата. Я ж скажу: што менавіта абнародавалі вы, я ня ведаю; тое, пра што вы казалі, мне вядома». Але ж ня ў тым, каб абнародаваць штосьці новае, быў сэнс дзейнасьці Лукашэнкавай камісіі! Сапраўдныя яе мэты ўжо тады можна было «вылічыць» зь некаторых іншых фрагмэнтаў дакладу, напрыклад такіх:

Мы разумеем, што пытаньне пра зямлю - часткова па-за

межамі кампэтэнцыі нашай камісіі. Аднак абысьці яго ніяк не было магчыма, бо да нас літаральна хлынула лявіна зваротаў ад народных дэпутатаў розных узроўняў, ад рабочых і сялянаў, ад жыхароў вёскі й гараджанаў. Яны скардзіліся на беззаконьне, *якое твораць чыноўнікі пры выдзяленьні зямельных надзелаў пад дамы і лецішчы. Пры гэтым да нас людзі йшлі як да апошняй інстанцыі - паабабіваўшы парогі паўсюль, аж да Вярхоўнага Савету і яго кіраўніцтва, але так і не знайшоўшы справядлівасьці.*

І апафэозам выступу - дэмагагічная заява, кшталту тых шматлікіх, да якіх мы ўжо прызвычаіліся за апошнія 10 год:

Шмат хто з прысутных чакаў буйных і малых выбухаў, скандальных гісторыяў, кампрамату на адказных асобаў. Што ж, камісія мае і гэта. Я гатовы даць вам гэткую інфармацыю, але па-за рамкамі дакладу камісіі.

І калі «прэзыдэнцкая гонка» ўжо стартавала, я думаю, мала каго зьдзівіла інфармацыя, якая зьявілася на старонках «Свабоды»:

Лукашэнкаўцы (Ганчар, Булахаў і інш.) сустракаліся, як нам вядома, з прадпрымальнікамі і прасілі падтрымаць іх «некалькімі мільярдамі рублёў». Аднак асоба Лукашэнкі выклікала энтузіязм толькі ў пэўнай часткі прадпрымальнікаў, а менавіта - у «камсамольцаў» (былых функцыянэраў ЛКСМБ, якія пасьпелі зарабіць добрыя грошы яшчэ ў камуністычныя часы і цяпер маюць багатыя фірмы). Камсамольцы паабяцалі падкінуць на кампанію Лукашэнкі «трохі грошай» (Панкратовіч П. Прэзыдэнцкая гонка стартавала // Свабода. 19-25.04.1994).

Наколькі быў натуральным гэткі альянс, настолькі ж ненатуральным было б для мяне за яго галасаваць на выбарах. Ненатуральным гэта было б і для Васіля Быкава, які за месяц да выбараў ацэньваў будучага прэзыдэнта так:

Разгадка «фэномэну Лукашэнкі» вельмі простая: ягоны зычны, абураны голас. Голас цалкам мітынговы, гэта значыць, зьвернуты болей да эмоцыяў слухачоў, чым да іхнае лёгікі. А эмоцыі слухача-народу ў наш час вядома чым захопленыя - абурэньнем на ўладу, якая ня служыць, а крадзе. І няма на яе ніякай управы. Лукашэнка выступіў у якасьці абаронцы народнае праўды, мэсіі, якога людзі чакалі, і выказаў усё так проста, зразумела ды з такім напалам, што людзі гатовыя былі схапіцца за кольле, каб тут жа рушыць за праведнікам... Лукашэнка набыў зіхоткі німб над галавой і паверыў у сваю выключнасьць. Усё тое дало яму права запрэтэндаваць на беларускае прэзыдэнцтва, зь якім ён наўрад ці ведае што рабіць. Хіба паехаць у Маскву на дамову аб парадку здачы Беларусі на больш-менш ганаровых умовах.

Як у ваду глядзеў дзядзька Васіль! Не прайшло і тыдня з дня публікацыі ягонага інтэрвію, а з трыбуны расейскай Дзяржаўнай думы ўжо даносіўся знаёмы голас:

Мы ў Беларусі не стамляемся паўтараць, што ніколі ня зможам «абысьціся» без Расеі... Праз нашую тэрыторыю праходзяць асноўныя камунікацыі, у тым ліку і энэргетычныя, якія зьвязваюць Расею з Эўропай, на нашай зямлі служаць дзясяткі тысяч расейскіх вайскоўцаў, урэшце, сотні тысяч расейцаў зьяўляюцца грамадзянамі Беларусі і мы ніколі не дазволім іх прыціскаць паводле нацыянальнай прыкметы. Ёсьць і мільёны іншых прычынаў, якія прымушаюць мяне як дэпутата лічыць аднаўленьне брацкіх сувязяў з Расеяй асноўнай чалавечай і палітычнай задачай... Веру, што толькі тут [у Думе], на ўзроўні палітыкаў-заканатворцаў, можна знайсьці мэханізмы, якія дазволяць стварыць умовы для рэальнага пераадоленьня праблемаў, якія не даюць разьвівацца нашым міждзяржаўным адносінам. Я маю на ўвазе і сапраўднае, глыбока прадуманае аб'яднаньне грашовых сыстэмаў, пытаньні мытных збораў, пытаньні грамадзянства, а таксама іншыя праблемы... Гэтага хочуць, паверце мне, не палітыкі, гэтага хочуць і народы. Заяўляю гэта без усялякага рэфэрэндуму... Прапаную тром парлямэнтам, я маю на ўвазе і братні ўкраінскі, неадкладна стварыць афіцыйныя дэпутацкія групы для правядзеньня

перамоваў аб выпрацоўцы мэханізму аб'яднаньня братніх рэспублік! Спадзяюся, што гэта падтрымаюць прэзыдэнт і ўрад Расеі.

Наўрад ці хто са сьвядомых выбарцаў у дзень галасаваньня ня меў на ўвазе гэтых Лукашэнкавых плянаў. Дый славутая гісторыя са «стрэлам пад Лёзнам» магла пераканаць на карысьць Лукашэнкі адно тых, хто вельмі хацеў быць перакананым. Затое яна шмат гаварыла пра маральныя якасьці людзей з Лукашэнкавай каманды. Шматзначным выглядала і абвяржэньне, якое ў гэтай сувязі прагучала з вуснаў аднаго зь іх, Дзьмітрыя Булахава, «аб тым, што быццам ён, Булахаў, разам зь Віктарам Ганчаром прасілі высокія пасады ўва ўрадзе і, атрымаўшы адмоўны адказ, быццам бы паабяцалі зрабіць нешта гучнае».

Аднак калі б нават усе вышэйпералічаныя фактары мною ня ўлічваліся, канчаткова пераканаць мяне не галасаваць за Аляксандра Лукашэнку магла сама ягоная перадвыбарная праграма. Нагадаю некаторыя прынцыповыя моманты зь яе:

Мэты. *Абноўленая дзяржаўная ўлада павінна забясьпечыць: 1) прыярытэтнае вырашэньне праблемаў эканомікі ды сацыяльнай сфэры - спыненьне росту цэнаў і зьбядненьня насельніцтва... 2) барацьба з карупцыяй, разьбіцьцё мафіёзных структураў, якія кіруюць у дзяржаве. 3) аднаўленьне на раўнапраўнай і ўзаемавыгаднай аснове бяздарна зьнішчаных сувязяў зь дзяржавамі, што раней уваходзілі ў склад СССР, перш за ўсё з Расеяй і Ўкраінай...*

Як дасягнуць гэтых мэтаў? *...Стабілізацыя цэнаў будзе ажыцьцяўляцца... усталяваньнем дзяржаўнага кантролю за цэнаўтварэньнем, каб выключыць рост прыбытку за кошт падвышэньня цэнаў; даваньнем права кантролю за цэнамі на спажывецкія тавары і паслугі грамадзкім арганізацыям ды іх падтрымкай з боку дзяржавы...*

Аднаўленьне кіравальнасьці эканомікай... *Будзе ўведзены рэжым простага кіраваньня дзяржаўнымі прадпрыемствамі...*

Прыярытэты галіновага характару… *Прэзыдэнт будзе выступаць супраць развалу сыстэмы калгасаў і саўгасаў…*

Навука, культура і адукацыя… Прэзыдэнт забясьпечыць рэальную магчымасьць кожнаму грамадзяніну Рэспублікі Беларусі думаць і гаварыць на той мове, на якой ён выхаваны…

Вонкавая палітыка… Дзяржаўнасьць Беларусі - не разьменная манета, але і не абраз… Дамагчыся аднаўленьня на раўнапраўнай і ўзаемавыгаднай аснове бяздарна зьнішчаных сувязяў зь дзяржавамі, якія раней уваходзілі ў склад СССР, перш за ўсё з Расеяй і Ўкраінай, найважнейшы вонкавапалітычны прыярытэт прэзыдэнта. Прэзыдэнт ініцыюе і будзе разьвіваць працэсы аб'яднаньня дзяржаваў, якія раней уваходзілі ў склад СССР, і будзе выступаць супраць любых дзеяньняў, што бураць гэтае адзінства.

Дарэчы, да падобных высноваў прыйшоў тады ня толькі я, але й людзі, ад якіх у значнай ступені залежаў дабрабыт краіны. Вось што з гэтай нагоды пісала прэса:

Прэс-служба Саюзу прадпрымальнікаў Беларусі распаўсюдзіла зварот да кандыдатаў у прэзыдэнты Аляксандра Дубка, Аляксандра Лукашэнкі ды Васіля Новікава. Ім прапаноўваецца зьняць свае кандыдатуры, бо праграмы, якія яны падалі, «ня маюць рэальнага абгрунтаваньня шляхоў выхаду з эканамічнага крызысу і не дапамагаюць зьняцьцю сацыяльна-палітычнай напружанасьці ў рэспубліцы».

Як вядома, Лукашэнка да гэтай парады не прыслухаўся. Тое, што было далей, усім нам добра вядома… Прычыны таго, чаму ўсё атрымалася менавіта так, а не інакш, можна тлумачыць навукова, як гэта зрабілі Дзьмітры Фурман і Алег Бухавец у 1996 годзе:

«Сярэднебеларуская» сьвядомасьць у 1994 годзе - гэта сьвядомасьць людзей змучаных, азлобленых, якія нікому не давяраюць. Яны ня так кепска жылі пры савецкай уладзе і

цалкам прымалі яе асноўныя ідэалягічныя каштоўнасьці, хаця, натуральна, нейкі сацыяльны пратэст, нейкая зайздрасьць што да верхавіны захоўваліся заўсёды. Але падчас перабудовы, і асабліва пасьля 1991 году, простыя людзі апынуліся ў нейкім незразумелым для іх віры падзеяў, калі ім навязваюць (і нават не заўсёды зразумела, хто дакладна) новыя, нязвыклыя формы жыцьця, прычым жывуць яны ўсё горш, а эліта - усё лепш. Ясна, што ў такой сытуацыі сацыяльны пратэст павінен быў рэзка ўзмацніцца. Аднак ніякай ідэалёгіі, здольнай акумуляваць і кудысьці скіраваць гэты пратэст, не існавала... У такой атмасфэры зусім натуральнае імкненьне схапіцца за якія-небудзь простыя, базавыя каштоўнасьці - шчырасьць і парадак. І Лукашэнка патрапіў у фокус гэтых народных чаканьняў.

Але, па-мойму, найлепей пра гэта напісала спартовая газэта «Прессбол», прычым яшчэ да таго, як аб'ект гэтага тэксту пачаў афіцыйна прэтэндаваць на ролю першай асобы ў дзяржаве:

Аляксандар Лукашэнка - чалавек зь беззаганнай рэпутацыяй і тварам старшыні калгасу, які можа выпіць тры пляшкі самагонкі, але абмежаваўся адной, - у роўнай ступені мае права лічыць сябе далакопам ці героем нашага часу. Зрэшты, адно не выключае другога. Такі час (РБ. Январь-94. ПоГРИБение // Прессбол. 1-8.02.1994).

Андрэй Мельнікаў, пісьменьнік і бард, Гомель

На выбарах 1994-га ў першым туры я галасаваў супраць, бо быў ляяльным сябрам БНФ і даверанай асобай БНФаўскага кандыдата, меў спадзеў, што той выйдзе ў другі тур. У другім туры я ўдзелу не прымаў, бо вынік быў зразумелы.

На выбарах 2001-га я галасаваў супраць, бо лічыў адмоўнымі, абразьлівымі, шкоднымі для сябе, дарагіх мне людзей і *маёй* Беларусі пэўныя выказваньні, учынкі і палітычныя хады ППРБ. Галасаваць «за» было б супраць майго сумленьня.

Дзьмітры Плакс, драматург, Стакгольм

Мэмуары пра дзевяноста чацьвёрты год пісаць яшчэ нібыта зарана. Наогул, мэмуары - жанр нялёгкі і даволі дзіўны. (Выдатны савецкі празаік Давід Дар лічыў мэмуары роднаснымі нэкрафіліі.) Але дзесяць год прайшло. Пара.

Дзевяноста чацьвёрты быў у многіх сэнсах, як гаварылі на партыйных зьездах - «годам вырашальным». І для краіны, і асабіста для мяне. І калі адкінуць усё, што ня мае дачыненьня да асноўнай тэмы гэтых вельмі кароткіх запісак, то, як ні дзіўна, застануцца тыя ж двое: краіна і я…

Я маю на ўвазе, што мае тагачасныя адносіны да краіны абмяжоўваліся амаль што выключна адно толькі выкананьнем грамадзянскага абавязку - галасаваньнем.

І тут я павінен прызнацца, што грамадзянін быў я кепскі. Ад наведаньня выбарчага ўчастку маладушна ўхіліўся.

Ды і як было не ўхіліцца, калі кандыдаты на гэтую «вялікую пасаду» выклікалі, мякка кажучы, неадназначныя пачуцьці (прынамсі ў мяне - за ўсю краіну тут казаць не наважуся).

Палітыкай я не цікавіўся і, як і належыць гнілому паўінтэлігенту, зьвяртаў нейкую ўвагу толькі на таго кандыдата, які мог скласьці хаця б чатыры словы ў сказ і зьвязна вымавіць хаця б чатыры пункты сваёй праграмы на тых дзьвюх мовах, якімі карыстаецца большасьць беларускага насельніцтва. А такіх кандыдатаў, трэба сказаць, было ня надта шмат...

Ну добра, асабістыя якасьці ды інтэлектуальны ўзровень патэнцыйных прэзыдэнтаў - гэта справа цёмная, але нават іх вонкавы выгляд пакідаў жадаць лепшага. Гледзячы на аднаго зь іх, мой стары знаёмы сказаў (цытую на мове арыгіналу): «Для полного шарма не хватает лишь лёгкого косоглазия». Што тут дадаць?..

Дзесяць год прайшло. Тэрмін. Жыцьцё - і маё, і краіны -

зьмянілася, здаецца, беспаваротна. Ці залежыць гэта ад майго маладушнага ўчынку, я, слова гонару, ня ведаю...

Андрусь Храпавіцкі, паэт, Глыбокае

Што я магу сказаць пра выбары 1994-га? Тады я яшчэ ня меў права галасаваць, але сёе-тое памятаю. Памятаю, як прыяжджаў Лябедзька і агітаваў за Лукашэнку, як мясцовыя жыхары шыкалі на майго бацьку, калі той задаваў пытаньні пра мову і дэмакратыю. Помню, як прыяжджаў Пазьняк і пасьля ягонага выступу на нашым малочна-кансэрвавым камбінаце адбыўся масавы запіс у Фронт, а ў першым туры Зянон ледзь не перамог Кебіча (у некаторых вёсках нават перамог)... І тым ня менш да ўлады прыйшоў той, каму і дзесяці год панаваньня мала.

На апошніх прэзыдэнцкіх выбарах я быў назіральнікам у г. п. Падсьвільле. Запомнілася, як са скрыняй мы аб'яжджалі мясцовых пэнсіянэраў. Каб хоць адзін прагаласаваў супраць ППРБ!

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (33) - 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/1/12
[image]

Ці зьмянілася Вашае стаўленьне да Лукашэнкі за 10 гадоў?

Аляксандар Вайтовіч, былы старшыня савету рэспублікі нацыянальнага сходу, экс-прэзыдэнт Нацыянальнай акадэміі навук

Я хацеў сказаць ня так пра Аляксандра Рыгоравіча, як пра стан рэчаў у 1994 годзе і тое, як выглядаў Аляксандар Рыгоравіч на тым фоне. А таксама пра тое, які стан цяпер. У 1994 годзе эканоміка Беларусі ў параўнаньні зь іншымі постсавецкімі краінамі была найменш пацярпелая, калі паглядзець на 1991 год. Спад быў прыкладна на 27 %, у іншых краінах - нашмат болей. Прычына такога адносна малога падзеньня ў тым, я думаю, што нашыя кадры былі добра падрыхтаваныя. У гэтай сувязі я б хацеў сказаць, што ў 1994 годзе пасьля выбараў прэзыдэнта Аляксандар Рыгоравіч Лукашэнка атрымаў не зусім дрэнную спадчыну ад папярэдняга кіраўніцтва. У 1994 годзе нашае грамадзтва было ў дзіцячым стане - яно не адышло ад шоку пасьля рэзкага падзеньня жыцьцёвага ўзроўню, а з другога боку, ня мела дастаткова досьведу. І гэта прывяло да таго, што на выбарах перамог чалавек, які фактычна ня меў ніякага досьведу дзяржаўнага кіраваньня. Ня так шмат можна знайсьці аналягаў у гісторыі, а ў гісторыі Эўропы ў новы час,

відаць, такіх аналягаў няма. Незалежна ад таго, у якім стане знаходзіцца грамадзтва і эканоміка, чалавеку, які пераскочыў прыступкі ад дырэктара саўгасу да кіраўніка дзяржавы, вядома, няпроста адаптавацца да новых умоваў. Трэба сказаць, што ў 1994 годзе большыня ў грамадзтве жадала посьпехаў новаму прэзыдэнту. Аляксандру Рыгоравічу даваўся аванс. На момант выбараў у Аляксандра Рыгоравіча не было ні яснай праграмы дзеяньняў, ні сваёй падрыхтаванай каманды. Але ён узяўся за справу вельмі горача, а цяпер мы бачым, што адбылося ў краіне за 10 гадоў. У 2004 годзе ў параўнаньні з 1994 годам некаторыя краіны постсавецкай прасторы разьвіваліся больш пасьпяхова, некаторыя - менш (тыя, дзе была ўнутраная нестабільнасьць, войны). Сказаць, што Беларусь тут выдзяляецца за 10 гадоў у эканоміцы - немагчыма. Апрача таго, за 10 гадоў назіраліся вельмі адмоўныя працэсы ў нашай краіне. Беларусь самаізалявалася. За апошнія 7 гадоў прэзыдэнт краіны ні разу ня быў з афіцыйным візытам у краінах Эўразьвязу, некаторыя зь якіх - нашы важныя гандлёвыя партнэры. Ня быў з афіцыйным візытам у ЗША. Гэта, вядома, не на карысьць краіне, што адбіваецца і на эканоміцы. У нас створаная цяпер сытуацыя, калі й нашыя дачыненьні з Расеяй пагоршыліся. Узьнікаюць канфлікты, двойчы - газавы. Абодва разы гэты канфлікт ініцыяваўся беларускім бокам.

У краіне створана своеасаблівая сыстэма кіраваньня, завязаная на адным чалавеку. Такая жорсткая сыстэма кіраваньня слаба адаптуецца да зьменаў умоваў і не дазваляе раскрыцца інтэлектуальнаму, гаспадарчаму патэнцыялу краіны. Я перакананы, што пры іншай сыстэме кіраваньня Беларуь мела б значна больш посьпехаў. У Беларусі, на мой погляд, сёньня насьпявае крызыс, які абумоўлены перадусім такой сыстэмай кіраваньня. Могуць быць розныя варыянты выхаду з крызысу, найлепшым варыянтам - выбары прэзыдэнта праз два гады: мяняецца лідэр, новае кіраўніцтва аналізуе сытуацыю, прымае адпаведныя меры, каб выправіць тое, што дрэнна было зроблена папярэднікамі.

Варыянт, які таксама абмяркоўваецца, - зьмена Канстытуцыі, каб даць магчымасьць дзейнаму прэзыдэнту падоўжыць тэрмін знаходжаньня на чале дзяржавы, - на мой погляд, мае істотныя

недахопы, бо прывядзе краіну да вялікіх праблемаў - і ў міжнароднай сфэры, і ў эканоміцы. Галоўная мэта беларускага грамадзтва цяпер - не дапусьціць зьмены Канстытуцыі ў тым артыкуле, які вызначае тэрмін паўнамоцтваў прэзыдэнта. У 1994 годзе я галасаваў за Лукашэнку, хаця цяпер думаю, што я тады зрабіў памылку. А ў 2001 годзе я не галасаваў за Лукашэнку. У 1994 годзе я яго ня ведаў. Першы раз сустрэўся зь ім, калі быў абраны прэзыдэнтам Акадэміі навук Беларусі. Тады была мая першая сустрэча з прэзыдэнтам. Ён выклікаў самыя супярэчлівыя ўражаньні. Як здавалася, чалавек стрыманы, але потым я шмат сустракаўся зь ім, удзельнічаў у шматлікіх нарадах, і ягоны тон у дачыненьнях з падначаленымі мяне вельмі ўражваў, бо часта гэта быў тон, які, я б сказаў, не павінен ужывацца ўва ўладных органах. Калі мне прапанавалі быць старшынём савету рэспублікі, тады прэзыдэнтам было сказана, што мае парады ў разьвіцьці навукі, краіны будуць успрымацца, да іх будуць прыслухоўвацца. Але неўзабаве справа дайшла да распрацоўкі і публікацыі дэкрэту аб Акадэміі навук, якім былі ўведзеныя новыя правілы прызначэньня кіраўніцтва ў НАН - прызначэньня, а ня выбараў. Дэкрэт быў зроблены цішком, адпраўлены ў друк. Калі я празь дзень даведаўся, паспрабаваў зьвязацца з прэзыдэнтам, то прэзыдэнт ухіліўся ад кантакту. У гэтым пункце ён мяне падмануў.

Анатоль Лябедзька, сябар выбарчай каманды А. Лукашэнкі ў 1994 годзе, лідэр Аб'яднанай грамадзянскай партыі ў 2004

Мае асабістыя адносіны да Аляксандра Лукашэнкі мяняліся ў залежнасьці ад эвалюцыі яго поглядаў, прынцыпаў і каштоўнасьцяў. Мы знаёмыя з Лукашэнкам 14 гадоў, і трэба шчыра сказаць, што Лукашэнка ўзору 1990 году і Лукашэнка 2004 году - гэта розныя асобы. На пачатку 90-х ён, можа, не так мэтанакіравана, як некаторыя іншыя выдатныя палітыкі пачатку перабудовачнага часу, але адстойваў прынцыпы дэмакратыі, падзелу ўлады, законнасьці, шмат выступаў у падтрымку СМІ, супраць савецкай партыйнай алігархіі, быў у апазыцыі да сыстэмы, якая існавала. А ў 2004 годзе Лукашэнка - гэта ўжо сам алігарх, які прыхватызаваў электронныя СМІ, які

даў постсавецкай прасторы ідэалёгію лукашызму як прадукт, што ў рознай ступені рэалізуецца ўва Ўкраіне і Расеі, не гаворачы пра азіяцкія краіны. Таму, як ён сам праходзіў эвалюцыю, відаць, адваротную, ад матыля да вусеня, так і маё стаўленьне за 14 гадоў трансфармавалася ад нэўтральна пазытыўнага да ўстойліва адмоўнага. Недзе 4 гады я проста ведаў Лукашэнку як дэпутата, была нейкая супраца, затым былі два месяцы, калі працавалі ў фармаце адной выбарчай кампаніі, працавалі разам. Затым, калі Лукашэнка быў ужо прэзыдэнтам, я б назваў два пэрыяды. Першы - 5 месяцаў, калі я ня меў ніякага афіцыйнага статусу, але, тым ня менш, меў мажлівасьць выказваць свае прапановы, уплываць на Лукашэнку. Затым, недзе ў канцы 94-га году і да лістапада 96-га - пэрыяд канструктыўнай апазыцыі да прэзыдэнта Лукашэнкі. А пачынаючы зь лістапада 96-га я знаходжуся ў стане барацьбы з той сыстэмай, якую ён стварыў. Я адчуваю далёка не пазытыўнае стаўленьне Лукашэнкі да мяне. На вялікі жаль, Лукашэнка мае нядобрую, злую памяць, ён помсьлівы. І я ня цешу сябе тым, што будзе паляпшэньне адносінаў, улічваючы павышаную цікавасьць спэцслужбаў, праваахоўных органаў, крымінальныя справы, папярэджаньне КДБ. Я выключаю, што гэта робяць тыя палкоўнікі ці нават генэралы на асабістае жаданьне. Я ў той ці іншай ступені падзяляю меркаваньне, што існуе нейкі чорны сьпіс людзей, якія асабіста не падабаюцца, непрымальныя для Лукашэнкі, і вакол гэтых людзей адбываюцца пэўныя падзеі.

Сяргей Навумчык, у 1994 годзе - дэпутат Вярхоўнага Савету XII скліканьня, каардынатар парлямэнцкай Апазыцыі БНФ, цяпер - намесьнік Старшыні Рады БНР

На самым пачатку 90-х Лукашэнка часам зьяўляўся ў памяшканьні апазыцыі на трэцім паверсе Дому ўраду «патрапацца» - але ніколі не працаваў над законапраектамі (такая праца вымагала сыстэмных ведаў, напружаньня ды вытрымкі і, да таго ж, не давала нейкай асаблівай магчымасьці засьвяціцца перад тэлекамэрамі). На асабістым узроўні ў мяне зь ім было ўзаемнае непрыманьне, псыхалягічная несумяшчальнасьць, здараліся і нейкія дробныя сутычкі, хаця

да бойкі, зразумела, не даходзіла.

У верасьні 1993 году, яшчэ да свайго «антыкарупцыйнага» выступу, Лукашэнка публічна (у газэце «Правда», затым у расейскай Дзярждуме, потым у шэрагу інтэрвію) заявіў пра неабходнасьць рэстаўрацыі СССР і ліквідацыі незалежнасьці Беларусі. У адмысловай заяве Апазыцыі БНФ гэта было ацэнена як дзяржаўная здрада, мы запатрабавалі пазбавіць яго дэпутацкіх паўнамоцтваў, рэзкую водпаведзь Лукашэнку даў у друку Васіль Быкаў - але сярод дэпутатаў ВС знайшліся тыя, хто ўсё ж падтрымаў яго і вылучыў у прэзыдэнты. Гэтых людзей турбаваў зусім ня лёс Беларусі, а ўласныя амбіцыі. Прычым менавіта яны дапамаглі Лукашэнку ўмацаваць дыктатуру ў першы год ягонага кіраваньня.

Пасьля прэзыдэнцкіх выбараў я зьведаў тое ж адчуваньне, што і за дзесяць гадоў да таго, калі мяне прызвалі ў Савецкую Армію, - абсалютна яснае ўсьведамленьне, што гады будуць проста страчаныя; хацелася заплюшчыць вочы і прачнуцца ўжо потым, калі ўсё пройдзе. Цяпер маё стаўленьне да Лукашэнкі не зьмянілася - хіба толькі прыйшло яшчэ большае ўсьведамленьне тых катастрафічных наступстваў, якія напаткалі Беларусь (і яшчэ напаткаюць!) у выніку ягонага кіраваньня. У найноўшай гісторыі Беларусі гэта, мне падаецца, другая жудасьць пасьля бальшавіцкіх рэпрэсіяў і вайны 1941-1945 гадоў. І толькі досьвед той самай вайны (і прыклад аднаўленьня) дае спадзеў, што ў нацыі хопіць духоўнага і фізычнага рэзэрву, каб потым ачуняць ад такога кашмару.

У Амэрыцы мне прапанавалі напісаць кнігу пра Лукашэнку, але я вырашыў, што ня варта марнаваць час на асобу, чыё імя праз сто гадоў будзе толькі эпізодам у біяграфіі Васіля Быкава і Зянона Пазьняка.

Аляксандар Саманкоў, у 1994 годзе прэзыдэнт Першага рэспубліканскага інвэстыцыйнага фонду

Маё стаўленьне да Лукашэнкі зьмянілася пасьля таго, як я адказаў сам сабе на філязафічнае пытаньне - ці можа

Мэфістофэль навучыць дабру. Разам з адказам я ўсьвядоміў, што чалавек можа быць шчасьлівы на турэмных нарах і глыбока няшчасны на самым версе ўлады. І яшчэ я зразумеў, што немагчыма дагнаць чалавека, які бяжыць ад сябе. Я аддаў некаторыя гады Лукашэнку, я разьлічваўся за тыя рашэньні, якія прыняў у 1994 годзе. Жыцьцё прымусіла мяне такім чынам разьлічыцца за рашэньне падтрымаць Аляксандра Рыгоравіча, калі ён балятаваўся ў прэзыдэнты ў 1994 годзе.

На маю думку, сучасны беларускі лідэр павінен валодаць шматлікімі якасьцямі - найперш гэта павінна быць цэльная асоба, зь ярка выяўленымі жыцьцёвай мудрасьцю, прыстойнасьцю, інтэлектам. Гэта мусіць быць чалавек, які свае амбіцыі павінен паставіць на службу народу. Яго асабістыя амбіцыі не павінны пераважаць над стратэгічнымі мэтамі. І яшчэ я лічу, што ў лідэра павінна быць паблажлівасьць. Ён павінен быць настолькі моцным, каб быць паблажлівым да сваіх апанэнтаў, да гістарычных адмоўных рысаў свайго народу.

Аляксандар Фядута, у 1994 годзе начальнік упраўленьня грамадзка-палітычнай інфармацыі Адміністрацыі прэзыдэнта

Было б сьмешна, каб не зьмянілася. За дзесяць гадоў любы чалавек мяняецца, а паколькі і я, і Аляксандар Рыгоравіч - жывыя людзі, то, натуральна, зьмяніліся і мы, і нашыя адносіны.

Я ня бачыўся зь ім больш за дзевяць гадоў, але мне вельмі сумна думаць, як ненавідзяць яго тыя людзі, што будуць атачаць яго ў дзень дзесяцігадовага юбілею інаўгурацыі.

Дзесяць гадоў таму я думаў: вось ідзе чалавек, які здолее разбурыць старую, прагнілую сыстэму. Цяпер я думаю: вось прыйшоў да ўлады чалавек, які здаўся сыстэме. А шкада: магчымасьці былі вялікія.

Апытвала Вольга Караткевіч

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/1/12
[image]

Часта кажуць, што для замежнікаў Беларусь асацыюецца толькі з Чарнобылем і Лукашэнкам. Ці згодныя вы з такім сьцьверджаньнем?

Лешак Бальцаровіч, старшыня Нацыянальнага банку Польшчы

На любую краіну часта глядзяць праз прызму найбольш гучных зьяваў, якія ў гэтай краіне ёсьць. Існуюць іншыя, часам значна больш істотныя рэчы, але, калі вакол іх няма розгаласу, яны, на жаль, не заўважаюцца. А не сакрэт, што Лукашэнка - досыць добра вядомая, так бы мовіць, асоба ў сьвеце.

Станіслаў-Мацей Булак-Балаховіч, унук генэрала Станіслава Булак-Балаховіча

На жаль, гэта так. Гэтыя два факты - чарнобыльская трагедыя і Лукашэнка, зь ягоным, я б сказаў, «нецікавым» кіраваньнем -

сталі ў пэўным сэнсе сымбалямі Беларусі для сярэдняга паляка. У мяне зусім інакш. Беларусь - гэтам месца, зь якім зьвязаная гісторыя майго роду, там знаходзяцца мясьціны, дзе калісьці ваяваў дзед.

Мар'юш Каміньскі, дэпутат польскага Сойму ад партыі «Закон і справядлівасьць»

На жаль, гэта так. Але што да палякаў, дык тут, як мне падаецца, сытуацыя трохі іншая. Мы - суседзі і маем шмат супольнага ў гісторыі і сучаснасьці, таму сярэдні паляк напэўна ведае пра Беларусь значна больш, чым іншыя замежнікі. Вядома, няшчасьце для беларускага народу, што на сёньняшні дзень на Беларусь глядзяць праз прызму дыктатуры Лукашэнкі і вялікай трагедыі, якой быў выбух у Чарнобылі.

Тадэвуш Канвіцкі, выбітны польскі пісьменьнік, кінарэжысэр, ураджэнец Віленшчыны

Не. Мне падаецца, што шмат хто ў Польшчы думае пра Беларусь не як пра краіну, дзе кіруе Лукашэнка, а як пра краіну, зь якой палякі столькі стагодзьдзяў жылі разам у адзінай супольнай дзяржаве. У такім пекным выглядзе, на маю думку, Беларусь прысутнічае ў сьвядомасьці многіх палякаў. А яшчэ ў нас жа ёсьць вялікая беларуская меншасьць, якая не дазваляе палякам забыцца пра існаваньне беларускай нацыі і культуры.

Браніслаў Камароўскі, былы міністар абароны Польшчы, дэпутат Сойму ад партыі «Грамадзянская плятформа»

Не, не, што вы! Я абсалютна з такім сьцьверджаньнем ня згодны. Напэўна, абодва гэтыя няшчасьці не дадаюць вашай краіне добрага іміджу, але, на шчасьце, палякі значна больш ведаюць пра беларусаў. Мяркую, што, нягледзячы ні на што, у нас значна больш добрых уяўленьняў пра Беларусь. Безумоўна,

зь ніводнай з гэтых бедаў - ані з Лукашэнкам, ані з Чарнобылем - палякі сваіх суседзяў-беларусаў не атаясамліваюць.

Катажына Матушэўска, намесьніца старшыні партыі «Унія працы»; супрацоўнічае зь беларускімі недзяржаўнымі арганізацыямі, за што была летась дэпартаваная зь Беларусі

Для сярэдняга паляка - так. Але для мяне Беларусь - гэта перадусім рух супраціву супраць рэжыму Лукашэнкі, Міцкевіч, які нарадзіўся ў Беларусі і таму таксама быў беларусам, прыгожая архітэктура, культурныя, выхаваныя людзі - мае сябры. А з другога боку ёсьць толькі адно - хамства чыноўнікаў лукашэнкаўскай адміністрацыі розных узроўняў.

Тэрэза Скірмунт, дачка Станіслава Скірмунта - расстралянага Чырвонай арміяй у 1939 годзе сваяка прэм'ера БНР Рамана Скірмунта. Жыве ў Варшаве

Так, у Польшчы часта гавораць пра Чарнобыль і Лукашэнку, калі гаворка заходзіць пра Беларусь. Але асабіста для мяне Беларусь атаясамліваецца перадусім з працавітымі і добрымі людзьмі. Людзьмі, якія, на жаль, стагодзьдзямі ня мелі сваёй дзяржаўнасьці. Што да Лукашэнкі, дык гэта справа часовая. Ён для мяне ні ў якім разе ня сымбаль Беларусі.

Прафэсар Эльжбэта Смулкова, першы амбасадар Польшчы ў Беларусі, беларусістка

Фактычна ў Польшчы існуюць два стэрэатыпы што да Беларусі. Адзін - гістарычны, які ўжо паволі аджывае: беларус як бедны вясковец, пазбаўлены нацыянальнай сьвядомасьці чалавек «з крэсаў», дабрадушны цёмны селянін. Другі стэрэатып - гэта погляд на Беларусь праз прызму прэзыдэнтуры Аляксандра Лукашэнкі. Гэта факт, але гэта ня польскі погляд на Беларусь у шырокім сэнсе. Палякі, якія сустрэліся зь Беларусьсю сучаснай,

сучаснай перадусім у сэнсе таго часу, што надышоў адразу пасьля распаду СССР, - гэтыя людзі глядзяць на Беларусь як на нашага партнэра, як на эўрапейскую краіну. Краіну пэўных супярэчнасьцяў і такой, я б сказала, цікавай разнастайнасьці поглядаў, веравызнаньняў. Краіны, дзе частка людзей больш прыхільная да Ўсходу, а частка - да Захаду. Для польскай інтэлігенцыі, для шмат каго з польскіх палітыкаў і навукоўцаў Беларусь - гэта эўрапейская краіна, якая мусіць больш голасна пра сябе заявіць - і ў галіне эканомікі, і ў галіне культуры. Для Польшчы Беларусь - гэта сусед, зь якім мы імкнёмся да раўнапраўнага супрацоўніцтва. Аднак часам дасягнуць яго цяжка, і часта ня з нашае віны.

Пётар Стасіньскі, журналіст, намесьнік галоўнага рэдактара «Gazety Wyborczej»

Не, гэта няпраўда. Ці не зусім праўда. Мне падаецца, што ад пачатку 90-х палякі сутыкаюцца зь вялікай колькасьцю беларусаў, напрыклад тых, што прыяжджалі і прыяжджаюць ува ўсходнюю Польшчу пагандаляваць. Тыя палякі, якія гандлявалі зь беларусамі, асабліва на пачатку 90-х, вельмі добра зараблялі, гэтыя грошы займалі значнае месца ў іх бюджэце. Таму беларусы атаясамліваюцца шмат кім зь людзьмі, якія, як і палякі ў 80-я, гатовыя да цяжкасьцяў і рызыкі, каб палепшыць узровень свайго жыцьця. А калі нехта думае пра палітыку, дык, вядома, у першую чаргу ўзьнікае Лукашэнка. Але Беларусь атаясамліваецца таксама і зь перасьледам апазыцыі. Тут трэба падкрэсьліць, што калі Беларусь і атаясамлівацца з Лукашэнкам, то вельмі непрыхільным для самога Лукашэнкі чынам. А Чарнобыль? Не, гэта ў сьвядомасьці палякаў атаясамліваецца хутчэй з Украінай.

Міхал Ягела, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Польшчы, былы віцэ-міністар культуры, пісьменьнік і навуковец

Не, я ня згодны. Але я не найлепшы прыклад «сярэднестатыстычнага» паляка, бо шмат цікаўлюся Беларусьсю

і шмат пра вашу краіну ведаю. А калі браць менавіта «сярэднестатыстычнага» паляка, дык Чарнобыль і Лукашэнка, на жаль, сапраўды прысутныя ў ягоным успрыманьні Беларусі. Але тут я б дадаў, што для «сярэднестатыстычнага» паляка Беларусь атаясамліваецца таксама з добрымі, лагоднымі людзьмі, якія маюць цікавую народную культуру.

Апытваў Аляксей Дзікавіцкі

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2005/1/12**
[image]

Валер Булгакаў Загадкі і адгадкі лукашэнкаўшчыны

ВАЛЕР БУЛГАКАЎ рэдактар часопісу «ARCHE». Летась уклаў і выдаў кніжку «Мясцовыя выбары ў найноўшай палітычнай гісторыі Беларусі».

Кнігі, якія згадваюцца ў артыкуле:

Ідыёт самы настаяшчы. Творы й экспромты ў розных жанрах. Менск-Варшава-Масква: Kontra-press, 2001.

В центре внимания всей нашей политики должны быть люди. Материалы совещаний активов областей и г. Минска по вопросам социально-экономического развития регионов Республики Беларусь в 2001-2005 гг. Минск: Беларусь, 2002.

А. Г. Лукашенко. Исторический выбор Беларуси. Лекции, прочитанные в высших учебных заведениях г. Минска. Минск: Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2003.

У Сяргея Даўлатава ёсьць афарызм: «Пасьля камуністаў я найбольш ненавіджу антыкамуністаў». Даўлатаў не любіў камуністаў з антыкамуністамі за іх візіянэрства, дагматызм, вернасьць малажыцьцёвым ідэалам і адарванасьць ад рэальнага жыцьця. Усьлед за Даўлатавым можна сказаць: «Пасьля лукашэнкаўцаў мяне найбольш нудзіць ад

антылукашэнкаўцаў». Іх палітычная культура дэфармаваная, стаўленьне да палітыкі вельмі павярхоўнае і грунтуецца на дарэфлексійнай ацэнцы мэтадаў асобы, якую прынята называць галоўным палітыкам у нашай краіне. Ім уласьцівы сьветапогляды, адрозныя ідэалягічна, але надзвычай падобныя характарам мысьленьня. Іх яднаюць непавага да голасу іншага, нецярпімасьць і агрэсіўнасьць, гераічны патас ахвярнасьці ў імя вечных, унівэрсальных вартасьцяў, вера ў прагрэсіўны, адзіна правільны характар сваёй пазыцыі і непазьбежнасьць яе гістарычнага трыюмфу.

Іншая рэч, што афіцыйны бок цынічна прамаўляе свой message, карыстаючыся самымі сучаснымі СМІ і найноўшымі тэхналёгіямі ачмурэньня насельніцтва, а яго праціўнікі вымушаны выказваць свае думкі ў мэдыях раньнекапіталістычнага часу - малатыражных газэтах і часопісах, улётках і нелегальных брашурах.

Кніжка «Ідыёт самы настаяшчы» прэзэнтуе крайнюю пазыцыю адмоўнага стаўленьня да Лукашэнкі. Яе прызначэньне - зрабіць з «шклоўскага ідала» «шклоўскага дэмана», даўшы галерэю яго нэгатыўных вобразаў. Дасьледчыку літаратуры гэта дазваляе прасачыць храналёгію паўставаньня твораў, а таксама жанраў і стыляў антылукашэнкаўскай палітычнай агіткі.

У вэрсіі ўкладальнікаў «Ідыёта…», яе родапачынальнікам быў грамадзянскі лірык Вядзьмак Лысагорскі, аўтар шырока вядомай паэмы «Лука Мудзішчаў - прэзыдэнт», за напісаньне якой яго беспасьпяхова й апатычна спрабавалі перасьледаваць. Гэты твор сярэдзіны 90-х выклікаў лавіну насьледаваньняў і імітацыяў. Яны тут займаюць ільвінае месца. Іх яднае сэнтымэнтальнасьць, фамільярнае абыходжаньне з палітыкамі, прыземлены мужыцкі гумар (на тэму стаўленьня Лукашэнкі да беларускай мовы і ягонай размытай культурнай ідэнтычнасьці, наконт ягонай недасканалай расейскай, схільнасьці да злоўжываньня лексыкай савецкай прапаганды), намёкі на датычнасьць прэзыдэнта да зьнікненьня шэрагу палітыкаў і г. д. Мастацкая вартасьць гэтых «вяршоідаў» настолькі ўмоўная, што напісаць іх мог бы адзін чалавек ці група аўтараў з прыкладна аднолькавым узроўнем адукацыі і інтэлекту. Па

сутнасьці, мы маем справу з заключэньнем палітычных лёзунгаў у вершаваную абалонку.

Бальшыня матэрыялу была створана пры канцы 90-х, калі нацыянальная незалежнасьць Беларусі ператварылася ў хадавы палітычны тавар, а дзяржаўная машына запрацавала на выцясьненьне беларускай культуры, зразуметай у шырокім сэнсе, з грамадзкага ўжытку. Таму іх ляйтматыў - перажываньні аб нацыянальнай незалежнасьці й культуры. Па ідэі, асабліва іранічную форму ім мела надаваць макаранічная мова:

Да і вабшчэ, скажу вам чэсна,
Два ў мірэ сільных языка,
А мова - эта ўсім ізьвесна -
Ліш дзіалект. І то - пака.
Но нічаво - уж скора ўрэмя,
Кагда падпішам у Крамле
Мы дагавор, што наша племя
Ні хочыт быць Русі ваўне.

* * *

Аляксандра Первава Лукавава ка ўсем возьлюбленым і заблудшым чадам Рэспублікі Бальшавіков

Але абмеркаваньне палітычных мэтадаў Лукашэнкі займае параўнальна другаснае месца. Больш агрэсіўна і азартна тут дэманізуецца сама яго асоба, перадусім пры дапамозе эксплюатацыі нізкіх чалавечых жарсьцяў і эфэкту блізкага знаёмства зь вехамі біяграфіі пэрсанажа, прэзэнтаванага як

байструк-недачалавек (чый бацька - «женатый одноглазый мужчина по имени Гирш»*), нацыянальны выродак і здраднік; беспрынцыповы аратар, прыслужнік мафіі, палітычны псыхапат і садыст, грабар свабоды СМІ* («изгнаны редакторы - это ли не факторы?»), *няверны муж, пачынальнік ценявой прыватызацыі, маскоўскі халуй, кадэбісцкі стаўленік, далакоп дэмакратыі, яе інстытуцый і працэдур, нацыянальны праклён, вызнаўца чужой палітычнай сымболікі, узурпатар улады, прыхільнік Гітлера,*

мілітарыст савецкай загартоўкі , аматар нецэнзурнай лексыкі, палітычная прастытутка; будаўнік лядовых палацаў і паветраных замкаў, пацыент шклоўскага дурдому; «абмежаваны, цьвердалобы, сьлязьліва-гнеўны цемрашал», «всінародный пустазвон».

Як і ў любым прапагандысцкім опусе, яго канструкцыя трымаецца на тонкім спалучэньні праўды, паўпраўды і непрыкрытай хлусьні. Гэты хісткі балянс, здаецца, незваротна зьнікае пры апісаньні вонкавага выгляду пэрсанажа. Градус яго акарыкатурваньня тут зашкальвае. Пэрсанаж вытрымлівае параўнаньне выключна з прадстаўнікамі эўразійскай і афрыканскай фаўны: *«касамозгі, віславусы», «чэрап вусаты», «пляшывы, ваўкаваты пёс», «цыганскі кот-баюн», «каменна-вусаценькі бажок», «дзікім воласам скрозь, нібы шчэцьцю, зарос», «плешивый косолапый гад», «шкловская обезьяна сипун-ревун... ворочает тараканьими усищами, убаюкивает сладкими речами».* Або:

Сёньня ён у вышшым чыне
Ды нікчэмны, як гарыла.
Спачуваю я жанчыне,
Што казьліну нарадзіла!

Гэтую лінію не бяз бляску разьвіў і біёграф Лукашэнкі Яўген Мяжэўскі, згодна зь якім будучы беларускі прэзыдэнт у пачатковай школе пастаянна прагульваў заняткі і, *«ожидая с уроков своих одноклассников, пугал их, кукуя с придорожных елок».*

Зьверападобны пэрсанаж надзяляецца пярэстым атачэньнем, асноўным спосабам «апусканьня» якога робяцца маніпуляцыі з прозьвішчамі. Зімоўскі ператвараецца ў Зюзімоўскага, Азаронак - у Азьвяронка (варыянт Абдуронак), Казіятка - у Азіятку, Цапкала - у Цыпкалу, Замяталін - у Вымяталіна (варыянт Дрысталін), Ціцянкоў - у Піцянкова (варыянт Цюцянкоў), Гаварухін - у Гаўнюхіна, Чыкін - у Чмыкіна, Посахаў - у Пасюхова. І - што, мабыць, павінна быць асабліва дасьціпна - самога пэрсанажа называюць Алкашэнкам.

Калі ўкладальнікі «Ідыёта...» ставілі сабе мэтай падрыў існых культурных гіерархій, то яны, безумоўна, яе дамагліся. З пункту гледжаньня падбору літаратурнага матэрыялу і яго мастацкай якасьці яны як бы вярнуліся ў пачатак XIX ст., калі літаратура, напісаная неўнармаванаю, насычанай рэгіяналізмамі і русізмамі беларускай моваю, была здольная толькі да бурлеску і пародыі. Гіерархія літаратурных жанраў і стыляў амаль двухсотгадовай даўніны тут старанна захаваная: кепскаю беларускаю (або макаранічнаю) тут напісаны банальныя творы ў нізкіх жанрах з маргінальнай эстэтычнай вартасьцю, па-расейску - творы ў «высокіх» жанрах і/або з інтэлектуальнымі прэтэнзіямі. А ці можа быць эфэктыўнай заснаваная на каляніяльных культурных мадэлях крытыка асобы, якая дала другое жыцьцё інстытуцыям, мэханізмам і практыкам расейскага культурнага дамінаваньня ў Беларусі, - пытаньне рытарычнае. Замест дэманізацыі пэрсанажа яна вядзе да баналізацыі яго вобразу.

Паводле клясыфікацыі Міністэрства інфармацыі, «Ідыёт самы настаяшчы» - масавае грамадзка-палітычнае выданьне. Яго адрасная група - народныя масы, а не карпарацыі палітыкаў ці інтэлектуалаў. Гэта, аднак, ня значыць, што і першыя, і другія не падзяляюць засьведчаных у ёй уяўленьняў пра Лукашэнку або ацэнак яго асобы і дзейнасьці. Можна сказаць больш: палітыкі і інтэлектуалы, як публічныя ідэолягі, да якіх прыслухоўваецца ўсё грамадзтва, нясуць на сабе цяжар бацькоўства гэтых ацэнак і уяўленьняў.

Яго факт можна ўстанавіць таму, што мысьленьне палітыкаў пра Лукашэнку больш лягічнае й структураванае, валодае разгорнутымі прычынна-выніковымі або сынэргетычнымі сувязямі. Здабыткам жа масавай сьвядомасьці становяцца ўвасобленыя ў папулісцкіх формулах гатовыя лёзунгі (Лукашэнка як агент ФСБ, як нацыянальны здраднік і г. д.), самастойна абгрунтаваць якія іх шараговы адэпт ня ў стане. Паназіраць за працэсам такой лягічнай эксплікацыі нядаўна даў магчымасьць Зянон Пазьняк падчас сваёй прэс-канфэрэнцыі на радыё «Свабода». Тэзу «Лукашэнка - агент расейскіх спэцслужбаў» ён абгрунтаваў так:

Барацьба ідзе за Беларусь, і ў гэтым змаганьні Лукашэнка ёсьць стаўленік і закладнік расейскага гэбізму на Беларусі. Ягоныя паказныя канфлікты з Масквой - гэта ёсьць сваркі ў лягеры саюзьнікаў дзеля палітычных мэтаў.

Лукашэнка не ператварыўся ў змагара за незалежнасьць. Думаючым людзям ня трэба паўтараць прапагандысцкіх «вэрсусаў». Прыступы ягонага «сувэрэнітэцтва» правяраюцца ўнутранай і зьнешняй палітыкай, а яна - не зьмяняецца. Сутнасьць жа яе - вынішчэньне ўсяго беларускага. (У апошні час вынарадаваньне стала нават больш жорсткім.) Я ўжо казаў, што сварка Лукашэнкі з Масквой - гэта паказная грызьня ў лягеры саюзьнікаў. Канфлікт ня мае прынцыповага характару (бо ў гэты ж час рыхтуецца ўвядзеньне расейскага рубля, гандлююцца пра «канстытуцыйны акт», плянуюць выбары ды рэфэрэндумы і г. д.).

Тлумачэньнем палітычнай непахіснасьці Лукашэнкі яго апорай на ўсюдыісных і надзвычай эфэктыўных расейскіх чэкістаў павінны быць задаволеныя ўсе тры бакі: і расейскія спэцслужбы, якім робіцца бясплатная рэкляма і тым самым умацоўваецца міт аб іх усёмагутнасьці, і Лукашэнка, які сам дзе можа кічыцца сваёй блізінёй да іх, і сам Пазьняк, які знайшоў зручную інтэрпрэтацыю сваёй палітычнай дысквалiфікацыі.

Але гэтая спрошчаная тэлеалёгія - тэлеалёгія маладушнага носьбіта траўматызаванай сьвядомасьці, схільнага гіпэрбалізаваць адны грамадзкія працэсы і затушоўваць або ідэалізаваць іншыя. Зрастаньне Лукашэнкі з расейскімі спэцслужбамі ў трактоўцы Пазьняка становіцца ўнівэрсальнай адгадкай на ўсе загадкі «лукашэнкаўскай» эпохі палітычнай гісторыі Беларусі[1].

Як на мяне, за настойлівай апэляцыяй да «вонкавых ворагаў» і «ўнутраных сілаў» стаіць паталягічнае нежаданьне крытыкаў Лукашэнкі ўбачыць унутраныя прычыны сваіх паразаў, адмовіцца ад культурных і гістарычных мітаў, якія засьмечваюць тэлеалёгію карціну сьвету і дэфармуюць успрыняцьце навакольнай рэчаіснасьці. У аснове такога мысьленьня ляжыць

[1] Пазьняк, Зянон. Беларускі шлях. Мінск, 1994.

мы, адраджэнцы і нацыянальныя рупліўцы, ня можам бяць разгромленыя ўласнай жа нацыяй, паколькі мы адраджаем тысячагадовыя традыцыі і робім усё магчымае для яе. Як нацыя можа прагаласаваць супраць гонару нацыі, супраць свайго сумленьня, проста не ўкладаецца ў галаве. Сапраўдны акцэнт робіцца на паўнаце, мудрасьці і сьпеласьці беларускай нацыі, а таксама на багацьці і адвечнасьці яе традыцыяў. Кандыгэты падыход не вытрымлівае сутыкненьня з рэальнасьцю, адказам становіцца не яго рэвізія, а гістэрычны пошук ворагаў сярод чужых: нацыю цяпер ірве на часткі дракон расейскай ФСБ.

Тым часам уся гісторыя незалежнай Беларусі даводзіць, што паразы нацыянал-дэмакратаў выкліканыя тым, што краіна збольшага заселеная «гома саветыкусам», а для сур'ёзнага разгляду самой тэмы маніпуляцыяў зьвязаных з спэцслужбамі палітычных інжынэраў не стае аргумэнтаў і фактаў. Пагнаць вернасьць такой абстракцыі даводзіцца плаціць палітычнай маргіналізацыяй: з ФСБ, як і з абсалютным злом, прастаму чалавеку няма як змагацца, яе можна толькі баяцца (і хавацца ад яе).

У адрозьненьне ад публічных палітыкаў інтэлектуалы вольныя ад абавязку пастаянна падкрэсьліваць адданасьць сваім ідэйным прынцыпам (пад выглядам якіх у нашым малаадукаваным грамадстве часам крыюцца дзікія забабоны) і дбаць пра грамадзкі рэзананс сваіх выказваньняў. Таму ў іх асяродзьдзі дыскусіі на актуальныя палітычныя тэмы найбольш жывыя і ідэалягічна найменш запраграмаваныя.

Адно з такіх абмеркаваньняў ролі і значэньня Лукашэнкі летась адбылося паміж, кажучы мовай савецкай прапаганды, двума наймітамі амэрыканскага капіталу - супрацоўнікамі беларускай службы радыё «Свабода» Юр'ем Дракахрустам і Сяргеем Навумчыкам у інтэрнэт-выданьні «Naviny.by».

На думку Ю. Дракахруста, стаўленьне наступных пакаленьняў беларусаў да Лукашэнкі можна будзе параўнаць з стаўленьнем сучасных гішпанцаў да дыктатара Франка, наступствы чыёй дыктатуры краіне ўдалося параўнальна лёгка пераадолець. Шмат якія гішпанцы лічаць, што Франка выратаваў краіну ў

ад бяды, ад ФСБ, якая ў Расеі. Як у расейскіх беларускай Канцлер Манаеў. Паводле яго, адзін з ключоў ад кабінэту з шыльдай «Прэзыдэнт РБ» знаходзіцца у Крамлі, Лукашэнкава палітыка «новага нацыяналізму» не знаходзіць сур'ёзнай падтрымкі як у Крамлі, так і сярод беларускай намэнклятуры ды ў грамадства ў цэлым, бо

«здравомыслящие люди понимают: Россия добилась

тагачасных умовах. Лукашэнку, у адрозьненьне ад *Ельцына*, давялося будаваць дзяржаву фактычна з нуля, і таму ён навечна застанецца ў гісторыі як першы прэзыдэнт *Беларусі*, пры якім краіна набыла свае інстытуты, хай прымітыўныя фэадальныя па сутнасьці і якія хоцькі-няхоцькі давядзецца пасьля дасканаліць. Яму наканавана ўвайсьці ў пандэмаю беларускіх дзеячоў ад Вітаўта да Машэрава, стаць увасабленьнем аднаго з этапаў беларускай гісторыі, хутчэй адрозьненьне ад прэзыдэнтаў», не выбіраюць.

Франіках усіхов, чем у Беларусі», а ўлучыць дэмакратычных сілаў і, хутчэй, іх антырасейскімі выпадамі. Высновa з гэтага: прымаюцца наша грамадзтва зь яго русіфікацыяй, саветызацыяй і іншымі бядамі такім, якім яно есьць, гаварыць зь ім на адной мове, інакш яно вас не зразумее. Кпіць цешыць слабе дурной ілюзіяй, што на беларускай мове, мове палітычных аутсайдэраў, слабых і малалікіх сацыяльных

У адказ С. Навумчык абвінаваціў свайго апанэнта ў міталягізацыі Лукашэнкі, выкліканай ягонымі незалежніцкімі заявамі, зробленымі пад уплывам сэзоннага абвастрэньня стасункаў з Расеяй. Лукашэнка насамрэч дзяржавы не стварaў, а толькі дзякуючы трагічнаму зьбегу абставінаў узурпаваў у ёй уладу. Ён не гарант беларускага сувэрэнітэту, паколькі сам сувэрэнітэт залежыць ад ягоных капрызаў. Падмуркі дзяржаўнасьці былі закладзеныя, пакуль парлямэнт узначальваў Станіслаў Шушкевіч. Сам Лукашэнка не распрацоўваў ні Дэклярацыі аб сувэрэнітэце, ні закона аб стварэньні войска, памежнай і мытнай службы, фінансавай сыстэмы і г. д. Перасьледуючы карысьлівыя мэты («*рабілася ўсё, як вядома, «пад Кебіча*»), ён падтрымаў толькі ўвядзеньне пасады прэзыдэнта. Ад 1994 году, з гледзішча адпаведнасьці нацыянальным інтарэсам і дэмакратычным стандартам, пачынаецца суцэльная дэградацыя беларускай дзяржавы, якая празь дзесяць год дасягнула свайго гістарычнага максымуму. Парлямэнт па-рабску залежны ад Лукашэнкі і функцыянальна недзеяздольны, апазыцыя пазбаўлена доступу да беларускага тэлеэфіру, незалежнасьць судовай сыстэмы цалкам зьнішчана, спэцслужбы, міліцыя і пракуратура выкарыстоўваюцца для палітычнага перасьледу, войска, памежная і мытная служба абслугоўваюць інтарэсы Расеі.

Калі Лукашэнка і герой, то выключна нэгатыўны, значна горшы за Машэрава, пры якім кнігі Быкава, Барадуліна, Брыля, Бураўкіна выходзілі непараўнальна большымі накладамі, рэгіянальныя газэты друкаваліся па-беларуску, а юбілейны вечар Караткевіча быў паказаны па тэлебачаньні. Праўда, пры Машэраву цяжка было пачуць на вуліцах Менску «беларускую

гаворку, але за беларускае слова не цягнулі ў міліцэйскі пастарунак». Лукашэнка стварыў такі прэцэдэнт нацыянальнага выраджэньня, якога ня ведае сусьветная гісторыя, бо нікто дагэтуль з нацыянальных лідэраў не дазваляў сабе і нават атачэньню забараняць нацыянальную сымболіку, мову і гісторыю, разбураць нацыянальную адукацыю і цынічна зьдзекавацца з нацыянальных пачуцьцяў.

Такім чынам, у 2003 годзе Беларусь, як ніколі, была блізкая да страты сваёй дзяржаўнасьці, існаваньне якой залежыць, вылучна ад волі аднаго чалавека. І ў тым, што Беларусь пакуль застаецца незалежнай, аніякай Лукашэнкавай заслугі няма:

Уявіце сябе бацьку, які падышоў да краю бездані зь немаўлем і трымае яго на выцягнутых руках. Ці будзеце вы хваліць яго за тое, што ён ня кінуў дзіцё ўніз (бо мог жа і кінуць)? Хутчэй у вас узьнікнуць сумненьні ў адэкватнасьці паводзінаў такога бацькі. У штаце Нью-Ёрк падобны экспэрымэнт (стварэньне пагрозы жыцьцю асобе, якая ня ў стане сябе абараніць) абыдзецца вам у бясплатныя гамбургеры на вельмі абмежаванай тэрыторыі цягам ад трох да пяці гадоў - гэта ўжо як вашаму адвакату ўдасца дамовіцца з судзьдзём.

Хаця Сяргею Навумчыку не адмовіш у назіральнасьці і праніклівасьці, шэраг яго аргумэнтаў можна бязь цяжкасьці аспрэчыць. Яго мысьленьне не свабоднае ад ідэалізацыі падзеяў дзесяцігадовай даўнасьці і вызначаецца атаясамліваньнем палітычнай рыторыкі і палітычнай прагматыкі лукашэнкаўскага рэжыму. Каб увекавечыць гістарычную ролю апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце XII скліканьня, ён вымушаны разумець «пабудову беларускай дзяржавы» тэндэнцыйна, як разавы акт заснаваньня яе інстытутаў, а не пастаянную мэтанакіраваную працу для падтрыманьня яе дзеяздольнасьці. Апрача зьмяненьня заканадаўства і перапрафіляваньня міністэрстваў і ведамстваў, незалежная Беларусь востра патрабавала кадраў, якіх дагэтуль не рыхтавалі на яе зямлі: мытнікаў і памежнікаў, вышэйшых афіцэраў і вайсковых лекараў і г. д. Без пастаноўкі іх вытворчасьці на паток, што было зроблена ўжо пры Лукашэнку,

рускі, тут можна нешта і нешта разварушыць. Сонца у тым, *як* адбываецца падмена паняцьцяў: справядлівае патрабаваньне да дэмсілаў улічваць у сваёй палітычнай барацьбе інтарэсы расейскамоўных беларусаў падмяняецца безапэляцыйным заклікам улічваць палітычныя інтарэсы Крамля (стандартныя для любога буйнога геапалітычнага актора: уплываць на суб'екты палітычнага поля і маніпуляваць «мясцовай» грамадзкай думкай).

нельга сур'ёзна гаварыць пра «нацыянальную дзяржаўнасьць».

Ідэя, згодна зь якой беларуская дзяржава стаіць на краі згубы, бо яе арганізацыя не адпавядае высокім дэмакратычным стандартам, таксама з абсягу сафістыкі. Гісторыя існаваньня дзяржаваў налічвае тысячы гадоў, а гісторыя высокіх дэмакратычных стандартаў мае ледзьве пару стагодзьдзяў. Вядома, пры іх выкананьні дзяржаўная сыстэма робіцца больш стабільнай, але й нічога ня ведаючы пра іх, пэўныя дзяржавы існавалі тысячу гадоў. Рэпліка пра неадпаведнасьць дзяржаўнай палітыкі нацыянальным інтарэсам навеяна перш-наперш іх дыямэтральна розным разуменьнем апанэнтамі. Проста адзін выступае ад імя меншыні, заклапочанай крызысам нацыянальнай культуры, укараненьнем у краіне высокіх стандартаў дэмакратыі і рынкавай эканомікі, а другі - ад імя бальшыні, якая не ўспрымае нацыянальнай культуры як каштоўнасьці і спавядае патэрналізм. (Адчуваньне гэтай дыхатаміі нацыянальных інтарэсаў ёсьць у прадмове Лукашэнкі да кнігі «Исторический выбор Беларуси», калі ён гаворыць пра разуменьне «*нацыянальных інтарэсаў, уласьцівае кіраўніцтву Рэспублікі Беларусі*».)

Да таго ж, аўтар сьцьверджаньня «Ў 2003 годзе Беларусь найбліжэй стаяла да страты сваёй дзяржаўнасьці» яўна прэтэндуе быць мэтафізычным голасам нацыі, а само яе паняцьце разумее як вянец сусьветнага культурна-гістарычнага працэсу:

...Абсалютна неістотна, колькі чалавек спавядаюць [нацыянальныя] пачуцьці і лічаць сабе абражанымі - дзесяць мільёнаў ці проста дзесяць. У XIX стагодзьдзі ў Чэхіі людзей, якія размаўлялі па-чэску, было менш за сотню, але іхнія высілкі і вера ў нацыянальнае адраджэньне зрабілі тое, што здавалася неверагодным. Вось гэтым людзям і ўзьведзеныя помнікі ў чэскіх гарадах.

Вынесем за дужкі яўную нацяжку пра 100 чалавек, якія ў XIX стагодзьдзі гаварылі па-чэску (мабыць, маецца на ўвазе колькасьць буйных інтэлектуалаў у буйных гарадох). Згодна з

прапагандаваным тут падыходам, калі сярод грамадзян і палітычных лідэраў пануе некампэтэнтнасьць, магчымы толькі элітарысцкі (арыстакратычны), а фактычна аўтарытарны стыль вядзеньня палітыкі, якая мае ажыцьцяўляцца ў імя нацыянальнага адраджэньня і дыктатуры нацыянальных інтарэсаў нават тады, калі яны па-сапраўднаму ўсьведамляюцца мізэрнай часткай эліты (людзьмі вышэйшай культуры). Пра дэмакратыю, кіраваньне пры якой ажыцьцяўляецца ад імя бальшыні і якая па азначэньні тоіць у сабе небясьпеку яе тыраніі, гаворка як бы зусім не ідзе.

Але самае неспадзяванае ў гэтым адказе - прыняцьце яўна каляніяльнай культурнай гіерархіі ў выглядзе «пантэону нацыянальных дзеячоў ад Вітаўта да Машэрава». Калі месца Вітаўта ў ім больш-менш апраўданае (хаця залічаць яго ў беларускія дзеячы нашы гістарыёграфы пачалі дзесьці з 1930-х гадоў), то з Машэравым усё значна цяжэй. Пры ім духоўная атмасфэра дэбеларусізацыі дасягнула свайго апагею, а прысутнасьць беларускай культуры ў грамадзтве зьвялася да энтаграфізму і папулізму. Таму калі мы не адкідаем гэты пантэон у прынцыпе, памяшчаць у яго Машэрава, маскоўскага намесьніка ў беларускіх правінцыях, і не памяшчаць Лукашэнкі, першага прэзыдэнта незалежнай Беларусі і хроснага сына Машэрава ў пляне духоўнай культуры, вельмі праблематычна. Лукашэнка па-свойму пайшоў значна далей за Машэрава, абвінавачваючы Крэмль у дзяржаўным тэрарызьме, адключаючы расейскія тэлеканалы і публічна разважаючы пра магчымасьць уваходжаньня Беларусі ў Эўрапейскі Зьвяз.

Сказаць, што пасьля дзесяці гадоў эміграцыі ўспрыманьне Лукашэнкі ягоным апанэнтам стала гратэскавым, заснаваным на чужых і ўласных фобіях або што яно падкрэсьлівае няўменьне бачыць сьвет інакш як у чорна-белым сьвятле, значыць не сказаць усяго. Тут мы маем справу, бадай, з спробай задаць нарматыўнае прачытаньне фэномэну Лукашэнкі, якое б абавязвала кожнага, хто далучае сябе да беларускай інтэлігенцыі. Шляхам яго рэдуктыўных трактовак інтэлектуалы так намагаюцца акрэсьліць рамкі сымбалічнае тэрыторыі, на якую нельга заходзіць простаму сьмяротнаму.

Адна з апошніх спробаў акрэсьліць «канон» мысьленьня аб Лукашэнку належыць нашаніўскаму публіцысту Сяргею Паўлоўскаму (гл. «Нашу Ніву» за 15 ліпеня г. г.). Паводле яго, наша эканоміка апошнім часам разьвіваецца і ў грамадзтве пануе мір дзякуючы не Лукашэнку, а «аб'ектыўным працэсам разьвіцьця», сіле і велічы нашага разумнага, гаспадарлівага і самастойнага народу. Наш народ пабудаваў бы кальцавыя дарогі, бібліятэкі ды лядовыя палацы і без Лукашэнкі, які мноства разоў парушыў закон і тым самым як бы паставіў сябе па-за правам. Безь яго ў краіне быў бы лепшы парадак, рэгулярна б выплачваліся пэнсіі, зьмяншалася б беспрацоўе. На бяду, беларусы ня бачаць Лукашэнку альтэрнатывы, бо ён зьнішчыў нашу нацыянальную самапавагу. Калі нарэшце яго скінуць, у нас зьявіцца моцны парлямэнт (Беларусь за ўсю сваю тысячагадовую гісторыю ня ведала аўтарытарнага дыктатара - толькі веча, сойм і партыі), будуць шэсьць-сем незалежных тэлеканалаў і свабода думак, «скончыцца застой у нацыянальным разьвіцьці - тысячы людзей зоймуцца творчай беларускай працай», дырэктары прамгігантаў будуць самі разьвіваць вытворчасьць і нарэшце краіна «вернецца да стану збалянсаваных інтарэсаў усіх сваіх жыхароў».

Тое самае іншымі словамі выказаў у сваім нядаўнім інтэрвію вэб-рэсурсу «Naviny.by» палітоляг Уладзімер Роўда:

За дзесяць гадоў народ паказаў, што ён здольны працаваць, стабілізаваць сытуацыю, дабіцца некаторага паляпшэньня матэрыяльнага становішча, разьвівацца па эўрапейскім шляху. Але ня дзякуючы прэзыдэнту, а, хутчэй, насуперак яму.

Як і Антон Луцкевіч зь Лявонам Гмыракам сто гадоў назад, Роўда з Паўлоўскім заклапочаныя горам народным, а іх сьветапогляд інсьпіраваны апалёгіяй роднай старонкі, паэтыкай барацьбы дабра са злом, замілаваньнем чалавекам працы. Іх народніцтва, ідэя якога зводзіцца да служэньня народу, тут арганічна дапаўняецца яшчэ адной інтэлектуальнай імплікацыяй XIX стагодзьдзя, навеянай пазытывізмам, - верай ува ўсеагульны прагрэс. Каб не пакрыўдзіць народу і зьняць зь яго любую адказнасьць за

Лукашэнкава панаваньне, ён разглядаецца сам па сабе, надзяляецца ўласным існаваньнем і аказваецца быццам ні пры чым. Ужо ўсьлед за Зянонам Пазьняком, Паўлоўскі ўспрымае Лукашэнку як абсалютнае зло, якое ў яго варыянце падзеяў непазьбежна зьмятуць з палітычнай сцэны нейкія аб'ектыўныя заканамернасьці. У сьвеце, дзе пануе дабро, справядлівасьць і існуе найвышэйшае наканаваньне, змагацца зь ім ня варта: не пераадоленьне «застою ў нацыянальным разьвіцьці» наблізіць сыход Лукашэнкі, а толькі яго палітычная сьмерць выкліча нацыянальнае адраджэньне.

Формула «Народ сам па сабе - Лукашэнка сам па сабе» немагчымая бязь веры ў гэтыя аб'ектыўныя заканамернасьці. Каб яны працавалі, павінны існаваць аб'ектыўныя перадумовы - і ў дадзеным выпадку імі служаць агістарычныя ўяўленьні пра тысячагадовую беларускую дэмакратыю і векавыя традыцыі нацыянальнай самапавагі беларусаў, зьнішчаныя Лукашэнкам. Ці ж не прасьцей, аднак, дапусьціць, што гэтай самапавагі ў нацыі ніколі не існавала, што і паказаў усяму сьвету першы беларускі прэзыдэнт? І чаму, калі мы верым у гэтыя заканамернасьці, мы ня хочам прызнаць, што «некаторае паляпшэньне матэрыяльнага становішча» беларусаў было аб'ектыўным наступствам эканамічных рашэньняў, прынятых на самым версе?

Мэта гэтага доўгага і бадай задоўжанага ўступу - паказаць, што стратэгія ачарненьня Лукашэнкі такая ж канфармісцкая і тупіковая, неадпаведная нацыянальным інтарэсам (таму што не дазваляе нацыі зразумець прыроду «лукашэнкаўшчыны»), як і вонкава супрацьлеглая стратэгія яго ўслаўленьня. Цьверджаньне, што пры Лукашэнку дэградацыя беларускай дзяржавы набыла катастрафічны памер, паводле сваёй бяздоказнасьці раўназначнае меркаваньню маскоўскага аналітыка Сяргея Караганава, што Аляксандар Лукашэнка - адзін з самых таленавітых палітыкаў на прасторы СНД, бо грунтуецца на затушоўваньні адных аспэктаў яго дзейнасьці і выпячваньні іншых (апрача ўсяго іншага, Караганаў такой ацэнкай Лукашэнкі падкрэсьлівае, што Масква вітае насаджэньне расейскага каляніялізму ў былой расейскай калёніі самім прадстаўніком калёніі). Так лукашэнкаўцы з

антылукашэнкаўцамі дасягаюць стратэгічнага кансэнсусу - фэномэн Лукашэнкі аказваецца зонай, закрытай для мысьленьня і адкрытай адно для прапаганды.

Стан, калі інтэлектуалы не прадукуюць адэкватных формулаў пазнаньня, а сур'ёзныя высновы з «лукашэнкаўшчыны» так і ня зробленыя, нельга лічыць нармальным. Абапольная забарона мысьленьня пра Лукашэнку не дазваляе зрабіць зь яго дзейнасьці інтэлектуальнага скандалу, разгледзець мэханізмы, праграмы, інстытуцыі і практыкі, на якіх трымаецца яго панаваньне.

На шчасьце, гэты імпэратыў яўна адчуваецца толькі ў нацыянальных рамках. Па-за імі застаецца магчымасьць для непрадузятасьці. Калі чэскія аналітыкі з уплывовага выданьня «Transitions Online» у артыкуле «Лукашэнка: чалавек свайго часу?» (31 траўня г. г.) захацелі адказаць на пытаньні «Чаму ў Беларусі за 10 апошніх гадоў не ўдалося ўкараніць дэмакратыю?», «Чаму Лукашэнка застаецца папулярным і непахісным?» і пад., яны не задаволіліся ўжо дадзенымі адказамі. Так, Лукашэнка заслужыў праблему з іміджам, а некаторыя зь яго іміджаў самі сабой становяць праблему. Але, зважаючы на Лукашэнкаву красамоўнасьць і высокі інтэлект, трэба ўважаць яго прынамсі вясковым дасьціпнікам, а не вясковым ідыётам (цікавы ракурс позірку!). Так, палітычная мэтады Лукашэнкі ўзыходзяць да савецкай эры, за што на Захадзе ён успрымаецца як анахранізм, а ў самой Беларусі зьмяншаецца колькасьць асяродкаў апазыцыі, але толькі гэтым не растлумачыш сакрэту яго палітычнага выжываньня. Яно было б немагчымым безь яго здольнасьці выдатна балянсаваць паміж рознымі палітычнымі сіламі і ўменьнем падзяляць і ўладарыць:

Ён захаваў старыя савецкія сымбалі і традыцыі, але пераняў такую рыторыку савецкіх часоў, якая падкрэсьлівае салідарнасьць з «старэйшым братам» Расеяй і ў той жа час прышчапляе савецкі варыянт беларускай нацыянальнай ідэнтычнасьці. Ён захаваў калгасы і трымае на плаву старую прамысловасьць, але запрасіў у краіну замежныя банкі (калі не замежныя фінансавыя інстытуты), дазволіў дробны бізнэс у

духу «гуляш-камунізму», пайшоў на пэўную прыватызацыю. Ён зьмяняў, перастаўляў і адпраўляў у адстаўку чыноўнікаў. Ён надзяляў іх ільготамі, але не дзяржаўнай маёмасьцю. Магчыма, яго бамбізы застрэлілі колькі палітычных апанэнтаў. Але сярэдні беларус усё яшчэ цешыцца большай свабодай, чымся ў савецкі час.

У трактоўцы «Transitions Online» важная асаблівасьць фэномэну Лукашэнкі - ягоная вялікая папулярнасьць у народзе. Яе прычыны ў эканамічнай сіле беларускага рэжыму: Лукашэнкаў стыль кіраваньня дазволіў пераадолець хаос у краіне. У параўнаньні з Украінай ці Расеяй беларуская прамысловасьць, нягледзячы на вялізныя дзяржаўныя датацыі, знаходзіцца ў дзеяздольным стане і дае работнікам працу, у краіне няма алігархаў і шалёнага сацыяльнага расслаеньня. Турмы хоць і перапоўненыя, але цяжкіх крымінальных злачынстваў параўнальна мала, а ўзровень карупцыі нізкі.

Нягледзячы на рытуальныя скокі вакол інтэграцыі з Расеяй, Лукашэнка абмяжоўваў ролю расейскага бізнэсу ў краіне, узмацняў беларускае пачуцьце адметнасьці, а калі Масква паказвала, што хоча іншага лідэра, «прыбіраў» патэнцыйных прамаскоўскіх канкурэнтаў (так ён зрабіў у сёлетнім красавіку, арыштаваўшы Міхаіла Марыніча, які меў цесныя бізнэс-сувязі з Расеяй). Наступнікам Лукашэнкі будзе не расейскі намесьнік, а вылучэнец беларускай сыстэмы, які прадэманструе моцныя асабістыя якасьці, найперш палітычную выжывальнасьць і волю адстойваць нацыянальныя інтарэсы.

Такім чынам, падсумоўваецца ў «Transitions Online», Лукашэнка - ня проста савецкі атавізм, а фэномэн пераходнага пэрыяду, вельмі пасьпяховы ў некалькіх важных адносінах. Ён заслужыў падтрымку, забясьпечыўшы пэўную стабільнасьць і пераадольваючы праблемы, спрычыненыя іншымі грамадзкімі лідэрамі. Фэномэн Лукашэнкі можа азначаць пераход да экстравагантнай (постмадэрнай) формы аўтакратычнай дзяржавы, але шмат хто ва Ўкраіне пазайздросьціў бы такой форме кіраваньня. Невыпадкова з прычынаў, зразумелых шмат якім беларусам, расейцы таксама прагаласавілі за сыстэму, якая выяўляе цяпер лукашэнкаўскія тэндэнцыі. Заканчваецца

артыкул канстатацыяй, што Беларусь дагэтуль мае статус краіны-ізгоя, які заснаваны на асуджэньні міжнароднай супольнасьцю асобы Лукашэнкі, а ня створанай ім сыстэмы.

Пра падмену крытыкі створанай Лукашэнкам сыстэмы крытыкай ягонай асобы яшчэ пару гадоў таму гаварыў і палітоляг Андрэй Ляховіч. Каб унікнуць гэтага, далей мы засяродзімся на крытыцы палітычнай культуры, культурнай і эканамічнай палітыкі беларускага рэжыму з максымальна магчымай дыстанцыяй да самога Лукашэнкі. Іначай кажучы, нас будзе цікавіць не канкрэтная асоба, а яе непаўторнае культурнае асяродзьдзе, праграмы, стратэгіі і прынцыпы, якія абвяшчаюцца дзяржавай або прызнаюцца грамадзтвам рацыянальнымі.

ПАЛІТЫЧНАЯ КУЛЬТУРА

Рабочая гіпотэза ў дачыненьні да Лукашэнкавай палітычнай культуры палягае ў тым, што яна спалучае праграмны папулізм, ідэйны эклектызм і палітычны апартунізм як мэтады з вартасьцямі этнічнай беларускай і савецкай палітычнай культуры як зьместам (зь якімі вартасьці нацыянальнай культуры суіснуюць як полюсы адмаўленьня). У адрозьненьне ад дэмакратычных палітыкаў, якія, як правіла, уцэнтраваныя на сваю электаральную нішу (прыхільнікі сацыял-дэмакратычных/ лібэральных вартасьцяў і/або энтузіясты нацыянальнага адраджэньня), гэта дазваляе Лукашэнку прадаваць свой палітычны тавар адразу некалькім уплывовым грамадзкім групам, а падчас агульнанацыянальных палітычных кампаніяў фармаваць «сытуацыйную бальшыню» на базе кааліцыі мяншынь - напрыклад, на ўзроўні ідэальнага тыпу, гарадзкога насельніцтва, апантаванага фобіямі адносна нацыянальнай мовы, вяскоўцаў, зачараваных абяцаньнямі сацыяльнай справядлівасьці і палітычнай стабільнасьці, ды паджылых людзей, сфрустраваных сацыяльнай няроўнасьцю і ўсё яшчэ прагных аднаўленьня СССР.

Пасьля распаду СССР беларуская намэнклятура перажывала пэрыяд дэзарыентацыі. Калі раней яе палітычная легітымнасьць пацьвярджалася і зацьвярджалася ў Маскве, то цяпер крыніцай яе здабыцьця, па лёгіцы рэчаў, мусіў стаць

беларускі народ. У гэты крытычны момант і паявіўся Лукашэнка зь ягоным прыроджаным талентам эфэктыўна спэкуляваць на вострых палітычных тэмах. Ён абапіраўся на жывыя электаральныя патрэбы, імкнуўся задавальняць бягучы попыт на палітычным рынку, у імя чаго яму даводзілася то шукаць кансэнсусу, то ісьці на радыкальны канфлікт зь іншымі ўплывовымі палітычнымі акторамі - намэнклятурай і нацыянал-дэмакратычнымі сіламі.

Перамога Лукашэнкі на прэзыдэнцкіх выбарах 1994 году[2] была ўпершыню на прасторы СНД парушыла правіла, згодна якім выбары адбываюцца толькі для таго, каб афармляць пераемнасьць выканаўчай улады, завяршыла каротка існаваўшы заняпаду кабінэтнай палітыкі і нараджэньня палітыкі канкурэнтнай у Беларусі. У яе аснове ляжала палітычны эгалітарысцкім духу маральна-этычных пытаньняў, зацыклена традыцыйная этнічная культура беларусаў («*Главный принцип моей политики - это справедливость*»[3]), абяцаньне паставіць у цэнтар дзяржаўнай палітыкі прадстаўленыя палітычныя інтарэсы, рэвалюцыйны характар рыторыкі - што адрозьнівала Лукашэнку ад любога іншага лідэра краін СНД сярэдзіны 90-х, якія прайшлі «грунтоўную» савецкую партыйную або гаспадарчую школу[3], - патас суровага канфлікту з тымі сіламі і асобамі, якія хочуць зла беларускаму народу, падкрэсьліваньне ўласнай блізіні да яго («*Я не пошел по накатанной колее, как иные политики*») і, нарэшце, прэзэнтацыя сябе як палітычнага лідэра, які вядзе актыўнае публічнае жыцьцё і пастаянна заклапочаны станам справаў грамадзкай падтрымкі.

Найбольш непрадстаўленымі на дзяржаўным узроўні былі палітычныя інтарэсы, вульгарныя з пункту гледжаньня эўрапейскага назіральніка. У чэрвені 2004 году, калі, згодна з дадзенымі НІСЭПД, толькі 39,5 % беларусаў выступалі за рэстаўрацыю СССР і 50,8 % - супраць, мала хто ўжо памятаў, што ў лістападзе 1992 году ўсё было наадварот: 55,1 % беларусаў былі за аднаўленьне СССР і толькі 22,3 % - супраць. Як паказваюць зьвесткі тагачасных апытаньняў, яшчэ адным масавым грамадзкім інтарэсам было згортваньне «гвалтоўнай» беларусізацыі і вяртаньне да савецкага культурнага статусу кво.

[2] Туду і дакладней ...ыбары, якія ...ыкарыстоўваюць ...ыя ...ыя ...ыя

Лукашэнка чуйна прыслухоўваўся да гэтых незадаволеных масавых інтарэсаў і, будучы ўжо прэзыдэнтам, адны зь іх рэалізаваў у плашчыні рэальнай палітыкі, другія - сымбалічна. Калі браць папулярныя этыкеткі яго асобы, то ён хутчэй не «закладнік расейскага гэбізму», а палітычны правакатар, які ў сваіх карысьлівых мэтах дамогся трыюмфу інтарэсаў расейскамоўнай і расейскакультурнай бальшыні грамадзтва, што нейкі час стрымліваўся палітычнымі, культурнымі і інфармацыйнымі мэханізмамі. Мабыць, іх гістарычны трыюмф быў непазьбежны: нездарма Сакрату Яновічу Менск пад бел-чырвона-белымі сьцягамі здаваўся горадам пад беларускай акупацыяй.

(Нязбытая траўма ці, можа, палітыканства нацыянал-дэмакратычных ідэолягаў выяўляецца кожны раз, калі яны імкнуцца супрацьставіць добры народ дрэннаму Лукашэнку - падаць яго трыюмфальныя культурныя ініцыятывы сярэдзіны 90-х як вымучаныя ім асабіста або навязаныя яму расейскімі спэцслужбамі ў якасьці платы за палітычную або эканамічную падтрымку. Момант іх грамадзкага запатрабаваньня, як правіла, гістэрычна ігнаруецца: надзелены тысячагадовымі дэмакратычнымі традыцыямі беларускі народ сам ня мог падняць руку на сваю шматвекавую культуру.)

Гэтая чуйнасьць да глыбінных жаданьняў і спадзяваньняў розных сацыяльных групаў разам з агрэсіўнай фразэалёгіяй і якасна новай канцэпцыяй узаемадзеяньня з публікай былі асноўным Лукашэнкавым «know how» у палітычнай сфэры: акрэсьленай праграмы палітычнага будаўніцтва ў яго не было.

Палітычны інтэрас можна параўнаць з таварам у рынкавай эканоміцы: калі попыт на яго заўважаны і задаволены, ён траціць у сваёй рынкавай вартасьці. Хоць пытаньне панаваньня расейскай мовы і культуры ў Беларусі ўжо дзесяць гадоў як згубіла палітычную вастрыню, сваімі пастаяннымі спэкуляцыямі вакол гэтай тэмы Лукашэнка не пакідае найменшага сумневу: яго кіраваньне сымбалізуе рэванш расейскамоўных беларусаў за спробу пахіснуць іх дамінантнае становішча ў грамадзтве. Вядучае культурнае «пасланьне» лукашэнкаўшчыны ў тым, што толькі цяперашні рэжым

гарантуе захаваньне існага культурнага статус-кво. Народу зь нячыстым культурным сумленьнем гэта дае адчуваньне стабільнасьці, а Лукашэнку, які ўспрымае замарожваньне культурнага балянсу як адзін з элемэнтаў курсу на агульную палітычную стабільнасьць, дае магчымасьць выкарыстоўваць страхі, што гэтай «маліне» калісь прыйдзе канец (для гэтага нацыянальны рух павінен быць пераможаны не да канца: галоўны культурны раздражняльнік павінен сымбалічна прысутнічаць у грамадзкай прасторы). Усе ягоныя праграмныя прамовы апошняга году дэмагагічна распальваюць фобіі наконт гэтага:

Ведь в свое время, в 1995 году после первых президентских выборов, многие русские сидели на чемоданах. Вы знаете, какая это была политика.

Я не хочу, чтобы… русских ребят посадили снова на чемоданы. А ведь в начале 90-х это было, когда у нас националисты были у власти… когда русских решили вычленить и выслать из страны.

Когда пошло нагнетание национализма, я был категорически против этого.

В начале 90-х годов у власти были определенные люди, которые буквально «продавливали» белорусский язык. Я был тогда депутатом в парламенте, у меня была особая позиция. Я всегда говорил: знаете, если мы сейчас под давлением введем белорусский язык, мы откатимся назад. Почему? Потому что в научных дисциплинах, в технических у нас терминология не создана. А там, где и создана, она пока слабее, чем на русском языке. И потому предложил: давайте не будем под диктовку Шушкевича и прочих «продавливать» эти вопросы, иначе будет откат. Так и произошло.

У нас это уже было в начале 90-х, когда у власти были определенные люди. Они попытались заставить все страну

размаўляць на той мове, на якой яны хацелі. Что получилось? Поверьте, это одна из причин поражения той власти. Очень серьёзная причина.

У апошнім выказваньні Лукашэнка сам прызнаецца, што ягоны дзікі бунт супраць мовы быў цынічнай палітычнай акцыяй, якая забясьпечыла яго лепшую пазнавальнасьць у народа. Прыйшоўшы да народу Лукашэнка падкрэсьліваў таксама сваёй далучанасьць ад намэнклятуры[4] («*Я не работал ни председателем райисполкома, ни первым секретарем райкома, обкома, облисполкома, тем более не сиживал в ЦК*»), асабістую сьціпласьцю («*Я своих родственников в Минск не перетаскивал*»), спарадычнай шчырасьцю («*В последнее время много говорят: наша оппозиция: «Балтика», «Балтика», Лукашенко «вешает российских олигархов!» Ну, радовались бы, что хоть один человек нашелся, который их «кинул». Нет, «пережимает»*») і насычанай вульгарызмамі ды бытавізмамі гутарковай расейскай мовай (*«без гвалта», «кровь из носа», «скотина должен долг»*), якая неўзабаве стала мовай беларускай публічнай палітыкі.

Яшчэ адзін важны аб'ект увагі - гэта імплікацыі палітычнай культуры позьняга СССР у Лукашэнкавым сьветапоглядзе. Напэўна, само яго ўяўленьне пра ідэальнага палітыка – асабіста надзвычай сьціплага, амаль аскетычнага, разам з тым, ваяўнічага і гіпэртрафавана прынцыповага, чуйнага да народнага гора, энэргічнага, не без палітычнага экстрэмізму ў галаве, гатовага на ўсё ў імя народнага дабра, схільнага ў разе патрэбы ахвяраваць уласнай сям'ёй на карысьць дзяржаўных інтарэсаў, нецярпімага да несправядлівасьцяў, скептычна настроенага да любых формаў непрамой дэмакратыі было навеяна савецкай іканаграфіяй палітычных лідэраў, рацыі тыя, хто ўсьлед за Аляксандрам Фядутам зводзяць палітычны ідэал Лукашэнкі вылучна да асобы Юр'я Андропава. У ім ёсьць нешта і ад Леніна, і ад Сталіна, а можа, нават ад Хрушчова. Зь імі Лукашэнку яднае і разуменьне ўласнага «ўвацарэньня» як вянца культурна-гістарычнага працэсу ў асобна ўзятай краіне», пры якім цалкам адпадае неабходнасьць штосьці зьмяняць на самым версе дзяржаўнай улады, бо

[4] Зь цягам часу Лукашэнка трансфармуецца ў ўе жорсткі тайсынг за кантроль, прадажнасьць, бесцырымонцыповасьць і дэгенэратасьць, дэградаванасьць. На пачатку другой прэзыдэнцкага тэрміну намэнклятура па ранейшаму ўспрымалася наверсе як хісткая апора дзяржаўнай машыны. У той час у краіне ідуць складаюся жорсткія аўтарытарны рэжым і значна павялічыўся набор

асноўныя культурныя і нацыянальныя супярэчнасьці пра і назаўсёды пераадоленыя - застаецца толькі падпраўляць асобныя недахопы. Існая форма кіраваньня «па змаўчаньні» абвяшчаецца дасканалай, пачынаецца «канец гісторыі». Яго характэрная адзнака ў тым, што «асабістая сьціпласьць усё часьцей абарочваецца непрыхаваным эгацэнтрызмам дзяржавы», які лічыцца больш кампэтэнтным за любога іншага грамадзяніна ў любых пытаньнях. Перафразуючы Віталя Сіліцкага, найбольш улюбёны Лукашэнкаў займеньнік «я» і ня «мы», а «я»:

Почему я Мясниковича послал в Академию? Да потому, что, при всем моем уважении, академики не могли в трех соснах разобраться.

Меня эти выборы довели до белого каления.

Я б разбился в блин, но нашел, куда реализовать этот заказ.

Вы получили льна больше, а мне волокно надо.

БГУ из руин и пепла подняли на моих костях. Что я там ни делал! А на президентских выборах самый низкий процент голосования - в БГУ.

Я для каждого пытался что-то сделать. В результате нарыдал, а как был советским, так им в основном и остался.

Нарэшце, да савецкай палітычнай культуры ўзыходзіць Лукашэнкаў антыамэрыканізм і іншыя праявы ксэнафобіі, а таксама ўспрыманьне расейскай культурнай прасторы як сваёй, а эўрапейскай - як чужой і нават варожай. Гэтыя ўстаноўкі, дарэчы, аказаліся надзвычай жывучымі ў нашым грамадстве: паводле апытаньняў НІСЭПД, у чэрвені 2004 году 44,3 % беларусаў лічылі, што галоўная пагроза краіне зыходзіць ад

інструмэнтаў кантролю ўнаменклятуры. Уладзіце абмяжоўваліся ж «кіраўніка ўстаноўленага прэзынгам («*У нас все должно быть в порядке - от усов до ботинок*»), дапоўнены абяцаньнямі крымінальнага пакараньня за сабатаж прэзыдэнцкіх рашэньняў («*Создадите обстановку криминальную - поотрываю головы*»; «*Не дай бог, он влезет куда-то - завтра стоять на*»), а і праводзілі рэгулярныя перастаноўкі ў ёй. Аднак пры такой сыстэме ратацыя ўжываецца з абмежаванымі мэтамі - каб

ЗША.

Пры гэтым Лукашэнка - чалавек з культурнага пагранічча, якому ўласьцівыя два вымеры праўнага пачуцьця. Адно зь іх прышчэплена расейскім культурным полем, другое - беларускай традыцыйнай культурай. Таму, з аднаго боку, у яго ёсьць пэўныя эўрапейскія праўныя інстынкты, якія дазваляюць Беларусі мець узровень карупцыі, роўны славенскаму. З другога боку, ён жыве ў сьвеце ўласных маральна-этычных нормаў, уяўляе сабой прыклад сучаснага Радзівона Раскольнікава, які ідзе на разбуральныя палітычныя акцыі ў імя сваіх абстрактных ідэалаў.

прадухіліць фронду ў намэнклятурным асяродзьдзі і зьменшыць карупцыю, а не для таго каб спрыяць дынамізму ўсёй палітычнай сыстэмы і лепш каналізаваць грамадзкія інтарэсы.

Гэтае несупадзеньне асабістага праўнага «коду» Лукашэнкі з нарматыўным расейскім асабліва выразна відаць падчас яго крытыкі расейскіх парадкаў. Лукашэнкава крытыка Расеі - гэта свайго роду культурная крытыка, заснаваная на ўяўленьні пра нізкую праўную культуру расейцаў і, як вынік, няздольнасьць расейскай дзяржавы ажыцьцяўляць манаполію на гвалт, збор падаткаў ды эфэктыўна супрацьстаяць росту злачыннасьці:

За последние два месяца в Москве застрелили несколько профессоров. За что застрелили этих обычных людей, которые занимались преподаванием? Это всё результат безмозглой, непродуманной политики. Там, где бешеные неучтенные деньги, там криминал, там кровь.

Яшчэ пару словаў пра Лукашэнкаў палітычны папулізм. Ён стаў індыкатарам прорвы паміж рэальным грамадзтвам і нацыянальнымі элітамі. Тое, што эліты не знаходзіліся ў дзеяздольным стане (у момант абраньня Лукашэнкі на прэзыдэнта інтэлектуальныя эліты ня мелі традыцыі прыняцьця палітычных рашэньняў, а гаспадарчыя ўмелі гаспадарыць пераважна з Расеяй) і не ўспрымаліся нацыяй як безумоўны аўтарытэт, падкрэсьліла іх спроба стварыць сымбалічныя межы збліжэньня з Расеяй. У сярэдзіне 90-х беларускія інтэлектуалы - журналісты, асьветнікі, аналітыкі і палітычныя дзеячы - імкнуліся навязаць палітычнаму кіраўніцтву краіны ўяўленьне пра гэтыя сымбалічныя межы, за якія нельга заходзіць. Іх

дэманстратыўнае патаптаньне «народным прэзыдэнтам» і стварыла эфэкт небясьпекі страты незалежнасьці.

Фэномэн, калі нацыя не ўспрымае нацыянальныя эліты як аўтарытэт, высьвечвае яшчэ адзін цікавы аспэкт яе ўнутранай арганізацыі. Такое можа быць толькі ў т. зв. «глухім» грамадзтве, розныя часткі якога існуюць у розных інфармацыйных прасторах і вызнаюць розныя культурныя гіерархіі. Калі радыкальна фармуляваць тэзу: каб жа ў 1994 годзе Зянон Пазьняк паяўляўся на экранах тэлевізараў не з «нацыянальным прарокам» Васілём Быкавым, а з удзельнікамі расейскага ВІА «Иванушки Интернешнл», гэта магло б даць яму большую прыбаўку галасоў. У такім грамадзтве лёсавызначальныя праграмы разьвіцьця ня могуць прымацца шляхам грамадзкага кансэнсусу - яго цела разарвана на шматлікія «камунікацыйныя» мяншыні[5], лідэры якіх саму магчымасьць публічных дэбатаў выкарыстоўваюць найперш для пашырэньня свайго ўплыву і павелічэньня колькасьці сваіх прыхільнікаў.

Аб «глушэчы» нашага грамадзтва сьведчыць і адчужэньне нацыянальнай літаратуры ад нацыянальных масаў. Культурны літаратуры мадэль незалежнага быцьця Беларусі павінна распрацоўвацца гадоў сто таму, то для масаў і іх палітычна настроеных лідэраў патрэба нацыянальнай незалежнасьці застаецца пад пытаньнем нават і цяпер. Інфармацыйная прастора ў (пост-)каляніяльным грамадзтве ўладкавана так, што нацыянальная эліта не ўспрымаецца як культурны лідэр; у ім таксама адсутнічае нармальная камунікацыя паміж сэгмэнтамі грамадзкага цэлага - ідэі і праграмы інтэлектуалаў даляютаць да масаў пад уплывам геапалітычных катастрофаў.

Іншымі словамі, тое, што Лукашэнка і культурна блізкія яму людзі ўспрымаюць нацыянальную культуру як фальшывы сакрум, мае ня столькі эстэтычныя (г. зн. тлумачыцца ня толькі папулярнымі ўяўленьнямі аб поўным убостве нацыянальнай літаратуры, адсутнасьці нацыянальнай гісторыі да 1917 году і «настоящего белорусского языка»), колькі камунікацыйныя прычыны. Гэтым ён дае знаць пра свой асаблівы культурны сьвет, у якім беларускія падзеі ўспрымаюцца пры расейскім

[5] Пра ў ім культурны сьвет самога Лукашэнкі: «Из больших писателей я очень люблю Пушкина, особенно о стороне его произведения. Очень любил в свое время, будучи молодым человеком, Есенина, и

інфармацыйным пасярэдніцтве, надзвычай тэндэнцыйным, паводле Лукашэнкавага ж уласнага прызнаньня. Абвінавачаньне расейцаў у інфармацыйнай неаб'ектыўнасьці адзін з улюбёных конікаў Лукашэнкавых публічных апошняга часу, мяккі тэрор у дачыненьні журналістаў расейскіх электронных СМІ - важны элемэнт дзяржаўнай палітыкі[6].

Праявай палітычнага папулізму Лукашэнкі было паразытаваньне на позьнесавецкай сымбалічнай спадчыне, у прыватнасьці савецкай міталёгіі апошняй вайны. Пакуль асобныя апазыцыйныя палітыкі былі зацыкленыя на дэканструкцыі імпэрскай абраднасьці, Лукашэнкава заігрываньне з савецкімі вэтэранамі выглядала вельмі жыва і пераканаўча. Што ж датычыць т. зв. «новага» або

ный только его тыўнасьці обрамоваў отношении «ужэй жанщине». У інфармацыйным пляне мадэль «імпэрыя - калёнія»можна параўнаць з адносінамі «горад - вёска» ў пасьляваеннай Беларусі: комплекс вясковай непаўнавартнасьці выражаўся ў гіпэрцікавасьці да гарадзкіх падзеяў, а сам горад успрымаўся як цэнтар цывілізацыі, асяродак дабрабыту і заканадаўца мод.

6 *«Телевидение скульприт каждый. Наркотик этот дали населению...*

«папулісцкага» нацыяналізму Лукашэнкі, то, як і ўсякі ірмы нацыяналізм, на сваім ідэйным узроўні ён застаецца ледзьве паняцьцем - нязьменна складаецца з мэсіянізму з сакралізацыяй нацыянальнай гісторыі і мовы. Адносна ў Лукашэнкавым выпадку ролю нацыянальнай мовы выконвае каляніяльная мова і нацыянальная гісторыя падаецца ў каляніяльнай трактоўцы.

Палітычная культура Лукашэнкі прадыктавала выбар такой палітычнай сыстэмы, пры якой зарукай яе стабільнасьці становіцца нязьменнасьць палітычнага лідэра (адразу пасьля апошніх прэзыдэнцкіх выбараў «актыву» адной зь беларускіх абласьцей было заяўлена: *«И не надейтесь, что это последний период! Лучше рассчитывайте, что Лукашенко будет еще два периода»*), а сэнсам існаваньня - нарошчваньне палітычнага кантролю над усімі сфэрамі публічнага жыцьця, у тым ліку і акадэмічнага[7], прымусовая дэпалітызыцыя грамадзтва і абмежаваньне сфэры публічнай палітыкі. Пакінуўшы ўбаку аспэкты тэмы, цікавыя для палітолягаў (пра біялягічнае старэньне сыстэмы, у аснову якой не пакладзеныя ўнівэрсальныя ідэі, пра ўнутраныя асяродкі яе нестабільнасьці і г. д.), далей мы паглядзім, як курс на вынішчэньне альтэрнатывы ў палітычнай сфэры карэлюе з курсам на вынішчэньне альтэрнатывы ў сфэры культуры.

КУЛЬТУРНАЯ ПАЛІТЫКА

Культурную палітыку Лукашэнкі прынята лічыць каньюнктурнай і зьвязваць з ваганьнямі бягучага палітычнага курсу. Такі пункт гледжаньня нядаўна выславіў Віталь Сіліцкі ў «ARCHE»:

На фоне палітычных кампаніяў, якія разгортваюцца афіцыёзам і ўжо атрымоўваюць мянушкі кшталту «газавай вайны за незалежнасьць», раздачы тэнісістам ордэнаў «за перамогу над Расеяй», Лукашэнка пасьлядоўна прытрымліваецца палітыкі русіфікацыі гістарычнай сьвядомасьці і сьветапогляду беларусаў (пра моўную русіфікацыю мы тут нават і ня ўзгадваем). Калі расейскі націск на Беларусь узмацняецца, калі незалежніцкая рыторыка, здавалася б, усё больш апаноўвае афіцыйную прапаганду, улада сьвядома мацуе ідэалягічную пляцоўку, што

Беларуское телевидение, как внушается, вдруг вспомнив. Переключил на ОРТ или РТР. И смотрит порнуху... Вы же понимаете, что я не могу закрыть вот эти «окна» Москвы и Запада, через которые нас снабжают информацией». Раздражненьне узмацняецца тым, што «Москву и Запад» немагчыма зьнішчыць або закрыць прэзыдэнцкім указам або званком з прэзыдэнцкай адміністрацыі: да іх даводзіцца прыстасоўвацца самому рэжыму, ісьці на

можа стаць падставай для страты дзяржаўнасьці і незалежнасьці. Як растлумачыць такі парадокс? Адна з самых распаўсюджаных вэрсіяў - Лукашэнка дагэтуль пакідае магчымасьць для новага паходу ўва ўнутраную расейскую палітыку.

На першы погляд, зь лёгікай усё у парадку: курс на русіфікацыю «гістарычнай сьвядомасьці і сьветапогляду беларусаў» сьведчыць пра расейскія амбіцыі Лукашэнкі. Аднак насамрэч мы яшчэ раз сутыкаемся з рэцыдывам тэлеалёгіі залежнасьці беларускай палітыкі ад расейскіх велічынь у духу Зянона Пазьняка і Алега Манаева, калі лёгіка ўнутраных працэсаў у беларускай палітыцы тлумачыцца ўзьдзеяньнем вонкавых фактараў, перадусім злачынамі або цнотамі Масквы.

Перш-наперш трэба разабрацца з тэрмінамі: у культурнай сфэры адбываецца не актывізацыя русіфікацыі «гістарычнай сьвядомасьці і сьветапогляду беларусаў», а вяртаньне да савецкіх, каляніяльных па сваёй сутнасьці трактовак беларускай гісторыі і ўяўленьняў пра месца беларускай мовы і культуры ў грамадзтве, прычым у адрозьненьне ад часоў дапускаецца пэўны «гістарыяграфічны плюралізм»[8] і магчымасьць публічных дэбатаў пра месца беларушчыны ў грамадзтве[9].

сур'ёзную ўнутраную ломку. Беларусы толькі-толькі пачынаюць жыць у агульнанацыянальн інфармацыйнай прасторы, што выклікала вялікае хваляваньне нашых расейскамоўных інтэлектуалаў. Яно й зразумела: у такіх варунках даводзіцца прывыкаць да новай дыспазыцыі культурных роляў і значэньняў.

[7] Можна сказаць, што пытаньне закрыцьця Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту было вырашана яшчэ ў 2001

годзе, калі кіраваць Нацыянальнай акадэміяй навук быў пастаўлены Мясьніковіч, які хуценька навучыў акадэмікаў разьбірацца ў трох соснах. Само прызначэньне сымбалізавала пачатак палітычнай экспансіі на патэнцыйна неляяльныя асяродкі акадэмічнага жыцьця. Другі аспэкт нарошчваньня экспансіі - пачатак жорсткага цэнзураваньня зьместу навучальных праграм: прыкладна ў тым самым часе быў выцягнуты на паверзню жыцьця «бедолага Трощенок»

Калі мы прымаем гэты тэзыс, давядзецца сказаць і пра тое, што сэнс культурнай палітыкі Лукашэнкі ня зводзіцца да русіфікацыі і бяз гэтага даўно зрусіфікаванай ці, хутчэй, «ніякай» гістарычнай сьвядомасьці беларусаў, яе мэта — рэстаўрацыя культурнага статус-кво за кошт зьбярэжаных каляніяльна-савецкай спадчыны, пагружэньне нацыі ў дэтэрмінаваную гістарычнай амнэзіі шляхам цынічных маніпуляцыяў нацыянальнай гісторыяй і культурай (у экстрымнай форме ў выглядзе Лукашэнкі расейская мова становіцца «древним языком белорусов»: «*Наше «двуязычие» имеет древние корни и традиции*»). Інакш кажучы, стаўка гэтай палітыкі - не на іконную заваёва Крамля, а маніпуляваньне грамадзкай сьвядомасьцю і ўзмацненьне цынічнага праўладнага дыскурсу, палітыка мабілізацыя грамадзтва. У гэтым пункце культурная палітыка Лукашэнкі выяўляе поўную пераемнасьць з расейскай каляніяльнай палітыкай у беларускіх правінцыях: каляніяльную палітычную стабільнасьць і замарозіць разьвіцьцё нацыянальнай самасьвядомасьці, нацыянальную культурную спадчыну цэнзуруюць і фальсыфікуюць, а з гуманітарных навук па магчымасьці робяць прапаганду (адно цяпер гэта называецца «навучыць акадэмікаў разьбірацца ў трох соснах»).

Як і ў савецкія часы, кіраваць беларускім народам прасцей і надзейней, калі ён мае надзвычай плыткае і тэндэнцыйнае ўяўленьне пра самога сябе. Што, напрыклад, рабіла савецкая прапаганда з «нацыянальнымі прарокамі» Коласам і Купалам у 40-80-я гады ХХ стагодзьдзя? Мэтадычна ператварала іх у жыхароў камуністычнага пантэону, чыя творчасьць ідэальна супадала з дырэктывамі пануючае партыі. Так выбітныя адраджэнцы Купала і Колас, якія, калі б чалавечае жыцьцё доўжылася вечна, хадзілі б цяпер на апазыцыйныя мітынгі, дэманстрацыйна гаварылі б на беларускай мове і галасавалі б супраць Лукашэнкі, станавіліся антыподамі саміх сябе, а іх адпаведна праінтэрпрэтаваная творчасць прыводзіла ў рух машыну, якая зьнішчала беларуса з аблічча зямлі.

Цяпер пра своеасаблівыя плюсы культурнай палітыкі Лукашэнкі. Яна выпхнула за маргінэс тую частку

(выраз Лукашэнкаў).

8. Пар. Лукашэнкам: *«В умных и здравых традиционных структурах никто не сомневается, что Президент должен быть, как минимум, профессором. Принимают абитуриентов, как правило, профессора. И в университете иностранных студентов такая каша в голове, что нам, прошедшим основательную советскую школу и вуз, даже и вообразить невозможно»*. Як сьведчыць «Исторический выбор Беларуси», Лукашэнку

«адраджэнскай» інтэлігенцыі, якая бачыла адзінай крыніцай культурнай актыўнасьці дзяржаўную падтрымку. Яна паказала ўсю прастытуяванасьць «згодніцкай», пралукашэнкаўскай часткі інтэлігенцыі. Панаваньне прывучае праяўляць прыватную ініцыятыву ў культурнай сфэры: у прыватных руках апынуліся буйныя выдавецкія пэрыёдыка й важныя адукацыйныя праекты. Разгул чатырох і культурнай рэакцыі дае кожнаму сьвядомаму беларусу непасрэдна адчувальную матывацыю да арганічнай культурнай дзейнасьці, якая можа мець неспадзяваныя палітычныя наступствы.

Адмова Лукашэнкі ад клясычнай нацыяналістычнай праграмы выклікала выбух народнай падтрымкі і разам з тым абмежавала магчымасьці для палітычнай гульні ў доўгатэрміновай пэрспэктыве. Дзякуючы сваёй манеры вядзеньня палітыкі - чапляцца за бягучую падтрымку масаў, папулісцкай трактоўкай бягучых падзеяў - ён пазбаўляе панаднай магчымасьці выступаць рэспэктабэльным абаронцам вечных інтарэсаў нацыі. У нашай частцы Эўропы нацыя можа шмат сьцярпець у імя свайго нацыянальнага разьвіцьця, а палітычныя лідэры і сілы выкарыстоўваюць сымбалічны капітал нацыянальнай традыцыі для палітычных мэтаў. Гэта, дарэчы, добра разумелі расейскія камуністы і нямецкія нацысты. Каб мабілізаваць беларускія масы на сваю падтрымку і дабіцца іх ляяльнасьці да свайго рэжыму, яны эксплюатавалі нацыянальныя лёзунгі, улучна з абвяшчэньнем нацыянальнай квазідзяржаўнасьці. Аднак рэальная гісторыя Беларусі прайшла пад зусім іншымі знакамі, і пры канцы ХХ стагодзьдзя выкарыстаньне нацыянальнай сымболікі для мабілізацыі масаў успрымалася палітычнымі прагматыкамі тыпу Лукашэнкі як аджылая палітычная стратэгія. (Ня выключана, што Лукашэнкавы наступнікі такі пойдуць на подкуп нацыянальна сьвядомай часткі грамадзтва.)

І яшчэ крыху - пра сьляды расейскага каляніялізму ў культурнай карціне сьвету Лукашэнкі і культурна блізкіх яму палітыкаў ды інтэлектуалаў. Яны да апошняга верылі, што перацёк ідэяў, мадэляў і праграмаў разьвіцьця можа ісьці толькі з Масквы ў Менск, у лепшым выпадку ставіліся да

Лукашэнка ўпершыню ў кожнай з чатырох сваіх урачыстых прамоваў на сустрэчах зь менскімі студэнтамі падаваў сябе як «отличного знатока белорусского языка» («Я, конечно, отлично знаю белорусский язык. Надо просто каждый раз включиться, немного прочитать, чтобы снова свободно, без ошибок, не на трасянцы размаўляць з вамі»),

беларускай мовы як мясцовай экзотыкі, а ў горшым выпадку — цярпелі яе, былі перакананыя ў сваёй асаблівай цывілізацыйнай місіі (бо толькі расейская культура можа ўзняць культурны ўзровень Беларусі) і тэндэнцыйна ставіліся да беларускі нацыяналізм як ідэалёгію нацыянальнай выключнасьці і ксэнафобіі (пар. «*Национализм, межэтническая вражда в Беларуси не приживутся - народ не тот*»), што ствараль культурны і інтэлектуальны рух, якому нацыя абавязана сваімі асноўнымі культурнымі здабыткамі, Рэспубліка Беларусь - самім існаваньнем на палітычнай сьвету.

І ўсё-такі Лукашэнку цяжка папракнуць у культурнай несумленнасьці. У заблытанай і непасьлядоўнай дзяржаўнай палітыцы першай паловы 90-х у дачыненьні да нацыянальнай мовы й культуры было насамрэч значна больш палітычнага каварства. Ані каліва ня тоячыся, Лукашэнка рэгулярна і публічна паўтарае заклікі аб недапушчэньні беларускай мовы да шырокага грамадзкага ўжытку. Ён не адчувае згрызотаў сумленьня, бо выказвае сваю культурную праўду. Беларуская мова для яго, як і мільёнаў беларускіх грамадзян, - адзнака іншай культуры, ня-блізкае, не-інтымнае, ня-цёплае полюс адштурхоўваньня ў больш утульны і абжыты жыццёвы сьвет.

І закругляючы тэму аб пазытывах культурнай палітыкі Лукашэнкі. Яна з усёй выразнасьцю выявіла ўсю парнаграфічнасьць пашыраных самаўяўленьняў беларусаў пра саміх сябе як пра высокадухоўны, культурны, эўрапейскі, адукаваны і памяркоўны народ. Выявілася, што наша памяркоўнасьць - гэта ня што іншае, як канфармізм, пад маскай духоўнасьці хаваецца культурная дыстрафія, бяспамяцтва, дзікасьць і падатлівасьць на маніпуляцыі, што наш гістарычны час радыкальна не супадае з агульнаэўрапейскім, а культурныя паталёгіі нацыі настолькі сур'ёзныя, што наўрад ці будуць пераадоленыя на працягу некалькіх наступных пакаленьняў.

ЭКАНАМІЧНЫ КУРС

Для дэмакратычнага візіянэра, які дакладна ведае, што

трэба не даваў беларусізацыю можна і ўрэшце дапускаў нацыянальнай мовы ў ужытку, а тым ці іншым чынам у грамадзтве:

И любому ректору всегда говорю: не давите на людей. Экзамены сдавать, выбирай - белорусский или русский язык. Сдавай на любом языке. И поверьте, только так, не иначе, если суждено, мы придем к одному языку, который мы называем беларускай мовай. Но я бы очень хотел,

пасьпяховая трансфармацыя постсавецкіх эканомік чамусьці толькі ў лібэральным кірунку, эканамічная палітыка Лукашэнкі настолькі ненармальная, што ён пастаянна знаходзіцца ў прадчуваньні яго гаспадарчага краху больш за дзесяць год гэткія прароцтвы рэгулярна праслухоўваюцца ў прэсу і так жа рэгулярна не пацьвярджаюцца жыццём.

чтобы у нас только

страхкому русский

Лукашенко

работающим

нашем.

Як кажа Лукашэнка, любая палітыка заснавана на эканоміцы, таму эканамічная сфэра для беларускага рэжыму - аснова для яго палітычнай легітымацыі як для шырокай публікі, так і для яго функцыянэраў (напэўна, мноства іх на пытаньне «Чаму я працую на Лукашэнку?» адказваюць самім сабе: «Таму што ён сумленны і гаспадарлівы чалавек»). Калі ў абсягу культуры і гуманістыкі заахвочваецца кансэрвацыя каляніяльнай спадчыны, то ў гэтай галіне вітаецца арыгінальнасьць і недагматычнасьць. Гэты праграмны момант асабліва выразна відаць у «Историческом выборе Беларуси», калі параўнаць узаемасупярэчлівыя, па сутнасьці процілеглыя, Лукашэнкавы выказваньні на тэму «Ці была Беларусь ускраінай Расеі» перад студэнтамі эканамічнага ўнівэрсытэту і студэнтамі БДУ. Перад эканамістамі (с. 10):

Из всех постсоветских республик мы, Украина, Казахстан и другие, кроме России, не можем сегодня сказать, что мы имели какие-то определяющие традиции и опыт государственности. Да, известные элементы были. Но все основные атрибуты государства были сконцентрированы в Москве. Тогда и кнопки все нажимались, и команды давались к исполнению из Кремля. Мы были «окраиной», «провинцией», как хотите называйте, и, естественно, не имели того, что дожно иметь государство... Из нашей страны, наоборот, все уплывало. И до революции и после Октябрьской революции.

Але Лукашэнка ня быў бы Лукашэнкам, калі б ён ласьціва не палітызаваў моўнае пытаньня, ці, кажучы яго словамі, *не давяў бы им людей.* У той жа самы час у іншай студэнцкай аўдыторыі ён прамаўляў: *«русский язык я... никому не позволю оплевать и никому не позволю его устранить их нашей жизни. Это наше достояние, как и Победа*

Перад студэнтамі БДУ (с. 119):

Беларусь никогда не была «отсталой аграрной окраиной самодержавной России». Не буду из-за недостатка времени приводить конкретные факты, напоминать о нашем

возрождении, культурном, национальном возрождении, зазвучавшем в творчестве Франтишка Богушевича, Адама Гуриновича, позднее - Янки Купалы, Якуба Коласа, Максима Богдановича, других представителей белорусской интеллигенции. Все это характерно для этого периода.

Нацыянальная эканоміка - адна з асноваў нацыянальнай бясьпекі, зь якой зьвязаныя першачарговыя нацыянальныя інтарэсы. У імя іх абароны Лукашэнка любіць публічна пабыць нацыяналістам, русабофам, які ліе сваю жоўць на ўсходнюю суседку зь яе «дзікім гаспадараньнем» і «5-7 працэнтамі насельніцтва, што маюць сёньня ў руках асноўныя фінансавыя, грашовыя рэсурсы, калі ўсе астатнія ня маюць нічога», і нарэшце, палкім праэўрапейскіх ідэалістам, для якога ведіч заходніх эканомік адкрываецца на фоне расейскага «беспредела»:

Хотелось бы, чтобы экономика, социальная политика Беларуси была чем-то похожа на шведскую... на германскую, на бельгийскую. Все это ближе нам в социальном смысле. И мы откровенно об этом говорим. Мы на это ориентируемся, нас не устраивают бандитские отношения внутри общества.

Эканоміка - сфэра, у якой рэжым ня толькі шукае, але і знаходзіць легітымнасьць. Пра пэўную эфэктыўнасьць беларускай эканамічнай мадэлі гавораць і гаспадарчыя паказьнікі, і вынікі апытаньняў грамадзкай думкі. У нас добрая зьбіральнасьць падаткаў, пастаянны эканамічны рост, пачынаючы з 1996 году, адзін з найвышэйшых у СНД узроўняў аплаты працы. Спасярод усіх краін СНД толькі ў Беларусі і Расеі пазытыўнае сальда міграцыі. Беларусь - ці не адзіная краіна ў СНД, у якой эканамічная трансфармацыя не завяршылася стварэньнем фінансава-прамысловых алігархій. Выдаткі на нацыянальную адукацыю ў дзесяць разоў перавышаюць выдаткі на нацыянальную абарону, замежны доўг складае ўсяго 10 % ад ВУП, валютныя рэзэрвы Нацбанку набліжаюцца да 1 млрд даляраў ЗША, а залаты запас - да 20 тон. Паводле дзяржаўнай статыстыкі, у 2002 годзе даходы

Адзначаючы (Тым самым два «здабыткі» - перамога і расейская мова - залічаюцца у адзін паняцьцёвы шэраг надзеяў ашошняга стагодзьдзя, што супярэчыць абсурднай ідэі пра расейскую мову як «древний язык белорусов».)

грамадзянаў перавысілі даходы ў 1990 годзе на 30 %. Пра якаснае паляпшэньне матэрыяльнага становішча гавораць матэрыялы апытаньняў НІСЭПД: калі ў лістападзе 1994 году 9,5 % беларусаў заявілі, што іх дабрабыт палепшаў, 17,3 % адказалі, што ён не зьмяніўся, і 72,1 % - што пагоршаў, то ў сёлетнім чэрвені 7,0 % беларусаў меркавалі пра паляпшэньне свайго дабрабыту, на думку 64,0 %, ён не зьмяніўся і толькі 26,6 % адзначалі яго пагаршэньне.

Каб зразумець вытокі цяперашняй эканамічнай палітыкі, трэба зрабіць невялікі экскурс у блізкую гісторыю. Згодна з савецкай статыстыкай, пры канцы СССР Беларусь абганяла ўсе астатнія рэспублікі паводле тэмпаў эканамічнага росту: у 1970-1986 гадох рост ВУП на душу насельніцтва склаў 240 %. Аснову прамысловасьці ўтваралі рэсурсаёмістыя прамысловыя гіганты, арыентаваныя на агульнасаюзныя рынку збыту, а таксама на рынкі краінаў усходняга блёку. Экстэнсіўны эканамічны рост быў маніяй мясцовага ЦК і знаходзіў спагадлівы водгук у Маскве, дзе Беларусь цанілі за культурную стабільнасьць (або, інакш кажучы, максымальна магчымую дэбеларусізацыю грамадзкага жыцьця) і гераічнае партызанскае мінулае. Прамысловая палітыка зводзілася да павелічэньня вытворчасьці, залежнай ад агульнасаюзнага рынку сыравіны, і надзвычайнай канцэнтрацыі працоўных рэсурсаў у індустрыйных цэнтрах, што прыводзіла да істотных структурных перакосаў у разьвіцьці краіны. Яна распадалася на адносна разьвітыя гарады і эканамічна адсталую вёску, у якой рынак бытавых, камунальных і адміністрацыйных паслуг знаходзіўся ў зародкавым стане, таварна-грашовыя адносіны часта падмяняліся дакапіталістычнымі формамі абмену і адчуваўся хранічны дэфіцыт працоўнай сілы.

На пачатку 90-х т. зв. «разрыў гаспадарчых сувязяў», фінансавая лібэралізацыя і зьяўленьне мытных бар'ераў паставілі буйную прамысловасьць на край пагібелі. Узьніклы на касьцях савецкай эканомікі бізнэс прынёс тыпова «эўразійскую» культуру гаспадараньня, накіраваную на максымілізацыю прыбытку, мінімалізацыю падаткаў, подкуп фіскальных чыноўнікаў і супрацоўнікаў органаў правапарадку. Аслабленая дзяржава траціла манаполію на збор падаткаў і

ўжываньне гвалту. У краіне, у якой адсутнічалі сур'ёзныя сыравінныя рэсурсы, асноўныя капіталы ў той час зараблялі банальнымі фінансавымі махінацыямі і напаўкрымінальным ценявым бізнэсам.

Максымальна спрошчана асноўнымі прычынамі рэзкага зьніжэньня матэрыяльнага становішча насельніцтва ў той час можна назваць рэзкае зьмяншэньне вытворчасьці нацыянальнага багацьця і яго несправядлівае разьмеркаваньне карумпаваным дзяржапаратам, суіснаваньне якога з крыміналізаваным бізнэсам і выклікае зь цягам часу да жыцьця фэномэн алігархій. Збольшага за гэта плюс «за насаджэньне беларускай мовы» слабахарактарны прэм'ер Кебіч і паплаціўся сваёй палітычнай кар'ерай улетку 1994 году.

Асноўны сэнс эканамічнага экспэрымэнту Лукашэнкі палягаў у тым, што савецкую эканамічную базу ў Беларусі, несувымерную з рэальнымі эканамічнымі патрэбамі і эканамічнымі інтарэсамі нацыі («*Это наша беда, что мы имеем такую экономику... Она огромная, порой даже, я бы сказал, излишняя для нашего населения, нашего государства*»), можна ажывіць пры дапамозе камбінацыі неспалучальных на першы погляд захадаў - дзяржаўнага ўмяшаньня і рынкавай лібэралізацыі, замарожваньня адносін уласнасьці і захаваньня прыватнага сэктару (у адным Менску больш за 70 тыс. прыватных суб'ектаў гаспадараньня) у рэжыме бязьлітаснай барацьбы з карупцыяй і эканамічнай злачыннасьцю[10].

Праграмным момантам гэтага эканамічнага курсу была адмова ад палітыкі дапасаваньня да структурных патрабаванняў МВФ, у прыватнасьці ад масавай прыватызацыі[11], і ад уключэньня ў сусьветную капіталістычную сыстэму падзелу працы. Замест гэтага з мэтай выжываньня экспартаарыентаванай прамысловасьці стаўка была зроблена для стварэньне зоны рэгіянальнай эканамічнай кааперацыі супольнай мытнай прасторы з краінамі СНД, выкарыстаньне пераваг геаграфічнага становішча Беларусі («*возле России, где есть ресурсы, где в центре Европы через тебя все идет и движется*»). Сёньня каля 60 % выраблены беларускай эканомікай тавараў і паслугаў збываецца на замежных рынках, і

[10] Падмова ад форсіраванай прыватызацыі і ад лібэралізацыі цэнаўтварэньня існай эканомікі «Сацыяльна арыентаванай рынкавай эканомікі зь дзяржаўнымі мэханізмамі

у прыватнасьці, на расейскім рынку штогод прадаецца прадукцыі беларускага машынабудаваньня амаль на 1 млрд дал. ЗША, а траціну бюджэтных паступленьняў дае мытны камітэт.

Інструмэнтам эканамічнай палітыкі была падтрымка простымі дзяржаўнымі датацыямі і падатковымі крэдытамі дзяржаўнага сэктару эканомікі - прамысловасьці і буйнатаварнай сельскагаспадарчай вытворчасьці. Дзяржаўны кантроль над прамысловымі прадпрымствамі, калгасамі і саўгасамі выяўляўся таксама ў рэгуляваньні цэнаў, непасрэднай рэалізацыі ўрадавымі агенцыямі вырабленай прадукцыі, лабіяваньні ў Расеі нізкіх цэнаў на рэсурсы, найперш энэрганосьбіты, забесьпячэньні іх сыравінай і рынкамі збыту, пратэкцыянізьме і абмежаваньні канкурэнцыі з замежнымі вытворцамі («*Есть у нас руководитель Рахманько. Он за счет бюджета всунул в поезд «Минск-Москва» японские телевизоры. Сейчас вынимает и ставит «Горизонты*»). Практыка «бюракратычнага гандлю» і цэнтралізаваных закупак рэсурсаў для прамысловасьці яшчэ нядаўна працьвітала пры ўзаемаадносінах з Расеяй.

У каротка- і сярэднетэрміновай пэрспэктыве дамінаваньне дзяржаўнай уласнасьці прадухіліла каляпс рэальнага сэктару эканомікі і дазволіла пазьбегнуць выбуху беспрацоўя. Але захаваньне адміністрацыйнымі мэтадамі прамысловасьці на плаву і пакетаў сацыяльных гарантыяў для яе працаўнікоў ня вырашыла задачы павышэньня яе эканамічнай эфэктыўнасьці. Тым ня менш, імкненьне прыватнага бізнэсу хаваць свае рэальныя даходы і недаплачваць падаткі будзе, напэўна, і надалей стымуляваць нежаданьне ўладаў што-небудзь зьмяняць у гэтай галіне, у тым ліку перагледжваць практыку т. зв. «індывідуальнай прыватызацыі». Высьвятленьне адказу на пытаньне, якая форма ўласнасьці больш эфэктыўная ў беларускай эканоміцы, адкладаецца на заўтра[12].

Прысутнасьць дзяржавы ў эканоміцы праяўляецца таксама ў адміністрацыйным пераразьмеркаваньні каля 50 % нацыянальнага багацьця пры дапамозе бюджэтных трансфэртаў ад больш багатых да больш бедных. У краіне, дзе каля 40 %

дзяржаўнага і рынкавага мытнаваньня, рацыянальным разьвіцьцём прыватнага сэктару разам зь дзяржаўным». Рынкавыя мэханізмы эканамічнай мадэлі - стымуляваньне спажываньня і абароту, пэўная фінансавая лібэралізацыя, стымуляваньне павелічэньня колькасьці і якасьці паслуг (у тым ліку стварэньне прыватнага рынку адукацыйных і мэдычных паслугаў), барацьба з ільготамі, перавод дзяржапарату на кантрактную сыстэму («*Такого вы не имели в*

прадпрыемстваў - стратныя, гэта дазваляе выконваць папулісцкія абяцаньні ўладаў, але стрымлівае маты фінансавых рэцыпіентаў да разьвіцьця і мадэрнізацыі прыватным бізнэсам займаюцца, «лежачы» пад КДБ іншымі «праваахоўнымі» органамі, з згоды прэзыдэнцкай Адміністрацыі і публічнага выяўленьня ляяльнасьці прэзыдэнту. Яшчэ адно наступства дзяржаўнага інтэрвэнцыянізму - бюракратычная зарэгуляванасьць дынамічных рынкаў, уваход і прысутнасьць на якіх «адкатаў» рэгістрацыйным і кантрольным органам. гіпэртрафія дзяржаўнай прамысловасьці і курс на нязьменнасьць палітычнай адміністрацыі кансэрвуе працоўную этыку: функцыянэры ўсіх вэртыкаляў улады зьневажаюць людзей, будучы, як і прэзыдэнт, перакананымі ў сваёй беспакарнасьці і незаменнасьці.

Лукашэнкаў эканамічны экспэрымэнт давёў усім добра вядомую ісьціну: пры жорсткім аўтарытарызьме, як і пры любых іншых недэмакратычных формах кіраваньня - манархіі або тэакратыі, - можна дасягнуць эканамічнага ажыўленьня, калі пазьбегнуць узьнікненьня алігархічных кланаў, выкараняць карупцыю і прадухіляць масавую галечу. На мове здаровага розуму гэта называецца «Багацеюць там, дзе не крадуць». І наадварот, любая эканамічная трансфармацыя бессэнсоўная пры недзеяздольнасьці дзяржаўнага апарату і захопе дзяржавы алігархічнымі кланамі.

Які ж кошт заплаціла за гэты экспэрымэнт нацыя? Лукашэнкаў стыль кіраваньня прадугледжвае задавальненьне эканамічных інтарэсаў зьверху, а ня зьнізу. У выніку няздольнасьць нацыянальнай эканомікі задаволіць канкрэтны эканамічны інтэрас, а ня толькі той, які прызнаны і санкцыянаваны наверсе, выклікае ў ёй структурныя дыспрапорцыі. дзяржавай вызначэньне прыярытэтаў эканамічнай палітыкі - жытло, харчаваньне, экспарт - сымулюе задавальненьне ўсяго спэктру эканамічных інтарэсаў і, калі задумацца, толькі падкрэсьлівае няздольнасьць эканомікі апэратыўна і паўнавартасна задавальняць бягучы спажывецкі попыт. Інакш кажучы, пры такой мадэлі дзяржаўная эканоміка арыентуецца не на жывога спажыўца зь яго хуткаплыннымі прэфэрэнцыямі, а

советские времена») і г. д. Цалкам МУС або іншай праслоіць стратэгію на найбольш запатрабуе Нягледзячы рынкаў. А ўвогуле ідэалогіку, накіраваную на рост рэальнага сэктару эканомікі, вытворнасьць гаварачы і паслугаў пры нераэвледзе фінансавых спэкуляцыяў, праводзіць кожны эўрапейскі урад.

11 Падобна да беларускай мовы. Навязанае адмова ад т. зв. абвальнай прыватызацыі, «при которой

на пасярэдніка паміж спажыўцом і вытворцам у выпадку прэзыдэнта або яго ўпаўнаважаных, якія надзяляюцца кампэтэнцыяй улоўліваць тэндэнцыі на спажывецкім рынку і дыктаваць цэнавую палітыку. Акурат гэты перакос выкрыў сам Лукашэнка, гаворачы: «*Нас захлестнул товар с Запада и уже даже из России*». Дзіва што: нават на прыярытэтным для харчаваньня Беларусь імпартуе з Расеі цяпер больш таварaў, чым экспартуе.

Коштам «захаванасьці дзяржаўнай уласнасьці» аказваецца, кажучы словамі А. Л., «*такое воровство, когда только ленивый не тащит с завода, колхоза, совхоза*». У імя яе прэзыдэнт вымушаны асабіста праглядаць вынікі тэндэраў у Міністэрстве аховы здароўя, клапаціцца пра энэргазьберажэньне на асобных аб'ектах і пра расьлінаводзтва як галіну народнай гаспадаркі. Курс на захаваньне тэхналягічна адсталых прамысловых гігантаў савецкай пары паглыбляе прафэсійную дэкваліфікацыю іх абслуговага пэрсаналу, які аказваецца неўспрымальным да найноўшых тэхналягічных інавацыяў. Дадатковай платай за іх захаваньне становяцца непазбежна прысутныя зоны карупцыі на сутыку дзяржаўнай сыстэмы і прыватнага бізнэсу, сталая небясьпека страты яе кіраванасьці, гіпэртрафія кантрольных органаў і аўтаркічныя самазаклінаньні, што Беларусь можа выжываць толькі пры апоры на ўласныя сілы. У памнажэньні на хранічны інвэстыцыйны голад, старэньне і зношанасьць асноўных вытворчых фондаў і іншыя эканамічныя болькі гэта дало зафіксаваны сёлетняй справаздачай ААН аб чалавечым разьвіцьці вылет Беларусі з групы высакаразьвітых дзяржаваў у групу зь сярэднім узроўнем разьвіцьця. Паводле гэтага дакумэнту, Беларусь у сваім разьвіцьці адстае ад Эстоніі роўна ўдвая.

На пачатку дзесяцігодзьдзя ў Эўропе былі дзьве краіны з найніжэйшым узроўнем сацыяльнага расслаеньня - Беларусь і Славаччына. Параўнаньне абодвух палітычных рэжымаў сьведчыць пра канъюнктурны характар палітыкі сацыяльнага эгалітарызму і яе залежнасьць ад аўтарытарызму. У Беларусі ёй надыдзе канец, калі Аляксандра Лукашэнку напаткае лёс Уладзімера Мэчыяра.

подчеркивается ценностная ориентация и выбор в пользу
Запада и
уже даже из России».
А у кого такой сноровки больше? У тех, кто при власти, у их приближенных, родственников, сынков и прочих», утаўляе сабой важны элемэнт палітычнай ідэнтычнасьці рэжыму і ключавым месцам прапаганды. Захаванъне статус-кво ў галіне ўласнасьці дазваляе ня толькі захоўваць існы баланс «улады - уласнасьці», але і эфэктыўна

І нарэшце, пра найбольшую трагедыю эканамічнага развіцця Беларусі. Для мяне няма сумневу, што чым большымі аказваюцца (часта папяровыя) гаспадарчыя посьпехі, тым больш Лукашэнка ўпэўніваецца, што распад СССР тлумачыцца не эканамічнымі, а ідэалягічнымі і сымбалічнымі фактарамі, тым глыбей Беларусь акунаецца ў змрок палітычнай і культурнай рэакцыі.

Узровень сёньняшняга матэрыяльнага дабрабыту беларусаў наступства фактычна ўпершыню зробленага нацыяй дэмакратычнага выбару. Ён выклікаў зьмену кіраўнічых эліт, што перашкодзіла росту карупцыі і крадзяжу нацыянальнага багацьця. Новыя людзі пры ўладзе прынесьлі з сабой абвостранае пачуцьцё рэальнасьці і больш эфэктыўныя мэнэджэрскія здольнасьці. Інакш як подласьцю цяперашняга рэжыму не назавеш, што ён у духу расейскага дэспатызму разумее сябе як вянец тварэньня і ўсяляк замінае нармальнай дэмакратычнай ратацыі, пакідаючы новым элітам толькі выйсьце радыкальнага канфлікту з уладай.

Калі палітычная сыстэма прасякнутая недэмакратычнымі адносінамі, а ўладная эліта незацікаўленая ў сваім абнаўленьні, адбываецца татальнае ігнараваньне або замоўчваньне грамадзкіх інтарэсаў. Пры такой закрытасьці непазьбежная гіпэртрафія кантрольных органаў: Анатоль Тозік і прэзыдэнцкія кантралёры падмяняюць незалежную прэсу.

У эканоміцы, кіраваньні дзяржаўным апаратам, мытнай службе, нацыянальнай абароне, ахове здароўя і нават школьніцтве (афіцыйная забарона будаваць новыя больніцы і школы па-свойму лягічная), фіскальнай сыстэме і сумежных абсягах Лукашэнка прыняў шмат рацыянальных і ўзважаных рашэньняў. Пераемнасьць зь імі давядзецца захаваць яго наступнікам, якімі б яны ні былі. Вельмі, аднак, хочацца, каб яны ніколі больш не належалі да тыпу аднавымерных людзей, для якіх усё багацьце запатрабаваньняў нацыі зводзіцца да дасягненьня і ўтрыманьня элемэнтарных цывілізацыйных дабротаў.

трансляцыі
экспансіі
заключаецца
ў прыватнасьці
пераводу
нацыянальных
эканамічных
чэмпіенаў у
чужыя рукі.
Пар. «Я не
хочу, чтобы
завтра
«Коммунарка»
отошла к
«Бабаевке».

[12] Сам Лукашэнка, чыё мысьленьне прасякнутае узьвелічэньнем дзяржавы ў гегельянскім духу, тлумачыць эканамічныя посьпехі менавіта дзяржаўным інтэрвэнцыялізмам. Пар. *Я это протоптал собственными ногами. И*

видел, что там происходит. У нас еще не наступила та дикая конкурентная ситуация и среда, при которой начали бы жестко думать о том, как нам выжить. Она идет. Мужики, она идет сюда. И с Запада, и с Востока. Она уже вот стучится. Не просто стучится, она уже одной ногой здесь. Если вы этого не видите, то я уже вижу и чувствую. Я это уже ощущаю.

На яго думку, блякаваньне рашэньня *«пустить с*

молотка останавливающиеся, а точнее, остановленные уже самые важные и крупные предприятия» палепшыла эканамічную каньюнктуру ў краіне і павялічыла ў канцавым выніку іх рынкавы кошт. Гэты аргумэнт нельга адкідаць як дэмагагічны: ува Ўкраіне каляпс савецкіх прамысловых гігантаў прывёў да таго, што на пачатку XXI ст. адным з найбуйнейшых платнікаў падаткаў у Кіеве быў бровар «Оболонь», а гігант савецкага машынабудаваньня Львоўскі

аўтамабільны завод быў перададзены адной камэрцыйнай структуры за 5 млн дал. ЗША - кошт сярэдненькага менскага панэльнага дому. Адным з самых даходных відаў бізнэсу заставаліся фінансавыя махінацыі: ува Ўкраіне налічвалася амаль 200 банкаў, якія мелі значна больш супольнага зь фінансавымі кампаніямі, чымся з крэдытнымі ўстановамі.

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/1/12
[image]

Андрэй Казакевіч Беларуская сістэма: марфалогія, фізіялогія, генеалогія

АНДРЭЙ КАЗАКЕВІЧ палітоляг, рэдактар незарэгістраванага часопісу «Палітычная сфера». Апошняя публікацыя ў «ARCHE» – аналіз «Вялікае Княства Літоўскае як ідэалагічная рэальнасьць» (3/2003).

У каралеўстве Арльскім, епіскапстве Валянс, ёсць высокая вежа, якую называюць вежаю епіскапа Валянтэна, вежа гэтая ўночы не прымае вартавых. Калі нейкага вартавога прызначаць сцерагчы вежу ўночы, раніцай яго абавязкова знойдуць у даліне, што ля падножжа вежы. У даліну вартавыя переносяцца без пашкоджанняў, ніхто з іх не баіцца ўпасці, не баіцца, што яго аднясуць невядома куды, не адчувае, што яго нясуць, і не адчувае ўдару аб зямлю.

Гервасій Тыльберыйскі. Цуды Дофіне. XIII ст.

Выданне, якое абмяркоўваецца ў артыкуле:

А.Г. Лукашенко. *Исторический выбор Беларуси. Лекции, прочитанные в высших учебных заведениях г. Минска.* Минск: Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2003.

ЗАМЕСТ УВОДЗІНАЎ

Калі я быў студэнтам, для мяне, як і для маіх калегаў, невырашальнае метадалагічнае і практычнае пытанне было ў тым, чаму Беларусь была непапулярным аб'ектам даследавання, а рэжым, нягледзячы на жорсткую крытыку, не зазнаў канцэптуалізацыі. Як ён можа існаваць без ідэнтычнасці? З нейкай незразумелай прычыны Беларусь (беларуская сітуацыя) практычна не станавілася аб'ектам рэфлексіі ні ў межах акадэмічнай супольнасці, ні ў межах медыйнага поля. Воля да самаразумення ніколі, здаецца, не была адметнаю рысаю беларускага грамадства, а цікавасць да Беларусі амаль выключна трактавалася як праява «нацыяналістычных» настрояў. Сітуацыя пачала кардынальна мяняцца на зломе тысячагоддзяў, і з 2000-2001 году мы сапраўды можам казаць пра надыход іншай інтэлектуальнай і палітычнай сітуацыі. Колькасць даследаванняў, рэфлексій і аналітыкі беларускае сітуацыі значна ўзрасла. Павялічылася і колькасць замежных даследаванняў. Дастаткова прыгадаць, што за перыяд 1990-99 гадоў не выйшла ніводнае манаграфіі ці зборніка, які б быў прысвечаны выбарчым кампаніям – прэзідэнцкай 1994-га, парламенцкім 1990-га і 1995-га, мясцовым 1990-га, 1995-га і 1999-га. Затое пра парламенцкія выбары 2000-га вядома прынамсі адно выданне, пра прэзідэнцкія 2001-га – два, пра мясцовыя 2003-га – чатыры. Тэндэнцыя відавочная. Чамусьці толькі ў гэтыя гады пачалося стымуляванне даследавання Беларусі і таксама ўзрасла колькасць адпаведных дысертацый, нібыта Беларусь стала незалежнаю толькі ў 2000 годзе. Здаецца, толькі зусім нядаўна з'явілася адчуванне, што Беларусь ужо мае сучасную гісторыю, генеалогію і досвед, што гэта нешта большае, чым побытавая рэальнасць і тэрыторыя. Высвятленне прычынаў і перадумоваў гэтых працэсаў патрабуе асобнага даследавання, таму толькі пазначым гэты вельмі важны факт. Менавіта недзе з 2000-2001 года пачынаецца канцэптуалізацыя і самаапісанне рэжыму, якое ў 2003-м выліваецца ў спробы стварэння «ідэалогіі беларускай дзяржавы».

Вонкавае апісанне Беларусі звычайна зводзіцца да дастаткова дзіўных і нават наіўных схемаў. Для заходняй «аналітыкі» выходзячы

Беларусь – практычна заўседы «чорная дзірка», якая ўсходнюю суправаджаецца эпітэтамі «неразвітая», «аграрная» Еўропы. Не – так даўно, чытаючы рэкамендацыі для замежнікаў, якія вядомыя былі наведаць Беларусь у межах каляпалітычнага праекту, сустрэў фразу: «Беларусь – малацывілізаваная краіна. Інтэрнэт і мабільная сувязь з'явіліся тут толькі два гады таму». Такія ўяўленні тыповыя, на жаль, не толькі для каля-, але і для рэальных палітыкаў (як не згадаць славутага Л. Вульфа з яго «Inventing Eastern Europe»[1]). Для ўласна суседзяў мы альбо ў «метастазы сталінізму», альбо «страчаны савецкі раёў», а ўкраінец М. Рабчук звязаў беларускі рэжым з кур'ёзным савецка-крэольскім нацыяналізмам. Натуральна, што сваёй палітычнай і культурнай напоўненасцю Беларусь не ступае большасці краінаў Еўропы, беларускі рэжым не мае ніякага дачынення да «метастазаў сталінізму» ні паводле сваёй логікі, ні паводле генеалогіі, ні паводле палітычнае практыкі, а беларускі савецкі нацыяналізм не больш кур'ёзны за ўкраінскае «маларасійства». Вонкавае апісанне падаецца дзіўным, але больш дзіўны нізкі – да апошняга часу – узровень самаапісання, якое звычайна зводзіцца да інтэрпрэтацыі Беларусі як анамаліі альбо апраўдання (нармалізацыі) яе «спецыфічнага» развіцця.

Самаапісанне рэжыму 2002-2003 гадоў (найбольш яўна адлюстраванае ў корпусе тэкстаў «ідэалогіі беларускае дзяржавы» – падручнікі, праграма курсу для ВНУ, артыкулы, прамовы) – шмат у чым адказ на апісанне, якое ажыццяўляецца іншымі. Залежнасць корпусу самаапісання ад вонкавых «крытычных» дыскурсаў вельмі значная. Гэта, на маю думку, ёсць яшчэ адным сведчаннем таго, што самаапісанне – працэдура да пэўнай ступені вымушаная. «Беларуская мадэль» у пошуку самацэнтраванасці будуе сваю сутнасць на апазіцыях (мы – яны), што прыводзіць яе да перманентнага «памежнага» стану.

Апісанне рэжыму апазіцыйнай паліталогіяй у 2001-2003 гадах таксама зазнала змены. Павялічылася колькасць выданняў, прысвечаных рэжыму і А. Лукашэнку персанальна, з якіх дастаткова згадаць політэхналагічнае «Нашествие» і «Случайный президент» з прэтэнзіяй на сістэмнасць. Крыху

павялічваецца ўвага да аналізу ўладных структураў, паступова страчвае сваё значэнне «рэвалюцыйная парадыгма», якая вызнала аналіз феномену сучаснага рэжыму як a priori паталагічнага ды недаўгавечнага, што спалучалася з табуяваннем шэрагу тэмаў (кшталту фінансавання) і некрытычным стаўленнем да ўласнай пазіцыі.

Напэўна, можна канстатаваць надыход новай інтэлектуальнай сітуацыі – паступовы пераход ад «барацьбы» да «крытыкі» («апалагетыкі»), і гэта сімптаматычна, асабліва з улікам таго, што сама палітычная сітуацыя змянілася нязначна. Назіраецца імкненне да нармалізацыі даследчых і ідэалагічных дыскурсаў, а гэта значыць, што сацыяльныя змены, выкліканыя існаваннем сучаснага рэжыму, носяць дастаткова глыбокі культурны характар.

I. Лукашэнка і рэвалюцыя

Свядомасць 1994 году – гэта свядомасць крызісу, адчуванне якога пранікае ва ўсе сферы грамадства. Нават у пасланні Канстытуцыйнага суду за 1994 год, дакуменце, які паводле азначэння не павінен утрымліваць палітычных, а тым больш эканамічных ацэнак, адчуваецца дух заняпаду:

Рэспубліка Беларусь ... знаходзіцца сёння на адным з самых цяжкіх этапаў свайго развіцця. Нягледзячы на захады, якія прымае ўлада для выхаду з крызісу, эканамічная сітуацыя застаецца цяжкай. Падае ўзровень жыцця большасці насельніцтва. Высокімі тэмпамі расце злачыннасць... [2]

З гэтага ўрыўку відаць агульны настрой, які сістэмна выходзіў з газет, тэлебачання, палітычных партый і нават дзяржаўных органаў, адлюстроўваючы своеасаблівы «Zeitgeist».

Цяпер зрабілася нават модна настальгічна ўзгадваць пачатак 90-х як «залаты час» эканамічнай свабоды, нацыянальнага «адраджэння» і дэмакратыі, але перш за ўсё гэта быў час крызісу, які патрабаваў рэвалюцыі, рашучых і радыкальных

[2] Дыскурс Канстытуцыйнага суду цяпер зусім іншы і закранае выключна юрыдычныя

пераўтварэнняў. Рэвалюцыя з'яўляецца, перш за ўсё, палітычнай акцыяй (і толькі потым эканамічнай і культурнай), таму свой «рэвалюцыйны праект» мелі практычна ўсе палітычныя сілы таго часу. Кожны з такіх праектаў – «адраджэнне», «аднаўленне СССР», «радыкальныя ліберальныя рэформы» – галоўным сваім ворагам бачыў «існую рэальнасць», «парадак», «стан», працяты крызісам, сацыяльнымі хваробамі, інфляцыяй і беспрацоўем. Стан, што знаходзіў сваю апору ў «бюракратыі», «наменклатуры», «дзяржаўнай машыне», якая персаніфікавала карумпаванасць і несправядлівасць.

Галоўным рэзервам любой рэвалюцыі з'яўляюцца народныя масы. Апеляцыя да «народу/нацыі» і шчырая ўпэўненасць у тым, што ён падтрымае, была характэрная ў роўнай ступені як для БНФ і камуністаў, так і для альтэрнатыўных палітычных праектаў, адным з якіх і стаў А. Лукашэнка.

Бюракратыя. Логіка рэвалюцыі патрабуе асаблівага стаўлення да «бюракратыі». Дзяржаўны апарат – сродак эксплуатацыі, прастора карупцыі і неэфектыўнасці – варты толькі нянавісці. Сімвалічная дыстанцыя паміж «наменклатурай» і А. Лукашэнкам падкрэсліваецца і да гэтага часу, апошні спрабуе заняць пазіцыю над уладаю, што ў значнай ступені ўдаецца як у інфармацыйным полі праз СМІ[3], так і юрыдычна: у адпаведнасці са зменамі ў Канстытуцыю 1996 году прэзідэнт фармальна перастаў узначальваць выканаўчую ўладу і набыў статус «кіраўніка дзяржавы».

Пасля перамогі апарат дзяржавы становіцца адзіным [3] Дастаткова
утрымання сітуацыі, але дыстанцыя паміж першай а
«вертыкаллю» захоўваецца, мяжа паміж «я» і «яны» н
знікала, што дазваляе ў значнай ступені здымаць а
дзеянні ўраду і іншых выканаўцаў «даручэнняў» п

Ворагі. Рэвалюцыйны настрой новае ўлады 1994-1996 гадоў быў скіраваны таксама супраць праекту нацыянальнага «адраджэння» і «рэформаў» і арыентаваўся на «ўзнаўленне» палітычнай і культурнай спадчыны савецкага мінулага. Праект «адраджэння» вынішчаўся настолькі жорстка, наколькі гэта было магчыма (ён быў практычна цалкам выціснуты з палітычнага поля і ў значнай ступені – з культурнага). Гэты

праект успрымаўся як галоўная крыніца нестабільнасці 1996 году і пазнейшага часу, да таго ж падаўленне «вулічнага супрацьстаяння» арганічна спрыяла назапашванню палітычнага капіталу для экспансіі ў Расію. Толькі пачынаючы недзе з 2000 году на першае месца «ідэйнага» і палітычнага ворага выходзіць праект «ліберальных рэформаў»[4].

Экспансія. «Надыходзіць такі момант, калі тэрыторыя, якую занялі партызанскія атрады, робіцца цеснаю, яны пачынаюць раёны, дзе сутыкаюцца з буйнымі сіламі праціўніка. Тады атрады аб'ядноўваюцца, ствараючы маналітны фронт, і пераходзяць да пазіцыйнай вайны, якую звычайна вядзе рэгулярная армія» (*Чэ Гевара*). Маналітны фронт для набалі рэжыму, які імкнуўся да экспансіі, склаўся на ўсходзе. «Рэвалюцыйны пафас» захоплівае ідэалагічную інфраструктуру рэжыму, дзе пачынае дамінаваць панславізм, розныя варыянты панрусізму, неаславянафільства (з элементамі камуністычнай рыторыкі) і г. д. Адміністрацыя прэзідэнта апякуецца рознымі расійскімі нацыяналістычнымі групамі (у прыватнасці, радыкальным СС «Белая Русь»), а Расійскае нацыянальнае адзінства (РНЕ) толькі што не займаецца персанальнай аховаю прэзідэнта (ці нават займаецца).

У другой палове 90-х радыкальныя расійскія камуністы/нацыяналісты (як, напрыклад, Ампілаў) былі гатовыя проста-такі «памерці як салдаты» за рэжым Лукашэнкі, які ўвасабляў магчымасць зламаць створаную «заходнімі імперыялістамі» логіку развіцця падзей у свеце. Рэвалюцыйны праект А. Лукашэнкі разглядаўся менавіта як сімвал такога злому, а сам ён – як персона, якая выявіла волю да таго, каб не гуляць паводле звыклых палітычных правілаў, што раней маглі сабе дазволіць толькі лідэры непрызнаных дзяржаваў кшталту Прыднястроўя.

II. Пасля рэвалюцыі

Рэвалюцыйны настрой не можа захоўвацца доўга, калі не падмацоўваецца рэальнымі палітычнымі дасягненнямі, злом

[4] Пачынае ўжываць у фразеалогія «ліберальнага ядро», «лабалізацыі» і інш.

адбываецца недзе ў 1999-2000 гадах. Стратэгія экспансіі, кіраванай уласнай палітычнай місіяй (якая мела толькі частковы поспех у падпісанні шэрагу дамоваў, мемарандумаў ды пратаколаў з Расіяй), змяняецца стратэгіяй самазахавання і адаптацыі да неспрыяльнага і варожага асяроддзя. Імперская свядомасць, працятая палітычным «нонканфармізмам», прадчуваннем апакаліпсісу і падзеннем глабальнага (ці, прынамсі, рэгіянальнага) парадку, выціскаецца тактыкай кантэкстуалізацыі і лакалізацыі рэжыму. Пошук *свайго* месца змяняецца яго агароджваннем. На змену дыскурсу экспансіі прыходзіць дыскурс кантэкстуалізацыі, а рыторыцы «рэвалюцыі» – фразеалогія «традыцыі». Унутраны вораг саступае месца вонкаваму, і нават апазіцыя перастае ўспрымацца як групы «дэструктыўных элементаў» ды нацыяналістаў і ператвараецца ў «купку марыянетак, кіраваных Захадам», што далёка не адно і тое ж.

Новая сітуацыя спрыяла сістэмнай каланізацыі рэжымам палітычнай, інфармацыйнай, сацыяльнай і нават культурнай прасторы, якая ўсё больш пачынала адпавядаць структурам беларускай улады. Усю першую палову 90-х палітычная і культурная «партызанка» магла цалкам захоўваць сваю незалежнасць і сацыяльную значнасць. Безліч інтэлектуальных, літаратурных, палітычных і грамадскіх ініцыятываў узнікалі, жылі і паміралі ў паралельным «афіцыйнаму» свеце таго, што называлі «незалежнай беларускай супольнасцю», «апазіцыяй» і г. д. Дастаткова згадаць існаванне пасля рэферэндуму 1996 году паралельных заканадаўчых і выканаўчых органаў: Вярхоўны Савет XIII склікання, Нацыянальны выканаўчы камітэт, а былі яшчэ часопісы, газеты, нефармальныя суполкі.

Паступова, аднак, «незалежная прастора» каланізуецца сацыяльнымі практыкамі новага рэжыму і звужаецца да мінімуму. Пасля 2001 году «інстытуцыялізацыя» (уключэнне ў існуючыя структуры) увогуле робіцца стратэгічнай мэтай практычна ўсіх палітычных і культурных праектаў, што значыла не толькі аднаўленне супрацоўніцтва з дзяржаўнымі інстытуцыямі, але і вяртанне ў іх (калі гэта было магчымым) для атрымання большай прасторы для дзейнасці, у тым ліку для кар'ернага росту.

«Незалежная беларуская супольнасць» распусцілася, «апазіцыйныя» палітолагі, філосафы, літаратары, юрысты ды эканамісты сталі імкнуцца быць проста кваліфікаванымі палітолагамі, філосафамі, літаратарамі, юрыстамі ды эканамістамі, без жорсткае палітычнае арыентацыі. Зноў стала важна мець права выступаць ад імя «структураў» (калі эканаміст, то ад імя Інстытуту эканомікі, калі юрыст, то ад калегіі адвакатаў ці БДУ і г. д.) ды падпарадкоўвацца правілам карпаратыўнай гульні.

Адпаведна змяніліся і сродкі палітычнае барацьбы – масавыя акцыі пратэсту («супраціву») 1996-99 гадоў саступілі месца цалкам сістэмнай практыцы ўдзелу ў выбарчых кампаніях[5] . Настала тое, што можна назваць «смерцю ідэяў». Ідэі канчаткова саступілі месца тэхніцы/тэхналогіям. Палітычныя суб'екты ўсё больш увагі надаюць абмеркаванню тэхналогій, а абмеркаванне ідэяў, нават у «ідэйных» партыях, даўно стала другасным. Яшчэ 4-5 гадоў таму сітуацыя была зусім іншая. Цяпер сама перамога над рэжымам успрымаецца выключна як тэхналагічны/тэхнакратычны пераварот пры актыўным удзеле замежнапалітычнага фактару. Ці не значыць гэта, што *ідэя* гэтага рэжыму (як сукупнасць сацыяльных практык) збольшага прынятая ўдзельнікамі палітычнай гульні?

Арыентацыя на стварэнне паралельных грамадскіх структураў ператварылася, паводле выразу функцыянера АБСЕ, у «пашырэнне формаў супрацоўніцтва з афіцыйнымі ўладамі» і пошуку там прымальных кантактаў. Нават сярод апазіцыйных палітыкаў цяпер больш модна ганарыцца тым, што маюць «знаёмых у Радзе Міністраў», чым уласна створанай парламенцкіх змаганнем з рэжымам з канца 80-х.

[5] Сімвалічнай структурай, яхой тут уладам лічыць кампанію НДА ці выбараў у 2000 г.

Больш за тое, былі каланізаваныя, здавалася б, найбольш актыўныя праціўнікі рэжыму. У другой палове 90-х радыкальныя нацыянальныя арганізацыі выяўлялі сваю шчырую нянавісць да прадстаўнікоў улады і асабліва праваахоўных органаў (якія сімвалізавалі «ворага/акупантаў»). Сёння служба ў войску ці МУС для сяброў такіх арганізацыяў лічыцца карыснай і толькі падвышае аўтарытэт у межах арганізацыі.

Сістэма ўлады, створаная ў 1994-1997 гадах, здолела інтэграваць значную частку «нелаяльнай» палітычнай і культурнай прасторы. Рэйтынг *прэзідэнта* можа падаць, але захоўваецца вялікая маса людзей, якія падтрымліваюць *рэжым* як сукупнасць зразумелых і звыклых сацыяльных практык.

Імкненне да аўтаноміі ад рэжыму не вытрымала ціску часу і змянілася жаданнем пранікнуць у «сістэму». Гэта ўспрымаецца як адзіны сродак пазбегнуць сацыяльнай і палітычнай маргіналізацыі.

Усё вартае ўвагі патрабуе інстытуцыяналізацыі – друкавання ў дзяржаўных выданнях, прысутнасці ў СМІ, працы ў «інстытутах», «органах», «цэнтрах». Стасункі з НДА ўсё часцей выклікаюць агіду (ці адчуванне несур'ёзнасці), а сама «незалежная» сістэма НДА канчаткова пачала асацыявацца не са свабодаю, але з маргінальнасцю і бессэнсоўным марнаваннем грошай.

Нельга сказаць, што інкарпарацыя адбылася ў выніку рэпрэсій ці ціску, пераважна гэта вынік *ізаляцыі* і, як наступства, маргіналізацыі паралельных практык, якія былі няздольныя забяспечыць самарэалізацыю і сацыяльную легітымнасць па-за межамі вузкага кола «ангажаваных».

III. «Усходнееўрапейская альтэрнатыва» і «global world»

Яшчэ ў 60-я гады Еўропа была кангламератам разнародных палітычных праектаў. Гішпанія знаходзілася пад кіраваннем Франка, які не прымаў да канца правілаў еўрапейскай палітычнай гульні. Партугалія стварала ў межах сваёй імперыі шматрасавую «луза-трапіканскую цывілізацыю» і сацыяльна-палітычную сістэму на прынцыпах карпаратывізму. Усходняя і Цэнтральная Еўропа ўтваралі адзіны «савецкі блок», «другі свет», які супрацьстаяў «першаму свету» як сістэме. Свой асаблівы шлях пэўны час спрабавалі абвясціць Грэцыя і Югаславія, нарэшце, камуністычная Албанія праводзіла палітыку ізаляцыі ад Еўропы, надаючы вялікую ўвагу

радыкальнаму супрацоўніцтву з Кітаем. Францыя, Італія, Заходняя Нямеччына і Вялікабрытанія толькі пачыналі фармаваць інтэграцыйны цэнтр будучага ЕС.

Еўрапейская прастора (дакладней, прастора таго, што цяпер прынята называць «Вялікай Еўропай») была месцам развіцця дастатковай колькасці розных – непадобных – палітычных праектаў.

Аднак з пачатку 70-х гэтыя аўтаномныя палітычныя праекты паступова саступаюць месца «цэнтральнаму» праекту еўрапейскай інтэграцыі, ужо праз 20 гадоў (у канцы 80-х – пачатку 90-х) гэты праект атрымлівае татальную перамогу. Палітычны ландшафт робіцца як ніколі раней аднастайным. Усе «альтэрнатыўныя» рэжымы зазналі калапс.

З падзеннем «сістэмы сацыялізму» ў 1989-91 гадах Еўропа стала адзіным палітычных праектам, які захапіў думкі большасці насельніцтва і элітаў, значна пашырыўшы свой уплыў на Ўсход і стаўшы палітычнай і культурнай мэтай новай усходнееўрапейскай палітыкі, аб'ектам жаданняў і чаканняў.

Узнікненне маналітнага еўрапейскага ландшафту паставіла ўсе магчымыя «альтэрнатывы» (як правыя, так і левыя) у пазіцыю анклаваў, апазіцыйных (часам маргінальных) палітычных партый, інтэлектуальных групаў, інстытуцыяў і, часам, краінаў. Гэтыя варыянты супраціву мелі зусім розную прыроду і аснову, але выкарыстоўвалі падобную стратэгію выпрацоўкі ўласных правілаў гульні і парушэння прынцыпаў паліткарэктнасці ў міжнародных дачыненнях рэгіёну. Такія анклавы, маючы савецкі ці нацыянальны грунт, выступалі і выступаюць як апазіцыя да палітычнага ліберальнага праекту глабалізацыі, але звычайна не ставяць сябе па-за еўрапейскім кантэкстам.

Трыумф «Вялікай Еўропы», такім чынам, не быў поўным і пакінуў пасля сябе анклавы нестабільнасці ў пытанні геапалітычнага выбару, найбольш трывалымі з якіх сталі Сербія і Беларусь (хоць можна было б дадаць Харватыю, Боснію ды Прыднястроўе). Пачуццё салідарнасці з Сербіяй (да 2000 году) беларускі рэжым меў не столькі праз яе прыналежнасць да славянскага свету, колькі дзякуючы яе «нестандартнаму»

рэжыму. У 2000 годзе рэжым С. Мілошавіча ў Сербіі паў, хоць да палітычнай стабілізацыі ў гэтай краіне яшчэ далёка. Беларусь засталася, здаецца, адзінай краінай, якая не толькі не пакінула сваёй выбранай палітычнай стратэгіі, але і ўзмацніла «альтэрнатыўныя» элементы ў сваёй ідэалогіі, «пабудаванай не на замежных аднатыпных праектах, а з апорай на гістарычны досвед нашага народу»[6].

Беларусь дазваляе сабе парушаць многія правілы экаНомічнай і палітыкі, якія былі прызнаныя за аксіёмы для рэгіёну, ігнаруе ўласным досведам сцвярджае адзін з лозунгаў антыідэалогіі – «свет можа быць іншым» (што, праўда, не значыць, што ён У гэтым беларускі рэжым, калі б меў дастаткова добрых, пазіцыянаваў бы сябе як не зусім еўрапейскі, мог бы супрацьпаставіць прыцягальным сімвалам для еўрапейскае палітычнае альтэрнатывы – як правай, так і левай[7]. Беларускія ўлады, могуць дазволіць сабе казаць тое, пра што іншыя краіны рэгіёну маўчаць, – адкрыта выступаць супраць ідэі «еднага мільярда» і аднапалярнага свету. Гаварыць пра амерыканізацыю як пагрозу для ўсіх краінаў і, больш за тое, сур'ёзна абмяркоўваць тэму «ліберальнага тэрору» ў сучасным свеце, называць ЗША ці Нямеччыну «сучаснымі імперыямі» Нездарма некаторыя афіцыйныя асобы Еўропы з захапленнем заявілі пра неабходнасць супрацоўніцтва з Беларуссю, пасля таго як афіцыйныя улады краіны выступілі з радыкальным асуджэннем аперацыі ЗША ў Іраку. Іншыя краіны Еўропы не маглі сабе такога дазволіць. Але назва чаны прыклад – хутчэй выключэнне. Паводле сваёй замежнапалітычны рэпрэзентацыі Беларусь працягвае заставацца нікому не зразумелай «шэрай зонай», ці «чорнай дзіркай», нікому не цікавай тэрыторыяй, якую цалкам можна аддаць пад «пратэктарат» Расіі[8].

Ідэалагічны канструкт «беларускасць» быў створаны на постсавецкай прасторы, дзе Беларусь (слабліва сярод розных культу, нацыяналізму. Што тычыцца астатняга свету, то – на шчасце ці на жаль – Беларусь не мела і не мае практычна ніякай рэдамасці для заходняй мяжой[9

цывілізацыя замяняецца ўсходнееўрапейскай, для якой Беларусь і павінна выконваць сваю культурную і каштоўнасную місію[10].

Колькі беларускі анклаў можа трываць – сказаць цяжка. Многія краіны (Партугалія, Гішпанія і г. д.) захоўвалі свае асаблівыя палітычныя сістэмы з практыкамі карпаратывізму да смерці сваіх сімвалічных цэнтраў – Франка і Салазара. Падаецца, што такія сістэмы (пакуль захоўваецца сімвалічны цэнтр) могуць існаваць даволі доўга, калі выключыць вонкавую інтэрвенцыю.

IV. Беларуская мадэль развіцця

> Я не хачу пераконваць вас у тым, што гэта абсалютна правільны курс, я лічу, што ён правільны, улічваючы ўсе абставіны.
>
> А. Лукашэнка

«Беларуская мадэль», «беларускі шлях», «выбар», «сістэма» – лінгвістычныя сродкі самаапісання беларускай сістэмы, якія павінны перадаць аўтаномнасць, самацэнтраванасць і альтэрнатыўнасць тутэйшай эканамічнай і палітычнай рэальнасці. Гэтая праца будуецца вакол вялікай колькасці апазіцый, выстаўленых, як падаецца, на супрацьпастаўленні «ўласнай мадэлі» і «вонкавага стандарту», «шляху» і «загаду», «выбару» і «прымусу». Першае ўяўляе сабой нешта натуральнае, арганічнае, годнае і свабоднае, другое ж – механічнае, прымусовае ды канфармісцкае. Працэс такой канцэптуалізацыі, аднак, пакуль нельга лічыць завершаным.

Феномен «кантэкстуалізацыі» мыслення ўлады (прывязванне да праблемаў «тутэйшага быцця», апісанне сваёй асаблівасці, пошук свайго цэнтру «тут» і фармуляванне ментальных межаў не толькі на захадзе, але і на ўсходзе), на жаль, быў практычна не заўважаны і не адрэфлексаваны палітызаванай супольнасцю.

А тым часам само вынясенне пытання пра «беларускую мадэль развіцця» значыць нешта большае, чым змена рыторыкі, а менавіта – што ў рэжыму з'яўляецца гісторыя, дакладней, генеалогія, у тым ліку і інтэлектуальная[11].

Апісанне «беларускай мадэлі развіцця» патрабуе дэлегітымізацыі эканамічнай тэорыі, таму крытычнае стаўленне да ліберальных «тэарэтычных схемаў» (якія вызначаюцца як «прафанацыя» і «прымітыўная прапаганда») выглядае вельмі арганічна на фоне дыскусій пра анамальнасць, няправільнасць і немагчымасць існавання беларускай эканомікі з пункту гледжання ліберальнай эканамічнай ідэалогіі, што спалучаецца з сімвалічным дыскутаваннем з МВФ, які персаніфікуе ў лепшым выпадку бяздумную, у горшым – наўмысна разбуральную эканамічную палітыку. Гэтая дазваляе «адрывацца ад нашай «грэшнай зямлі», забываць пра тыя першапачатковыя ўмовы, якія «абмяжоўваюць магчымасці».

Кантэкст, нацыянальныя і эканамічныя асаблівасці, спецыфічныя ўмовы развіцця «беларускай мадэлі» з'яўляюцца прычынай таго, што нас некарэктна параўноўваць з Захадам і іншымі «імперыямі» – бо мы толькі пачынаем складвацца як [13]. Дастаткова будзе нагадаць, што ў 1995 г. схемы, што дае магчымасці для эканамічнай альтэрнатывы. Натуральна, што ў такой рыторыцы няцяжка знайсці палітычную аснову (апраўданне status quo), але гэтае ўсведамленне не робіць прапанаваныя з замежжа тэарэтычныя схемы выключна «навуковымі».

Сутыкненне існавання беларускага рэжыму з «логікай» эканамічнай тэорыі ў тым сэнсе, як яе падавала мясцовая «эканамічная навука», заслугоўвае асаблівага разгляду, таму мы не будзем спыняцца на ім падрабязна. Зазначу толькі, што першы апакаліпсіс чакалі яшчэ ў 1995 годзе, а потым – як эканамісты-практыкі, так і ліберальныя тэарэтыкі – бясконца пераносілі яго на паўгоду, пакуль вера ў магчымы «крызіс» (якая, нягледзячы на «навуковую» рыторыку, была цалкам

[11] З'яўленне ў 1994 ці 1998 годзе канцэпцыі «Беларускага дзіва», што развіцця» не тэмаю нумар адзін для дыскурсу ўладых.

[13] Дастаткова будзе нагадаць, што ў 1995 г.

ірацыянальнай) не згасла.

V. Самаразуменне і эвалюцыя сістэмы

> *Паверце, у нас унікальная краіна, я да прэзідэнцтва далёка не ўсё ведаў пра яе ўнікальнасць.*
>
> А. Лукашэнка

У падваліны «беларускай мадэлі» пакладзена яшчэ адна апазіцыя, якая павінна выяўляць яе выразную адрознасць ад усіх краінаў Цэнтральна-Ўсходняй Еўропы. «Крызіс», «радыкальныя трансфармацыі», «шокавая тэрапія», «абвальная прыватызацыя» як неад'емная частка палітычнага і эканамічнага ландшафту рэгіёну супрацьпастаўляецца «стабільнасці», «удасканальванню», «асцярожнасці і акуратнасці». Замест слова «рэформа» – цэнтральнага панятку ліберальнага эканамічнага праекту для Ўсходняй Еўропы, які «скампраметаваў сябе ў пачатку 90-х гадоў», прапануецца ўжываць «удасканальванне». «Удасканальванне» рэпрэзентуе праект мадэрнізацыі, супрацьлеглы праекту «рэформаў» («катастрафічнаму шляху абвальных рэформаў») паводле плану МВФ, ЕБРР, рэкамендацый «заходніх» экспертаў і аналітыкаў, «непрымальных для беларускага народу».

Развіццё павінна быць пераймальным, без «кардынальнае ломкі» існай сістэмы і «рэвалюцыйных эксперыментаў», павінна ўлічваць «менталітэт беларускага народа, яго гісторыю і традыцыі». Развіццё не павінна грунтавацца на нечым «чужым», неўкарэненым у эканамічную і сацыяльную рэальнасць, нават калі яно «навукова» абгрунтавана і легітымізавана «сусветным досведам». Натуральна, што для ўлады «сусветны досвед» не значыць «універсальны» і прыдатны для беларускай рэальнасці. Дарэчы, гэтая пазіцыя мае пэўную рацыю.

Трэба «стаць на плечы» генерацыі, якая стварыла існае грамадства. «Мы ішлі і ідзём ад таго, што ў нас ёсць... мы

нічога не ламалі, не раскідвалі і не знішчалі». «Мы выбралі эвалюцыйны шлях развіцця».

Навідавоку тэндэнцыя да адаптацыі «сістэмай» лексікі і Weltanschauung еўрапейскага кансерватызму. На адным з семінараў для кіраўнічага корпусу ў красавіку 2003 году элементы ідэалогіі кансерватызму былі вызначаны як «традыцыйна характэрныя для беларусаў», што і «сёння не трацяць сваёй актуальнасці». Гэта можна лічыць яшчэ адным сродкам канцэптуалізацыі палітычнага і эканамічнага status quo.

Сістэма, створаная ў выніку «кансерватыўнае» палітыкі, павінна мець не толькі асаблівасці ў стратэгіі свайго развіцця, але і адпаведную структуру. Адметнымі рысамі беларускай мадэлі (у адпаведнасці з самаапісаннем) выступаюць *адсутнасць алігархічных кланаў*, што забяспечваецца стварэннем моцна цэнтралізаванай улады. З гэтым, збольшага, можна пагадзіцца, асабліва калі ўлічваць сітуацыю ў суседніх краінах. Трэба згадаць, што ў Беларусі і да фармавання сучаснага рэжыму не склалася алігархічная сістэма. Трэба таксама браць пад увагу працэсы ценявой прыватызацыі, якая адбываецца цяпер.

Адсутнасць крыміналу ва ўладзе і нізкі ўзровень карупцыі. Ва ўмовах канцэнтрацыі ўлады палітычныя праекты як традыцыйнага, так і новага крыміналітэту немагчымыя. Манаполію на ўладу маюць дзяржаўныя службоўцы, дырэктары дзяржаўных прадпрыемстваў і зрэдку «бізнес», калі мае надзейны бюракратычны «дах».

«Наша мадэль не прывяла да *масавага беспрацоўя* і збяднення людзей». У прынцыпе, узровень беспрацоўя ў Беларусі ніжэйшы за 2-3 %, што ёсць нізкім паказчыкам для Еўропы і пэўным сацыяльным дасягненнем. Хаця наколькі гэта эканамічна эфектыўна – пытанне адкрытае.

Сярод іншых прыкметаў беларускай мадэлі звычайна называецца прадухіленне *дэіндустрыялізацыі,* нізкі ўзровень *замежнай запазычанасці*, адносна высокі ўзровень *сацыяльнае абароны*[13].

VI. Правілы ўлады

Нават маючы ўладара, і *і* дзі *не могуць быць параўнанымі з* ся*, пазбаўленым уладара*[14].

Канфуцый. Лунь Юй. Раздз. 3, 3

Палітычныя аналітыкі любяць не толькі капіяваць еўрапейскія тэорыі ды канцэпцыі, але і надаваць палітычнаму полю зноў для іх тып рацыянальнасці, які рэдка супадае з логікай мыслення рэжыму.

Большасць аналітыкаў няўхільна эвалюцыянуе да fast thinking, як гэта вызначыў Бурдзье, гэта значыць да простага выклад – не тыпізаваныя хлапёцы – зоўнаў і бо сцягнуць, страўдзя – ны перакананні сакаіцтва Кітаю, адпаведна, азначае дыктат моды і банальных фразаў у вызначэнні палітычнае сітуацыі, што спалучаецца з некрытычным стаўленнем да сваёй пазіцыі і абавязковай (сама)цэнзурай. Сапраўды, аналітык практычна не можа абмяркоўваць шэраг табуяваных тэмаў, напрыклад фінансаванне палітычных структураў, хоць гэта можа цалкам прадвызначаць развіццё палітычнае сітуацыі. Абыходзячы табуяваныя тэмы, ён можа вельмі доўга разважаць пра менталітэт, каштоўнасці, эканамічныя законы ды «актыўнасць масаў», але не кранаць сутнасці палітычнага працэсу.

Вельмі істотныя рэчы застаюцца па-за ўвагай, і асабліва – уладныя адносіны (правілы ўлады) у Беларусі[15], якія вельмі далёкія ад рацыянальнасці, прыпісванай ім «звонку», і ад тыпізаваных у СМІ і свядомасці вобразаў.

Улада – феномен сацыяльнай укарэненасці, які адначасова стымулюе і ўласнае спрашчэнне (апазіцыйная аналітыка) і сакралізацыю (афіцыйная прапаганда) сваіх праяваў. Спрашчэнне занадта простае, а сакралізацыя занадта

[13] Прыярытэты для дзяржавы вызначаны папулісцкія – экспарт, жытло і прадуктовыя тавары. Калі пераінтэрпрэтаваць, то ўрамейскія хлопцы (сацыяльная абарона) і сельская гаспадарка.

[14] Ці дзі – не тыпізаваныя хлапёцы – зоўнаў і бо сцягнуць, страўдзя – ны перакананні сакаіцтва Кітаю, адпаведна, азначае

[15] Мы дыктуем не ўласнае спрашчэнне і сакралізацыю. Спрашчэнне занадта простае, а сакралізацыя занадта

складаная, каб быць рэальнасцю. Улада – гэта адносіны паміж тым, хто яе мае, і падначаленым. Падначалены актыўна ўплывае на паводзіны гаспадара.

бінарнага

ШТО ТАКОЕ ПРЭЗІДЭНТ

«Things fall apart; the centre cannot hold; Mere anarchy is loosed upon the world»[16] . У адрозненне ад большасці аналітыкаў, палітолагаў ды журналістаў, я не схільны перабольшваць прэзідэнта ў палітычна-бюракратычнай сістэме новага ўзору. Ён утварае цэнтр, але не столькі цэнтр «рэальнай палітыкі», колькі сімвалічную/арганізацыйную аснову яе легітымізацыі, якой пачынаецца выбудоўванне структуры ўладных дачыненняў. Пытанне пра тое, наколькі прэзідэнт *вызначае* палітыку дзяржавы, застаецца адкрытым і далёка не рытарычным. Не выклікае сумневу, што ён прымае рашэнні, уплывае на іх выкананне, але ці *вызначае* ён палітыку? Рашэнні прымаюцца на падставе інфармацыі і аналітыкі, а адзінаю крыніцаю іх для прэзідэнта з'яўляецца «сістэма», якая канструюе інфармацыйную рэальнасць і робіць гэтую аналітыку (часта дэкларуецца, што гэтым перш за ўсё займаюцца КДК і служба бяспекі, але гэтым спіс не заканчваецца). Прарыў да рэальнасці практычна немагчымы ды і непатрэбны. Практыка «сістэмы» самадастатковая. Прэзідэнту можа здавацца, што ён займаецца ўсім, але гэта прыкмета зусім адваротнага, свайго роду «псіхалагічнай інфляцыі» (К. Юнг)[17] – пашырэння індывідуальнай свядомасці ды ідэнтычнасці на сацыяльныя інстытуты і функцыі. «Мае грошы», «мая дзяржава», «я сваю краіну»… – дамінаванне падобнай рыторыкі ў выступах прэзідэнта з'яўляецца прыкметай менавіта такога феномену. Псіхалагічная інфляцыя – ні ў якім разе не паталогія, а асаблівы стыль мыслення, які, акрамя шмат чаго іншага, выяўляе пэўную страту пачуцця рэальнасці. *Погляды сістэмы робяцца ўласнымі поглядамі*, што ў асяроддзі сістэмы непазбежна, і такіх прыкладаў у гісторыі сучаснае Беларусі больш чым дастаткова.

У адміністрацыйных дачыненнях паступова ўзрастае інфляцыя дэлегавання функцый, спецыялізацыя, агульная «стомленасць» цэнтру і зніжэнне ўвагі да дэталяў, якая ўсё больш

[16] «Усё ідзе ўкасякі, цэнтр не ўтрымлівае, на свет выпушчана анархія» (Уільям Батлер Ейці).

[17] Інфляцыя – павелічэнне колькасці чаго-небудзь.

на стасунках з невялікім колам інфармацыйных крыніцаў. Галоўнае, што вылучае прэзідэнта ад іншых структурай рэжыму, – адсутнасць страху палітычнай ці нейкай іншай адказнасці, адсутнасць пагрозы «звальнення», «адстаўкі» і г. д., што вельмі моцна ўплывае на дзейнасць *усіх астатніх*. Гэта дазваляе ігнараваць звыклыя для бюракратычнай сістэмы імкненні ўхіліцца ад персаніфікацыі сваіх функцый і дэцэнтралізацыі адказнасці і займаць сімвалічную «цэнтральную» пазіцыю ў палітычным ладзе.

Тое, што «цэнтр» рэжыму з'яўляецца пераважна сімвалічным цэнтрам, ніякім чынам не значыць, што ён не мае значэння для рэжыму. Месца прэзідэнта ў сістэме вельмі важнае – з яго, як ужо было адзначана, пачынаецца сістэма складаных дачыненняў кіроўнай эліты. Для многіх ён гарант прэферэнцый і палітычных пазіцый. З вялікай ступенню верагоднасці можна казаць, што сам рэжым распадзецца разам з сыходам А. Лукашэнкі з палітычнае сцэны, прынамсі, яго чакаюць значныя трансфармацыі. Такім чынам, гэта «цэнтр», але цэнтр, уплыў якога на логіку і стратэгію развіцця «сістэмы» дастаткова абмежаваны, а гіпертрафаваныя ўяўленні пра яго функцыі (пашыраныя ў масавай свядомасці) выглядаюць дастаткова наіўна.

ПРАВІЛЫ СІСТЭМЫ — БЕЛАРУСКАЯ КАРПАРАЦЫЯ

У сучасным свеце, паводле выразу І. Бабкова, адбываецца паступовае ператварэнне невялікіх дзяржаваў у вялікія «Макдональдсы». Каб забяспечыць сваю будучыню, невялікая дзяржава робіцца карпарацыяй са сваёй карпаратыўнай этыкай (ідэалогіяй), пазнавальным і палітычна легітымным «брэндам» (іміджам), рацыянальнай іерархічнай структурай, карпаратыўнай стратэгіяй (праграмаю развіцця), менеджментам (а не групаю ўласнікаў) і г. д. Можна спрачацца пра тое, наколькі прапанаваная мадэль падыходзіць для ўсіх дзяржаваў, але арганізацыя беларускай улады вельмі падобная да карпарацыі. Гэта стала асабліва відавочна пасля правалу інтэграцыйнага праекту з Расіяй.

Карпарацыя падпарадкавана прынцыпу эфектыўнасці (гэта не абавязкова эканамічная эфектыўнасць), тэхналагічнасці, хуткага рэагавання, выжывання ў «акіяне вонкавай рызыкі». «Палітычныя» адносіны ў ёй вельмі далёкія ад класічнай вертыкальнай схемы, якая робіцца ўсё больш і больш гарызантальнай. Уладу ўсё больш цікавіць «функцыя», а не «свядомасць». У міністэрствах, дэпартаментах і камітэтах ужо цяпер цяжка знайсці людзей, якія сур'ёзна ставяцца, напрыклад, да ідэалогіі рэжыму, што не перашкаджае ім лаяльна выконваць свае абавязкі і служыць сістэме.

Звычайна беларуская дзяржаўная і палітычная машына апісваецца як цэнтралізаваная сістэма з вызначанай іерархіяй месцаў лакалізацыі ўлады. Гэта, аднак, толькі часткова адпавядае праўдзе. Сапраўдная цэнтралізацыя магчымая толькі пры ўмове жорсткай спецыялізацыі функцый падпарадкаваных суб'ектаў – тады роля цэнтру як «каардынатара» ўзрастае максімальна. У Беларусі назіраюцца хутчэй працэсы канцэнтрацыі ўлады дзяржаўным апаратам, але ў межах самой сістэмы ўлада дастаткова дысперсная. Калі выкананне пэўнае функцыі (напрыклад, продаж дзяржаўнай маёмасці на пэўную суму) патрабуе ўзгаднення з прэзідэнтам, гэта значыць не толькі тое, што Савет Міністраў не можа вырашыць гэтае пытанне без «цэнтру», але і тое, што да прыняцця рашэння далучаецца Адміністрацыя прэзідэнта і, магчыма, яшчэ некалькі дзяржаўных органаў. Працэдура атрымліваецца значна менш цэнтралізаванай, чым падаецца, а рашэнне няўстойлівым і неперсаніфікаваным. Такая дэцэнтралізацыя дае таксама вялікія магчымасці для «перагляду» сітуацыі ўжо пасля прыняцця рашэння. Гэта дазваляе ўступіць у гульню новым лабісцкім групам. У выніку дакладны *цэнтр* знайсці складана праз вялікую колькасць працэдур узгаднення, кансультацый, дублявання функцый і г. д. Існуе толькі вельмі размытае поле, дзе канцэнтруюцца ўсе значныя функцыі і прымаюцца рашэнні, але ў межах гэтага поля любы цэнтр мае адносны характар. Кожны чыноўнік зніжае сваю рызыку, уводзячы працэдуры бясконцай колькасці візаў, замаруджвае прыняцце і выкананне рашэнняў, нават калі гэта адпавядае яго кампетэнцыі. Яшчэ менш падставаў казаць пра ўстойлівую *іерархію* ўладных цэнтраў у Беларусі, бо стабільнасці тут няма.

Канцэнтрацыя. Вышэй была адзначана адрознасць працэсаў цэнтралізацыі і канцэнтрацыі, паспрабуем спыніцца на феномене канцэнтрацыі больш падрабязна.

Баланс кантролю і эфектыўнасці пабудаваны на прынцыпах канцэнтрацыі розных відаў капіталу – палітычнага, эканамічнага, культурнага і г. д. – у межах аднаго «дзяржаўнага» поля. Логіка канцэнтрацыі прысутнічае практычна ва ўсіх адміністрацыйных рашэннях – ад акцыянавання прадпрыемстваў і скарачэння дзяржаўнай службы на 10 % (канец 2001 г.) да стварэння сістэмы «ідэалагічнае працы». Кожны сацыяльны інстытут павінен выконваць максімальную колькасць дадатковых, «факультатыўных» функцый – ідэалагічных, сацыяльных. Даследчы інстытут павінен захоўваць вобраз «навуковай установы», быць эканамічна прыбытковым прадпрыемствам, весці ідэалагічную працу і выконваць шэраг сацыяльных функцый. Буйная прамысловасць канцэнтруе ў сабе яшчэ значныя функцыі сацыяльнага, палітычнага і эканамічнага кантролю, а цяпер павінна займацца і ідэалагічнай працай. Шмат якія з дзяржаўных інстытуцый адначасова займаюцца і вытворчасцю, і кантролем, і кіраваннем, і падпарадкаваннем. І колькасць такіх функцый расце.

Канцэнтрацыя – да пэўнай ступені працэс, супрацьлеглы цэнтралізацыі, якая будуецца на прынцыпе спецыялізацыі (чым больш вузкая спецыялізацыя, тым большае значэнне цэнтру). Канцэнтрацыя прыводзіць да стварэння неперсаніфікаванай, неспецыялізаванай «сістэмы», што і ўгрунтавана ў беларускую практыку кіравання. Нават такі далікатны палітычны праект, як «ідэалогія беларускай дзяржавы», ад пачатку ажыццяўляецца праз наданне новых ідэалагічных функцый дзяржаўным інстытуцыям, а адзіны метадычны і «навуковы» цэнтр праекту так і не быў створаны (прынамсі пакуль).

Канцэнтрацыя рэсурсаў у межах дзяржаўнага поля і адначасовая дэцэнтралізацыя іх у прасторы досыць высокая. Менавіта таму ў Беларусі не склалася алігархічнай сістэмы. У Беларусі няма «эканамічнай эліты», бо эліта адначасова і палітычная, і эканамічная, і ідэалагічная, і сацыяльная, рэсурсы

максімальна дэцэнтралізаваныя і раскіданыя па розных частках сацыяльнага поля. А ў такіх абставінах працэс *цэнтралізацыі* эканамічнага рэсурсу (звядзенне вялікага эканамічнага рэсурсу да аднаго цэнтру) супярэчыць логіцы сістэмы, а таму выціскаецца за яе межы ці падаўляецца.

Дэканцэнтрацыя магчымая праз прыватызацыю, гэта значыць праз увядзенне ў «сістэму» іншай логікі, іншага тыпу рацыянальнасці. Гэта натуральна выклікае супраціў рэжыму. Напрыклад, калі размова ідзе пра прыбытковае прадпрыемства, інвестыцыі нявыгадныя таму, што дзяржаўная сістэма страціць гэты прыбытак, а разам з ім і магчымасць для пошуку надзвычайнага рэсурсу ў крызіснай сітуацыі. Вынікам з'яўляецца зніжэнне эканамічнай эфектыўнасці, але выбар «сістэмы» цалкам рацыянальны, калі зыходзіць з яе логікі і інтарэсаў. «…Забралі прадпрыемства, скарацілі людзей, зрабілі прадукт, прадалі, забралі грошы». Кантроль страчваецца не толькі над сучаснасцю, але і над будучыняй – магчымасці прагназавання і планавання змяншаюцца незваротна. Інвестыцыі для «карпарацыі» – толькі аднаразовы прыток фінансаў, за што трэба плаціць стратай эканамічнага і, што асабліва важна, сацыяльнага кантролю. Акрамя таго, змена ў складзе акцыянераў непазбежна выкліча патрабаванні ў змене менеджменту, а гэта ўжо пытанне палітычнае.

УЛАДА І СІМВАЛІЧНАЯ ГУЛЬНЯ

Публічны бок улады пабудаваны на сімвалічнай гульні. З аднаго боку, прэзідэнт дыстанцуецца ад «сістэмы» і можа заўсёды дазволіць ачысціць сваю легітымнасць абвінавачаннямі ў бок бюракратыі («я свае абавязкі выконваю, але ВЫ [міністры, старшыні, дырэктары] не даяце рады») і, натуральна, рэгулярнымі сімвалічнымі (селектарныя нарады) і рэальнымі (звальненні ці арышты) рэпрэсіямі. З іншага боку, сістэма настолькі дэперсаніфікаваная, што яна не можа быць за нешта адказнай, а тым больш вінаватай за ўсе рашэнні прэзідэнта. Такая гульня адлюстроўвае логіку рэжыму і асаблівасць яго сацыяльнай рэпрэзентацыі.

Наколькі б эфектнымі ні здаваліся селектарныя нарады, такая праява нянавісці да бюракратыі толькі сімвалічная. На самай справе «людзі сістэмы» не асабліва баяцца А. Лукашэнкі, добра разумеючы, што галоўнае для іх кар'еры – адносіны не з «цэнтрам», а з калегамі ўласнага ўзроўню ці непасрэдным кіраўніцтвам. Персанальныя адносіны з прэзідэнтам, якія мелі сваё значэнне ў першыя гады яго кіравання, паступова дэвальвуюцца. Значэнне мае толькі «кулуарная» барацьба – баяцца трэба сваіх сяброў, калегаў і ворагаў, толькі такія войны могуць прывесці да сапраўды негатыўных наступстваў. Пры нармальным развіцці сітуацыі любое невыкананне даручэнняў прэзідэнта (кшталту паказчыкаў росту на 6 %) заўсёды можна абгрунтаваць і навукова, і практычна. У адваротным выпадку хеўра «кланаў» здольная знішчыць каго заўгодна, наколькі б ён ні быў набліжаны да прэзідэнта («добрыя адносіны» заўсёды можна разбурыць «правільнай інфармацыяй»)[18]. Логіка развіцця сістэмы робіць функцыянераў усё больш залежнымі адзін ад аднаго, а не ад «абстрактнай» першай асобы.

VII. Кіраванне і структуры дамінавання

У межах беларускага поля «сістэма» валодае трыма структурамі дамінавання. Прамое дамінаванне, метафарай якога можа быць слова «ўласнасць», найбольш важнае і займае «сістэмаўтваральныя» пазіцыі. «Валоданне» канцэрнамі, прадпрыемствамі, калгасамі і г. д. дазваляе не толькі эканамічна кантраляваць, але і кантраляваць адміністрацыйна, патрабаваць тэрміновых грошай, забяспечваць сацыяльны кантроль у якасці працадаўцы.

Гэта прыватная (унутраная) уласнасць сістэмы на сродкі шчыльнага эканамічнага, культурнага і палітычнага кантролю. Права ўласнасці на сістэмаўтваральныя інстытуцыі мае як эканамічнае і сацыяльнае, так і адміністрацыйнае значэнне. Усе дырэктары буйных заводаў, адукацыйных структураў, СМІ etc. прызначаюцца прэзідэнтам, а само прызначэнне праходзіць кола «ўзгадненняў» у прэзідэнцкай адміністрацыі, Радзе Міністраў і г. д. Займанне пасады старшыні калгасу застаецца не столькі эканамічным, колькі палітычным рашэннем. Права на кіраванне можа зыходзіць толькі з самое сістэмы.

[18] Прыклад Жураўковай сведчыць, што поўная лаяльнасць і давер з боку прэзідэнта нічога не гарантуюць.

УСКОСНАЕ ДАМІНАВАННЕ – АДНОСІНЫ АРЭНДЫ

Калі дзяржава здольная ўтрымаць *кантроль* над прадпрыемствам ці галіной эканомікі, яна яго захоўвае. Але не ўсюды прамое дамінаванне дае жаданыя вынікі. Сістэма мае патрэбу ў лакунах, якія б забяспечвалі яе «адваротны» бок. Адносіны лакуны да «сістэмы» маюць характар хутчэй *васалітэту*, чым прамога падпарадкавання: лаяльнасць мае большае значэнне, чым эканамічная эфектыўнасць; сутнасць дзейнасці – у *служэнні* «сістэме» (яе канкрэтным звёнам), а не ў структурным *падпарадкаванні*. Бізнес, які мае адміністрацыйны дах, не падпарадкоўваецца міністэрствам і канцэрнам – ён служыць міністрам і дырэктарам заводаў. Лаяльныя СМІ могуць самастойна фармаваць інфармацыйную палітыку, але пры гэтым мусяць заўсёды спрыяць палітычнай стабільнасці, рэкламаваць толькі ўзгодненых кандыдатаў на мясцовых і агульнанацыянальных выбарах і забяспечваць іх «самастойную» палітычную кар'еру. Прыкладна такія самыя функцыі выконваюць і лаяльныя палітычныя партыі ды грамадскія аб'яднанні, якія ўбудаваныя ў сістэму як персаніфікаваныя праекты, што працуюць не столькі на рэжым, колькі на пэўныя яго цэнтры.

Васальныя структуры атрымліваюць у арэнду частку сацыяльнай і эканамічнай прасторы «сістэмы», за што плацяць, адпаведна, арэндную плату, якая спалучаецца з нефармальнымі выплатамі і карупцыяй. Знаходжанне ў бюракратыі – вельмі часта адзіная магчымасць утрымання бізнесу.

Сістэма нібыта дэкларуе для сваіх функцыянераў вялікія рызыкі (дысцыплінарнае пакаранне, звальненне і г. д.) і ставіць іх у цалкам залежнае і падпарадкаванае становішча. Васальныя структуры маюць за місію зніжэнне гэтае рызыкі – забеспячэнне дадатковых прыбыткаў, працу для родзічаў і знаёмых і г. д.

З іншага боку, такі бізнес цалкам павінен захоўваць сваю лаяльнасць і, галоўнае, ведаць сваё месца – як дадатковага элементу дзяржаўнай сістэмы, які знаходзіцца на ніжэйшай

прыступцы палітычнае іерархіі. Да гэтага часу значная частка бюракратыі захоўвае арганічнае пачуццё пагарды да «паганых камерсантаў» і сімвалічна дыстанцуецца ад іх у сваіх сацыяльных практыках[19].

Ускосны сектар фармуецца на розных узроўнях, ключавы склад, самыя нізкія. Ён мала звязаны з «цэнтрам», прынамсі, пакуль не ўзнікаюць канфлікты з рэгіянальным «дахам». Тамуматыялаў «сістэма» выяўляе нават нязначныя прыкметы слабасці,сістэч «арандатары» палітычнае легітымнасці пачынаюць Лукашэнкі з дэманстраваць свае правы і нават спрабуюць навязрацыянальным ўмовы чыноўнікам, якім яны плацяць. Такія спробыкіраванцу ініцыятыву жорстка падаўляюцца. Гэта логіка сістэмы.2001 г.,дзі, што зарабляюць грошы і «кормяць» пэўную колькасцможнаў «сістэмы», пачынаюць траціць пачуцце рэальнасці. Яны пачынаюць адчуваць, што валодаюць сітуацыяй і што менавыпавінны плаціць за легітымнасць, а наадварот. Адбываецца спробы змяніць сістэму дамінавання і зрабіць яе сваёйкамерсантаў уласнасцю, што на пэўных лакальных узроўнях можа быцца паспяховым. Але звычайна такія намаганні прыцягваюць цэнтру ды іншых кланавых групаў і хутка падаўляюцца.карысць», Кантроль таго, хто дае хабар, над тым, хто яго атрымлівае, можа быць доўгім.

[19] Нагадаем, што ў Беларусі, у адрозненне ад Расіі, карысць не самавідавочная.

Беларуская ўлада звычайна вельмі насцярожана ставіцца да такога бізнесу і ніколі не прызнае яго часткай *сябе*. Яна, аднак, стымулюе яго развіццё і ў той жа час моцна абмяжоўвае і кантралюе. «Рэпрэсіі» ў гэтай сферы – звычайная палітычная гульня, вынік выключна кланавае барацьбы ці «галавакружэння ад поспехаў», якое спалучаецца са стратай пачуцця свайго месца. Але, як сказаў бы Ніцшэ, рэпрэсіі – гэта толькі пыл, які ўздымаецца над полем бітвы, а пыл не павінен засціць таго, што адбываецца на самай справе. Спробы рабіць з кожнай ахвяры «палітыка» сімптаматычныя, але не маюць ніякага дачынення да сутнасці гэтых працэсаў.

Адразу зазначым, што ахвочых атрымаць васальны статус і з боку бізнесу, і з боку грамадска-палітычнага сектару значна больш, чым самой той сацыяльнай і эканамічнай прасторы, якая здаецца сістэмай у арэнду, таму ўключэнне ў адносіны

васалітэту (ускоснага кіравання) сутыкаецца з канкурэнцыяй і многія суб'екты гэтага поля вымушаны быць лаяльнымі, не атрымліваючы за гэта практычна ніякіх дывідэндаў.

ДРУГАСНЫЯ СТРУКТУРЫ

Не ўсе структуры эканамічнай і грамадскай сферы, аднак, атрымліваюць легітымацыю сістэмы. Прадпрымальнікі[20], рознага кшталту грамадскія ініцыятывы без вызначанай палітычнай арыентацыі вымушаны знаходзіцца ў «вольным» стане, мала цікавым для сістэмы.

Другасныя структуры цікавыя для сістэмы толькі як дадатковая (але далёка не асноўная) крыніца даходу, які паступае ў форме падаткаў і «даніны». Дробны бізнес знаходзіцца па-за сістэмай, ён не атрымлівае ў арэнду яе сацыяльнай і эканамічнай прасторы, але запаўняе лакуны і пусткі, збольшага непрыкметныя для карпарацыі. Яго сацыяльная база – «часова беспрацоўныя» (палітычна і сацыяльна нязначныя агенты), эканамічная – сферы, дзе «сістэмныя» структуры не здольны эфектыўна кантраляваць сітуацыю. Калі дзяржаўныя структуры выявілі сваю цікавасць да занятай эканамічнай сферы, забраць яе ў бізнесу не будзе праблемай.

[20] Гэта катэгорыя не супадае з катэгорыяй «прадпрымальнік» у тэрміналогіі Й. Шумпетэра, які ўкладвае ў гэтае паняцце «перыферыйную» катэгорыю.

Дробны бізнес не асабліва цікавы рэжыму з пункту гледжання сацыяльнага кантролю – страйк гандляроў ніколі не выкліча і дзесятае часткі грамадска-палітычнага рэзанансу, які магла б выклікаць такая акцыя на буйным заводзе. Іншая справа – кантроль эканамічны. Другасным структурам не надаецца дадатковых сацыяльных функцый, якія маюць дзяржаўныя заводы альбо «паддашны» бізнес. Яны выконваюць толькі адну ролю – *фіскальную*. У адпаведнасці з гэтай логікай пабудавана сістэма нарматыўных актаў і кантрольных органаў.

Звычайна дзяржаву цікавіць не тое, наколькі праца арганізацыі эфектыўная эканамічна, але тое, наколькі гэтую працу можна кантраляваць. Мясцовыя ўлады нясуць адказнасць за «беспарадак і крадзеж» «бізнесу». Бізнес можна разняволіць, але да тае ступені, пакуль ён паддаецца кантролю і дысцыпліне

– фіскальнай, сацыяльнай, палітычнай. Калі не будзе дысцыпліны, не будзе мяжы, а не будзе мяжы – будзе бязмежжа («беспредел»), гэта значыць, нестабільнасць, якой «сістэма» не можа дазволіць у прынцыпе.

VIII. Ступені ўлады
(некалькі заўваг пра палітычную сістэму)

Беларуская ўлада «жорсткая»[21], канцэнтраваная і ўзначаленая, як даводзіцца ўлічваць тое, што адбываецца ў нашай краіне і тое, што адбываецца вакол яе. «Без моцнай улады, якая арганізуе працэсы, мы проста развалімся, як іншыя, у краіне будзе суцэльны крымінал». Такая ўлада самаапісваецца як здольная магчымасць утрымацца ад распаду, фрагментацыі, хаосу і заняпаду. «Сёння могуць што хочаце казаць пра ўладу, але гэта не п'яная ўлада. Гэта ўлада, якая адказвае, абараняе, вырашае праблемы...» Прэзідэнт (як сімвалічны і арганізацыйны цэнтр гэтай улады) гатовы прызнаць «прысутнасць элементаў аўтарытарызму» ў практыцы кіравання. Аўтарытарная ўлада – рэч неабходная і сацыяльная, «кожнае грамадства ў такі складаны перыяд вырашае праблемы з дапамогай моцнай улады».

[21] Прыведзены тэкст «жорсткая» існуе ў двух варыянтах: «жорсткая» і «жесткая». Існуе ў дадатак, але гэта не істотна. Прыкладаў: «Жорсткая ўлада, але гэта не п'яная ўлада. Гэта ўлада, якая адказвае, абараняе, вырашае праблемы...» «Жесткая ўлада, але гэта не п'яная ўлада. Гэта ўлада, якая адказвае, абараняе, вырашае праблемы...» Беларуская ўлада пагаджаецца з тым, што яе ўласцівасці – шчыльнасць, вага ды высокі ўзровень канцэнтрацыі. Але ў дыскусіі вымушана даводзіць свой натуральны, негвалтоўны і легітымны характар. Азначэнні «дыктатура», «узурпацыя» адмаўляюцца, і гэта значыць, што палітычная і адміністрацыйная пазіцыя ўлады патрабуе апраўдання і доказу, што «дыктатура – гэта ідэалагічны накат, пустыя словы» і не больш за тое. *У вызначэнні сваёй сутнасці ўлада становіцца на пазіцыю апраўдання, гэта значыць, што сувязь з «крытыкамі» не парываецца.*

ПРЫНЦЫПЫ

Беларускі рэжым падкрэслівае сваю нарматыўнасць, унутраную

цэласнасць і падпарадкаванасць пэўным устойлівым прынцыпам, якія павінны дэманстраваць стабільнасць. Сярод прынцыпаў палітыкі часцей за ўсё называюцца справядлівасць (якая спалучаецца са шчыльным кантролем і патрабавальнасцю), шчырасць («пра факты трэба гаварыць») і нелюбоў да «гвалту» на вуліцах. Апошняму (напэўна, па інерцыі) надаецца асаблівая ўвага – шматкроць падкрэсліваецца, што «вуліца – гэта не палітыка» і ўсё павінна быць «цывілізавана», у рамках дыялогу. Згадкі пра вулічнае супрацьстаянне выконваюць ролю негатыўнага фону, калі размова ідзе пра апазіцыю, «дэструктыўныя сілы» і спробы дэстабілізаваць палітычную сітуацыю. Гэта яшчэ раз пацвярджае вялікую ролю вулічнага супраціву 1996-99 гадоў у развіцці рэжыму і пачатак яго стварэння менавіта ў атмасферы гэтага супраціву, якім бы фатальным і безвыніковым ён цяпер ні здаваўся[22].

ІНФРАСТРУКТУРА РЭЖЫМУ

Вызначаючы сваю інфраструктуру – інстытуцыі і арганізацыі, якія фармальна не з'яўляюцца часткай дзяржаўнага апарату, але выконваюць розныя дапаможныя функцыі ў межах «грамадзянскай супольнасці», – улада называе звычайна прафсаюзы, мясцовыя саветы і моладзевыя арганізацыі (БРСМ). Не будзем спыняцца на падрабязным разглядзе кожнай са структураў, адзначым толькі, што такая канфігурацыя склалася толькі ў 2002 годзе, калі быў усталяваны шчыльны кантроль над прафсаюзамі. Мясцовыя саветы заўсёды былі лаяльна-пасіўнымі ў палітычным жыцці. Пасля выбараў 2003 году лаяльнасць захавалася, але з'явілася жаданне зрабіць з іх больш актыўную структуру. Пра рэформу мясцовага кіравання размова, праўда, не ідзе. Атрыманне фінансавай аўтаноміі мясцовых саветаў не мае прынцыповага значэння – яны і так адміністрацыйна залежаць ад «цэнтру», дый склад мясцовых органаў кіравання і самакіравання ў значнай ступені вызначаецца Адміністрацыяй прэзідэнта. Самым галоўным аргументам супраць рэформы называецца дэцэнтралізацыя, што пры наяўнасці дыспрапорцый у рэгіянальным развіцці і наступстваў аварыі на ЧАЭС прывядзе да заняпаду цэлыя раёны

[22] У свой час гэта сапраўды успрымалася як галоўная палітычная пагроза.

(«паставіць іх на край пагібелі»). Што тычыцца БРСМ, то штучнае стварэнне агульнай (татальнай) моладзевай структуры пачалося ў 1997 годзе заснаваннем БПСМ. Сучаснае афармленне гэтая структура атрымала ў 2002 годзе шляхам аб'яднання БПСМ і БСМ у адзіную арганізацыю.

Рэжым спецыфічна, у параўнанні з іншымі краінамі рэгіёну, ставіцца да партый. Ніводны лаяльны палітычны праект так і не стаў уплывовым – гэта ўнікальная сітуацыя, якая патрабуе спецыяльнага разгляду па-за межамі гэтага тэксту.

ПАЛІТЫЧНАЯ ДЫСЦЫПЛІНА

> *Калісь, помню, пры старым яшчэ мэру Менску, я пачаў прыводзіць у парадак горад. Кажу: гэта трэба зрабіць так. «Гэта, Аляксандру Рыгоравічу, немагчыма!» Я гавару: «Не зробіш – выганю!!!»*
>
> А. Лукашэнка

Калі пад палітыкай разумець адкрытую палітычную гульню, беларуская «сістэма» ад крызісу 1994-1996 гадоў з'яўляецца апалітычнай і маналітнай. Яна агароджвае ўсё поле афіцыйнай палітыкі, і таму розныя формы дырэктыўнага планавання і дысцыплінавання палітычнага жыцця выглядаюць цалкам натуральна і лагічна.

Яшчэ да выбараў адбываецца планаванне складу будучых выбарных органаў і нават адкрыта дэкларуецца план прадстаўніцтва, накшталт дырэктыўнай пастаноўкі задачы пра саракапрацэнтную прысутнасць у мясцовых саветах і парламенце жанчын і моладзі альбо захаванне ў выбарных органах дастатковае колькасці «дасведчаных кадраў» (не менш за 50 %). Такім чынам, кадравая праца ў выбарных органах мала чым адрозніваецца ад прызначэнняў у бюракратычным апараце. Фразы пра планаванне (прадвызначанасць) вынікаў

выбараў транслююцца ўладай дастаткова часта, хоць звычайна і дапаўняюцца дэмакратычнай рыторыкай і апеляцыямі да «права». Няма сумневу, што персанальны склад выбарных органаў з нязначнымі выключэннямі вызначаецца ўладай яшчэ да выбараў.

Палітычная дысцыпліна азначае не толькі планаванне складу выбарных і нявыбарных органаў, але і дысцыпліну агентаў рэжыму. Уплеценая ў сеціва фактаў, прыхаваных практык і звычаяў, праца ў «сістэме» вызначае шэраг патрабаванняў, найбольш значныя з якіх – не «ідэйнасць» і «вера» (хоць гэта час ад часу дэкларуецца ўладамі), а розныя ступені лаяльнасці і функцыянальная карыснасць («лаяльны прафесіяналізм»[23]). Аснова кадравае палітыкі – «адданасць Беларусі, дзяржаве і патрыятызм», «адданасць той палітыцы, якая праводзіцца». Адпаведна, самы цяжкі палітычны грэх – здрада. Здрада – самая небяспечная і нелюбімая праява нелаяльнасці, асабісты досвед якой прэзідэнт сістэматычна падкрэслівае. Натуральна, вялікае значэнне мае дасведчанасць і прафесіяналізм, але *«для нашага грамадства важна, каб яны* [людзі «сістэмы»] *былі сумленнымі. Не былі здраднікамі. А ў нас ёсць і такія. Калі не згодзен з палітыкай, ідзі адкрыта ў апазіцыю. Здраднікаў у камандзе быць не павінна»*. Менавіта зыходзячы з гэтай логікі, найбольшую пагрозу для ўлады на месцах уяўляе «жулік», які спалучае ў сабе элементы палітычнай нелаяльнасці і крымінальнасці. Непасрэдна для задачаў дысцыплінавання прызначаны нарматыўныя паказчыкі, праверкі, дырэктывы, рэарганізацыі і звальненні.

БІНАРНАЕ СУПРАЦЬПАСТАЎЛЕННЕ ЎЛАДА/АПАЗІЦЫЯ

Для ўлады палітычнае поле Беларусі выразна падзелена на сектары ў залежнасці ад узроўню лаяльнасці. Нягледзячы на шэраг нюансаў, гэты падзел збольшага зводзіцца да бінарнага супрацьпастаўлення ўлада/апазіцыя. Гэтае супрацьпастаўленне пранізвае палітычную рыторыку ўлады і значна ўплывае на яе структуру, у якую апазіцыя ўпісваецца як маса, якая мысліць паводле схемы «прэзідэнт – дрэнны, народ – «быдла», краіна – «задворкі Еўропы».

[23] Лаяльнасць гэта, перш за ўсё, лаяльнасць паводзінаў, а не свядомасці. Адданасці «ідэі рэжыму» ніхто не

Апазіцыйнасць набывае анталагічныя рысы нелаяльнасці, нестабільнасці, дэструктыўнасці і арыентацыі на Захад. Успрыняцце апазіцыі як *Іншага* падкрэсліваецца навязваннем ужываннем іншае мовы. У прыватнасці, большасць выпадкаў ужывання беларускіх словаў і фразаў у прамовах прэзідэнта звязана з перадачай словаў апазіцыі, азначэннем апазіцыі («свядомыя», «дэмакраты») і палітычнымі планамі апазіцыі («у Эўропу», «на Захад»). Ужыванне беларускай мовы робіцца палітычным маркерам, які вызначае кантэкст апазіцыйнасці, нягледзячы на падкрэслена лаяльнае стаўленне да беларускай мовы ўвогуле.

Прычына існавання апазіцыі вядомая: гэта альбо недахоп інфармацыі (і, як вынік, неразуменне дзяржаўнай палітыкі)[24], альбо «несумленнасць», «карыслівасць» і «непрыстойныя паводзіны» шэрагу палітычных дзеячоў. Любая апазіцыйнасць можа быць знятая альбо тлумачэннем «фактаў праўдзівага стану рэчаў», альбо выкрыццём яе своекарыслівай палітычнай сутнасці. Нібыта для працы ў першым кірунку ствараецца разгалінаваная ідэалагічная інфраструктура беларускай дзяржавы з курсамі ідэалогіі ў ВНУ, ідэалагічнай працай «у калектывах», з агітацыйнымі брыгадамі і дзяржаўнымі СМІ. Для працы з другой катэгорыяй «апазіцыі» існуе канцэнтраваны і жорсткі апарат дзяржавы.

[24]На гэтым пабудавана логіка ідэалагічнай працы.

АНКЛАВЫ АПАЗІЦЫЙНАСЦІ

Апазіцыйнасць як фактар нестабільнасці размеркавана ў сацыяльнай прасторы нераўнамерна і, акрамя палітычных партый разам з блізкімі да іх структурамі, канцэнтруецца ў шэрагу сфераў і сацыяльных групаў: адукацыя, культура, «моладзь» і г. д. Сярод такіх анклаваў, у прыватнасці, выступаюць ВНУ і студэнты (генератары і носьбіты самых радыкальных ідэй пераўтварэння грамадства), чыя «незразумелая» апазіцыйнасць не можа задавальняць. Адна з кніг, якія сталі эмпірычнай асновай гэтага тэксту, складаецца з прамоваў прэзідэнта перад студэнтамі, і ВНУ ў іх выступаюць як асаблівы аб'ект уладнага дамінавання. Кантроль лаяльнасці студэнтаў вельмі розны, але, як падаецца, галоўным сродкам выступае «праца» з рэктарамі, якія павінны праводзіць

дзяржаўную палітыку ў *дзяржаўных* ВНУ і забяспечваць вынікі на выбарах (адпаведна, зрыў вынікаў асабліва ставіўся ў віну былому рэктару БДУ). Другі важны сродак – развіццё лаяльных моладзевых арганізацый і ідэалагічная праца. Самі рэктары, натуральна, прыдумваюць больш дзейсныя сродкі забеспячэння лаяльнасці. У прыватнасці, заключэнне дамоваў аб няўдзеле ў апазіцыйных мерапрыемствах у абмен на права не ўдзельнічаць у мерапрыемствах афіцыйных.

Любое выдаткоўванне сродкаў на нелаяльныя групы і структуры з'яўляецца неэфектыўным. Улада адкрыта дэкларуе, што фінансаванне, напрыклад, культурных праектаў магчыма пры ўмове лаяльнасці іх рэалізатараў. Нелаяльныя культурныя практыкі не толькі не могуць стымуляваць, але павінны ўсяляк рэпрэсавацца. Апазіцыйнасць парушае ўнутраную логіку кантролю «сістэмы», павышае яе нестабільнасць, таму негатыўнае стаўленне да такой актыўнасці цалкам лагічнае, як і стратэгія па сацыяльнай ізаляцыі такіх практык. Для легітымацыі «апазіцыйнасці» неабходна, прынамсі, змена структураў размеркавання ўлады, чаго дапусціць, натуральна, нельга.

IX. Ідэнтычнасць – дзяржаўная і нацыянальная

> *...маем часта гэткія прыкрыя выпадкі, што ў ваднэй вёсцы ёсьць беларусы і «тутэйшыя». «Тутэйшыя» лічаць беларусаў партыяй, як, прыкладам, ППС, камуністаў і г.д... У гэтую беларускую «партыю» «тутэйшыя» ня хочуць уступаць!*
>
> М. Шкялёнак. Аб тутэйшых

Беларуская ідэнтычнасць апошнім часам зрабілася прывабным аб'ектам даследавання, якому надаецца дастаткова навуковай і ненавуковай увагі. Гэта рэфлексіўныя тэксты, дзе структура

беларускай свядомасці толькі цьмяна пазначаецца супрацьпастаўленнем «заходняга» і «ўсходняга» пачатку, эмпірычныя сацыялагічныя даследаванні «сістэмы каштоўнасцяў», нацыянальнай, культурнай і рэлігійнай прыналежнасці, розныя варыянты аналізу палітычнага (і гістарычнага) выбару і г. д.

Практычна ўсе даследаванні, якія ставяць сабе за мэту выяўленне структуры беларускай свядомасці – а такіх чайна, з розных прычынаў, у тым ліку і палітычных, ставяць сабе ўсе[25], – сутыкаюцца з яе няцэласнасцю. Звычайна аналізу», прыводзіць да фармулявання бінарнай апазіцыі дзвюх нятоесных і непадобных беларускіх ментальнасцяў, якія супрацьстаяць адна адной як палітычна, так і культурна. Крытэры падзелу вельмі розныя: стаўленне да рэформаў («прагрэсіўная» і «кансерватыўная» свядомасць), нацыянальнай каштоўнасцяў («свядомыя» і «несвядомыя»), субэтнічнага падзелу («ліцвіны» і «русіны»), палітычнае арыентацыі («нацыяналісты-беларусы» і «русафілы-заходнярусы»). Гэтую стратэгію бінарнай апазіцыі вытрымлівае вылучэнне «моцнай» ідэнтычнасці (Бабкоў), «нацыянальнай» і «данацыянальнай»[28], а лепей сказаць, «нацыянальнай» і «тутэйшай». Глыбокі аналіз двух тыпаў беларускай ідэнтычнасці і таго, наколькі пазначаныя апазіцыі адпавядаюць беларускай рэчаіснасці, патрабуе спецыяльнага даследавання. Тут мы толькі зазначым падзел паміж беларускімі свядомасцямі як факт і заўважым, што існуючая ўлада транслюе другі ў пералічаных апазіцыях тып ідэнтычнасці «слабы», «данацыянальны», «тутэйшы», «кансерватыўны», «русафільскі» і г. д.

Прыход да ўлады і дамінаванне такой ідэнтычнасці складала частку рэвалюцыйнага праекту 1994 году, нягледзячы на тое

[25] Гэта, напрыклад, характэрна для Расійскай Федэрацыі, Украіны, Малдовы і Прыднястроўя.

[26] Гэта, напрыклад, характэрна для Расійскай Федэрацыі, Украіны, Малдовы і Прыднястроўя.

[27] Гэта, напрыклад, характэрна для Расійскай Федэрацыі, Украіны, Малдовы і Прыднястроўя.

[28] Гэта, напрыклад, характэрна для Расійскай Федэрацыі, Украіны, Малдовы і Прыднястроўя.

[25] Сацыёлагі ўключаюць у даследаванні каштоўнасцяў, якія ўключаюць у сябе ўстаноўкі адносна нацыянальнай, культурнай і рэлігійнай прыналежнасці. Даследаванні ЦСІД пры Адміністрацыі Прэзідэнта і спрабуе аперыгінаваць субэтнічныя ўстаноўкі беларусаў. Гэтыя ўстаноўкі ўключаюць такія непадабенствы выкрыцьцё.

[26] Гэта, напрыклад, характэрна для Расійскай Федэрацыі, Украіны, Малдовы і Прыднястроўя.

[27] Гэта, напрыклад, характэрна для Расійскай Федэрацыі, Украіны, Малдовы і Прыднястроўя.

[28] Гэта, напрыклад, характэрна для Расійскай Федэрацыі, Украіны, Малдовы і Прыднястроўя.

Генетычна ўладная свядомасць звязаная не з «заходнерусізмам», які супрацьстаяў спачатку польскаму культурнаму кантэксту, а потым беларускаму нацыянальнаму руху, а з «тутэйшай» самасвядомасцю, найбольш значнымі рысамі якой з'яўляюцца выключна практычнае, а не ідэалагічнае стаўленне да таго, што для астатніх фармуе так званую *сістэму нацыянальных каштоўнасцяў* (мова, традыцыі, дзяржава, тоеснасць etc.), імкненне пазбегнуць ідэнтыфікацыі, імкненне да захавання нявызначанага культурнага і нацыянальнага стану і, адпаведна, неабходнасць культурнага донара (вонкавага вытворцы «высокай культуры»). Натуральна, што «тутэйшасць» XIX ст. перажыла некалькі важных трансфармацый, найбольш важная з якіх – індустрыялізацыя і фармаванне ў складзе БССР беларускай савецкай ідэнтычнасці, тутэйшыя элементы якой стымулявалі палітычную лаяльнасць і культываваліся савецкай уладай. Але такая стратэгія паводзінаў у палітычным і культурным полі застаецца, пры пэўных дапушчэннях, актуальнай.

Тым не менш, апісанне і самаапісанне гэтай «маўклівай», «размытай» і «няпэўнай» ідэнтычнасці, якая лічыла за лепшае заставацца ў цені іншых, пачалося адносна нядаўна. Фармаванне корпусу «ідэалогіі беларускай дзяржавы» – адна з прыкметаў гэтага працэсу.

Уласцівасці ўладнае ідэнтычнасці разнастайныя, але для нас найбольшую цікавасць уяўляюць практыкі ўхілення ад ідэнтыфікацыі шляхам размывання і *дэцэнтралізацыі* (гэты панятак будзе займаць стрыжнёвае месца ў нашым аналізе) ідэнтычнасці. Улада[29] не мае трывалай нацыянальнай ідэнтыфікацыі. Гэта выяўляецца ў сістэматычным нагадванні пра падабенства беларусаў да суседніх народаў. У прыватнасці, сутнасць беларускай мовы ў адпаведнасці з «тутэйшым» падыходам вызначаецца формулай «слова польскае, слова расійскае, слова ўкраінскае», г. зн. нешта несамадастатковае, што не мае цэнтру і этнічнай/нацыянальнай угрунтаванасці.

Генеалагічна свядомасць улады моцна звязаная з беларускай савецкай ідэнтычнасцю. Яна будавалася ў адпаведнасці з палітычнымі практыкамі індустрыялізацыі, масавай ліквідацыі

[29] Нацыянальная ідэнтычнасць улады ніта

ды фармавання «адзінага савецкага народу», у падмурак якога ляжаў прынцып русацэнтрызму. Натуральна, што колькасць рысаў «нармальнай» савецкай ідэнтычнасці разам з паўстаннем новай беларускай дзяржавы, адбываецца сутнасная трансфармацыя «расійскага цэнтру». Трансфармацыя савецкай ідэнтычнасці мае многа прычынаў, але найбольш важным было змяненне сістэмаў улады і перамяшчэнне палітычнага цэнтру з Масквы ў Менск.

Савецкая свядомасць мела два ўзроўні – саюзны і нацыянальна-лакальны. Расійская мова і расійская культура была ўніверсальнай мовай і культурай «агульнасаюзнага ўзроўню», нацыянальныя культуры, адпаведна, займалі лакальныя нішы на другім узроўні. З распадам СССР, фармаваннем незалежнай дзяржавы і канцэнтрацыі палітычнай улады ў Менску, нацыянальна-дзяржаўная ідэнтычнасць непазбежна грацыць іерархічнасць і робіцца аднаўзроўневай. Гэта паставіла вельмі важнае практычнае пытанне: «Які змест павінна мець нацыянальнае?» (бо нацыянальнае пераставала быць лакальным). Расійская мова, здаецца, страціла легітымацыю цэнтру, і гэта выклікала дзве супярэчлівыя тэндэнцыі: паварот да *беларускасці* і спрыянне яе паступовай экспансіі, не толькі ў праекце «адраджэння», але і ў праекце «стварэння дзяржавы», які фармаваўся часткай постсавецкай эліты. Беларусь павінна была стаць *нармальнай дзяржавай*, а гэта значыць дзяржавай са сваёй мовай, традыцыяй, міфалогіяй. Гэта азначала стварэнне аднаўзроўневай ідэнтычнасці, падобнай да літоўскай альбо польскай.

Супрацьлеглая стратэгія патрабавала ўкладання расійскай мовы і культуры ў межы аднаўзроўневай ідэнтычнасці, гэта значыць, упісання яе ў лакальны кантэкст. Логіка такога працэсу патрабавала пазбаўлення расійскага цэнтру манаполіі на свае культурныя прадукты і фактычнага паступовага разбурэння русацэнтрызму. Адзінай перашкодай на гэтым шляху былі спробы аднаўлення іерархічнай свядомасці за кошт стварэння новага «саюзу», «саюзнай дзяржавы», але збольшага з пачатку гэтага стагоддзя пытанне пра «самастойнасць» і каштоўнасць беларускага цэнтру з'яўляецца, здаецца, вырашаным.

Легітымацыі расійскай мовы для беларусаў рэжым надае вялікае значэнне. Формула легітымацыі падаецца простай – «расійскае ёсць не толькі расійскім». У лекцыях А. Лукашэнкі перад студэнтамі некалькі разоў паўтараецца байка пра тое, як Б. Ельцын хацеў падзякаваць А. Лукашэнку за рэферэндум 1995 году (дакладней, за наданне расійскай мове статусу другой дзяржаўнай). Дзякаваць няма за што, бо «русский язык – это и наш язык», – адказвае прэзідэнт.

«Мы не можам нашу расійскую мову вярнуць Расіі». «Мова, на якой мы гаворым, гэта не толькі расійская, гэта і наша мова». «Мы ў яе ўклалі не менш, чым самі расіяне, сваёй душы, пачуццяў, эмоцый і іншага». Даводзіцца, што расійская мова *павінна* лічыцца роднаю для беларусаў і быць сапраўднай каштоўнасцю.

Такая рыторыка спалучаецца са спробамі дэкаланізацыі расійскай мовы – «у нас асаблівая расійская мова, асаблівы беларускі акцэнт, і мы гэтай мовы не пакінем». Расійская мова ў Беларусі набывае нацыянальна беларускія рысы[30]. «Чыстая расійская мова адрозніваецца ад тае, на якой мы з вамі атрымліваем адукацыю і гаворым». Гэта мова нашага народу, які доўгі час жыў не «паміж Масквой і Варшавай», а «ў Расійскай імперыі і савецкай дзяржаве», што, адпаведна, дае правы на культурную спадчыну. Асаблівасці расійскай мовы ў Беларусі, такім чынам, выкарыстоўваюцца як сродак давесці яе «роднасць» для народу і «ўкарэненасць» у беларускі культурны ландшафт ды паказаць яе нацыянальны (нерасійскі) характар. Такія спробы можна ўспрымаць з іроніяй, але гэта важная тэндэнцыя сучаснага развіцця Беларусі, якая з цягам часу будзе ўзмацняцца.

«Прыватызацыя» расійскай мовы выглядае дзіўна (і нават наіўна), калі адбываюцца спробы гістарычнай легітымацыі расійскай мовы і культуры. Сцвярджаецца, што Ф. Скарына пісаў «па-руску», хоць добра вядома, што ў тэрмін «руский» укладаў зусім не «русский» ці «маскоўскі» змест.

[30] Так, напрыклад, «беларусізаваць» расійскую мову цалкам падобнае да працэдур «дэкаланізацыі»

Беларуская мова ідэнтыфікуецца ўладай як нешта «роднае» і «натуральнае» – *матчына мова.* Яна – не прадмет для разважанняў і, натуральна, не інструмент шырокага ўжывання.

На гэтай мове не абавязкова гаварыць ці пісаць, яе проста *трэба ведаць*[31]. Натуральнасць і роднасць павінна быць не мець прэтэнзій на сацыяльную экспансію, павінна быць «утаймаваным іншым»[32] , схаваным у целе ўласнае ідэнтычнасці.

У такім статусе праблемаў з беларускай мовай няма, у ёй яна не ёсць праблемай. Ніхто не забараняе ёй карыстацца, можна нават падтрымліваць розныя культурныя і сацыяльныя анклавы, дзе яна можа быць цалкам легітымнай (беларуская літаратура, гісторыя, краязнаўства і г. д.), але калі пытанне павышэння сацыяльнага статусу (пашырэнне прасторы), стаўленне да яе мяняецца радыкальна.

Палітычная аргументацыя «супраць мовы» сфармавалася ў пачатку 90-х і з тых часоў мала змянілася: «гвалтоўнае ўвядзенне мовы прыводзіць да сацыяльнай напружанасці». «Падрыхтаваць ёй дзеяслоўя». «Пра адной з прычынаў сферы, дзе ў 2001 г. былі пры ўладзе на пачатку 90-х».

Палітыка ўлады, накіраваная на тое, каб стрымаць распаўсюджванне беларускай мовы, мае пераважна сацыяльна-палітычную аргументацыю і фармулюецца ў кантэксце апраўдання. Можна казаць пра наяўнасць пэўнага палітычнага «комплексу беларускай мовы», калі выцісканне яе са штодзённага ўжытку патрабуе для палітычных суб'ектаў вельмі асцярожнай аргументацыі, а таксама «апраўдання» і дэманстрацыі сімвалічнай прыхільнасці да яе. Гэта сведчыць пра тое, што ідэнтычнасць улады не пазбаўлена ўплываў дыскурсу «адраджэння», якое адводзіла мове цэнтральнае месца ў нацыі. Але, здаецца, гэта адзіны прыклад такога ўздзеяння.

Лакалізацыя расійскай мовы і існаванне беларускай у моцна абмежаваных сацыяльных рамках робіць лінгвістычны элемент ідэнтычнасці, якую транслюе ўлада, дэцэнтралізаваным і да канца не вызначаным. Жаданне пазбегнуць вызначэння патрабуе, аднак, дэлегітымацыі не толькі «нацыянальнай мовы» як прыкметы беларускага этнасу, але і дэканструкцыі меркаванняў «пра адзінае паходжанне сучасных беларусаў».

[31] Можна, такім чынам, сцвердзіць, што беларуская мова ў Беларусі — гэта тое самае, што ірландская мова ў Ірландыі і былых калоніях Брытаніі.

[32] Гэта, безумоўна, не адносіцца да моладзі, якая ўсё больш і больш выкарыстоўвае беларускую мову ў якасці сродку камунікацыі, колькі нацыянальным сімвалам.

Паказальным тут з'яўляецца сістэматычнае выкарыстанне (у прыватнасці, прэзідэнтам у лекцыях перад студэнтамі) метафары маштабнага «кровазмяшэння» і апісання Беларусі як «melting pot» Усходняй Еўропы. Натуральна, вобраз Беларусі як «плавільнага катла» мае мала супольнага з працэсамі рэальнага этнагенезу, але з'яўляецца важным элементам палітычнай рыторыкі рэжыму. Палітычныя мэты метафары «melting pot» відавочныя: яны адлюстроўваюць асноватворныя структуры нацыянальнай ідэнтыфікацыі ўлады. «У нас кроў настолькі перамяшаная...», «мы, беларусы, таму такія хітрыя і разумныя, што беларус – гэта *букет крывей*». Згадваецца, што Вялікае Княства Літоўскае, Рэч Паспалітая і Савецкі Саюз развіваліся як шматнацыянальныя дзяржавы. Такое разуменне прыроды беларускага супярэчыць нават канцэпту савецкай нацыі, якая прызнавала асобнае этнічнае паходжанне беларусаў.

«Сярод рысаў беларускага характару выступае... інтэрнацыяналізм, а не нацыяналізм». «Калі мы стваралі наш гімн... я сказаў: зрабіце так, каб наш гімн гучаў як гімн народу-інтэрнацыяналіста»[33] . Каб убачыць ідэнтычнасць улады, слова «інтэрнацыяналізм» тут трэба разумець не ў савецкай традыцыі – традыцыі роўнасці/салідарнасці народаў, – а як практыкі *нацыі-паміж (інтэр-нацыі, між-нацыі)* , як стан легітымнай нявызначанасці і жаданне пазбегнуць глыбокай і абавязковай нацыянальнай ідэнтыфікацыі. Традыцыйныя для Ўсходняй і Цэнтральнай Еўропы цэнтры нацыянальнай ідэнтычнасці – мова і супольнае паходжанне – сублімуюцца палітычнымі практыкамі рэжыму. Разам з разбурэннем савецкай свядомасці на першае месца, як і раней у гісторыі, выходзяць практыкі «тутэйшасці», да-нацыянальнага ці між-нацыянальнага, якія спалучаюцца з традыцыйным імкненнем пазбегнуць вызначэння зместу сваёй ідэнтычнасці, артыкуляваннем «неасаблівасці» і «падобнасці» нацыянальна беларускага да *іншага*.

Для між-нацыі сітуацыя дзвюхмоўя, дакладней бязмоўя (у сэнсе існавання без нацыянальнае мовы), больш натуральная, і нігілістычнае стаўленне да кожнай з нацыянальных моваў паводле азначэння не могуць быць самакаштоўнымі, але

[33] Такім сэнсам і ўзмоўнай якія і максімальна

«тутэйшай» самасвядомасці.

Інтэр-нацыянальная метафара створана і для адказу на больш важнае з палітычнага пункту гледжання пытанне: «Чым мы – расійцы і беларусы – адрозніваемся?» Канцэнтраваны адказ улады будзе – *практычна* нічым. У выніку «аб'ектыўных прычынаў, перш за ўсё эканамічных (*??? – **Аўт.***), і таму мы практычна адзін народ». Слова «практычна» тут цэнтральнае: *практычна* нічым – значыць, *нічым* не адрозніваемся, што б мела *практычнае* значэнне (эканамічнае, палітычнае etc.). Слова *практычна* нясе асаблівы сэнсавы цяжар для ідэнтычнасці, адсылаючы да бясконцых нюансаў некарыснага і нецікавага непадабенства[34]. «Нармальная расійскасць» беларускага рэжыму ўсё больш сутыкаецца з ненармальнай палітычнай, эканамічнай і культурнай расійскасцю Расіі, што часам выклікае шчырае неразуменне і яшчэ большае адчужэнне. Дыстанцыя паміж расійскімі «русскими» і беларускімі «рускімі» непазбежна павялічваецца, ставячы пад пытанне ўсё больш і больш метафарычную «агульнасць».

аморфным і невыразным. Прыпамяні, з прапанаваных версій імну выбралі тую, якая найменш падыходзіла для яго статусу.

[34]Менавіта ў такім кантэксце расійскую мову можна называць «інструментам нашых ведаў». Які інструмент, такія і веды.

ДЗЯРЖАВА

Дзяржава – адзіны «цэнтр», існаванне якога прызнаецца і насаджаецца рэжымам. Астатнія магчымыя пункты канцэнтрацыі свядомасці і ўлады – нацыя, мова, культура і г. д. – паслядоўна дэлегітымуюцца палітычнымі і культурнымі практыкамі рэжыму. У адрозненне ад «беларускай дзяржавы», яе незалежнасці ды суверэнітэту, беларуская нацыя ўяўляе дастаткова цьмяную каштоўнасць для ідэалогіі беларускага рэжыму.

Калі нацыянальная (у сэнсе нацыянальна-культурная) ідэнтычнасць «беларускай мадэлі» скіравана да максімальнай нявызначанасці, то дзяржаўная самасвядомасць выяўляецца адкрыта. І хоць адзінае разуменне дзяржаўнай традыцыі адсутнічае, каштоўнасць «суверэнітэту і незалежнасці» «нашага супольнага дому Беларусі» ўсяляк падкрэсліваецца і не ставіцца пад пытанне. У нас «павінна быць незалежная дзяржава», «мы павінны развівацца незалежна». Незалежнасць

звычайна транслюецца ўладаю як бясспрэчная каштоўнасць, галоўны сродак забеспячэння дзяржаўных, нацыянальных і народных інтарэсаў.

Такая «дзяржаўніцкая» рыторыка – з'ява адносна новая, найбольш адкрыта сфармуляваная пасля 2000-2001 гадах, калі праект інтэграцыі з Расіяй пачынае ўстойліва губляць свой палітычны капітал. Раней, у сярэдзіне 90-х, само слова «незалежнасць» (якое, здавалася, гучала занадта «нацыяналістычна») сублімавалася і замянялася на больш паліткарэктнае «суверэнітэт». Беларусь – «суверэнная рэспубліка». Гэта выклікала ўстойлівыя асацыяцыі з савецкай дзяржаўнай традыцыяй і БССР[35] . Цяпер слова «незалежнасць» выходзіць на першы план і займае ўсё большае значэнне, нават для дыскурсу «ідэалогіі беларускай дзяржавы» (тое, што В. Булгакаў і Ю. Чавусаў назвалі «папулісцкім нацыяналізмам»).

Праект інтэграцыі з Расіяй захоўвае сваю актуальнасць, але набывае іншае гучанне. Гэта абавязкова *раўнапраўны* саюз дзвюх *незалежных* і суверэнных дзяржаваў. «У нас, у беларусаў, менталітэт іншы: для расійцаў не страшна, каб кіраваў іншаземец (што ў гісторыі краіны шмат разоў было), а нам страшна, каб і Расія рабіла тое ж». «Толькі праца на роўных – ніякай «інкарпарацыі Беларусі».

Дапускаюцца і больш паказальныя выказванні. Калі раўнапраўя не будзе, «будзем, сціснуўшы зубы, трываць, будзем працаваць, як яно ёсць». Тут нават існаванне без Саюзу не выглядае як катастрофа, што яшчэ 3-4 гады таму значыла адступленне ад дзяржаўнай палітыкі. Магчыма, гэта толькі рыторыка, але тое, што рыторыка стала менавіта такой, сведчыць пра многае.

Такім чынам, «слабая» ідэнтычнасць улады мае адно «моцнае» выключэнне – беларуская дзяржава. Калі на самых ранніх этапах эвалюцыі рэжыму дзяржаўнасць разглядалася толькі як сродак для дасягнення мэтаў, пастаўленых рэвалюцыяй 1994 (у тым ліку і пранікнення на расійскі палітычны рынак), то цяпер гэта адзіная прастора існавання рэжыму. Цяпер беларуская дзяржава набыла вялікае палітычнае значэнне, і недзе пасля

[35] Цікава, што ў Беларусі, у адрозненне ад Расіі, слова «суверэнітэт» (ці «суверэнны») не мае негатыўнага адцення. «Незалежнасць» суадносілася з нацыянальнай традыцыяй разумення дзяржаўнасці (ад БНР), «суверэнітэт» – з савецкай (БССР).

2001 году пачалася выразная ідэнтыфікацыя ўлады з ёй і паступовая міфалагізацыя ды ўзвядзенне ў сістэму «трывалых каштоўнасцяў», калі ў нашым кантэксце пра такія можна весці размову.

Імкненне пазбегнуць нацыянальнай і культурнай ідэнтыфікацыі з'яўляецца адной з прыкметаў сучаснага свету, калі выбар самасвядомасці робіцца праблемным, а межы звыклай ідэнтычнасці – размытымі. Тым не менш, для Беларусі гэты феномен мае не столькі новы, колькі традыцыйны характар, добра апісаны яшчэ ў XIX стагоддзі. Культурныя практыкі накіраваныя на максімальнае расцярушванне ідэнтычнасці і пазбаўленне яе выразнага цэнтру, на месца якога можа прэтэндаваць толькі дзяржава.

Часам тыя, хто шчыра любіць беларускую культуру і мову, вельмі холадна, абыякава ставяцца да беларускай дзяржавы. З іншага боку, часцяком людзі, адданыя ідэі незалежнае Беларусі, не разумеюць, навошта «чапляцца за калхозную, напалову мёртвую мову». Можна было б назваць гэтую ідэнтычнасць «гібрыднай» альбо, з лёгкай рукі У. Абушэнкі, «крэольскай», калі б не недаравальная нявызначанасць гэтых паняткаў для беларускага кантэксту. Гібрыднасць патрабуе вызначэння двух «чыстых» першапачатковых тыпаў, якія потым утварылі нейкую «сумесь», «сінтэз» і г. д. «Крэольскасць» патрабуе пошуку цэнтру, перыферыі і міграцыйнага руху. І першае, і другое пры ўважлівым даследаванні сутыкаецца са значнымі канцэптуальнымі цяжкасцямі.

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ/ДЗЯРЖАЎНАЯ СІМВОЛІКА

Спрэчка пра сімволіку яшчэ здольная выклікаць эмоцыі, але яе сацыяльная энергетыка, здаецца, згасла. «Сам па сабе бел-чырвона-белы сцяг не вінаваты», ён больш не з'яўляецца сімвалам пагрозы і палітычнае альтэрнатывы.

У 1995 г., калі Ціцянкоў драў на сувеніры бела-чырвона-белы сцяг на будынку Адміністрацыі прэзідэнта, ён вынішчаў рэшткі палітычнага праекту «адраджэння», які, здавалася, увасабляў

асноўную пагрозу дэстабілізацыі для новага рэжыму. Калі моладзь у 1995-96 гадах паліла чырвона-зялёныя сцягі, зрывала іх са слупоў падчас дэманстрацый і здымала з афіцыйных будынкаў, гэта быў таксама палітычны чын супрацьстаяння рэжыму і «акупацыі». Паступова, аднак, новая сімволіка пачала ўспрымацца не як сімвал акупацыі, а як няправільны беларускі сімвал, які перастаў мець канкрэтнае палітычнае значэнне, тым больш што ўжо цэлая генерацыя вырасла, ведаючы толькі яго.

Новая сімволіка становіцца часткай ідэнтыфікацыі, сродкам рэпрэзентацыі не толькі і не столькі рэжыму, колькі Беларусі. Гэтае стаўленне можна параўнаць з стаўленнем да сімволікі БССР, якая магла ўспрымацца як «няправільная», але адначасова была важным элементам нацыянальнага самаадрознівання. Усё негатыўнае стаўленне было накіравана супраць СССР, а не савецкае Беларусі (бо гэта *ўсё-такі* Беларусь).

Чырвона-зялёны сцяг цяпер – гэта «няправільны» *беларускі* сімвал. Няправільны, але *беларускі*, і ўсё менш савецкі.

Бел-чырвона-белы сцяг таксама «не вінаваты». Гэта азначае не яго легітымацыю, але дастаткова спакойнае ўспрыманне. Здаецца, для ўлады ён усё больш траціць палітычнае і набывае пераважна гістарычнае значэнне. Нават вяртанне нацыянальных сімвалаў не выглядае вар'яцтвам ці здрадаю: «Можа быць, калі-небудзь мы вернемся да гэтага пытання, але не цяпер», – кажа прэзідэнт, усяляк адмаўляючы сваё асабіста негатыўнае стаўленне да нацыянальнага сцягу.

Улада легітымуе новую («савецкую, як яе некаторыя называюць») сімволіку праз «народ» і «закон».

«Калі мяняць сімволіку, з якой нашы папярэднікі жылі, працавалі і ваявалі, то мы павінны былі параіцца з народам. Я даў магчымасць людзям вызначыцца» – правёў рэферэндум. Цяпер усе павінны паважаць гэтую сімволіку, таму што гэта закон, як гэта рабіў і сам прэзідэнт у 1994 годзе, цалуючы бел-чырвона-белы сцяг падчас інаўгурацыі. Пра перавод аргументацыі ў «прававую» сферу дадаткова сведчыць зніжэнне

палітычнай і эмацыйнай напоўненасці «спрэчкі пра сімвалы».

X. Генеалогія рэжыму

У 1995 годзе... усё ляжала ў руінах.

А. Лукашэнка

Нягледзячы на падобную рыторыку, мы не можам казаць пра прамую пераемнасць савецкага рэжыму і рэжыму сучаснага. Гэта, я думаю, відавочна для ўсіх, акрамя вонкавых/замежных аналітыкаў, якія прызвычаіліся ўсё падводзіць пад уласныя зручныя схемы. Рэвалюцыя сярэдзіны 90-х не стала ні «вяртаннем імёнаў», ні «вяртаннем да маці»[36] . Для стварэння ўласнае генеалогіі рэжым значна часцей выкарыстоўвае супрацьпастаўленне з «хаосам пачатку 90-х» – менавіта з гэтага «хаосу» ён і паўстаў.

У кантэксце настолькі характэрнага ідэалагічнага ўнікерсуматыўныя вобраз «пачатку 90-х» паўстае як вобраз сістэмаўтварэнні, ад якога пачынаецца сапраўднае «нармальнае» фармаванне беларускай дзяржавы. Рэжым сапраўды выводзіць сваю генеалогію з 1994-1996 гадоў і, натуральна, не мае ніякага жадання хоць неяк атаясамліваць сябе з першымі гадамі незалежнасці. Прэзідэнт дакладна вызначае ўзрост «нашай дзяржавы» – 8 гадоў (1995, год першага рэферэндуму і фармавання «вертыкалі ўлады»). «Толькі 8 гадоў, як мы пачалі фармаваць сваю дзяржаву» (с. 11, 41). З логікі ідэалагічных схемаў, 1990-1994 гады – вір разбурэння, этнічнай варожнечы, эканамічнага калапсу, палітычнай анархіі і здрадніцтва. Эліса «дэмакратыі», «незалежнасці» (абавязкова ў двукосрэформ размова тут не можа ісці пра сапраўдную дэмакратыю і незалежнасць, якую персаніфікуе рэжым) – здрадніцкія ілюзіі. ператвораны ў начное трызненне. Звычайная пазіцыя прадстаўнікоў сістэмы: так, менавіта так адбывалася ў тыя часы, але я (мы) не маем да гэтага дачынення, «апазіцыя» (гэта значыць «тыя-хто-цяпер-у-апазіцыі») – яны ў гэтым вінаватыя, мы былі апошнім бастыёнам «нармальнага розуму» супраць «рэфарматарскага», «нацыяналістычнага», «ліберальнага» etc.

[36] Кансультатыўныя версіі, ад рэвалюцый. «Вяртанне імёнаў» - дадзіяльны краіна. Канфуцыя, вяртанне да маці» - гаражнечы, цэнтральнага рэформы ў шумерскай цывілізацыі.

шаленства. Дарма што тады шмат хто з апарату займаў пасады дый цяпер прыгадвае гэты час як «залаты век», калі можна было многае.

«Думаю, многія памятаюць, якая разруха была ў сярэдзіне 90-х, на жаль, не толькі ў матэрыяльнай базе, але і перш за ўсё ў галовах, ладзе жыцця» (?! – **А.К.**). «Таму мне многа што дазволена, і вы не маеце права на мяне крыўдаваць». Такая сінтаксічная канструкцыя пачынае будаваць спецыфічную логіку мыслення, якая выходзіць далёка за межы спрэчак пра тое, што было на самай справе, і складае падмурак стратэгіі кіравання. Здзіўляе, наколькі моцная яшчэ апеляцыя да дэмакратычнай улады перыяду 1991-1994 гадоў. Тэрмін існавання сучаснага рэжыму ў тры разы перавышае час «дэмакратыі», але апеляцыя да гэтага дастаткова аддаленага перыяду мае ў дыскурсе ўлады вельмі вялікае значэнне.

Вось некалькі найбольш важных бінарных апазіцый, на якіх сучасны рэжым будуе сваю генеалогію:

— распрадаць, спыніць буйныя прадпрыемствы, аддаць уладу крыміналу і карупцыі альбо навесці парадак ва ўсіх структурах дзяржаўнага кіравання;

— пакінуць без дзяржаўнай падтрымкі адукацыю, навуку, медыцыну альбо захаваць моцную дзяржаўную палітыку;

— пакінуць парламенцкую анархію альбо выбудаваць эфектыўную вертыкаль кіравання з персанальнай адказнасцю;

— пайсці ў нацыяналістычным кірунку альбо забяспечыць сацыяльна-палітычную стабільнасць.

Такія апазіцыі сустракаюцца скрозь па тэксце выступаў прэзідэнта нават перад студэнтамі і могуць быць важным сімптомам.

Акт паўстання новага рэжыму легітымуецца не толькі станам «хаосу», але і «народнай падтрымкай». Народ нібыта самастойна выявіў сваю прыхільнасць да новага ладу і новае канстытуцыі на рэферэндуме. Больш за тое, вырашэнне

канстытуцыйнай крызы на карысць прэзідэнта «было адзіным сродкам пазбегнуць гвалту», бо «ўжо некаторыя зброяй «ляскалі» ды на сілавыя захады правакавалі».

Карпаратыўнага адзінства новы рэжым не меў, як і не меў прэзідэнт уласнай каманды праз адсутнасць досведу бюракратычнай і апаратнай працы. Улады для прыходу «новай», амбіцыйнай бюракратыі было дастаткова, але «нешта яго ўтрымала ад памылак». Цяпер рэжым лічыць сваім гонарам, што ён не стаў «рэзаць па жывому і мяняць усю ўладу», «там было шмат таленавітых, гадамі шліфаваўся досвед. Гэтае ядро засталося і перш за ўсё ў эканоміцы». Частка «новых людзей» збегла з ураду, астатнія заняліся ідэалогіяй, кадрамі і правам. Тыя, хто не павінны былі «быць пры ўладзе», праз сваю «здрадлівасць і несумленнасць» (гэта тычылася і старой, і новай эліты), сталі «дэструктыўнай апазіцыяй».

«...Потым быў рэферэндум. Потым мы боўталіся, неяк выкарабкаючыся, выкарыстоўваючы старыя кадры, ... тады была праблема і мы яе вырашылі». Прыкладна так выглядае кароткае самаапісанне беларускім рэжымам уласнае генеалогіі.

Такім чынам, сваю генеалогію рэжым пачынае недзе ў 1994-95 гадах. Рыторыка ўлады сістэматычна падкрэслівае, што Беларусь толькі пачала складвацца як дзяржава. «Мы, як і іншыя краіны СНД, не мелі традыцый дзяржаўнасці. У савецкія часы мы былі «ўскраінай», «правінцыяй» і, натуральна, не мелі таго, што павінна мець дзяржава».

У адрозненне ад большасці краінаў рэгіёну, якія рознымі шляхамі спрабуюць паглыбіць сваю гісторыю, беларускім уладам гэтага не трэба (уся рыторыка пра «традыцыю беларускага народу», «карані» і г. д. мае абстрактны, а не канкрэтна гістарычны змест, дакладней, гэты змест наўмысна агістарычны). Што яшчэ больш важна (асабліва для вонкавага назіральніка): рэжым не выводзіць сваёй генеалогіі з савецкай сістэмы, хоць і падкрэслівае сваю сімвалічную лаяльнасць да яе досведу. *Новы рэжым* - гэта ўтаймаванне паслясавецкага хаосу, а не жыццё mos maiprum[37] савецкага палітычнага і эканамічнага ладу, як гэта часта (і, на маю думку, зусім беспадстаўна) апісваюць СМІ, а таксама расійскія і заходнія

аналітыкі.

XI. Гісторыя і яе будучыня

Калі б нехта хацеў даказаць, што гісторыя – гэта толькі лялька ў руках тых, што з ёю гуляе, то ён мог бы ўзяць у якасці прыкладу Беларусь і Украіну.

Даніэль Бавуа. Спрэчкі гісторыкаў Францыі, Расіі і Польшчы вакол Украіны-Русі

Вы можаце мяне папракнуць, што я ў гісторыі шукаю апраўданне гэтаму курсу, але калі гісторыя дае такое апраўданне і я яго знаходжу, дык што ў гэтым благога?

А. Лукашэнка

Гісторыя з'яўляецца важным элементам нацыянальнай тоеснасці: «Назапашаны народам гістарычны досвед павінен творча выкарыстоўвацца для ўзмацнення нашай маладой дзяржаўнасці, для вырашэння задач мінулага і сучаснага». «Беларусь – краіна паводле гістарычных мерак маладая, але наш народ мае шматвекавую гісторыю». Бітва за гісторыю, дакладней, за гістарычную памяць у Беларусі налічвае ўжо некалькі стагоддзяў, нават у сучаснай Беларусі такая барацьба мае сваю насычаную падзеямі гісторыю, дастаткова ўзгадаць, колькі разоў перапісваліся падручнікі гісторыі за апошнія 13-14 гадоў.

Палітычныя сілы ставіліся і ставяцца да гісторыі вельмі ўважліва, шукаючы тут не толькі сродак фармавання масавай свядомасці, але і крыніцу «сакральнага» для грамадства. Інтэрпрэтацыя гісторыі ў дыскурсе ўлады зазнала апошнім часам пэўныя змены, але пераважна яны тычацца рознай расстаноўкі акцэнтаў, а не карэннага перагляду.

[37] Лац. «паводле звычаю продкаў».

Дамінантнай да гэтага часу застаецца канцэпцыя трыадзінага рускага народу і агульнарускага паходжання нашай дзяржаўнасці[38] . Канцэпцыі пра агульнарускую народнасць, мову, самасвядомасць, дзяржаву («заснаваную на моцнай княскай уладзе») успрымаюцца як аксіёмы. Гэта нават служыць наіўнай аргументацыяй на карысць гістарычных вытокаў дзвюхмоўя ў Беларусі. Больш за тое, сцвярджаецца, нібыта і Ф. Скарына пісаў «па-руску», а «руская мова» была кніжнаю для насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага, хоць агульнавядома, што тая «руская мова» была далёка не «рус*с*кая мова» ў сучасным разуменні.

Інтэграцыі гістарычнай і культурнай спадчыны ВКЛ[38] у адным з гістарычны канон улады так і не адбываецца, хоць пэўны прагрэс у гэтым працэсе заўважны. Рускія землі ўчынялі «зацятае супраціўленне» пашырэнню ВКЛ, а Полацкае і Віцебскае княствы неаднаразова бунтавалі супраць улады княства. ВКЛ – дзяржава збольшага чужая, і яе нельга *уласна* беларускай, хоць можна лічыць *да пэўнай ступені* беларускай. Прыкладна такія формулы вызначаюць ВКЛ у гістарычным каноне афіцыйнай улады. Асаблівая надаецца сцверджанню праваслаўнай ідэнтычнасці, роду міфу пра «асаблівую вернасць беларусаў праваслаўю», якое «захоўвалася і ўзмацнялася на працягу стагоддзяў», нельга лічыць гістарычнай праўдаю (дастаткова ўзгадаць два стагоддзі дамінавання Уніі).

Натуральна, што далучэнне да Расіі было пазітыўным фактам (беларускі народ выратавалі ад шляхецкай анархіі), а паўстанні супраць Расіі – толькі рухам «чужой па духу» для беларускага народу шляхты.

БНР – не дзяржава, а БССР – калыска беларускае незалежнасці. Рэпрэсіі 30-х гадоў беларусаў практычна не закранулі, «бо ў Беларусі былі добрыя кіраўнікі, якія… заўсёды абаранялі народ».

Культывуецца шэраг іншых гістарычных міфаў: беларусы ніколі не былі заваёўнікамі, заўсёды арыентаваліся на прынцыпы сацыяльный справядлівасці. Акрамя таго, увесь гістарычны шлях нашага народу адзначаны стваральнай дзейнасцю. Усё

гэта спалучаецца з рытуальным выкрыццём «гістарычных фальсіфікацый» ідэалагічных ворагаў, іх таемных сімпатый да фашызму, русафобіі і паланафільства.

Вось такім чынам пераняты савецкі гістарычны корпус з некаторымі «дадаткамі» незалежнасці ды суверэнітэту. Хоць гэта і мае нечаканы «патрыятычны» разварот кшталту: «Мяне глыбока абурае і як гісторыка, і як кіраўніка дзяржавы, калі Беларусь атаясамліваецца то з Вялікім Княствам Літоўскім, то з Польшчай, то з Расіяй. Мы павінны ганарыцца тым, што стварыў і чым быў слаўны наш беларускі народ, а не ягоныя гістарычныя суседзі», – дзе праступае імкненне ачысціць беларускую годнасць ад вонкавых напластаванняў. Хоць і тут прыняцця спадчыны ВКЛ не адбываецца.

Збольшага беларускі рэжым шукае сваю сутнасць не ў гістарычнай традыцыі, а ў сучаснасці і перш за ўсё ў палітычных і сацыяльных практыках апошніх 8-10 гадоў. Беларускі рэжым пазіцыянуе сябе як сістэму з кароткай генеалогіяй, што можна лічыць цалкам палітычна апраўданым.

Як бы ні склалася *будучыня* Беларусі, не факт, што яна стане *гісторыяй*.

XII. Без заканчэння

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (33) – 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/1/12
[image]

ВОЛЬФ РУБІНЧЫК
палітоляг, выдавец незарэгістраванага часопісу «Шахматы плюс».

Вольф Рубінчык Лукашэнка бяз маскі, або Гульня на паніжэнне

Кнігі, якія аглядаюцца ў артыкуле:

Шеремет П., Калинкина С. *Случайный президент*. Ярославль: Нюанс, 2003.

Нудельман Ю. *Щаранский без маски*. Беер-Шева: Негев-пресс, 1999.

Сярэдзіна 1990-х была для Беларусі і Ізраілю часам «вялікай смуты». Старыя ідэалагічныя сістэмы («камунізм», «сіянізм») атрымалі сур'ёзны ўдар, новыя знаходзіліся ў працэсе станаўлення. Жыхары Беларусі гадалі, у колькі разоў павялічацца цэны ў наступным месяцы, выбіралі першага прэзідэнта ды спазнавалі, чым ёсць рэферэндум. Ізраільцяне смуткавалі з нагоды забойства прэм'ер-міністра Іцхака Рабіна, якое раскалола нацыю, вызначалі сваё стаўленне да мірнага працэсу ды новых імігрантаў з СССР-СНД. Лік апошніх у той час наблізіўся да мільёна, што склала пятую частку ўсяго насельніцтва. З таго мільёна амаль сотня тысяч прыбыла з Беларусі. Інтэграцыя паставіла перад усім ізраільскім грамадствам шэраг сур'ёзных праблемаў, перадусім

культурніцкіх, што не вырашаны канчаткова і да сёння.

Нават калі б Беларусь з Ізраілем не былі павязаныя безліччу ніцяў, кнігі «Выпадковы прэзідэнт» (далей – «ВП») і «Шчаранскі без маскі» (далей – «ШчБМ») варта было б паставіць побач. Іх героямі сталі людзі з падобнымі палітычнымі біяграфіямі. Абодва прыйшлі ў вялікую палітыку на стыку эпох, надзвычай хутка падняўшыся на ліфце «сацыяльнай мабільнасці» дзякуючы набору папулісцкіх лозунгаў. Абодва здольныя мабілізаваць падтрымку замежных спонсараў, набіваючыся ў сябры да кіраўніцтва супердзяржаў. Абодва не любяць рабіць справаздачы аб сваіх фінансавых справах. Нарэшце, абодва гавораць з адчувальным акцэнтам і захапляюцца спартовымі гульнямі, прапагандуючы іх жыўцом. Ідзецца пра беларуса, хакеіста Аляксандра Лукашэнку і ізраільцяніна расійскага паходжання, шахматыста Анатоля (Натана) Шчаранскага. Як будзе паказана далей, журналісцкая трактоўка гэтых асобаў шмат у чым падобная.

Пра тое, хто такі Лукашэнка, чытач гэтай рэцэнзіі апрыёры ведае дастаткова. Асоба Натана Шчаранскага наўрад ці часта трапляе пад увагу беларускай публікі. Нашай краіны ён, у адрозненне ад свайго калегі Авігдора Лібермана, не наведваў. Тым не меней, шлях у блізкаўсходнюю палітыку ўраджэнца Данецку, дысідэнта 1970-х, які амаль дзевяць гадоў адседзеў у савецкіх турмах, з'яўляецца досыць павучальным і для нашых краёў. Кніга «ШчБМ», ілюстраваная былым менчуком Канстанцінам Лейтэсам, дадае нечаканыя штрыхі да параднага партрэту «героя нашага часу»[1] – кіраўніка партыі «расійскіх імігрантаў» (насамрэч у Ізраілі «расійцамі» называюць і выхадцаў з Беларусі), дэпутата парламенту з 1996 г., былога міністра прамысловасці і гандлю, унутраных спраў, будаўніцтва, віцэ-прэм'ера ўраду, цяперашняга міністра па сувязях з дыяспарай… Шанцаў стаць на чале дзяржавы ў Шчаранскага не так многа, як здавалася ў канцы мінулага стагоддзя: па меры інтэграцыі новых імігрантаў у Ізраілі партыя «Ісраэль ба-алія» страціла значную частку свайго электарату. І ўсё ж важыць ізраільскі ўрадовец у сусветнай палітыцы, бадай, не меней, чым беларускі лідэр. Пад імя Шчаранскага ў 1980–1990-х гг. ствараліся фонды, збіраліся

рэсурсы, якія шматкроць пераўзыходзілі, напрыклад, рэсурсы Лукашэнкі ў час прэзідэнцкай гонкі 1994 г. Пра славутага вязня здымаліся фільмы, яго імем названы скверык у амерыканскай сталіцы…

Дзве кнігі, дзве спробы наблізіцца да разумення «феноменаў»[2]. Метады, ужытыя аўтарамі, дэманструюць больш падабенства, чым адрозненняў. І Шарамет з Калінкінай, і Нудэльман цытуюць афіцыйныя біяграфіі сваіх герояў, ставячы на шаль сумнеў. Робяцца экскурсы ў дзяцінства, зварот да радаводу – нібыта гіпотэзы пра «цыганскае» або «яўрэйскае» паходжанне Лукашэнкі, «камуністычнае мінулае» бацькоў Шчаранскага, могуць нешта растлумачыць у кар'ерным росце герояў. Палітычнай псіхалогіяй тут не пахне – хутчэй, чытачу імпліцытна навязваецца вобраз «чужынца», ад якога менавіта шанцаў дачакацца нейкіх дабротаў. Аўтары кніг пра Лукашэнку і Шчаранскага чапляюцца і за дэталі аблічча сваіх герояў, таксама мусіць дадаваць апошнім хтанічнага каларыту. На трыбуне малады чалавек дзіўнага выгляду, чырвоны, запінаючыся, штосьці хрыпіць…» («ВП»). «Ростам ён не большы за 160 сантыметраў. Ён лысы, косаплыкі на вачах, на ўсіх мовах, на якіх гаворыць…» («ШчБМ»).

Нудэльман Ю. Цудоўны чалавек, умомант ператвараецца ў «Вялікага Правакатара», і – Шарамет з Калінкінай – у «Нудэльмана, які адмаўляе, што ён Нудэльман». Пра Ю. Нудэльмана: «Маладзён з вялікай літары, адзін з тых, хто ўмее, хто ведае, і – галоўнае – хто хоча». Калінкіна заяўлена як «адзін з самых кампетэнтных экспертаў па сітуацыі ў Беларусі», а Нудэльман на прэзентацыі сваёй кнігі заяўляў: «Да мяне ніхто і ніколі гэтак грунтоўна не вывучаў жыццёвага шляху Шчаранскага»[3]. Аўтарам яўна бракуе памкнення да аб'ектыўнасці. Шарамет з Калінкінай часткова здымаюць з сябе адказнасць за якасць свайго «аналітычнага праекту» агаворкай «гэта наш асабісты погляд»[4]. У Нудэльмана даследаванне мяжуе з «расследаваннем» і спалучана з абвінавачаннем героя кнігі не толькі ў падмане выбарцаў, але і ў нанясенні шкоды дзяржаве Ізраіль[5]. Тое самае паўторана ў іўрыцкім варыянце «ШчБМ», які выйшаў адначасова з расійскамоўным.

[1] Цытата з кнігі Шарамет з Калінкінай «Вялікі Правакатар» (1994).

[2] «Лукашэнку трэба вывучаць як феномен» – загаловак інтэрв'ю з С. Калінкінай у «Независимой газете» (22.12.2003).

[3] Выяўляецца, «з яго смяяліся, а пара падумаць, чаму гэта адбывалася, чаму ён так лёгка ператвараў сваіх праціўнікаў у смешных дурняў». Пра тую ж самую «Вялікую Хітрасць» Шчаранскага пісаў і Ю. Нудэльман: «Шчаранскі ўвесь час ведаў, што ён робіць, і – галоўнае – ведаў, чаму ён гэта робіць».

[4] Шарамет з Калінкінай: «Нудэльман прадаваў, што адбывалася ў ЦРУ».

[5] Нудэльман: «Шчаранскі ўвесь час ведаў, што ён робіць, і – галоўнае – ведаў, чаму ён гэта робіць».

Намёкі на супрацоўніцтва героя кнігі з расійскімі спецслужбамі сталі падставай для пазову ад імя Шчаранскага, у выніку чаго ў 2003 г. кніга «Шчаранскі без маскі» была забаронена для распаўсюджвання ў Ізраілі як «паклёпніцкая». У Шарапе з Калінкінай абяцаная праўдзівасць («не ўся праўда, але толькі праўда») усцяж абарочваецца чуткамі і дадумкамі кшталту «кажуць… ён тады пакінуў маладую жонку з дзіцем ні з чым. Але хто ведае?..». «Махровы антысемітызм беларускага ўрада вядомы ўсім» (тутсама высвятляецца, што аўтарам ён быў выдадзены са слоў неназванага кіраўніка расійскай піваварнай кампаніі). Безумоўна, карыстанне сумнеўнымі крыніцамі інфармацыі (накшталт былой старшыні Нацбанку Т. Віннікавай, якую аўтары называюць «жанчынай абаяльнай, какетлівай, але крутой і каварнай у бізнесе») не дадае кнізе аўтарытэту. «Дакументы знішчаны або захоўваюцца ў недаступных у грамадскасці месцах» – так аргументуюць сваю пазіцыю ў канцы кнігі.

Кніга Нудэльмана, падрыхтоўка якой зацягнулася больш як на тры гады (у адрозненне ад кнігі пра Лукашэнку, напісанай, паводле прызнання С.Калінкінай, за некалькі месяцаў у 2003 г.), абапіраецца на сведчанні знаных асобаў, чыю рэпутацыю няпроста паставіць пад сумнеў, – былых дысідэнтаў ці «адмоўнікаў», жыхароў Ізраілю і Расіі. Праўда, дакументальная база і тут кульгае: як тлумачыць Нудэльман, яму «давялося складаць аб'ектыўную карціну з асобных фраз, недагавораў, намёкаў, іншасказанняў». Вядома ж, апошнія – зброя слабых. Аўтар прызнае, што многія яго суразмоўцы не пажадалі дзяліцца інфармацыяй пра Шчаранскага, будучы, на яго думку, запалоханымі… Нягледзячы на стэрэатып аб Ізраілі як краіне, дзе свабода друку захоўваецца ў большай ступені, чым у Беларусі, версія Нудэльмана можа мець пад сабой грунт: у час візіту ў Мінск восенню 2002 г. славуты антысаветчык 1970-х гг., былы паплечнік Шчаранскага Эдуард Кузняцоў прызнаў, што ў Ізраілі цяжка казаць аб незалежнай расійскамоўнай прэсе, бо «Шчаранскі ўсіх купіў». Адпаведна, праз недагаворкі нудэльманаўская праца падвісае ў паветры, і вывады пра тое, што «яго [Шчаранскага] праваабарончая дзейнасць выдуманая, яго клопаты аб новых рэпатрыянтах фальшывыя, яго ізраільскі патрыятызм ненатуральны», могуць

Зноў жа, Нудэльман не знайшоў пераканаўчых доказаў таго, што Шчаранскі ў 1971 г. быў вербаваны КДБ. Ён толькі выказаў здагадку, што ў 1970-х гг. аўтары выбарчых спіс прэм'ер-міністра А. Шарона. У 1930-я гг. выкрывау негатыўныя зявы ізраільскай медыцыны у кнігах з красамоўнымі назвамі «Пралеце крывіу медыцыне», «Медыцынская мафія у каруцыйнай дзяржаве». Займаюц

разглядацца – і разглядаліся ў кулуарах партыі «Ісраэль-алія» – як звядзенне рахункаў з удачлівым навічком палітыкі.

Кніга пра Лукашэнку выглядае яшчэ менш скрупулёзнай працай, чым «ШчБМ». Па сутнасці, яе сэнс зводзіцца да чарговай пяцігадовай даўніны «Stop Luka» або ўлёткі пачатку ХХІ ст. «Он должен уйти». Дзесяцігоддзе існавання Лукашэнкі ў вялікай палітыцы (з моманту прызначэння «гэтага гарлапана» старшынёй антыкарупцыйнай камісіі ў парламенце) давала значна больш рэлевантнага матэрыялу для стварэння «палітычнага партрэту», чым тыя калейдаскапічныя фрагменты, што вынесены на суд чытачоў. Кідаюцца ў вочы фактычныя недакладнасці, якія сведчаць пра павярхоўнасць раскрыцця тэмы: Язэп Бролішс названы «Якавам» (с. 39), адстайка Чытіра адбылася ў лістападзе 1996 г., а не ў жніўні (с. 49), у чарговы раз перамагчы… у дзвюх-трох газет, што засталіся, з кожным годам усё менш і менш (с. 92–93; тыраж «Звязды» ў 1994 г. – 1 тыс. 77 экземпляраў[1]), «Наша ніва» ніколі не была «ўрадавай газетай» (с. 99), а Канстытуцыйны суд – «органам, які ўзначальвае Канстытуцыйны суд Беларусі» (с. 29)[2]. Ці не замест таго, каб аналізаваць, чаму ў Беларусі ўрэшце-рэшт не ўзнікла моцнай апазіцыйнай партыі, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[3]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[4]. Ці не замест таго, каб аналізаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[5]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[6]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[7]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[8]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[9]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[10]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[11]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[12]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[13]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[14]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[15]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[16]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[17]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[18]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[19]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[20]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[21]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[22]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[23]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[24]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[25]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[26]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[27]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[28]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[29]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[30]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[31]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[32]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[33]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[34]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[35]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[36]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[37]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[38]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[39]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[40]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[41]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[42]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[43]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[44]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[45]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[46]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[47]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[48]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[49]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[50]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[51]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[52]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[53]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[54]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[55]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[56]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[57]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[58]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[59]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[60]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[61]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[62]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[63]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[64]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[65]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[66]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[67]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[68]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[69]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[70]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[71]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[72]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[73]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[74]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[75]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[76]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[77]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[78]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[79]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[80]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[81]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[82]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[83]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[84]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[85]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[86]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[87]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[88]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[89]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[90]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[91]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[92]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[93]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[94]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[95]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[96]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[97]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[98]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[99]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[100]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[101]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[102]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[103]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[104]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[105]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[106]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[107]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[108]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[109]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[110]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[111]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[112]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[113]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[114]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[115]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[116]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[117]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[118]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[119]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[120]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[121]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[122]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[123]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[124]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[125]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[126]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[127]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[128]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[129]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[130]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[131]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[132]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[133]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[134]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[135]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[136]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[137]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[138]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[139]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[140]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[141]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[142]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[143]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[144]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказвае ўспаміны Шарамета пра тое, як ён «здабываў» для «Звязды» інтэрв'ю з Шушкевічам[145]. Ці не замест таго, каб даследаваць, чаму ў Беларусі не ўзнікла моцнага грамадскага руху, аўтар пераказ

здольным ні на што ўплываць. Не хочацца верыць, што ў імкнуцца зноў наблізіць гэткі «Залаты век» Беларусі, «Група дэпутатаў, «з маладых ваўкоў», зладзіла ў пакаленне дэбош». «Раней у апазіцыі былі нацыяналісты, Беларускі народны фронт… Выявілася, што палітыку Лукашэнкі падтрымліваюць вельмі і вельмі сур'ёзныя людзі». «Ці Лукашэнка адрадзіў БНФ да жыцця». Вось жа, амаль на «нацыяналісты – гэта бээнэфаўцы» характэрная якраз праўладнага дыскурсу. Паколькі БНФ паказаны з патэрналісцкіх пазіцый як несамастойная, слабасільная групоўка, расійскаму чытачу, найхутчэй, прышчэпваюць аб «несур'ёзнасці» нацыяналізму ў Беларусі, аб тым, што да Лукашэнкі ўсё спакойна было». Нездарма на фотаўкладцы выяўляюцца сутыкненні дэманстрантаў з міліцыяй з «Звыклыя сцэны сучаснага Менску» – улічваючы вышэйпададзенае, застаецца толькі крок да высновы летапісу: «Парадку на нашай зямлі няма… Прыходзіцца кіраваць намі». Бо парадак Лукашэнкі – «не той», з «кідалавамі»… Апошні выраз з крымінальнага лексікону належыць аўтарам і ўжываецца пры апісанні ўзаемадачыненняў Лукашэнкі з Булахавым. Моўныя абароты накшталт «ваўкі Сцяпанавіч Чарнамырдзін асабіста засведчыў…», маюць, сведчаць аб патаемнай павазе аўтараў да расійскага кіраўніцтва, якое можа памыляцца (Ельцын прымаўімя «непрыгожыя, але цвёрдыя рашэнні»), але нібыта ня тое самае «кідалава»…

У параўнанні з беларусамі Нудэльман больш стрыманы ў выбары моўных сродкаў. Дэмістыфікуючы вобраз Шчаранскага, ён надае менш увагі «ахвярам» свайго антыгероя, а болей – супярэчнасцям у заявах і дзеяннях Шчаранскага як палітыка ды грамадскага дзеяча. Зрэшты, і беларусы, і ізраільцяніну скарыстоўваюць гэты прыём – даць слова самому протаганісту, а потым пакпіць з яго слоў. Пэўная контрпрапагандысцкая логіка тут ёсць, але пачуццё меры часам адмаўляе аўтарам. Шарамет з Калінкінай у адным месцы даюць Лукашэнку слова аж на чатыры старонкі, што наводзіць на думку аб захапленні красамоўствам першага прэзідэнта РБ. Зрэшты, ён пайстае як ізаляваны «ўлюбёнец журналістаў», самотная постаць на тле зачышчанай палітычнай сцэны… Нудэльман зрабіў крыху

Лукашэнку ў нашумелым кастрычніцкім рускім нарысе «Ці Лукашэнка ідзе да дыктатуры» («Независимая газета», 27 кастрычніка), дзе дыскутуецца магчымасць «пераабуджэння» Расіі, яе «вяртання да сябе», «вяртання да сваіх каранёў». Ці ня ўсе гэтыя «вяртанні» – толькі ілюзія, ці не ўсе яны – «вяртанні ў мінулае»? Ці не ўсе яны – «вяртанні» ў тое самае «кідалава»…

Лукашэнку ў нашумелым кастрычніцкім рускім нарысе «Ці Лукашэнка ідзе да дыктатуры» («Независимая газета», 27 кастрычніка), дзе дыскутуецца магчымасць «пераабуджэння» Расіі, яе «вяртання да сябе», «вяртання да сваіх каранёў». Ці ня ўсе гэтыя «вяртанні» – толькі ілюзія, ці не ўсе яны – «вяртанні ў мінулае»? Ці не ўсе яны – «вяртанні» ў тое самае «кідалава»…

Лукашэнку ў нашумелым кастрычніцкім рускім нарысе «Ці Лукашэнка ідзе да дыктатуры» («Независимая газета», 27 кастрычніка), дзе дыскутуецца магчымасць «пераабуджэння» Расіі, яе «вяртання да сябе», «вяртання да сваіх каранёў». Ці ня ўсе гэтыя «вяртанні» – толькі ілюзія, ці не ўсе яны – «вяртанні ў мінулае»? Ці не ўсе яны – «вяртанні» ў тое самае «кідалава»…

Лукашэнку ў нашумелым кастрычніцкім рускім нарысе «Ці Лукашэнка ідзе да дыктатуры» («Независимая газета», 27 кастрычніка), дзе дыскутуецца магчымасць «пераабуджэння» Расіі, яе «вяртання да сябе», «вяртання да сваіх каранёў». Ці ня ўсе гэтыя «вяртанні» – толькі ілюзія, ці не ўсе яны – «вяртанні ў мінулае»? Ці не ўсе яны – «вяртанні» ў тое самае «кідалава»…

Лукашэнку ў нашумелым кастрычніцкім рускім нарысе «Ці Лукашэнка ідзе да дыктатуры» («Независимая газета», 27 кастрычніка), дзе дыскутуецца магчымасць «пераабуджэння» Расіі, яе «вяртання да сябе», «вяртання да сваіх каранёў». Ці ня ўсе гэтыя «вяртанні» – толькі ілюзія, ці не ўсе яны – «вяртанні ў мінулае»? Ці не ўсе яны – «вяртанні» ў тое самае «кідалава»…

Лукашэнку ў нашумелым кастрычніцкім рускім нарысе «Ці Лукашэнка ідзе да дыктатуры» («Независимая газета», 27 кастрычніка), дзе дыскутуецца магчымасць «пераабуджэння» Расіі, яе «вяртання да сябе», «вяртання да сваіх каранёў». Ці ня ўсе гэтыя «вяртанні» – толькі ілюзія, ці не ўсе яны – «вяртанні ў мінулае»? Ці не ўсе яны – «вяртанні» ў тое самае «кідалава»…

Лукашэнку ў нашумелым кастрычніцкім рускім нарысе «Ці Лукашэнка ідзе да дыктатуры» («Независимая газета», 27 кастрычніка), дзе дыскутуецца магчымасць «пераабуджэння» Расіі, яе «вяртання да сябе», «вяртання да сваіх каранёў». Ці ня ўсе гэтыя «вяртанні» – толькі ілюзія, ці не ўсе яны – «вяртанні ў мінулае»? Ці не ўсе яны – «вяртанні» ў тое самае «кідалава»…

Лукашэнку ў нашумелым кастрычніцкім рускім нарысе «Ці Лукашэнка ідзе да дыктатуры» («Независимая газета», 27 кастрычніка), дзе дыскутуецца магчымасць «пераабуджэння» Расіі, яе «вяртання да сябе», «вяртання да сваіх каранёў». Ці ня ўсе гэтыя «вяртанні» – толькі ілюзія, ці не ўсе яны – «вяртанні ў мінулае»? Ці не ўсе яны – «вяртанні» ў тое самае «кідалава»…

Лукашэнку ў нашумелым кастрычніцкім рускім нарысе «Ці Лукашэнка ідзе да дыктатуры» («Независимая газета», 27 кастрычніка), дзе дыскутуецца магчымасць «пераабуджэння» Расіі, яе «вяртання да сябе», «вяртання да сваіх каранёў». Ці ня ўсе гэтыя «вяртанні» – толькі ілюзія, ці не ўсе яны – «вяртанні ў мінулае»? Ці не ўсе яны – «вяртанні» ў тое самае «кідалава»…

Лукашэнку ў нашумелым кастрычніцкім рускім нарысе «Ці Лукашэнка ідзе да дыктатуры» («Независимая газета», 27 кастрычніка), дзе дыскутуецца магчымасць «пераабуджэння» Расіі, яе «вяртання да сябе», «вяртання да сваіх каранёў». Ці ня ўсе гэтыя «вяртанні» – толькі ілюзія, ці не ўсе яны – «вяртанні ў мінулае»? Ці не ўсе яны – «вяртанні» ў тое самае «кідалава»…

Лукашэнку ў нашумелым кастрычніцкім рускім нарысе «Ці Лукашэнка ідзе да дыктатуры» («Независимая газета», 27 кастрычніка), дзе дыскутуецца магчымасць «пераабуджэння» Расіі, яе «вяртання да сябе», «вяртання да сваіх каранёў». Ці ня ўсе гэтыя «вяртанні» – толькі ілюзія, ці не ўсе яны – «вяртанні ў мінулае»? Ці не ўсе яны – «вяртанні» ў тое самае «кідалава»…

болей намаганняў, каб пазнаёміць чытача з палітычнай кухняй сваёй краіны. Ён прызнае своеасаблівую веліч Шчаранскага, які, будучы «пешкай», здолеў прайсці «ў ферзі», зрабіўшы ў сваёй адседкі трамплін для ўпэўненай кар'еры на волі. Пры гэтым Нудэльман імкнецца адказаць на галоўнае пытанне «Каму выгадны феномен Шчаранскага?», называючы ізраільскія спецслужбы, амерыканскі яўрэйскі істэблішмент, кіраўніцтва правыя і ультрарэлігійныя колы Ізраілю, г. зн. «капітал» за беларусаў, пафас якіх зводзіцца да зручнага «Лукашэнка – гэта не мы! Мы не нясём адказнасці за сваіх кіраўнікоў!» Нудэльман акрэслівае кола зацікаўленых у стварэнні міфу Шчаранскага – выяўляецца, што і «правыя», і «левыя» ізраільскія палітыкі мелі аб'ектыўную патрэбу ў перакладзе адказнасці за няўдачы інтэграцыі новых імігрантаў на плечы саміх «няўдачнікаў». Аўтары ж «ВП» інфантыльна ізалюцыя ад «дзіўнаватага дырэктара саўгасу», «гарлапана», забываючыся тое, што Лукашэнка прыляцеў не з Марсу. Нельга не з іхнім пасланнем «Беларускі народ заслугоўвае лепшага (зрэшты, кожны народ заслугоўвае лепшых кіраўнікоў), пакуль рэальнай палітычнай асобе будуць прыпісваць дэманічныя якасці[7], шанцы на рацыяналізацыю палітычнага працэсу застануцца мізэрнымі. Па сутнасці, кніга Шчаранскага і Калінкінай – чарговая праява «сіндрому непераможнага ворага». Справядліва адзначаліся хібы гэтага сіндрому, які «накідвае няшкодныя для ворага спосабы барацьбы».

Наступствы з'яўлення кніг пра Шчаранскага і Лукашэнку былі непадобныя. «ВП» застаўся амаль незаўважаным нагатоўкі антылукашэнкаўскіх твораў[9], выклікаўшы хіба крыты заўвагі *ad marginem*[10]. Пасля выхаду «ВП», як прызнаецца Калінкіна, яна «з прэзідэнтам добра пагутарылі хвілін 40. Пра

Чаплыга А. Беларуская дэмакратыя: вопыт аднаўлення // Беларускі гістарычны часопіс. 1996. № 1. С. 3–7.

Маю на ўвазе
толькі
беларускія
выданні
1990-х.
Замежныя
аўтары
таксама
не
ігнаруюць
бібліяграфіі
пра
Лукашэнку,
тады як у
«ШчБМ»
маецца
пералік
артыкулаў і
кніг,
прысвечаных
Шчаранскаму.
Гэты пералік
таксама
толькі
частковы.

мяне, пра яго, пра ягонае атачэнне. «Ну што вы там пішаце: ўсялякія неправераныя факты? – лагодна дзівіўся Лукаценка. – Вы што, мне не можаце патэлефанаваць, раз вам маіх тэлефонаў не даюць інфармацыі?»[11] Кніга Нудэльмана пацягнула на судовы працэс, які давёў да галечы аўтара, але кінуў цень на «светлы вобраз» героя, які, у свой час змагаўшыся за права слова, праз чвэрць стагоддзя аказаўся бліжэйшым дарадчыкам КДБ-ФСБ Пуціна[12], чым да герояў яўрэйскага супраціву ў познім СССР (Іда Нудэль і інш.), што ў іерусалімскім судзе падтрымалі Нудэльмана.

[8] Жукоўскі Д. Пасткі на хайвэі постмадэрнізму // ARCHE. 2001. № 4. С. 13.

[9] Гл. агляд некаторых з іх у артыкуле А. Казвіча «Тры метады палітычнае тэрапіі» (ARCHE. 2003. № 4), а таксама «антыдукашыцкі» сайт www.batke.net.

[10] Рэцэнзія Алега Цішкова на сайце www.belarusmedia.com, 28.11.2003.

[11] Независимая газета», 2003, 22 декабря.

[12] На www.jjc.ru/natan.html працытаваны цікавы дыялог паміж Пуціным і Шчаранскім у час ураднавага крызісу ў Ізраілі (2000 г.): «Пуцін: Прывітанне, Натан! Мы з цікавасцю сочым за Вашай кар'ерай, Шчаранскі. Прывітанне, спадар Прэзідэнт! Мы таксама з цікавасцю сочым за Вашай кар'ерай. Калі паўтара году таму Вы, будучы кіраўніком ФСБ, раскрылі перада мною тэчкі маёй справы, я адразу зразумеў, што Вы далёка пойдзеце. Пуцін: Мы Вас любім, Натан, але Вы Барака [тагачаснага прэм'ер-міністра Ізраіля] усё такі не крыўдзіце. Ён слаўны малец» і г. д. Нават калі такога дыялогу не адбылося, ён адлюстроўвае ўжо факт прыцягнення Шчаранскага «дзяржаўнымі яўрэямі» (сайт www.jjc.ru належыць Расійскаму яўрэйскаму кангрэсу) да рабочых кантактаў з высокапастаўленым расійскім спецслужбоўцам.

Папярэднія высновы з супастаўлення двух твораў:

1. І ў Ізраілі, і ў Беларусі ў нядаўнім мінулым стаў магчымым прыход да улады нетрывіяльных асобаў, што сваімі неарыстакратычнымі паводзінамі даюць падставы для грэбліванне чмыхання прадстаўнікоў традыцыйных эліт, маніпулюючы свядомасцю сваіх прыхільнікаў і перапісваючы гісторыю «пад сябе». Такім чынам, інстытуты улады ў абедзвюх краінах – пры усёй рознасці рэжымаў – маюць часткова адкрыты, але у той жа час эзатэрычны характар. Можна таксама з цікавасцю сочым за Вашай кар'ерай. Калі паўтара году таму Вы, будучы кіраўніком ФСБ, раскрылі перада мною тэчкі маёй справы, я адразу зразумеў, што Вы далёка пойдзеце. Пуцін: Мы Вас любім, Натан, але Вы Барака [тагачаснага прэм'ер-міністра Ізраіля] усё такі не крыўдзіце. Ён слаўны малец» і г. д. Нават калі такога дыялогу не адбылося, ён адлюстроўвае ўжо факт прыцягнення Шчаранскага «дзяржаўнымі яўрэямі» (сайт www.jjc.ru належыць Расійскаму яўрэйскаму кангрэсу) да рабочых кантактаў з высокапастаўленым расійскім спецслужбоўцам.

2. І ў Ізраілі, і ў Беларусі вербальным адказам на гэткае ўварванне ва ўладу становіцца хуткая іронія, чым сур'ёзны аналіз з боку людзей, блізкіх да «традыцыйнага» ўспрыняцця ўладнага універсуму. «Хлопчык з вескі з прасценькай біяграфіяй» («ВЫ»), «ах ты, Герой...» Герачны ты які хлопец» («Шчыт»). Пагэрналісцкія стэрэатыпы прыводзяць апанентаў «моцных асобаў» да тэндэнцыйнасці, пошуку «ліха» нават у бяскрыўдных учынках апошніх. У выніку змяшання важнага і няважнага пафас гэных апанентаў – незалежна ад намаганняў, прыкладзеных для «выкрыцця антыгероя», – б'е міма мэты.

3. І ў Ізраілі, і ў Беларусі ў апанентаў існага парадку падзяляюць:

Ультыматыўнасць

Ігнараванне з'яўленняў

Ігнараванне з'яўленняў

Ігнараванне з'яўленняў

захоўваецца даволі наіўная вера ў тое, што яго мажліва радыкальна змяніць або нават разбурыць з дапамогай Логасу (больш дакладна – заклёну), не падмацаванага рэальнымі рэсурсамі. Так, у беларускіх крытыкаў Лукашэнкі назіраецца недаацэнка «суперніка-выскачкі», які нібыта не ведае «правілаў гульні», парадаксальна спалучаная з яго дэманізацыяй як «каварнага і небяспечнага праціўніка, у якога яшчэ вельмі многа планаў на будучыню».

4. І ў Ізраілі, і ў Беларусі ірацыянальная падмена аналізу «кавалерыйскім наскокам» на непрыяцеля, даследавання – расследаваннем, як правіла, не выклікае энтузіязму ў чытацкай аўдыторыі, для патрэбы якой гэтае спрашчэнне робіцца. «Развянчанне міфаў» і ў 1999 г., і ў 2003 г. мала цікавіла людзей, якія ўжо перажылі багата развянчанняў (Сталіна, Брэжнева, Гарбачова, Ельцына, Шарэцкага і г. д.). Наўрад ці ў расіянаў пасля прачытання «Выпадковага прэзідэнта» зменіцца стаўленне да Лукашэнкі, навязанае іхняй палітычнай элітай («сукін сын, але наш сукін сын»), гэтаксама як у «расійскіх ізраільцянаў» – да Шчаранскага, квазіафіцыйна прызнанага «заступнікам расійскамоўных у Ізраілі» як ізраільскім ды амерыканскім, так і расійскім істэблішментам.

Дык ці варта чытаць такія кнігі? Думаецца, варта. У пэўным сэнсе яны не проста адзначаны духам фельетоннай эпохі, а з'яўляюцца яе ўзорамі. Гэта творы пра драматычнае несупадзенне аўтарскіх магчымасцяў і амбіцый. Вось жа, і беларусы, і ізраільцяне – жыхары краінаў, дзе кантроль за «парадкам» стаў ледзь не нацыянальным спортам, – маюць важную патрэбу ў назіранні за назіральнікамі. Выхад такіх кніг актуалізуе пытанне пра маральнасць не толькі ў палітыцы, а і ў пісанні пра палітыкаў і палітыку, падштурхоўвае да самастойнага мыслення пра ролю асобы ў гісторыі, пра выбар сродкаў для дасягнення мэты. Урэшце, гэтыя кнігі закладваюць падмурак для сапраўды дзейснага асэнсавання феноменаў лідэрства незалежна ад нацыянальных межаў.

[image]
[image]

№ 4 (33) – 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2005/1/15**
[image]

СЛАВОЙ ЖЫЖАК
прафэсар філязофіі Люблянскага унівэрсытэту, рэдактар выданьня «Revolution at the Gates: Selected Writings of Lenin from 1917» («Рэвалюцыя на парозе: Выбраныя творы Леніна пасьля 1917 году»), Апошнія кніжкі – «Iraq: The Borrowed Kettle» (2004), «Organs Without Bodies: On

Славой Жыжак Лавіце момант: ленінская спадчына

Hélène Carrère d'Encausse. *Lenin*. Translated by George Holoch. Holmes & Meier, 2001. 371 pp.

Сённяшнія левыя перажываюць няпросты этап: прагрэсіўны рух вымушаны наноў выбудоўваць уласны праект. Пры гэтым чамусьці забываюцца, што падобны час даў пачатак ленінізму. Уявіце сабе шок Леніна, калі ўвосень 1914 году ўсе еўрапейскія сацыял-дэмакратычныя партыі, за выключэннем сербскай, усталі на «патрыятычную пазіцыю». Наколькі ж мусіла быць цяжка ў часы, калі ваенны канфлікт раскалоў Еўропу напалам, не прыняць нічыйнага боку. Падумайце, колькі нібыта незалежных мысляроў-інтэлектуалаў, у тым ліку й Фройд, не вытрымалі і паддаліся, хай і на кароткі час, нацыяналістычнай спакусе.

У 1914 годзе цэлы сусвет знік, зносячы з сабой не толькі буржуазную веру ў прагрэс, але і сацыялістычны рух, што быў яе спадарожнікам. Ленін (той самы Ленін, што напісаў «Што

рабіць») адчуў, як глеба знікае ў яго з-пад ног, аднак у гэтым роспачным пратэсце не было пачуцця задаволенасці, неабходнасці жадання сцвердзіць: «Я ж вам казаў». У той самы час для Гэты катастрофа зрабіла магчымай ключавую ленінісцкую ідэю – пераадоленне эвалюцыйнага гістарызму Другога Інтэрнацыяналу. Ядро ленінісцкай «утопіі» – радыкальнае патрабаванне поўнага разгрому буржуазнае дзяржавы для пабудовы новай калектыўнай сацыяльнай формы, без ліпеня рэгулярнай арміі, паліцыі ці бюракратыі, дзе кожны мог браць удзел у кіраванні грамадскімі справамі, – паўстала беспасярэдне з попелу 1914-га. Гэта не было тэарэтычным праектам для нейкай далёкай будучыні: у кастрычніку 1917-га Ленін заяўляў, што «*мы можам адразу ж стварыць дзяржаўны апарат мільёнаў з дзесяці, калі не з дваццаці, чалавек*». Што варта прызнаць, дык гэта «вар'яцтва» (у кіркегараўскім сэнсе слова) той утопіі, – у гэтым плане сталінізм сімвалізуе паварот да «здаровага розуму». Выбуховы патэнцыял «Дзяржавы і рэвалюцыі» немагчыма пераацаніць: на яе старонках, як Нейл Гардынг зазначыў у сваім «Ленінізме» (1996), «*былі рэзка адкінутыя слоўнік і граматыка заходняй палітычнай традыцыі*».

Peter Hallward. Badiou: A Subject to Truth. (2003). Slavoj Žižek. The Ticklish Subject: The Absent Centre of Political Ontology. (1999). Alain Badiou. Ethics: An Essay on the Understanding of Evil. (2002).

Тое, што адбылося пасля, можна назваць, запазычыўшы назву з Альтусэравага тэксту пра Мак'явелі, «La solitude de Lenine»: час, калі ён застаўся ў адзіноце, змагаючыся супраць курсу ўласнай партыі. Калі ў «Красавіцкіх тэзісах» 1917 году Ленін распазнаў *Augenblick* – унікальны шанец для рэвалюцыі, – першапачатковай рэакцыяй з боку пераважнай бальшыні калегаў па партыі былі ступар або пагарда. Ніводзін з вядомых бальшавіцкіх лідэраў не падтрымаў ягонага закліку да рэвалюцыі, а рэдкалегія «Правды» пайшла на выключны крок, адмежаваўшыся і адмежаваўшы партыю ад ленінскіх прапановаў. Багданаў назваў «Красавіцкія тэзісы» «трызненнем вар'ята». Надзея Крупская падсумавала: «Здаецца, што Ленін з'ехаў з глузду».

Хаця без асабістага ўмяшання Леніна не абышлося, гісторыю Кастрычніцкай рэвалюцыі не варта ператвараць у міф самотнага генія. Ленін меў поспех, бо ягоны покліч, пакінуўшы абыякавай партыйную наменклатуру, знайшоў водгук на ўзроўні рэвалюцыйнай мікрапалітыкі: ва ўсіх вялікіх гарадах

Расіі былі заснаваныя мясцовыя саветы, рашуча настроеныя ігнараваць уладу «законнага» ўраду і ўзяць справы ва ўласныя рукі.

Увесну 1917 году Ленін поўнасцю ўсведамляў парадаксальнасць сітуацыі: цяпер, пасля таго як Лютаўская рэвалюцыя скінула царскі рэжым, Расія была найбольш дэмакратычнай краінай у Еўропе – з беспрэцэдэнтным узроўнем мабілізацыі масаў, свабоды арганізацыяў і друку – аднак гэтая свабода рабіла ўсё няпэўным. Калі нешта праходзіць чырвонай ніткай праз усё напісанае Леніным паміж Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыямі, то гэта менавіта націск на тым разрыве, які аддзяляе палітычную барацьбу ад пастаўленых перад ёй мэтаў (спыненне вайны, пераразмеркаванне зямлі і, вядома ж, «*уся ўлада Саветам*», то бок ліквідацыя існага дзяржаўнага апарату і замена яго новымі формамі грамадскага кіравання камуністычнага кшталту). Гэта разрыў паміж рэвалюцыяй як уяўным выбухам свабоды ў светлы міг усеагульнай салідарнасці, калі «здаецца, што магчыма ўсё», і цяжкай працай дзеля перабудовы грамадства, якую неабходна выканаць, каб той выбух пакінуў нейкі след у сістэме грамадства.

Гэты разрыў, які нагадвае этап паміж 1789 і 1793 гадамі ў Французскай рэвалюцыі, і стаўся прасторай унікальнага ўмяшальніцтва Леніна. Асноўнае, чаму вучыць рэвалюцыйны матэрыялізм, гэта тое, што рэвалюцыя мусіць наносіць удар двойчы. Нельга сказаць, што ў першым моманце рэвалюцыя адбываецца адно фармальна і толькі пазней напаўняецца зместам, хутчэй наадварот: першая рэвалюцыя захоўвае старое мысленне, веру ў тое, што свабоды і справядлівасці можна дасягнуць пры выкарыстанні існага дзяржапарату і яго дэмакратычных механізмаў, што «добрая» партыя можа выйграць свабодныя выбары і «легальна» ажыццявіць сацыялістычныя пераўтварэнні. (Найяснейшая праява гэтай ілюзіі – тэзіс Карла Каўцкага, сфармуляваны ў 1920-х гадах, што лагічнай формай першай стадыі на шляху ад капіталізму да сацыялізму мае быць парламенцкая кааліцыя буржуазных і пралетарскіх партыяў.) Тыя, што вагаюцца і баяцца зрабіць другі крок у пераадоленні старых формаў, – гэта тыя, што

хочуць, кажучы словамі Рабесп'ера, «рэвалюцыі без рэвалюцыі».

У творах 1917 году Ленін скіроўвае сваю найбольш з'едлівую іронію на адрас тых, хто займаецца марнымі пошукамі нейкай страхоўкі для рэвалюцыі ў выглядзе арэчаўлёнага панятку сацыяльнай неабходнасці (*«яшчэ не пара рабіць сацыялістычную рэвалюцыю, працоўны клас яшчэ не саспеў»*) або нарматыўнай, дэмакратычнай законнасці («бальшыня насельніцтва не на нашым баку, таму рэвалюцыя не будзе па-сапраўднаму дэмакратычнай»). Так, нібы рэвалюцыйнаму дзеячу трэба атрымаць дазвол нейкага прадстаўніка Іншага, перш чым адважыцца на захоп дзяржаўнай улады. Для Леніна, як для Лякана, рэвалюцыя «ne s'autorise que d'elle-même»*. Боязь заўчаснага захопу ўлады, пошукі страховак – гэта страх перад безданню. Гэта тое, што Ленін паслядоўна выкрывае як «апартунізм», як, па сутнасці сваёй, наскрозь фальшывую пазіцыю, што хаваецца за абарончым экранам нібыта аб'ектыўных фактаў, законаў і нормаў. Першы крок у змаганні з ім – гэта ясна заявіць: *«Што ж у такім разе рабіць? Трэба* aussprechen was ist, *«назваць рэчы сваімі імёнамі», прызнаць, што ў нас у ЦК ды ў вярхах партыі існуе плынь ці меркаванне...»*

Што ж адбылося, калі Ленін лепш усвядоміў сабе мёртвае [illegible] бальшавіцкай улады? Вось тут назіраўся рэзкі кантраст [illegible] Леніным і Сталіным. У самых апошніх запісах Леніна (ужо [illegible] пазней пасля таго як ён адмовіўся ад утопіі «Дзяржавы і рэвалюцыі», маюцца контуры сціплага «рэалістычнага» праекту таго, што належыць зрабіць бальшавіцкай уладзе. Ён усведамляў, што, прымаючы да ўвагі недаразвітасць эканомікі і культурную адсталасць расійскіх масаў, Расія не зможа *«перайсці наўпрост да сацыялізму»*. Усё, што можа зрабіць Савецкая дзяржава, гэта спалучаць памяркоўную палітыку «дзяржаўнага капіталізму» з культурнай асветай сялянскіх масаў. Факты і лічбы паказваюць, *«колькі яшчэ неадкладнай чарнавой працы належыць нам зрабіць, каб дасягнуць узроўню звычайнай заходнееўрапейскай цывілізаванай дзяржавы... Мы павінны памятаць аб той напаўазіяцкай бескультурнасці, з якой мы яшчэ не выбраліся»*. Ленін неаднаразова засцерагае супраць непасрэднага *«насаджэння камунізму». «Мы ні ў якім разе не павінны спешна несці камуністычныя ідэі наўпрост у вёску. Да*

тае пары, пакуль вёсцы бракуе матэрыяльнага базісу для камунізму, да тае пары гэта будзе, можна сказаць, згубна для камунізму». Ягоны лейтматыў – *«паспешлівасць і размашыстасць найболей шкодныя»* . Насуперак гэтаму настойванню на «культурнай рэвалюцыі» Сталін аддаў перавагу антыленінісцкаму паняццю «пабудовы сацыялізму ў адной асобна ўзятай краіне».

Гэта, аднак, не азначае, што Ленін маўкліва пагадзіўся з меншавіцкай крытыкай бальшавіцкага ўтапізму – ідэяй пра тое, што рэвалюцыя мусіць плыць па прадвызначаным рэчышчы і можа адбыцца толькі пры наяўнасці ўсіх неабходных матэрыяльных перадумоваў. Пішучы гэтыя нататкі ў 1920-х, Ленін усведамляў, што галоўнай задачай для бальшавікоў з'яўляецца неабходнасць выканаць задачы прагрэсіўнага буржуазнага ладу (забеспячэнне ўсеагульнай адукацыі і г. д.). Аднак факт, што чыннікам развіцця з'яўляецца рэвалюцыйна настроены пралетарыят, грунтоўна змяняе сітуацыю: існуе імавернасць, што гэтыя меры будуць ажыццяўляцца так, каб пазбавіцца ад іх буржуазнага ідэалагічнага базісу – адукацыя паслужыць дабру народу і не будзе маскаваць прапаганду класавых інтарэсаў буржуазіі. Папраўдзе дыялектычны парадокс заключаецца ў тым, што саму безнадзейнасць расійскай сітуацыі (адсталасць, якая вымушае пралетарскую ўладу ажыццяўляць буржуазны цывілізацыйны працэс) можна перавярнуць на карысць: *«Што калі б поўная безвыходнасць становішча, падзесяцярыўшы сілы рабочых і сялян, разгарнула б перад намі магчымасць іншага пераходу да стварэння асноўных пасылак цывілізацыі, чым ва ўсіх астатніх заходнееўрапейскіх краінах?»*

Такім чынам, мы маем дзве несумяшчальныя мадэлі рэвалюцыі: чакаць моманту фінальнага крызісу, калі рэвалюцыя выбухне «ў належны ёй час» згодна з немінучасцю гістарычнай эвалюцыі, або сцвердзіць, што для рэвалюцыі няма «належнага часу», што зручная магчымасць для рэвалюцыі – нешта, што паўстае само сабой і што трэба ўлавіць. Ленін настойвае, што выключны збег абставінаў, накшталт тых, што меліся ў Расіі ў 1917 годзе, дазваляе падарваць норму як такую. Я б сцвердзіў, што сёння гэтая думка больш

пераканаўчая, чым калі б там ні было. Мы жывём у час, калі дзяржаўная ўлада і яе апараты, уключна з палітычнымі дзеячамі, усё менш і менш здольныя выразна фармуляваць ключавыя праблемы. Ілюзія, што пільныя праблемы, якія стаялі перад Расіяй у 1917 годзе, маглі быць вырашаныя парламенцкімі сродкамі, збольшага нагадвае сучасную ілюзію, быццам пазбегнуць засмечвання навакольнага асяроддзя можна ўжываннем рыначнай логікі (калі тых, хто забруджвае асяроддзе, прымушаюць плаціць за нанесеную прыродзе шкоду).

Якое ж месца займае ва ўсім гэтым новае даследаванне Элен Карэр д'Анкос? Асноўную сутнасць яе падыходу можна падсумаваць гэткім чынам: цяпер, калі з камунізмам пакончана, надышоў час для аб'ектыўнай ацэнкі ленінскай спадчыны. У межах гэтых каардынат кніжка спрабуе аддаць Леніну належнае. Элен Карэр д'Анкос выразна паказвае, што сталінскі дзяржаўны апарат вырас на глебе нэпаўскага кампрамісу. Калі дзяржаве давялося пацясніцца і даць месца рынку, прыватнай уласнасці і г. д., то яна ж мусіла забяспечыць строгі кантроль над грамадствам, каб дасягненні рэвалюцыі не апынуліся пад пагрозай з боку новых класаў, што пачалі з'яўляцца. Капіталістычная эканамічная інфраструктура мусіла быць збалансаваная сацыялістычнай палітычна-ідэалагічнай надбудовай.

Карэр д'Анкос таксама акцэнтуе ўвагу на тым, як у сваёй барацьбе за права быць спадкаемцам Леніна Троцкі, Бухарын і рэшта не выказвалі нічога, акрамя пагарды, да новай адміністрацыйнай ролі Сталіна – генеральнага сакратара, – ставячыся да яго як да звычайнага загадчыка гаспадаркі: яны недаацэньвалі ўладу, якую давала гэтая пасада. Калі ў 1922 годзе Ленін даслаў у «Правду» артыкул «Лепей меней, ды лепей», скіраваны наўпрост супраць сталінскага аўтарытарызму, Бухарын, яе галоўны рэдактар, не ўбачыў нагоды, каб яго друкаваць; адзін з чальцоў Палітбюро прапанаваў надрукаваць адзін асобнік газеты з гэтым артыкулам і даць яго Леніну.

Адносна нацыянальнага пытання Карэр д'Анкос піша, што

Ленін рашуча выступаў супраць вялікадзяржаўнага нацыяналізму і падтрымліваў права малых народаў, пад чыім кантролем яны б ні знаходзіліся, на суверэнітэт. У самой Расіі ён адстойваў палітыку спрыяння прыгнечаным малым народам – «накшталт праграмы пазітыўнай дыскрымінацыі». Сёння гэтая пазіцыя важная, як ніколі. Не дзіва, што антыамерыканскія настроі ў Еўропе найбольш заўважна праяўляюцца ў «вялікіх» нацыяў. Часта гучаць скаргі, што глабалізацыя найбольш пагражае суверэнітэту нацыянальных дзяржаваў, аднак не столькі малых дзяржаваў, колькі дзяржаваў з другога шэрагу (былой) сусветнай вярхушкі – краінаў накшталт Вялікабрытаніі, Нямеччыны і Францыі. Яны пабойваюцца поўнага паглынання новай глабальнай імперыяй, што цяпер нараджаецца, звядзення да тае ж ролі, якую цяпер адыгрываюць Аўстрыя, Бельгія або нават Люксембург. Варожасць да амерыканізацыі ў Францыі з боку як левакоў, так і правых нацыяналістаў – гэта, урэшце, проста нежаданне прызнаць той факт, што Францыя страчвае сваю ролю лідэра ў Еўропе.

Выраўноўванне большых і меншых нацыянальных дзяржаваў належыць залічыць да добрых уплываў глабалізацыі: заходнееўрапейская пагарда да посткамуністычных краінаў Усходняй Еўропы выдае зранены нарцысізм. Што цікава, тая самая логіка дзейнічала ў былой Югаславіі: не толькі сербы, але і шмат якія заходнія краіны меркавалі, што адна толькі Сербія здольная пабудаваць самастойную дзяржаву. Праз усе 1990-я гады нават радыкальныя дэмакраты – крытыкі Мілошавіча, якія не прымалі сербскага нацыяналізму, дзейнічалі зыходзячы з пераканання, што толькі Сербія, скінуўшы Мілошавіча, можа зрабіцца па-сапраўднаму дэмакратычнай краінай; астатнія былыя югаслаўскія дзяржавы, маўляў, занадта правінцыйныя, каб гэтага дасягнуць. Гэта нагадвае Энгельсава адмаўленне малых балканскіх народаў як рэакцыйных пережыткаў.

Адносна Леніна як асобы Карэр д'Анкос паўтарае старыя аргументы – пра ягоную бязлітасную жорсткасць і абыякавасць да пакутаў народных масаў, – аднак, пішучы пра лёс рабочай апазіцыі ў 1921 годзе, яна-такі зазначае, што «гэта быў яшчэ

адзін прыклад ленінскага асаблівага метаду, які заключаўся ў вынішчэнні не апанентаў, а іхніх ідэяў, і дазваляў пераможаным заставацца ў кіраўнічых органах». Цяжка ўявіць сабе мацнейшы кантраст з палітыкай Сталіна. Зласліўцы Леніна любяць прыгадваць ягоную рэакцыю на «Апасіянату» Бетховена – ён быў заплакаў, а потым заявіў, што рэвалюцыянер не можа сабе дазволіць гэткай сентыментальнасці, – у якасці пацвярджэння ягонай надзвычайнай здольнасці да самакантролю. Аднак ці не можа гэты анекдот з'яўляцца проста сведчаннем крайняй уражлівасці – і ўсведамлення Леніным таго, што яе варта трымаць пад кантролем у імя палітычнай барацьбы?

Сваёй трывіяльнасцю дэталі штодзённага жыцця бальшавікоў у 1917-м і шэрагу наступных гадоў відавочна падкрэсліваюць, наколькі яны адрозніваліся ад сталінскай наменклатуры. Едучы з дому ў Смольны ўвечары 24 кастрычніка 1917 году, Ленін сеў на трамвай і запытаўся ў кандуктаркі, ці адбываліся ў той дзень бойкі ў цэнтры гораду. У першыя гады пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ён найчасцей перамяшчаўся ў машыне з адным толькі кіроўцам і целаахоўнікам Гілём; у іх стралялі, іх спыняла і затрымлівала міліцыя (міліцыянты не пазналі Леніна). Аднойчы пасля наведання школы ў прыгарадзе машыну скралі бандыты, пераапранутыя ў міліцыянтаў, і Ленін з Гілём былі вымушаныя пешкі дабірацца да найбліжэйшага аддзелу міліцыі, каб заявіць аб крадзяжы. 30 жніўня 1918 году ў Леніна стралялі падчас ягонай размовы з рабочымі побач з фабрыкай, якую ён толькі што наведаў. Гіль адвёз яго ў Крэмль, дзе не было лекараў; Надзея Крупская прапанавала, каб хто-небудзь збегаў у найбліжэйшую бакалею па лімон.

Што да гістарычнага поспеху Леніна, Карэр д'Анкос справядліва падкрэслівае, што ягоны геній быў у ягонай здольнасці вырвацца за рамкі тыповага сюжэту рэвалюцыі, дзе імгненны экстатычны выбух утапічнай энергіі змяняецца працверазненнем на заўтрашнюю раніцу. Нідзе ў ягоных творах няма і следу таго, што Лякан назваў «нарцысізмам прайгранай справы», характэрнага тым, хто загадзя чакае правалу рэвалюцыі, каб выказаць захапленне ёю або пачаць аплакваць

яе. Гэта тое, што зрабіла Леніна палітыкам XX стагоддзя – стагоддзя Захаплення Рэальным.

Як зазначыў Ален Бад'ю, у той час як XIX стагоддзе вызначылася ўтапічнымі або «навуковымі» праектамі і ідэаламі, што меліся быць рэалізаваныя ў будучыні, дваццатае мела на мэце само вызваленне, усталяванне жаданага Новага Ладу. Асноўным і вызначальным досведам XX стагоддзя быў непасрэдны досвед Рэальнага як адрознага ад штодзённай грамадскай рэчаіснасці: Рэальнае, у сваёй выключнай жорсткасці, – гэта цана, якую плацяць за ачышчэнне ад падманлівых слаёў рэчаіснасці. Прыгадваючы траншэі першай сусветнай вайны, Эрнст Юнгер апяваў рукапашныя бойкі як аўтэнтычнае міжсуб'ектнае сутыкненне: аўтэнтычнасць маецца ў акце гвалту, трансгрэсіі, жорсткага парушэння закону або ў форме сутыкнення з ляканаўскім Рэальным – тым, з чым сутыкаецца Антыгона, парушаючы закон Гораду, – або ў форме батаеўскай празмернасці. У сферы сексуальнасці ўзорам гэтага захаплення Рэальным з'яўляецца «Ai No Corrida» («Імперыя пачуццяў») Нагішы Ашымы, дзе кульмінацыяй узаемаадносінаў пары каханкаў робіцца ўзаемакатаванне і ўрэшце смерць – выразнае рэха «Гісторыі Вока» Батая. У якасці іншага прыкладу можна прыгадаць вебсайты з жорсткай парнаграфіяй, што даюць магчымасць сузіраць унутранасць вагіны з выйгрышнага пункту агляду мініяцюрнай камеры, усталяванай на галоўцы фалаімітатара. Калі занадта наблізіцца да жаданага аб'екту, эратычнае зачараванне ператвараецца ў агіду перад Рэальным аголенай плоці. Шыбуючы да свайго тэатру ў ліпені 1953 году, Брэхт прамінуў калону савецкіх танкаў, што рухалася ў бок Stalinallee, алеі Сталіна, каб задушыць паўстанне рабочых. Ён памахаў ім рукой і пасля запісаў у дзённіку, што ў той момант ён упершыню ў жыцці адчуў спакусу запісацца ў камуністычную партыю, – узорны выпадак захаплення Рэальным. Гэта не азначае, што Брэхт падтрымліваў сілавыя метады, – рэч у тым, што ён успрыняў і падтрымаў гвалт як праяву аўтэнтычнасці.

Паводле Бад'ю, асноватворнаю пасылкай, што ляжыць у аснове нашай постпалітычнай эпохі, у якой кіраванне сацыяльнымі справамі пакрысе замяняе палітыку як такую, з'яўляецца тое,

што ХХ стагоддзя, груба кажучы, не было. На працягу тых пакутных год мела месца пачварная пустая страсць, выпадковае адхіленне, найярчэйшым вынікам (і праўдай) якога былі ГУЛАГ і Галакост. Выснова, якую належыць зрабіць, палягае ў тым, што спробы змяніць грамадства на Дабро маюць сваім вынікам выключна адвечнае Зло, адзіны Абсалют, што сёння прызнаецца. Такім чынам, шлях, па якім належыць весці жыццё, – гэта сцежка прагматычнага кампрамісу, цынічнай мудрасці, усведамлення абмежаванняў і супрацьстаяння спакусе Абсалюту. Насуперак гэтаму стаўленню, вернасць ленінскай спадчыне прымушае нас настойваць на тым, што ХХ стагоддзе было не проста выпадковым адхіленнем ад правільнага шляху, а выбухам вызвольнага патэнцыялу. Сапраўдная цяжкасць – і задача праўдзівай тэорыі – палягае ў тым, каб злучыць у адно гэты выбух і яго трагічныя наступствы.

У сваіх спробах нармалізаваць Леніна, зрабіць яго адной з гістарычных постацей, якія патрабуюць безуважнае ацэнкі, Карэр Д'Анкос абыходзіць увагай сапраўдны ленінскі прарыў, Падзею Леніна, якую не прыменшыш і не спішаш на трагічныя гістарычныя абставіны, бо яна адбываецца ў іншым маштабе. Няздольнасць аўтаркі гэта ацаніць найбольш відавочная ў яе падыходзе да «Дзяржавы і рэвалюцыі», калі яна выцягвае на паверхню старыя нудныя развагі аб ленінскіх ваганнях паміж падтрымкай рэвалюцыйнае стыхійнасці і прызнаннем патрэбы ў кантралюючым уплыве партыйнай эліты. Аўтарка выразна сцвярджае, што бальшавіцкі «Дэкрэт аб міры», выдадзены адразу ж пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, азначыў пачатак новай палітыкі, якая абыходзіла дзяржаву: яна была скіраваная не да іншых дзяржаваў, а наўпрост да народу, да грамадства як цэлага. Аднак яна не прызнае, што тое самае бачанне ляжыць у аснове «Дзяржавы і рэвалюцыі» – уяўленне аб форме самаарганізацыі грамадства, якая дзейнічае ў абыход дзяржаўных механізмаў. Гэта кідае святло на ўяўную супярэчнасць паміж ленінскай тэорыяй эліты (верай, што асвечаныя прафесіяналы павінны несці класавую свядомасць у рабочы клас) і «непрыхаваным заклікам да стыхійнасці» ў «Дзяржаве і рэвалюцыі». Падобна да Адорна, які сцвярджаў, што стыхійная радасць – гэта рэч, якой найцяжэй дасягнуць у сучасным грамадстве, Ленін цалкам усведамляў, што

сапраўдная стыхійнасць – вельмі рэдкая з’ява: каб яе дасягнуць, неабходна пазбавіцца фальшывай, навязанай ідэалагічнай стыхійнасці. А таму ягоная пазіцыя была наступная: у межах юрысдыкцыі дзяржавы – бальшавіцкая дыктатура, па-за імі – народная «стыхійнасць».

7 лістапада 1920 году, у трэцюю гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі, у Петраградзе паставілі тэатралізаваную рэканструкцыю штурму Зімовага Палацу. Дзесяткі тысячаў рабочых, салдатаў, студэнтаў і мастакоў працавалі круглыя суткі, жывячыся толькі кашай, гарбатай і мерзлымі яблыкамі, каб падрыхтаваць спектакль, які адбыўся акурат тамсама, дзе і сапраўдная падзея. Іх працу каардынавалі чыноўнікі, а таксама мастакі, музыкі і рэжысёры-авангардысты, ад Малевіча да Меерхольда. Нягледзячы на тое што гэта была тэатральная пастаноўка, а не «рэчаіснасць», салдаты і маракі, што бралі ў ёй удзел, гралі самі сябе. Шмат хто з іх не толькі ўдзельнічаў у штурме 1917 году, але на час пастаноўкі змагаўся ў грамадзянскай вайне: Петраград у 1920 годзе быў у аблозе і пакутаваў ад жорсткага дэфіцыту прадуктаў. Адзін з сучаснікаў пракаментаваў: «Будучыя гісторыкі занатуюць, як цягам адной з найбольш крывавых і брутальных рэвалюцыяў цэлая Расія ўдзельнічала ў спектаклі»; тэарэтык фармалізму Віктар Шклоўскі зазначыў, што «адбываецца нейкі стыхійны працэс, дзе жывую тканку жыцця ператвараюць у тэатральную». Гэтыя пастаноўкі – асабліва ў параўнанні са сталінскімі першамайскімі парадамі – сведчаць пра тое, што Кастрычніцкая рэвалюцыя была не проста путчам, які ажыццявіла невялічкая купка бальшавікоў, але падзеяй, што выслабаніла велізарны вызваленчы патэнцыял.

Захоўваюць сваю моц па сённяшні дзень і іншыя складнікі ленінскай спадчыны: ягоная крытыка «левізны як дзіцячай хваробы камунізму», напрыклад, і рэзка адмоўнае стаўленне да эканамізму. Ён усведамляў, што палітычны «экстрэмізм» або «празмерны радыкалізм» заўжды трэба будзе разумець як сведчанне ідэалагічна-палітычнага выцяснення, абмежаванасці таго, што можна рэальна дасягнуць. Зварот якабінцаў да тэрору быў істэрычным самавыкрыццём, сведчаннем іхняй няздольнасці парушыць асновы эканамічнага ладу (такія, як

прыватная ўласнасць і да т. п.). Сённяшнія «празмерныя праявы» палітычнай карэктнасці гэтаксама высвечваюць няздольнасць перамагчы сапраўдныя прычыны расізму і сексізму. Магчыма, надышоў час паставіць пад сумнеў меркаванне, якога трымаюцца шмат якія сучасныя левыя, – веру ў тое, што палітычны таталітарызм нейкім чынам вынікае з вяршэнства матэрыяльнай вытворчасці і тэхналогій над чалавечымі стасункамі і культурай. Што калі рэч у адваротным? Што калі палітычны «тэрор» азначае акурат тое, што сфера матэрыяльнай культуры падпарадкоўваецца палітыцы? Насамрэч праўдападобна, што палітычны «тэрор», ад якабінцаў да кітайскай «культурнай рэвалюцыі», заўжды прадугледжваў перанос вытворчасці на поле палітычнай барацьбы.

Ленінскае супрацьстаянне эканамізму мае сёння крытычнае значэнне, калі ўзяць да ўвагі падзел у поглядах на эканоміку ў радыкальных колах (у тым, што ад іх засталося): з аднаго боку, палітыкі адмовіліся ад выкарыстання эканомікі як сферы барацьбы і ўмяшання, а эканамісты, зачараваныя функцыянаваннем сучаснай сусветнай эканомікі, адхіляюць усялякую магчымасць палітычнага ўмяшання. Здаецца, што нам як ніколі прыдаецца праніклівасць Леніна: так, эканоміка – ключавая сфера, тут будзе вырашаны зыход бітвы; неабходна развеяць чары сусветнага капіталізму – аднак гэтае ўмяшанне мусіць быць чыста палітычным, а не эканамічным. Цяпер, калі антыкапіталістамі сталі ўсе і паўсюль – нават у Галівудзе, дзе ў апошні час з'явілася некалькі фільмаў на тэму змоваў (ад «Ворага дзяржавы» да «Свайго чалавека»), у якіх ворагам выступае вялікая карпарацыя і яе бязлітасная пагоня за прыбыткам, – ярлык [антыкапіталізму] страціў сваю падрыўную вастрыню.

У рэшце рэшт даводзіцца паставіць пад сумнеў усеагульную надзею на свабоду і дэмакратыю, веру, што яны выратуюць нас ад злоўжыванняў капіталізму. Праўда ў тым, што ліберальная дэмакратыя з'яўляецца спосабам палітычнай арганізацыі, якая як найлепш забяспечвае росквіт капіталу. Гэта асноўнае, чаму вучыць Ленін: толькі пазбавіўшыся ад нашай прывязанасці да ліберальнай дэмакратыі, якая не ў стане выжыць без прыватнай

уласнасці, мы зможам зрабіцца сапраўднымі антыкапіталістамі. Развал камунізму ў 1990 годзе пацвердзіў тэзіс «вульгарнага» марксізму, што эканамічнай базай палітычнай дэмакратыі ёсць права прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці – то бок капіталізм са спадарожнымі яму класавымі адрозненнямі. Найпершым памкненнем пасля ўвядзення палітычнай дэмакратыі была прыватызацыя – шалёныя намаганні любым коштам і якім заўгодна чынам знайсці новых уладальнікаў для ўласнасці, што была нацыяналізаваная за камуністамі, – былых апаратчыкаў, мафіёзі, каго заўгодна, абы толькі стварыць «базу» для дэмакратыі. Аднак усё гэта адбываецца запозна – акурат у моманце, калі ў першых постіндустрыяльных грамадствах права на прыватную ўласнасць пачынае страчваць сваю галоўную рэгуляцыйную ролю.

Нядаўна Джон Бергер выказаў цікавую думку адносна французскай рэкламы адной брокерскай інвестыцыйнай інтэрнет-фірмы пад назвай «Сэлфтрэйд». Пад выявай сярпа і молата з чыстага золата, інкруставаных дыяментамі, быў змешчаны подпіс: «А калі б фондавая біржа прыносіла прыбытак кожнаму?» Стратэгія рэкламнай кампаніі відавочная: сёння фондавы рынак выконвае эгалітарную праграму камуністаў, бо ў ім можа ўдзельнічаць кожны. Бергер прапануе параўнанне: «Уявіце сабе рэкламную кампанію, што выкарыстоўвае выяву свастыкі, адлітай у золаце ды інкруставанай дыяментамі! Вядома ж, гэта не спрацуе. Чаму? Свастыка адсылае да патэнцыйных пераможцаў, а не да пераможаных. Яна заклікала да дамінавання, а не да справядлівасці». У адрозненне ад яе, серп і молат абуджаюць надзею на тое, што «гісторыя ўрэшце будзе на баку змагароў за братэрства і справядлівасць». У той самы момант, калі кіроўная ідэалогія «канца ідэалогіяў» абвясціла гэтую надзею мёртвай, узорнае постіндустрыяльнае прадпрыемства (ці існуе нешта больш постіндустрыяльнае, чым гандаль акцыямі ў Інтэрнеце?) ізноўку яе мабілізуе. Надзея па-ранейшаму не дае нам спакою.

З ангельскай мовы пераклала Мілана Міхалевіч

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2005/1/15**
[image]

ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ
філёзаф, публіцыст. Сёлета ў выдавецтве «Логвінаў» выйшла яго кніга «Разбурыць Парыж».

Валянцін Акудовіч Прэзідэнт недадуманай нацыі

Не асмейваць чалавечых учынкаў, не пераймацца імі і не клясці іх, а разумець.

Бенедыкт Спіноза

У панядзелак пасля майскага рэферэндуму 1995 году дачка запытала, як людзі прагаласавалі «пра бел-чырвона-белы сцяг і мову».

Яна толькі ўвайшла ў хату, стаяла нераспранутая з ранцам за плячыма (тады вучылася ў другім класе) і напята чакала майго адказу.

З радыё я ўжо ведаў смутныя вынікі рэферэндуму і сказаў праўду… З дзявочых вачэй пырснулі слёзкі.

Добра, што я быў апрануты на працу і меў усе падставы хуценька схавацца за дзвярыма, бо што б я ёй сказаў, чым бы суцешыў?!

Але яшчэ не паспеўшы схавацца за дзвярыма, я ўжо быў поўны, як звон, нянавісці, якая сама сабой загула словамі: *гэтага* яму

я ніколі не дарую.

Натуральна, той даўні эпізод прыгадаўся не так сабе. Сваім эмацыйным успамінам я хацеў нагадаць, што бадай у хоць-каго з дэмакратычна (а тым болей яшчэ і нацыянальна) заангажаваных грамадзянаў нашай краіны здараўся момант, калі ён зацінаў у сабе нешта падобнае да «*гэтага* яму *я ніколі не дарую*». Інакш і быць не можа, бо за дзесяцігоддзе сваёй улады Аляксандр Лукашэнка стварыў столькі сітуацыяў, у якіх абражалася і рэпрэсавалася годнасць чалавека, што іх поўны пералік можна было б уціснуць хіба толькі ў бясконцасць стужкі Мёбіуса. Тут і бязлітаснае задушэнне страйку працаўнікоў метрапалітэну (скуль і набрала хаду рэпрэсіўная машына), і гвалт над дэпутатамі ў будынку парламенту, і «дзікае паляванне» на ўдзельнікаў мітынгаў ды шэсцяў, і хамавітае шальмаванне палітычных апанентаў (усімі магчымымі спосабамі), і вандалізм у дачыненні да нацыянальных святыняў (найперш сцяга ды гербу), і маўклівы пераслед беларускай мовы (ды яе носьбітаў), і публічнае абсцёбванне функцыянераў рознага гатунку, і запалохванне «дырэктарскага корпусу», і знікненне апазіцыйных палітыкаў...

Хопіць. Бо я зусім не маю на мэце ў чарговы раз даводзіць, які Аляксандр Лукашэнка нехарошы палітык. Хаця б таму, што харошых палітыкаў не бывае. Палітыкі бываюць вялікімі і нязначнымі, папулістамі і прагматыкамі, рэфарматарамі і кансерватарамі, агрэсарамі і міратворцамі… Але харошымі палітыкі a priori быць не могуць. І калі мы вымяраем Аляксандра Лукашэнку мерай той крыўды, што ён нам учыніў, то блытаем палітыка з начальнікам камунгасу, які не парупіўся завезці людзям торфу на зіму.

* * *

У кожнай сферы дзейнасці ёсць свае параметры, якімі ацэньваюцца дасягненні таго ці іншага чалавека. У даяркі – гэта колькасць літраў малака ад адной каровы, у бізнесоўца – прыбытак за год, у альпініста – вышыня гары…

А вось дасягненні палітыка выяўляюць колькасць (у сэнсе працягласці) і якасць (у сэнсе паўнаты) улады. І тут неістотна, якімі сродкамі палітык атрымаў і ўтрымлівае ўладу: самачынным гвалтам, рэпрэсіямі, папулізмам ці наспелымі рэформамі ды разумнымі законамі. (У маштабах *палітыкі* Сталін і Брэжнеў – велічыні несувымерныя, хаця апошні, прынамсі да перыяду «старэчага маразму», па чалавечых мерках быў куды як больш людскім у параўнанні са Сталіным.)

Зыходзячы з гэткага падыходу, мы мусім канстатаваць, што Аляксандр Лукашэнка, які амаль адразу пасля свайго абрання на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь займеў, лічы, абсалютную ўладу над усёй краінай і трымае яе ўжо дзесяць год, – не абы-што сабе палітык.

Між іншым, заўважым, Аляксандр Лукашэнка адзіны, хто на еўрапейскай частцы былога посткамуністычнага блоку (а не толькі СССР) утрымаўся на прэзідэнцтве столькі часу. За гэтую пару Літва змяніла ўжо трох прэзідэнтаў, а «наш», відавочна, збіраецца і далей доўжыць свой марафон, і ніхто яму не можа даць рады: ні апазіцыя, ні Захад, ні Масква. Таму калі нехта ўсё яшчэ думае, што Лукашэнка ўсяго толькі прыкрая недарэчнасць аднаго з эпізодаў беларускай гісторыі, а ягонае палітычнае «доўгажыхарства» неяк само сабой атрымліваецца, дык ён радыкальна памыляецца. На палітычнай верхатуры выпадковыя людзі доўга не трымаюцца. Там заўсёды ёсць каму падштурхнуць у спіну, калі ў цябе дрыжаць каленкі.

Упершыню рэальна ўвесь свой палітычны патэнцыял Аляксандр Лукашэнка выявіў тады, калі негалосна аб'явіў рушанне на Крэмль…

Як пайшла пра тое пагалоска, то спачатку ад рогату ўсе (што тут, што ў Маскве) ледзь не панадрываліся (маўляў, калгаснік, палітрук, «Піліп з канапель» – і на імперскі трон). Але вельмі хутка смехачам сталася не да смеху. Рэйтынгі Аляксандра Лукашэнкі ў Расіі «зашкальвалі», самыя буйныя расійскія бізнесоўцы вешалі ягоныя партрэты на сценах сваіх кабінетаў, а расійскія губернатары прымалі Аляксандра Рыгоравіча ў сваіх «вотчинах», як быццам на ім ужо была шапка Манамаха.

Крэмль не на жартачкі затурбаваўся, аднак нічога лепшага не змог прыдумаць, як забараніць Аляксандру Лукашэнку самастойна гойсаць па расійскай частцы ім жа створанай Саюзнай дзяржавы…

Толькі яшчэ невядома, чым бы ўся гэтая гісторыя скончылася, каб Барыс Ельцын не прыняў рашэнне, сапраўды вартае вялікага палітыка. Сярод тысячаў расійскіх чыноўнікаў ён відушча ўчуў Уладзіміра Пуціна і перадаў яму ўладу над зняможанай Расіяй.

Аляксандр Лукашэнка калі не адразу, дык досыць хутка зразумеў, што ягоная гульня на расійскім полі скончана, і паспяшаўся пераключыцца з «вялікага інтэгратара» ў «нацыяналіста».

Аднак гэта ўжо іншы сюжэт.

* * *

Палітык (прынамсі, маштабны) не столькі чалавек, колькі звер. У тым сэнсе, што ў яго, як у звера, мусяць быць гіпертрафавана выяўленыя (адносна чалавека) інтуіцыя ды розныя інстынкты (найперш інстынкт улады). Уласна чалавечыя якасці (сумленне, адукацыя, інтэлект) толькі замінаюць палітыку. Вось чаму сярод знаных палітыкаў мы амаль не знойдзем выбітных навукоўцаў, слынных філосафаў, вялікіх маралістаў…

Ёсць толькі адзіная чалавечая якасць, якой палітык мусіць валодаць лепей за чалавека. Гэта – умельства гаварыць (неабавязкова шмат).

Па ўсіх пералічаных параметрах (інтуіцыя, уладныя інстынкты, красамоўства) Аляксандр Лукашэнка мала якому іншаму прэзідэнту саступіць. Але асабіста мяне найбольш захапляе дэмагагічны складнік ягоных казаняў.

Аляксандр Лукашэнка – дэмагог ад Бога (калі пагадзіцца з хрысціянскім догматам, што ўся ўлада ад Бога). *Проста*

дэмагог – хай сабе і таленавіты, – прамаўляючы, ведае, дзе ён праўдзівы, а дзе «займаецца дэмагогіяй». А вось дэмагог ад Бога (як Лукашэнка), што б ні казаў, свята верыць у тое, аб чым у кожны пэўны момант кажа. І з гэтага шмат хто яму дае веры…

Вышэй, пералічваючы «звярыны» набор якасцяў палітыка, я неабачліва прамінуў «інстынкт тэрыторыі». Для звера акрэслены ягонымі пахамі параметр падуладнай тэрыторыі – базавая велічыня яго існавання. Тое самае і ў палітыка, толькі ў апошняга «інстынкт тэрыторыі» трансфармуецца ў «інстынкт пазіцыі», рухомага модусу прысутнасці, які ўвесь час мадыфікуе прастору ягонай улады адпаведна зменам геапалітычнай рэальнасці.

Аляксандр Лукашэнка найлепей выявіў «інстынкт пазіцыі» тады, калі развітаўся з нацыянал-дэмакратамі (і сацыял-дэмакратамі, і лібераламі…) і пачаў пазіцыянаваць сябе як пераемніка каштоўнасцяў «вялікай імперыі» і савецкага ладу жыцця.

На тую пару (пачатак дзевяностых) гэтае рашэнне Аляксандра Лукашэнкі шмат каму магло падацца бязглуздым. Бо ўсё абуджанае перабудовай да жыцця імкнулася як надалей адсланіцца ад ушчэнт дыскрэдытаванай «імперыі зла». Палітычная перспектыва бачылася толькі за дэмакратыяй, незалежнасцю, рынкам, лібералізацыяй…

Усё як быццам правільна – за адзіным выключэннем. Згаданыя інавацыі (мабыць, тэарэтычна слушныя) не мелі тады ў Беларусі патэнцыялу рэальнай улады. І Аляксандр Лукашэнка пакінуў гэтыя пазіцыі (як бесперспектыўныя) іншым, з больш слабай палітычнай інтуіцыяй і з менш развітым інстынктам улады. І да гэтай пары ён спіхвае на тую «тэрыторыю няўдобіцы» ўсіх сваіх новых супраціўнікаў, добра разумеючы, што нічога палітычна вартага ўскаласіцца там пакуль не можа.

Для палітыка, пакліканага ў гэтым свеце рэалізоўваць волю ўлады як волю да ўлады, зусім неістотна, у якім палітычным дыскурсе (ліберальным, нацыянальным, сацыялістычным, камуністычным…) выяўляць сваё пакліканне. Засвоіў некалькі

ліберальных ці нацыяналістычных лозунгаў (ды столькі ж прозвішчаў) – і маніпулюй імі, пакуль не наспее час мяняць пазіцыю. Але найбольш аптымальны варыянт атрымліваецца тады, калі сацыяльная канстанта палітыка хаця б збольшага тоесніцца з ягонай праграмай. І ў гэтым сэнсе Аляксандру Лукашэнку ў свой час моцна пашанцавала. Ён, наскрозь і завершана савецкі ды імперскі, ідэальна супаў з большай часткай такога ж самага беларускага электарату. Таму яны (Лукашэнка і электарат) вельмі хутка паразумеліся паміж сабой. Крэда гэтага паразумення беларускі прэзідэнт выказаў наступным чынам: *«За цывілізаваным светам я сваю краіну не павяду»*.

Хто толькі не кпіў з гэтага шэдэўру красамоўства! А дарма. Бадай нідзе і ніколі Аляксандр Лукашэнка не фармуляваў феномену сваёй улады гэтак лапідарна, ёміста і кантрастна.

«Цывілізаваны свет» (дэмакратыя, рынак, розныя свабоды і г. д.) і пасля распаду СССР заставаўся глыбока варожым савецкаму чалавеку, якім пераважна і быў беларускі грамадзянін.

Савецкі чалавек марыў мець капіталістычныя даброты, не супраць быў з'ехаць жыць «на Захад» ці хаця б выправіць туды дзяцей на вучобу, але *тут і цяпер*, на сваіх палетках і гонях, у сваім мікрараёне і на сваёй фабрыцы, ён ні пра які «цывілізаваны свет» нават слухаць не хацеў. І, між іншым, меў рацыю ў сваіх засцярогах, бо, па сутнасці, раптоўнае і татальнае нашэсце капіталізму на Беларусь было б для яго не чым іншым, як чарговай акупацыяй. Натуральна, новы акупант змусіў бы тутэйшага савецкага чалавека жыць паводле чужых яму законаў ды правілаў і бязлітасна караў бы галечай, калі б той умомант не перавучыўся завіхацца на «цывілізаваны» капыл.

Дык вось, сваім знакамітым выслоўем Аляксандр Лукашэнка рашуча запэўніў пераляканых беларусаў: не пераймайцеся, пакуль мая ўлада, мы не аддамо нашай бацькаўшчыны пад акупацыю «цывілізаванаму свету».

На здаровы клёк прамова як бы бязглуздая, але акрэсленая ёю

палітычная пазіцыя – пераможная. І хто з каго тут мае болей падставаў смяяцца?

* * *

Неяк Вальтэр сказаў, што калі б Бога не было, то яго варта было б прыдумаць. Бадай, тое самае можна сказаць і пра Аляксандра Лукашэнку ў дачыненні да Беларусі…

Распад СССР не стаўся для нас катастрофай. Прынамсі, у адміністрацыйна-гаспадарчым плане краіна цалкам была падрыхтаваная да самастойнага жыцця. І хаця «разрыў эканамічных сувязяў» стварыў шэраг сур'ёзных сацыяльна-эканамічных нязручнасцяў, асноўная праблема незалежнага існавання палягала зусім не ў эканоміцы, а ў адсутнасці досведу палітычнай улады. Праўда, раней гэтага досведу трохі мелі беларускія камуністы, але ўсе іх уладныя інстытуцыі і структуры ляснулі яшчэ напярэдадні развалу СССР.

Лёгка было на мітынгах палымяна дэкляраваць, што мы самі хочам і можам быць гаспадарамі на сваёй зямлі. Хацець як быццам сапраўды многія хацелі, а вось «магчы» – дык не надта каб у каго атрымлівалася. Што і паказаў пачатак незалежнасці, калі ўся ўлада ў краіне была згорнутая да памераў будынку Вярхоўнага Савету (добра, што пад «гарачую руку» хоць Вярхоўны Савет не згамавалі як інстытуцыю, створаную камуністамі).

Пазней Аляксандр Лукашэнка будзе казаць (і не аднойчы), што тады ўлада валялася пад нагамі, але ніхто не хацеў нават нахіліцца, каб яе падняць. Фармальна гэта як быццам і слушна, хаця па сутнасці ўсё выглядала інакш. Калі зірнуць на пачатак дзевяностых у цэлым, дык мы ўбачым: гістарычнага і практычнага досведу ўлады няма, ні дэмакратычных, ні камуністычных структураў ды інстытуцыяў улады няма, грамадзянскай супольнасці няма, канвенцыйнай нацыянальнай ідэі няма… З усяго гэтага татальнага «няма» і вынікала асноўная праблема: на чым (у адсутнасці грунту) паўставаць

уладзе, дзе ёй сталець і множыцца?

Магчыма, гэта залішне радыкальна, але, з майго гледзішча, на зачын дзяржаўнай улады тады заставалася толькі адно месца – прастора персанальнага «я». У нас не было выбару нейкай яшчэ формы ўлады ў тым сэнсе, што альбо знойдзецца такіх амбіцыяў і здольнасцяў чалавек, які наважыцца рэалізаваць Беларусь як свой уласны праект, альбо Беларусь неўзабаве зноў апынецца ў сітуацыі нічыйнай зямлі, якую ў кожны момант можа прырэзаць да свайго надзелу не той, дык іншы сусед.

Карацей кажучы, як на сённяшні свой розум, дык я не бачу для Беларусі дзевяностых гадоў іншай формы ўлады, акрамя дыктатуры альбо, як мінімум, жорсткага аўтарытарнага рэжыму. Ні для чога іншага рэальных падставаў на тую пару тут не было. Таму нам нічога не заставалася, адно як *прыдумаць* (паводле Вальтэра) таго, хто стане «Аляксандрам Лукашэнкам», бо інакш будзе ўжо зусім нядобра.

Зрэшты, трудзіць глузды беларусам не спатрэбілася, паколькі гісторыя нарэшце злітасцівілася з нас і падрыхтавала на «дэмакратычны» выбар дзве роўнавялікія постаці: Зянона Пазняка і ўласна Аляксандра Лукашэнку.

Калі б беларусы, як прыбалты, выявіліся «нацыяналістамі», яны мелі б прэзідэнцкую дыктатуру Зянона Пазняка. На іншы выпадак у дублёрах чакаў Аляксандр Лукашэнка.

Як усе мы добра памятаем, доўга чакаць яму не давялося.

* * *

Шчыра кажучы, у феномене Аляксандра Лукашэнкі мяне мала цікавіць і ён сам, і ягоны феномен. Аляксандр Лукашэнка ўсяго толькі адзін з агентаў волі ўлады (гісторыя чалавецтва падобных ведае мноства), якому было наканавана выявіцца і рэалізавацца ў Беларусі ў пару яе чарговага паўставання над роўняддзю быцця.

Мая абыякавасць да Аляксандра Лукашэнкі абумоўленая яшчэ і тым, што Беларусь сама па сабе (без персанальнай улады над Беларуссю) яго, здаецца, мала абыходзіць. Калі б яму ўволю хапіла той самай волі да ўлады, дык ён ужо даўно сядзеў бы ў Крамлі і пра занядбаную «малую радзіму» публічна нават не згадваў бы – каб не псаваць бляску свайго іміджу.

Вось чаму ў феномене Аляксандра Лукашэнкі мяне нікалькі не цікавіць ён сам, а толькі мы – кожны паасобку і ўвесь беларускі люд разам.

Неяк мне прыдумаўся немудрагелісты афарызмік: *паглядзі на сябе ў люстэрка – і там убачыш Лукашэнку*. Але той афарызмік мне адразу не спадабаўся (і зусім не таму, што яго недарэчы заканцавала рыфма). Я адчуваў, што недзе ў спратах прыпадабнення ўсяго беларускага народу да першага прэзідэнта крыецца вялікая хіба. І толькі нядаўна нарэшце зразумеў, чаму беларускі прэзідэнт ніякае не люстэрка: бо ён – наша вялікая паўза.

Аляксандр Лукашэнка – наша вялікая паўза ў тым сэнсе, што, каб асягнуць вышэйшай улады і трымаць яе цягам столькіх гадоў, яму спатрэбілася прыпыніць плынь часу, затрымаць яго ў формах і канфігурацыях, якія засталіся ў Беларусі ад савецкай пары. За гэтую затрымку хто толькі яго ні ганбіў. А я вось дык і зусім наадварот – удзячны яму за тое (магчыма, усяго за тое і ўдзячны).

Вышэй ужо казалася, што тая адміністрацыйна-гаспадарчая сістэма, якая нам дасталася пасля распаду СССР, была цалкам прыдатная для незалежнага існавання. Не ставала толькі рэальнага досведу самастойнай улады. Але, калі па вялікім рахунку, дык нам найперш не ставала іншага, а менавіта – разумення беларускім грамадствам сваёй анталагічнай самасці, цэласнага ўяўлення пра тое, хто мы такія ёсць (і ці ёсць мы ўвогуле), скуль тут апынуліся і куды нам праставаць далей. Праўда, гэткае «разуменне» з'явілася было ў нацыянал-дэмакратычнага руху. Аднак досыць хутка высветлілася, што яно было такім толькі для саміх чальцоў гэтага руху (з чаго ён пакрысе і заняпаў).

Адным словам, беларусам яшчэ трэба было зразумець сябе іншымі і ад тых, якімі іх выдумалі камуністы, і ад тых, якімі іх вымудрылі нацыянал-дэмакраты. А для таго каб наноў зразумець, чым (кім) ёсць гэтая дзесяцімільённая сукупнасць людзей (на пачатку незалежнасці паяднаная між сабой адно дзяржаўнымі межамі Рэспублікі Беларусь), неабходны быў час. І Аляксандр Лукашэнка нам яго адшкадаваў – запыніўшы.

З ягонай ласкі (хай сабе і не дзеля нас матываванай) беларусы змаглі спакойна агледзецца навокал, без спеху пакорпацца ў саміх сабе, прачуць сваю затуленасць уласнай дзяржавай (і скразнякі ў яе агароджы). Але самае галоўнае, што за гэты час яны патроху пачалі намацваць саміх сябе, са здзіўленнем адзначаючы, што нехта апрычоны тут, здаецца, сапраўды ёсць.

Праўда, у гэтай вялікай паўзе беларусы і шмат страцілі, найперш у рэфармацыйным, дэмакратычным ды нацыянальным дыскурсах. Толькі скуль каму вядома, колькі б чаго яны па дарозе растрэслі, каб адразу на злом галавы пабеглі ў тую ці іншую рэфармацыю (не надта ўяўляючы, хто і чаго туды бяжыць)?

Альбо вось дэмакратыя. Некаторыя чакаюць яе не раўнуючы як Царства Божага на зямлі… Не, я не супраць. Дэмакратыя, натуральна, лепшая за дыктатуру ўжо хаця б таму, што пры дыктатуры ў цябе на карку сядзіць паганяты з бізуном, а як надарыцца дэмакратыя – дык усяго толькі з пугай.

Наастачу не прамінём згадкай і ніштажэнне ўсяго нацыянальнага. Тут можна суцешыць сябе хіба толькі тым, што сваімі рэпрэсіямі Аляксандр Лукашэнка дапамог «свядомым» беларусам праверыць іх ідэалы на трывушчасць, а іх саміх – на меру ўпартасці ды мужнасці…

* * *

Сёння цяжка сказаць, наколькі плённа беларусы скарысталіся дараванай ім паўзай. Напэўна, не вельмі…

Прынамсі, мы дасюль застаёмся нацыяй, якую яшчэ трэба прыдумаць, дакладней, якую мы самі яшчэ мусім прыдумаць як універсалію, прыдатную для супольнага ўжытку кожнаму асобнаму чалавеку.

А пакуль не прыдумалі, нам, на вялікі жаль, ніяк не абысціся без «Лукашэнкі», пад якім бы прозвішчам ён ні быў запісаны ў пашпарце.

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/1/15
[image]

Сяргей Шыдлоўскі
Без прэзыдэнта ў галаве

СЯРГЕЙ ШЫДЛОЎСКІ сталы аўтар «ARCHE» і «Нашай Нівы». Робіць тэхнолягам на адным хімічным прадпрыемстве Наваполацку. Стваральнік рэсурсаў www.sivier.net і www.epolotsk.com.

Мысьлячая частка нашага грамадзтва знаходзіцца ў патомнай апазыцыі да тыраніі. Гэтая сьвятая нянавісьць, нібы атрыбут улады, пераходзіла ад генсека да генсека, пакуль яе налкам не ўзурпаваў Аляксандар Лукашэнка. Ужо дзесяць год мысьлячая частка нашага грамадзтва засынае і прачынаецца зь яго ным імем на вуснах.

Беларусь – краіна рэваншу «шасьцідзясятнікаў». Яна падаравала савецкай інтэлігенцыі шанец на «аксамітны» – маральны – супраціў. Інтэлігенцыя гэты шанец выкарыстала. Усё адбылося: біяграфіі адліліся ў лёсы, паэты падаліся ў выгнаньне, надрукаваліся чорна-белыя фотаальбомы, склаліся хартыі, у драматычнай цішы на пераломе стагодзьдзяў было прагаворана гістарычнае «ня зломіш».

Што ж будзе пасьля Лукашэнкі? Удакладнім пытаньне: што будзе пасьля Лукашэнкі з інтэлігенцыяй? А што было пасьля Леніна, Сталіна, Хрушчова, Брэжнева, Андропава, Чарненкі, Гарбачова? Ці нехта дзякуючы зьмене першай асобы ў дзяржаве памаладзеў, ці стаў больш здаровым або разумным?

Эўразьвяз і надалей ня будзе экспартаваць у Беларусь «правільных» грамадзянаў, Расея застанецца самым вялікім

нашым суседам, а Літва ня зробіцца «маці-радзімай» для праваслаўных беларускіх патрыётаў.

Рана ці позна Лукашэнка зьнікне з гістарычнай сцэны, магчыма – хто ведае? – разам зь ім, пазбыўшыся аб'екту нянавісьці, сыдзе і савецкая інтэлігенцыя – палітычныя аналітыкі, што займаюцца псыхааналізам, журналісты, якія цкуюць «жлобскую нацыю», гісторыкі, якія складаюць манаграфіі-фэнтэзі на падставе літоўскіх хронік? – гэты новы нечуваны тып людзей, мысьлячым органам якіх зьяўляецца сэрца.

Беларускаму прэзыдэнту супрацьстаіць «ліцьвінская» апазыцыя. Яна не нясе альтэрнатывы традыцыйнай сьвядомасьці. Эфэкт у сутыкненьні гэтых двух сусьветаў той самы, які быў бы, калі б, напрыклад, на ангельскіх выбарах кансэрватарам ці лейбарыстам надумалі супрацьстаяць эльфы ці оркі.

Якім нехарошым ні быў бы Лукашэнка, ён суадносны сыстэме каардынат беларускай рэальнасьці. Каштоўнасьці ж адраджэнскіх палітыкаў «ліцьвінскага» толку ўспрымаюцца на ўзроўні фэнтэзі. Замест пошуку кансалідуючых сымбаляў інтэлектуалы павялічваюць расколіну, адкідаючы, умоўна кажучы, «полацкую», задужа «бізантыйскую» спадчыну на карысьць спадчыны «віленскай». Але за будучага прэзыдэнта Беларусі будуць галасаваць менавіта палачане, а не віленчукі.

Сацыёлягі нядаўна ўсьцешылі сэнсацыяй: значная частка беларусаў за эўрапейскі шлях. Але чым паўстае для беларусаў «цывілізаваны Захад» – краем трыюмфу правоў чалавека ці радзімаю мыла «Пальмаліў», якое перамагло перхаць? Што перашкаджае інтэграцыі Беларусі з Эўропай – Лукашэнка ці, напрыклад, пагалоўнае няведаньне замежных моваў і нежаданьне іх ведаць? Чаго больш у нашым непрыманьні першага прэзыдэнта – ідэйнай прынцыповасьці ці абражанага эстэтычнага пачуцьця? Хто больш вінаваты ў шэрасьці нашай палітычнай сцэны – дрымучасьць эліт ці крыза беларускае кінаіндустрыі, якая ня ў стане прадукаваць айчынных Рэйганаў ды Шварцэнэгераў? Зрэшты, мець кіраўніка ад зямлі ў сучасным тэатралізаваным сьвеце могуць дазволіць сабе цяпер акрамя Беларусі хіба толькі Злучаныя Штаты Амэрыкі, што прагаласавалі за каўбойскія боты кандыдата з Тэхашчыны. Мы

самабытныя, мы ўпоперак мэйнстрыму.

Роля Аляксандра Лукашэнкі ў гісторыі Беларусі, то бок у падручніку гісторыі Беларусі, ня вызначана. Цана пытаньня – беларуская незалежнасьць, а дакладней – дылема: быць ці ня быць беларускаму падручніку гісторыі. Калі падручнікі ў найбліжэйшыя 20 гадоў у Беларусі будуць пісацца, Лукашэнка мае шанец заняць месца ў шэрагу крызысных мэнэджэраў эўрапейскіх нацый – Кромвэля, Бісмарка, Франка... У адваротным выпадку ня факт, што ён пройдзе гістарычны кастынг на ролю нават другараднага д'ябла расейскай гістарыяграфіі, кшталту Мазэпаў-Хмяльніцкіх.

Наша мінулае ўва ўладзе гісторыкаў, будучыня належыць Галівуду, і толькі гэты момант – наш. Трэба проста вымыкнуць тэлевізар.

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2005/1/15**
[image]

МАКС ШЧУР
паэт, перакладчык, публіцыст. Стваральнік інтэлектуальнага інтэрнэт-часопісу www.mamiesta.net. Жыве ў Празе.

Макс Шчур
Venit, dividit et imperat

Калі аднойчы будзе пісацца гісторыя зацяглай, «памяркоўнай», маруднай і ўсё яшчэ ня скончанай беларускай буржуазнай «рэвалюцыі», Лукашэнка зойме ў ёй ролю маленькага, халерычнага, славахцівага Напалеона Банапарта сан Шклова – рэстаўратара «старога рэжыму» й рэабілітатара ранейшых парадкаў. Нікім іншым, як гэткім Банапартам, Лукашэнка быць і ня мог – праз сваё савецкае выхаваньне, адукацыю ў духу «вялікадзяржаўніцкага» шавінізму, а таксама шматгадовую практыку саўгаснага кіраўніцтва, падчас якой будучы прэзыдэнт, вельмі магчыма, меў усе падставы лічыць сябе самым вялікім разумнікам у радыюсе 20–30 кілямэтраў. Дадамо да гэтага шырокія плечы й цяжкія кулакі – і вобраз фальклёрнага героя, народнага заступніка, асілка, якому «на родзе напісана» стацца царом, гатовы.

Насамрэч, каб прайсьці шлях ад старшыні да прэзыдэнта, трэба верыць ува ўласнае наканаваньне. Верыў у яго, натуральна, і Напалеон. Шырока вядомы камэнтары Напалеона да мак’явэліеўскага «Манарха»: зь іх вынікае, што Напалеон быў няздольны бачыць у гэтым творы нічога, апрача створанага за трыста год да яго «прарочага» апраўданьня сваіх будучых плянаў. Ён бачыў у ім толькі тое, што хацеў бачыць. Таму

нельга адмаўляць Напалеону ў наяўнасьці волі й пэўнай візіі – зусім наадварот. І чым больш шалёнай была гэтая візія, тым больш было й волі (як і колькасьці ахвяраў) для ейнай рэалізацыі. На жаль (на шчасьце? – хто ведае), гістарычныя акалічнасьці былі спрыяльныя: краіна патанала ў хаосе рэвалюцыі.

Ці быў Напалеон рэвалюцыянэрам? Не, у глыбіні душы ён ніколі ім ня быў, бо ня меў досыць розуму, каб зразумець саму ідэю рэвалюцыі. Ён быў толькі рэвалюцыйным генэралам (які быў павышаны ў генэралы за жорсткасьць і нечульлівасьць да чужых пакутаў), што скарыстаў сваё становішча для рэалізацыі сваіх мэтаў, – гэтаксама Лукашэнка быў спачатку толькі дэпутатам, які сваёй рыторыкай дамогся таго, што яму далі пасаду паводле ягоных амбіцыяў: ён узначаліў антыкарупцыйную камісію. Неўзабаве Напалеон стаўся консулам, таксама дзеля таго, каб «навесьці парадак» у сплюндраванай краіне, тым часам як Лукашэнка – «дэмакратычна абраным» прэзыдэнтам, што кляўся народу РБ у вернасьці на Канстытуцыі й пад бел-чырвона-белым сьцягам. Нарэшце, Напалеон зрабіўся манархам, які кіраваў «ад імя» Рэвалюцыі – тым часам як Лукашэнка пасьля свайго абраньня замяніў Канстытуцыю й сьцяг «лепшымі», больш адпаведнымі ягонаму сьветапогляду, а сам стаўся «ўсенародна абраным» бестэрміновым дыктатарам, які прыкрываецца інтарэсамі народу і пры гэтым /…/ сваіх апанэнтаў і замінае працаваць свабоднаму друку, незалежным адвакатам, прадпрымальнікам і ўсім астатнім, хто не падзяляе ягоных пераканаьняў. Як кожны дыктатар, ён належыць да катэгорыі людзей, перакананых у тым, што мэта апраўдвае сродкі. Той, хто ў гэтым сумняецца, – вораг нумар адзін.

Зрэшты, у 1994 годзе ніхто ня мог сабе ўявіць, што пераабраць першага прэзыдэнта будзе настолькі складана. Апошні шанец выправіць сытуацыю быў страчаны ў лістападзе 1996 году – гэтая дата мне бачыцца сёньня нашмат больш важнай, чымся 10-я ўгодкі прэзыдэнцкіх выбараў 1994 году. Гэтыя выбары былі не паразай дэмакратычных сілаў, а паразай іхнай палітычнай рэпрэзэнтацыі. Але што зробіш, ужо сам выбар даты ўтрымлівае ў сабе пэўны падыход, пэўную ідэалягічную

інтэрпрэтацыю, абавязковым складнікам якой ёсьць дэманізацыя Лукашэнкі й інфантыльнае перанясеньне ўсёй адказнасьці на «Дрэннага», «Іншага», «Ня-Я і кабыла не мая»...

Пры гэтым палітычная роля Лукашэнкі залежыць ня толькі й ня столькі ад ягоных асабістых здольнасьцяў ці палітычных густаў, колькі ад аб'ектыўнага гістарычнага становішча Беларусі. Вядома ж, ягоная асоба ня ёсьць і ня можа быць ні для кога сымпатычнай: менавіта таму ўлада ёсьць для Лукашэнкі сродкам дасягнуць нават не ўсенароднай, а наагул любові. Ёсьць як бы два Лукашэнкі: адзін – актыўны, імпульсіўны, аўтарытарны патрыярх, які ўсё вырашае сам і робіць паводле ўласных уяваў, і другі – пасіўны, датклівы, самалюбны, які чакае ўдзячнасьці й камплімэнтаў за сваю працу, а як тая ня клеіцца, дык заўсёды перакладае віну за сваю няўдачу на іншых. Але трэба ўсё-такі аддаць яму належнае: гэта нечувана моцная асоба, упарты чалавек, якога немагчыма пераканаць нават у відавочным, калі ён не жадае гэтага бачыць альбо трымае на вас нейкую даўнюю злосьць.

Пакінуць пасаду прэзыдэнта такому чалавеку самому вельмі цяжка – Напалеон таксама двойчы вяртаўся да ўлады, а потым да самага свайго заўчаснага канца сумаваў на высьпе Сьвятой Алены. У выпадку Лукашэнкі, аднак, ніякай выспы не прадбачыцца – хутчэй за ўсё яго чакае /…/. Таму ён ведае, што папросту абавязаны перамагчы. Гэта трэба мець на ўвазе ўсім, хто зь ім змагаецца. Мяркую, што весьці адкрытую палітычную барацьбу супраць дыктатара ягонага калібру й спадзявацца перамагчы яго на выбарах – марная рэч. Застаецца спадзявацца на «палацавы пераварот», замежнае ўмяшаньне ці народную рэвалюцыю накшталт грузінскай. Першы варыянт мне здаецца найбольш, апошні – найменш імаверным.

Ёсьць і яшчэ адзін варыянт: Лукашэнка застанецца пры ўладзе, аднак хтосьці павінен будзе займець на яго такі ўплыў, каб прымусіць яго радыкальна й незаўважна зьмяніць ягоныя палітычныя й эканамічныя погляды і з усенароднага Бацькі стацца сапраўдным «бацькам нацыі». Думаю, наўрад ці гэта калі ў каго ўдасца: Лукашэнку дастаткова, што ён ёсьць «бацькам нацыі» ў сваім уласным уяўленьні. Пры гэтым

створанай ім нацыі (так званага «электарату») не існуе й ніколі не існавала – яна ёсьць фікцыяй выбарчых фальсыфікацый.

На жаль, у дзяржаўным апараце існуе мноства людзей, якім гэтая гульня вельмі выгадная, – так званая вэртыкаль. Менавіта гэтыя людзі зробяць усё магчымае, каб Лукашэнка любым коштам застаўся пры ўладзе, але пры гэтым застаўся сам сабе гаспадаром і не далучаўся да Расеі. Калі Лукашэнка будзе пераабраны ці скінуты, дык толькі тады, калі ягоная палітыка перастане іх задавальняць. Менавіта з гэтага асяродзьдзя выйдзе магчымы будучы наступнік Лукашэнкі, які забясьпечыць яму беспакаранасьць у абмен на дабравольны сыход з пасады. Гэты «расейскі» варыянт мне здаецца нашмат больш імаверным, чымся тое, што да ўлады цягам наступных 10 гадоў прыйдзе апазыцыя. Такім чынам, хутчэй за ўсё шэрая расейскамоўная эпоха маруднай капіталізацыі й адсутнасьці пэрспэктываў для бальшыні насельніцтва (якая суправаджаецца далёкім і звычайнаму чалавеку няўцямным шумам беларускамоўных дыскусій аб незалежнасьці, беларускасьці, дэмакратыі і іншых узьнёсласьцях) будзе цягнуцца яшчэ даволі доўга. Хіба што толькі беларус сапраўды прачнецца – толькі вось наўрад ці яго абудзіць згаданы далёкі шум.

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2005/1/15**
[image]

Алесь Аркуш
Будаўнік эгіпэцкіх пірамідаў

АЛЕСЬ АРКУШ нарадзіўся ў 1960 годзе ў Жодзіне. Паэт, эсэіст, выдавец. Скончыў інстытут народнай гаспадаркі. Аўтар словаў гімну Полацку.

Чым быў знакаміты 1994 год для мяне асабіста?

Гартаю стары ўласны дзёньнік, запісы ў якім абрываюцца лютым 1995-га. Зь ягоных старонак павявае мінуластагодзьдзевай даўніной. Год, у якім быў абраны першы прэзыдэнт Беларусі, выдаўся для мяне цікавым, зьмястоўным і плённым. 18 лютага пастаўскі паэт Алесь Касьцень прывёз з Паставаў у Полацак наклад першага нумару часопісу «Калосьсе». Нумар быў памножаны ў пастаўскай друкарні і выглядаў вельмі сьціпла. Але мы былі радыя і такому. Прынамсі, гэта быў крок наперад у параўнаньні з альманахам «Ксэракс беларускі». У 94-м яшчэ працуе ў Полацку прыватная мастацкая галерэя «Рыса» (яе стварылі два мастакі – Сяргей Цімохаў з Аляксандрам Канавалавым – і мастацтвазнаўца Ларыса Лысенка). 4 сакавіка ў «Рысе» адбылася прэзэнтацыя новай выставы, сярод яе аўтараў і мая жонка Тацяна. 25 сакавіка – у Полацку ў былой Цёплай царкве Брацкай школы, у якой цяпер месьціцца Музэй беларускага кнігадрукаваньня, адкрыўся музэй Сімяона Полацкага. Менавіта ў гэтай залі ладзяцца штогадовыя ўручэньні літаратурнай прэміі «Гліняны Вялес». На банкеце з нагоды адкрыцьця новага музэю я апынуўся за сталом побач з расейскай літаратуразнаўцай

Лолай Званаровай. Маскоўскай госьці распавёў пра тэвээлаўскую фронду і падараваў нашыя саматужныя выданьні. У 94-м я жыў яшчэ ў Наваполацку. Дахаты з банкету нас з Тацянай завёз тагачасны мэр Нафтаграду дэмакрат Аляксандар Ніякоўскі. Ужо тады пазыцыі яго пахіснуліся. За «сімяонаўскім» сталом Ніякоўскі таямніча і глыбаказначна сказаў мне, што цяпер трэба «замацоўвацца» на пазыцыі сацыял-дэмакратыі. Празь нейкі час ён ціха, незаўважна пакіне наваполацкі «белы дом» – палітык зь яго не атрымаўся. 16 красавіка ў віцебскай галерэі Алеся Пушкіна наладзілі тэвээлаўскую літаратурную імпрэзу «Новая ініцыятыва». Падчас нашых паэтычных выступаў Пушкін рабіў замалёўкі-накіды да карціны, якую намалюе і прывязе на лістападаўскую тэвээлаўскую канфэрэнцыю ў Наваполацак. 8 траўня ў галерэі «Рыса» гучна адзначалі першыя ўгодкі ТВЛ. Прыяжджалі Лявон Вольскі, Кася Камоцкая, Юрась Барысевіч. Увечары ўсе сабраліся на полацкай кватэры Сяргея Цімохава. 20 траўня здаў у полацкую друкарню другую кнігу Юрыя Гуменюка «Твар Тутанхамона». Кошт друку – паўмільёна рублёў. 6 жніўня выбраліся ў вандроўку па мясьцінах Яна Баршчэўскага, гэта менавіта тая вандроўка, падчас якой, згодна зь сьведчаньнямі Пятра Васючэнкі, была зварана юшка з цмока. 12 лістапада прымалі Алеся Разанава ў Наваполацкім цэнтры нацыянальнай культуры, госьць апавядаў пра канцэпцыю новай «Крыніцы», пра ўсходнюю філязофію, якой захапляецца, пра сваю новую кнігу «Дзьверы», якую выдаў у Беластоку разам з Надзеяй Артымовіч. 19–20 лістапада ў Наваполацку адбылася першая тэвээлаўская канфэрэнцыя. Сярод гасьцей – украінцы Ўладзімер Цыбулька, Сяргей Жадан, Ігар Бондар-Цярэшчанка, расейцы Герман Лукомнікаў, Дзьмітры Кузьмін, Мікалай Байтаў, альбанец – культурны аташэ альбанскай амбасады ў Маскве Лігор Цулуфэ. Было шмат цікавых спрэчак, пра асобныя зь іх згадвае ў папярэднім нумары «ARCHE» ўдзельнік канфэрэнцыі Юрась Пацюпа.

Гэта мой культурны кантэкст 1994-га.

У маім дзёньніку ані слова пра абраньне прэзыдэнтам Лукашэнкі. У адрозьненьне ад культурных падзеяў 94-га, палітычныя згадваюцца аскепкава, фрагмэнтарна. Добра

памятаю, што ўгаворваў асобных сваіх крэўных, якія адмаўляліся галасаваць за Пазьняка, аддаць галасы хаця б за Шушкевіча. Было шмат спрэчак. Асабліва горача я спрачаўся з бацькам. Ён падтрымліваў Лукашэнку. У кожны свой прыезд у Жодзіна я абавязкова, часам задужа эмацыйна, дыскутаваў з татам. На якіх пазыцыях стаялі? Я казаў, што мусім будаваць незалежную краіну, дзеля гэтага трэба мець адпаведнага прэзыдэнта. Казаў пра інтэграцыю з Эўропай, пра эўрапейскія інвэстыцыі, пра перавагі самастойнасьці. Бацька казаў, што трэба не дапусьціць развалу таго, што маем. Ён ня быў фанатычным сымпатыкам Лукашэнкі, але лічыў, што з прапанаваных кандыдатаў найлепшым з горшага ёсьць А.Л.

Па шчырасьці, я быў упэўнены, што Пазьняк ня мае шанцаў. Аднак калі б Пазьняк выйшаў у другі тур разам з Кебічам, дык шанец зьяўляўся. На гэта і была надзея.

У другі тур выйшаў Лукашэнка.

Памятаю, ля ўваходу на адзін з выбарчых участкаў у Наваполацку пабачыў згорбленую, сівую бабулю, якая, ледзь перастаўляючы ногі, ішла галасаваць. Нехта зь людзкой гурмы гучна спытаў, за каго бабуля зьбіраецца аддаць голас. «Ой, сынку, за Лукашыка, бачыла яго ў целявізары, панравіўся дужа, справядлівы». Людзі гучна засьмяяліся. Нехта падтрымаў: «Правільна, бабуля». А мне падумалася, што прозьвішча «Лукашэнка» складанае для беларускага вымаўленьня.

Сёньня я працягваю спрачацца-дыскутаваць з бацькам па палітычных пытаньнях. Ён мне даводзіць, што меў рацыю адносна Лукашэнкі. Заводы працуюць, дзяржаўную маёмасьць розныя дзялкі не расьцягнулі, сякі-такі парадак у краіне ёсьць. Я кажу пра рэпрэсіўныя мэтады, якімі той парадак усталёўваецца, пра неэфэктыўнасьць такой эканомікі, пра дзяржаўны гвалт над асобай. Кажу пра закрытыя беларускія клясы, пра занядбаньне нацыянальнай культуры, пра разьяднанасьць нацыянальнай эліты, пра «недадзяржаўнасьць» Беларусі.

Некаторыя спрэчкі я бацьку прайграў. Некалі я казаў пра немінучы крызыс гарадзкога транспарту ў беларускіх местах.

Маўляў, хутка нашы аўтобусы-тралейбусы зусім дойдуць да ручкі, а купляць новыя за мяжой няма за што. Неўзабаве МАЗ пачаў выпускаць свае аўтобусы, якія ўсё часьцей сустрэнеш на полацкіх і жодзінскіх вуліцах.

Адзін мой знаёмы кажа, што Беларусь павінна прайсьці пэрыяд таталітарызму. Толькі з дапамогаю пугі, калі няма адпаведных рэсурсаў, можна пабудаваць эгіпэцкія піраміды. Пры дэмакратыі мы гэткіх посьпехаў ня мелі б (Палац Рэспублікі, менскі чыгуначны вакзал, нацыянальная бібліятэка, лядовыя палацы і г.д.).

Памятаю, прачытаў у літоўскай газэце інфармацыю пра тое, што прэзыдэнт Літвы Валдас Адамкус пазычыў у цырыманіяльнай службы аўтамабіль, бо прэзыдэнцкі зламаўся, а на новы ў дзяржаўным бюджэце не закладзены сродкі. Неймаверная сытуацыя для Беларусі, дзе прэзыдэнт можа мяняць самалёты, ня тое што аўтамабілі.

А яшчэ адзін мой знаёмы кажа, што, можа, нам і пашанцавала з А.Л., бо адваяваць у Лукашэнкі Беларусь усё ж прасьцей, чым у расейскіх або заходніх багатыроў, калі б тыя тут сур'ёзна атабарыліся.

Шкада, аднак, галерэі «Рыса» і часопісу «Калосьсе»: гэтыя праекты не знайшлі падтрымкі на Полаччыне – ані ў мясцовай улады, ані ў бізнэсоўцаў і кіраўнікоў прадпрыемстваў нафтахіміі. Сёньняшні беларускі парадак абыходзіцца і бязь іх.

чэрвень 2004

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2005/1/15
[image]

Пятро Васючэнка Беларус вачыма беларуса Беларус міфалагізаваны, гістарычны, рэальны

ПЯТРО ВАСЮЧЭНКА (нар. у 1959) – пісьменнік, літаратуразнаўца. Летась у выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшла яго кніга «Жылі-былі пяты, куляцкі ды заблоцкі». Гэты тэкст быў напісаны для зборніку «Невядомая Беларусь», які мае выйсьці пры падтрымцы фонду «За новую Беларусь».

Мая мілая маскоўская знаёмая, якая любіць гасцяваць у мяне, кажа, што любіць беларусаў, а найболей – размаўляцца з мной. Але, па-мойму, найболей яна любіць ставіць пытанні і не слухаць адказы на іх. Таму нядзіўна, што сёння яна пытаецца пра тое ж, што і ўчора. Прыкладам: «Ну чаму б вам не прызнацца, што вы такія самыя рускія, як і мы?»

Бывае, што яна змяняе форму пытанняў, але змястоўна яны тыя ж. Учора яна пыталася ў мяне: «А ці праўда, што вас прыдумалі палякі?» Сёння: «Ці не камуністы вас прыдумалі?» Заўтра будзе пытацца: «Ды хто вас увогуле такіх прыдумаў?»

Адказаць бы ёй, што ўсе нацыі спраектаваў Госпад, як яно і ёсць, але яна западозрыць мяне ў месіянізме. Каб не сварыцца, зводжу адказ да жарту: «Хай сабе і камуністы нас прыдумалі, не найгоршая іхняя прыдумка».

Можа быць, нас і прыдумалі тыя ж рускія. Скажам, у XIX стагоддзі, калі замацавалі за намі старасвецкае і даволі

цьмянае найменне – «белорусы», альбо нават «белорусцы». Маўляў, тое ж самае, што і «рускія», хай сабе белыя. Абы не палякі. Каб не гэтая прыдумка, можа, хадзілі б мы дагэтуль крывічамі або ліцвінамі, як у даўнейшыя часы. Хаця і тады беларусы называлі сябе тутэйшымі. «Я не лях, не маскаль, але тутэйшы чалавек». А сёння, каб не рускія, мы б, можа, сабе і штось больш мілагучнае ды мадэрнавае прыдумалі.

Беларуская асаблівасць палягае ў тым, што мы пачынаем прыдумваць сябе пасля таго, як нас ужо нехта прыдумае. Гэтая чужая думка пачынае свярбець, і тады беларус мусіць думаць пра сябе сам, ужо ў мэтах самазахавання.

У 1860 годзе расейскія дабрадзеі-літаратары жыўцом пахавалі беларуса: маўляў, такі ён і сякі, зусім занядбаны, адсталы, закатаваны, забіты, збыдлячэлы. Аж нават спадар дэмакрат Мікалай Дабралюбаў абурыўся: не веру, кажа, каб цэлы народ гэтак забілі ды затуркалі. Паглядзім, маўляў, што скажуць самі беларусы.

І беларусы неўзабаве адказалі – удзелам у антыімперскім паўстанні 1863–1864 гадоў.

Па вялікім рахунку, кожны народ сам сябе прыдумвае – праз саманазву, міф і прыхарошаную гісторыю.

Беларусы, як і іншыя народы, самі сябе прыдумвалі, самі выводзілі свой радавод ад легендарнага племені волатаў і рымскіх патрыцыяў, самі сябе дабудоўвалі цягам гісторыі, за рознымі акупацыямі і адраджэннямі, і такім чынам стварылі іпастась *беларуса міфалагізаванага*. Але рабілі мы гэта запозна і часам адставалі ад сутворцаў. Нашы суседзі надзялялі беларускі тып такімі міфалагічнымі якасцямі, як звышцярплівасць, звышталеранцыя, забітасць, затурканасць, прыгнечанасць, мужыцкасць, бясконцая адданасць большаму брату.

Гэтым міфалагемам з усяе моцы супраціўляецца *беларус гістарычны*, які жыў за часамі паўстанняў, войнаў і лакальных боек, сыходзіў у падполле, вылазіў з сутарэння, біўся з ворагам твар у твар, паміраў, адраджаўся, цярпеў, ненавідзеў, дараваў –

словам, адыгрываў сваю непаўторную ролю ў гістарычнай драме.

Ёсць яшчэ *беларус рэальны*, які паўстае з першых дзвюх іпастасяў, але прарастае праз іх у найноўшую гісторыю; ён пажыў за Саветамі, ён пасмакаваў незалежнасці, ён звыкся ўжо з тым, што жыве ў незалежнай дзяржаве, хаця не раз прымаў рашэнні насуперак гэтай незалежнасці на рэферэндумах.

Перадусім беларус рэальны сёння – творца гісторыі: ён папхнецца на новыя выбары і рэферэндумы або не папхнецца, у ягоных руках уласная экзістэнцыя і экзістэнцыя тых беларусаў, што прыйдуць пасля яго.

Ва ўсіх спробах акрэсліць тып беларуса – ці робяць гэта суседзі, ці робяць свае – заўжды будзе прысутнічаць момант непрасветленасці, недапраяўленасці, недавыказанасці. Гэта заўважыў яшчэ ў першай траціне XX стагоддзя філосаф Ігнат Абдзіраловіч. Падкрэсліў ён і тое, што, не стаўшы народам ні Заходняй Еўропы, ні славянскага Ўсходу, беларус захаваў такім чынам незалежнасць свайго духу.

Непраяўленасць Беларусі нагадвае вока тайфуна: навокал усё бурапеніць, віруе, а ўсярэдзіне штыль. Суседзі актыўна афармляюцца, набываюць выразнае культурнае аблічча, яно кідкае, выразна акрэсленае.

Мы іншыя, бо мы – у цэнтры гістарычных шляхоў, на скрыжаванні парадыгмаў. Усё, што наўкол, складаецца на нашай зямлі ў адметную суму, але запісваецца даволі таемнымі пісьмёнамі, якія, бы рунічныя знакі, не расчытаеш адразу. І калі мы хочам спасцігнуць беларуса рэальнага, трэба ад самага пачатку рабіць акцэнт на гэтую непраяўленасць і таямнічасць.

Грэючы душу ўспамінамі, вялікі ліцвін Адам Міцкевіч у лекцыях па славянскім фальклоры ды філалогіі, якія ён чытаў у Парыжы, так выказаўся пра сваіх суайчыннікаў-беларусаў: «Жыццё іх цалкам у духу. На зямлі іх гісторыя поўная смутку і жальбы». У Беларусі шмат чаго алагічнага, невытлумачальнага, не падуладнага сілагізму.

У гэтым трагедыя і абранасць. Як быццам Творца пазначыў тут цэнтр таемнага сілавога поля, *зону zero*, у якой вонкавае ператвараецца ва ўнутранае, істотнае, але дасюль не расшыфраванае.

АНТРАПАЛОГІЯ

Мая эрудыяваная маскоўская знаёмая разбіраецца ў антрапалогіі; яна лічыць, што мы адной крыві. «Што, чэрап мне будзеш штангенцыркулем мераць?» – у запале пытаецца яна. А пасля з уласцівай ёй непаслядоўнасцю мыслення пытаецца: «Чым жа вы ўсё-такі адметныя?», маючы на ўвазе будову чарапоў і ўсяго астатняга, што складае чалавечую знешнасць.

Беларусы міфалагізаваныя мелі гіганцкі рост і паставу. В. Ластоўскі, даследчык беларускае даўніны, наш Умберта Эка пачатку XX стагоддзя, сцвярджаў, што мае продкі жылі бясконца доўга, бо жывіліся толькі сырым, а страцілі даўгалецце, калі аскароміліся – пакаштавалі варанага.

Антрапалагічную рэпутацыю беларуса гістарычнага моцна папсаваў адзін з улюбёных паэтаў маёй начытанай маскоўскай знаёмай Мікалай Някрасаў, калі прысвяціў яму наступныя радкі ў вершы «Чыгунка»:

…Волосом рус,
Видишь, стоит, изможден лихорадкою,
Высокорослый, больной белорус:

Губы бескровные, веки упавшие,
Язвы на тощих руках,
Вечно в воде по колено стоявшие
Ноги опухли; колтун в волосах;

Ямою грудь, что на заступ старательно
Изо дня в день налегала весь век…
Ты приглядись к нему, Ваня, внимательно:
Трудно свой хлеб добывал человек!

Не разогнул свою спину горбатую
Он и теперь еще: тупо молчит
И механически ржавой лопатою
Мерзлую землю долбит!

Хворага беларуса, дробнага ў костцы, чэзлага, як бяроза на балоце, спітага ды ростам меншага за жанчыну насамрэч можна сустрэць на паўночным памежжы маёй краіны, дзе кабеты аруць і косяць, а мужыкі займаюцца браканьерствам і мяняюць рыбу на чарніла і танны адэкалон.

Інакш выглядае беларус, якога паказаў на карціне «Палясоўшчык» расейскі мастак І. Крамской: вочы – бы два зледзянелыя возеры пад блакітна-сталёвым небам, іх позірк не абяцае чужынцу нічога добрага. За спінаю рукі хаваюць невядома што – сякеру такога самага колеру, што і ягоныя вочы, ці звязку ўпаляваных качак. Такога і ў горадзе ў ціхім завулку страшна сустрэць сам-насам, не тое што ў лесе.

Беларус рэальны ў сваёй большасці захаваў яшчэ рысы, якія адзначыў у ім наш літаратурны класік Уладзімір Караткевіч у эсэ «Зямля пад белымі крыламі». Тыповы беларус – бялявы, з блакітнымі або шэрымі вачыма, мяккімі рысамі твару. Нават калі ён брунет, вусы ў яго найчасцей русявыя. Барады старасвецкія беларусы прынцыпова не насілі і гэтым адрозніваліся ад рускіх і стараверaў.

Дэмаграфічныя працэсы разбавілі гэты тып, і вось ужо на Палессі і беларускім захадзе сустрэнеш чарнявых землякоў, што сведчыць пра дамешак яцвяжскай (балцкай) або габрэйскай крыві.

Так, нас разбаўлялі ў розныя часы рускія, жыды, татары, балты, украінцы, і гэта асвяжала беларускі генафонд і спрыяла мясцоваму нацыяналізму. Заўважана, што самыя заўзятыя беларускія нацюгі – напаўкроўкі або квартэроны. Каго бракуе ў Беларусі – дык гэта сваіх мурынаў, хаця апошнім часам яны пачынаюць з'яўляцца, спяваюць беларускія зонгі. Змітрок Бядуля, наш паэт-класік габрэйскага паходжання, марыў некалі пра негрыцянскую акупацыю Беларусі, «абы не было ў ёй бальшавікоў».

Разбаўленне нацыянальнай інтэлігенцыі падчас масавых рэпрэсіяў не заўжды ішло на карысць захаванню тутэйшай мовы, культуры, традыцыі, бо часам імпартаваны вучоны бачыў нас як народ, а часам і не бачыў. Вучыў або не вучыў нашу мову. Гінуў дзеля яе ў сталінскіх канцлагерах або выкараняў тутэйшых «нацдэмаў».

Антрапалагічнае здароўе нацыі вымяраецца ў нас спортам. Характэрна, што беларусы перамагаюць у тых відах лёгкай атлетыкі, якія робяць яе цяжкай. Беларускія Зігфрыды і Брунхільды, што спрытна шпурлялі ядро, молат, дыск, змусілі ашалець публіку на апошнім чэмпіянаце свету. Беларусь – краіна волатаў і снайпераў. Поспехі ў біятлоне згадваюць пра даўнейшыя нашы партызанскія якасці – уменне страляць і ўцякаць. Такім быў наш старажытны князь Усяслаў Полацкі, якога за здольнасць знікаць, калі трэба, і з'яўляцца там, дзе не чакалі, абвясцілі ваўкалакам і пярэваратнем.

Някідкасць, стандарт выгляду беларускага мужчыны, дзеля якога ён мог бы стацца таленавітым віжом ці шпіёнам, кампенсуецца хараством беларускіх дзяўчат і размаітасцю формаў гэтай прыгажосці, якая задаволіць самы пераборлівы густ.

Прайдзіцеся ўлетку па праспекце Скарыны ў Менску ў той час, калі дрэвы апранаюцца ў зялёныя шаты, а дзяўчаты максімальна распранаюцца, і паўзірайцеся ў гэтыя твары і не загарэлыя яшчэ целы, і калі праспект не паплыве ў вас перад вачыма, як чароўная рака, дык ці мужчына вы? Інквізіцыя на Захадзе знішчыла дзявочае харство, бо спальвалі самых прыгожых і спакуслівых, а Беларусь гэтая пошасць абмінула.

Мая прыгожая маскоўская знаёмая не любіць гаворак на гэтую тэму, хаця пры нагодзе згадвае свае тры кроплі беларускае крыві.

Але яна ўжо больш ахвотна пагаджаецца са мною, што тое важнае, чаго не кранае чарвяк часу і што хаваецца пад чэрапам, завецца беларускі дух.

ТУТЭЙШЫ

«Я ведаю, што такое Руская ідэя, – кажа мне мая начытаная маскоўская знаёмая. – А Беларуская ідэя ў прыродзе існуе?»

Паколькі мая госця не чытае па-беларуску і з гэтае нагоды не можа засвоіць трактату тутэйшага філосафа Ігната Абдзіраловіча «Адвечным шляхам», які акрэсліў Беларускую ідэю як шлях і замацаваў за ёй прынцып «ліючайся формы», я раблю ёй прыемнае – вяду ў тэатр на спектакль «Тутэйшыя» паводле п'есы Янкі Купалы. Праходзяць абразы беларускага жыцця за часамі рэвалюцыйных забурэнняў і так званай грамадзянскай вайны. Мінск, або Менск, як называўся ён тады, па чарзе захоплівалі немцы, палякі, бальшавікі, а тутэйшыя людзі гандлявалі гарэлкай і зброяй, заганялі немцам іхнія маркі, а палякам злотыя, слухалі палітычных прамоўцаў у мясцовым Гайд-парку – на Брахалцы – і не верылі нікому, шыліся ў пажарнікі, каб не трапіць на прымусовыя работы, цішком здавалі адных акупантаў другім і не рабілі галоўнага – не ладзілі свайго нацыянальнага жыцця. Такую хворую рэакцыю на гістарычныя змены Купала і акрэсліў як «тутэйшасць».

Купала ведаў кошт гэтаму «тут» як цэнтру беларускай свядомасці, яго фатуму і болю, з якімі беларус не развітаецца, напэўна, ніколі, бо нават тутэйшасць як хвароба ёсць часткаю яго самога.

Беларуская зямля была асвоеная людзьмі каля 100 000 гадоў таму, і з тае пары яе насяляе адзін і той народ, аўтахтоны. Хай сабе цягам тысячагоддзяў мы змянялі свае імёны і нават мовы. Быў час («Які жах!» – вырываецца ў маёй знаёмай-славянкі), калі мы нават не былі славянамі, а належалі да цьмяных праіндаеўрапейцаў, арыяў, балтаў. Але мы дасюль захавалі сваё найпершае – пракаветнае *тут*.

Цягам доўгіх стагоддзяў чужынцы ўздымалі пыл на нашых дарогах і ў спешцы нічога не ведалі ды ведаць не хацелі ні пра нашу зямлю, ні пра нашых людзей. Ім цікавейшыя былі тыя, за кім яны гналіся або хто іх ганяў. Для іх Беларусь і беларус былі заўжды празрыста-прыдуманымі, праз што яны праходзілі без

перашкодаў, як праз паветра. Як жа яны дзівавaліся, калі аб гэтае празрыстае балюча набівалі гузы, як, прыкладам, татары пад Сіняй Вадой, крыжакі пад Грунвальдам, маскоўцы пад Оршай, акупанты ХХ стагоддзя ў беларускіх лясах ды багнах.

Вось так і рассыпаецца міф пра беларуса звышцярплівага, звышталерантнага, звышміралюбівага, бо ён бярэцца за зброю тады, калі ніхто ад яго гэтага не чакае.

Беларус гістарычны сядзіць на ўзбочыне дарогі і меланхалічна глядзіць з-пад далоні, хто там яшчэ сунецца. А той, хто сунецца, менш за ўсё чакае небяспекі ад гэтага вонкава абыякавага чалавека.

Рана або позна да фатальнай недапраяўленасці беларуса гістарычнага дадаўся інстынкт самазахавання тутэйшага. У рэшце рэшт, мала хто тут сноўдаецца з люду прышлага, а выходзіць да кожнага ды пытацца: «Хто ты такі і чаго табе трэба?» – дык ніякага цярпення не хопіць. Жыццё навучыла: усе яны гэтымі ж дарогамі і сыдуць, а ён, тутэйшы, заўсёды тут, каля свайго Богам наканаванага крыжа.

Слова «тутэйшы», па-за тым трагічна-саркастычным значэннем, якое надаў яму Купала, ёсць дастатковым самавызначэннем чалавека, які жыве ў запаветнай зоне zero. Яго не абыходзіць, хто тут каля яго вошкаецца, – гэта прыхадням трэба дапасоўвацца да тутэйшай прасторы і насельніцтва, прыдумваць для іх адэкватныя імёны, а нам да гэтага ніякай справы няма.

Абярнуліся гэтыя гульні тым, што ў XIX стагоддзі расейскія ды польскія этнографы самі пачалі пытацца ў тутэйшага люду: «Хто вы такія?» – і гэта прывяло да «дапраяўкі» нацыянальнай свядомасці тутэйшых.

Напрыканцы XIX стагоддзя, калі землякі маёй дапытлівай маскоўскай знаёмай пачалі задаваць беларусам занадта шмат пытанняў, шляхціц Францішак Багушэвіч напісаў культавую кнігу «Дудка беларуская», у якой адказаў на ўсе магчымыя пытанні гадоў на дзвесце наперад. Ягоны герой, селянін Мацей Бурачок, якога казакі ставяць пад бізуны і пытаюцца: «Хто ты

ёсць?», – адказвае па-беларуску дыхтоўна:

«Тутэйшы», кажу я, свой чалавек,
Сын бацькі свайго, а бацька дзяцей,
Тут і радзіўся, тут жыву век,
Юркам зваць бацьку, я дык Мацей.
Вунь дзе і хата, і выган, і сад:
Там жнець мая жонка, а там гарэць брат...

Гэты адказ расчытваецца прыблізна так: «Я, Мацвей Юр'евіч Бурачок, жыву на сваёй зямлі, нікому не перашкаджаю, я аўтахтон, мае продкі нарадзіліся і памерлі тут, і я так спадзяюся пражыць, па нацыянальнасці я не маскаль і не лях, а тутэйшы чалавек, па веры я ўніят, гаспадарку маю невялікую, але яна мая, і найбольш пільнуюся сваёй хаты». Яго гаспадарка – гэта ягоны свет, ягоны мікракосм. Але поўнае значэнне слова «тутэйшы» вядомае толькі Мацею, аднак ён не збіраецца казаць казакам нічога звыш за тое, што ўжо сказаў. А казак, для якога «тутэйшасць» абсалютна недасяжная рэч, ажно вар'яцее ад злосці. І ўжывае сілу.

Хто ж ён – тутэйшы, як ён жыве на гэтай зямлі?

ЯГОНЫ ДОМ

Мая маскоўская знаёмая азіраецца ў маёй гасцёўні і кажа: «Дом як дом, і нічога новага. Ёсць народы, «зацыкленыя» на сваіх дамах. Вось ангельцы кажуць: «Мой дом – мая крэпасць». Дык у іх жа насамрэч дамы! А ў вас? Што тут ахоўваць?»

Нядаўна мы з маёй мілай тэатралкай наведалі яшчэ адзін спектакль з беларускага рэпертуару, драму Я. Купалы «Раскіданае гняздо». Усё ў гэтай п'есе не так, як у людзей. Герой, селянін Лявон Зяблік, вешаецца ўжо напрыканцы першага акту, калі да фіналу яшчэ бездань часу. Ён не сцярпеў трагедыі бясхацця: яго выгналі з дому, які ўзводзіў уласнымі рукамі, бервяно за бервяном, «скуль бацьку і матку на могілкі вывез». Астатнія персанажы сноўдаюцца па руінах бацькоўскае

хаты і вырашаюць, як ім быць далей. Мая цудоўная тэатралка паціскае плячыма і не знаходзіць у гэтым сюжэце падставы для трагедыі.

Беларус гістарычны, як і беларус рэальны, нічога не будзе вам тлумачыць, пераконваць у нечым, а як што, дык і ў хату не пусціць. Дзіўная ў яго хата, парадаксальныя адносіны да яе.

Бедна ж мая хата, расселася з краю
Між пяскоў, камення, ля самага гаю.
Ля самага бору, на беражку лесу:
Ніхто тут не трапе, хоць бы з інтарэсу.
(Ф. Багушэвіч, «Мая хата»)

«Кепска мая хата, падваліна згніла, і дымна і зімна», – зацягвае сваю песню Мацей Бурачок. Суседзі, шкадуючы гаротніка, будуць запрашаць яго ў новую хату, прапаноўваць інтэрнат, сужыцельства і гэтак далей. Але гаспадар упарта трымаецца за сваю хаціну. Аддзярыце яго гвалтам ад гэтай хаты, вывезіце туды, куды Макар цяляты не ганяў, – ён вернецца да руінаў, пажарышча, котлішча, нават на згубу сваёй галавы, як гэта здзейсніў герой аповесці Васіля Быкава «Аблава» Хведар Роўба, у якога адабралі дом, гаспадарку, сям'ю, раскулачылі і вывезлі ў Сібір.

«Што гэта, любоў да ўласнай беднасці? Патрыятызм? – дзівіцца мая маскоўская знаёмая. – Патрыятызм не ёсць любоўю да ўласнае галечы. Патрыятызм – імкненне выбавіцца ад галечы».

Ключавыя словы знаходзім у Мацея Бурачка: «А яна мне міла». Мне і нікому іншаму. Што там, за гэтымі збуцвелымі сценамі, што саграваe сэрца гаспадару хаты? Ягоная душа.

Хата як замкнёная на замкі душа ёсць сымбалем беларускай эзатэрыкі і інтравертнасці. За някідкай, нецікавай абалонкаю дзеецца ўласная містэрыя, таямніца, дзяліцца якой беларус ні з кім не жадае.

«П.С.Х.» – так назваў свой твор двойчы апальны беларускі

драматург Леапольд Родзевіч. За часамі Юзафа Пілсудскага пісьменніка ганялі польскія ўлады, а пасля расстралялі Саветы. Мужык і жонка, героі п'есы, зняверыліся ў камуністах і вырашылі стварыць уласную партыю. П.С.Х. расшыфроўваецца як, «Пільнуй свае хаты».

«Колькі вы будзеце цярпець? Няўжо не брыдка?» – пытаецца мая спагадлівая маскоўская знаёмая, калі ёй нешта ў нас не падабаецца. Міфалагізаваны беларус – істота звышцярплівая, але і гэтай цярплівасці пакладзена мяжа. «Калі? – пытаецца яна. – Калі апошні мех з бульбай з-пад азадка выцягнуць?» – «Не, – адказваю я. – З такой бядой беларус справіцца». – «Будзе з голаду пухнуць?» – «Не будзе. У яго ў падполлі яшчэ адзін мех закапаны». – «А калі і той адбяруць?» – «У яго ў лесе ў капцы яшчэ адзін». – «І гэта будзе апошні?» – «Апошняга не будзе ніколі».

Душа як хата, хата як душа – сімвалы беларускага эзатэрычнага існавання, адменнікі дзвюх сакраментальных формулаў яго існавання: «Я тут» і «Я ёсць».

Гэта вялікія таямніцы беларуса, якія ён старанна ахоўвае. Вось чаму так ахвотна ён адмаўляецца (на словах) ад роднай мовы, ад суверэнітэту (нацыянальнага дому). Толькі з тае прычыны, што насамрэч ён іх нікому не аддасць. Ні мовы, ні незалежнасці. Нікому і нізавошта. А так – хай сабе цешацца. А мая маскоўская знаёмая ўсё дапытваецца: «Чаму вы не любіце сваёй мовы?» А іншым разам: «Чаму вы не кінеце беларускай мовы і не пяройдзеце на нашу?»

Насамрэч ніколі беларусы не выракаліся свае мовы. Памятаюць. Хаваюцца ў яе, ведаюць сваю перавагу над суседзямі: захочам, дык вы нас не зразумееце, а мы вас – заўжды. Вы для нас празрыстыя, а мы – цьмяныя.

«А беларусы ж нічога не маюць», – так шкадаваў суайчыннікаў Янка Купала. «Чаму вы вечна прыбядняецеся?» – дзівіцца мая раскручаная маскоўская знаёмая. Чаму нават новыя беларускія інтэлектуалы, папаездзіўшы па Літве ды Польшчы, уражаныя, адхрышчваюцца ад свайго ды кажуць, што ў нас усё чужое – польскае, літоўскае, расейскае? Што за гістарычная звычка да

самапрыбяднення? Іншыя нацыі крадуць чужых класікаў, а беларусы імкнуцца задарма аддаць сваё чужым.

Беларусы твораць міф наадварот. Прыкідваюцца, што ў іх нічога няма.

Беларусы – хобіты еўрапейскага лесу, што хаваюцца ў цень ад саміх сябе. Яны спадзяюцца, што гэты цень іх схавае. І што гэты цень потым дапаможа ім выйсці з ценю. Бо ім выгадней, каб іх рэальнага быцця не заўважалі. Гэта нацыя, якая спарадзіла адзінага ў свеце філосафа, які сцвярджае, што яго няма.

НАША ЗДРАДА

Калі нашы адносіны пагаршаюцца, мая раўнівая маскоўская знаёмая абвастрае і свае пытанні: «Чаму сярод вас столькі здраднікаў?», «Чаму вы так любіце здраджваць?». Пэўна, яна лічыць, што я здраджваю ёй, але ж гэта не так, бо яна мне не жонка і не айчына.

«Памятаеш, у нас быў путч? Вы нас не падтрымалі», – прыгадвае яна, надзьмуўшыся, сваю гістарычную крыўду.

Праўда, беларусы і тым разам маўчалі, бо сітуацыя была ў краіне маёй сяброўкі такая, што без паўлітры не разбярэш. Зрэшты, і самі яны дагэтуль не могуць разабрацца, дзе там праведнікі, а дзе здраднікі.

У нас на той час таксама былі людзі, якіх пасля назавуць пярэваратнямі і здраднікамі. Яны на былой плошчы Леніна, якая цяпер Незалежнасці, палілі чырвоныя кніжачкі, што калісьці насілі каля сэрца. Палала вогнішча з чырвоных кніжачак, усе радаваліся. У майго знаёмага не было чаго кінуць у полымя, бо не быў ён камуністам. Дык ён пашпарт у вогнішча кінуў, каб неяк спрычыніцца да ачышчальнага аўтадафэ.

Ані кнігі, ані кніжачкі паліць не варта. Але і тыя людзі на плошчы не бачацца мне здраднікамі.

Дай Бог уласную гісторыю разблытаць, бо яна, калі глядзець на яе вачыма маёй рыгарыстычнай сяброўкі, – суцэльны клубок

здрадаў.

Уладзімір, князь кіеўскі, здрадзіў бацьку і братам Рагнеды на сваім крывавым вяселлі. Рагнеда здрадзіла свайму бацьку і братам тым, што пайшла за іх забойцу. Потым яна і на мужа ўзняла меч. Сын яе, Ізяслаў, таксама замахнуўся мячом на бацьку. Але пасля ён з бацькавых рук прыняў спадчыну – Полацк. Уладзімір безліч разоў здраджваў Рагнедзе з палюбоўніцамі, якіх у яго было не менш, чымся ў цара Саламона, аж пакуль па хрысціянскім звычаі не павянчаўся з візантыйскай царэўнай, а верную жонку аддаў у манашкі.

Кароль нашае здрады – Ягайла. Ён здрадзіў свайму дзядзьку Кейстуту ў бруднай крэўскай справе, а заадно здаў і Беларусь дзеля польскае кароны. Гісторыкі скажуць, што гэтым ён Беларусь адначасова і адратаваў. Падчас Грунвальдскае бойкі невядома хто каму здраджваў – Ягайла Вітаўту або Вітаўт Ягайлу. Польскія храністы цвердзілі, што з беларусамі атрымаўся канфуз і яны на чале з Вітаўтам уцякалі ажно да Вільні.

Нехта невядомы здрадзіў Вітаўтавай кароне.

Апанас Філіповіч здрадзіў уласнаму вучню Яну Лубу. Вучыў, выхоўваў чарговага Ілжэдзмітрыя, каб пасля здаць маскоўскаму пасольству. Яшчэ Апанас Філіповіч клікаў Міхаіла Раманава, каб ішоў з вайною на родную Апанасу Літву, дзяліўся з маскоўскім царом дзяржаўнымі таямніцамі, павучаў караля Ўладзіслава IV, канцлера Льва Сапегу. Кароль ды канцлер глядзелі на гэтыя вымудры паблажліва. Апантаны Апанас выраблял у гэтай дзяржаве што хацеў – і ўрэшце даскакаўся. Царква зрабіла са здрадніка святога.

Аднойчы ў беларускай Акадэміі навук збіраліся ўшанаваць памяць самых знакамітых дзеячоў старажытнасці – паставіць ім стэлы. Абмеркаванне кандыдатураў было, у дэмакратычным часе, адкрытае. Павесілі на дошцы доўгі спіс кандыдатаў на стэлу, і кожны з навукоўцаў вольны быў паставіць «плюс» альбо «мінус».

Насупраць прозвішча Сімяона Полацкага якісь максімаліст

напісаў: «Здраднік. Перакінуўся на бок цара маскоўскага».

Небарака Сімяон Полацкі заблукаў на мяжы канфесіі ды Радзімы, не ведаў, што галоўнае, але і ў сваёй «здрадзе» імкнуўся захаваць сумленнасць. Спрабаваў перарабіць маскоўскага Навухаданосара на цывілізаванага еўрапейскага манарха, але не атрымалася. Сімяон Полацкі стаўся для Масковіі культуртрэгерам, навучыў маскоўцаў складаць вершы, падараваў ім першы літаратурны стыль (барока), але ягоных высілкаў не ацанілі як след ані тутэйшыя, ані тамтэйшыя. Добра яшчэ, што на палю не пасадзілі.

Падчас кампаніі Напалеона Банапарта ў Беларусі пачалася суцэльная здрада: мяшчане віталі супастата хлебам ды соллю, а шляхта запісвалася ў напалеонаўскія харугвы, каб разам ваяваць Маскву. Як быццам вярнуліся часы Альгерда.

Кастусь Каліноўскі вызваляў «дзецюкоў», «братоў сваіх, мужыкоў родных» ад няволі, а тыя браты адлоўлівалі ды здавалі каліноўцаў царскім жандарам за тое, што «хаваюць ад народу царскую волю».

XX стагоддзе было росквітам здрады, тут і кветачкі цвілі, «зялёны ліст, чырвоны цвет», і ягадкі крывавыя спелі. На нашым матэрыяле можна складаць анталогію здрадніцтва.

У лабірынце здрады можна заблукаць. Асабліва калі глядзець на матывацыі ды ўчынкі асобаў ды ўсёй грамады не праз нейкую ідэалагему ці маральную максіму, а праз агульнапрыняты (адмоўны) вобраз здрады.

Беларусь прадалі падчас падпісання Берасцейскага ды Рыжскага пагадненняў, прычым нават дывідэндамі не падзяліліся.

У 1930-я гады беларускія літаратары навучыліся здраджваць адзін аднаму. Рабілася гэта адкрыта і пакрыёма. Купала ў «Звяздзе» выракаўся былых сяброў-«нашаніўцаў», Кандрат Крапіва ва «Ўзвышшы» – «няправільных» правых «узвышэнцаў». Бэндэ, Кучар і яшчэ цэлая плойма аўтараў прафесійна займаліся знішчэннем літаратараў праз крытыку і данасы.

Выпрацоўваўся адмысловы тып пісьменніцкай двудушнасці, якую невядома як вызначыць – амаралізм ці проста тутэйшы спосаб літаратурнае экзістэнцыі.

«Пачакай! Пашкадуй сябе і свой народ! – не вытрымлівае мая чуйная знаёмая. – Хіба ж вы унікумы? У гісторыі кожнага народу можна знайсці безліч крывавых і ганебных плямаў!«

А я пра што кажу?! Нашто ж нас адных судзіць так строга і абвяшчаць увесь край здрадніцкім?

Тут яна ажыўляецца: «Вось-вось! Дык чаму падчас вайны сярод вас было столькі калабарантаў?»

За часамі другой сусветнай вайны Беларусь, як не раз ужо здаралася, была закінутая ў тыл акупантаў. Знайшліся тыя, што не беглі са зброяй у лясы, сеялі жыта, кармілі сям'ю, вучылі дзяцей, выдавалі газеты, пісалі вершы, былі выгнаны на працу ў Нямеччыну. Іх абвяшчалі найчасцей калабарантамі. Расейскія гісторыкі ўжо спрабуюць апраўдаць генерала Ўласава, а ў нас па-ранейшаму поўна «калабарантаў».

Беларус у чорную гадзіну часта кіраваўся індыйскай мудрасцю: «Лепей жывы сабака, чымся здохлы леў». Гэта дапамагала яму выжыць.

У горшыя часы мы выправаджвалі аднаго ўладара, каб замяніць яго новым. Пакрыўджаныя ўладары маглі назваць гэта здрадаю. Яны прапаноўвалі нам саюзы, уніі, выгадныя ўмовы анексіі. А потым крыўдавалі, што беларусы гэтых умоваў не прымалі.

«Мы заўсёды былі пад кімсьці», – кажа калега А. «Мы заўсёды былі ў нейкай уніі або саюзе», – кажа калега Б. «Можа, цяпер ганарары будуць большыя», – уздыхае калега В.

Праўда. Мы былі пад кімсьці, каб з-пад яго пасля вылузацца. І ў саюзы ўступалі, каб пасля з іх выходзіць. Гэта і лічылася здрадай. Падманулі давер.

Навошта ж было верыць? Не верылі б – і здрады не было б

аніякай.

Ёсць пакрыўджаныя на нас, што «здрадзілі», а мы гэтай крыўды як бы і не чуем, а на крыўдлівых ваду возяць. Паверылі ў нас, пасля зняверыліся – не трэба было верыць.

Тое, што называюць «здрадай», выглядае сумай розных матывацый, учынкаў ды іх наступстваў. Здрада – таямнічая, закрытая камера-абскура. Яна ж – і змесціва гэтай камеры, таямнічае, няўлоўнае рэчыва.

Яно можа рассыпацца на першасныя матывацыі, на элементарныя рэфлексы і пачуцці, і тады здрады не стане. Яна можа перарасці ў сваю процілегласць, і тады яе таксама не стане.

Мы не апраўдваем здрады, але шукаем яе матывацыю. Здрада – зброя слабога. Гісторыя пра меншага брата, вядомая яшчэ ў Егіпце Старажытным. Беларусаў прывучылі выконваць ролю меншых братоў пры моцных суседзях, хаця ўзростам яны старэйшыя. І на гэтую ролю мы ўнутрана не згадзіліся.

«Вы кепскія саюзнікі і пры нагодзе можаце здаць, – працягвае мая крыху разгубленая знаёмая. – А ў чым вы добрыя?»

Адказваю, хоць гэтыя адказы пададуцца камусь стэрэатыпнымі. Беларус – добры сусед, для тых, хто паважае ягонае «тут». Ён надзейны сябра для тых, хто паважае ў ім яго самога, а не прыдуманага кімсь. Ён адданы паплечнік, калі адстойвае разам з іншымі свае «тут» і «ёсць», а не чужыя прыхамаці. У эканоміцы ён надзейны партнёр, і – ідэальны працаўнік. Толькі не рабіце з яго службу, не абуджайце ў ім застарэлага комплексу служэння, з якога вырастае жаданне здаць часовага гаспадара. Нашы жанчыны – гарэзлівыя і незалежныя, зменлівыя, але не здрадлівыя. Нашы мужчыны гнуткія ў экзістэнцыйным выбары, але паслядоўныя ў анталагічных памкненнях (выжыць, выстаяць, пратрымацца, ацалець, самазахавацца насуперак усяму). У каханні яны…

«Не спяшайся пра гэта, – кажа мая знаёмая, – пасля паглядзім».

ЛЮДЗІ НА БАЛОЦЕ

«Балота, – са скрухаю кажа мая госця, – ці ж не ёсць вы балотная нацыя?»

Ад беларускіх памежжаў цякуць у процілеглых кірунках рэкі. «Сіняя-сіняя», – сказаў пра нашу краіну Ўладзімір Караткевіч. А другі класік, Іван Мележ, беларускі народ назваў «людзі на балоце». Сіняя ад безлічы крыніцаў і рэчак, азёраў ды балатоў з іх павольнай, маларухомай вадой.

Вада – захавальніца і правадніца энергіі ў кожным фізічным целе.

Абкружаны вадой, рэкамі, азёрамі ды багнай, беларус настальгаваў па трывалай зямлі, і шэдэўры нашай літаратуры – паэма Якуба Коласа «Новая зямля», «Палеская хроніка» Мележа – увабралі ў сябе гэтую адвечную прагу беларуса.

Літаратура міфалагізавала беларуса, які марыць пра зямлю больш, чым пра нявесту, і рэальны беларус сённяшняга дня таксама здатны здзіўляць сваёй геафіліяй або геаманіяй. Бадай што і бульбаманіяй.

Чароды «Мерседэсаў», «Аўдзі» і «Гальфоў», што шныраюць у дачныя сезоны паміж вёскай і горадам, не сведчаць, што беларусы апанаваныя голадам. Гэта сведчанне неспатоленага голаду духоўнага, настальгіі па «сваім». Беларусу важна, каб на стале ў яго было сваё – «свая цыбулька, свой часнок».

Беларус – дзіця плённага шлюбу зямлі і вады. Зямля, на якой ён стаіць, нагадвае яму пра тое, што ён *тут*, а вада, якая спрабуе вымыць зямлю з-пад ягоных ног, кажа пра тое, што ён *ёсць* і будзе. Заўжды, як гэтая рака часу.

Тут, на гэтай вільготнай зямлі, шмат што нараджалася, але непрыкметна, нягучна. Балота – не мора, каб бушаваць і бурапеніць. Беларус жыве настальгіяй па страчаным калісь моры – мільёны гадоў таму яно пялёскалася каля паўднёвых берагоў нашае зямлі, а пасля знікла, пакінуўшы карысныя выкапні і аграмаднае Пінскае балота. Якое, дарэчы, Герадот

зблытаў з морам, і адсюль пайшло – «мора Герадота».

На берагах Герадотавага мора рэвалюцыі адбываюцца бязгучна і млява.

Мы з маскоўскай госцяй стаім на гаўбцы маёй кватэры, разглядаем наваколле і гаворым пра беларускую палітычную гісторыю. «Чаму ў вас не было сваіх дысідэнтаў? – дапытваецца мая прыяцелька. – Што рабіла вашая творчая інтэлігенцыя, калі Салжаніцын і Вайновіч з'язджалі на Захад?»

Я жыву ў мікрараёне, які праглынуў некалі прылеглую да Менску вёску. Ад вёскі засталася толькі назва – Уручча – і падземнае возера ад асушаных калісь ручаёў. Аднойчы вада выйшла на паверхню. Возера засыпалі жвірам і пабудавалі на ягоным месцы аўтастаянку.

«Зірні вунь туды», – паказваю я ў бок Маскоўскае шашы. Там, за асфальтавай ракой, утварылася новае возера. Месяц таму яно было мёртвае, а сёння ўжо качкі на ім гняздуюць, жабы крумкаюць і дзеці плаваюць у начоўках ды ловяць калючак.

Так і з беларускім духам. Яго засыпаюць жвірам, заганяюць у падземныя лабірынты, і ніхто не ведае, дзе ён паўстане далей. Ён неўміручы, як гэтая блукаючая вада.

Дысідэнты і палітычныя эмігранты ў нас былі і ёсць, як і ў кожнай нацыі. Але не абавязкова яны, тутэйшыя, з'язджалі ў іншыя краіны – яны сыходзілі ва ўнутраную эміграцыю. Нашы паэты маўчалі гадамі, а мова – дзесяцігоддзямі. Беларусы пабудавалі для свайго духу схоў – падземны лабірынт, а суседзі пра іх існаванне згадвалі толькі тады, калі беларусы выходзілі з лабірынту. Пакрыёмнага існавання амаль ніхто не заўважаў.

І таму не варта дзівіцца, што мы ўсё-такі ёсць. На гэтай крыжаванай зямлі на працягу апошніх пяці стагоддзяў гіне то кожны другі, то кожны трэці, чацверты. Чарнобыль пасыпаў радыяцыйным попелам галовы тутэйшых. Неаднойчы ў нашай гісторыі здавалася, што колькасць людскіх стратаў пераваліла крытычную масу і пасля такога адрадзіцца ўжо немагчыма. Наўрад ці які яшчэ з еўрапейскіх народаў перажыў бы і ацалеў

пасля такога бязлітаснага вынішчэння.

А мы сабе сеем і сеем
Пшаніцу, і радасць і кветкі;
Ачышчаным сеем насеннем
Шчаслівыя нашы палеткі...

– пісаў Купала ў страшным 1938 годзе, калі творчая інтэлігенцыя была практычна вынішчаная.

Не першы раз заўважаецца, што беларуская ментальнасць хавае ў сабе архетып багны, дрыгвы. Рызыкоўна выпрабоўваць вонкава спакойную, непрадказальную стыхію.

Варта ведаць адну ўласцівасць балота: на ім немагчыма што-небудзь трывалае збудаваць. Але і дарэшты разбурыць немагчыма.

Энергія Герадотавага мора можа сплысці ў нетры Палесся, прыхавацца, як нячутна хаваецца ва ўласным панцыры палеская дрыгвяная чарапаха. Праз нашу літаратуру, як праз ракавіну, чуцён пошум памерлага мора. Але яно нагадвае пра сябе – і не толькі ў літаратуры.

Як ціха, амаль незаўважна пачыналася вялікая дзея ў дамку панад Свіслаччу ў 1898 годзе, дзе на першы свой з'езд сабраліся расейскія сацыял-дэмакраты! Аж пакуль па ўсіх абшарах Расейскай імперыі і далей не разлілася «такая чырвоная паводка... такая, меджду протчым, паводка, аб якой не снілася ні Фараону, ні Саламону» (Я. Купала, «Тутэйшыя»).

Каб праз стагоддзе зноў ціха суняцца дзе-небудзь у гушчарах Белавежскае пушчы.

Але багна бывае і проста прыгожай. Толькі сляпы не ацэніць хараства смарагдавых імхоў, з якіх паказваюцца, бы кроплі крыві, буйныя ягады журавіны. Калі-небудзь мая маскоўская знаёмая прасякнецца дзівосным хараством беларускіх балатоў.

БЕЛАРУС СЯРОД ІНШЫХ

«Чаму вы нас не любіце?» – гняўліва спытала мая знаёмая пасля таго, як мы пасварыліся праз фільм «Сібірскі цырульнік», які яна ўпадабала, а я не.

Як непрэтэнцыёзная нацыя, беларусы не клапоцяцца, каб іх дужа любілі. Мы ж не амерыканцы і не расейцы, для якіх чужая любоў жыццёва неабходная. Беларусу больш актуальна, каб яго не чапалі. Няма ў беларуса і вялікай любові да якога-небудзь іншага народу ці нацыі.

Адпаведна ў беларусаў няма грунтоўнай нянавісці да іншых народаў. Марная справа культываваць сярод беларусаў антысемітызм або звярыны нацыяналізм. Як і ўвогуле прышчапіць ім чужую ідэю. У маёй краіне хапае прарокаў, тутэйшых і прышлых, якія прапаведуюць чужыя майму народу ідэі і твораць на кожным кроку Брахалку, але душа беларуса на гэтыя заклікі не адгукаецца.

Беларус будзе пагаджацца з усім, што вы яму скажаце, махаць галавой, але сам у гэты час будзе думаць пра другое, а рабіць трэцяе. Адсюль пэўная немажлівасць (да нядаўняга часу) беларускага месіянізму.

Беларус не можа ненавідзець іншыя народы, але ў штурханіне, барацьбе за месца пад сонцам ёсць у яго свая стратэгія.

«Беларус, дзе трэба, крэпкім словам, што бізуном, дасць...» – казаў пра наш нораў пісьменнік Максім Гарэцкі. Але рэдка беларусы той бізун уздымаюць. Пра сваіх суседзяў – палякаў, расейцаў, украінцаў, жыдоў, цыганоў – кажуць найчасцей жартам. Пацвельваюцца.

Пацвельванне – мяккая, гуманная, ачышчальная тэрапія смехам. Беларус не жадае ліха сваім суседзям, калі іранізуе з іх. Нехта можа і пакрыўдзіцца на іх нязлосныя показкі. Але апраўдвае беларусаў тое, што найболей ахвотна і дасціпна яны пацвельваюцца з саміх сябе.

Практыка самаіроніі – гэта памахванне, ківанне, гульня

бізуном. Удару няма. Шкадуючы іншых, няўжо беларус будзе сцябаць самога сябе?

Смех мае ўласцівасці памяншальнага шкла.

– А за Гомлем людзі ё? – пытаецца адзін беларус у другога.

– Ё. Толькі дробненькіё, – адгукаецца другі.

У святле смеху мізарнеюць не толькі рэчы, але і сур'ёзныя заганы.

Якія якасці беларусы самі ў сабе высмейваюць?

Тыя, што нам прыпісваюць. Правінцыялізм, вясковасць, ксенафобію, звышцярплівасць, звышпамяркоўнасць, здрадлівасць.

Самаіронія беларусаў – папераджальны захад супраць нянавісці. Мы смяёмся з тых міфалагемаў, якімі нас надзяляюць, і прымушаем іншых смяяцца, а не ненавідзець.

Пацвельванне хавае ад чужога вока ўласную няёмкасць. Сорам ператвараецца ў браваду.

У XIX стагоддзі невядомы аўтар склаў вершаванае апавяданне «Тэатр», герой якога, безыменны селянін, у самаіранічных фарбах распавёў пра сустрэчу з Мельпаменай. Ён выгадна прадаў дровы, купіў жонцы хустку, сыну штаны, сабе тытуню і вырашыў павесяліцца. Убіўся ў тэатр, купіў квіток, залез на галёрку, зняў лапці, анучы і развесіў сушыцца. Яму здавалася, што прыгожая, хаця і худаватая актрыса глядзіць толькі на яго. Калі грымнулі воплескі і на сцэну пасыпаліся кветкі, герой шпурнуў актрысе сваю ахвяру – люльку з гарачым попелам, пасля наважыўся кінуць лапаць, але яго схапілі падпахі паліцыянты. У кутузцы герою спадабалася яшчэ больш, бо яму выдалі тры фунты белага хлеба, якога ён ніколі ў жыцці не каштаваў. Потым ён гэтым хлебам частаваў у вёсцы дзевак.

Наіўнасць героя, ясна, удаваная. Ён як бы запрашае: ну ведама, мужык – дурны, як варона, дык смейцеся, шаноўныя, абы пасля не плакалі.

Самаіронія для беларуса – панцыр, у які ён хавае свае комплексы і таямніцы.

Пацвельванне – інтэлектуальная тэхніка, гульня шкляных пацерак, рызыкоўная, але вартая пераймання, высокае майстэрства, вынаходлівая містыфікацыя. Шэдэўры нашага пісьменства – «Прамова Мялешкі», «Ліст да Абуховіча», «Энеіда навыварат», «Тарас на Парнасе», «Панскае ігрышча» – сведчаць пра тое, што беларусы валодалі гэтай тэхнікай здаўна.

Сур'ёзным і закамплексаваным на сваёй сур'ёзнасці народам ёсць чаму ў беларусаў павучыцца.

То ж бо ад смешнага да вялікага – таксама адзін крок.

АДНОСІНЫ ДА ХВАРОБЫ І СМЕРЦІ

Мая госця аднойчы ўзлавалася на мяне за нешта і шпурнула ў мяне кактус. Сама пакалолася і мяне пакалола. Адразу пабегла ў паліклініку рабіць прышчэпку ад слупняку, бо ў Амерыцы, дзе яна пражыла колькі часу, усе так робяць. Праз гэты інцыдэнт у нас адбылася гаворка пра адносіны беларуса да хваробы і смерці.

Закрытасць і эзатэрыка прысутнічаюць і тут.

Беларус хварэе, як і кожны чалавек. Цярплівасць, якую часам перабольшвалі, праяўляецца тут напоўніцу. Беларус вытрымае любую хваробу і любы боль. Я ведаў некалькі старых беларусаў, якія памерлі, не ведаючы, што хворыя на рак лёгкіх.

Яшчэ ў беларусу жывуць спрадвечныя недавер і страх перад Лекарам.

Я лекар, глаўны аптэкар,
Умею лячыць,
Кроў мячыць,
Корпію ўстаўляць,
Жывых людзей на той свет адпраўляць:
Ка мне вядуць на нагах,

А ад мяне вязуць на санях,

– самарэкламуецца Лекар з батлейкі (народнага лялечнага тэатру).

Лекар ва ўяўленні беларуса – гэта тутэйшы Харон, які перапраўляе людзей у апраметную і ніколі – адтуль. Беларус як істота інтравертная не любіць, каб хтосьці корпаўся ў ягоных шлунках. Звязвацца з Лекарам азначае тое ж, што хаўрусаваць са Смерцю.

Таму беларус, калі яго апаноўвае немач, схільны без старонняй дапамогі ачуньваць або ісці да Абрама на піва саматугам.

Беларусы лечацца і паміраюць паасобку. Да апошняга моманту іх не пакідае надзея: можа, як-небудзь разыдзецца? І няма ў традыцыйнага беларуса такой звычкі – паміраць у калектыве. Кожны імкнецца зрабіць гэта ціха, без лішніх сведкаў.

Калі ў Беларусі пабудавалі больніцы, людзі запоўнілі іх неахвотна. І не дзеля таго, каб лячыцца. А для таго, каб, як той казаў, у іх «ляжаць». Хаця насамрэч беларусы ў больніцах не ляжаць. Яны ў іх сноўдаюцца, поўзаюць, цягаюцца, мадзеюць, чаўрэюць, але не ляжаць. Няма ў нас такой ментальнае рысы – ахвоты да ляжання. У Беларусі Ілья Мурамец не пралежаў бы і трыццаці трох дзён, бо яго сцягнулі б з печы.

Прагматычныя беларусы вырашаюць у больніцах тыя праблемы, якіх яны не могуць вырашыць на волі. Больніца – месца, дзе можна прабавіць час узімку, калі працы няма, пракачацца, наглядзецца серыялаў, каб аж уваччу пазелянела. Улетку больніцы напаўпустыя. Беларусам улетку няма калі хварэць ды паміраць.

У больніцах як нідзе беларусы выяўляюць свае ментальныя рысы – цярплівасць ды законапаслухмянасць.

Прыгадваю, з якой пакараю прымалі пацыенты самае балеснае, што ёсць у больніцы, – уколы ў вочы. Сам атрымаўшы іх з тузін, засведчу: пасля такога радуешся кожнай хвіліне, пражытай без

уколаў.

Дысцыплінаванасць хворага беларуса паказаў пісьменнік Ядвігін Ш. у апавяданні «З бальнічнага жыцця». Пацыент № 17 марудна канае, і нецярплівы наглядчык, не дачакаўшы ягонай смерці, запісвае ў кніжцы: «Памёр у 9 гадзін вечара». «Як увесь свой нядоўгі век быў паслухмяны Сымон, так і ў гадзіну свайго канання стаўся паслухмяным начальству: у дзевяць сканаў», – піша аўтар.

Больніца прышчапіла беларусам кепскую звычку – хадзіць шоргаючы ды ўгнуўшыся.

Часам думаю, што ўсе хваробы пайшлі ад гэтай звычкі – існаваць угнуўшыся ды шоргаючы. Не абмінулі гэтае хваробы многія народы, у тым ліку і мы, грэшныя. Праходзіць час, і людзі выпрастваюцца, паколькі кожнай хваробе пакладзены канец. Беларусы ж паводле ментальнасці настроеныя на неўміручасць, бо яны, як кажа філосаф Валянцін Акудовіч, абраныя вечнасцю.

«ШТО-ТА БУДЗЕ ЦЯПЕР?»

Такое пытанне сёння задаваў і задае кожны, хто думае пра Беларусь. Самі беларусы пераважна маўчаць. Альбо адказваюць, як мудры Купала вуснамі сваіх хітраватых палешукоў з паэмы «Над ракой Арэсай»:

Што-та будзе тут цяпер?
«Нічога не будзе!» –
Хітра думалі ў чацвер
Палескія людзі.

Гэта адказ і тым, хто ўпотай спадзяецца на знікненне з еўрапейскай карты гэтай краіны, асіміляцыю яе народу. І тым, хто шчыра спачувае гэтаму народу і трывожыцца за яго лёс.

«Не загіне краю родны», «чарнобылем не зарасце», як казалі тутэйшыя паэты, бо край гэты асуджаны на неўміручасць,

прынамсі, да тае пары, пакуль «не пагаснуць зоры ў небе».

Не знікне беларуская мова, пра паміранне якой казалі дзесяткі і сотні гадоў таму, а яна жыла, насуперак усім законам, паводле якіх нараджаюцца і паміраюць мовы.

Але ў гэтай краіне, пад вонкава спакойнай паверхняй яе быцця, адбываюцца новыя таемныя змены, якія закранаюць за душу беларуса.

Беларусы ў XXI стагоддзі, у камп'ютэрнай і глабалізаванай цывілізацыі – не зломкі і не ізгоі. Яны таксама хочуць жыць, як усе людзі паспалітыя, і цярэбяць да годнага жыцця свой адмысловы шлях. Прыжыцца ў новых варунках рэальнаму беларусу дапамагаюць такія яго прыроджаныя якасці, як цягавітасць, прагматызм, жывучасць, эўрыстычнасць мыслення, пакрыёмасць існавання.

Апошняя якасць нібыта перашкаджае беларусу раскручвацца як гандляру або творцу, але поспехі нашых дзялкоў і мастакоў перакульваюць і гэтыя стэрэатыпы.

Беларус рэальны адмаўляецца ад забабонаў і падкрэсленай сціпласці, хаця ў глыбінях душы захоўвае якуюсь таямніцу.

Учэпістасць новага беларуса дапамагае яму рабіць бізнес нават там, дзе мала хто зрабіў бы. Прыкладам, на літаратуры.

Мы з маёй госцяй, вялікай аматаркай чытання, спыняемся каля кніжнага развалу, дзе ў каляровых вокладках прадаюцца чарговыя працягі прыгодаў славутай Скарлет, выкананыя тутэйшымі стылізатарамі, якія схаваліся пад амерыканскімі жаночымі прозвішчамі, і яна набывае чарговы том – «Скарлет і каўбой».

«Ты ж адукаваная жанчына. Навошта табе гэтая падробка?» – пытаюся я. «Адчапіся. Ведаю, што падробка. Але мне ўсё адно цікава», – кажа мая маскоўская знаёмая.

«Дарэчы, пра літаратуру. Дзе вашы нобелеўскія лаўрэаты?» – з'едліва пытаецца яна.

А яны ўжо выстраіліся ў доўгую чаргу, ад Святланы Алексіевіч да семнаццацігадовага Рыгоркі Цісецкага, і, ведаючы беларускую настойлівасць і вынаходлівасць, можна меркаваць, што лаўрэаты неўзабаве будуць.

У галаве новага беларуса няспынна варацца дасціпныя палітычныя, бізнесовыя і творчыя праекты, і гэта карэктуе яго базавыя якасці.

Беларусы змяняюць абалонку свайго зямнога быцця, абнаўляюць сцены свайго дому. Манія абнаўлення, адбудовы дамоў, кварталаў, дарог і ходнікаў апанавала сталіцу, вялікія і малыя гарады.

Экалагічны турызм. Гандаль пітной вадой. Прыбыткі за транзіт. Мноства іншых ідэяў, часам фантастычных, пракручваюцца ў гэтай абноўленай свядомасці, і я не гарантую, што ў псіхалогіі новага беларуса не запануе тое, чаго не было раней, – месіянізм.

Беларусы маглі б выконваць місію пасярэдніка паміж Усходам і Захадам. Тое, чым яны займаліся пакрыёма, цішком яшчэ за часамі Скарыны і Сімяона Полацкага, неўзабаве можа ажыццяўляцца маніфестацыйна.

Гэтаксама як і дзяліцца таямніцамі нацыянальнага выжывання ў самых неспрыяльных геапалітычных варунках. Негатыўны досвед сваёй гісторыі беларус можа абярнуць у пазітыў.

Беларусы застаюцца хобітамі еўрапейскага лесу, але якраз цяпер ад іх варта чакаць чагось цалкам непрадказальнага.

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2005/1/15
[image]

Аляксандар Надсан Новая Друя*

АЛЯКСАНДАР НАДСАН беларускі рэлігійны і нацыянальны дзяяч, апостальскі візытатар для беларусаў-каталікоў. Нарадзіўся ў Нясьвіжы.

5 лістапада 1952 году айцец Сіповіч напісаў у Генэральную раду Марыянскага закону наступную заяву:

*Пасьля доўгай развагі перад Богам, маючы на думцы большую славу Божую і Блаславёнай Дзевы Марыі, а таксама лепшае асягненьне мэтаў нашага закону сярод беларусаў на выгнаньні, мяркуючы, дать магчымасьць заснаваць законны дом (г. зн. кляштар — **Айт.**) беларускіх айцоў марыянаў (ut possibilitas Domus Religiosae Marianorum Alboruthenorum praeberetur), ніжэйпадпісаны прапануе: набыцьцё, г. зн. купля для Беларускай місіі дому, які знаходзіцца на Голдэн-авэню, Лёндан, № 12 і называецца «Марыян Гаўз», разам з гародам і мэблямі, за цану 8200 фунтаў. Умовы куплі наступныя: сума 4000 фунтаў павінна быць заплачаная на працягу трох гадоў ад часу, калі Галоўная рада дасьць сваю згоду. Пасьля таго як сума 4000 фунтаў будзе сплачаная літоўскім айцам марыянам, тытул уласнасьці «Марыян Гаўз» фармальна пераходзіць да Беларускай місіі. Апошнія 4200 фунтаў павінны быць сплачаныя на працягу наступных трох гадоў разам з 2,5 % ад сумы, якая застаецца да заплаты. Пасьля куплі «Марыян Гаўз», уласнасьць бізантыйска-славянскай капліцы пераходзіць канчаткова да Беларускай місіі.*

У рыбак з кнігі «Вяскун Тэслаў Сіповіч, сьвятар і беларус», якая мае сёлета выйсьці ў выдавецтве «Тэхналогія».

Думка купіць «Марыян Гаўз» для беларусаў нарадзілася ў айца Сіповіча даволі рана, хоць ён не казаў пра гэта нікому, апроч блізкіх прыяцеляў, якім мог даверыцца. 11 верасьня 1952 году ён пісаў айцу Гарошку: *«Трэба выкупіць для Беларускай місіі «Марыян Гаўз». Гэта вельмі важная, але і цяжкая справа»*. Гэта была сьмелая думка, бо ў тым часе Сіповіч ня меў ніякіх фондаў і даходаў, апрача маленькай дапамогі ад Усходняй кангрэгацыі. Але калі яму нельга было адмовіць у сьмеласьці і ініцыятыве, дык, відаць, не хапіла дасьведчаньня і разважнасьці, каб дакладна абмеркаваць праект і такім чынам пазьбегнуць у будучыні - калі не для сябе, то для сваіх наступнікаў - паважных прыкрасьцяў і канфліктаў.

У вышэйзгаданым лісьце можна вылучыць два сутнасныя пункты:

1) дом купляецца для Беларускай місіі;

2) гэта будзе законны дом (кляштар) беларускіх айцоў-марыянаў, якім даручаная праца Місіі.

Тут адразу кідаецца ў вочы адсутнасьць яснага падзелу між дзьвюма ўстановамі: Беларускай каталіцкай місіяй і Законам айцоў-марыянаў. Місія была заснаваная Кангрэгацыяй для Ўсходніх Цэркваў дзеля пастырскай апекі над беларусамі-каталікамі ў Англіі. Першым яе рэктарам быў айцец Чэслаў Сіповіч, які належаў да Закону айцоў-марыянаў. Але гэта не азначала, што ягоным наступнікам таксама мусіў быць марыянін, як гэта бачылася Сіповічу. І вось тады паўставала пытаньне, хто ўласьнік «Марыян Гаўз»: калі Місія, то марыяне заставаліся без свайго кляштару; калі ж марыяне, дык Місія магла апынуцца на вуліцы. Магчыма, праз гэтую юрыдычную няяснасьць марыянскія ўлады ў Рыме не сьпяшаліся з адказам. Пачакаўшы адзін год, 30 кастрычніка 1953 году Сіповіч паўтарыў сваю просьбу, але ў крыху зьмененай форме:

Я заўсёды цьвердзіў і цьверджу, што сужыцьцё і супрацоўніцтва дзьвюх установаў, менавіта беларускай і расейскай, у адным доме ёсьць практычна немагчымым... Каб разьвязаць гэтае пытаньне, я зрабіў прапанову ўважаць «Марыян Гаўз» як ядро

законнага дому беларускіх айцоў-марыянаў (Ad solvendam questionem proposui «Marian House» qua cellularti Domus Religiosae Marianorum Alboruthenorum considerare) і, як такі, купіць яго ад літоўскіх айцоў-марыянаў на працягу чатырох гадоў за цану 8200 фунтаў. Калі будзе на гэта згода, пакорна прашу Генэрала і Галоўную раду даць дазвол на збор грошай.

Гэтым разам яму не прыйшлося доўга чакаць. 31 сьнежня 1953 году ён атрымаў ліст, падпісаны генэралам марыянаў Уладыславам Мрочакам і галоўным сакратаром Янам Сакевічусам:

Каб задаволіць тваю просьбу ад 30 кастрычніка 1953 г., пасьля атрыманьня згоды нашай Рады 25 лістапада 1953 г., мы даем табе дазвол купіць у Лёндане маёмасьць літоўскай правінцыі, што называецца «Марыян Гаўз», з мэтаю заснаваць у будучыні законны дом беларускіх айцоў-марыянаў (ut ibi m futuro Domus Religiosae Marianorum Alboruthenorum fundetur), і дзеля асягненьня гэтай мэты мы даем табе права зьбіраць грошы, пад умоваю, што ўсё будзе згодна з патрабаваньнямі нормаў сьвятых канонаў і нашых канстытуцыяў.

Апошнія два дакумэнты ясна паказваюць, што купля «Марыян Гаўз» мела быць прыватнай справай між беларускімі і літоўскімі марыянамі. Пра Беларускую каталіцкую місію няма нават згадкі.

Атрымаўшы дазвол ад сваіх марыянскіх уладаў, Сіповіч пачаў зь вялікай энэргіяй збор грошай. Пад патранатам арцыбіскупа Ўэстмінстэрскага кардынала Грыфіна быў створаны Фонд Беларускай каталіцкай місіі (па-ангельску - «The Whiteruthenian Catholic Mission Fund»; па-французку - «Le Fond de la Mission Catholique Biélorussienne»). Ганаровы камітэт фонду складаўся з 15 беларусаў і іхніх прыяцеляў з розных краінаў сьвету на čале зь біскупам Баляславам Слосканам. Ад імя фонду былі надрукаваныя падпісныя лісты «дабрадзеяў «Марыян Гаўз» (Benefactors of..., bienfaiteurs de...) для зьбіраньня ахвяраваньняў. На адвароце лістоў падаваліся тлумачальныя

тэксты на трох мовах - ангельскай, французскай і беларускай. Вось беларускі тэкст:

Беларуская Каталіцкая Місія, якая вядзе ад 1947 г. душпастырскую, харытатыўную і культурна-грамадзкую працу сярод беларусаў у В. Брытаніі, ня мае дагэтуль собскага прыпынку. Таму з дазволу і багаславенства царкоўных уладаў прыступіла ў гэтым годзе 1954 - асабліва пасьвячаным Найсьвяцейшай Дзеве Марыі - да зборкі грошы на куплю дому, у якім яна сяньня знаходзіцца, а які сваім імем мае славіць Марыю: MARIAN HOUSE. На закуп «Марыян Гаўз» трэба восем тысяч ангельскіх фунтаў. Гэтым зьвяртаемся з гарачай просьбай дапамогі да суродзічаў беларусаў і да ўсіх тых, хто разумее патрэбы беларускага жыцьця на чужыне. Кожнага году ў дзень Унебаўзяцьця Н. Д. Марыі, 15 жніўня, за ўсіх дабрадзеяў «Марыян Гаўз» будзе адпраўлена сьвятая Багаслужба.

Побач з афіцыйнай акцыяй, айцец Сіповіч зьвяртаўся асабіста да некаторых больш вядомых асобаў, просячы іхняй дапамогі. 30 ліпеня 1954 году ён пісаў Амбражэю Ондраку, абату бэнэдыктынскага манастыра ў Ляйлі каля Чыкага:

На жаль, да сёньняшняга дня Місія наймае памешканьне. У гэтым годзе, з дазволу маіх старэйшых у Рыме, Яго Эмінэнцыі Кардынала Грыфіна і Біскупа Слоскана, Апостальскага Візытатара для беларусаў, я распачаў падпіску на фонд куплі дому для Беларускай місіі ў Лёндане. Асьмельваюся зьвярнуцца да вас з просьбай...

25 кастрычніка 1954 году айцец Сіповіч пісаў беларускаму сьвятару ў Нямеччыне Ўладзімеру Салаўю:

Вялікі дзякуй за тваю дасюлешнюю дапамогу для Беларускай Каталіцкай Місіі. Несумненна, разьвіцьцё і лёс Місіі блізкія твайму сэрцу, і таму асьмельваюся, пачэсны Ойча, прасіць яшчэ адной ласкі, менавіта каб ты прыйшоў з дапамогаю набыць дом для Місіі (ut adiutorio in emenda domo pro Missione venias). Каб

набыць гэты дом, які б задаволіў патрэбы Місіі, трэба 8000 фунтаў. Зборка грошай, пад патранатам Яго Эмінэнцыі Кардынала Грыфіна, арцыбіскупа Ўэстмінстэрскага, ужо пачалася.

Сіповіч прасіў дапамогі ў айца Вэрэнфрыда ван Страатэна, заснавальніка арганізацыі «Дапамога сьвятарам з Усходу» (Oostpriesterhulp). У лісьце ад 31 жніўня 1956 г. ён пісаў:

Наступная і вельмі важная справа - купля ўласнага дому для Беларускай каталіцкай місіі ў Англіі (Die nächste und auch sehr wichtige Sache ist der Ankauf des eigenes Hauses für die Weissruthenische Katholische Mission in London)... Зьвяртаемся да цябе, дарагі Ойча, і празь цябе - да ўсіх дабрадзеяў з просьбай дапамогі... Купля дому для Беларускай каталіцкай місіі ня толькі запэўніць існаваньне Місіі, але будзе служыць як духоўны цэнтар для беларусаў усёй Эўропы.

У адказ Ван Страатэн прыслаў 357 фунтаў, што ў той час было значнай сумай.

Ува ўсіх гэтых просьбах і зваротах адсутнічае якая-колечы згадка пра марыянаў. Таму дабрадзеі былі пад уражаньнем, што дом, на які яны давалі ахвяраваньні, будзе ўласнасьцю Беларускай каталіцкай місіі. Пра сапраўдны стан рэчаў ня ведалі нават самыя блізкія супрацоўнікі айца Сіповіча. Так, 24 сьнежня 1954 году ў «Catholic Herald» быў надрукаваны пад назовам «Лёнданская Місія» ліст старшыні БАКА «Рунь» Язэпа Пазьняка, у якім аўтар, пахваліўшы дзейнасьць Беларускай каталіцкай місіі, якая *«часова знаходзіцца ў «Марыян Гаўз», Голдэн-авэню, Лёндон, № 12 (temporarily established at Marian House, Holden Avenue, London N. 12)... пад разумным і заўсёды прысутным у патрэбе, поўным спагады кіраўніцтвам Айца Сіповіча»,* працягвае: *«Каб запэўніць будучыню гэтай карыснай працы, ...патрэбныя фонды, каб набыць «Марыян Гаўз» як сталы цэнтар гэтай Місіі»*.

Айцец Сіповіч зьвяртаўся таксама непасрэдна з просьбаю дапамагчы да кардыналаў Спэльмана зь Нью-Ёрку, Стрытча з

Чыкага і Капэльля з Буэнас-Айрэса. Усе тры лісты, з датаю 31 ліпеня 1954 году, мелі аднолькавы зьмест і пачыналіся такім сказам: *«У выніку рэлігійнага перасьледу ў нашай бацькаўшчыне Беларусі, вялікая колькасьць уцекачоў, маіх суродзічаў… пасялілася ў В. Брытаніі»*. Рэлігійны перасьлед сапраўды існаваў у той час у Беларусі і ўва ўсёй Усходняй Эўропе, дзе пры ўладзе былі камуністы. Аднак ня ён быў прычынаю, чаму бальшыня ўцекачоў пакінула сваю бацькаўшчыну. Таму тое, што казаў Сіповіч, гучала непераканаўча і выглядала на спробу выкарыстаць рэлігійныя пачуцьці асобаў, да якіх ён зьвяртаўся.

У лісьце да кардынала Леркара з Балёніі ад 29 чэрвеня 1955 году Сіповіч, папрасіўшы дапамогі, «каб набыць дом для маёй Місіі», працягваў: *«Маю ініцыятыву ўхвалілі і падтрымалі мае непасрэдныя начальнікі, менавіта Яго Эмінэнцыя кардынал Грыфін і Яго Эксцэленцыя біскуп Баляслаў Слоскан»*. Сіповіч не належаў да Ўэстмінстэрскай дыяцэзіі, і таму кардынал Грыфін ня мог быць ягоным непасрэдным начальнікам: імі былі генэрал марыянаў і сакратар Усходняй кангрэгацыі. Ніводзін зь іх не ўваходзіў у ганаровы камітэт куплі «Марыян Гаўз».

Лісты да кардыналаў не далі чаканых вынікаў і прынесьлі айцу Сіповічу толькі клопат. Кардынал Спэльман зь Нью-Ёрку пераслаў ягоны ліст і лісты ахвярадаўцаў ува Ўсходнюю кангрэгацыю. Гэта была звычайная абачлівасьць з боку кардынала, які, напэўна, атрымліваў шмат падобных просьбаў і, ня ведаючы асабіста Сіповіча, не жадаў, каб ягонае ахвяраваньне трапіла ў неадпаведныя рукі. Айцец Сіповіч не чакаў такога павароту справы. На збор грошай на патрэбы Місіі патрабаваўся дазвол ад Усходняй кангрэгацыі. Сіповіч такога дазволу ня меў, бо, хоць у звароце да ахвярадаўцаў гаварылася пра куплю дому для Беларускай каталіцкай місіі ўсходняга абраду, у сапраўднасьці (пра што не было сказана) ён меў заставацца ўласнасьцю марыянаў. Такім чынам, склалася даволі прыкрая сытуацыя. Відаць, каб пазьбегнуць падобных прыкрасьцяў у будучыні, у сваім лісьце ад 28 жніўня 1954 году да айца Яна Тарасэвіча Сіповіч настойваў, каб беларусы ў Чыкага абавязкова пайшлі да кардынала Стрытча, бо, як ён пісаў, *«калі вы ня пойдзеце і ня выясьніце справы, я баюся, што ён мой ліст і просьбу перашле ўва Ўсходнюю кангрэгацыю ў Рым,*

і тады страціцца шмат часу і паперы на розныя выясьненьні».

Амаль праз тры гады, 15 траўня 1957 году, Сіповіч пісаў да доктара Станіслава Грынкевіча ў зьвязку з прапановай аднаго амэрыканскага сьвятара, Марціна Макдонафа, выстарацца яму дапамогу ў біскупа Філадэльфіі:

Вяртаючыся да справы «Марыян Гаўз»... жадаю... зьвярнуць увагу на некаторыя важныя абставіны. Трэба помніць, што на звычайную душпастырскую працу сярод беларусаў я атрымоўваю дапамогу сталую ад Айца Сьв. праз Усходнюю Кангрэгацыю. Гэтай дапамогі, аднак, мне зусім не выстарчае на куплю дому. Калі аднак а. Марцін МакДонаф жадае пайсьці да біскупа і прасіць аб сталай дапамозе мне, то трэба перш упэўніцца (у дыскрэтнай гутарцы з а. Марцінам), ці той біскуп не пачне наводзіць «спраўкі» адносна маёй Місіі і розных яе запамогаў. Я не баюся нічога, але гэтакія спраўкі звычайна вядуць у Рым, а Рым кажа: «Прысылайце нам грошы, а мы будзем дапамагаць сваім сьвятарам». Гэтак мне ўжо здарылася з кард. Спэльманам, якому паслаў ліст, і тую ліст той пераслаў у Рым. А Рым так і астаўся нясьпешлівым Рымам...

Такім чынам, прыйшлося, хочаш ня хочаш, даваць тлумачэньні для Ўсходняй кангрэгацыі. 30 сьнежня 1954 году айцец Сіповіч пісаў кардыналу Тысэрану:

Было пастаноўлена заснаваць у Лёндане «Новую Друю», але каб зрабіць гэта, трэба перш набыць адпаведны дом. Праблема вырашылася, бо літоўскія айцы (марыяне) прыйшлі нам з дапамогаю і выказалі згоду перадаць маёмасьць «Марыян Гаўз» на выгодных для нас умовах... Дзеля яснасьці справы пасылаю неабходныя дакуманты і прашу пакорна ў Вашай Эмінэнцыі дапамогі ў куплі дому ў залежнасьці ад вашага меркаваньня і шчодрасьці.

Тысэран адказаў 25 лютага 1955 году:

У справе куплі дому для Місіі, паколькі кантракт мае быць унутранай справай між дзьвюма часткамі таго самага Закону (між літоўскімі марыянамі рымскага абраду і беларускімі марыянамі бізантыйскага абраду), гэтая Сьвятая Кангрэгацыя (Усходняя. - **Аўт.**) *ня мае ў гэтым ніякай асаблівай зацікаўленасьці; калі б, з другога боку, набытак быў для Беларускай каталіцкай місіі бізантыйскага абраду ў Англіі sic et simplicker (так, а не інакш), тады і толькі тады гэтая Сьвятая Кангрэгацыя магла б разгледзець магчымасьць зрабіць свой унёсак.*

Беларуская грамадзкасьць на Захадзе пасьля Другой сусьветнай вайны складалася галоўным чынам з «новых» эмігрантаў, г. зн. тых, што засталіся на Захадзе як уцекачы, не жадаючы ці ня могучы вяртацца на бацькаўшчыну, якая тады ўваходзіла ў Савецкі Саюз. Большасьць новых эмігрантаў былі маладыя людзі, якія пачыналі сваё новае жыцьцё ў цяжкіх абставінах. Тым ня менш яны вызначаліся глыбокім зразуменьнем і ахвярнасьцю дзеля беларускай справы. У прыватнасьці, яны добра разумелі вартасьць свайго рэлігійнага цэнтру, і таму многія, каталікі і праваслаўныя, шчодра адгукнуліся на заклік дапамагчы набыць «Марыян Гаўз». Калі б, аднак, яны ведалі, што «Марыян Гаўз» меў застацца ўласнасьцю айцоў-марыянаў, іхняя рэакцыя ня розьнілася б вельмі ад рэакцыі кардынала Тысэрана. Для маладзейшага пакаленьня словы «беларускія марыяне» не азначалі нічога. Старэйшыя маглі памятаць лёс Друі...

Большасьці сяброў ганаровага камітэту для куплі «Марыян Гаўз» няма ўжо ў жывых, таму цяжка сказаць, ці яны ведалі пра сапраўдны стан рэчаў. Усё паказвае на тое, што не. Адзін зь сяброў камітэту, доктар Вітаўт Рамук з Чыкага, даслаў 2 сьнежня 1998 году ліст аўтару гэтых радкоў, у якім піша:

У 1953-54 г.г. я жыў у Лёндане... У 1954 г. Айцец Сіповіч спытаўся ў мяне, ці я згадзіўся б быць сябрам камітэту куплі «Марыян Гаўз» як сталага памешканьня для Беларускай каталіцкай місіі ў Англіі. Я згадзіўся з гатовасьцю, бо ідэя ўласнага рэлігійнага цэнтру была вельмі даспадобы мне і іншым

беларусам... Таму для мяне быў вялікі шок, калі нядаўна даведаўся, што «Марыян Гаўз» застаўся ўласнасьцю айцоў марыянаў, а не Беларускай каталіцкай місіі ў Англіі. Выглядае, што спачатку мне і іншым не сказалі ўсіх фактаў. Я ўпэўнены, што, калі б мы ведалі праўду, наша рэакцыя на заклік была б зусім іншай. Як католік і беларус я вельмі праняты тым, што я даведаўся. Я заўсёды верыў, што жаданьні ахвярадаўцаў павінны быць выкананымі. Не хачу абвінавачваць нікога, але выглядае, што беларусам не сказалі праўды. Асабіста ў мяне такое адчуваньне, быццам мяне выкарысталі.

Іншыя беларусы мелі яшчэ больш сьціслыя весткі. 12 верасьня 1953 году, яшчэ да атрыманьня дазволу на збор грошай, айцец Сіповіч пісаў А. Касьцюкевічу ў Бафалё ў ЗША:

Цяпер дазвольце мне зьвярнуцца да вас з просьбай. Пасьля доўгіх разважаньняў я пастанавіў выкупіць «Марыян Гаўз» ад літоўцаў... Таму, абгаварыўшы з усімі знаёмымі суродзічамі справу, я адважыўся распачаць зборку грошы на выкуп з мэтай зрабленьня ў ім беларускай бібліятэкі, архіву, мейсца на розныя зборкі. Ужо мне некаторыя беларусы злажылі ахвяры, некаторыя задэкляравалі... Я ведаю, што вы небагатыя і што кожны грош цяжка запрацаваны, але асьмельваюся да вас зьвярнуцца з просьбай аб злажэньні ахвяры на выкуп «Марыян Гаўз» з той надзеяй, што Вы мне дапаможаце і што я Вам у будучыні пастараюся чым-колечы адплаціцца.

З маладых год жыцьцё айца Сіповіча было цесна зьвязанае з Друяй. Ён застаўся да канца ёй верным і эмацыянальна зь ёю зьвязаным. Зь цягам часу значэньне Друі ў рэлігійным жыцьці Беларусі непамерна выросла ў ягоным уяўленьні. Адсюль і спроба заснаваць «Новую Друю». Наогул, аднак, ён трымаў гэтую сваю мару ў сакрэце і дзяліўся ёю толькі зь нешматлікімі даверанымі асобамі. 27 жніўня 1954 году ён пісаў айцу Міхалу Ўрбановічу, беларускаму марыяніну, які правёў амаль усё свае жыцьцё ў працы сярод літоўцаў і палякаў у Амэрыцы:

«Марыян Гаўз» мае быць Новай Друяй, якая, зруйнаваная і зьбяшчэшчаная бязбожнікамі, на векі будзе ганарыцца, што ў ёй працавалі сьвятыя нашы айцы беларусы: Абрантовіч, Цікота, Германовіч, - якія аддалі жыцьцё і кроў за веру. Я - як той недабітак, - з Божай помаччу хацеў бы традыцыі Друі, маіх дарагіх Айцоў, якія мяне выхоўвалі, захаваць, і таму трэба залажыць дом для марыянаў беларусаў на чужыне.

Зрэдку ідэя «Новай Друі» вельмі асьцярожна згадваецца ў перапісцы зь іншымі беларусамі-каталікамі, напрыклад у лісьце ад 1 кастрычніка 1954 году да доктара Станіслава Грынкевіча ў Кліўленд: *«Марыян Гаўз» - гэта Новая Друя. Тут павінны знайсьці прыпынак беларускія архівы, музэй і да т. п. Вельмі цяжка ўрэчаісьніць гэты плян, але пры помачы Божай ёсьць магчыма».*

Ахвярадаўцы маюць поўнае права ведаць, куды ідуць іхнія ахвяраваньні, і дамагацца, каб іх скарыстоўвалі на мэту, на якую яны даваліся. Паколькі будучыя дабрадзеі «Марыян Гаўз» нічога ня ведалі пра «Новую Друю», цяжка пазбыцца ўражаньня, што Сіповіч абышоўся вельмі ашчадна з праўдаю.

У 1954 годзе беларускіх марыянаў у «Марыян Гаўз» было двое: айцец Сіповіч (40 год) і брат Мікалай Баговіч (51 год). Спадзявацца на рост у будучыні практычна не прыходзілася. Адзіны кандыдат, Янка Садоўскі, які вучыўся ў Рыме, пакінуў марыянаў у 1953 годзе. Не даводзілася разьлічваць і на прыезд марыянаў з Польшчы, дый усе яны належалі да рымскага (лацінскага) абраду і былі ў немаладым веку. Аднак гэта не зьнеахвочвала Сіповіча. Ён пачаў зьбіраць грошы на «Марыян Гаўз» яшчэ ў 1953-м, да таго як атрымаў дазвол ад сваіх законных уладаў. Так, у чэрвені таго году ён адведаў беларусаў у Ковэнтры, Бірмінгеме, Нью-Ёрку і Ньюпарце і вярнуўся дамоў зь велізарнай сумай... 6 фунтаў. У верасьні таго самага году а. Сіповіч быў у Ірляндыі. Паездку зладзілі сябры «Легіёну Марыі», якія часта прыходзілі ў «Марыян Гаўз». Гэты візыт ня быў пастырскі, бо ў Ірляндыі не было беларусаў. Як спроба сабраць грошы на «Марыян Гаўз» ён скончыўся нічым. Другая паездка ў 1957 годзе атрымалася ня лепшай, хаця а. Сіповіч пазнаёміўся з заснавальнікам «Легіёну Марыі» Франкам

Дафам, які даў на «Марыян Гаўз» 2 фунты. Айцец Сіповіч меў таксама аўдыенцыю ў прэзыдэнта Ірляндыі Дэ Валера, але, як толькі ўспомніў аб дапамозе, той адаслаў яго да ірляндзкіх біскупаў. Спроба атрымаць аўдыенцыю ў Дублінскага арцыбіскупа скончылася няўдачай, а генэральны вікарый прыняў яго ветліва, але холадна.

Акцыя збору грошай сур'ёзна распачалася ў другой палове 1954 году. Беларусы і іхнія прыяцелі шчодра адгукнуліся на заклік Сіповіча, і ўжо ў пачатку 1956 году ён здолеў сплаціць літоўцам 1000 фунтаў, а яшчэ праз год аддаў ім другую тысячу. У верасьні 1957 году Сіповіч паехаў на тры месяцы ў Амэрыку. Мэты паездкі не абмяжоўваліся зборам грошай, але ён пра гэта нідзе не забываўся. Вярнуўся ў Лёндан 13 сьнежня, прывёзшы з сабою 6500 даляраў, або больш як 2000 фунтаў паводле тагачаснага абменнага курсу. У лютым 1959 году Сіповіч сплаціў літоўскім марыянам 5200 фунтаў. 8 ліпеня 1959 году літоўскія марыяне пастанавілі: *«Паколькі большая частка грошай для літоўскіх айцоў была сплачаная а. Сіповічам МІС (дагэтуль заплачана 5200 фунтаў, застаецца да заплаты 3000 фунтаў), было аднагалосна пастаноўлена перадаць тытул уласнасьці «Марыян Гаўз» беларускім марыянам»*. Галоўная марыянская рада ў Рыме 21 ліпеня зацьвердзіла пастанову *«перадачы тытулу ўласнасьці маёмасьці, што называецца «Марыян Гаўз», ад літоўскай правінцыі да айцоў-марыянаў беларускага паходжаньня»*.

Такім чынам, набыццё «Марыян Гаўз» для Беларускай каталіцкай місіі набліжалася да завяршэньня. Толькі Місія як раней, так і цяпер ня мела нічога. Дом заставаўся ўласнасьцю Закону марыянаў, бо «перадача ўласнасьці» літоўскімі марыянамі беларускім была іхняй чыста ўнутранай справай. За яе заплацілі беларусы з усяго сьвету і іхнія прыяцелі. Праўда, некаторыя падазравалі, што тут нешта не зусім у парадку. 1 чэрвеня 1955 году Сіповіч пісаў Віктару Іваноўскаму ў Лёндан (Канада):

Асобным лістом пасылаю вам лісту на «Марыян Гаўз». Убачыўшы яе, вы зразумееце, колькі трэба было далажыць стараньняў, каб атрымаць той высокі Патранат

Уэстмінстэрскага Кардынала і іншых асоб! Ужо крыху сабраў грошы, але вельмі мне далёка да канца. Буду Вам вельмі ўдзячны, калі знойдзеце спосаб уцягнуць на лісту хаця некалькі ахвярадаўцаў. Верце, даражэнькія, што ўсё гэта робіцца на славу Бога і нашай гаротнай Беларусі.

Відаць, «высокі патранат» не зрабіў вялікага ўражаньня на Іваноўскага, і ён адказаў айцу Сіповічу (ліст бяз даты):

На падпісную лісту я ўжо сабраў звыш 21 даляра... Калі грошы вам так пільна не патрэбныя, то я хацеў бы іх затрымаць і выслаць большай сумай, каля 50 даляраў, бо маю надзею, што змагу сабраць досьць парадачную суму тады, калі вы выясьніце праз газэту «Бацькаўшчыну», на каго гэны дом мае быць запісан і г. д. Бачыце, у мяне людзі пытаюць, і нат Др. Рагуля катэгарычна патрабуе шырэйшага выясьненьня. Чы гэты дом будзе належаць для беларусаў каталікоў як цяпер за вашым жыцьцём, так і пасьля вашага адыходу ад рэлігійнага і наогул жыцьця.

Няведама, ці былі яшчэ іншыя лісты падобнага зьместу, але праз год у газэце «Бацькаўшчына» (выходзіла ў Мюнхене) зьявіўся наступны ліст Сіповіча:

На просьбу некаторых беларусаў падаю да агульнага ведама наступнае:

Дом у Лёндане (пры Holden Avenue, № 12), названы «Марыян Гаўз», у якім ад 1948 г. знаходзіцца беларуская каталіцкая капліца, прызначаецца для наступных мэтаў:

1) на памешканьне законьнікаў марыянаў-беларусаў;

2) на рэлігійнае абслугоўваньне беларусаў-каталікоў у В. Брытаніі;

3) на бібліятэку, архівы й музэй вылучна беларускага зьместу або зьвязанага зь беларусаведай.

Юрыдычна справа выглядае наступна: галоўная ўлада айцоў марыянаў дала фармальна поўную згоду на куплю «Марыян Гаўз» для вышэй выказаных мэтаў - з тэй, зразумела, умовай, што знойдуцца сродкі на сплату коштаў куплі дому. Няма ніякіх сумлеваў, што «Марыян Гаўз» прызначаецца для беларусаў і за імі назаўсёды застанецца. Сяньня ў Эўропе пражывае 12 беларускіх сьвятароў-марыянаў, і яны ня маюць змогі пакуль што сабрацца і працаваць разам. Але, каб навет і была гэтая магчымасьць, няма дзе зьбірацца, пакуль ня купіцца «Марыян Гаўз». Хто із старэйшых беларусаў прыгадвае манастыр айцоў марыянаў у Друі і іхную працу сярод беларускай моладзі й сялян, той будзе ведаць, што «Марыян Гаўз» мае служьщь тым самым мэтам, хоць і ў іншых - шмат цяжэйшых абставінах выгнаньня. Ад часу, калі ўсе юрыдычныя фармальнасьці былі выясьненыя, пачалася зборка грошай на выкуп «Марыян Гаўз». Дагэтуль было сабрана і выплачана собсьніку дому роўна тысяча фунтаў. Яшчэ трэба сем тысяч фунтаў, якія я павінен сабраць на працягу трох год.

Ліст канчаецца заклікам складаць ахвяраваньні на «Марыян Гаўз».

Гэты ліст выклікае неадназначныя пачуцьці. Кідаецца ў вочы адсутнасьць якой-колечы згадкі пра Беларускую каталіцкую місію, між тым як у падпісным лісьце ахвярадаўцаў на «Марыян Гаўз» няма ні слова пра марыянаў. Прачытаўшы сказ «няма сумлеваў, што «Марыян Гаўз» прызначаецца для беларусаў», хочацца спытацца, чаму наогул павінны былі быць нейкія сумневы. Аўтар таксама замоўчвае, каму належаў дом. З 10 (не 12) марыянаў «у Эўропе» толькі адзін, айцец Сіповіч, быў на Захадзе, усе іншыя - у Польшчы. Двух зь іх, Германовіча і Падзяву, толькі годам раней выпусьцілі зь зьняволеньня ў Савецкім Саюзе. Тры айцы, выселеныя з Друі ў 1938 годзе, - Язэп Дашута, Віталіс Хамёнак і Казімер Смулька, - не надаваліся да працы з прычыны веку і стану здароўя. Дашута пісаў Сіповічу 28 сакавіка 1956 году: «Я яшчэ да працы не надаюся... Пасьля другога завалу сэрца ідзе трудней, але і так ніхто не спадзяваўся, што выжыву». Айцец Германовіч у 1955 годзе «знайшоў а. Смульку ўжо поўным інвалідам і

невідушчым». Айцец Віталіс Хамёнак быў найстарэйшы і, мусіць, найздаравейшы з трох. Але і ён пісаў Сіповічу 14 сакавіка 1961 году: «Аб сабе пісаць ня маю нічога новага. Старэю. Дакучае рэўматызм, артрыт, скляроза і печань, але прытрымліваюся ў ядзе і зажываю адпаведныя лякарствы і пры помачы Божай неяк кратаюся і працую».

Былі яшчэ чатыры былыя друйскія клерыкі: Фэлікс Журня, Францішак Апячонак, Баніфат Саруль і Антон Лось - усе, за выняткам аднаго, крыху маладзейшыя за Сіповіча. Усе чатыры канчалі навуку ў Польшчы і сталі сьвятарамі ў 1943-1946-м. Сіповіч думаў, што яны, як і ён, засталіся шчырымі беларусамі і мелі жаданьне працаваць сярод свайго народу. Але насамрэч аказалася іначай. У канцы 1956 году Сіповіч усталяваў сувязь з адным зь іх, Францішкам Апячонкам. 19 лютага 1957 году ён выслаў яму пакет са сьвятымі абразкамі, якія той прасіў, падаючы іх кошт як 10 імшальных інтэнцыяў. 5 сакавіка Апячонак адаслаў пакет назад з кароткім лістом, зразумела, па-польску: «Пакет адсылаю назад... Інтэнцыяў, зразумела, не служу, хіба толькі адну і то на інтэнцыю Ксяндза (г. зн. Сіповіча. - **Аўт.**), каб Ксёндз быў больш сумленны». Сіповіч адказаў 15 сакавіка лістом, у якім казаў: «Мне вельмі прыкра, што пасьля гэтак доўгага чаканьня нейкай весткі ад сваіх атрымаў гэткі няветлівы ліст». На гэта ён атрымаў адказ па-польску ад 8 красавіка: «Калі ідзе пра лучнасьць са сваімі, то мне здаецца, што ўся віна на баку тых, хто за мяжою». Было ясна, што Апячонак і іншыя былыя друйскія клерыкі маглі сказаць, што для іх, як у той прыказцы на чыстай трасянцы, «курыца ня пціца, Польшча не заграніца». У іх не было ані ахвоты, ані разуменьня патрэбы працаваць сярод беларусаў, асабліва на эміграцыі. Адзіным выняткам быў айцец Фэлікс Журня, для якога курыца была «пціцаю».

Айцец Сіповіч пісаў 9 чэрвеня 1956 году Іваноўскаму: «Я ня толькі ня гневаюся, але ўдзячны вам, што мяне падбухторылі напісаць у «Бацькаўшчыну» пра «Марыян Гаўз». Я ўжо гэта зрабіў... Як убачыце з майго выясьненьня, што няма сумневу, што «Марыян Гаўз» астанецца за беларусамі нават па маёй сьмерці».

Ліст у «Бацькаўшчыну» пісаўся ў разьліку на тое, каб супакоіць беларусаў. У сапраўднасьці ён нічога ня выясьніў і выклікаў больш пытаньняў, чым даў адказаў.

Некалькі словаў пра 3000 фунтаў, якія засталіся да заплаты літоўскім марыянам у 1959 годзе. У тым часе прыплыў ахвяраваньняў моцна зьменшыўся (што, пасьля пяці гадоў, зусім зразумела). Доўг пакрываўся зь невялікай гадавой дапамогі для Беларускай каталіцкай місіі ад Усходняй кангрэгацыі. Між іншым, у гадавых грашовых справаздачах беларускіх марыянаў у іхнюю Генэральную раду ў Рым у 1960-х гадах гэтая дапамога значыцца як «Subsidium Sacrae Congregationis Orientalis pro Marian House» (дапамога Сьвятой Усходняй кангрэгацыі для «Марыян Гаўз»). Наступная табліца, складзеная на падставе марыянскіх рахунковых кнігаў (асобных рахунковых кнігаў для Місіі не вялося), паказвае гэта наглядна:

Дапамога Ўсходняй кангрэгацыі (у фунтах)	Выплата за «Марыян Гаўз» (у фунтах)		
Студзень 1960	500	25 студзеня 1960	500
10 сакавіка 1961	500	10 сакавіка 1961	500
3 красавіка 1962	500	3 красавіка 1962	500
1 студзеня 1963	500	1 студзеня 1963	500
10 лютага 1964	500	11 лютага 1964	333
23 студзеня 1965	750	26 студзеня 1965	290
9 лютага 1966	500	9 лютага 1966	250
Усяго	3750		3000

Такім чынам, Усходняя кангрэгацыя сталася без свайго ведама і жаданьня дабрадзеем закону марыянаў...

Чэслаў Сіповіч быў чалавекам вялікай сьмеласьці і ініцыятывы,

што брала свае вытокі ў ягонай глыбокай веры. Ён быў таксама моцна прывязаны да Закону марыянаў, якому ён шмат заўдзячаў. На жаль, гэтая прывязанасьць, заснаваная на эмоцыях, часта не дазваляла яму зірнуць цьвяроза на некаторыя рэчы і бачыць іх у існым сьвятле. Ягонай марай было заснаваць «Новую Друю», кляштар беларускіх айцоў-марыянаў, якія б «заўсёды» кіравалі Беларускай каталіцкай місіяй у Англіі. Ён нават ня мог дапусьціць думкі, што аднойчы ў «Марыян Гаўз» не застанецца ніводнага беларускага сьвятара-марыяніна. На жаль, тое, чаго ён не чакаў, здарылася, і Місія апынулася ў вельмі цяжкім, каб не сказаць безвыходным, становішчы.

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/1/16
[image]

Павал Абрамовіч
Страва бяз солі

ПАВАЛ АБРАМОВІЧ (нар. у 1977) – літаратурны крытык, выкладчык катэдры «Літаратурна-мастацкая крытыка» факультэту журналістыкі ВДУ, даследуе пісьменніцкую крытыку. Аўтар газэты «Наша Ніва» і часопісу «ARCHE».

***

У ляканічных «Пятрогліфах і філялягемах» («Дзеяслоў» № 9/2004) пісьменьнік і крытык **Пятро Васючэнка** знаходзіць месца і для культавага пісьменьніка Стывэна Кінга, амэрыканца, які ўжо чвэрць стагодзьдзя працуе ў жанры «horror». Не баючыся падацца вар'ятам у вачах сваіх старэйшых калег-акадэмікаў (празь цемрашальства афіцыйнай навукі вывучаць масавае мастацтва ў нашай краіне – тое самае, што ў сярэднявеччы апісваць мікробаў альбо даводзіць наяўнасьць радыяцыі), Васючэнка прама называе Кінга «напраўдзе вялікім пісьменьнікам», роўным… Умбэрта Эка, і цьвяроза заўважае, што ад ягоных кніг «ніхто не звар'яцее ды маньякам-забойцам ня станецца».

Напрыканцы крытык аналізуе раман Кінга «Яно». І вось што цікава: згодна з апытаньнем 7770 наведнікаў сайту www.stephenking.ru – адной з самых аўтарытэтных расейскамоўных крыніц, прысьвечаных гэтаму пісьменьніку, – найлепшай кнігай Кінга ёсьць менавіта «Яно» (530 галасоў). Выключны выпадак – прафэсійны крытык і шырокая чытацкая аўдыторыя *абралі* адно і тое ж.

***

Калі я на ўласныя вочы пабачыў, як чырванеюць вушы **Адама Глёбуса**, як пачынаюць дрыжэць ягоныя пальцы – гэта адбывалася падчас публічнага выступу родных пісьменьніка, якія прыйшлі на прэзэнтацыю ягонага раману «Дом», – я моцна засумняваўся, што стасункі спадара Глёбуса і ягонай дачкі Ядзі сапраўды можна пазначыць ангельскім паняткам «cool», як сьцьвярджае гэта сам пісьменьнік на дванаццатай старонцы сваёй апошняй кнігі.

Хутчэй за ўсё, «прахалода і спакой» – дэкляратыўныя, вонкавыя, а ўнутры – гарачыя пачуцьці, нэрвовае супераживаньне, якое нашыя суайчыньнікі ня ўмеюць надзейна хаваць на дне душы, як ангельцы віктарыянскай эпохі.

***

«Купідон» **Сьвятланы Сьмірновай**, якая жыве ў Менску, атрымаў першае месца на конкурсе апавяданьняў, што ладзіў часопіс «Cosmopolitan» (апавяданьне было надрукавана ў «Нашай Ніве» № 20/2004). Дзякуючы чаму перамог гэты твор?

«Cosmopolitan» прадукуе ўяўленьне пра жанчыну як гаспадыню свайго лёсу. Да таго ж, сутнасьць «глянцавай» жыцьцёвай устаноўкі, як цьвердзіць Вольга Рагінская ў артыкуле «Глянцавае «я»: жаночыя часопісы і крыза аўтабіяграфізму» («Критическая масса» № 1/2004), палягае ў прынцыповай адсутнасьці праблем, якія жанчына не магла б пераадолець. Вось і галоўная гераіня Сьмірновай ставіць мэтаю закахацца, бо ёй надакучыла адзінота. Купідон з гадзіньніка, што належаў прабабулі гераіні фантастычнага апавяданьня, спрабуе дапамагчы апошняй, але не пасьпявае пусьціць стралу, бо жанчына спыняе яго сваім воклічам. Дзеля чаго яна гэта зрабіла? Спрацавала псыхалягічная ўстаноўка – гераіня закахалася *сама, без дапамогі*. Абраны ёю мужчына знаходзіць яе, каб размаўляць з каханай некалькі гадзін запар, забыўшыся на правілы прыстойнасьці, ажно пакуль Купідон не пускае

стрэлы ў сэрцы іх абаіх, але навошта цяпер тыя стрэлы? Гераіня сама ўладкавала сваё жыццё, знайшла каханьне, падпарадкавала сабе мужчыну. No problems.

Чытайце і выпісвайце «Cosmopolitan».

***

Ці ёсьць у сьвеце больш рэалістычная кніга пра тыранію, барацьбу за ўладу, чым фэнтэзійны раман-эпапея «Ўладар пярсьцёнкаў»?

У кожнага беларуса на кніжнай паліцы мусіць стаяць гэты твор **Джона Рональда Руэла Толкіена** – чалавека, які бліскуча скончыў Оксфардзкі ўнівэрсытэт і добраахвотна пайшоў у войска, дзе ў званьні малодшага лейтэнанта сувязі адзінаццатага батальёну Ланкашырскіх стральцоў напоўніцу зьведаў жахі першай сусьветнай вайны, а потым, як сьведка крывавага супрацьстаяньня імпэрый, усё жыццё пісаў адну вялікую кнігу пра гэта.

***

Пісьменьнік **Уладзімер Арлоў** у эсэ «Крыжы над Мантэнэгра» («Наша Ніва» № 48/2003) апісвае сюжэт свайго будучага мастацкага твору пра беларускіх вампіраў (!) – «сьвядомых прыхільнікаў дзяржаўнага сувэрэнітэту Бацькаўшчыны». Як было вынайдзена адным з вампіраў-беларусаў, што працуе ў НДІ гематалёгіі, іхны ўкус прышчапляе «паддосьледным» нацыянальную сьвядомасьць. Далей падзеі разгортваюцца зь неймавернай хуткасьцю: «Пасьля чарговае акцыі апазыцыі грацыёзная супрацоўніца станцыі пераліваньня крыві выбірае першы аб'ект – бамбізу-палкоўніка, што кіраваў жорсткім разгонам дэманстрантаў, і заваблівае яго ў ціхі менскі дворык, дзе ў альтанцы чакае ўся дружная суполка. Астатняе – справа тэхнікі…»

Ня ведаю, можа, каму і даспадобы такая літаратура і такі

«неацэнны даробак у сьвятую справу вяртаньня роднае да болю краіны ў Эўропу» (выраз самога Арлова), але асабіста мяне перасмыкнула ад творчай задумы пісьменьніка. І не таму, што я не люблю мастацкіх тэкстаў Брэма Стокера, барона Олшэўры, Ганны Райс, Барбары Хемблі, Аляксея Талстоя, Сяргея Лук'яненкі і іншых аўтараў, якія пісалі пра вампіраў, – хутчэй наадварот. Вампіры Арлова нагадалі мне дактароў-фашыстаў, якія ставілі экспэрымэнты ў супэрсучасных клініках у Альпах, спрабуючы стварыць звышлюдзей і ўносячы тым самым свой «неацэнны даробак у сьвятую справу вяртаньня роднае краіны» да чыстых арыйскіх вытокаў.

***

Кітайскі пісьменьнік **Кан Фучан** нядаўна стварыў незвычайны па форме раман «Знутры абложанай цытадэлі», у якім апавядаецца пра «поўную жарсьці гісторыю забароненага каханьня паміж жанатым мужчынам і замужняй жанчынай», – у выглядзе SMS. Тэкст, які, паводле слоў спэцыялістаў, валодае значнымі мастацкімі якасьцямі, падзелены на 60 невялікіх разьдзелаў, кожны зь якіх складаецца з 70 гіерогліфаў (максымальны памер SMS-паведамленьня).

Падобную форму для сваёй мастацкай творчасьці абраў малады беларускі паэт **Глеб Лабадзенка**, ляўрэат літаратурнай прэміі «Залаты апостраф» (у намінацыі «Дэбют»), заснаванай часопісам «Дзеяслоў». Свае паэтычныя творы Глеб спачатку дасылаў знаёмым праз пэйджэр, тым самым «падключаючы» да сучаснай беларускай літаратуры апэратарак пэйджынгавых кампаній. Замест так званых пагер-вершаў Глеб цяпер стварае мабіл-вершы, выкарыстоўваючы рэсурс SMS.

Разам з сусьветнымі тэхналёгіямі пашыраюцца магчымасьці ды аўдыторыя і нацыянальнай літаратуры. І гэта надае надзеі.

***

Расейскае выдавецтва «Фортуна ЭЛ» на пачатку гэтага году прэзэнтавала ўнікальнае выданьне – «Мёртвыя душы» Гогаля з ілюстрацыямі **Марка Шагала**. У кнігу ўвайшлі 96 гравюр, выкананых знакамітым віцебчуком у 1923–1925 гадах для аднаго французскага выдавецтва, якое пажадала надрукаваць раман Гогаля ў Парыжы ды так і не рэалізавала праекту. Іншы беларускі мастак **Міхаіл Башылаў** (1821–1870) ілюстраваў кнігі Грыбаедава, Салтыкова-Шчадрына, Талстоя (апошні быў у захапленьні ад малюнкаў Башылава; работа аўтара «Вайны і міру» і мастака-ілюстратара, што цікава, ішла паралельна). Французы і расейцы, што казаць, заўсёды паважалі багата ілюстраваныя мастацкія выданьні.

Робіцца шкада беларускіх літаратараў і выдаўцоў, пераважная большасьць якіх, не камплексуючы, працуюць без мастакоў, свабодна абыходзяцца без ілюстрацый. Але ж кніга без малюнкаў – гэта як страва бяз солі.

А зьесьці такую страву вельмі няпроста.

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/1/16
[image]

Аляксей Знаткевіч Грудзі Курнікавай – канец гісторыі

«Дэпутаты зацьвердзілі рэфэрэндум і пайшлі на арганізаваны Лукашэнкам банкет». Пад такім загалоўкам мой калега і былы дэпутат Вярхоўнага Савету Беларусі Сяргей Навумчык неяк выставіў у Інтэрнэце кароткі ўспамін пра падзеі 1995 году, калі спэцслужбы зьбілі і гвалтам выдалілі з залі парлямэнту дэпутатаў-галадоўнікаў ад апазыцыі БНФ. Гаворка йшла пра «першы» рэфэрэндум аб мове, зьмене сымболікі, эканамічнай інтэграцыі з Расеяй і праве прэзыдэнта распускаць парлямэнт. Паколькі беларускія наведнікі Інтэрнэту ад чарговага рэфэрэндуму не застрахаваныя, на гэтую спасылку ў той дзень ціснулі часьцей, чым на суседнія.

У самім загалоўку ўсё было праўдзіва, але ён пагрозьліва-спакусьліва падманваў наконт астатняга тэксту. Прыкладна гэтак інтэрнэт-спасылкі абяцаюць паказаць грудзі расейскай тэнісісткі Ганны Курнікавай ці нават усю румынскую каманду гімнастак, голую цалкам. Замест таго яны звычайна прыводзяць на спартовы сайт, дзе грудзей няма, а ёсьць дзясяткі артыкулаў, сярод якіх аповед пра здымкі для часопісу «Playboy» ці «Maxim». Тут мы зь Сяргеем пагадзіліся, што гэта

АЛЯКСЕЙ ЗНАТКЕВІЧ журналіст, перакладчык. Нарадзіўся ў 1974 годзе ў вёсцы Дашкаўцы Магілёўскага раёну. Скончыў Менскі дзяржаўны лінгвістычны ўнівэрсытэт і ўнівэрсытэт Паўночнай Караліны ў Ўэлэл-Гіле (ЗША).

Апошняя публікацыя ў «ARCHE» пераклад апавяданьня Мілана Кундэры «Эдуард і Бог».

негуманна.

Жорсткія законы мас-мэдыяў даўно прыйшлі і ў кнігавыдавецтва. Да Гутэнбэргавай вынаходкі аўтар мог дазволіць сабе назваць кнігу «Роздумы» ці «Рэспубліка». Цяпер так можна назваць газэту або фракцыю ў Нацыянальным сходзе. Калі сучасны Аўрэліюс ці Плятон прапануе такую назву кнігі рэдактару і выдаўцу, тыя наўрад ці будуць пляскаць у ладкі, хіба што аўтар мае для продажу «адміністрацыйны рэсурс».

Першай кнізе амэрыканскага палітоляга і філёзафа[1] Фрэнсыса Фукуямы адначасна пашанцавала і не пашанцавала з загалоўкам. «Канец гісторыі і апошні чалавек» - гучыць нішто сабе, асабліва пасьля гучнай славы артыкулу з назвай «Канец гісторыі», які Фукуяма надрукаваў у амэрыканскім часопісе «The National Interest» трыма гадамі раней, у 1989-м.

Ня тое каб загаловак падманваў наконт зьместу кнігі, як «Грудзі Курнікавай». І пра канец гісторыі там ладная частка, і цытатаў зь Ніцшэвага «Так казаў Заратустра» нямала. Але асноўная тэза кнігі цісьне на ўсё астатняе, як слон, якога паставілі на страху вясковай хаты. Гэтую хату для таго й будавалі, каб на яе паставіць слана. Здаецца, і дошкі ў страсе тоўстыя, і кроквы з бэлькамі здаравезныя, але слана ўсё роўна не вытрымлівае. У хаце можна было пажыць ня горш, а можа, і лепш, чым у суседніх. Але без слана на страсе яна б мала чым ад іх адрозьнівалася, прынамсі звонку. Таму можна сказаць, што Фукуямавай кнізе пашанцавала і не пашанцавала з асноўнай ідэяй.

Гэты артыкул ня будзе спробай крытыкі Фукуямавай кнігі, якая выйшла 12 гадоў таму[2] . Крытыкаў за гэтыя гады было шмат і безь мяне. Хутчэй гэта спроба паказаць, што будынак, які Фукуяма пабудаваў як слановы пасад, прыдатны для іншых мэтаў. Не пагаджаючыся з Фукуямавай тэзай пра «канец гісторыі», можна адначасна гаварыць пра ўнівэрсальны рух да лібэральнай дэмакратыі ў сьвеце і пра магчымасьць (а таксама пажаданасьць) лібэральнай дэмакратыі ў Беларусі.

Найперш, аднак, трэба пераказаць асноўныя пункты кнігі,

рызыкуючы, што нехта скажа, як у анэкдоце: «Не падабаецца мне гэты Фукуяма. Самога, праўда, ня чуў, але мне ўчора троху зь яго прасьпявалі».

СЛОН НА СТРАСЕ

Паводле Фукуямы, гісторыя чалавецтва як пошук ідэальнай мадэлі грамадзтва скончылася. Сучасны лібэральна-дэмакратычны капіталізм (далей ЛДК)[3] - няважна, у амэрыканскім, японскім ці адным з эўрапейскіх варыянтаў - стварае найлепшыя ўмовы, каб задаволіць два рухальныя, разам з розумам фармуюць сутнасьць чалавека: «жаданьне ўлады шырокім сэнсе і «прагу прызнаньня»[4]. Фукуяма піша: *Мы можам намаляваць сабе сьвет, які* сутнасна *адрозьніваецца ад цяперашняга і адначасна лепшы за яго»*[5].

Краіны, дзе пануе ЛДК, ужо жывуць у «постгісторыі». Тыя краіны, што пакуль сядзяць у «гісторыі», рана ці позна да «постгісторыі» дабяруцца ці памруць у дарозе[6].

Пры гэтым Фукуяма засьцерагае ад разуменьня, што ўсе альтэрнатывы ЛДК зьнікнуць блізкім часам. Ён таксама ня піша, што ўсе праблемы ўнутры цяперашніх ЛДК і на глябальным роўні хутка вырашацца. Ён нават не дае ільвёрдага абяцаньня, што чалавецтва больш не сутыкнецца з катастрофамі накшталт першай ці другой сусьветнай вайны. Але, паводле яго, вядомыя цяпер альтэрнатывы ЛДК (такія, як камунізм ці ісламскі фундамэнталізм) з часам стануць усё менш прывабныя, а прынцыпова новыя ня зьявяцца. Усе праблемы можна вырашыць, не зьмяняючы сыстэмных прынцыпаў ЛДК, а імавернасьць новай глябальнай вайны будзе надалей зьмяншацца.

Любая тэза накшталт «мы пабудавалі найлепшы магчымы сьвет» правакуе на пярэчаньні. Крытыкаў было шмат, таму і тэза пра канец гісторыі абвяргаецца больш чым адным спосабам, як шахматны эцюд зь некалькімі рашэньнямі.

Найбольш цікавым падаецца зьедлівы камэнтар рэдактара кансэрватыўнага амэрыканскага часопісу «The New Criterion» Роджэра Кімбала:

1. Фукуяма таксама працаваў у Дзяржаўным дэпартамэнце ЗША ў часы *Рональда* Рэйгана і Джорджа Буша старэйшага. Акрамя навуковай і выкладчыцкай працы, Фукуяма цяпер займае пасаду ў камісіі па абароне пры прэзыдэнту Джорджу Бушу-малодшым. У 1997 годзе ён стаў адным з 25 першых удзельнікаў Праекту для новага

Прыхільнасьць спадара Фукуямы да Гегелевай дыялектыкі амэрыканскага прыводзіць да некаторых дзіўных перакручваньняў. Напрыклад, у сваёй кнігі ён зазначае, што «можна гаварыць пра гісторычны працэс, толькі калі ведаеш, куды чалавецтва ідзе». Але гістарычны Хіба для таго, каб вызначыць прагрэс, ня трэба хутчэй ведаць таго, дзе чалавецтва было, чым таго, куды яно ідзе? Ці сапраўды надзейны праваднік Г. В. Ф. Гегель, пры ўсёй ягонай геніяльнасьці? Ці сам Фукуяма? Не: каб абвясьціць прагрэс, нам трэба гісторыя – сьціплае апісаньне таго, што адбываецца, каб ня ўдавацца ў прадказаньні. Гісторык – гэта той, хто апавядае пра тое, што адбылося, а не той, хто ўмее прадказваць.

Сапраўды, Фукуямава філязофія падобная да артадаксальнага марксызму, бо і першая, і другая грунтуюцца на гегелеўскай «гістарычнай неабходнасьці». Толькі ў Фукуямы найвышэйшай формай грамадзтва замест камунізму робіцца ЛДК. Таму ня дзіўна, што Фукуяму запісваюць ягоныя ідэалёгі «ліберальных фундаманталістаў».

Як заўважае беларускі палітолаг Юры Дракахруст, іншае магчымае абвяржэньне Фукуямавай тэорыі палягае ў тым, што ягоную «найлепшую з усіх магчымых сыстэмаў» могуць зьнішчыць, не абцяжарваючы сябе ідэалёгіяй «*сутнасна* адрознай і адначасна лепшай» за ЛДК. У свой час Рымскую імпэрыю і цывілізацыю разбурыў не канкурэнт-Карфаген, а натоўпы барбараў. Пагатоў відавочна, што цяперашнім барбарам не абавязкова будзе хадзіць натоўпамі. Зброя масавага зьнішчэньня дае ім новыя магчымасьці.

Сам Фукуяма, выглядае, ня бачыць у гэтым супярэчнасьці. У жыхары Эўразьвязу, у адрозьненьне ад амэрыканцаў, лічаць, што канец гісторыі ужо настаў ува ўсім сьвеце і замест сілавых мэтадаў у міжнародную палітыку прыйшло вяршэнства закону. Сьледам за іншым амэрыканскім дасьледнікам Робэртам. Каганам Фукуяма гаворыць, што «мір і бясьпека ў іх эўрапейскай бурбалцы гарантаваныя, па вялікім рахунку, амэрыканскай вайсковай сілай. Безь яе яны самі хутка былі б

2 Надалей у гэтым артыкуле пад Фукуямавай кнігай маецца на ўвазе менавіта кніга «Канец гісторыі і апошні чалавек», хоць ён піша і пра іншыя свае кнігі.

3 У кнізе ён ужывае тэрмін «liberal» у самым шырокім сэнсе, маючы на ўвазе ўсякага прыхільніка ліберальных каштоўнасьцяў. Фукуяма тлумачыць, што «liberal« тут выкарыстоўваецца і ў значэньні рынкавай эканомікі/капіталізму, і ў значэньні абароны законам правоў асобы. Ён таксама піша, што ў палітычнай сыстэме дэмакратыі і ліберальнасьці эвалюцыя спынілася, дасягнуўшы «канца гісторыі». Як прыклад ліберальнай краіны, якая не была дэмакратычнай, Фукуяма называе Брытанію XVIII стагодзьдзя. У сучасным сьвеце, піша ён, праводзяць рэгулярныя і даволі справядлівыя, паводле стандартаў разьвіцьцёвых краін, дэмакратычныя выбары. Але Іран нельга назваць ліберальнай краінай, бо там няма гарантыяў свабоды слова, сходаў і, перадусім, свабоды вераваызнаньня.

4 Больш падрабязна пра гэтыя паняткі – у наступным разьдзеле.

5 У сваім разуменьні «канца гісторыі» Фукуяма грунтуецца на тэорыі Гегеля ў інтэрпрэтацыі французскага філёзафа Аляксандра Кажэфа, які нейкі час быў чыноўнікам эўрапейскай супольнасьці. Цікава, што ў сваёй лекцыі «Ці пачалася гісторыя наноў пасьля 11 верасьня?» Фукуяма кажа, што менавіта жыхары Эўразьвязу, у адрозьненьне ад амэрыканцаў, лічаць, што канец гісторыі ужо настаў ува ўсім сьвеце і замест сілавых мэтадаў у міжнародную палітыку прыйшло вяршэнства закону, якая была б незнаемая з навуковым прагрэсам і яго пагрозамі.

Фукуяма гэтак заканчвае разьдзел:

Сапраўды цыклічную гісторыю можна ўявіць, толькі калі нейкая цывілізацыя зьнікне, зусім не пакінуўшы адбітку на наступных. Гэта сапраўды здаралася да вынаходкі сучасных прыродазнаўчых навук. Сучасныя прыродазнаўчыя навукі, аднак, настолькі магутныя, – як для дабра, гэтак і для зла, – што ведьмі сумнеўна, ці магчыма іх некалі забыць альбо «ня вынайсьці» пры ўмовах іншых, чым зьнішчэньне чалавечай расы.

Пры такім падыходзе да тэорыі растлумачыць ею можна усё што хочаш. Ніводная магчымая зьява, улучна з глябальнай адмаўляецца ад ідэі «канца гісторыі», бо навуковы працэс ядзернай вайной ці усясьветным патопам, яе не абвяргае. А бясконцы і можа зьмяніць нават біялягічную структуру калі вынішчэньне чалавечай расы таксама тэорыі не пярэчыць, чалавека. Фукуяма выступае супраць гістарычнага разьвіцьця ў дык пасьлядоўнасьць вымушае сказаць, што гэтае вынішчэньне, гэтым кірунку, бо гэта будзе ужо не «чалавечая» гісторыя.

[8] Выдзелена мною. - **Аут**.

[9] Можна пачаць разважаць, што чалавечы розум, як любая сыстэма, ня можа аналізаваць сам сябе, але ў гэтым артыкуле няма спробы давесьці бязьмежныя магчымасьці чалавечага розуму.

[10] Для празрыстасьці я сьвядома пазьбягаю ў перакладзе захаваньня з арыгіналу грэцкіх ці стварэньня гібрыдных форм, накшталт «ізатымія».

[11] Вакол палітычных азначэньняў «правы-левы» шмат ольтаніцы. У гэтым артыкуле «правы» – той, хто акцэнтуе важнасьць ці роўнасьць паміж людзьмі для эканамічнага разьвіцьця грамадзтва і неабходнасьць «звыш-годнасьці» для задавальненьня чалавека. «Левыя», адпаведна, робяць акцэнт на роўнасьць разьмеркаваньня дабрабыту і важнасьць «раўнагоднасьці» паміж людзьмі.

У падмурку ўяўных вэрсіяў чалавечай прыроды з трох кампанэнтаў – жаданьня, розуму і годнасьці / прагі прызнаньня.

1) Пад жаданьнем маецца на ўвазе інстынкт самазахаваньня, прыродныя патрэбы, кшталту голаду ці смагі, але таксама імкненьне да дабрабыту, то бок матэрыяльнага камфорту. У гэтым сэнсе жаданьне ня можа спыніцца, бо ўзровень пажаданага дабрабыту будзе расьці сьледам за дабрабытам атрыманым.

2) Калі нехта ня ведае, што такое розум, дык дзіўна, што ён аж дасюль дачытаў гэты тэкст[9] .

3) Годнасьць і прага прызнаньня гэтай годнасьці - гэта

спэцыфічнае жаданьне атрымаць прызнаньне ад іншых людзей, што ты - чалавечая істота, роўная ім ці вышэйшая за іх (адпаведна можна адрозьніць «раўнагоднасьць» і «звышгоднасьць»[10]). Фукуяма тлумачыць, што годнасьць нельга лічыць проста адным з магчымых жаданьняў, бо яна часам перамагае ў чалавеку базавае жаданьне - інстынкт самазахаваньня.

Паводле Фукуямы, жаданьне разам з навуковым прагрэсам рухае ўсё чалавецтва да капіталізму / вольнага рынку. Менавіта рынак найлепшым чынам дапамагае задаволіць прагу матэрыяльнага камфорту ў найбольшай колькасьці людзей. Адначасна годнасьць штурхае чалавецтва да лібэральнай дэмакратыі, бо ЛДК дазваляе найбольшай колькасьці людзей атрымаць «раўнагоднасьць». Два гэтыя рухавікі разам, зьвязаныя міжсобку розумам, цягнуць вагоны гісторыі ў адным кірунку - да перамогі ЛДК ува ўсім сьвеце.

НАЙЛЕПШАЯ МОВА - ГЭТА КАЎБАСА?

Аддзяленьне годнасьці ад звычайных інстынктаў для Фукуямы прынцыповае - яно аддзяляе яго тэорыю ад клясычнага лібэралізму пасьлядоўнікаў Джона Лока. Для апошніх чалавек - гэта ня больш чым рацыянальная жывёла. Нездарма Фукуяма піша, што першабытныя людзі пачалі змагацца паміж сабой не за матэрыяльныя рэсурсы, а за «чысты прэстыж».

У сваіх філязофскіх акцэнтах, як і ў палітычным жыцьці, Фукуяма - тыповы «правы»[11] . Ён зазначае, што цьверджаньні пра канец гісторыі найбольш падатлівыя для крытыкі менавіта з боку правіцы. Фукуяма шчодра цытуе Ніцшэ зь яго пагардай да «апошняга чалавека», які думае выключна пра самазахаваньне. Сам ён таксама мае што сказаць наконт гэтага:

У Амэрыцы сёньня мы адчуваем за сабой права крытыкаваць звычку да курэньня іншага чалавека, але не ягоныя ці ейныя рэлігійныя перакананьні ці маральнасьць паводзінаў. Для амэрыканцаў здароўе іх целаў – што яны ядуць і п'юць, якія практыкаваньні робяць, у якой яны форме – стала значна большай апантанасьцю, чым маральныя пытаньні, ад якіх

пакутавалі іх продкі.

Цікава, што ў тым асобніку кнігі «Канец гісторыі і апошні чалавек», які я ўзяў у бібліятэцы, была толькі адна зацемка некага з ранейшых чытачоў. Менавіта побач з тырадай, цытаванай вышэй, нехта дапісаў асадкай: «Bullshit, forebears wanted to eat most of all»[12].

Ад якіх маральных пытаньняў пакутавалі папярэднікі, можна даведацца з кніг, калі верыць іх аўтарам і ранейшым чытачам. А вось вызначыць, дзеля чаго пачалі змагацца міжсобку нашыя продкі, - праца ня зь лёгкіх, бо ў іх пра гэта ўжо не запытацца. Паколькі гэты артыкул ня ёсьць спробай некага пераконваць у існаваньні гістарычнага прагрэсу ці дэградацыі, гэтую працу лепей пакінуць іншым.

Але кожны можа адказаць сабе сам, ці пакутуе ад нейкіх маральных пытаньняў, ці хоча *толькі* паесьці-папіць-патрахацца ў камфорце і дабрабыце. Апроч таго, можна паназіраць за навакольным сьветам і вырашыць, якая мадэль чалавека дазваляе вытлумачыць больш фактаў - «жаданьні + розум» ці «жаданьні + розум + годнасьць»[13].

Чалавечую «годнасьць» тут не абавязкова разумець у звычайным пазытыўным сэнсе. Беларускае пажаданьне «каб і ў суседа карова здохла» - гэта таксама прыклад «раўнагоднасьці». Ды й пажаданьне ня толькі беларускае.

Напрыклад, некаторыя дасьледаваньні паказваюць, што калі чалавеку прапанаваць выбар з крыбак на нейкія «Сам 300 навукоў/рублёў/гуцряў», каб быць прыгэткай, а любоўна 700, а ўсім яна 1000, - ды каб ён збольшага выбраў лепш каравіны. Калі за гэтыя 300 можна фізычна прасьць.

Кун зрабіў такую выснову з свайго дасьледаваньня гісторыі прыродазнаўчых навук. Але для спробаў растлумачыць чалавека і грамадзтва яна пасуе нават лепей.

Фукуяма, сьледам за шэрагам іншых дасьледнікаў, піша, што рэвалюцыі часта адбываюцца не тады, калі сярэдні жыцьцёвы ровень павольна падае, а калі гэты ровень ніжэйшы і расьце павольней, чым у суседзяў. Тут важна, з кім параўноўваюць сябе людзі. Нездарма беларуская ўлада і апазыцыя збольшага спрабуюць накіраваць погляды насельніцтва ў супрацьлеглыя бакі - адпаведна на ўсход/поўдзень і на захад/поўнач. Хоць

[12] «Лухта, вродкі перадусім хацелі есьці» (анг.).

[13] Як адзначае Тоўвас Кун зь сваёй крыбак на нейкія «Сам 300 навукоў/рублёў/гуцряў», каб быць прыгэткай, а любоўна 700, а ўсім яна 1000, - ды каб ён збольшага выбраў лепш каравіны. Калі за гэтыя 300 можна фізычна прасьць.

беларускае тэлебачаньне ахвотна раскажа пра жахі Польшчы, Літвы і Латвіі, усё ж больш выйгрышныя для прапаганды праблемы Расеі з Украінай.

Зацятым эканамічным лібэралам варта было б яшчэ раз падумаць над традыцыйным беларускім пытаньнем: што важнейшае - мова ці каўбаса? Ніхто не заклікае адмаўляцца ад каўбасы, але ня першы год стабільна ня спраўджваецца тэза пра тое, што калі стане жыць горш, людзі «дастануць сякеры з-пад лавы».

РАЗ-ДВА, ЛЕВАЙ!

Не пагаджаючыся з Фукуямам у тым, што ЛДК - найлепшае з магчымых грамадзтваў, можна адначасна вылучыць гіпотэзу, што для *большасьці жыхароў* яно лепшае за альтэрнатывы, якія існуюць зь ім побач. На карысьць гэтай гіпотэзы сьведчаць кірункі міграцыі насельніцтва. Няшмат жыхароў Эўразьвязу ці ЗША імкнуцца пераехаць на сталае месца жыхарства ў Беларусь. Хоць дакладную статыстыку цяжка знайсьці, рух у зваротным кірунку выглядае значнейшым.

Нехта можа запярэчыць, што для «пераезду з постгісторыі ў гісторыю» існуюць вялікія культурныя і бюракратычныя бар'еры. На гэта можна адказаць, што бар'еры ўзаемныя і таму мусілі б стрымліваць міграцыю з двух бакоў. Тэарэтычна прасьцей пераехаць з Захаду ў Беларусь, Іран ці на Кубу, чым наадварот. Тым ня менш не назіраецца вялікага прытоку маладых немцаў ці палякаў у Беларусь, нягледзячы на высокі ровень беспрацоўя ў Польшчы і Нямеччыне.

Крытыкі ЛДК зь левага лягеру на Захадзе падзяляюцца на дзьве групы. Адны адмаўляюцца ад традыцыйнага марксызму і ленінізму і прапануюць новыя альтэрнатывы. Другія, як Шарлатаў, намякаюць, што рэальныя мадэлі сацыялізму[14], якія паўсталі ў ХХ стагодзьдзі і захаваліся дагэтуль, лепшыя за ЛДК. Крытыку прыкладаў дае амэрыканскі дасьледнік Дэвід Майкл Сьміт з каледжу Мэйнлэнду ў сваёй крытыцы «Пераасэнсаваньне «Канца гісторыі»: пасьпешлівы нэкралёг па сацыялізьме ад Фрэнсыса Фукуямы». Спачатку ён, аднак, прызнае, што

[14] Сьмідзюк сацыялістычныя і капіталістычныя.

сацыялізм перажывае цяжкія часы, і падкрэсьлівае, што гэтая крытыка ня ёсьць спробай апраўдаць сталінізм і загады сацыялістычных краін. Ён, аднак, называе Кубу і Паўночную Карэю «сацыялістычнымі рэжымамі з народнай падтрымкай». Сьміт таксама падае як прыклад існых краін з элементамі сацыялізму Лібію, Вэнэсуэлу, Анголу і Эфіёпію. Акрамя таго, ён адзначае лякальныя посьпехі левых паўстанцаў у шэрагу краін напрыклад у Пэру ці Нэпале, - а таксама падкрэсьлівае марксысцкія элемэнты ў нацыянальных рухах палестынцаў, курдаў і г. д. Аднак Сьміту не стае ўпэўненасьці, каб сказаць, што нейкая зь існых сацыялістычных краінаў ЛДК, і каб прапанаваць яе як прыклад для пераймання ў «постгістарычных» грамадзтвах. Замест гэтага Сьміт пішы

Мая мэта пры называньні гэтых размаітых марксысцкіх і сацыялістычных рухаў ня ў тым, каб адназначна падтрымаць кожны зь іх, але каб падкрэсьліць устойлівасьць сацыялістычных памкненьняў і рухаў на большай частцы плянэты, нягледзячы на развал традыцыйных «камуністычных» рэжымаў у Савецкім Саюзе і іншых краінах. У гэтым кантэксьце варта заўважыць, што нават у некаторых прасунутых мясцовых капіталістычных грамадзтвах марксысцкія і сацыялістычныя партыі аднаўляюцца, адраджаюцца і вынаходзяцца наноў.

Такога кшталту крытыка паказвае толькі тое, што камунізм яшчэ не сканаў, але ня тое, што ён ізноў набірае моц. Цікава тут яшчэ й тое, што ўзоры камуністычнага посьпеху часьцей бяруцца з «гістарычнага» грамадзтва. Напрыклад, Сьміт называе расейскую кампартыю пракапіталістычнай, нацыяналістычнай і апартуністычнай арганізацыяй, і ўсур'ёз піша, што *«дзясяткі мільёнаў (sic!) расейскіх рабочых далучыліся да марксысцкіх і сацыялістычных арганізацыяў, адданых ідэі сацыялістычнай рэвалюцыі ў сваёй краіне»*. І прадказвае чарговую сацыялістычную рэвалюцыю ў Расеі[15].

Шэсьцьдзесяцігадовы ўзрост Сьміта, які ён называе «сярэднім», ня ёсьць ні ранейшы прадказаны ім эпохавым, ні нават ягоны ўласны. Ён, відавочна, ня ведае, што ў сучасным капіталізьме ўзрост прадпрымальніка, які ўкладае ў справу ўласныя грошы, ня мае ніякага значэньня. Ня ведае ён і таго

Пішучы пра левых мысьляроў на Захадзе, Фукуяма зведаны, зазначыў, што ў пачатку 1980-х большасць зь іх ужо не верыла, што савецкі камунізм - гэта іх будучыня. *«Так у гэтым лягеры захавалася вера ў легітымнасьць марксызму-ленінізму для* іншых *людзей, і гэтая вера звычайна павялічвала іхнія прапорцыі да геаграфічнай і культурнай дыстанцыі».*

Было б несправядліва казаць, што гэтая заўвага наўпрост тычыцца Сьміта, які не абмяжоўваецца крытыкай ЛДК, а прапануе ўнівэрсальную альтэрнатыву. Вось толькі гучыць яна расплывіста:

Я лічу, што новыя радыкальныя рабочыя рухі ў дваццаць першым стагодзьдзі павінны аднавіць і вярнуць сабе бачаньне дэмакратыі працоўных і сапраўднага інтэрнацыяналізму, якія былі ў сэрцы першапачатковага марксысцкага праекту.

Сьміт *«так і не* прадказвае *назваў* Кітай да ліку капіталістычных краін і там *сацыялістычную* супраць цяперашняй улады.

Не спрачаючыся з тым, што ідэі Леніна адрозьніваліся ад першапачатковага марксызму, можна прыгадаць словы Ігара Губэрмана, што *«ідэя, кінутая ў масы — гэта дзеўка, кінутая ў полк»*. Таму, вяртаючыся да старых апрабаваных ідэяў, варта памятаць, *як менавіта* іх апрабоўвалі. Новыя ідэі таксама часам лепей было б спачатку выпрабоўваць на сабаках.

РАЗ-ДВА, ПРАВАЙ!

У 1996 годзе у Менску мне давялося пазнаёміцца з амэрыканскім прафэсарам Расэлам Гарысанам. Той выкладаў у лінгвістычным унівэрсытэце па нейкай праграме абмену, а ў дадатак рэдагаваў тыднёвік, які я тады перакладаў на ангельскую. Гарысан называў сябе «камуністам без партбілета», хваліў Лукашэнку і сацыялізм і казаў, што ў Менску значна чысьцей, чым у Нью-Ёрку. З апошнім цьверджаньнем я быў абсалютна згодны, бо Нью-Ёрк ужо наведваў. Я толькі асьцярожна прапаноўваў, што варта было б паглядзець, як жывуць людзі па-за Менскам, пачытаць газэты і паглядзець тэлевізар, чаго Гарысан, прынамсі за першы год свайго побыту ў Беларусі, не зрабіў.

Тэарэтычны камуніст Гарысан, аднак, зьдзіўляўся зь некаторых

[15] Дарэчы, Сьміт заўважае і прадказвае і там рэвалюцыю супраць цяперашняй улады.

[16] Паколькі ў гэтым артыкуле няма згоды з Фукуямавай заявай пра канец гісторыі, нельга пагадзіцца і зь ягонай тэзай пра адсутнасьць сыстэмных супярэчнасьцяў у ЛДК. Заявы пра такія супярэчнасьці ідуць з усіх бакоў: экалягічныя рухі папярэджваюць, што планэта можа хутка ня вытрымаць тэмпаў эканамічнага росту, што прывядзе да катастрофы; левыя скардзяцца, што рэальнай дэмакратыі на Захадзе стала менш праз новую алігархію і далейшае расслаеньне грамадзтва; правыя гавораць пра заняпад сапраўднага рынку і дыктат маскавага чалавека.

практычных праяў «рынкавага сацыялізму». А мой аповед пра спрэчку ў мэтро з агрэсіўным дзядзькам (які сьпярша загадаў нейкаму падлетку зьняць з галавы хустку, а потым хваліў СССР і даводзіў мне, што ўсіх дэмакратаў трэба пастраляць) прафэсара ўвогуле зьбянтэжыў. Гарысан сказаў, што ў Амэрыцы так сябе паводзіць мог бы толькі «правы». Прафэсар таксама зьдзіўляўся, чаму ўва Ўсходняй Эўропе камуністаў цяпер больш падтрымліваюць сяляне, чым гараджане.

Магчыма, што Гарысану было б лягчэй адказаць на свае пытаньні, калі б ён быў больш уважлівы да ўласнага літаратурнага густу. Неяк ён прынёс мне ў падарунак зборнік Чарлза Букоўскага, сказаўшы, што гэта яго ўлюбёны пісьменьнік і што ён сам напісаў пра Букоўскага кнігу «Against the American Dream»[17].

Праз год ува Ўнівэрсытэце Паўночнай Караліны я ўзяў Гарысанаву кніжку, але не адолеў яе. Спроба знайсьці ў Букоўскага як мага больш элемэнтаў марксызму мяне не натхніла. Тады замест марксысцкага аналізу я з задавальненьнем пачытаў «The Buk Book» – караценькія ўспаміны, напісаныя некім зь сяброў Букоўскага і шчодра ілюстраваныя яго здымкамі ў кампаніі голых сябровак.

[17] «Супраць амэрыканскай мары» (анг.).

Калі карыстацца крытэрамі Фукуямы, дык Букоўскі - менавіта «правы», а ня «левы», нягледзячы на ягоную пагарду да кансэрватыўных каштоўнасьцяў. У яго творах падкрэсьліваецца права асобы паводзіць сябе, як ёй хочацца самой, і дзякуючы гэтаму адчуваць перавагу над іншымі. Стаўленьне да Амэрыкі сваіх часоў Букоўскі выказаў у знакамітай фразе пра розьніцу паміж дэмакратыяй і дыктатурай: у дэмакратыі ты спачатку галасуеш, а потым выконваеш загады, а ў дыктатуры ня трэба марнаваць час на галасаваньне.

Наўрад ці такая фраза магла нарадзіцца ў Букоўскага, калі б той жыў у СССР. Па-першае, марнаваць час на галасаваньне там усё роўна, мякка кажучы, заахвочвалі. Непарушны блёк камуністаў і беспартыйных павінен быў атрымаць свае 99,9 % падтрымкі. Па-другое, там такое пісьменьніцтва, хутчэй за ўсё, прывяло б Букоўскага ня толькі да скандальнай славы, але й да турмы, вар'ятні ці эміграцыі - у залежнасьці ад пэрыяду

савецкай гісторыі.

Фукуяма гэтак піша пра адну з асноўных ідэйных супярэчнасьцяў камунізму: такое грамадзтва будуюць, каб задаволіць прагу «раўнагоднасьці», але, каб распачаць рэвалюцыю і будаваць нешта новае, патрэбны людзі, якія маюць «звышгоднасьць». Нездарма ідэалістаў у любой рэвалюцыі даволі хутка выцясьняюць цынікі, а потым і першыя, і другія часта апынаюцца ня там, дзе ім хацелася. Каб захаваць ідэалістычны імпэт камунізму, даводзіцца ўвесь час весьці няспынную барацьбу з ворагамі. Таму заканамерная сталінская тэза пра абвастрэньне клясавай барацьбы з набліжэньнем да камунізму. Калі барацьба на зьнішчэньне суцішаецца, сыстэма пачынае загніваць.

Але апошняе можна сказаць і пра радыкальныя «правыя» ідэалёгіі. Там, дзе на дзяржаўным роўні робяць абавязковым ідэал «звышчалавека», даводзіцца ваяваць з вонкавым ворагам і вынішчаць усё новых і новых «недачалавекаў» унутры свайго грамадзтва.

Некаторых гэта не турбуе, і яны шчыра гавораць пра вайну і любое змаганьне з ворагамі як пра самакаштоўнасьць. Насьледуючы Ніцшэ, такую пазыцыю, напрыклад, выклаў расейскі пісьменьнік Эдуард Лімонаў у сваёй кнізе «Дысцыплінарны санаторый». Ён пісаў пры канцы 1980-х, што грамадзтвы Захаду і СССР мала чым адрозьніваюцца, бо і адны, і другія зрабілі з чалавека свойскую жывёлу. Крытыкі ў Францыі, дзе Лімонаў напісаў гэтую кнігу, назвалі яго філёзафам для скінгедаў.

Вярнуўшыся ў Расею на пачатку 1990-х, Лімонаў заснаваў нацыянал-бальшавіцкую партыю, аб'яднаўшы ў ёй радыкалаў з абодвух полюсаў палітычнага поля. У нядаўнай кнізе «Новая Расея: абрысы будучыні», напісанай у Лефортаўскай турме[18], Лімонаў закладае даволі лягічны падмурак пад «чырвона-карычневую» ідэалёгію. Ён зьняважліва піша пра пралетарыят і сучасную расейскую нацыю. Рухавіком любой рэвалюцыі ён называе маргінальную моладзь, якая (незалежна ад ідэалёгіі) незадаволеная існым парадкам, адчувае сябе лепшай за іншых і хоча адабраць уладу ў старэйшага пакаленьня. Лімонаў

адкрыта падтрымлівае перавагу правоў гэтай меншасьці над большасьцю, выводзячы гэта зь біялягічнай няроўнасьці.

Натуральна, што такія ідэі ня выклічуць энтузіязму ў тым, хто лічыць сябе большасьцю. Тыя, хто лічыць сябе мацнейшымі за іншых, таксама часта больш схільныя змагацца за ідэю расавых магчымасьцяў для людзей з рознымі здольнасьцямі, чым за эгаістычны закон джунгляў. Нездарма Лімонаў з павагай піша пра такіх радыкальных расейскіх дысыдэнтаў, як Уладзімер Букоўскі (ня блытаць з Чарлзам).

У дадатак, пакуль існуе «гістарычная» частка сьвету, радыкальным правым «постгістарычнай» часткі могуць параіць пераехаць туды і там шукаць прыгодаў на ўласную задніцу ды не тлуміць «апошнім людзям» галаву.

Таму «новыя правыя» прапануюць і іншыя абгрунтаваньні сваіх ідэяў. Той жа Лімонаў у «Дысцыплінарным санаторыі» выводзіў неабходнасьць разбурэньня цяперашніх грамадзтваў з таго, што прырода ня здолее вытрымаць усё большыя запыты «масавага чалавека» на Захадзе ды Ўсходзе і адпомсьціць экалягічнай катастрофай[19].

Унабомбэр, які дасылаў выбуховыя прылады амэрыканскай адукацыйнай эліце, у сваім «Маніфэсьце» заклікаў вярнуцца да першабытнага грамадзтва. Гэты заклік ён тлумачыў пакаўкі

[18] Лімонаў у 2001 году на ваўлі абвінавачаньняў у незаконным захоўваньні зброі, тэрарызьме, арганізацыі незаконных узброеных фармаваньняў і закліках да зрыненьня дзяржаўнага ладу. Суд пагадзіўся толькі зь першым абвінавачаньнем. Лімонаў быў асуджаны на 4 гады зьняволеньня, потым яму скарацілі тэрмін, і ён выйшаў на волю ў чэрвені 2003 году.

[19] Рэкамендацыі карпуцца да пакаўкі

тым, што ў сучасным грамадзтве чалавек, на ягоную думку, ня можа знайсьці задавальненьне. Экалягічныя праблемы большую сур'ёзная падстава задумацца, ці ўсё так добра ў найбліжэйшасьць магчымых сьвеце.

Фукуяма не адмаўляе экалягічных небясьпек, але тлумачыць, што вяртаньне да прыроды і першабытных камун ці традыцыйнай вёскі (ідэалу некаторых «новых правых») маларэальнае, незалежна ад чалавечага жаданьня. Асабліва гэта зразумела для «правых», якія падкрэсьліваюць агрэсію ў біялягічнай структуры чалавека. Новым першабытным камунам ізноў давядзецца разьвіваць навуку і тэхналёгіі, інакш іх зьнішчаць іншыя супольнасьці зь лепшай зброяй. Супраць танка не абараніцца дзідай. Таму варта шукаць рашэньні цяперашніх праблем, не ідучы пры гэтым «назад у будучыню».

ЗЛЫ ГАНТЫНГТАН, НАІЎНЫ ФУКУЯМА

Калі Фукуяма ў сваёй кнізе выступае збольшага як філёзаф, дык твор, які многія назвалі адказам на ягоны «Канец гісторыі», тычыцца перадусім геапалітыкі. Гаворка йдзе пра кнігу амэрыканскага дасьледніка Сэмюэла Гантынгтана «Сутыкненьне цывілізацыяў і пераўладкаваньне ўсясьветнага парадку», якая выйшла ў сьвет у 1996 годзе.

У эпоху масавых мэдыяў шырокая публіка ўспрымае кнігі такога кшталту ў асноўным паводле папярэдніх артыкулаў, рэцэнзій ці нават загалоўкаў. Гантынгтан, як раней Фукуяма, таксама стаўся ахвярай і атрымальнікам выгадаў такога падыходу. Мне ўжо давялося чуць легенду пра Гантынгтана як пра ідэалягічнага змагара супраць незаходніх цывілізацый - усіх гэтых «чорных», «мусьлімаў» і «вузкавокіх»[20].

Тэракты 11 верасьня 2001 году надалі Гантынгтану статус прарока, а Фукуяму - рэпутацыю наіўнага аптыміста. Як сказаў адзін мой знаёмы, які, праўда, не чытаў ані артыкулу, ані кнігі, - «Фукуяма лажануўся».

Але ў геапалітычным разьдзеле Фукуямавай кнігі вельмі мала наіўнага аптымізму. Ёсьць захапленьне распадам СССР, але

[20] Гантынгтан лічыць, што ў сучасным грамадзтве чалавек, на ягоную думку, ня можа знайсьці задавальненьне. Экалягічныя праблемы большую сур'ёзная падстава задумацца, ці ўсё так добра ў найбліжэйшасьць магчымых сьвеце.

[20] Гантынгтан лічыць, што ў сучасным грамадзтве чалавек, на ягоную думку, ня можа знайсьці задавальненьне. Экалягічныя праблемы большую сур'ёзная падстава задумацца, ці ўсё так добра ў найбліжэйшасьць да экалёгіі, чым ЛДК. У гэтым многія беларусы пераканаліся на ўласным здароўі.

пры гэтым Фукуяма даволі ясна акрэсьлівае праблемы, якія, на ягоную думку, чакаюць сьвет далей. Больш за тое, некаторыя асноўныя тэзы Гантынгтана нібы перапісаныя з Фукуямы, як невялікім адрозьненьнем:

— папярэджаньне пра спробу Ўсходняй Азіі (у Гантынгтана, кітайскай цывілізацыі) вылучыць альтэрнатыву ЛДК (Захаду) эканамічную мадэрнізацыю плюс канфуцыянскі аўтарытарызм;

— тлумачэньне, чаму палітычны іслам ёсьць пасьлядоўнай альтэрнатывай ЛДК (Захаду) і таму не зьбіраецца рэфармавацца паводле заходніх лібэральна-дэмакратычных мадэляў;

— вызначэньне асноўных канфліктных пунктаў паміж «постгістарычным» і «гістарычным» сьветам (паміж Захадам і астатнімі цывілізацыямі): іміграцыя, кантроль над ваеннымі тэхналёгіямі, нафта.

А вось наступны Фукуямаў пасаж:

...Магчыма, што міжнароднае жыцьцё будзе ўсё больш разглядацца як спаборніцтва не паміж канкурэнтнымі ідэалёгіямі – бо большасьць эканамічна пасьпяховых краін будзе арганізавана паводле падобных прынцыпаў, – але паміж рознымі культурамі.

Цікава, што сам Гантынгтан у сваёй кнізе ўсё гэта ігнаруе. Называючы магчымыя альтэрнатыўныя «сутыкненьню цывілізацыяў» парадыгмы, ён першай вылучае нейкую мітычную тэорыю «Адзін сьвет: эўфарыя і гармонія» і называе Фукуяму яе прыхільнікам. Наўрад ці гэта сьвядомая містыфікацыя. Хутчэй за ўсё Гантынгтан Фукуямавай кнігі папросту не чытаў, абмежаваўшыся артыкулам.

Фукуяму можна хутчэй аднесьці да прыхільнікаў другой тэорыі, якую крытыкуе Гантынгтан, - «Два сьветы: мы і яны». Гантынгтан піша, што ў нейкім сэнсе гэтая тэорыя адпавядае рэчаіснасьці, калі разглядаць яе як падзел паміж багатымі і беднымі дзяржавамі. Ён, аднак, тлумачыць, што канфлікт паміж гэтымі двума сьветамі малаімаверны: багатыя дзяржавы

мы, яны, на
рэкатэрыя
заходняя
(каталіцка-
пратэстанцкая),
лацінаамэрыканска
(каталіцкая
спадкаемніца
Захаду),
Кітай
(канфуцыянская),
Расея
(праваслаўная),
ісламская,
Індыя
(індуісцкая),
Японія
(будысцкая)
і, магчыма,
афрыканская.

будуць весьці міжсобку гандлёвыя войны, бедныя дзяржавы могуць проста ваяваць паміж сабой, але ў бедных краін ня хопіць палітычнай еднасьці, эканамічнай моцы і ваенных магчымасьцяў выступіць супраць багатага сьвету.

Яшчэ менш карысны, на думку Гантынгтана, падзел на Захад і ўсіх астатніх. Не-заходнія грамадзтвы маюць мала супольнага, акрамя сваёй «незаходнясьці».

Аднак фукуямаўскія «два сьветы» не дублююць падзелу «Захад супраць ня-Захаду». Для Фукуямы такія краіны, як Японія, Паўднёвая Карэя, Баўгарыя ці Грэцыя ёсьць часткай сьвету ЛДК. Для Гантынгтана першая ёсьць асобнай цывілізацыяй, другая належыць да цывілізацыі кітайскай (канфуцыянскай), а Баўгарыя з Грэцыяй - да праваслаўнай цывілізацыі, дзе дамінуе Расея.

Геапалітычныя высновы з гэтага робяцца даволі сур'ёзныя. Пры канцы сваёй кнігі Гантынгтан вядзе чытача да думкі, што НАТА варта было б усьвядоміць «незаходнясьць» Грэцыі і Турэччыны (адкрытага закліку выключыць іх з гэтай арганізацыі, аднак, няма). У свой час сяброўства ў НАТА шмат у чым дапамагло гэтым дзьвюм краінам пазьбегнуць ваеннага канфлікту паміж сабой.

Таксама пэсымістычныя пэрспэктывы далучэньня да Эўразьвязу Баўгарыі і Румыніі, не гаворачы ўжо пра Сэрбію з Чарнагорыяй, Македонію, Беларусь, Малдову і Ўкраіну.

І Фукуяма, і Гантынгтан даволі крытычна выказваюцца наконт «чыстага рэалізму» ў геапалітыцы. Тут іх крытыка падобная. Калі ўважаць, што ўсе дзяржавы аднолькава разумеюць свае нацыянальныя інтарэсы і аднолькава дзейнічаюць у міжнароднай палітыцы, дык немагчыма рэалістычна прагназаваць падзеі. Паводле тэорыі «балянсу сілаў», заўважае Гантынгтан, краіны Заходняй Эўропы мусілі б у канцы 1940-х гадоў стаць хаўрусьнікамі Савецкага Саюзу супраць ЗША. Абодва аўтары заўважаюць, што паводле «чыстага рэалізму» ЗША даўно б ужо акупавалі Канаду. Абодва таксама тлумачаць, што каштоўнасьці, культура і грамадзкія інстытуты ў значнай ступені ўплываюць на разуменьне дзяржавамі нацыянальных

інтарэсаў.

Разыходжаньне толькі ў тым, якія парадыгмы прапануюцца для разуменьня геапалітыкі ў найбліжэйшыя гадоў пяцьдзясят. Для Гантынгтана ЛДК ёсьць мадэллю, якая пасуе *толькі* заходнім грамадствам і вынікае зь іх гісторыі і традыцыяў, таму Захад павінен захоўваць сваю ўнікальнасьць і ня лезьці ў справы чужых цывілізацыяў. Пазыцыя ў нечым падобная да колішняй ідэі левых інтэлектуалаў Захаду, якія ня верылі, што савецкі камунізм - гэта *іх* будучыня, але захоўвалі ўпэўненасьць у легітымнасьці марксызму-ленінізму для *іншых* людзей, «і гэтая вера звычайна павялічвалася ў прапорцыі да геаграфічнай і культурнай дыстанцыі». Гэтаксама Гантынгтан верыць у легітымнасьць для іншых людзей рознага кшталту аўтарытарных рэжымаў. Ён прапануе Захаду выкарыстоўваць супраць варожых цывілізацыяў нешта накшталт «палітыкі стрымліваньня», якая некалі выкарыстоўвалася ў дачыненьні да СССР.

Фукуяма не адмаўляе важнасьці культуры. Ён даволі дэталёва тлумачыць, чаму некаторыя рэлігіі і звычаі ёсьць бар'ерам на шляху ЛДК. Аднак для яго чалавечая прырода ўнівэрсальная, і яна, на ягоную думку, будзе спрыяць трансфармацыі ўсіх культур у кірунку, які дазволіць ЛДК перамагчы[21].

Для Гантынгтана лібэральная дэмакратыя ня можа ўсталявацца ў Баўгарыі ці Беларусі, бо гэтаму пярэчыць іх прыналежнасьць да «праваслаўнай цывілізацыі», якая вызнае іншыя і каштоўнасьці. Зь беларускім прыкладам можна не пагадзіцца хаця б таму, што сумнеўным выглядае адназначнае аднесеньне Беларусі ў праваслаўную цывілізацыю. Але больш прынцыповы аргумэнт - супраць абсалютызацыі культуры ўвогуле і царквы ў прыватнасьці.

[21] Гантынгтан, Фукуяма

Паводле Фукуямы, рух да ЛДК ёсьць грунтоўнай патрэбай грамадствоў у апошнія стагодзьдзі[22]. Таму рэлігіям давядзецца прыстасоўвацца да чалавечага патрабаваньня дабрабыту і палітычнай «раўнагоднасьці». Калі «малады» ісламізм ня вылучае палітычныя альтэрнатывы, дык сучаснае праваслаўе наўрад ці ўжо можна разглядаць як палітычную мадэль з прэтэнзіямі на перавагу над ЛДК. Нягледзячы на спробы

ня надаюць
ўвагі
фундамэнтальны
м перамовам
ў сучасным
сьвеце
пратэстанцтва,
якое есьць
правадніком
каштоўнасьцяў
лібэральна-
дэмакратычнага

«канкардату», рэлігія ў Беларусі найперш застаецца кампаніяму асабістага выбару. Можна гаварыць пра праваслаўныя звычкі і звычаі, але іх нельга разглядаць як нязьменную дадзенасьць. Фукуяма таксама, рыцыя.

22 Пра такі ўнівэрсальны рух да дэмакратыі пісаў яшчэ французскі дасьледнік Алексіс дэ Таквіль у сваёй кнізе «Дэмакратыя ў Амэрыцы». Фукуяма таксама, рыцыя.

Фукуяма засьцерагае ад падтрымкі ўрадамі ЛДК, найперш Злучанымі Штатамі, недэмакратычных рэжымаў, і тлумачыць, чаму, на ягоную думку, ЛДК ня будуць ваяваць міжсобку, нават калі яны належаць да розных культур. Паводле яго, адносіны паміж ЛДК у нечым нагадваюць палітычныя адносіны паміж людзьмі ўнутры лібэральных дэмакратыяў зь іх павагай да «раўнагоднасьці».

Калі тэзу пра «канец гісторыі» праверыць даволі цяжка, дык геапалітычныя мадэлі і Гантынгтана, і Фукуямы правяраюцца і будуць няспынна правярацца на практыцы. У супрацьвагу тэзе, што «Фукуяма лажануўся», варта сказаць, што ў сваёй кнізе ён, напрыклад, прадказваў, што ў выніку дэмакратызацыі Чэхаславаччына, хутчэй за ўсё, падзеліцца на дзьве дзяржавы, але распад ня будзе канфліктным, у адрозьненьне ад Югаславіі[23]. Ня дужа вялікае прароцтва, калі глядзець з 2004 году, але і ня Гантынгтанаў акцэнт на магчымасьць хуткага распаду Ўкраіны.

Для нашай часткі сьвету можна паставіць, напрыклад, наступныя пытаньні, дзе далейшыя адказы будуць вызначаць, чыя тэорыя праўдзівейшая:

— Ці застанецца Грэцыя ў Эўразвязе і НАТА?

— Якія пэрспэктывы Турэччыны ў НАТА і ці далучыцца яна некалі да Эўразьвязу?

— Ці далучацца да Эўразьвязу ў 2007 годзе, як заплянавана, праваслаўныя Баўгарыя з Румыніяй?

23 Фукуяма тлумачыць, што найбольш інтэнсіўныя канфлікты культур адбываюцца ў найменш мадэрнізаваных краінах.

— Якія пэрспэктывы балканскіх краінаў - праваслаўных, ды Чарнагорыі, Македоніі, падзеленай Босьніі, мусульманскай Альбаніі?

Але натуральна, што найбольш цікавае пытаньне для нас:

— Што будзе зь Беларусьсю і яе «гістарычнымі» суседзямі?

Гантынгтан у «Сутыкненьні цывілізацыяў і пераўладкаваньні ўсясьветнага парадку» згадвае Беларусь даволі часта. На мапе ў кнізе, дзе пазначана мяжа паміж заходнім і ўсходнім хрысьціянствам каля 1500 году, Беларусь падзеленая напалам. Аднак нядзіўна, што Гантынгтан, які пісаў кнігу ў 1995 годзе, называе Беларусь фактычнай часткай Расеі, якая для яго - аснова праваслаўнай цывілізацыі.

Гісторык Алег Латышонак выступіў з даволі дэталёвай крытыкай гэтай Гантынгтанавай тэзы ў «ARCHE» (№ 6 за 2003 год). Не пагаджаючыся з многімі Латышонкавымі высновамі, можна, аднак, пагадзіцца з галоўным ягоным закідам Гантынгтану пра Расею як пра праваслаўную цывілізацыю.

Гантынгтан залічае Расею да гэтак званых краінаў на ростанях, «разарваных» краінаў (torn countries). Жыхары такіх краінаў сыходзяцца ў тым, хто яны, але спрачаюцца пра тое, якую цывілізацыю лічыць сваёй. Латышонак у адказ гаворыць, што Расея, паводле клясыфікацыі Гантынгтана, належыць да «расшчэпленых» краінаў (cleft countries), зь мільёнамі мусульман і ўсё большай колькасьцю нэапратэстантаў. У кнізе Гантынгтана «расшчэпленая» краіна вызначаецца як краіна, дзе вялікія групы насельніцтва належаць да розных цывілізацыяў, таму гэты тэрмін у дачыненьні да Расеі выглядае дарэчным. Яго пацьвярджае і рыторыка ў адносінах да Чачэніі як да «неад'емнай часткі Расеі». Відавочна, што за нежаданьнем вывесьці войскі з Чачэніі стаіць ня столькі боязь крыніцы тэрарызму (тэрарызму якраз больш у часе вайны), але боязь даць кепскі прыклад іншым мусульманскім часткам Расейскай Фэдэрацыі[24].

Таму, Сэрбіі напрыклад, Славенія здолела выйсьці зь югаслаўскай фэдэрацыі адносна мірна, а самы крывавы канфлікт адбыўся ў немадэрнізаванай Босьніі. Няма падставаў лічыць, пісаў ён, напрыклад, што памежныя спрэчкі паміж Польшчай і Літвой прывядуць да сур'ёзнага гвалту. Дарэчы, зьяўленьне Чэхіі і Славаччыны ўвогуле ня ўпісваецца ў Гантынгтанаву схему, бо абедзьве краіны

Цікава, што ні Гантынгтан, ні Латышонак ніяк не вызначаюць Беларусь у гэтай клясыфікацыі. Калі верыць напісанаму Гантынгтанам, дык Беларусь цалкам пагадзілася быць часткай праваслаўнай цывілізацыі. Калі верыць Гантынгтаваму крытыку, Беларусь - клясычная «расшчэпленая» краіна, падзеленая паміж праваслаўным усходам і каталіцка-пратэстанцкім захадам.

Аднак мне падаецца, што абодва варыянты памылковыя і Беларусь бліжэйшая да мадэлі культурна «разарванай», ці «расшчэпленай» краіны. Натуральна, ёсьць адрозьненьні паміж заходняй і ўсходняй часткамі краіны - у гэтым можа пераканацца кожны, хто меў магчымасьць параўнаць Горадню і Магілёў, Паставы і Клімавічы, вёскі розных рэгіёнаў і г.д. Але калі параўнаць з той жа Ўкраінай, якую Гантынгтан назваў кандыдаткаю на распад, дык заўважная розьніца. Напрыклад, на прэзыдэнцкіх выбарах 1994 году ў заходніх Львоўскай, Цярнопальскай ды Івана-Франкоўскай абласьцях Украіны за Леаніда Краўчука прагаласавалі амаль 95 працэнтаў выбарнікаў. За Леаніда Кучму - каля чатырох працэнтаў. У той жа час у самай усходняй, Луганскай вобласьці Краўчука падтрымалі толькі каля 10 працэнтаў, а Кучму - амаль 90 працэнтаў[25]. На выбарах у Беларусі ў той жа год нічога блізкага не адбылося, хоць рэгіянальныя адрозьненьні былі.

Гаворкі пра тэрытарыяльную падзеленасьць Беларусі і праекты накшталт «заходняга каталіцкага ліцьвінізму» зыходзяць зь недаацэнкі супольнай беларускай гісторыі і паваеннай міграцыі. Наш падзел, у адрозьненьне ад украінскага, вызначаны ня рознымі імпэрыямі (Беларусь ня мела сваёй Галіччыны ў адносна лібэральнай Аўстра-Вугоршчыне). Беларускія тэрытарыяльныя адрозьненьні вызначаны найперш міжваеннымі гадамі падзелу паміж Польшчай і СССР. Тры падзелы Рэчы Паспалітай, скасаваньне Уніі ў 1839 годзе - гэта таксама фактары, але другасныя. Насуперак Гантынгтану, беларускае праваслаўе мае мацнейшыя пазыцыі на захадзе, чым на ўсходзе краіны. Беларусь перажывала вызначальныя падзеі эўрапейскай гісторыі (напрыклад, Адраджэньне, Рэфармацыю, Асьветніцтва) ці іх адсутнасьць (напрыклад, каталіцкія.

24 У адносінах да Расеі

Ўкраіна, дык

Беларусь

ідэальны

прыклад

уласнай

тэорыі.

Паводле яго,

краіна ня

можа

ператварыцца

у ліберальную і

лаяльную

нацыянальнай

дзяржаве,

дзе ня будзе

канфліктаў

паміж

групамі

насельніцтва.

Расея ж,

паводле яго,

мела на

пачатку

1990-х

добрыя

пэрспэктывы

для

дэмакратыі.

Супярэчнасьць

тут уяўная,

бо Фукуяма

у сваёй кнізе

зь верай

цытуе

заходні капіталізм XIX стагодзьдзя) на ўсёй сваёй цяперашняй тэрыторыі.

Нельга таксама забываць пра масавую міграцыю «заходнікаў» у разбураныя другой сусьветнай вайной гарады, у тым ліку ўсходнія абласныя цэнтры і Менск. На геаграфічным захадзе жыве менш насельніцтва, але «заходнікі» цяпер паўсюль, тым больш што нараджальнасьць на захадзе Беларусі дагэтуль вышэйшая. Захад і ўсход разам часта могуць быць у адной сям'і і нават у адной галаве. Нездарма сацыялягічныя апытаньні паказваюць, што прыкладна траціна беларусаў адначасна хацелі б далучэньня да Эўразьвязу і інтэграцыі з Расеяй.

Беларусь ня ёсьць «разарванай» краінай, якую, паводле Гантынгтанавага вызначэньня, уладная эліта хоча пераключыць у чужую цывілізацыю насуперак волі насельніцтва. У Беларусі насельніцтва само вагаецца паміж дзьвюма цывілізацыямі. Пра гэта добра напісаў яшчэ ў 1921 годзе беларускі філёзаф Ігнат Абдзіраловіч (Канчэўскі) у сваім творы «Адвечным шляхам».

У Фукуямавай кнізе Беларусь згадваецца толькі адзін раз, калі ён піша, што сельская гаспадарка Польшчы ня зьведала калектывізацыі, у адрозьненьне ад суседніх Беларусі і Украіны. Тое, што згадка толькі адна, нядзіўна, калі памятаць, што кніга пісалася на мяжы 1991-1992 гадоў. Фукуямава тэорыя больш аптымістычная для тых, хто жадае ператварэньня Беларусі ў ЛДК. Паводле яго, такое ператварэньне імавернае і для гэтага ня трэба адмовы ад нацыянальнай культуры ці падзелу краіны на дзьве часткі. Бар'ерам для такога ператварэньня ў Беларусі застаецца найперш спадчына савецкага камунізму.

Апошнім часам антылібэралізм у розных формах робіцца модным - «канец гісторыі» і «залаты век» не прыйшлі разам з распадам камунізму. Аднак крытыкі лібэральнай дэмакратыі праваслаўнай, але заходняй Валынскай вобласьці за Кучму прагаласавалі 14 працэнтаў выбарнікаў, а за Краўчука - 84 працэнты. Далейшая палітыка Кучмы таксама не пацьвердзіла гіпотэзы пра адназначны выбар прарасейскага курсу.

[25] Дарэчы, Гантынгтанава тэза і тут ня цалкам спрацоўвае, бо ў праваслаўнай, але заходняй Валынскай вобласьці за Кучму мадэлі, што існавалі раней. Пры гэтым яны не тлумачаць, як не патрапіць у старыя яміны. Асабліва небясьпечны такі падыход для краінаў кшталту Беларусі, дзе «гісторыя», як ні круці, ня скончылася.

[image]

Барыса Ельцына да нацыянальных аўтаноміяў - маўляў, бярэце сувэрэнітэту колькі здолееце. Ён ставіць словы Ельцына ў прыклад Грузіі, якая пайшла на вайну са сваімі аўтаноміямі. Але ўварваньне ў Чачэнію ў 1994 годзе паказала, што Расея была гатовая даць волю аўтаноміям ня больш за Грузію.

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/1/16
[image]

Алена Гапава
Што такое «бацька» і яго бацькоўскі клопат

И только когда напьюсь,
Мне снится Советский Союз.

Група «Ленинград»

АЛЕНА ГАПАВА
дырэктарка Цэнтру гендэрных дасьледаваньняў Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту. Летась у Менску пад яе рэдакцыяй выйшаў зборнік «Женщины на краю Европы».

На пачатку ліпеня ў Менск прыехала мая ўкраінская каляжанка. «Ты ведаеш, - сказала я, - мне прапанавалі напісаць пра жанчын у сувязі з дзесяцігоддзем кіравання А. Лукашэнкі». - «Цікава, - адказала яна, - мне зрабілі такую ж прапанову ў сувязі з Кучмам». Нам абедзвюм мужчынскі раман з уладай падаецца больш інтрыгоўным, бо гэтае каханне значна мацнейшае за «Фаўста» Гётэ. Але, здаецца, такі ракурс нікога не цікавіць: тое, што робяць мужчыны, бачыцца як натуральнае, а таму механізм іх жадання тлумачэнняў «не патрабуе». Такім чынам, мы пачалі пісаць пра жанчын, кожная пра сваіх. Але праз нейкі час выявілася, што мужчыны ўсё роўна ў нашых тэкстах прысутнічаюць. Можа, паводле Фройда, гэта вылазіць на паверхню лібіда, а можа, вандроўка ў псіхааналіз увогуле залішняя і тут прычыны зусім іншага кшталту.

МЫ ЎСЕ ГЛЯДЗІМ У ПІГМАЛІЁНЫ...

Паводле статыстыкі, жанчыны ставяцца да А. Лукашэнкі лепш за мужчын і складаюць большасць яго выбарцаў. Паводле апытанняў НІСЭПД канца 1990-х, сярод прыхільнікаў прэзідэнта жанчыны складалі 58,3 %, а мужчыны - 41,7 %, паводле звестак агенцыі БелаПАН, падчас выбарчай кампаніі 2001 г. 63 % жанчынаў былі гатовыя прагаласаваць за А. Лукашэнку. Некалькі адсоткаў агульнай тэндэнцыі не мяняюць: яна відавочная і ў шырокіх публічных колах прынятая за адзін з фактаў беларускага жыцця.

Сам А. Л. пра структуру свайго электарату таксама добра ведае і, здаецца, разумее вагу жанчын як ідэалагічнага рэсурсу:

О, женщины – это мои избиратели. Вот говорят, что Лукашенко одни женщины поддерживают. А я говорю: дай Бог, чтоб так было до конца жизни. И страна будет наша – женская. А я буду у вас руководителем партии вашей...[1]

Жанчыны, згодна з іх рэпрэзентацыяй у савецкім дыскурсе, ёсць спажыўцамі льгот, якія «радзіма» можа ім «даць», а практыкі, праз якія дабрадзействы ўлады для жанчын як мацярок робяцца відавочнымі, складаюць частку ўладнай тэхналогіі. Адчыняючы ў ліпені 2001 г. гінекалагічную клініку ў Менску, прэзідэнт звярнуўся непасрэдна да жанчын як клапатлівы муж і бацька: «Гэта падарунак вам, жанчынам, ад нас, мужчын». Той факт, што жанчыны - таксама працоўныя грамадзяне, чый эканамічны ўклад у будаванне аб'ектаў аховы здароўя прапарцыянальны іх колькасці ў структуры насельніцтва, а праца па біялагічным і культурным узнаўленні грамадства, якую яны робяць у прыватнай сферы, увогуле не аплачваецца, у такой інтэрпрэтацыі цалкам знікае. Жаночая масоўка абрана на ролю «ўдзячнага народу» і выкарыстоўваецца для дэманстрацыі палітыкі «ўсё на карысць чалавека», паколькі кожны рэжым мае патрэбу ў сімвалічнай легітымацыі. А. Л. толькі ўспадкаваў дыскурсійныя механізмы, распрацаваныя яшчэ савецкай ідэалагічнай сістэмай.

Хаця жаночая прыхільнасць да прэзідэнта канстатаваная і прызнаная, яе прычыны як асобная праблема ніколі паслядоўна

не аналізаваліся. Прагледзеўшы недзяржаўныя СМІ, можна сустрэць дзве фантазіі, што існуюць у папулярным уяўленні як пэўнае «тлумачэнне» сацыяльнай з'явы, а таксама для выпрацоўкі пэўных жаночых вобразаў, што патрэбныя эліце пры канструяванні сябе праз канструяванне «іншага».

Першая «тлумачальная» фантазія грунтуецца на міфе аб сексуальнай моцы як адным са складнікаў прэзідэнцкай харызмы. *«Именно женщины, говорят, и сыграли решающую роль при выборах президента Лукашенко. Как признаются одни из доверенных лиц Александра Григорьевича, главным некоторым девизом в их борьбе за место президента был: Лукашенко – единственный из кандидатов, который может...»*[2] - пісаць журналісты ў сярэдзіне 1990-х. Тады нечаканае для прыхільнікаў рынкава-незалежніцкага кірунку і большасць інтэлігенцыі абранне А. Лукашэнкі прэзідэнтам з вялікім адрывам ад астатніх кандыдатаў стала раўнаважным разбурэнню сімвалічнага парадку, які складваўся з канца 1980-х. Выбух патрабаваў рацыяналізацыі, і праз адсутнасць сацыяльнай тэорыі (бо вульгарна-марксісцкая тады ўжо памерла, а іншай не было) на яе ролю была абрана сексуальная фантазія. Цікава тое, што яна часам выкарыстоўваецца і цяпер: *«Потенциал физический влияет на потенциал умственный. Он – настоящий мужчина, поскольку сочетает физические, сексуальные параметры с материальными возможностями. Он мог бы быть культовым секс-символом»*[3] , - распрацоўвае паліталагічную дактрыну (ці працуе на нейкую іншую мэту?) у газеце, што прэтэндуе на аналітыку, дэпутат і член пастаяннай камісіі ПП НС па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ Надзея Цыркун. Хоць на самай справе гэтая фантазія нічога рэальна не тлумачыць, яе з'яўленне цалкам натуральнае, бо яна выконвае іншую функцыю. Справа не ў А. Л., які «можа», а ў тым, што тыя, хто прайграў, вельмі хочуць «магчы» і імкнуцца пэўным чынам канструяваць «жанчыну» і «жаночае жаданне». Рэпрэзентацыяй унутры дыскурсу беларускай апазіцыі «жанчыны» (праз секс) як набору біялагічных і анатамічных характарыстык адбываецца ўжыванне цела «іншага» дзеля адыгрывання ўласнага ўладнага дыскурсу. Спецыяльны нумар «ARCHE» пад назвай «Кабеты» ёсць культурным сведчаннем таго, як адбываецца інтэрпрэтацыя

1 А. Лукашэнка. Заразумовы з жыхарамі вікторыі Маліноўка г. Менск // Свабода. 1996. 8 кастрычніка.

2 Батька Лукашенко // Комсомольская правда. 1995. 4 жніўня.

3 Интервью с депутатом ПП НС Надеждой Цыркун // Белорусская газета. 2004. 26 ліпеня.

(жаночага) цела ў тэксты. Адзін з цэнтральных артыкулаў нумару «Жанчыны й секс: што, дзе й навошта» пачынаецца фразай: «Полавыя органы ў жанчыны прынята падзяляць на вонкавыя й нутраныя». Далей на дзесяці старонках ідзе скрупулёзнае медыцынскае апісанне, і ў выніку жаночае цела становіцца, паводле словаў Тацяны Клімянковай, нават не сексуальным, а «генітальным». А цяпер уявіце сабе, каб прысвечаны мужчынам (калі б такое ўвогуле можна было ўявіць) нумар інтэлектуальнага часопісу пачынаўся з апісання мужчынскіх рэпрадукцыйных органаў: такога быць не можа, бо мужчына не зводзіцца да сваёй сексуальнай функцыі. Жанчына ж у беларускіх тэкстах зводзіцца рэгулярна і паслядоўна, бо праз гэта будуецца пэўны ўладны (г. зн. палітычны) дыскурс. У артыкуле пра рэферэндум 1996 г. нейкі рупліўца бацькаўшчыны заўважыў: *«Сімвалам жа жаночага пачатку (паводле Фрэзера) з глыбокай старажытнасці было кола. Альбо вянок. Таму багіня перамогі Ніка ўзнагароджвала пераможцу на спаборніцтвах лаўравым вянком. Бо жанчына была і застаецца найвялікшай узнагародаю для мужчынаў»*[4].

Што думае сама ўзнагарода аб сваёй прысутнасці ў[4] Навіны. мужчынскім сексуальным праекце, нікога не цікавіць яна, як і іншыя рэчы - кола ці вянок, не мае голасу і ўвогуле не можа мець самастойнай жаночай сексуальнай асалоды. Аўтару ж такі этнаграфічны экскурс патрэбны, каб, параўнаўшы беларускую нацыю з жанчынай, потым гуляць са словамі «ператрахіваць» і «паімець». Няцяжка здагадацца, хто той, што нацыю «імее».

1998, № 52.

На самай справе праз сексуалізацыю жаночага вырашаецца праблема ўласнага мужчынскага самаўяўлення і робіцца магчымай рэпрэзентацыя палітычнай пазіцыі часткі мужчын як агульнай «мужчынскай пазіцыі»: жанчыны - гэта тыя, каго «маюць», а мужчыны - тыя, хто «мае». У Жака Лякана ёсць знакаміты тэзіс пра тое, што «жанчына не існуе» ў тым сэнсе, што яна нібыта можа знайсці сваё азначэнне толькі ў Іншым, без якога яна пазбаўлена ідэнтычнасці, адсутнічае, не мае назвы; яна заўсёды ёсць адлюстраваннем Іншага і г. д. Рэпрэзентацыя жанчыны як «месца» ў нечай фантазіі, як кагосьці, хто інакш адсутнічае і цалкам залежыць ад свайго «Пігмаліёна», падымае «агульнага мужчыну» на Пігмаліёнаў п’едэстал. Тады палітычныя паводзіны можна кваліфікаваць не

як выбар пэўнай сацыяльнай групы, што вызначаецца супольнымі інтарэсамі (жанчын, што галасуюць супраць А.Л., таксама шмат), а менавіта як мужчынскія, г. зн. «прынцыповыя»: «І я прагаласаваў супраць. Як меншасць. Мужчын, сапраўды, у Беларусі менш, чым жанчын»[5] .

Аўтар «робіцца мужчынам» праз дыскурсійны механізм. Тым сама. (няўпэўненасць ва ўласнай мужчынскасці, якую трэба ўвесь час даказваць, ёсць яшчэ адной рысай беларускага дыскурсу, звязанай з уяўленнем сябе праз апазіцыю «каланізатару», але гэтая тэма знаходзіцца па-за рамкамі артыкулу), а сацыяльнае пытанне (чаму значная частка народу паводзіць сябе так?) увогуле знікае. На нашых вачах спрацаваў механізм выключэння жанчыны як «іншага» з «нацыянальнага» палітычнага канструкту і яе ператварэння з чалавека, суб'екта ў аб'ект (сексуальнай) палітыкі. Летам 2001 г. «Народная воля» папарадзе размовы з кандыдатам на пасаду прэзідэнта Беларусі ад «дэмакратычнай апазіцыі» падае наступны пасаж: «Александр Лукашенко - сторонник силовых методов управления страной. Александр Ярошук считает, что страной нужно овладевать нежно и ласково. Но твердо и настойчиво».

Чаму, у рэшце рэшт, усё зводзіцца да «валодання жанчынай» (той, хто выйграе выбары, будзе «мець», «овладевать» ці «ператрахіваць»)? Тая ж Надзея Цыркун працягвае: *«И мы по-прежнему наблюдаем за тем, как Лукашенко защищает свою территорию и женщин, как противостоит тому, кто сильнее...»*

Згодна з тэорыяй Мішэля Фуко, існуюць два тыпы ўлады, якія ўжываюць два тыпы гвалту - просты і сімвалічны. Сімвалічная ўлада ажыццяўляе ў грамадстве нармалізацыйную функцыю і існуе перш за ўсё як «закон» (не толькі юрыдычны, але як уяўленне пра тое, што лічыцца нормай, а што - паталогіяй, якая версія гісторыі прызнаецца правільнай, якое мастацтва трапляе ў музей і лічыцца «вялікім» і г. д.). Просты ж гвалт спараджаецца абсалютысцкай уладай, аснова якой звязаная з ідэяй даэдыпальнага бацькі. Ён паўстае як «бацька племя», і яго абсалютная ўлада выяўляецца ў валоданні «ўсімі» жанчынамі, а дзеянні не падпарадкоўваюцца ніякаму закону акрамя ўласнага жадання. У гэтай сістэме нельга знайсці прычыну, з якой нехта

трапіў у турму: гвалт не мае рацыянальнай асновы і выконвае ролю забеспячэння ўласнага жадання (што, здаецца, і адбываецца ў Беларусі, дзе ніхто не ведае, хто з «важных асобаў» будзе арыштаваны заўтра: гэта можа быць хто заўгодна). Такім чынам, прыцягненне «сексуальнай» версіі ўсё ж мае тлумачальную моц, але не адносна жаночага выбару, а нечага зусім нечаканага. Менавіта - мужчынскага (палітычнага) неўсвядомленага.

Другая фантазія адносна прыроды беларускага электаральнага трэнду грунтуецца на ўяўленні, што жанчына як мадэль палітычнага ўдзелу вылучаецца «ірацыянальнасцю» і лёгка робіцца аб'ектам маніпуляцый. *«Женским своеобразием было отмечено выступление г-жи Ольги Абрамовой (белорусское «Яблоко»), которая предложила освободить диалог от политики и считать всех его участников «миротворцами»*… - пісала «Наша Свабода». «Аўтсайдэрамі кшталту крэйзанутых бабак-сталіністак» называе прыхільнікаў А. Лукашэнкі нашаніўскі інтэлектуал, што глядзіць навокал левым вокам. *«Ды вы паглядзіце, хто за яго галасуе*, - кажа адзін з кіраўнікоў БНФ у прыватнай размове (я не называю прозвішча, бо ён не разглядаў выпадковы абмен думкамі як інтэрв'ю для прэсы), - *жанчыны ды пенсіянеры. Яны ж усе нічога не разумеюць. Гэта абсалютна нерацыянальныя слаі насельніцтва. Хіба іх можна браць у разлік?»*

Праблемаў з гэтай інтэрпрэтацыяй прынамсі дзве. Па-першае, крэйзанутасць залежыць ад таго, хто вызначае «норму», г. зн. мае сімвалічныя рэсурсы дзеля яе артыкуляцыі. Крэйзануты заўсёды той, хто не мае голасу давесці сваю логіку. Па-другое, калі з глузду з'язджаюць людзі аднаго сацыяльнага становішча і аднолькавым чынам, трэба шукаць цалкам матэрыяльную прычыну такой крэйзанутасці.

Яшчэ больш праблематычнае сексуальнае тлумачэнне. Лякан даў узор вельмі цікавай інтэлектуальнай гульні, але я не карыстаюся псіхааналізам для абгрунтавання мадэлі палітычных паводзінаў. Гэтую тэорыю немагчыма даказаць альбо абвергнуць - у яе трэба верыць. Я ж не магу паверыць, каб жанчыны, якія могуць нараджаць, г. зн. даваць жыццё,

рабіць самую галоўную на зямлі працу, зайздросцілі нейкаму адростку паміж нагамі (адкуль, паводле Фрэйда, і пачынаюцца іх праблемы). Гэты пасыл падаецца нерацыянальным: лічыцца, што ён народжаны мужчынскім страхам перад жаночай сілай і той уладай, якую гэта ім дае. Я марксістка і мушу шукаць матэрыяльнай прычыны палітычнаму выбару, які робяць жанчыны. Таму хопіць Лякана! Даеш Маркса!

ЖАНЧЫНА І САЦЫЯЛІЗМ (АМАЛЬ ПАВОДЛЕ БЕБЕЛЯ)

Беларускія «кантраверсіі» апошніх дзесяці гадоў традыцыйна тлумачацца палітолагамі, журналістамі і ўсімі тымі, хто пра гэта піша і гаворыць, як «нацыянальныя»: з нейкай прычыны (якая звычайна вынікае з геаграфічнага становішча Беларусі, г. зн. знаходжання «паміж») беларускія грамадзяне цураюцца нацыянальнай незалежнасці і культуры (мовы, гісторыі і г. д.). Гэтай версіі трымаецца большасць нашых і заходніх даследчыкаў. Некаторыя з іх жывуць з двума ці нават трыма пашпартамі розных краін, пераважную частку жыцця праводзяць у дарозе і вызначаюць сябе грамадзянамі свету, але ў дачыненні да іншых лічаць, што тыя павінны мець акрэсленае нацыянальнае пачуццё як падставу для адной-адзінай і заўсёды пастаяннай ідэнтычнасці. Яны выключаюць для іншых тое, што натуральна для іх саміх, - магчымасць вызначаць сябе праз множныя і зусім не абавязкова нацыянальныя ідэнтычнасці.

Мне ўжо даводзілася пісаць пра тое, што ў постсавецкім свеце дыскурс па нацыянальных пытаннях на самай справе прыкрывае сабой той выбар паміж рынкавай эканомікай (і ліберальнай дэмакратыяй) ды сацыялізмам (і палітычнымі абмежаваннямі), г. зн. паміж двума процілеглымі механізмамі размеркавання рэсурсаў, які стаў прычынаю распаду СССР[6]. Галоўны працэс, што адбываецца на постсавецкай прасторы, - гэта фармаванне класавай структуры (праз эканамічную няроўнасць, г. зн. праз дзеянне рынку), а нацыянальныя пытанні ў іх розных інкарнацыях - патрабаваннях аўтаноміі ці незалежнасці, спрэчках пра мову, пэўную версію гісторыі альбо тэрыторыі і г. д. - ёсць маніфестацыямі класавага пытання. Савецкі Саюз распаўся не таму, што быў «турмой народаў», а

таму, што ў нетрах сацыялістычнай эканомікі выспеў «новы клас», для якога сацыялістычная сістэма размеркавання сталася цеснай, як бочка - князю Гвідону: гэты клас імкнуўся да свабоды, якую дае рынак[7].

Нацыянальны дыскурс даў выхад класаваму «неспакою» ў сутнасць не ў нацыянальным пытанні як такім, а ў канфліктах інтарэсах процілеглых груп, якія былі артыкуляваны з яго. Нацыянальныя праекты ў свой час адыгралі ролю ў стварэнні новага сацыяльнага парадку («класавага грамадства»), даўшы паўсталым новым элітам высакародную нацыянальную ідэю, таму што нельга павесці народ на барыкады, сказаўшы «Мы тут будуем эканамічную няроўнасць, далучайцеся да нас». «Нацыянальнае» зрабілася фактарам сацыяльнай мабілізацыі, бо, як зазначае Кетрын Вердэры, «калі сістэма такога тыпу пачынае дэцэнтралізоўвацца і заахвочвае да большай ініцыятыўнасці знізу, адзінымі структурнымі формамі, што маюць досвед і арганізацыйную гісторыю, з'яўляюцца нацыянальнасці»[8]. Што, вядома, сведчыць не пра адсутнасць нацыянальнага пачуцця ў «зацікаўленых бакоў», а пра тое, што карані нацыянальных праектаў палягаюць у групавых («класавых» альбо карпаратыўных) інтарэсах тых, хто артыкулюе нацыянальную ідэю, г. зн. інтэлектуалаў.

[6] Ibid. P. 3.

[7] Пад класам я маю на ўвазе не стаўленне да сродкаў вытворчасці (як у класічным марксізме), а размеркавальныя (як у класічным маргінальным падыходзе) адносіны, якія ствараюцца ў выніку ўзаемадзеяння паміж рознымі групамі людзей з рознымі магчымасцямі ў дачыненні да рынку. Сённяшняя сітуацыя ў Беларусі ясна паказвае, што ў выніку барацьбы за кантроль над рэсурсамі, якія маюць каштоўнасць на рынку, у выніку «змагання за рынак» (Мовай Дзяржавіна, «праклятыя пытанні Кенігсберга») ствараюцца новыя сацыяльныя парадкі (Timothy Frye, Property Rights and Property Rights Enforcement: Argumentation and Evidence from Post-Communist Russia and Beyond // Comparative Political Studies. 2002. Vol. 35. No. 3. P. 308-337; Peter Murrell, Conservative Political Philosophy and the Status Quo // Journal of Economic Perspectives. 1993. Vol. 7. No. 1. P. 3-14; Jeffrey Sachs, Andrew Warner, Natural Resource Abundance and Economic Growth // Center for International Development and Harvard Institute for International Development. Cambridge, MA, 1997. P. 29).

[8] Katherine Verdery, What Was Socialism and What Comes Next? Princeton: Princeton University Press, 1996. P. 85.

Сённяшняя беларуская сітуацыя - гэта сітуацыя, у якой ідэалагічныя канструкты, якія ўзнікаюць у выніку барацьбы за кантроль над рэсурсамі, ствараюць новыя сацыяльныя парадкі. Гэтыя парадкі ўзнікаюць у выніку ўзаемадзеяння паміж рознымі групамі людзей з рознымі магчымасцямі ў дачыненні да рынку, зацікаўленай у тым, каб змяніць status quo, і процілеглай - у тым, каб яго захаваць.

Мовай дзяржавы ў гэтым кантэксце з'яўляецца мова, якая адпавядае інтарэсам пэўнай дамінуючай групы, якая ўзначальвае працэс дзяржаўнага будаўніцтва. Гэтая група, якая ўзначальвае працэс дзяржаўнага будаўніцтва, можа ўключаць у сябе прадстаўнікоў розных этнічных груп, але ў любым выпадку яна будзе ўключаць у сябе прадстаўнікоў тых этнічных груп, якія ўдзельнічаюць у барацьбе за кантроль над рэсурсамі, якія маюць каштоўнасць на рынку. Такім чынам, мова дзяржавы будзе адлюстроўваць інтарэсы гэтай групы, а не інтарэсы ўсіх этнічных груп, якія пражываюць на тэрыторыі дзяржавы.

Такім чынам, мова дзяржавы будзе адлюстроўваць інтарэсы гэтай групы, а не інтарэсы ўсіх этнічных груп, якія пражываюць на тэрыторыі дзяржавы

згодна з тым, як гэта падае дзяржаўны друк? Ён выплачвае заробкі і пенсіі, ён забараніў звальняць працоўных і зачыняць прадпрыемствы, ён настойваў на замарожванні цэнаў (яны ўзрасталі ўсё роўна, але ж ён спрабаваў нешта зрабіць), ён «захаваў» бясплатную медыцыну і сацыялістычную сістэму сацыяльнай абароны. Ён размяркоўвае рэсурсы, і, каб атрымаць хаця б нешта, дастаткова проста мець патрэбу. *«Президент дал указание чиновникам увеличить пенсии на 20 процентов с 1 августа»*, - паведамляе дыктар у тэленавінах. Для прыхільнікаў заходняй эканамічнай рэструктурызацыі гэтыя каштоўнасці выглядаюць антырынкава і недэмакратычна. Для тых, хто за іх галасуе, яны ўвасабляюць сацыяльную справядлівасць - эгалітарную сістэму цэнтралізаванага размеркавання, што дазваляе забяспечваць усіх грамадзян жыццёвымі рэсурсамі.

Апазіцыя ж (неаліберальныя і/ці нацыянальна-арыентаваныя інтэлектуалы) услаўляе нацыянальную незалежнасць, свабоду, правы чалавека, рынак і свабодныя цэны, бо лічыць іх «універсальнымі каштоўнасцямі», з дапамогай якіх мы хутка дасягнём заходняга дабрабыту («Бачыў, як добра жывуць у Еўропе, ідыёт?»). Аб'яднаная грамадзянская партыя піша на сваіх сцягах «Свабода, уласнасць, законнасць», г. зн. амаль тое самае, што 200 гадоў таму французская буржуазія, патрабуючы палітычнай рэпрэзентацыі. Кандыдат у прэзідэнты Ярашук даводзіць: «...Поэтому надо создать привлекательный инвестиционный климат, а он возможен только в случае предоставления субъектам хозяйствования полной экономической свободы».

Такім чынам, наша «нацыянальная» спрэчка проціпастаўляе дзве пазіцыі. З аднаго боку - погляд гарадскіх інтэлектуалаў ды новапаўсталай «буржуазіі» і той сацыяльны парадак, пры якім, як яны лічаць, ім жыць будзе лепей. Дэмакратыя - гэта пра тое, хто будзе сядзець у кабінетах, дзе творыцца ўлада: *«У ідэале беларуская моладзевая арганізацыя павінна фармаваць будучую беларускую эліту: гэтыя людзі, сябры арганізацыі, павінны потым стаць дэпутатамі парламенту, міністрамі, дырэктарамі прадпрыемстваў, загадчыкамі школ, рэктарамі ўніверсітэтаў…»*[9], - прагаворваецца пра свае эканамічныя інтарэсы ўдзельніца моладзевай арганізацыі.

На другім баку - тыя «немаёмныя», што згубілі больш, чым атрымалі ў прыгожым новым свеце, які павінен быў паўстаць пасля 1991 году. Для мільёнаў людзей, зазначае Дэвід Лецін, *«калапс Савецкага Саюзу азначаў… катастрафічнае разбурэнне сацыяльнага жыцця, сацыяльнай бяспекі і статусу ў тым новым грамадстве, якое яны наўрад ці маглі зразумець…»* Генерал у адстаўцы, старшыня ветэранскай арганізацыі тлумачыць: *«Мы галасуем за Савецкі Саюз, бо гэта самае лепшае, што мы бачылі»*[10].

НІСЭПД рэгулярна ладзіць апытанне, каб даведацца пра матэрыяльнае становішча, эканамічныя, палітычныя і грамадзянскія погляды тых, хто галасуе за і супраць прэзідэнта. Удзельнікаў спачатку пытаюць: ці галасавалі б вы за Лукашэнку заўтра? Потым дзве групы (тыя, хто адказалі «так» ці «не») адказваюць на больш канкрэтныя пытанні: ці хапае ім грошай на ежу? на адзежу і абутак? ці працуюць яны ў прыватным сектары або ў дзяржаўным? і г. д. Такім чынам атрымліваецца партрэт апанентаў і прыхільнікаў прэзідэнта. Даследаванне выявіла, што пенсіянеры падтрымліваюць А. Л. больш, чым моладзь; жыхары вёскі больш, чым гараджане; жанчыны больш, чым мужчыны; тыя, хто пражывае на ўсходзе краіны, больш, чым заходнікі; працаўнікі дзяржпрадпрыемстваў больш, чым работнікі прыватнага сектару; бедныя больш, чым заможныя. І розніца складае не два ці тры, а 30 і нават 40 адсоткаў. Прэзідэнту вераць тыя, хто аддае перавагу заробку невялікаму, але стабільнаму перад высокім, але негарантаваным; планавай эканоміцы перад рынкавай; рэгуляваным цэнам перад свабоднымі. Яны нават згодныя, как выбар тавараў у краме быў невялікі, але каб хапала грошай іх купляць. Увогуле, яны мараць пра Савецкі Саюз...

Якое дачыненне да ўсяго гэтага маюць жанчыны? Ці ёсць гендэр у гэтых лічбах? Яшчэ колькі: толькі анёлы нябесныя не маюць полу; усе ж астатнія - бізнесоўцы і беспрацоўныя, прастытуткі і міліцыянты, заможныя і бедныя - мужчыны альбо жанчыны. Калі ўважліва паглядзець на лічбы, пашукаць дадатковую статыстыку і правесці некаторыя ментальныя аперацыі, робяцца відавочнымі дзве рэчы. Па-першае, катэгорыі «жанчыны» і «бедныя» ў значнай ступені супадаюць: у пераходнай эканоміцы бедных жанчын больш, чым мужчын.

9. Наша Ніва. 2000. 26 чэрвеня.

10. Народная воля. 2001. 23 чэрвеня.

Другое: жанчыны ў большай ступені, чым мужчыны, разлічваюць на дзяржаву як сродак атрымання жыццёвых рэсурсаў.

Згодна са звесткамі Нацыянальнай справаздачы па статусе жанчын, падрыхтаванай для ААН, радыкальнае пагаршэнне эканамічнага статусу пасля 1991 г. закранула жанчын больш, чым мужчын. Напрыклад, у 1996 г. (калі рыхтавалася справаздача) найменшы заробак для мужчын вагаўся паміж 105 і 390 тысячамі беларускіх рублёў, а найвышэйшы - паміж 900 і 13578; суадносныя лічбы для жанчын былі адпаведна паміж 50 і 345 ды 750 і 5000[11] . Жанчыны складалі 81,4 % беспрацоўных у 1992 г. і 63,8 % у 1996. Сярэдні перыяд беспрацоўя ў жанчын таксама даўжэйшы, чым у мужчын.

Фармальна, мацнейшая жаночая беднасць ёсць вынікам розных жаночай адаптацыі да новай сітуацыі: жанчыны часцей спяшаюцца паводзіць сябе як актыўныя ўдзельнікі рынкавых зносін і не робяць дастатковых крокаў да паляпшэння свайго становішча. Яны рэдка працуюць на некалькіх работах, радзей распачынаюць свой бізнес альбо мяняюць прафесію. Журналісты любяць гэта тлумачыць «жаночай псіхалогіяй», адсутнасцю жадання рызыкаваць, нерашучасцю альбо нежаданнем у наяўнасць у сабе неабходных навыкаў. Але ў чым сапраўдная прычына таго «вольнага выбару», праз які мужчыны шукаюць працу, дзе лепей плацяць, а жанчыны - дзе гнуткі працоўны дзень (бо непраўдападобна, каб яны фармулявалі сваю мэту як «хачу працаваць там, дзе мала грошай»)?

Рынкавая канкурэнцыя і ліберальная дэмакратыя паўтаюць на ўяўленні пра свабодных, незалежных, аўтаномных агентаў, і лібералізм доўга лічыў такія якасці «ўніверсальнымі». Але яны паўстаюць з пэўнага досведу і магчымасцяў. У жыцці жанчыны амаль ніколі не бываюць такімі ж аўтаномнымі, як мужчыны; яны не свабодныя для канкурэнцыі і рызыкі ў такой самай ступені. Праз сваю (сацыяльна сканструяваную) ролю ў фізічным і культурным узнаўленні, г. зн. у працы, без якой чалавецтва існаваць не можа, праз сваю адказнасць за дзяцей і догляд старых жанчыны не маюць той самай «свабоды», што і мужчыны, для ўдзелу ў рынку. Без гэтай бясплатнай працы дзяржаўны бюджэт выглядаў бы зусім інакш.

11. Women of Belarus: Seen Through the Gender Lens. National Report, UNDP, Minsk, 1997. P. 32–33.

12. Там самае. С. 36.

Усюды, дзе існуюць сістэмы сацыяльнай бяспекі, жанчыны залежаць ад іх больш, чым мужчыны: яны з'яўляюцца асноўнымі іх спажыўцамі, супрацоўнікамі (гэта дзяржаўны сектар эканомікі, дзе нізкія заробкі, але пэўныя гарантыі), а таксама адказнымі за ўзаемадзеянне сям'і з гэтай сістэмай. Калі не завесці дзіця да доктара, сістэма медыцынскага абслугоўвання не зможа працаваць, а калі вядзеш да доктара - адсутнічаеш на працы. Рынку такі працаўнік нявыгадны, таму што галоўная рынкавая мэта - атрыманне найвышэйшага прыбытку. Калі пасля 1991 г. сістэма сацыяльнай бяспекі пачала разбурацца, жанчыны і старыя - тыя, хто ад гэтай сістэмы залежаў у найбольшай ступені, - імгненна зрабіліся «беднымі». Іх шанцы паспяхова «ўвайсці» ў рынак былі абмежаваны нявыгаднымі стартавымі пазіцыямі. Згодна з некаторымі звесткамі канца 90-х, у Беларусі ўласны бізнес распачалі 9,1 % мужчын і толькі 2,7 % жанчын. Хаця гэтыя лічбы прыблізныя (не ўключаюць ценявога рынку), яны даюць уяўленне пра суадносную колькасць жанчын і мужчын у бізнесе: розніца складае 3,5 разу. Сацыёлаг Эрык Шыраеў у артыкуле пра маёмасную няроўнасць у новай Расіі піша, што «большасць маладых прадпрымальнікаў, банкіраў і гандляроў нерухомасцю… стартавалі ўнутры старога савецкага грамадскага і палітычнага істэблішменту», г. зн. належалі да савецкай, партыйнай альбо камсамольскай наменклатуры, у якой было вельмі мала жанчын. Калі пасля 1991 г. з'явіліся новыя эканамічныя магчымасці, жанчынам, якіх нямала было сканцэнтравана ў ніжэйшых сектарах эканомікі ці на ніжэйшых пазіцыях, вельмі хутка зрабілася зразумела, што ў той гендэрнай структуры, якую выпрацоўвае рынак, у іх вельмі мала шанцаў для вертыкальнай мабільнасці, тым часам як былых сацыяльных гарантыяў таксама больш не існуе.

У дадатак да гэтага, постсавецкі рынак у значнай ступені набывае форму ценявой, альбо нефармальнай, эканомікі. У пераходны перыяд яна служыць пэўным «буферам», які трошкі змякчае ўдары рынку, бо дае магчымасць атрымліваць дадатковыя рэсурсы. Не для ўсіх, аднак, гэты буфер аднолькава добры: «слабыя» (напрыклад, адзінокія жанчыны з дзецьмі) атрымліваюць горшы вынік ад свайго ўкладу ў нефармальную эканоміку (прыбіранне кватэр і г. д.), чым моцныя (спекуляцыі

гарэлкай). Сістэма «аб'ектыўна» працуе так, што багатыя робяцца больш багатымі, а бедныя - больш беднымі, але гэтая няроўнасць не трапляе ў статыстыку заработнай платы. Непразрыстаць ценявога рынку дазваляе схаваць існую эксплуатацыю, і ўплываць на сітуацыю можа толькі дзяржава, якая праз падаткі альбо іншыя механізмы можа перараз мяркоўваць рэсурсы.

Мужчыны і жанчыны па-рознаму ставяцца да ролі дзяржавы ў эканоміцы: жанчыны разлічваюць на яе ў значна большай ступені і паводзяць сябе абсалютна рацыянальна, калі галасуюць за праграмы, якія абяцаюць ім як маці (невядома, наколькі рэалістычна) некаторую сацыяльную абарону праз перападзел рэсурсаў. А. Л. зрабіў сацыяльнае забеспячэнне «як у СССР» значнай часткай сваёй унутранай палітыкі і папулісцкай рыторыкі, і пэўныя сацыяльныя каштоўнасці трапілі «ў адзін флакон» з палітычнымі (спосабам арганізацыі дзяржаўнай ўлады):

Женщин в парламенте не должно быть меньше 30–40 процентов. Тогда парламент будет стабильным, спокойным. От женщины всегда исходит доброта. И остальная часть мужиков будет хорошо работать. Поэтому я буду всячески поддерживать тенденцию на большее присутствие в парламенте женской части нашего общества. Попрошу и органы власти на местах поддерживать эти процессы, и мужиков-депутатов, которые окажутся в округе вместе с женщинами, чтобы они, может, даже и уступили, дали возможность женщинам поработать. В Советах женщины должны быть представлены очень широко. Это и фактор стабильности[13] .

На гэтую рыторыку шмат хто купляецца: *«…президент говорит о желаемом соотношении мужчин и женщин в структурах власти. Если мы выйдем на указанные президентом проценты, то у нас сразу повысится индекс человеческого потенциала»*[14]. На самай справе індэкс чалавечага патэнцыялу павысіўся б толькі тады, калі б павелічэнне колькасці жанчын ва ўладзе было вынікам структурных змен у грамадстве, а не «прызначэння» дэпутатаў зверху.

[13] Послание Президента Республики Беларусь А. Лукашенко Национальному собранию и белорусскому народу.

Палітычны выбар ідзе, у рэшце рэшт, праз спосаб размеркавання рэсурсаў (праз адміністрацыйную сістэму ці рынак); але праблема, якая ляжыць у яго падмурку, да канца ў справе абсалютна глабальная, і чалавецтва не ведае сродкаў яе вырашэння: ёсць толькі нейкія спробы, больш ці менш удалыя.

Той (ці тая), хто «займаецца рэпрадукцыяй», не можа свабодна ўдзельнічаць у рынку і, такім чынам, не мае пэўных магчымасцяў. У ідэале, каб няроўнасць не была ўдзелам людзей аднаго полу, рабіць працу па ўзнаўленні (акрамя чыста біялагічных актаў) павінны людзі незалежна ад полу. Але мужчыны не надта імкнуцца браць «адпачынак для дагляду», бо ён вядзе да страты сацыяльнага статусу, г. зн. дэканструкцыі іх мужнасці. Можна наняць іншую жанчыну даглядаць дзяцей, пакуль першая бярэ ўдзел у капіталістычным спаборніцтве; наймітка ў такім разе павінна быць бяднейшай за першую, г. зн. належаць да іншага класу. Што рабіць гэтай іншай, калі яна захоча нарадзіць дзіця (якое грамадству вельмі патрэбна)? Што кажа пра гэта лібералізм? Статыстыка ж кажа, што «іншая жанчына», што працуе ў доме першай, - нелегальная эмігрантка: філіпінка, мексіканка альбо «руская» (беларуска, украінка, румынка), часта з вышэйшай адукацыяй і нават вучонай ступенню.

Ёсць іншы шлях: аплачаны дэкрэтны адпачынак, амаль бясплатны дзіцячы садок і г. д., але дзеля гэтага трэба вельмі моцна абмежаваць лібералізм. Амаль да сацыялізму. Павялічыць падаткі, а потым іх сабраць. Але для той, што жыве на дзяржаўную дапамогу, роўнасці ўсё роўна няма: яна не ўдзельнічае ў працэсах абмену і, такім чынам, не ёсць аўтаномным, свабодным суб'ектам...

Іншых шляхоў вырашэння праблемы не бывае. А без рэпрадукцыі чалавецтва існаваць не можа. Вось тут яно спатыкнулася: самае простае пытанне аказалася і самым складаным...

ЗАМЕСТ ЗАКЛЮЧЭННЯ: НЕ ШУКАЙЦЕ ЖАНЧЫНЫ

Чаму ж наша апазіцыя столькі год не хоча бачыць гэтай

відавочнай «класавай» праўды, часткай якой ёсць «жаночае пытанне»? Чаму лічыць бабку Ганну з калгасу «Новы шлях» крэйзанутай, калі тая хоча гарантаванай пенсіі, якую яна страціла менавіта пры «рынку»? Яна паводзіць сябе абсалютна рацыянальна, калі галасуе за той рэсурс, праз які атрымлівае паляпшэнне свайго становішча. «Еўропа», што здаецца маладым інтэлектуалам сімвалам капіталістычнага дабрабыту і дэмакратыі, увасабляе для яе тое, што знаходзіцца па-за межамі рэальнага: падарожжы туды нават не з'яўляюцца аб'ектам яе жадання, бо даступныя, у яе уяўленні, толькі новым багатырам і толькі таму, што яны робяць гэта за кошт простага люду. Яна мае рацыю...

У Славоя Жыжака ёсць эсэ пра Ота Вайнінгера і яго кнігу «Пол і характар», упершыню надрукаваную ў 1904 г. Як вядома, праз кароткі час пасля яе выхаду ў свет аўтар, зусім яшчэ малады чалавек, забіў сябе. Кніга Вайнінгера прысвечана доказу таго, што жанчына ніколі не кажа праўду і ўвогуле «не існуе». Яна не мае незалежнай ідэнтычнасці, а заўсёды ёсць адлюстраваннем мужчыны, жыве ягонымі інтарэсамі і імкнецца яму спадабацца. Усё яе жыццё накіравана на тое, каб быць побач з мужчынам: без яго яна гіне. Яна ніколі не кажа праўды, нават тады, калі сама верыць, што кажа яе, бо заўсёды кажа тое, што хоча пачуць яе «пігмаліён»: праўда для яе не нешта аб'ектыўнае, а тое, што патрэбна ёй у дадзены момант. Але тут, піша Жыжак, адбылося нечаканае: аўтар зразумеў, што менавіта жанчына якраз існуе, бо мае адну сапраўдную, канчатковую матэрыяльную мэту, якой падпарадкоўвае ўсё свае жыццё. Яна не хлусіць, бо ідзе ў сваім «продажы» да канца: яна ведае, чаго хоча, і ўжывае рацыянальныя сродкі, каб гэта атрымаць. Мужчына ж толькі верыць, што кажа праўду і што яна аб'ектыўная. На самай справе ён яе ўяўляе (пра «адсутнасць» мужчыны пазней пісаў і Лякан).

І вось, як у іншых бывае - «гаманок ці жыццё», так у Вайнінгера выйшла - гэтая з'яўленая яму праўда ці жыццё. Зразумеўшы гэта, ён не змог з той праўдай жыць.

НЕ шукайце жанчыны як тлумачэнне сваіх праблем. Прычына таго, што вас няма, не ў ёй.

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/1/16
[image]

[redacted]ізм

[image]
ARCHE Пачатак № 4 (33) - 2004
[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]
[image] [image] [image] [

ўвогуле
нічога не
было чуваць.
Сёньня на
Захадзе
любы, хто
хоць бы
нешта ведае
пра
Беларусь,
пры згадцы
аб нашай
краіне
найперш
прыгадае
«дыктатара
Лукашэнку».
Мэта гэтага
нарысу –
адлюстраваць
паўсталы на
Захадзе
спэктар
ацэнак
палітычнай
асобы
кіраўніка
Рэспублікі
Беларусі па
выніках
дзесяцігодзьдзя
ягонага
панаваньня.
Трэба
зазначыць,
што з
прычыны
самой
сутнасьці
аўтарытарнага

рэжыму для
заходніх
назіральнікаў
цяжка не
атаясамліваць
палітычную
асобу
прэзыдэнта
РБ зь
дзяржаўнай
структурай,
якую ён
ачольвае.

Уяўленьне аб надзвычай адыёзнай вядомасьці, якую Аляксандар Лукашэнка трывала займеў у заходняй прэсе, можна атрымаць нават з кароткага пералічэньня азначэньняў, якія звычайна ўжываюцца да ягонай асобы ў брытанскіх газэтах «The Times» і «The Daily Telegraph»: *«апошні дыктатар савецкага ўзору ў Эўропе», «найбольш аўтакратычны лідэр у Эўропе», «апошні дыктатар у Эўропе, чыя краіна зрабілася выспай савецкай стагнацыі», «зацяты камуніст, які ўладарыць у апошняй савецкай дыктатуры ў Эўропе»*… Гэткія акрэсьленьні асобы Лукашэнкі – да таго ж, «ворага прэсы» – сталіся агульнай і звычайнай зьявай у друку па абодва бакі Атлянтыкі. На працягу дзесяцігодзьдзя імя Лукашэнкі фігуравала ў навінах зь Беларусі пераважна ў сувязі з рэпрэсіямі супраць прэсы, тэрарызаваньнем дзеячоў апазыцыі, выбарчымі фарсамі ды рознымі ашаламляльнымі для заходніх назіральнікаў палітычнымі ўчынкамі і выказваньнямі.
Але А. Лукашэнка далёка не адразу здабыў такую адмоўную міжнародную рэпутацыю. Ніхто на Захадзе спачатку не шукаў звадаў з новым кіраўніком Беларусі, як і ніхто не сьпяшаўся «дэманізаваць» ягоную асобу, а некаторыя нават і пасьля шматлікіх скандальных крокаў беларускага прэзыдэнта ўва ўнутранай і замежнай палітыцы ставіліся да яго вельмі некрытычна. Пра заходнюю цярплівасьць сьведчыць і такі амаль анэкдатычны выпадак. Пэўны дыплямат адной невялікай заходнеэўрапейскай краіны, якая ў часе свайго прэзыдэнцтва ў Эўразьвязе мелася заняцца «праблемай Беларусі» і шукала да

яе новых падыходаў, дыскутуючы на канфэрэнцыі, вылучыў прапанову, што, маўляў, паколькі Эўропа цешыцца са сваёй разнастайнасьці – то і Лукашэнку трэба не адштурхоўваць, але ў рэчышчы эўрапейскай талерантнасьці ды права на адрознасьць прыняць у агульнаэўрапейскую сям'ю. Вядома, навіны пра нялюдзкае абыходжаньне рэжыму Лукашэнкі з палітычнымі апанэнтамі ды незалежнай прэсай, а таксама кампрамэтуючыя міжнародныя сувязі даволі хутка заслужылі яму крытычныя камэнтары ў заходніх СМІ; аднак у шырэйшых колах, якія займаюцца палітычнай ацэнкай, спэктар стаўленьня да асобы Лукашэнкі яшчэ нядаўна вызначаўся істотна большай неадназначнасьцю.

СУЦЯШЭНЬНЕ САЦЫЯЛІСТАЎ

Пэўныя інтэлектуальна-палітычныя колы, асабліва ў «старых» краінах Эўразьвязу, схіляліся да досыць лагоднага – а часам папросту некрытычнага – стаўленьня да Лукашэнкі. Гэткае яго ўспрыманьне грунтавалася пераважна на іх ідэалягічнай прыхільнасьці да пэўных элемэнтаў таго, што – у вэрсіі беларускага рэжыму – складала ягоную палітыку, а менавіта – да сацыяльна-эканамічнай «мадэлі» і пазыцыі супраць пашырэньня NATO.

Зрэшты, пачатковая дзейнасьць беларускага прэзыдэнта выклікала больш-менш прыязнае стаўленьне даволі шырокага спэктру эўрапейскіх левых. Праявы гэтага можна было ўбачыць у выказваньнях некаторых эўрапейскіх палітыкаў сярэдзіны і нават другой паловы 1990-х, у публікацыях шэрагу недзяржаўных арганізацыяў ды, часам, у акадэмічнай літаратуры. Гэткія дадатныя выказваньні сталіся, аднак, значна радзейшымі пасьля 1997 году з прычыны выразнага пагаршэньня ў Беларусі сытуацыі з правамі чалавека, канфлікту рэжыму зь міжнароднымі прафсаюзнымі арганізацыямі ды часта цытаванай у заходняй прэсе сэнтэнцыі Лукашэнкі пра станоўчыя бакі дзейнасьці Гітлера.

На фоне глыбокай дэмаралізацыі заходняй левай палітычнай думкі ў выніку каляпсу мадэлі сацыялістычнага грамадзтва ў Сярэдне-Ўсходняй Эўропе ды СССР постаць Лукашэнкі выклікала зь яе боку прыхільную цікаўнасьць – як да дзяржаўнага кіраўніка «неэлітнага» паходжаньня, прыведзенага

да ўлады галасамі шырокіх масаў насельніцтва, які ледзьве не адзін афіцыйна паўстаў супраць экспансіі капіталізму ды пашырэньня NATO на постсацыялістычную прастору. Гэтым колам Лукашэнка ўяўляўся жывым доказам таго, што капітуляцыя сацыялізму перад «сіламі капіталу» не была гістарычна непазьбежная і што пры наяўнасьці адпаведнай палітычнай волі моцны лідэр можа захоўваць або нават і аднаўляць элемэнты сацыялістычнага ладу ў адной асобна ўзятай краіне ды супрацьстаяць ціску NATO – гэтага ваенна-палітычнага блёку капіталізму.

Найбольшую прыхільнасьць у левых заходніх колах здабылі Лукашэнку ягоныя (рэальныя ці ўяўныя) заслугі ў недапушчэньні эканамічнай няроўнасьці і росту сацыяльнага расслаеньня паміж багатымі й беднымі, а таксама заслугі ў забесьпячэньні сацыяльнай бясьпекі для насельніцтва Беларусі. Такія аспэкты віталіся ў публікацыях, напрыклад, нямецкага «Таварыства за абарону грамадзкіх і чалавечых правоў». Але, мусіць, самымі крайнімі формамі ўхваленьня дзейнасьці Лукашэнкі праславілася на Захадзе недзяржаўная арганізацыя «Брытанская Гельсынская група па правох чалавека». Яе прадстаўнікі на працягу колькіх гадоў узносілі хваласьпеў Лукашэнку з нагоды захаваньня ім сваёй краіны ад «найгоршых спусташэньняў», ад якіх у выніку капіталістычных рэформаў пацярпелі суседнія зь Беларусяй дзяржавы. За Лукашэнкам прызнавалася заслуга захаваньня Беларусі па-за кантролем сьвету капіталу, што, маўляў, і сталася галоўнай прычынаю варажнечы ды ціску на яго з боку NATO, пашырэньне якога ў Сярэдняй і Ўсходняй Эўропе, паводле прадстаўнікоў гэтай недзяржаўнай арганізацыі, прыводзіцца ў рух «заходнімі эканамічнымі інтарэсамі»[1].

Даволі некрытычныя – хаця й больш асьцярожныя – адносіны палітычнай асобы кіраўніка Беларусі з увагі на згадоны сацыяльную дамінанту ў ягонай палітыцы можна бачыць і ў акадэмічнай літаратуры. Дыскусія там зводзіцца пераважна да таго, што Лукашэнка, які дзейнічае згодна з сапраўднымі сацыяльна-эканамічнымі інтарэсамі насельніцтва і дасягае пільнуе інтарэсаў найслабейшых сацыяльных групаў, карыстаецца рэальнай падтрымкай масаў насельніцтва Беларусі. А таму, маўляў, ня варта занадта зважаць на тое, што праявы гэтай сапраўднай народнай падтрымкі – мажліва, і

[1] Laughland, John. The Plague States: The New German Hegemony and the Decline of Democracy. London: Verso, 2015.

Лукашэнка як палітык акурат рэалізуе – у Беларусі ня цалкам, адпавядаюць звыклым для Захаду формам і інстытуцыйным нормам, якія таксама няма падставаў абсалютызаваць.

like Belarus, unpublished. *The Guardian*, November 22, 2002.

СУМНАЯ АНАЛІТЫКА

Тым ня менш, погляды такога кшталту паступова сыходзілі на маргінэс у меру таго, як улада Лукашэнкі набывала рысы рэжыму ня проста аўтарытарнага, але й жорстка рэпрэсіўнага – у тым ліку й да інтарэсаў працоўных. Сёньня на Захадзе фактычна агульнапрыняты погляд, што адказнасьць за ўнутрыдзяржаўную рэпрэсіўную палітыку, а таксама за складаныя дачыненьні Беларусі з заходнімі краінамі нясе асабіста Лукашэнка. У сучаснай паліталягічнай і аналітычнай літаратуры цяжка знайсьці спачувальныя ацэнкі палітычнай асобы беларускага прэзыдэнта.

Істотная доля датычных Беларусі публікацыяў робіцца на Захадзе праваабарончымі арганізацыямі. Усе ўплывовыя заходнія арганізацыі ў галіне абароны правоў чалавека выдаюць звычайна засяроджаныя на канкрэтных інцыдэнтах аналітычныя матэрыялы, нязьменна надзвычай крытычныя да Лукашэнкі. У якасьці ілюстрацыі погляду праваабаронцы зь вялікім досьведам працы працытуем Малкольма Хокса, які падсумоўвае вынікі панаваньня Лукашэнкі: *«Пад аўтарытарным кіраваньнем прэзыдэнта Аляксандра Лукашэнкі Беларусь ператварылася ў дзяржаву, дзе панаваньне закону і павага да чалавечых правоў былі адкінутыя ў мэтах здушэньня іншадумства і парушэньня фундамэнтальных чалавечых правоў»*[2].

Як прыклад ацэнак аналітыка з досьведам працы ў дзяржаўных установах можна прывесьці меркаваньні Тэрэзы Думаісоўлой супрацоўніцы брытанскага Міністэрства замежных справаў. Як яна зазначае, з пачаткам прэзыдэнцтва А. Лукашэнкі наладжаныя раней дачыненьні з Эўрапейскім Зьвязам стаў «занепадаць». Гэтак, *«маштаб супрацоўніцтва паміж Беларусяй і ЭЗ цяпер мінімальны, а дыялёг – складаны»*. Як тлумачыць аўтарка, *«гэты заняпад у дачыненьнях выкліканы не інтэграцыяй з Расеяй»*, прычынаю яго сталіся *«хутчэй унутраныя*

[2] Hawkins, Mad, Bad (2002). Republic of Belarus: Elegant Dictatorship?» in: Агр. Lewis, ed.:

антыдэмакратычныя падзеі ў Беларусі, якія крытыкаваў ЭЗ, ды выразна антызаходні характар замежнай палітыкі Лукашэнкі». Добрыя дачыненьні з Захадам, як вынікае далей, фактычна сталіся ахвяраю цяперашняй беларускай маскоўскай эканамічнай мадэлі, бо *«Лукашэнка ставіцца з падазронасьцю да заходніх фінансавых установаў… [вонкавую дапамогу]. ён успрымае як заходняе «ўмяшальніцтва» ўва ўнутраныя справы Беларусі»*. Таксама Лукашэнка ў прапагандысцкіх мэтах перабольшвае ваенную «пагрозу» з боку Захаду[3] – што, натуральна, не магло паспрыяць далейшай прыязнасьці з ЭЗ. Падобныя ацэнкі выказваюцца і іншымі эўрапейскімі аналітыкамі. Роб ван дэ Ватэр і Ян Марынус Віерсма, пішучы пра дачыненьні Беларусі з Эўрапейскім Парлямэнтам, зазначаюць, што *«рэжым прэзыдэнта Лукашэнкі стаўся пры сярод дэмакратычных нацыяў і інстытуцыяў Эўропы»*. Але найбольш жорсткія азначэньні Лукашэнкі паходзяць з ЗША: напрыклад, дзяржсакратар Колін Паўэл ахарактарызаваў беларускага кіраўніка як «самотнага ізгоя ў Эўропе».

Нарэшце, і ў акадэмічнай літаратуры крытычная ацэнка кіраўніка Беларусі цяпер стала практычна агульнапрынятай. У якасьці прыкладу можна разгледзець ацэнкі прафэсара гісторыі ўнівэрсытэту Альбэрты (Канада) Дэвіда Марплза, аўтара вялікай колькасьці публікацыяў, прысьвечаных найноўшай гісторыі і бягучай палітыцы Беларусі. Найбольш «лагодная» тэза, якую знаходзім у ягонай пазалеташняй публікацыі, – што

«The EU and Belarus: Between Moscow and Brussels». P. 86.

3 Dumasy, Teresa (2003) «Belarus's relations with the European Union: a Western Perspective», in: Elena A. Koresteleva, Colin W. Lawson and Rosalind J. Marsh, eds: «Contemporary Belarus: Between Democracy and Dictatorship». P. 179–184.

4 Water, Rob van de, and Wiersma, Jan Marinus (2002) «The European Union – and

пры параўнаньні рэжыму Лукашэнкі зь сярэднеазіяцкімі рэжымамі першы можа выйграваць:

Напэўна, рэжым Лукашэнкі трэба разглядаць у постсавецкім ракурсе. Яго лягчэй параўнаць з рэжымамі, якія існуюць у Сярэдняй Азіі, чымся ў іншых эўрапейскіх былых савецкіх рэспубліках, адно ён [беларускі рэжым] нашмат менш карумпаваны, чым рэжымы ў такіх краінах, як Узбэкістан і Казахстан[5].

Агляд характарыстык, дадзеных дзейнасьці Лукашэнкі самым аўтарам сёлета, выяўляе тэндэнцыю да іх паляпшэньня: *«Галоўная рыса прэзыдэнцтва Лукашэнкі – гэта пануючая здольнасьць падабацца пэўным сэктарам электарату – сялянству, старэйшаму пакаленьню і вайскоўцам»*. Як палітычная асоба Лукашэнка атрымаў азначэньне чалавека «дробязьлівага і помсьлівага», «апантанага ўладаю» і гатовага ахвяраваць амаль усім, каб застацца на пасадзе. Таму ён, як падсумоўвае аўтар, вызначыць найвышэйшую мэту ягонага лідэрства.

Замежнапалітычная дзейнасьць Лукашэнкі таксама заслугоўвае мала пахвалы. З аднаго боку, Лукашэнку пасуюць такія азначэньні, як «прыхільнік міжнародных аўтсайдэраў», асабліва зрынутых дыктатараў накшталт Слабадана Мілошавіча або Садама Хусэйна. З другога боку, Лукашэнка сам стварыў сытуацыю, калі яго далейшае знаходжаньне ля ўлады сталася залежным пераважна ад Расеі. Выснова прафэсара Марплза: *«Цяжка перабольшыць тую шкоду, якую прэзыдэнцтва Лукашэнкі нанесла беларускаму дзяржавабудаўніцтву»*.

ФІДЭЛЬ, ЯКІ НЕ АДБЫЎСЯ?

Сёньня цяжка сказаць, ці можа імідж Лукашэнкі на Захадзе падлягаць «рэабілітацыі». Вядома, на Захадзе знойдуцца тыя, хто зноў узяўся б сьцьвярджаць, што Лукашэнка нічым прынцыпова ня горшы за заходніх палітыкаў: маўляў, і прэзыдэнт Ніксан незаконна падслухоўваў сваіх апанэнтаў, дэ Голь быў аўтарытарным кіраўніком, а цяперашні прэзыдэнт Дж.

5 Marples, David R. (2002) «The Last European Dictatorship?» in: Ann Lewis, ed.: «The EU and Belarus: Between Moscow and Brussels».

Буш прыйшоў да ўлады ў выніку сумнеўнага падліку галасоў. Аднак нікога зь іх не вінавацілі ў забойствах сваіх палітычных супернікаў. Таму, калі толькі Лукашэнка ня знойдзе спосабу пераканаўча давесьці сваю недатычнасьць да вядомых зьнікненьняў, немагчыма ўявіць, як можа быць папраўлена яго маральна-палітычная рэпутацыя ў вачох заходняй палітычнай супольнасьці – ня важна якой ступені «левізны» або прагматычнага цынізму.

Аналізуючы вынікі дзесяцігодзьдзя яго прэзыдэнцтва, добра паразважаць пра пэўны «змарнаваны патэнцыял», які пры больш разумным абыходжаньні мог бы быць скарыстаны Лукашэнкам на заходняй палітычнай сцэне. А менавіта, беручы пад увагу сымпатыі да Лукашэнкі з боку заходняй лявіцы, можна запытацца: ці мог бы Лукашэнка – як кіраўнік адзінай у Эўропе краіны, што афіцыйна абвяшчае сваім сацыяльна-эканамічным ладам «рынкавы сацыялізм», – стацца сымбалічнай фігураю рэгіянальнага ці нават усеэўрапейскага левага руху, сымбалем «левай альтэрнатывы» капіталізму, падобна да Фідэля Кастра?

Як ведаем, гэтага не адбылося, але не з прычыны адмоўнага заходняга ўспрыманьня Лукашэнкі. Так, тэзы недапушчэньня сацыяльна-эканамічнага расслаеньня, прыярытэт сацыяльнага перад нацыянальным, супрацьстаяньне сілам капіталу ды пашырэньню NATO знаходзяць у эўрапейскіх колах левай арыентацыі прыхільнасьць. Аднак Лукашэнка, у той самы час, не сугучны, напрыклад, з такім важным складнікам ідэалёгіі сучаснага левага руху, як антыглябалізм. Далей, ягоная апазыцыя да NATO зусім ня тоесная пазыцыі антываеннага руху, што важна для «лявіцы». У дадатак, уціск свабодных прафсаюзаў і тым самым абмежаваньне правоў людзей працы адносна працадаўцы таксама ставіць пад пытаньне шчырасьць «сацыяльнай сутнасьці» ягонай мадэлі.

Гэта паказвае на прынцыповую прычыну змарнаваньня Лукашэнкам сымпатыяў эўрапейскіх левых. З свайго боку, Захад мае справу з разнастайнымі фігурамі – ад афрыканскіх да лацінаамэрыканскіх і азіяцкіх, прычым даволі рознай палітычнай рэпутацыі, – і ён ня стаў бы гэтак адрынаць

Лукашэнку ані за ягоную «сацыялістычнасьць», ані за прарасейскасьць. Але лёгка заўважыць своеасаблівы парадокс: як крытыкі, так і прыхільнікі Лукашэнкі на Захадзе называлі і ўспрымалі яго як зьяву «in Europe» (напрыклад, «апошняга дыктатара ў Эўропе»), тым часам як сам ён не разглядае сябе элемэнтам менавіта гэтага кантэксту, а ў сваім сьветаўспрыманьні належыць да зусім іншай прасторы. Эўрапейскія левыя, можа, і ня супраць былі б вітаць Лукашэнку як рэгіянальнага лідэра «сацыялістычнай альтэрнатывы» – толькі сам Лукашэнка не ўважае Эўропу «сваёй» палітычнай прасторай. Ён ня бачыць сябе ў такім дачыненьні: ён засяроджаны на былой савецкай прасторы і ня робіць ніякіх спробаў шукаць палітычнага капіталу ў Эўропе.

Дзеля справядлівасьці варта дадаць, што, нават актыўна прэтэндуючы на ролю рэгіянальнага лідэра «сацыялістычнай альтэрнатывы», наўрад ці было б магчыма захаваць такую «сацыяльную» мадэль без самаізяляцыі ад яе «капіталістычнага» асяродзьдзя і без рэпрэсіўных захадаў знутры (што, зрэшты, праўда і ў выпадку рэжыму Фідэля Кастра) ды без апоры на рэсурсы аднабаковых дачыненьняў з Расеяй звонку. Аднак разгляд «змарнаваных магчымасьцяў» пры пошуку больш дадатнага іміджу для Лукашэнкі ў Эўропе дае нагоду яскрава вылучыць важную супярэчнасьць паміж заходнім поглядам на беларускага кіраўніка і ягоным уласным палітычным самаўспрыманьнем. Як зазначана вышэй, праф. Марплз настойвае на разглядзе прэзыдэнцтва Лукашэнкі менавіта ў постсавецкім кантэксьце, прычым сярод краін, якія да Эўропы маюць малое дачыненьне (Узбэкістан, Казахстан). Тым часам важная прычына асаблівай крытычнасьці да Лукашэнкі з боку бальшыні заходніх камэнтатараў грунтуецца на ўяўленьні пра яго як пра зьяву ў сёньняшняй Эўропе – у кантэксьце якой *такі* рэжым выглядае сапраўды вельмі пачварна. З другога боку, сталыя скаргі прадстаўнікоў РБ на «двайныя стандарты» ў заходніх ацэнках Лукашэнкі, відавочна, сьведчаць таксама пра тое, што сам лідэр менскага рэжыму бачыць сябе ў зусім іншай палітычнай прасторы – у кантэксьце, якому ўласьцівыя зусім іншыя нормы і прынцыпы, – а таму напал заходняй крытыкі яму шчыра падаецца несправядлівым. Бяда ў тым, што, ізаляваўшыся ад Захаду і сапраўды

пазбавіўшы яго эфэктыўных спосабаў уплыву, Лукашэнка выракся і спосабаў якога-колечы адваротнага ўплыву на Эўропу.

ПАЖАДАНА ЎВАЖАЦЬ НЯІСНЫМ

Хоць, магчыма, ня ўсе на Захадзе сярод левых страцілі надзею знайсьці глыбіню і пэрспэктыву ў беларускім кіраўніку, бальшыня назіральнікаў, відавочна, прыйшла ўжо да адназначнай высновы, што фэномэн Лукашэнкі проста ня варты таго, каб надалей прысьвячаць яму шмат увагі.

Па-першае, Захад практычна зьняверыўся ў пэрспэктыве наладзіць з рэжымам Лукашэнкі канструктыўныя дачыненьні. Гэты погляд грунтуецца на досьведзе 10 гадоў, які сьведчыць пра немагчымасьць памысна мець справу зь беларускім кіраўніком.

Адным з аспэктаў тут можна назваць адназначны нэгатыўны досьвед у адносінах Захаду з Лукашэнкам, што – з гледзішча Захаду – мусіць сьведчыць пра пасьлядоўную незацікаўленасьць кіраўніка РБ у паляпшэньні ўзаемадачыненьняў. Сапраўды, пасьля 10 гадоў знаходжаньня Лукашэнкі пры ўладзе, здаецца, ніхто на Захадзе цяпер не сумняецца ў ягоных асабістых палітычных здольнасьцях, сьведчаньнем якіх зьяўляецца стварэньне даволі стабільнай палітычнай і сацыяльна-эканамічнай мадэлі (хай сабе й збудаванай на палітычным уціску ды эканамічным гвалце пры падтрымцы з Крамля) у мэтах падмацаваньня сваёй улады. Беручы пад увагу гэткую стабільнасьць, можна нават дапусьціць, што – прынамсі на ранейшых этапах – многія прагматычныя заходнія палітыкі былі б схільныя «заплюшчыць вочы» на ўсялякія «своеасаблівасьці» рэжыму, калі б толькі з Лукашэнкам атрымалася мець партнэрскія дачыненьні. Але ўсе спробы эўрапейскіх структураў заахвоціць Лукашэнку да ўзаемных «малых крокаў», да нармалізацыі адносінаў не сустрэлі дадатнай рэакцыі. Зрэшты, як зазначаюць эўрапейскія назіральнікі, ня толькі ЭЗ меў праблемы з рэжымам Лукашэнкі. Дзейнасьць Кансультацыйна-наглядальнай групы АБСЭ, адмыслова створанай для сталага маніторынгу і кантактаў,

кансультаваньня ў канкрэтных аспэктах, для працы «на месцы», з увагай на мясцовыя акалічнасьці, таксама не дасягнула чаканага плёну. Нават брытанскі сацыялістычны палітык Тэры Дэвіс – на працягу доўгага часу ўплывовы прыхільнік «неканфліктных» паводзінаў Захаду адносна менскага рэжыму – урэшце прызнаў, што спробы дыялёгу з Лукашэнкам сапраўды «выдыхнуліся». Агулам, для заходніх назіральнікаў адназначна выглядае, што ў беларускай сытуацыі «ўдзел міжнароднай супольнасьці даў мала ў сэнсе канкрэтных вынікаў»[6].

Яшчэ адным аспэктам таго, чаму Захад займеў такое стаўленьне да рэжыму, ёсьць расчараваньне ў самой здольнасьці Лукашэнкі да выпраўленьня дачыненьняў з Захадам, пачынаючы з належнага ўсьведамленьня іх неабходнасьці. Як прызнае большасьць заходніх камэнтатараў, пэўныя адметнасьці самой асобы Лукашэнкі сталіся адной з галоўных прычынаў ператварэньня Беларусі ў найбольш «праблемную» краіну ў рэгіёне. Варта згадаць, што ім добра вядомыя распаўсюджаныя меркаваньні, нібыта Лукашэнка мае спэцыфічны тэмпэрамэнт. У прыватнасьці, праф. Марплз згадвае, што ў беларускіх апазыцыйных колах прэзыдэнта часам прэзэнтуюць «як чалавека з сур'ёзным псыхічным разладам». Натуральна, канадзкі аўтар тым не можа зазначыць, што «гэта ня тая галіна, у якой гісторык або палітоляг стане ахвотна рабіць дапушчэньні». Захад на практыцы ўжо пераканаўся, што Лукашэнка здольны на вельмі непрадказальныя крокі, але Захад не ўспрымае іх як паводзіны вар'ята, які не здае сабе справы з таго, што робіць. Як добра падсумаваў адзін заходні назіральнік, якому даводзілася мець з афіцыйным Менскам сталыя і шчыльныя стасункі на працягу доўгага часу, прэзыдэнт РБ у сапраўднасьці ня ёсьць асобай, якая дзейнічае па-вар'яцку: ён дзейнічае пасьлядоўна і на падставе непахіснага ўнутранага пераканаьня ў поўнай слушнасьці таго, што робіць. Гэты аспэкт, маўляў, пазбаўляе Захад магчымасьці дасягнуць плёну ў дачыненьнях з кіраўніком Беларусі.

Зрэшты, «пошук кампрамісу» ды дасягненьне «ўзаемапрымальнае ўгоды» – гэта фундамэнтальныя мэты для

6 J. Hawkes, Malcolm (2002) Republic of Belarus: Beyond the Pale of Dictatorship? in Jan Jarab and Jan Zielonka (eds.): «The EU and Belarus: Between Moscow and Brussels». P. 86

«рынкавага» мысьленьня (як у эканоміцы, так і ў палітыцы), а тым часам у камэнтарах заходніх назіральнікаў заўважаецца ўсьведамленьне таго, што для беларускага кіраўніка гэтыя паняцьці даволі чужыя. Як зазначыла Тэрэза Думасі, *«у вачох некаторых заходніх камэнтатараў Лукашэнка ня мае ані жаданьня, ані здольнасьці да зьменаў»*.

Трэцяя прычына зьмяншэньня на Захадзе ўвагі да Лукашэнкі – гэта прагматычная магчымасьць бясьпечна яго ігнараваць. Пасьля сыходу Мілошавіча Лукашэнка апынуўся ў становішчы адзінага такога непрыемнага для Захаду выключэньня ў цэлай Эўропе. З гэтага вынікае, што Лукашэнка разглядаецца не як лідэр або прыкмета нейкай новай небясьпечнай тэндэнцыі ці пэрспэктывы, а толькі як «перажытак»: як чытаем у праф. Марплза, *«Лукашэнка – гэта анахранізм»*. У такой якасьці, прагматычна разважаючы, ягонаму хаця й непрыемнаму, але «перажыткаваму» існаваньню можна дазволіць сабе не надаваць шмат увагі.

Яшчэ адна падстава для простага ігнараваньня Лукашэнкі – гэта ягоная міжнародная нязначнасьць. У яго не засталося хаўрусьнікаў, а ў саюзе з Расеяй Лукашэнка асуджаны на ролю меншага партнэра. У «саюзе» Расея часам можа зь ім у нейкай ступені лічыцца, але ён ня станецца ініцыятарам «саюзных» захадаў у міжнароднай палітыцы. А нават і па-за кантэкстам «саюзу» на Захадзе вядома, што многія пытаньні можна вырашыць непасрэдна з Масквой «цераз галаву» нясхільнага да кампрамісаў менскага рэжыму. Такім чынам, Захад глядзіць цяпер на зьяву Лукашэнкі зусім безь цікавасьці і дакладна бяз страху, а толькі як на пэўную нязручнасьць: *«Сп. Лукашэнка – гэта непрыемная асоба, якая не асабліва важная. У адрозьненьне ад іншых ізгоеў, ён уяўляе для Захаду не пагрозу, а толькі абразу»*[7].

ПАМІЖ КРАІНАЙ І ЛУКАШЭНКАМ

Як было згадана напачатку, з прычыны самой сутнасьці аўтарытарызму, для Захаду досыць цяжка падзяляць палітычную асобу Лукашэнкі, зьяву ягонага прэзыдэнцтва і тую структуру дзяржаўнай улады, на чале якой ён знаходзіцца.

[7] «The bully of Belarus», *Guardian*, September 11, 2001.

Паводле словаў праф. Марплза, сёньня Рэспубліка Беларусь – гэта *«дзяржава, якая сфармавалася на ўзор і падабенства свайго прэзыдэнта – зь ягонымі слабасьцямі, асаблівасьцямі, яго ўласьцівым вяскоўцу поглядам на жыцьцё»*. Такім чынам, асоба кіраўніка РБ непазьбежна займае цэнтральнае месца ў заходніх разважаньнях пра той характар, які Рэспубліка Беларусь набыла цягам апошніх 10 гадоў.

З выкладзенага вышэй мусіць быць відавочна, чаму прычыны праблемаў Беларусі, якая «сталася карыкатурнай аўтакратыяй»[8], многія назіральнікі схільныя бачыць у асобе Лукашэнкі і што такі падыход, з заходняга пункту гледжаньня, зусім небеспадстаўны. Першае наступства гэтага відавочнае: пэрсаналісцкі характар палітычнага рэжыму ў Беларусі вядзе да таго, што ўся краіна ў сваіх вонкавых дачыненьнях сталася закладніцай пэўнай асобы; характар кіраўніка як «ізгоя» міжнароднай супольнасьці надае выгляд міжнароднага ізгоя і самой апанаванай Лукашэнкам краіне.

Можна, вядома, спрачацца, ці такі погляд на беларускую сытуацыю аналітычна плённы, бо ён здымае «адказнасьць» за тое, што адбылося і адбываецца ў краіне, з адміністрацыйнага апарату ўлады, а таксама зь некалькіх мільёнаў выбарцаў, якія дагэтуль ухваляюць палітыку Лукашэнкі, задаволеныя ягонымі кіраваньнем і, урэшце, уважаюць, што ягонае знаходжаньне ўлады найлепш ці, прынамсі, дастаткова добра адпавядае іх асабістым інтарэсам. А менавіта, такі засяроджаны на асобе Лукашэнкі падыход пакідае ў цені той факт, што гэтыя мільёны больш-менш сьвядома аддалі ўладу таму, хто апэляваў да вузкіх сацыяльных інтарэсаў гэтай часткі насельніцтва краіны. Тым часам увага да гэтай акалічнасьці вядзе да высновы, што справа заахвочваньня беларусаў да іншых – прыязных да Захаду – палітычных альтэрнатываў запатрабавала б актыўнага стварэньня кантраснай з рэжымам Лукашэнкі пэрспэктывы будучыні, якую прыземленае беларускае жыхарства ўспрыняло б як безумоўна прывабнейшую, чым лукашэнкаўскі ідэал гарантаванага пражыцьцёвага мінімуму, вядомы як «чарка і шкварка». Пры гэтым наданьне такой альтэрнатыве рэальнай верагоднасьці ў вачох беларускіх людзей запатрабавала б з боку Захаду прыняцьця пэўных палітычных абавязкаў наконт

[8] Belarus: a Catalogue of Authoritarian Civil Society Caught in a Strangehold»: www.eixct.org, 11/9/2001.

будучыні Беларусі, да фармуляваньня якіх эўрапейскія структуры дагэтуль заставаліся няздатнымі. Праўда, у сьвеце пасьля «11.09» ды ў Эўропе пасьля пашырэньня Эўразьвязу стан рэчаў і дынаміка, у тым ліку эўрапейскай палітыкі ў дачыненьні да Беларусі, можа зьмяніцца – напрыклад, у выпадку, калі зьявіцца непасрэднае палітычнае зацікаўленьне ў гэтай справе з боку ЗША.

[image]

[image]

№ 4 (33) – 2004

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2005/1/17**

[image]

ПЁТР РУДКОЎСКІ ОП

Пётар Рудкоўскі Оп Замкнёнае грамадства і замкнёны розум

Нікога на зямлі не называйце бацькам,
бо адзін ёсць Бацька ваш – Той, што ў небе.

Дабравесце Св. Мацвея 23:9

Перыяд «бескаралеўя» (1991–1994) стаўся для Беларусі перыядам нясмелай, але самастойнай спробы дэмакратызацыі і развіцця нацыянальнага густу. Разам з прыходам да ўлады А. Лукашэнкі была аспрэчана аўтаномія грамадства. Дэмакратыя, вольны рынак, нацыянальныя каштоўнасці – усё гэта надалей мела свой «мінімум», але толькі ў такім вымярэнні і ў такім выглядзе, у якім дазволена магутнай дзяржавай.

ДЗЯРЖАЎНЫ «РЭАЛІЗМ» І ДЗЯРЖАЎНАЯ ІДЭАЛОГІЯ

У першыя гады панавання Лукашэнкі хапала яго

праметэеўскага
іміджу, каб
ва ўмовах
«беспочвенности»
(маральнай і
палітычнай)
даць людзям
нейкае
апірышча.
Не было
асаблівай
патрэбы ў
прапагандзе
канкрэтнай,
сінтэтычнай
ідэалогіі.
Пераважала
прагматычная
рыторыка,
нават,
можна
сказаць,
антыідэалагічная.
Хоць з
першых дзён
прэзідэнтуры
Лукашэнка
надзвычай
часта
з'яўляўся ў
эфіры ды на
старонках
газет і не
грэбаваў
доўгімі
павучальна-
пагражальнымі
прамовамі,
але ўсё ж
гэтыя

прамовы
былі
далёкімі ад
тэарэтычных
спекуляцыяў,
былі
сканцэнтраваны
на
канкрэтных
надзённых
праблемах і
ствараліў
ўражанне
цвярозага
рэалізму.
Пазняковы
прынцыпы
тыпу
«Спачатку
мова, а
потым –
каўбаса»
адштурхоўвалі
сваім
ідэалізмам і
ўтваралі
пэўны
кантраст
Лукашэнкаваму
«рэалізму».
Людзі не
верылі ў
ідэалогію –
ані
савецкую,
ані
нацыяналістычную.

Але з’явіліся чыннікі, якія падштурхоўвалі да пастаноўкі пытання пра дзяржаўную ідэалогію. Варта ўказаць на

наступныя: 1) апазіцыя валодала немалым інтэлектуальным патэнцыялам, а гэта значыла, што інтэлігенцыя ды моладзь будуць альбо схіляцца да апазіцыі, альбо прынамсі ёй сімпатызаваць; таму паўстала патрэба стварыць інтэлектуальную процівагу; 2) бадай адзінай катэгорыяй сярод інтэлектуалаў, гатовай безагаворачна падтрымліваць Лукашэнку, выявіліся панславісты ды кансерватыўныя марксісты; таму забяспечыць іхнюю дамінацыю ў беларускай наасферы ды заручыцца іх ідэалагічнай падтрымкай стала безумоўна мэтазгодным; 3) панславісцка-камуністычная ідэалогія не толькі гатовая прапагандаваць веру ў новы абсалют – прэзідэнта, сімбіятычна зжытага з народам, але, як высвятляецца, можа выконваць функцыю неблагога опіуму для народу, паколькі эканамічную і грамадска-культурную адсталасць гэтая ідэалогія надзвычай удала замяняе на плюс: мы непадобныя да іншых, але гэта таму, што на нас ускладзена вышэйшая місія – быць лідэрам усходнеславянскай/ усходнееўрапейскай цывілізацыі. Для людзей з комплексам непаўнавартасці гэткая ідэалагема мае амаль лібіданальнае значэнне; 4) хранічны канфлікт з Пуціным прымусіў Лукашэнку задумацца над шанцамі застацца прэзідэнтам у будучыні.

Крызіс хаўрусу з Расіяй мусіў быць растлумачаны на карысць беларускага кіраўніцтва. Апрача таго, зрабілася ясна, што значная частка беларускага насельніцтва без асаблівага энтузіязму падтрымлівае інтэграцыю з Расіяй, падтрымка гэтая ўзнікае больш як вынік інерцыі і абыякавасці, чымся пераканання. Таму мэтазгодна аб'явіць Расію духоўным банкрутам і вяшчаць тэзіс аб немачы расійскай дзяржавы перад абліччам злой алігархіі, каб супрацьпаставіць моцы і духоўнай напоўненасці беларускай дзяржавы.

Так пачаўся працэс пошукаў ідэалагічнага абгрунтавання лукашэнкаўскай палітыкі. Трэба адзначыць, што нялёгка напісаць больш-менш лагічны аповед, які б быў «прыемным для вуха» і не надта б пярэчыў бачаным рэаліям. У выніку паўстала нейкая копія расійскага нацыянал-бальшавізму – імперыялістычнай ідэалогіі Аляксандра Дугіна.

БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛ-БАЛЬШАВІЗМ

Акрэсленне «нацыянал-бальшавізм» ужывае таксама доктар У. Роўда для характарыстыкі белдзяржідэалогіі, разумеючы пад гэтым «усходнеславянскую версію нацыянал-сацыялізму». Падаецца, што найбліжэйшым ідэалагічным аналагам цяперашняй беларускай дзяржаўнай дагматыкі з'яўляецца імперыялістычная канцэпцыя аднаго з лідэраў расійскай Нацыянал-бальшавіцкай партыі (НБП) згаданага ўжо Дугіна. Прыгледзьмася да некаторых кампанентаў

гэтай
канцэпцыі.

«На пытанне, што аб'ядноўвае нацыяналізм з бальшавізмам, Дугін адказвае: што аб'ядноўвае Платона, Шэлінга, Гегеля, Маркса і Шпенглера? Адказ тут дае Попер: яны – ворагі «адкрытага грамадства». Сярод гэтых ворагаў – успрынятых як прадстаўнікоў аднае катэгорыі – мы спаткаем фашыстаў і марксістаў, кансерватараў ды сацыял-дэмакратаў». Зыходзячы з гэтай пасылкі, Дугін дае ўласную дэфініцыю нацыянал-бальшавізму: гэта «звышідэалогія, супольная для ворагаў адкрытага грамадства». Дугін кажа: «Можна рызыкнуць сцвердзіць, што нацыянал-бальшавізм прызнае *любую* версію Абсалюту, *любую* матывацыю дзеля таго, каб адкінуць адкрытае грамадства».

Ідэалагічны генезіс канцэпцыі Дугіна сягае акультыстычных сектаў і рэвалюцыйных дактрын. У першых Дугіна ўзбуджае ідэя «містычнага месіянізму», а ў другіх ён знаходзіць жаданую ідэю патаплення ў крыві гэтага грэшнага свету, каб завесці новы парадак.

Існуе шэраг сутычных элементаў паміж ідэалогіяй Дугіна і Лукашэнкі:

Дугін:

Мэта расійскай экспансіі – татальная сатэрыялагічная навука… Мы не з'яўляемся народам адным з, але маем місію – аб'явіць свету поўную праўду… Мы, расійцы, да гэтага пакліканыя.

Лукашэнка:

Беларусь гісторыяй, лёсам і становішчам абраная, мабыць, выканаць агромністую ролю духоўнага лідэра ўсходнееўрапейскай цывілізацыі. (…) Усведамленне гэтага наканавання можа падштурхнуць наш народ да вялікіх дзеянняў. Многія людзі ў Расіі, Украіне і ў іншых краінах глядзяць на Беларусь як на прыклад паслядоўнай і самастойнай палітыкі… Беларусь павінна прыцягваць патрыятычныя сілы з усяе постсавецкай прасторы. Менавіта тут гэтыя людзі знойдуць платформу выказвання, свабодную ад неаліберальнага тэрору і пераследу.

Дугін:

Мы выключаем індывідуалізм, адзінку, свабодны рынак, светапоглядную талерантнасць…

Лукашэнка:
Патрэбу ў ідэалах і высокіх мэтах, узаемадапамогу, калектывізм мы проціпастаўляем заходняму індывідуалізму.
Што да гаспадаркі, дык тэарэтычна Лукашэнка не такі радыкальны, як расійскі ідэолаг, бо гэты першы прызнае «сацыяльна арыентаваную рынкавую гаспадарку», але на практыцы аўтаномія рынкавых зносін зведзена да мінімуму, а і ў гэтым мінімуме пануе няўпэўненасць, бо заўжды можна чакаць неспадзяванага і самавольнага ўмяшальніцтва прадстаўнікоў дзяржаўнай улады.
Супольным для абедзвюх ідэалогіяў з'яўляецца повязь з савецкім мінулым:
Дугін: *«Выразна бачу пульсаванне нашага гістарычнага быцця таксама ў камунізме».*
«Дзяржаўная ідэалогія Рэспублікі Беларусь» (падручнік): *«Савецкі перыяд стаўся вяршыняй айчыннай гісторыі»*[1].
Найбольш інтрыгоўным ёсць стаўленне абодвух – Дугіна і Лукашэнкі – да праваслаўя. Як вядома, абодва робяць праваслаўе амаль цэнтральным складнікам сваіх ідэалогіяў, але ў той жа час беларускі прэзідэнт называе сябе «праваслаўным атэістам» (цяжка прыдумаць больш прыгожае для праваслаўя выслоўе), а лідэр НБП ухваляе перасяг Праваслаўнай царквы ў гады сталінізму: *«Па-першае, – заўважае Дугін, – тое праваслаўе, якое нішчыў Сталін, было зноў акцыдэнталізавана – прасякнута духам Захаду, а па-другое, месіянісцкая мара магла існаваць і па-за праваслаўем».*

1. Владимир Мельник. *Государственная идеология Республики Беларусь: конституционные основы.* Минск, Тесей, 2004. С. 195.

Гэты сінкрэтычны кампанент – «праваслаўе-бальшавізм» – з'яўляецца сур'ёзным выклікам для ўсіх вернікаў-хрысціянаў, і таму наступны пункт прысвяцім гэтай праблеме.

ПАЛІТЫЧНАЯ ЦАРКВА І ХРЫСТОВА ЦАРКВА

Тут давядзецца выйсці па-за межы сацыяльнай філасофіі ды сацыялогіі рэлігіі і зрабіць некалькі тэалагічных заўвагаў. Абмяжуюся толькі каталіцкай і праваслаўнай цэрквамі, але гэта зусім не значыць, што недаацэньваю вартасць іншых канфесіяў і хрысціянскіх рухаў, бо поўны разгляд справы хрысціянства ў Беларусі патрабаваў бы адмысловай працы.
Само слова «царква» паходзіць ад грэцкага «кюрікé» (kyrike) і

з’яўляецца этымалагічна прыметнікам жаночага роду: «Гасподняя». Ужо на самым світанку хрысціянскае эры паслядоўнікі Хрыста і ягоных вучняў заўважылі, што да хрысціянскай супольнасці нярэдка «прычэпліваюцца» элементы (паводзінаў, сувязяў, структур, узаемаадносінаў), якія супярэчаць Хрыстоваму вучэнню, але надзвычай цвёрда замацоўваюцца пад назовам хрысціянства. Святыя Айцы царквы заўважылі, што не ўсё ў хрысціянстве Хрыстова, і ўжо ў III стагоддзі паўстала парадаксальнае акрэсленне царквы – *meretrix casta*, «чыстая чужаложніца». Гісторыя царквы – і праваслаўнай, і каталіцкай – паказвае, як часта і як глыбока яна бывала інфікаваная грахом і нявернасцю свайму Заснавальніку.

Інструменталізацыя праваслаўя ў беларускай дзяржаве робіцца чарговым выпрабаваннем для людзей, якія па-сапраўднаму вераць у Хрыста. Першым непажаданым наступствам працэсу этатызацыі праваслаўя будзе расчараванне інтэлігенцыі праваслаўнай царквой і паніжэнне яе аўтарытэту. Другім наступствам будзе рост антыправаслаўных настрояў сярод каталікоў і пратэстантаў.

Паўстае пытанне, наколькі каталікі і праваслаўныя ў Беларусі здолеюць захаваць давер і прыязь адно да аднаго. На жаль, і ў адных, і ў другіх дамінуе замкнёная ментальнасць. Праваслаўныя схільныя раздзьмухваць і абагульняць злачынствы з боку каталікоў, нярэдка можна спаткацца з агрэсіўным і прынцыпова непрыязным стаўленнем. У той жа час «каталіцкія грахі» ў дачыненні да праваслаўя сёння маюць адмысловы характар. Асноўны грэх – гэта «самазадаволеная адкрытасць» і пачуццё цывілізацыйнай перавагі. Спадар З. Пазьняк закідае праваслаўнай царкве прыроджаную схільнасць да цэзарапапізму, г. зн. зліцця з дзяржаваю, але не бярэ пад увагу таго, што больш як дзесяць стагоддзяў у каталіцызме еднасць царквы і дзяржавы была непахісным прынцыпам; а колькі было супраціву яшчэ ў першай палове XX ст., калі некаторыя каталіцкія інтэлектуалы спрабавалі абгрунтаваць важнасць раздзялення царквы і дзяржавы. Зрэшты, і сёння хапае сярод каталікоў прыхільнікаў цэзарапапізму, альбо папацэзарызму.

Ад «адкрытых» каталікоў нярэдка можна пачуць: «Дасць Бог, калі-небудзь праваслаўныя зменяцца, і тады будзе магчымы дыялог. Тады, можа, паяднаемся і аб'яднаемся. Бо мы – дык у кожную хвіліну гатовыя». Гэтак паставіўшы справу, каталікі самі не заўважаюць, што робяцца ахвярамі ідэалізму і трыумфалізму. Рэч не ў тым, каб яднацца з ідэальным праваслаўем, але каб палюбіць *канкрэтнае* праваслаўе. Апрача таго, няма неабходнасці гэтак канцэнтравацца на *аб'яднанні*. Гістарычныя спробы заключэння уніі – на Фларэнцкім саборы ў 1439 годзе і ў Берасці ў 1596 годзе – паказваюць, што ў гэтых саюзах было больш палітыкі і макіявелізму, чымся вернасці Хрысту. Мы можам жыць у еднасці без інстытуцыянальнага аб'яднання. Рэч не ў тым, каб праваслаўныя і каталікі «аб'ядналіся», а каб змянялі свой спосаб мыслення, каб вярнуліся да Бога.

Асноўнай жа перашкодай на шляху вяртання да Бога ёсць *ідалапаклонства*, якое можа мець самыя розныя формы – ад пакланення багаццю да абагаўлення свецкага валадара.

ІДЭАЛОГІЯ І ІДАЛАПАКЛОНСТВА

Варта прысвяціць крыху ўвагі тэарэтычнаму асэнсаванню ідэалогіі. Слова «ідэалогія» можа ўжывацца ў нейтральным, сацыялагічным сэнсе. Найбольш шырока можна яе акрэсліць як «сукупнасць ідэяў, якія ўтвараюць пэўную іерархію», або «сістэму жыццёвых прынцыпаў». Тым не менш, кампраметацыя пэўных памкненняў сучаснасці – стварыць дасканалую сістэму грамадскіх зносінаў, завяршыць гістарычны працэс грамадскай эвалюцыі – прывяла да таго, што само слова «ідэалогія» набыло негатыўнае адценне. Ідэалогія пачала асацыявацца з гвалтам, задушэннем інтэлектуальнай незалежнасці, дыскрымінацыяй ды таталітарызмам. Ян Павел II у вакольніку[2] «Цэнтэсімус аннус» называе ідэалогію «дэфармацыяй аўтэнтычнай філасофіі». «Ян Павел II… дае наступныя характарыстычныя прыметы ідэалогіі: 1) яна змяшчае ў сабе канцэпцыю ісціны і дабра; 2) яе спавядальнікі лічаць, што гэтую канцэпцыю можна навязаць іншым; 3) усю рэчаіснасць яна замыкае ў статычнай і простай схеме. Папа сцвярджае ў гэтым вакольніку, што хрысціянская ісціна не выконвае другой і трэцяй умовы і ўжо

хоць бы таму каталіцызм не ёсць ідэалогіяй»[3].

Беларуская навастворaная ідэалогія наўрад ці стане інструментам імперыялізму, але напэўна будзе (і ўжо з'яўляецца) устанаўленнем у абавязковым парадку ідалапаклонства, што й Прэзідэнт *і* народ, народ *і* прэзідэнт утвараюць адно цэлае, святы сімбіёз. Ёсць святары і прарокі, якія служаць справе захавання гэтай цэльнасці, – гэта філосафы-ідэолагі, якія пакліканы навучаць народ, дапамагаць яму ўсвядоміць гэтую ісціну, даводзіць яе непазбежнасць. Ёсць інквізіцыйная машына, якая мае моц пакараць няверных, і нехта асмельваецца аспрэчваць дзяржаўную дагматыку, для такіх Гэта можа мець самыя непрыемныя наступствы (прэзідэнт: «Калі ты не падзяляеш ідэй, вызнаваных уладай і прэзідэнтам, не ідзі працаваць у дзяржаўныя ВНУ. (...) Чаго ты туды прыходзіш і плявузгаеш (мямлишь), балбочаш (лепечешь) невядома што»). Ёсць таксама варожыя сілы, «д'ябал», які з упадніцкага Захаду будзе нас спакушаць ідэямі гуманізму ды свабоды, а ўсё таму, што зайздросціць нашаму шчасцю, нашай велічы і несамавітай годнасці.

[3] Maciej Zięba OP, *Kościół wobec liberalnej demokracji* // *Chrześcijaństwo, demokracja, kapitalizm*. Poznań: W drodze 1993; S. 138.

Белдзяржідэалогія дагэтуль не мае кагерэнтнай версіі, але можна заўважыць наяўнасць пэўных догмаў, якія, праўдападобна, стануцца сталымі складнікамі «беларускае веры»: *арганіцызм* (асоба чалавека з'яўляецца кампанентам пэўнай цэльнасці. Калі хтосьці не пасуе да цэльнасці, шкодзіць ці з'яўляецца носьбітам якогасьці «вірусу», ён павінен быць знішчаны дзеля дабра ўсяго арганізму), *беларускі месіянізм*, а ў сувязі з гэтым – беззаганнасць «незаражанай» часткі беларускага народу, *непагрэшнасць беларускага лідэра* і *гнасеалагічная іерархія* (г. зн. найлепш ведае праўду лідэр, ягоныя міністры – крыху горш, кіраўнікі дзяржаўных навучальных устаноў – яшчэ горш, і г. д. Апазіцыя ж утварае іерархію хлусні і няпраўды).

PERENNIAL REVOLT AGAINST FREEDOM AND REASON

«Адвечны бунт супраць свабоды й розуму» (фармулёўка Попера) – гэта сталая рыса ворагаў адкрытага грамадства. Бунт супраць адкрытага грамадства, свабоды і розуму мае даволі моцную традыцыю і пэўны запас тэарэтычных сродкаў. Няма

падставаў спадаць у «патрыятычны песімізм» (маўляў, толькі беларусам такое характэрна), бо на працягу гісторыі антыдэмакратычныя і антыгуманістычныя тэндэнцыі значна пераважалі над гуманістычнымі, а калі глянем на сённяшнюю мапу свету, то заўважым, што зусім невялікі працэнт грамадстваў можна назваць дэмакратычнымі. Дый нават гэтая жменька дэмакратычных краінаў параўнальна нядаўна паверыла ў сэнс паслядоўнай абароны правоў і свабод чалавека, шанавання прынцыпаў публічнай дыскусіі ды праяўлення велікадушнасці да меншасцяў.

Хваля папулізму і антыдэмакратычнага ўздыму пранеслася і надалей нясецца па сённяшняй Еўропе: Ж.-М. лё Пэн, крайні нацыяналіст, быў нядаўна канкурэнтам Ж. Шырака ў Францыі, у Аўстрыі значную падтрымку мае Ё. Гайдэр, у Галандыі – партыя П. Фортэйна (год таму забітага), у Вугоршчыне – В. Орбан, у Літве пару год таму цешыўся адноснай папулярнасцю неафашыст М. Мурза, а ў Польшчы трымаецца папулярнасць дэмагога А. Лепера, тым часам як значная частка каталіцкіх традыцыяналістаў падтрымлівае рыторыку радыё «Марыя» і Лігі польскіх сем'яў з яе ідэалогіяй нацыянал-каталіцызму. Я ўжо не кажу пра Расею ці Ўкраіну. У ЗША множацца рознага тыпу фундаменталізмы, а некаторыя з фундаменталістаў маюць пэўны (хоць і абмежаваны) уплыў на палітыку. У Еўрапейскім парламенце ў 1994 годзе неафашысты і камуністы мелі па 12 прадстаўнікоў. Усё гэта сведчыць пра тое, што дэмакратычныя каштоўнасці ў сучасным свеце далёка не ўсіх пераконваюць і зусім не відавочна, што – насуперак Фукуяму – дэмакратычны лібералізм завершыць гісторыю.

Не толькі Беларусь з'яўляецца маладой і кволай краінай, але таксама дэмакратыя і свабода з'яўляюцца маладымі і кволымі каштоўнасцямі чалавецтва. Іншую пастаноўку справы, тыпу «Беларусь – выспа аўтарытарызму ў моры дэмакратыі», лічу неадпаведнай рэчаіснасці; зрэшты, апрача мазахістычных лямантацый яна нічога не імплікуе.

Славянафільска-марксісцкага гібрыду немагчыма пазбыцца адно толькі іранічнымі ўсклікамі ды павярхоўнай катэгарыялізацыяй тыпу «гома саветыкус». Замацаванне

дзяржідэалогіі робіцца выклікам для розных сфераў насельніцтва: хрысціяне, іудзеі і мусульмане павінны праверыць яе ў аспекце першага прыказання: *«Не май іншых багоў апрача Мяне»*, прадстаўнікі агнастычнай арыентацыі мусяць пераправерыць яе ў аспекце светапогляднай нейтральнасці дзяржавы, а ўсе разам – у аспекце прынцыпаў рацыянальнага мыслення.

Кракаў, 11.06.2004

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (33) – 2004
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2005/1/17**
[image]

Даніла Жукоўскі «Зразумела» і «понятно»

…мы толькі зрэдзьчас спатыкаемся з імі – настолькі, што нават Джэбел, вельмі дасведчаны астранаўт, праходзячы побач з адным з іх, не патрапіў пазнаць, хто гэта. Хочаце ведаць чаму?
Чаму?
Бо сумяшчальныя чыннікі камунікацыі надзвычай слабыя.

С. Дылані. «Вавілон-17»

«Усё
становіцца
зразумела і
понятно», –
двойчы з
вуснаў
вядомых і
аўтарытэтных
журналістаў
я чуў гэты
адметны
выраз[1]. З

лапідарнасцю
Мікалая
Дземянцея
мэтры пяра і
мікрафона
сфармулявалі
тое, што
ўвесь час
жыве ў
падсвядомасці:
«зразумела»
і «понятно»
– розныя
рэчы. Слова
не верабей.
Жывая
гаворка, у
адрозненне
ад запісу,
які можна
прачытаць і
выправіць
(хаця можна
і не
выпраўляць
дзеля
нязмушанасці
і
натуральнасці),
іншы раз
выяўляе
старанна
прыхаваныя
з’явы.

І справа тут не толькі ў асабістай культуры людзей, якія прафесійна штодня працуюць са словам. Пры ўсёй нашай, намі ж апетай, двухмоўнасці мы слаба ўсведамляем, як моцна злучаныя мова і светаўспрыманне. З пэўнай мераю палемічнае завостранасці можна сцвярджаць, што ў братніх моваў болей

адрозненняў, чым падабенства.
Тут не толькі банальныя спасылкі на «калхознасць» беларускае ці яе ўяўную немілагучнасць. У Максіма Багдановіча ёсць вершы ў двух варыянтах: па-беларуску і па-расійску. Літаратуразнаўцы, гэтак жа як і простыя чытачы, адзначаюць адрозненне эмацыйнага фону, сухую стрыманасць ягоных расійскамоўных вершаў у параўнанні з беларускімі. Яшчэ большы кантраст – паміж перанасычаным эмацыйнымі фарбамі тэкстам І.Абдзіраловіча «Адвечным шляхам» і халодна-інтэлектуальным перакладам, колісь надрукаваным у «Нёмане»: літаральна нібы дакладны, ён нагадвае арыгінал гэтаксама, як рахунак за камунальныя паслугі – любоўнае пасланне.
Вінаватае не нядбальства перакладчыкаў, а рознасць моваў як з'яў сацыяльных, надзейна схаваная пад бясспрэчным лінгвістычным падабенствам. (Тое ж з украінскаю: што ў арыгінале гучыць сакавіта і натуральна, у расійскім перакладзе або губляе сакавітасць, або траціць усю натуральнасць.) Сёння ахвотна перабольшваюць блізкасць нашых моваў (і менталітэтаў) і прымяншаюць іх рознасць. Увадначас непазбежна прымяншаецца вага і складанасць праблемы ўзаемаразумення. Ці з'яўляецца разыходжанне паміж «зразумелым» і «понятным» праблемай, вартай увагі беларускамоўнай грамады, або гэта можна да часу ігнараваць? На мой погляд, адказ можа быць толькі адзін: ля вытокаў пагардлівага стаўлення да праяваў беларускага разумення красы, якасці, дыхту ды адмаўлення палітычных правоў беларускае нацыі з аднаго боку і цяжкасцяў пераказу беларускага светапогляду сродкамі «братняй славянскай мовы-сястры» з другога ляжыць адна прычына.

ЧАМУ
ПЕРАВАЖАЕ
PREACHING
TO THE
CONVERTED
Відаць, ці не
ўсім больш-
менш
культурным
жыхарам

Беларусі не
даспадобы
«моўны
апартэід» з
лозунгам
«пра
гісторыю і
культуру –
па-
беларуску».
Акрамя
відавочнага
прыніжэння
мовы,
прапагандысцкі
імпэт
тэкстаў
збольшага
губляецца
марна:
шырокае
кола
патэнцыйных
чытачоў
спыняецца
беларускаю
моваю
тэксту,
выдатна
разумеючы,
што тут
толькі пра
мову,
культуру ды
гісторыю.
Таго ж, для
каго мова не
ёсць
перашкодаю,
ужо паводле

азначэння пераконваць у слушнасці падвалінаў беларускае нацыянальнае ідэалогіі не трэба.

Гады перабудовы не прайшлі для беларусазнаўства бясплённа. За дзесяць год убачыла свет досыць матэрыялаў, каб іх мог скарыстаць *кожны ахвотны*. Тое, што сёння можна сустрэць у неспецыяльных выданнях, ёсць на 99 % паўтарэннем. Абсалютнай большасці тых, хто чытае па-беларуску, не трэба невядома ў каторы раз нагадваць школьныя звесткі пра бітву пад Грунвальдам. У той самы час гэткія звесткі, пададзеныя ў прывабнай форме, будуць па-ранейшаму навіною для значнае часткі тых, хто чытае толькі па-расійску. Толькі хто іх падасць гэтым упартым «чужынцам» і «манкуртам»?

У Беларусі, здаецца, не склаўся тып грамадскага дзеяча, які прапагандаваў бы беларушчыну *па-расійску* і *для расійцаў*[2]. Не магу прыгадаць таксама й нечага падобнага да твораў Кіплінга, не скіраваных, натуральна ж, на «агітацыю за Індыю», але прасякнутых непадробным светлым пачуццём да краіны і людзей, якое з гістарычнай перспектывы выявілася больш важкім за каланіялісцкія міфы, свядома прапагандаваныя «жалезным Рэдзьярдам».

Адсутнасць расійскамоўнае прапаганды беларушчыны з боку свядомых беларускамоўных колаў можа быць растлумачана іхняй памылкай і трываннем рэшткаў каланіяльных забабонаў, пра што крыху ніжэй. Адсутнасць, ці надзвычай малая інтэнсіўнасць, беларусафільскай дзейнасці з боку тых, хто застаўся на баку «понятного», мусіць мець іншыя карані.

Адкінем у думках тэксты, скіраваныя выключна на індактрынацыю, уцягванне ў кола беларускасці. Адкінем тое, што служыць выключна мэтам вывучэння мовы й літаратуры ў школе і ВНУ. Асобна адставім класікаў, падмурак нацыянальнае культуры (і школьнае праграмы). Адкладзём літаратурныя помнікі, цікавыя адно спецыялістам. Што

[2] Па-збоку Беларускай дзейнасці «Газеты» тут выглядае тым выключэннем, якое адно падмацоўвае правіла.

засталося? Што ёсць на сёння *дзейнай*, жывой беларускай культурай, рэальным сведчаннем паўнакроўнага жыцця нацыі? Што ёсць такога, пра што можна напісаць неюбілейны матэрыял, падаць як гарачую падзею? Перакласці на расійскую мову і выдаць вялікім накладам?

Замала ў нас цікавага, каб падтрымліваць больш-менш значнае кола беларусафілаў. У бездані, якая падзяляе «зразумела» і «понятно», вінаватыя ў значнай ступені мы самі. Занадта бо ўтульна асталяваліся ў адведзенай нам рэзервацыі, як тыя амерыканскія індзейцы ці аўстралійскія абарыгены.

Паслядоўна выключаючы з разгляду ўсё, што ўяўляе сабою хоць нейкую рэальную канкурэнцыю, мы стварылі сваю адмысловую іерархію. А дзеянні свае тлумачылі тым, што канкурэнты не лічацца, бо не карыстаюцца беларускай мовай. Але ж яны «карыстаюцца» беларускай аўдыторыяй!

Адсутнасць адпаведнай якасці твораў па-беларуску – што арыгінальных, што перакладных, – выкліканая прыгнётам і непасрэднымі шматгадовымі рэпрэсіямі, можа быць апраўданнем адставанняў, але ні ў якім выпадку не падставаю для паменшаных патрабаванняў *да саміх сябе*. Насуперак здароваму сэнсу, саматужныя стандарты мы паціху абсалютызавалі, пачалі патрабаваць прызнання іх навакольным светам. Калі ж свет не пагаджаецца з нашым спісам выдатнікаў, мы абвяшчаем, што ён памыляецца, і яшчэ больш замыкаемся ў сваім коле.

І каб жа гэта было ўсё! Накінуты каланізатарамі комплекс нацыянальнай непаўнавартасці набыў у незалежнай Беларусі нечаканую форму: звычка бачыць «усходніх братоў» як звышлюдзей, носьбітаў непараўнальна вышэйшай культуры сёння шмат каму з беларусаў не дае ўцяміць, што чалавек русіфікаваны можа папросту не разумець нас у тых аспектах, дзе мы выяўляемся як носьбіты адрознай культуры.

Пераадолеўшы (што праўда, не зусім – іначай адкуль тая прыхільнасць да зніжак самім сабе) першы каланізатарскі міф – пра слабасць і непаўнавартасць уласнае культуры і яе немінучую смерць, мы пакуль не пераадолелі іншага – пра

надзвычайныя ўласцівасці культуры расійскай. Між тым самі расійцы часам наракаюць, што іхняя культура не стварыла сродкаў для раўнапраўнага дыялогу з былымі «меншымі братамі». Расейская культура і расійскае грамадства – не наш клопат, чаго нельга сказаць пра нашых суайчыннікаў, незалежна ад іхняе нацыянальнае прыналежнасці і культурнае арыентацыі.

«Сумяшчальныя чыннікі камунікацыі надзвычай слабыя», – гераіня «Вавілона-17» Рыдра Вонг мела на ўвазе іншапланетнікаў, негуманоідаў. Аўтар, Сэмюэль Дылані, спрабаваў гэткім чынам адлюстраваць чалавечыя праблемы ўзаемаразумення ў сябе на радзіме. Але яму, хутчэй за ўсё, нават не снілася сітуацыя, якая мае месца ў нас. Бо ўсё гэта, як здаецца, не мела б такога значэння, калі б мяжа паміж «зразумела» і «понятно» ішла ўздоўж дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь, а не праз душу ці не кожнага насельніка краіны.

ПАСЯБРУЙМА З ЛЮСТРАМ

Барацьба за беларусізацыю, за паўсюднае ўсталяванне «зразумелага» павінна спалучацца са змаганнем за набліжэнне да яго «понятного». Бо першае без другога можа быць ажыццёўлена толькі з ужываннем гвалту – дзяржаўнага прымусу, дзяржаўных грошай і дзяржаўнага апарату, а гэта не толькі невыканальна, але й непрымальна, бо сумяшчаецца адно з недэмакратычнымі мадэлямі грамадскага ўладкавання.

«Усур'ёз і надоўга» можна планаваць толькі беларусізацыю з поўнае згоды большасці грамадства. Адсутнасць згоды на гэта азначае слабасць расійскамоўнага беларусафільства. Расійскамоўныя ставяцца да беларускай культуры па-рознаму: абыякава, спачувальна-паблажліва, варожа, – але ніколі не *зацікаўлена*.

Мусіць стацца «понятным», што пашырэнне ў грамадстве беларускай культуры ані ў якім разе не будзе збядненнем ці абмежаваннем, але толькі ўзбагачэннем культурнай палітры індывіда. Мусіць стацца «зразумелым», што сёння ўзровень

развіцця беларускай культуры гэткі, што яна ніяк не можа імгненна і паўнацэнна заступіць паноўную, заснаваную на расійскай мове, культуру – нават пры наяўнасці адпаведнае палітычнае волі кіраўніцтва Беларусі.

Беларушчына дастаткова жывая, каб паступова набіраць сілу, але за неабходныя для таго ўмовы трэба змагацца і змагацца, бо іх няма.

Траўнік беларускай культуры не настолькі пышны, каб жывіць святарных кароваў. Каб недахопы асобных аўтараў не ўспрымаліся аўдыторыяй як недахопы культуры, да якой яны належаць, неабходна, каб яны носьбітамі гэтай культуры былі асэнсаваныя як недахопы тых аўтараў. Тут шлях рэабілітацыі «зразумелага» да «понятного». У адваротным выпадку культура губляе свой высокі статус атрыбуту нацыі, робіцца субкультураю.

Беларускасць у форме субкультуры апошнім часам даволі часта выконвае ролю сродку асабістага самавыяўлення індывіда, формы бунту асобы супраць абмежаванняў паноўнай культуры. Мэты гэткага руху выразна супярэчаць прыярытэтам нацыянальнага будаўніцтва: носьбіты субкультуры не прэтэндуюць на ахоп усяго грамадства – толькі на прызнанне за імі, адрознымі, «права грамадзянства» ў паноўным культурным асяроддзі.

Ужыванне ў нацыянальна свядомым асяроддзі сусветных стандартаў якасці будзе штодня сцвярджаць дзейнасць гэтага асяроддзя менавіта як форму нацыянальнага будаўніцтва. Дамагацца падтрымкі ад шырокіх колаў немагчыма без пераасэнсавання такое каштоўнасці, як унікальнасць беларускае нацыі. Па-першае, патрабуе ўдакладнення ступень гэтае ўнікальнасьці, а па-другое, сярод адрозненняў варта вызначыць тыя, што аніяк не надаюць беларусам гонару і, выяўляючы нашу ўнікальнасць, з’яўляюцца не каштоўнасцю, а ўсяго прыкметай нацыянальнай няспеласці.

Грунтоўны перагляд нашай скарбонкі палепшыць стаўленне навакольных: калектыўны «свядомы« беларус радзей будзе паводзіцца гэтак, нібы кожная праява ягонае адрознасці

самакаштоўная. Тады тыя, якім толькі «понятно», будуць ставіцца да пэўных асаблівасцяў суседа па пад'ездзе з большай павагай, а сёй-той дойдзе нават да разумення, што ў экзатычнасці беларускамоўнага знаёмца ёсць і ягоная віна.

Першасная, немаўлячая форма нацыяналізму – сімвалічнае прысваенне сабе ўсяго добрага. Прыкладна тры чвэрці малых латышак (полек, чэшак і г.д.) у рэлігійных класах перакананыя, што Маці Божая – латышка (полька, чэшка і г.д.). Протанацыяналізм сілкуецца ці не стопрацэнтнай хлуснёй, але й гэта ідзе на карысць нацыянальнаму пачуццю, лучыць яго з іншымі ідэаламі.

Супрацьлеглая тэндэнцыя – выкарыстанне нацыянальнага пачуцця дзеля апраўдання хібаў і недапрацовак. Для мацавання нацыянальнага пачуцця яна шкодная, а для пашырэння яго сярод людзей неперакананых – згубная[3]. Праз невялікую хібіну, праз неістотную для сутнасці вялікай ідэі непатрабавальнасць да сваіх адбываецца вялізная дыскрэдытацыя. Тут мы маем змаганне за аўдыторыю – яе ўвагу, суперажыванне, разуменне, неабыякавасць, прыхільнасць, давер. І толькі потым – за больш моцныя пачуцці. Шмат якія беларускія грамадскія ініцыятывы не проста не вытрымліваюць выпрабавання «пониманием» – яны выразна не разлічаныя на гэта. Між тым, імкненне не чуць мату на кожным рагу зразумець значна лягчэй, чым неабходнасць рэформы правапісу беларускае мовы. Справа за тым, каб перакінуць масток паміж адным і другім.

У АБАРОНУ МОВЫ

Сістэма ідэяў заўсёды грунтуецца на пастулатах (прыгадаем амерыканскую Дэкларацыю Незалежнасці: we hold these truths self-evident…). Розніца паміж «зразумела» і «понятно» выяўляецца ў тым, што відавочнае для «зразумелага» не з'яўляецца гэткім для «понятного».

Сутыкненне з «понятным» – найсур'ёзнейшы выклік для носьбіта «зразумелага» – змушае пераасэнсаваць тое, што ён прызвычаіўся быў лічыць безумоўна абгрунтаваным. Не кажу пра «слабых верай» – гэтае практыкаванне можа ўвогуле яе пазбавіць. Моцныя (толькі яны й могуць быць лідэрамі ў

[3] Пісьменнік напісаў гэтрэдзе, але ж ён патрыёт, і будзем лічыць твор добрым (або выдатным ці нават геніяльным)…

грамадскім працэсе) выйдуць з яго з каштоўным досведам – калі Бог дасць – з новымі прыхільнікамі.

Варта адзначыць, што мастацкія творы маюць спецыфічную здольнасць абгрунтоўваць памянёныя пастулаты – адно не лагічнымі, а ўласцівымі мастацтву сродкамі – і гэта надае мастацтву надзвычайную вагу ў нацыянальных справах: у той час як рухавіком гэтага працэсу ёсць насамперш інтарэсы эканамічнага парадку, кансалідацыя грамадства толькі на эканамічным грунце наўрад ці магчымая. На маё глыбокае перакананне, «слоўнік цяжказразумелых выразаў для беларуска-расейскага ўзаемаразумення» павінен складацца перш за ўсё з мастацкіх твораў.

Сукупнасць відавочных праўдаў беларускай нацыянальнай ідэі досыць добра вядомая:

— родная *мова*,
— самабытная *культура*,
— слаўная *гісторыя*,
— незалежная *дзяржава*.

Але гэта толькі адзін – светлы – бок беларускай ідэі. Цёмны бок утвараюць разуменне, што беларуская нацыя далёкая ад дасягнення сваіх мэтаў, адчуванне хранічнае малалікасці шэрагаў свядомых змагароў ды наяўнасць шматлікага натоўпу тых, хто паводле этнічнае прыкметы падлягае навяртанню. Мо таму сталым прыярытэтам зрабілася асветніцтва дзеля першаснае індактрынацыі. Ёсць праблема працягласці змагання, якое расцягнулася сама меней на стагоддзе з гакам і дасюль не прынесла чаканага выніку ў выглядзе стабільнае незалежнае дзяржавы – найвышэйшай на сёння формы самаарганізацыі нацыі. У выніку асветніцка-місіянерская лінія з інструментальнай, часовай сталася сутнаснай, сталаю рысаю беларускай нацыянальнай ідэі. Цень перапоўз на светлы бок.

У мусульманскім Пісанні шмат разоў гучыць перасцярога: не дадавайце Алаху таварышаў. У нас гэты прынцып парушаны – што з боку афіцыёзу, што з боку актывістаў нацыянальнага руху.

Некаторыя паважаныя – без двукоссяў! – дзеячы БНФ за пятнаццаць год – без двукоссяў! – змагання не навучыліся гладка гаварыць па-беларуску, аутарытэтны ў нацыянальна арыентаваных колах дзяяч сёння вярзе ex catedra адно, а заўтра нешта зусім прошлецдае… Прыкладаў нашмат больш, чым хацелася б.

Абавязак любіць *мову* блытаюць з абавязкам любіць *канкрэтную літаратуру і канкрэтных літаратараў*.

Абавязак шанаваць *гісторыю* – з абавязкам верыць у *канкрэтныя гістарычныя міфы*.

Абавязак ганарыцца сваёй *культурай* – з абавязкам захапляцца *фальклорна-эстраднаю выцяжкай* з яе.

Абавязак мацаваць сваю дзяржаву – з абавязкам верыць у *палітычныя фантазіі асобных палітыкаў*.

Гэта вынік якраз-такі адноснае малалікасці культурных каштоўнасцяў ды прагматычна-місіянерскага падыходу да іх ужывання: індактрынацыя ў беларускім нацыянальным руху лічыцца важнейшаю за далейшае паўнацэннае існаванне свядомага індывіда. Адчуўшы сваю беларускасць, культурны чалавек, які не абраў лёсу творцы, апынаецца перад выбарам: пагадзіцца на існаванне ў небагатым асяроддзі ці спрабаваць спалучыць нованабытае «зразумелае» са звычным «понятным». Але «зразумелае» лічыць гэтае спалучэнне заганаю: дух школьнага настаўніка, якім прасякнуты ўвесь беларускі рух, не пагаджаецца з суседствам. Настаўнік заўсёды ведае, што правільна толькі тое, чаму ён вучыць, адданы свайму прадмету, і не даруе здрады нават у дробязях.

Калі ж гаварыць пра творцаў, то слабасць беларускае культуры стварае для іх моцную спакусу атаясаміць *сябе* з найвышэйшымі нацыянальнымі абстракцыямі. Мова, бедная, спакутаваная, прыгнечаная беларуская мова валодае чароўнай уласцівасцю рабіць кампілятара пачынальнікам, эпігона – наватарам, шарагоўца – першым (бо адзіным). Небяспечная ўласцівасць, выкліканая дзесяцігоддзямі рэпрэсій, уцечкі мазгоў і аслабленых стандартаў.

Звычайны чалавек даволі ясна разумее розніцу паміж любоўю да роднага слова і захапленнем творамі канкрэтнага аўтара. Адчувае несупадзенне маштабу тутэйшых філосафаў ды палітолагаў і Арыстоцеля з Платонам. (Карціць згадаць некаторыя імёны, але нельга – іншыя могуць набраць пераканання, што іх гэта не тычыцца.) СМІ, асабліва

літаратурныя выданні, у агітацыйным запале імкнуцца накінуць проціслеглае бачанне (іншым разам, дарэчы, насуперак жаданням уздыманых на п'едэстал). У выніку шмат хто з чытачоў, давяраючы ўласнаму пачуццю здаровага сэнсу, адварочваецца – прэч ад «зразумелага» ў бок «понятного». Просты і эфектыўны механізм. Тыя ж, хто ўсё-такі застаецца, часцяком пазбаўляюцца волі да прапаганды беларушчыны, не жадаючы трапляць у смешнае становішча са сваімі дамарослымі Сакратамі.

Перад, так бы мовіць, здаровымі сіламі беларускай грамады стаіць пачэсная задача: пазбавіць беларускую мову яе цудоўнай уласцівасці дарыць німб і карону кожнаму шараговаму працаўніку ейнае нівы. І прагну зазначыць, што зрабіць гэта адносна проста.

Недахоп літаратурнай крытыкі, пра які часцяком згадваюць сёння, сведчыць якраз пра тое, што мы гатовыя адмовіцца ад разгляду беларускага мастацтва як мастацтва заведама ніжэйшага гатунку, якому патрабуецца зніжка (падобна як пры ацэнцы першага сачынення школьніка малодшых класаў). Фактычна, спажывец ад гэтага ўжо адмовіўся. Адзіная праблема – малаватая база параўнання.

SINE QUA NON

Згадваецца апокрыф пра колішні Вярхоўны Савет, дзе расійскамоўны дэпутат пакрыўдзіўся на беларускамоўнага за фразу «няма ўмоў». Абраннік народу абурыўся публічна: «Как это – нет умов!» Як і ў выпадку з журналістамі, вуснамі каламбурыста гаворыць ісціна: *умы* ёсць, *умоў* – няма.

Праблема нязгоды «зразумелага» і «понятного» не ў тым, што беларускамоўным «усяго толькі» не стае шэдэўраў, якімі яны маглі б ганарыцца. Зазірніце ў СМІ: мяркуючы па іх, нас тлумам акаляюць геніяльныя творцы, праніклівыя палітыкі, таленавітыя навукоўцы і высокапрафесійныя менеджэры. Адзінае, чаго не хапае гэтым абраннікам лёсу, – гэта прызнанне і адпаведныя маштабу іхняга таленту рэсурсы, якія ўдзячны беларускі народ абавязаны перадаць у іхнія рукі дзеля свае ж

карысці.

Марна спадзявацца на моц геніяльных твораў, пакуль грамадства не ў стане адрозніць іх ад графаманаў. Марна чакаць выратавання ад мудрага й адданага народу палітыка, пакуль грамадства не адчувае розніцы паміж патрыятызмам і фашызмам, імкненнем да справядлівасці і дэмагогіяй. А каб абудзілася здольнасць адрознення, трэба не толькі якасць, але таксама колькасць і разнастайнасць.

Трэба перакладаць сусветную літаратуру на беларускую мову, бо толькі гэта здольнае стварыць варты даверу базіс. Трэба пакончыць з традыцыяй разглядаць вартасці беларускіх твораў праз прызму клопату не пакрыўдзіць аўтара, які ахвяраваў свой талент на няўдзячны алтар Беларушчыны. Перш чым ганараваць сейбіта «разумнага, добрага, вечнага», трэба агледзець ураджай з ягонай валокі і зважыць яго гірамі са штампам сусветнага стандарту. А свае – самаробныя, падточаныя і з дзіркамі – выкінуць на сметнік.

Нельга патрабаваць ад чалавека пералічыць адценні блакіту, калі яго ўсё жыццё ўсе навокал вучылі толькі таму, што ёсць святло і цемра. Нельга чакаць упартага пошуку свайго ў беларускім культурным асяроддзі, калі чалавеку ўвесь час тлумачаць, што тут усё – найвышэйшай якасці, а ён адчувае, што гэта не адпавядае рэчаіснасці. *Бядак вымушаны або паверыць, або адрынуць*. Нібы гэта сімвал веры нейкае рэлігіі.

Беларускасць – не рэлігія, і, менавіта каб падкрэсліць гэта, я ўжыў тут выразы «зразумелае» і «понятное», пазбаўленыя сакральнага флёру. Абмяжоўваючы двухбальнаю сістэмай («добра» ці «выдатна») шкалу ацэнак уласнае дзейнасці, беларуская грамада накідвае гэткі спосаб паводзінаў навакольнаму асяроддзю, але там шкала атрымлівае крыху іншы выгляд: «здавальняюча–нездавальняюча». Будаваць на гэткай глебе?

Калі мы самі ў сваім асяроддзі навучымся карыстацца калі не дзесяцібальнаю, то хаця б пяцібальнаю сістэмай адзнак, тады старонняй асобе будзе прасцей класіфікаваць праявы беларускасці, дапасоўваючы гэта да сваіх зацікаўленняў. Яна

зможа лягчэй вызначыць тое, што ёй падабаецца. У яе з’явіцца шанс высочваць цікавае без прыкрасцяў і расчараванняў. Значыць, варты ўвагі беларускі твор атрымае дадатковыя шансы быць заўважаным і адзначаным шырэйшай аўдыторыяй, а бязглуздзіца будзе названая сваім імем да таго, як стане нагодаю для кпінаў нядобразычліўцаў. Іншымі словамі, з’явіцца мноства шансаў для прыязнага дыялогу паміж «зразумелым» і «понятным».

Тады мо расейскамоўны сусед па пад’ездзе, убачыўшы ў нашых руках беларускамоўнае выданне, пачуўшы беларускае слова або дазнаўшыся пра невядомага яму беларускага творцу, задасць нарэшце сабе гэтае няпростае пытанне: «Чаму мы толькі зрэдзьчас сустракаемся з імі?»

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2005/1/17**
[image]

ЮРАСЬ ПАЦЮПА
паэт, эсэіст, сталы аўтар «ARCHE». Падрыхтаваў да друку выбраныя творы Івана Франка на беларускай мове.

Юрась Пацюпа
Зьяўленьне героя
Імправізаваная п’еска-пастыча
ў адной дзеі

Хор
піянераў
(пачынае) Ім
народу
багацьце па
зерню
зьбірана,
І вазамі
плыве яно
сёньня да
хат.
Кожны ў
думках
даўно
галасуе
аддана

За таго, хто
наш бацька і
наш дэпутат
[9, *69*].

Ідэоляг *(мройлівым салодкім голасам)*
Мы свой кут
у сьлязах
пакідалі,
Да цябе нас
твой голас
пазваў,
Ты усіх нас
прыгрэла,
Масква!
[4, *421*]

Апошні апазыцыянэр *(выскоквае з-за куста і ўсё псуе)*
Магілёўскі
чорт,
кулажнік,
Ад гразі
душа
чарней,
Скамарох,
мардва,
біклажнік –
Хоча нас
згубіць
ямчэй.
Даў душу
нам ад
скаціны,
Сэрца ад
зьмяі
уткнуў,
Парабіў
пушней
мякіны –
Каб

скрозьдонна
ён нырнуў
[10, *88*].

Ідэоляг *(дае адпор)*

Адарваць бы
язык
падкалоднаму
гаду...
Вунь з
пахмельля
ці ўжо за
Іудаву плату
Адшчапенец
варожую
плётку куе.
Як жа з
тонкай
кішкой – ды
на нашу
уладу? –
Людзі
моцнага
гарту кавалі
яе [7].

Міліцыянты валакуць апошняга апазыцыянера, а тым часам...

Цётка з
вуліцы
*(шэпча
нешта сваёй
суседцы)* У
той час ішлі
там людзі.
Паляўнічы
Іх паклікаў:
«Зьвера я,
сябры,
спаймаў.
Ён, відаць,

заморскі, –
нейкі
таямнічы...»
Як вядома
стала,
праўду дзед
сказаў.
Зьвер той
быў,
гадлівы,
сапраўды
заморскі,
А дакладней
кажучы, быў
буйнейшы
ён
Японскі
Шпіён...
[6, *18*]

Паэтка *(абураная выбягае на сцэну і дэклямуе ў залю, махаючы рукамі)*

Уключыш
Амэрыку,
голас
гнусавіць:
– Ніхто
вайну
адмаўляць
ня ўправе
Як сродак...
Сродак!
Сродак
чаго?
Нажывы –
хай сьвет
зашнуруюць
акопамі?
Зьнішчэньня
межаў для

новых
шаленстваў
Эўропы?
Ці іншага
кантынэнту?
Хопіць!
[3, *48*]

Тэлевядучы *(сухім шпаркім тонам, падглядваючы ў паперку)*
Падбівае
рахункі
крывая
статыстыкаў:
І ў Нью-Ёрку
вайна. Па
ахвярах ня
лепш, чым
В'етнам.
«Дык
сьпяшайся ж
у джунглі,
на бераг
Мэконгу
імглісты.
Бо ўсё роўна
загінеш.
Загінеш,
загінеш! – ці
тут, а ці
там...»
[8, *216*]
Ідэоляг *(як у наркатычным ап'яненьні)*
Амэрыка,
Зьзяеш
кастрамі ў
цямноце,
Над імі
У дрыжыках

корчацца
целы.
На здані
падобны
Кацюгі-
забойцы,
З вачамі
савінымі ў
саванах
белых
[4; *555*].

Бацька *(выяжджае на белых лыжах)*
Што яны ў
вас – з
глуздам ці
прыдуркі?
Шмат было
ўсяго, пара і
знаць:
Атамнымі
бомбамі і
туркамі
Нас не
запалохаць,
не зламаць.
Ты ня з тою
падыходзіш
меркай
Да народу
нашага,
Амэрыка!
Людзі мы
занятыя.
Закончылі
Пасяўную…
Росьцім
ураджай.
Мінск
будуем.

Зброяй не
грукочам
мы,
Дык і нам,
васпан, не
пагражай
[12, *33–34*].

Тэлевядучы *(высунуўшыся з экрану тэлевізара)*
А ў Палесьсе
заляцеў калі
б ты
Ў гэты час,
убачыць быў
бы рад:
Між былых
багнішчаў
эўкаліпты
Узьнімаюць
к сонцу
бусьлянят
[12, *63*].
Хор
піянераў
(падпявае)
На Палесьсі
гоман,
гоман...
[4, *551*]
Ідэоляг
*(загаворвае
зь першым
сустрэчным,
голас яго
зусім
заплятаецца)*
Вы –
амэрыканец.
Вы
трымаеце

сябе
дастойна
І на мяне
глянулі,
Нібы я ў
гарэлачным
тумане.
Я з глузду
ня зьехаў.
Спакойна,
Спакойна,
пане!
Вось вы і
папаліся тут
нарэшце,
Вы
абяззброены.
Вам няма
чым крыць.
Скажыце,
калі вы
ўзбройваеце
Нямеччыну,
Ці не
гаворыце,
што рашылі
ў вадзе...
Жывога
Сома
затапіць?
[11, *28*]

Фізкультурны трэнэр *(выходзіць, махае сьцяжкамі)*
Радасьць у
сэрцах,
Бадзёры
настрой.
Вітаньне
прывольлю –
Вясьне

маладой!
Хваля за
хваляю
Дыбіцца,
пеніцца,
Раць
маладая
Ўзрастае,
вяселіцца
[1].

Бацька глядзіць, усьміхаецца. Потым разганяецца і едзе на лыжах далей.

Піянеры
(захоплена,
тоненькімі
галаскамі)
Добра на
лыжах
Імчацца ў
прасторы,
Клічуць
гасьцінна
Нізіны і
горы [2, *47*].

Бэпээсэмавец *(суровым барытонам)*
Ясна ўсім –
На лыжы
стаў,
Будзеш
ведаць хутка
сам –
Не для ўцехі
і забаў
Лыжы
дадзены
байцам.

Па завеях сьнегавых,

Як пакліча грозны год,
Мы на лыжах баявых
Возьмем ворага ў абход [5, *399*].

Паэтка і ідэоляг *(сьпяваюць эпілёг)*

Мой друг!
Колькі б раз
ты па
плошчы ні
крочыў –
Спытайся ў
сябе: а ці
так ты
жывеш,
Каб сьмела
герою
зірнуць мог
у вочы?
Ці так свае
сілы
жыцьцю
аддаеш?
[8, *460*]

АЎТАРЫ:

1. Агіевіч У. Хваля за хваляю... // Чырвоная зьмена. 1928. 26 жніўня.
2. Александровіч А. Творы. – Мн., 1981.
3. Бондар Т. Захапленьне: Вершы. – Мн., 1974.

4. Броўка П. Выбраныя творы. – Мн., 1951.
5. Броўка П. Збор твораў: У 9-і т. Т. 1. – Мн., 1987.
6. Гейне А. Шчасьлівая зорка: Зборнік вершаў. – Мн., 1939.
7. Губярнатараў М. Пра Савецкую ўладу // Гродненская правда. 1986. 20 декабря.
8. Кірэенка К. Выбраныя творы: У 2-х т. Т. 1. – Мн., 1978.
9. Куляшоў А. Мы жывем на граніцы. – Мн., 1938.
10. Марцінкевіч Г. Адвячорак // Беларуская літаратура XIX

стагодзьдзя:
Хрэстаматыя.
– Мн., 1988.
С. 74–92.
11. Наўроцкі
А. Неба
ўсьміхаецца
маланкаю:
Паэзія. –
Мн., 1962.
12.
Панчанка П.
За шчасьце,
за мір. –
Мн., 1950.

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/1/17
[image]

Анджэй Шчыпёрскі Імша за места Арас

АНДЖЭЙ ШЧЫПЁРСКІ (1924–2000) – вядомы польскі пісьменьнік і публіцыст. Аўтар больш як 20 зборнікаў прозы. Удзельнічаў у польскім дэмакратычным руху, падчас ваеннага стану быў зьняволены. У 90-х гг. быў у Польшчы надзвычай паважаным публі-цыстам, маральным і інтэлектуальным аўтарытэтам.

Увесну году 1458 места Арас зьведала нашэсьце заразы й голаду. На працягу месяца пошасьць забрала жыцьці амаль пятае часткі месьцічаў.

У кастрычніку году 1461 зь нявысьветленых прычынаў пачалося слыннае «Vauderie d’Arras». Былі гэта лютыя перасьледы жыдоў і вядзьмарак, працэсы аб уяўных герэзіях, а таксама выбух рабаваньняў ды злачыну. Пасьля трох тыдняў настала суцішаньне.
Трохі пазьней утрэхцкі біскуп Давід, бастард герцага

бургундзкага Філіпа Добрага, спыніў усе працэсы аб вядзьмарстве і блаславіў Арас.
Менавіта гэтыя падзеі і складаюць канву дадзенага раману.
А. Ш.
У той вечар ён прыйшоў да мяне і сказаў, што я не люблю нашага места. Ужо з парогу ён пачаў выкрыкваць гнеўныя абвінавачаньні. Я прыняў яго з пашанаю, якую мы абавязаны выказваць нашым настаўнікам. Правёў яго ў дом і прапанаваў выгоднае месца, мяркуючы, што супакой атачэньня ды напой, якім я зьбіраўся яго пачаставаць, астудзяць ягоны гнеў... Ён, аднак, сесьці не захацеў. У міргатлівым сьвятле лямпы я бачыў ягоны твар – вельмі азызлы. Мне ніколі раней не здаралася бачыць яго ў стане гэткае запальчывасьці, і я мог бы прысягнуць, што ён хворы, але тое, што ён казаў, сьведчыла пра незамутнёнасьць ягонага розуму. Ён абвінаваціў мяне, што папярэдняе ночы я зьбіраўся пакінуць места, аб чым яму таемна данесьлі. Сьпярша мне хацелася выкпіць гэтыя закіды. Але ж я ведаў яго. Калі ён прыйшоў да мяне, значыць, меў на руках доказы... Мінулага вечара я задумаў паехаць да Давіда. Я рыхтаваўся ў дарогу з захаваньнем поўнае патаемнасьці. Перад поўначчу я выйшаў з дому, выслаўшы папярэдне чалавека з асядланым канём да брамы Сьвятога Эгідыя. Я знайшоў яго ўва ўмоўленым месцы. Ён дрыжэў ад холаду й страху. Ноч была халаднаватая, дзьмуў парывісты вецер, ганяючы лісьце, што нападала з дрэў. Зь вялікім зьдзіўленьнем я заўважыў, што брама шырока расчынена, а мост не падняты. Вартавыя бавіліся ў косьці непадалёк. Занятыя гульнёю, яны, здавалася, на праход не зьвярталі аніякае ўвагі. Я адчуў пастку. Мінаў час, напоўнены нейкаю асабліваю небясьпекай. Конь нецярпліва біў капытом зямлю. Узышоў месяц, вялізны й белы, як сьнежны ком. Зьнянацку я пачуў крокі, а праз імгненьне ўбачыў мніха ад цыстэрцыянаў, які ня тоячыся набліжаўся да мескае брамы. Адзін з вартаўнікоў падняў галаву, глянуў безь цікавасьці на хадака і вярнуўся да гульні. Мніх мінуў браму, узышоў на мост. Ягоная кульба глуха пастуквала ў цемрадзі. Ён выйшаў зь места нікім не затрыманы. Я счакаў яшчэ колькі хвілінаў, а пасьля вярнуўся дадому, загадаўшы адвесьці скакуна ў стайню. У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амэн. Места зноў выкінула са мною д'ябальскі жарт... Сыходзіць адсюль пры разнасьцежаных брамах было б нізкасьцю! А я ж меў

шляхетныя намеры. Я вырашыў нарэшце паведаміць Давіду аб усім, што адбывалася ў Арасе. Перакананы, што места апанавала шаленства, я шчыра жадаў уберагчы яго ад большых пакутаў і прывесьці чалавека, мудрасьць і цьвярозы розум якога неадкладна паклалі б канец усеагульнаму д'яблаваньню. Мне здавалася, што гэта абавязкова выкліча супраціў месьцічаў. Усе ведалі, што я асуджаў пастановы Рады. Было ясна, што Рада ня спыніцца на выгнаньні мяне са свайго кола, але прыме больш жорсткія меры. Празь некалькі папярэдніх начэй я не заплюшчыў вока. Людзей звычайна забіралі пасьля захаду сонца. З надыходам цемры я палка маліўся, каб лёс ухаваў мяне ад пакутаў. Калі я вось так трываў у горкім чаканьні, вярнуўся аднойчы да збаўленчае думкі, якая турбавала Арас. Запросіны ў места Давіда былі б паратункам для ўсяе грамады месьцічаў, якую апанавала шаленства. Я, безумоўна, усьведамляў небясьпеку падобных захадаў, але быў гатовы на ўсё. Баючыся, што магу быць схопленым у часе ўцёкаў, я выбраў найлепшага каня і пасьвяціў у свой плян даверанага чалавека. Але вось я застаў брамы спакусна расчыненымі, а вартавых – прынадніва абыякавымі.

Калі вы думаеце, што я прагнуў пакутніцтва і адступіў перад лёгкасьцю – вы памыляецеся. Мяне скарыла барбарская вера Рады ў маю ляяльнасьць! Калі перад тым я яшчэ мог сумнявацца ў звар'яцеласьці места, дык пасьля тае начное выправы да брамы Сьвятога Эгідыя я ўжо ня меў аніякіх ілюзіяў.

І калі пад вечар зьявіўся ў маім доме Альбэр, я ўжо ведаў дакладна, што толькі ў ягонай галаве мог нарадзіцца хітры плян расчыніць насьцеж мескія брамы.

У Арасе не было больш мудрага й годнага чалавека. Я выхоўваўся ў ягоным цені, ці, дакладней, у ягоным бляску. Мудрасьць гэтага сьвятога старца асьвятляла сьцяжыны майго жыцьця. Я прыехаў у Арас вельмі маладым чалавекам, які яшчэ не сканчаў школ, ня ведаў ні пісьма, ні добрых манераў. Мяне аддалі ў ягоную апеку, калі мне было год каля дваццаці і, па сутнасьці, я нічога ня ўмеў рабіць самастойна апроч тупога адгаворваньня пацераў. Ён заняўся мною сардэчна, ахінаючы ня толькі апекаю, але й шчыраю прывязанасьцю, якою мужчыны дарослыя і дасьведчаныя часам маюць звычай адорваць смаркачоў, у каторых бачаць працяг сваіх жыцьцёвых

памкненьняў. Клянуся Богам жывым, што ён бачыў ува мне наступніка!
Па праўдзе, я ніколі ня меў падобных схільнасьцяў. Гент зрабіў мяне трохі натурыстым, і хаця, па меры таго як ішлі гады, вобразы мінулага сьціраліся ў маёй памяці, усё адно ўва мне заставалася ахвота да сваволі ды незалежнасьці. У Генце людзі прымаюць рэчаіснасьць даволі лёгка. Належачы да тамтэйшае залатое моладзі, я неаднойчы аддаваўся забавам малапрыстойным. Я не цураўся ані любоўных уцехаў, ані добрага стала, ані нават ігрышчаў, якія суораму воку маглі падацца блюзьнерскімі. Ды не пра тое гаворка. Побыт у Генце даў мне пераканаьне, што хоць, па сутнасьці, я, можа, і не гаспадар уласнага лёсу, аднак заўсёды павінен імкнуцца быць ім! Шастэль, які ў той час быў маім мэнтарам і карыстаўся прыхільнасьцю герцага, меў звычку казаць, што не йснуе нічога болей заганнага за пераканаьнасьць, быццам чалавек не зьяўляецца вольным. Шастэль казаў – найчасьцей за шчодра ўстаўленым сталом, – што сумневы ў вольнасьці змушаюць чалавека думаць азадкам замест галавы. «Азадак, – гаварыў Шастэль, – робіцца ў гэтым разе быццам са шкла. Чалавек ужо ні пра што іншае ня можа думаць, як толькі пра ўратаваньне свайго сядзельна, якое стала крохкім і звышдалікатным. Між тым, – дадаваў ён звычайна, – добры Бог даў нам азадкі, каб мы маглі атрымаць высьпятка!» Грубасьць гэтага пагляду зусім не азначала павярхоўнасьці. Падчас надзвычай раскошных бяседаў, у таварыстве пекных кабет і дасьціпных кавалераў, дасьпяваў я да ўпэўненасьці, што сам варты таго, каб думаць па-свойму і на сваю мерку.
Таму я пакідаў Гент хаця й маладзёнам, але не без ганарлівае пераканаьнасьці, што я дастаткова вольны, каб хадзіць уласнымі сьцежкамі. Але, праўду кажучы, калі я апынуўся ў самоце, без таварыства маіх субяседнікаў і сяброў, без Шастэля і ягонай надзейнай апекі, я хутка трапіў у паняверку. Першыя тыдні ў Арасе я правёў у малітвах, пастах і пакоры. У часе размовы з Альбэрам, неўзабаве па прыезьдзе ў Арас, я перажыў глыбокае ўзрушэньне. Ён задаў мне пытаньне – на першы погляд простае, але якое ніколі раней не прыходзіла мне да галавы: «Дзе пэўнасьць і скуль яна ў табе бярэцца, што больш слушна давяраць свайму розуму, ніж адкрыцьцю Божаму? Ці верыш ты ў Бога?» Я адказаў палка й пераканана, што веру ў Бога. Тады

ён запытаў, ці веру я ў д'ябла. Я адказаў, што веру ў д'ябла. Тады ён запытаў, ці я веру, што Бог і д'ябал змагаюцца за маю душу. Я сказаў, што і ў гэта шчыра веру. Ён запытаў – усё яшчэ тонам мяккім і быццам бы вясёлым – ці веру я, што як Бог, так і д'ябал уплываюць на мае думкі. Я даў адказ, што, несумненна, так і ёсьць. «Вось жа, – сказаў ён, – станаўленьне твайго розуму ўяўляе сабою нешта, што падобна да няспыннай вайны. Ласка нябесная змагаецца ў табе з падшэптамі пекла. Дык у чым ты знаходзіш пацьверджаньне, што твая кульгавая думка, аблытаная тысяччу залежнасьцяў, уплываў, густаў, пажадлівых прыхамацяў, боязяў ды капрызаў, можа быць больш яснай і плённай у пазнаваньні волі Божае, чым вучэньне Царквы?.. Мы жывем у бязьлітасны час, дарагі Яне. Людзі ўжо больш ня хочуць быць сумленнымі хрысьціянамі – яны бяруць прыклад з распусных герцагаў і дурных біскупаў, аддаюцца дзівосным вычварэньням, шукаюць Божае прысутнасьці ў штодзённым жыцьці і стараюцца высачыць замыслы Бога, каб выйсьці ім насустрач. Але ж Бог не жадае, каб людзі так заўзята дбалі пра збаўленьне. Гэта ясна, што кожны прагне вечнага шчасьця, але няхай жа ён аддасьць свой лёс у рукі Госпада нашага Ісуса Хрыста і няхай не спрабуе Яго замяніць... Яне, даверся мне! Я правёў усё жыцьцё сярод кніг ды трактатаў наймудрэйшых аўтараў. Гэта ўсё сьмеху варта! Я пагарджаю ўсімі тымі ўзурпатарамі, якія прагнуць – давяраючы розуму – ураставаць сьвятую Царкву. Наймагутнейшаю сілаю Царквы зьяўляюцца сакраманты, бо яны ёсьць вузкаю кладкай, па якой Бог прыходзіць да нас па-над безданямі жыцьця. Захоўваючы вернасьць сакрамантам, ты захоўваеш вернасьць Богу. Тады Ён з табою, а ты – зь Ім. І калі Ён даў табе розум, дык не дзеля таго, каб ты імкнуўся на неба, а каб ведаў, як рухацца па зямлі».

Тады я запытаў, дзе знаходзіцца душа, а ён дакрануўся да маіх грудзей і сказаў, што там ёсьць душа, дыханьне Бога, сіла, дзякуючы якой я рухаюся, адчуваю сьпякоту і холад, сплю, ем, гавару і думаю. Я спытаўся, ці таксама дзякуючы гэтай сіле я адчуваю пажаду да кабет, на што ён адказаў, што, несумненна, гэта так, бо Бог зусім не вымагае зрачэньняў; Ён велікадушны і любіць мяне, а таму стварыў кабету, каб я мог яе жадаць і ёю валодаць. «Толькі дурні лічаць, – гаварыў ён гнеўна, – што кабета ёсьць зброяй шатана. Яна мае несьмяротную душу і

прывабнае цела. Калі б яе стварыў шатан, яна была б рапухай...»
Тады я насьмеліўся яго запытаць, ці душа, удары якой я адчуваю ў грудзях, дадзена таксама кожнаму стварэньню. Ён адказаў, што, здаецца, ня будзе памылкаю меркаваць, што Бог абдарыў сабаку, ката, карову і нават асла нечым накшталт сьвятое іскры, якая дазваляе ім існаваць, мучыцца і радавацца. Я адчуў у гэтым яўную герэзію і сказаў, што ягоныя словы падаюцца мне неадпаведнымі вучэньню Царквы. Ён пасьміхнуўся лагодна: «Мой Яне, – сказаў, – ня ўсё, чаго Бог хоча, запісана ў кнігах, і ня ўсё, што Бог задумаў, вядома чалавеку, хай нават ён належыць да герархаў Царквы. Уяві сабе, напрыклад, што твае скакуны й статкі, якія пасьвяцца на лугох Брабанту, таксама маюць нейкае жывёльнае неба. Што ж у гэтым кепскага і дзе тут абраза хрысьціянскага вучэньня? Сьвяты Францішак казаў пра каня: «Брат мой, конь», а пра павука: «Брат мой, павук». Ці ж нельга прыпушчаць, што Творца ў сваёй неапісальнай ласкавасьці і дабрыні пасылае розныя лёсы коням, каровам, козам і жаўрукам, каб іх выпрабаваць у радасьці й пакуце?! Толькі тое пэўна, што чалавека стварыў Бог на свой вобраз і падабенства, а таксама даў яму розум, што зрабіла нас самымі нешчасьлівымі істотамі пад сонцам. Патрабаваньні Бога да чалавека тысячакроць большыя, чым да пацука, але гэта зусім ня значыць, што пацук будзе асуджаны на векі вечныя. Молячыся за сябе й за мяне, ты павінен часьцінку сваіх узьнёслых пачуцьцяў прысьвяціць жывёлам, дрэвам ды зоркам, каб і яны апынуліся ў нябесных сьпісах». Ён прамаўляў доўга й гэтак шляхетна, што ў мяне па твары цяклі сьлёзы, а сэрца перапаўнялася ўдзячнасьцю і павагай. Гэта, аднак, не азначала, што я без ваганьняў і сумневу прымаў ягоныя настаўленьні. У маёй галаве, праўду кажучы, было пуста, але ў касьцёх я яшчэ насіў генцкае свавольства, і яно падбухторвала мяне да пэўнае ўпартасьці. Мы гаманілі тады ўсю ноч, аж пакуль сонца ня вызірнула з-за пагоркаў і не асьвятліла завулкі места. Я пытаў яго пра роўнасьць людзей перад Богам і ў дачыненьні да зямное экзыстэнцыі. «Чым жа горшы пастух тваіх статкаў ад цябе? – адказаў Альбэр. – Вядома, ён горшы паходжаньнем. Ты прыйшоў на сьвет у добрай сям'і, якую паклікала неба сьвяціць узорам цнотаў ды справядлівасьці. Людзі ж простыя і жыцьцё маюць простае.

Няма сэнсу чакаць ад іх чынаў, якія прызначаны для цябе. Не азначае гэта, аднак, нічога іншага, як толькі большыя абавязкі. Не дзеля таго ты маеш статкі тлустых кароваў і добрых коней, каб жыць у нікчэмнасьці, а дзеля таго, каб зазнаць больш балючыя выпрабаваньні. Калі Госпад хоча выпрабаваць жабрака – ён спасылае заразу. І калі хоча выпрабаваць цябе – таксама спасылае заразу. Уяві сабе пакуту жабрака, скурчанага ля храмавай брамы, цела якога пакрыта скульлем, і ўяві сабе пакуты багацея, што канае ў гноі й задусе цудоўных палатаў, сярод слуг, годных апекуноў і пекных выляжанак. Калі табе дадзена высокае паходжаньне, дык толькі дзеля таго, каб ты ўпаў з вышыні. Божым выракам так адбываецца, што ўсялякая выгода й вытанчанасьць твайго існаваньня спрычыніцца да тым больш цяжкай і сумнай сьмерці. Бо растаўацца з нэндзаю нескладана».

Праўду кажучы, мне хацелася выкпіць гэтыя навучаньні, бо не падабаліся мне такія слоўныя выкрутасы. Раздражняў мяне ў Альбэру ягоны вычварны рытуал мысьленьня, а таксама ягоная шматслоўнасьць, што паходзіла з даўніх часоў, калі людзі ні пра што іншае, апроч Госпада Бога ды ягоных Сьвятых, размаўляць не былі здольныя. О, я верыў палка і быў пабожным хрысьціянінам, але я не зьбіраўся марнаваць цэлае жыцьцё ў спробах зразумець замыслы Божыя ды стараньнях Яму спадабацца. Што Бог хоча са мной учыніць – гэта Ягоная справа. Я меркаваў, што мая справа – жыць у згодзе з такой натурай, якой я быў адораны. Калі хочаце, можаце лічыць мяне трутнем! Бо, па праўдзе, я толькі аднаго прагнуў больш за ўсё – вольнасьці! Калі Бог станавіўся ў мяне на дарозе – я абмінаў Яго. Спадзяюся, што ў сваёй дабрыні Ён прабачыў мне велікадушна...

Вольнасьць... У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амэн. Азначае гэта быць тым, кім нас неба стварыла. Гэта – вольнасьць глупства й мудрасьці, свавольства й пакуты, шчасьця й няшчасьця. Пры ўсёй павазе, якую я меў да Альбэра, заўсёды мне здавалася, што сядзіць у ім кавалак тупога папа. О, як жа ён прагнуў змагацца за збаўленьне душ... Нават над хрушчамі ён схіляўся, апантаны сваім пасланьніцтвам. Менавіта гэтае пасланьніцтва я лічыў асаблівым відам зьняволенасьці. Калі ён чуўся добра ў шкуры прарока ды настаўніка – напэўна, быў вольны. Але калі намагаўся гэтую

шкуру і на мой карак нацягнуць, дык ператвараўся ў тырана. Аднаго разу ён задаў мне камэнтар да вялебнага Яна Герсона. Гэта была праца на тры тыдні зь лішкам. Быў час вясновы, места купалася ў праменьнях сонца. Пры канцы году прыехаў у Арас герцаг Філіп, а зь ім – квяцісты й вясёлы двор. Як вы ведаеце, круцілася там мноства ангельцаў, бо, хоць герцаг і выгнаў іх за парог, пазаставаліся яны ў ягоных маёнтках, гуляючы ды п'ючы за бургундзкія грошы. Ангельцы заўсёды там, дзе добра... Калі настала адліга, Філіп зьехаў у Брусэль, але ў Арасе засталіся розныя людзі – абжоры, балбатуны, распусьнікі, а таксама трохі даступных кабет. Я не дзівіўся гэтаму. Стары Філіп брыдчэў, усё больш палка адгаворваў пацеры, нядобрым вокам спаглядаў на гэтую крыклівую і юрлівую шаць – дык частка двара разважліва вырашыла, што лепей застацца ў Арасе, пад міласьцівай, а да таго ж далёкай, уладай Давіда. Каралеўскія бастарды больш лагодна ставяцца да распусты, чым іхныя шляхетнароджаныя бацькі. Такім чынам, тае вясны Арас поўніўся гаманлівай гурмою бургундцаў ды ангельцаў, ахвочых да келіха. Была там ангельская дзеўка, вельмі спраўная ў любошчах. Мне было дваццаць, і начамі я сьніў кабет. Я закінуў у кут камэнтары Герсона, валачыўся па лугох з тою дзеўкай і меўся цудоўна. Пэўнага дня Альбэр накінуўся на мяне й зьбіў па твары. Я страшэнна тады пакутаваў ад болю ды прыніжэньня. Калі ж паправіўся, дзеўкі ўжо ў Арасе не было, а Альбэр узяўся мяне дапытваць. «Дзе ж пэўнасьць, – сказаў я тады фанабэрыста, – што больш годна славіць Бога дыспутам аб творы майстра Герсона, ніж чалёсамі?! Ты казаў мне пра любоў, Альбэру. Я стакротна болей люблю ўлоньне кабеты, чым кнігі старых псюкоў з Сарбоны. Герсону не патрэбныя мае разважаньні! Ён распаўся ў пыл і, у найлепшым разе, мы ўбачым яго ў даліне Ёсафата празь пяць тысяч гадоў. Што ж датычыць гэтай ангельскай дзяўчыны, дык мы ўдваіх на прымескіх лугах каштавалі шчасьця. І дзе ж пэўнасьць, што гэта не падабаецца Богу?» – «Ты блюзьнерыш», – крыкнуў Альбэр.

Такі ён быў заўсёды. Калі ён павучаў, мудрасьць ды памяркоўнасьць бруілі зь яго, як вада з крыніцы, але калі хтосьці спрабаваў жыць згодна з прынцыпамі ягоных павучаньняў – дык ён адразу ж пачынаў пагражаць пеклам... Ён пеставаў у сабе чыстую ідэю, паводле якой паміж Богам і

чалавекам існуе цудоўная гармонія, але яго раздражняла яе ажыццяўленьне.
У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амэн. Усё добра, мае панове, але менавіта гэта і было пеклам. Уявіце сабе маё існаваньне пры боку гэтага годнага й разумнага настаўніка, які мог бы служыць узорам усіх цнотаў. Ён казаў мне: «Любі жывёлаў, бо гэта твае браты меншыя». Але калі я загадаў сыпаць поўна зерня маім коням, бо надышла суворая зіма, ён абвінавачваў мяне ў легкадумнасьці й марнатраўстве. Ён казаў мне: «Любі кабету, бо яна табе дадзена Богам». Але калі я трымаў выляжанку ў доме, ён выгнаў яе з крыкам, які чула ўсё места, а мяне абвінаваціў у распусьце, што – рэч ясная – выклікала ўсеагульны сьмех у Арасе, дзе кожны прыстойны месьціч болей меў дзевак, чым скакуноў. Ён казаў мне: «Любі блізкіх і прымай іх як сабе роўных, бо яны – роўныя табе». Але калі я стараўся дастасавацца да гэтых павучаньняў – мардаваў мяне дысцыплінаю, кажучы, што я вар'яцею. Ён казаў мне, каб я ня брыдзіўся жыдамі, але не хацеў есьці ў маім доме, бо абедалі ў ім жыдоўскія банкіры з Утрэхту. І, што найгорай, не было ў ім нат каліўца крывадушнасьці. Ён хадзіў па Арасе закуты ў дасьпехі сваёй веры, гэткі сьціплы, што амаль ганарысты, гэткі мудры, што амаль дурны, гэткі шляхетны, што амаль нікчэмны. Толькі аднаго ён баяўся на сьвеце больш, чым пекла. Давіда ён баяўся, мае панове.
Аднаго разу я прысутнічаў пры іхнай размове. Давід прыехаў у Арас зьнянацку, зь невялікаю сьвітай. Ён спыніўся ў Альбэра, а вітаючы таго – пакланіўся нізка да зямлі. Ён быў рослы, чорны, смуглы ад паўночных вятроў. Альбэр жа – белы, як сьнег, сагнуты векам, з даўгой сівой барадою. Каралеўскі бастард, нястомная кроў, увасоблены д'ябал, абжора, хлус, поўны дзікае пыхі ды найшалёнейшых задумаў, а насупраць яго – мудрэц, зьлеплены з адных ведаў, павагі ды цнатлівасьці. Дзьве стыхіі – нібы сабакі, спушчаныя з ланцуга. Ах, панове, якая ж гэта была надзвычайная размова...
Альбэр запрасіў Давіда да стала, на што той адказаў:
— Вашая Вяльможнасьць, я ня звык вячэраць, грызучы карэньчыкі...
Ён заўсёды зьвяртаўся да Альбэра «Вашая Вяльможнасьць», а той палаў румянцам ды мармытаў ціха: «О, мой герцаг...» Рэч ясная, кожны баляваў па-свойму. Давід жор за дзесяцёх, кідаў

вакол косьці, абсмоктваў тлушч з пальцаў, засунуўшы іх у рот. Я паглядаў уважліва на Альбэра, якога адразу ж пакінуў апэтыт. Клянуся Богам, я ведаў, што чыніць герцаг! Ён зусім ня быў такі хамула, такі прасьцяк, якім хацеў тады выглядаць. Ён іржаў як конь, кісла бзьдзеў за сталом, што не выклікала добрага ўражаньня нават у людзей, аддадзеных яму ўсім сэрцам. Напраўду, ён трохі перабраў... Але калі распачалася размова – толькі тады зазьзяў біскуп утрэхцкі.
Яны размаўлялі аб натуры чалавека. Альбэр, як звычайна, учапіўся за свае літасьцівыя формулы.
— Пане, – кажа, – хто шчыра любіць сваю маці і ставіцца ласкава да жывёлаў, як наказваў і навучаў сьвяты Францішак, той несумненна павінен быць добрым чалавекам...
— Ну бясспрэчна, – рыкнуў Давід. – Быў у мяне адзін бамбіза, які часам душыў для мяне непакорных падданых, атруту падсыпаў, нож, бывала, пад рэбры ўсаджваў на мой загад... Аднойчы прыходзіць ён да мяне, заліты сьлязьмі. Што сталася? – пытаю я нягодніка. Пане герцагу, кажа, маці ў мяне памерла сёньня на сьвітаньні. І такі ён быў несуцешны, што – уяві сабе, Вашая Вяльможнасьць, – мусіў я яго на тыдняў колькі вызваліць ад усялякае працы, бо ў яго рука дрыжэла і ён мог пакалечыць чалавека, замест таго каб на неба адправіць. Што тычыцца жывёлаў, дык ён любіў іх сардэчна і чула...
Альбэр лыпнуў вокам, прыкусіў губу і кажа, што выключэньне пацьвярджае правіла. На гэта яму Давід, што і ён таксама належыць да тых выключэньняў, бо любіць маці моцна, свае коні і сабакі пялегуе як мала хто, а славаю найлепшага чалавека ў Брабанце, здаецца, ня цешыцца...
— Гэта толькі капрыз Вашае Дастойнасьці! – выгукнуў Альбэр. Без малога паўночы я катаўся са сьмеху, чуючы гэткія высновы. Калі яны пад'елі як належыць, Давід выклаў мэту прыезду.
— Вашая Вяльможнасьць, – кажа ён з ласкавай пасьмешкай. – Я прыехаў у Арас, бо мне данесьлі, што месьцічы змораныя і асавелі ад бесьперастанных пастоў, працэсіяў ды клопату аб вечным збаўленьні. Я таксама турбуюся аб вашым збаўленьні і, клянуся сьвятымі ранамі Хрыстовымі, ні пра што іншае ня думаю ды нішто мяне не напаўняе такою згрызотаю, як змарненьне цнатлівага жыцьця. Але рэч у тым, што пагалоўшчына з Брабанту мізарнее, мой каралеўскі айцец вельмі раззлаваны тым, што паступленьні з паўночных местаў

нязначныя, што гандаль у нас – як дыхавічны конік, а муры мескія скрышаныя і ад часоў ангельскага прыгнёту ніхто да іх рукі не прыклаў, што па гасьцінцах валочацца ўсюды рабаўнікі ды пакутнікі – ажно для купцоў ужо месца няма... Я рады быў бы месту Арас прыхільнасьць неба здабыць, але ж зважай, Вашая Вяльможнасьць, з чаго нам хлеб штодзённы есьці даводзіцца. Душа душою, але й целу крыха належыцца!— Вашая Дастойнасьць! – выкрыкнуў Альбэр, але біскуп перапыніў яго рухам рукі і казаў далей, ужо менш лагодным тонам:
— Мы ведаем адзін аднаго, шляхетны ойчыку, як два лысыя кані. Ты, Вашая Вяльможнасьць, збаўляй людзкія душы, але ў дзьве нядзелі мусіш заплаціць маім зборцам шэсьцьдзесят дукатаў...
У Альбэра дрыжэлі рукі.
— Столькі багацьця! – загукаў ён у роспачы. — Каб я трошкі паскроб, – сказаў Давід, – дык у тваіх скрынях знайшоў бы тысячы...
— Я гэтага ўчыніць не магу, – кажа Альбэр. – Я ня буду грабежнікам тутэйшых людзей...
Біскуп мала з лавы ня ўпаў – такім выбухнуў сьмехам... — Ойча, – сказаў ён праз хвіліну. – Дзе ж напісана, што людзі больш прагнуць збаўленьня душы, чым дастатку? Места Арас гіне! Усё цяжэй і складаней тут жыць. Ты бесьперастанку красамоўнічаеш пра Госпада Бога ды Ягоных сьвятых, удзяляеш сакраманты, а ў той жа час парша точыць быдла, гасподы занепадаюць, няма ўва што апрануцца і што на зуб пакласьці. Месьцічы тутэйшыя ўцякаюць у іншыя краі, дзе менш сьвятасьці, затое больш харчоў. За шэсьцьдзесят дукатаў, якія ты мне дасі, я давяду гэтае места да ладу. Ты мяне знаеш, Вашая Вяльможнасьць, і ведаеш, што я – добры гаспадар. Табе здаецца, што калі прыгнятаеш людзей з божым словам на вуснах, дык ужо ім лёгка. Мая ж улада грунтуецца на іншым. Спатрэбіцца – уцісну, а спатрэбіцца – паслаблю. У Утрэхце відно шмат вясёлых твараў, а ў вас у Арасе ўсе вусны шнуруюць у малітве.
Альбэр падняўся ад стала, узнёс рукі. Я ўжо ведаў, што зараз ён скажа адну са сваіх цудоўных фразаў, якімі карміў Арас на працягу двух дзясяткаў гадоў. І сапраўды ён прамовіў: — Вашая Дастойнасьць, трэба над усім любіць тых, кім правіш...

А той ізноў рыкнуў сьмехам. — Ідзі ты да ка́та, Альбэру. Тваю любоў яны могуць засунуць сабе ў зад! Ня тое важна, каб іх любіць, а тое, каб яны добра чуліся! Што з таго, што ты іх любіш, калі ім дрэнна? Мяне ў Утрэхце любіць мала хто, а я не люблю нікога. Але я хачу бачыць задаволеныя твары і паўсюдную сытасьць, бо толькі тады буду чуцца бясьпечна, каштуючы асалодаў жыцьця!— Вашая Дастойнасьць, – выкрыкнуў Альбэр, – ты імкнешся здабыць папулярнасьць у натоўпу. Калі б яны нат пажадалі барбарскіх гульбаў, і то б ты не адмовіў! Ты прагнеш ухваленьня, тады як я прагну над усім узвышанасьці людзкіх сэрцаў.
— А йдзі ты да ка́та, Альбэру, з гэтай узвышанасьцю. Калі б мой бацька кіраваўся як належыць запаведзямі Гасподнімі, я б увогуле не зьявіўся на сьвет. Ён спладзіў мяне грэшна; я плён ягонае разбэшчанасьці, але, прынамсі, ведаю, што быў пачаты ў раскошы, якой узорны шлюб айцу майму не даваў. Дык не патрабуй жа ад мяне, Вашая Вяльможнасьць, узвышанасьці пачуцьцяў! Мне больш блізкія тыя месьцічы Арасу, якія прагнуць хлеба ды забаваў, чым Ты, ойча, са сваімі казанямі.— Кожны валадар, – сказаў Альбэр, – які змагаецца за душы падуладных, зьяўляецца самотным.
— Вярзеш, Вашая Вяльможнасьць. Ня кожны, а толькі той, хто гэтага прагне.
Тады Шастэль, які суправаджаў герцага, схіліўся ў ягоны бок і сказаў ціха:
— Што б ні рабілася ў Арасе, але прызнаць трэба, што наш ойчык Альбэр чысты як сьляза!
— І што з таго, што чысты, калі дурань! – буркнуў біскуп утрэхцкі. Напраўду, гэты чалавек быў спрытны на язык. Хто іншы апроч яго здолеў бы з гэткай жа трапнасьцю пацэліць Альбэру проста ў сэрца.
Пачалося ўсё, так бы мовіць, нявінна. Хто б мог падумаць, што такога роду драбяза дасьць пачатак жудасным падзеям. У суконьніка імем Гервазі, якога клікалі Дамаскіным – бо калісьці ў Сырыі бываў і меў шырокія сувязі сярод тамтэйшага купецтва, – паў конь. Па праўдзе, здарэньне асаблівае! Зважаючы, што конь быў здаровы й моцны. Двухлетак, добрае крыві, які выкарыстоўваўся для верхавое язды і быў ахінуты надзвычайнай апекаю ў стайні ягонага ўладальніка. Конь, як я ўжо казаў, быў папярэдняга вечара здаровы, а калі гаспадар

абыходзіў сядзібу перад сном, зьвярнуў нават увагу, што жывёліна маецца цудоўна й даў загад стайніку, каб зранку асядлаў скакуна і вывеў яго пад браму, бо Гервазі хацеў ехаць з саржаю ажно ў Ліль. Назаўтра ўбягае стайнік у спальню гаспадара й кажа, што конь паў. Зьбегліся хатнія. Жывёліна ляжыць бяз руху на зямлі, жывот надзьмуўся, а храпы пакрытыя застылай пенай. «Што ён еў уначы?!» – крычыць Гервазі. Яму кажуць, што нічога не давалі. «У мяне атруцілі каня!» – гукае суконьнік. Але гэта было зусім немагчыма, бо перад змрокам вароты дому былі зачыненыя, а ўсе жыхары сядзібы былі людзьмі знанымі на працягу гадоў і цешыліся даверам гаспадара. Гервазі бедаваў доўга над стратаю пекнай жывёліны. Каля поўдня прыйшоў да яго знаёмы вяровачнік, чалавек багаты, які трымаў у сябе трох чаляднікаў і меў за местам вялікі сад. Гэты вяровачнік і кажа: «Чуў я, Дамаскін, што напаткала цябе вялікае няшчасьце. Конь твой паў гэтае ночы... Дык жа ж ведай, што я праходзіў паблізу стайняў і бачыў у сьвятле паходні жыда імем Цэлюс, які кідаў праклён на ўсю тваю гасподу».

Гэты вяровачнік пацэліў у яблычак, бо Дамаскін меў звады з Цэлюсам ужо многа год. І сапраўды, у справе таго каня не магло абысьціся без удзелу нячыстай сілы, бо хто ж чуў, каб жывёліна пала так раптоўна? Дамаскін пасьпяшаў у Раду і склаў скаргу. Я пры гэтым не прысутнічаў, бо ў той дзень меў іншыя заняткі, якія не дапускалі адкладу, але ведаю, што суконьніка выслухаў сам Альбэр.

— Прадстаў сьведку, – кажа ён раззлаванаму скаржніку.

Умомант прывялі ў Раду вяровачніка.

— Прысягнеш, што ты бачыў? – пытаецца Альбэр.

— Прысягну на Ранах Хрыстовых.

Фар'я дэ Сакс, які быў вельмі дасьведчаны ў галіне кампэтэнцыі ды нормаў права і засядаў у Радзе з адсутнасьці цікавейшага занятку, сказаў Альбэру:

— Ойча, ня слушна тое, каб ты вырашаў справы, датычныя мяшчанаў. Нават калі яны сёньня выкажуць задавальненьне з твайго прысуду, заўтра ўзьнімуць лямант, што ты маніпулюеш местам паводле ўласнае волі. Няхай лепей яны самі дапытваюць Цэлюса.

Усчалася немалая спрэчка. Альбэр, які ніколі не адмаўляў сабе ў задавальненьні вяршыць суд, запярэчыў Фар'ю дэ Саксу,

спасылаючыся на паходжаньне Цэлюса.
— Дзе ж тое напісана, што мескія трыбуналы павінны судзіць жыда?! Жыда можа судзіць кожны!
На гэта Фар'я дэ Сакс:
— А дзе напісана, што жыда можа судзіць кожны?
Рэч ясная, спрэчку выйграў Альбэр, бо для яго вынік быў сутнасна важны, тады як дэ Сакс усё разглядаў як забаву. Ён быў надта багаты і знуджаны, каб надаваць вагу чаму-колечы. Калісьці я застаў яго ў касьцёле ля канфэсіянала, і ён сказаў мне, што грашыць з нуды, а потым з нуды і спавядаецца... Быў гэта, сапраўды, адзіны вялікі чалавек у месьце Арас! Няхай спачывае ў спакоі...
Такім чынам, прывялі Цэлюса.
— Ці кідаў ты праклён? – пытаецца Альбэр.
— Вашая Вяльможнасьць, я на гэта ня здатны.
— Кажуць пра цябе, што ты – разумны жыд.
— Тым болей ня здатны!
— Ці ж гэта азначае, што для дзейснага праклёну патрэбна няведаньне?
— Для адных гэта азначае адно, а для другіх – другое... кожны чытае тое, што хоча прачытаць! — Прызнайся, Цэлюсе. Ты ненавідзіш Гервазія Дамаскіна...
— А ці мушу я горача яго любіць, Вашая Вяльможнасьць?! Калі так, дык палюблю. — Ты ўжо не ўпершыню становішся перад Радаю, Цэлюсе. Тры гады таму, здаецца, ты апаганіў хрысьціянскія парэшткі. — Вашая Вяльможнасьць памыляецца. Я ня меў з тым нічога супольнага; мяне тады не было ў месьце, як пераканаўча давяло сьледзтва. — Аднак жа ты ня будзеш пярэчыць, што быў замяшаны ў справу. — Гэтаму запярэчыць не магу, бо так было... Але...
— Цэлюсе, данесена нам, што ты працівіўся гасьціне пана дэ Сакса, як наказвае звычай. — Вашая Вяльможнасьць, пан дэ Сакс засьведчыць, што я заўсёды вітаў яго з належнаю пакорай. Пан дэ Сакс прыяжджаў разам з двума хартамі і адным выжлам, і я ніколі не абразіў ягоных правоў. — Але ты не лічыў гэтыя правы справядлівымі. — Не мая гэта справа судзіць, што справядліва ў месьце Арас, а што – не... — Ці гэта мае азначаць, што табе гэтае места – чужое? — Гэтага я не сказаў, Вашая Вяльможнасьць. — Але так падумаў, Цэлюсе. — Прашу прабачэньня, але скуль Вашая Вяльможнасьць ведае мае

думкі?!
— Ты тут не для таго, каб задаваць пытаньні, а каб на іх адказваць...
Так гэта цягнулася аж да позьняга вечара. Мне было шкада Цэлюса, хоць ён і жыд, – але я не мяшаўся ў гэтую справу. Паказаньні вяровачніка прынялі за довад, што ад пачатку было ясна. Тае ж ночы Цэлюс павесіўся ў сутарэньнях ратушы. Пан дэ Сакс меў мужнасьць заявіць Альбэру: — Ойча, кроў гэтага жыда – на тваім сумленьні.
На што Альбэр адказаў напышліва: — Ты гаворыш аб тым, чаго сам ня знаеш і чым не распараджаешся.
Фар'я дэ Сакс, выходзячы з раднае залі, буркнуў да мяне: — Такія, як ён, заўсёды найгоршыя. Яны забіваюць бязгрэшна.
Я чуў, таго дня пан дэ Сакс напіўся шалёна. Быў гэта адзін зь нямногіх дзён ягонага жыцьця, калі ён ня нудзіўся.
Аднак ня ўпой Фар'і выклікаў напружанасьць у месьце. У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амэн. Мае панове! Ваш погляд на месьцічаў Арасу можа быць сёньня поўны непрыязьнасьці і нават агіды, бо сапраўды яны дапусьціліся рэчаў, якіх сьвет ня бачыў. Але ўсё ж гэта быў кон. Я ведаў гэтых людзей. Яны не былі злыя і, напэўна ж, яны не былі горшыя ад іншых жыхароў Брабанту, дый усяго герцагства. Арас, праўда, ня даў сьвету надта шмат пабожных мужоў ды цнатлівых жанок; было там багата зайздрасьці, паскудзтва, сьвінства; не адзін нягоднік зьвіў сабе цёплае гнязьдзечка ў мескіх мурох, але таго вечара, калі разьнеслася вестка пра сьмерць жыда Цэлюса, – амаль усе месьцічы прызналі сябе сувінаваўцамі забойства. О, я ня буду тутака даводзіць, што яны любілі жыдоў ды іхныя чырвоныя латы на каптанах; што без усялякай агіды сутыкаліся зь іхнымі плячыма ў мітусьлівыя дні кірмашоў альбо верылі жыдоўскаму слову. Усе месьцічы разумелі, што жыды – гэта чужацкая стыхія і што Бог цяжка выпрабоўвае места, асуджаючы яго на сужыцьцё з катамі Ісуса Хрыста. Але менавіта таму, што яны зьяўляліся прававерными хрысьціянамі і падпарадкоўваліся судам Божым, былі яны тою супольнаю глебай, на якой магло ўзрастаць жыдоўскае насеньне.
Я ня цешыўся асаблівай сымпатыяй у Арасе, гэта напэўна! Я быў прыбышом зь іншага краю, быў вухам і вокам утрэхцкага двара – таму мой дом абыходзілі здалёк і мне не давяралі. Але тым ня менш, у той вечар менавіта да мяне яны прыйшлі са

сьлязьмі й лямантам. — Жыд Цэлюс павесіўся ў ратушы! – гукалі яны з засмучэньнем. – Пан Альбэр несправядліва зь ім абышоўся... Гора нам, бо Бог не адпускае такіх агідных грахоў!
— І што я маю зрабіць? – пытаўся я. — Ідзі да біскупа Давіда, які ёсьць тваім сябрам, і прасі яго, каб прыехаў у вернае места Арас. Безь ягонае прысутнасьці нас усіх напаткае няшчасьце. Мы прагнем змыць нявінную кроў, што пала на жыхароў Арасу. Няхай нам біскуп скажа, што мы павінны чыніць...
Што я мог адказаць? Мне здавалася сьмешным ехаць у Утрэхт або Гент, зьяўляцца перад абліччам Давіда і прасіць яго аб прыезьдзе. Спаглядаючы на гэты маркотны натоўпік мяшчанаў з вышыні свайго дому, я ўявіў сабе пасьмешку Давіда, калі б я яму пераказаў просьбу ягонага статку.
Мае панове! Вы ведаеце герцага ня горай за мяне. Гэта вялікі чалавек і ўзорны хрысьціянін. Але тым ня менш... Я ўявіў сабе, што вось прыяжджаю ў Гент, пакідаючы па сабе палых у дарозе коней. Уваходжу ў біскупавы палаты, увесь пакрыты пылам і потам, з пасечаным восеньскім ветрам тварам. Давід вітае мяне ласкава: — Слава Найвышэйшаму, Яне, што ты тут! Я зьбіраюся заўтра на паляваньне, ты паедзеш са мной...
— Вашая Дастойнасьць, – кажу, – я пасланец места Арас. Тамтэйшыя людзі пакорна просяць, каб Ты прыехаў, бо баяцца кары Божай. Пан Альбэр давёў да сьмерці аднаго жыда імем Цэлюс...
— Жыда, кажаш?! – гаворыць Давід з пасьмешкаю. – І дзеля аднаго жыда я мушу ехаць у Арас?
— Не дзеля яго, Вашая Дастойнасьць, але дзеля жыхароў гэтага няшчаснага места!
— І чым жа я змагу памагчы месту, калі ў яго ікаўка... Я ня маю ахвоты спрачацца з Альбэрам за нейкую жыдоўскую падліну. Бог даў – Бог узяў! А ты, Яне, перастань мучыцца. Маю я дзеўку са Сьпіры, вялікае прыгажосьці; дам яе табе на дзьве ночы...
— Вашая Дастойнасьць, – кажу я ў роспачы. – Люд у месьце ўзбухторыўся. Я баюся хваляваньняў. Ты, Вашая Дастойнасьць, ведаеш, як лёгка ў сёньняшніх цяжкіх часох распаліць жарсьці. Яшчэ не загаіліся раны пасьля жахлівых людажэрстваў мінулых гадоў і ледзьве толькі места выкараскалася з прадоньня, як ізноў...
Давід падносіць далонь да твару, нібы адганяючы назойлівую муху. Я замаўкаю. Тады ён гаворыць: — *Рах, Рах!* Што там

здарылася з гэтым жыдам?
— Адзін чалавек паказаў, што жыд Цэлюс наслаў праклён на дом суконьніка, у якога паў конь добрае крыві. Конь быў здаровы і мусіў быў ісьці ў дарогу, калі раптам, пасярод ночы, паў у стайні з прычыны жыдоўскага праклёну...
— А якой быў масьці? – пытаецца Давід і сьмяецца. — Гэтага я ня ведаю, Вашая Дастойнасьць!
— Калі гняды, дык не шкада...
— Вашая Дастойнасьць! Я праўду кажу. Места ўзбухторылася...
— Ты нудзіш мяне, Яне. Калі ім няймецца пакутаваць, дык няхай вылупцуюцца. Скажы ў Арасе, што біскуп наказаў працэсію ды дзесяцідзённы пост... Але мушу сказаць, гэты ойчык Альбэр для мяне надта вялікі клопат... У яго рахунак просты. Адзін конь – адзін жыд. А як разьлічвацца з Богам, дык гэта мая справа. А што я Богу скажу? І адкуль я ведаю, ці ў думках Божых справядліва было жыда караць? Можа, аднаго жыда, можа, двух, а, можа, толькі палову... Я ня ведаю, у колькі ацэньваецца конь у стайнях нябесных.
Вось столькі здабыў бы я ў Генце – бы кот наплакаў... Таму абвесьціў я людзям, каб яны варочаліся дадому ды чакалі наступнага ранку. Сам жа пайшоў, каб паразмаўляць з Альбэрам. Ён прыняў мяне суха, як звычайна, калі прадчуваў спрэчку. Ён ніколі не пазбавіўся пераканаьня, што я хоць і зьяўляюся ягоным вучнем, аднак жа належу да чужынцаў – да таго аграмаднага сьвету, што раскінуўся за мурамі Арасу. Ён адшукваў ува мне – нават пасьля многіх гадоў, калі я ўжо даў яму шматлікія пацьверджаньні сваёй ляяльнасьці і нават сыноўскае прывязанасьці, – нейкія повязі з Давідам ці, яшчэ горай, з Шастэлем, якога ён ненавідзеў усім сэрцам. Колькі ж разоў ён папікаў мяне бракам руплівасьці хрысьціянскае, прыпісваючы віну за тое згубным уплывам Генту. Колькі разоў ён паўтараў з горыччу: «Табе здаецца, дарагі Яне, што над усім трэба шанаваць розум. І ты мяркуеш, што твае генцкія мэнтары з Давідам на чале менавіта розуму ўзносяць найвялікшую хвалу. У той час як, насуперак бачнасьці, ня ў розуме справа, а ў натуры. Сваю разумовую спраўнасьць Давід практыкуе ў ложку. Здаецца яму, што ён моцны, бо ні ў што ня верыць... Якое ж гэта глупства, Яне!» Ня кажучы таго непасрэдна, ён заўсёды падазраваў, што біскупскі двор мне бліжэйшы, чым тое было на самай справе. Ён думаў, што Давід прыслухоўваецца

да маіх радаў. У той час як у сапраўднасьці Давід бачыў ува мне сябра і таварыша на забавах, але заўсёды пільна ўнікаў больш сур'ёзных размоў. Але Альбэр не памыляўся, мяркуючы, што сэрцам я хутчэй з Гентам, чым з Арасам. Зрэшты, гэта крыху цешыла мае амбіцыі.
Таму й гэтым разам, прыйшоўшы да Альбэра, я быў трохі спаняволены. Ужо сам факт, што месьцічы зьвярнуліся да мяне, просячы аб пасярэдніцтве ў двары біскупа, быў для мяне неспрыяльным. І я зусім не зьдзівіўся, калі Альбэр, выслухаўшы маё паведамленьне, сказаў жорстка: — Калі цябе паслалі да Давіда, чаму ты прыйшоў да мяне?!
— Ойча, – кажу я як мага лагаднейшым голасам. – Няслушна б было ўмешваць у тутэйшыя спрэчкі біскупскі двор. Месьцічы ўзбухторыліся з прычыны выпадкаў, якія разыграліся ў мурох места, таму ў гэтых мурох і трэба прымаць адпаведныя рашэньні.
Ён зірнуў на мяне з-пад ілба, пасьля паціснуў плячыма непрыязна і зморана, нібы хацеў скінуць нейкі цяжар. — Ну, гэта гучыць разумна, канечне, але ў тваіх вуснах, Яне, гэта крывадушнасьць! Няўжо сьмерць гэтага жыда схіліла цябе да салідарнасьці зь местам, якой дагэтуль ты ніколі не адчуваў? Неспасьцігальныя суды Гасподнія... Раптам, у такую небясьпечную часіну, калі зьяўляецца мажлівасьць для ўмяшаньня Давіда ў нашыя справы, а месьцічы, што заўсёды так рупяцца, каб ніхто толькі не пазбавіў іх хаця б аднаго з прывілеяў ды не парушыў іхных правоў, уласнавольна зьвяртаюцца па рашэньне да двара, ты становішся апекуном мескіх вольнасьцяў і адмаўляешся ўмешваць чужынцаў у араскія справы?! Калі ўрэшце паўстала спрэчка паміж мною і месьцічамі ды надарылася такая цудоўная магчымасьць, каб выдаць мяне на пасьмех, выкпіць і прынізіць у вачох тых людзей, якіх я заўсёды любіў, ты, Яне, выказваеш мне спагаду? Глядзі, каб Давід не разьлічыўся з табою за гэткую слабасьць сэрца!
Раптам ён замоўк і падышоў да мяне. Глядзеў мне ў вочы з выразам чуйнае падазронасьці і нібы са зьдзіўленьнем. — А можа, ты ведаеш?! – спытаў ён зьнянацку, беручы мяне за руку. – Скажы шчыра, Яне! Можа, ты зразумеў, у чым тут справа?! Дальбог, у мяне нават у думках тады не было, да чаго ён вядзе. І відаць, ён вычытаў гэта ў маіх вачох, бо засьмяяўся зьедліва:

— Ну, так... Скуль жа гэта магло б прыйсьці табе да галавы! Мусіць, ніколі ён так мною не пагарджаў, як у тую хвіліну, калі заўважыў, што пераацаніў мяне. І адразу ж зрабіўся ўладарны, недаступны, пазбыўся нават зьедлівасьці, якая пры ягонай халоднай як лёд натуры часам выглядала крыхаю ўнутранага цяпла.— Зважай, – кажа ён, – што ты прыехаў у Арас шмат гадоў таму, яшчэ будучы птушанём! Гэтаму месту ты абавязаны сваімі посьпехамі. Яно зрабіла зь цябе чалавека асьвечанага і багатага, абдарыла цябе даверам і абцяжарыла часьцінкаю ўлады...
— Ойча, – перабіў я яго, – усё, што ты прыпісваеш месту Арас, гэта твая ўласная заслуга!
— І што з таго? – адказаў ён. – Ты дасканала ведаш, што няма мяжы, якая аддзяляла б мяне ад места і места ад мяне. Я – гэта яно, а яно – гэта я. Калі я нешта зрабіў для цябе – ты павінен быць удзячны ўсім месьцічам Арасу, бо гэта менавіта яны празь мяне кіруюць местам. Столькі гадоў я паўтараў табе безупынна, што хто змагаецца са мною – выступае супроць места, а хто імкнецца парушыць тутэйшыя правы ды прывілеі – робіцца маім ворагам. Гэта было б сьмешна, калі б у часіну выпрабаваньня дарогі тутэйшых месьцічаў разышліся. Толькі роспач ды бязладзьдзе ў галовах маглі ўчыніць, што прыйшлі яны да цябе з просьбаю запрасіць Давіда. Я ўзорваў гэтую глебу цягам дваццацёх гадоў, і я перааряў яе. Тут ня любяць біскупа! Ён не зрабіў нічога, каб заслужыць любоў. Колькі разоў ён сюды ні прыяжджаў, заўсёды здавалася, што места наведала грамада грабежнікаў. Мы жывем у Арасе высакародна, бязь лішкаў ды ганебнасьцяў, у якіх марнеюць Утрэхт і Гент. А што сталася з Брабантам? Усеагульнае крывадушніцтва, інтрыгі, звады, нікчэмнасьць. Давід трымае нанятых забойцаў, якія на першы ж ківок распраўляюцца з праціўнікамі двара. А ці бачыў ты калі забойцаў у Арасе? Ці ў нашым месьце трэба зьвяртацца да штылетаў і атруты, каб пад завесаю ночы забіваць ворагаў? Мы дасягнулі тут адзінства, якое бласлаўляюць Бог і людзі. — Пане, – прамовіў я, – жыд Цэлюс павесіўся ў ратушы!
— Я памятаю пра гэта... Бедны жыд! Пэўна, Госпад Бог захацеў учыніць зь яго ахвяру. Не забывай, Яне, – ня здарылася нічога, што ўскладала б віну на нашае места. Рада яшчэ ня вынесла прысуду. Цэлюс пазбавіў сябе жыцьця з уласнае волі. Ці ж ты ня бачыш усяе ўзьнёсласьці пачуцьцяў тутэйшых месьцічаў,

якія засмуціліся і журбуюць з прычыны сьмерці гэтага няшчаснага? Паспрабуй уявіць сабе падобную рэч у Генце або Утрэхце... Сьмеху варта! Каго ж там будзе турбаваць адзін жыдоўскі труп?! У той час як тут людзі прагнуць ачышчэньня. І яны яго атрымаюць! Таму хачу, каб ты зразумеў, наколькі ганебна і неразумна зьвяртацца да Давідавага суду. Ты вінен месту Арас ня толькі ўдзячнасьць, але й салідарнасьць у цяжкую часіну. — Менавіта так я й меркаваў, – адказаў я спакойна. – І таму прыйшоў да цябе, ойча, хоць месьцічы й патрабавалі, каб я адправіўся ў Гент.

Тады Альбэр ізноў засьмяяўся едка і сказаў: — Яне! Я ведаю цябе ўжо шмат гадоў. І заўсёды давяраў тваёй ляяльнасьці. Ідзі да людзей і скажы ім, што гэта нізка – шукаць апірышча на двары біскупа. Мы самі гаспадары Арасу, і толькі ў нашых руках лёс гэтага места. — Ці ня будзе лепей, ойча, каб ты сам спавясьціў гэта месту?

— Не, дарагі вучань! Я ніколі не таіў ад месьцічаў, якія пачуцьці маю да Давіда. Таму яны могуць маю пастанову прыпісаць непрыязнасьці ды недаверу... Ці ж не да цябе яны прыйшлі прасіць аб пасярэдніцтве? Хто ж можа быць лепшым пасланцом Арасу на утрэхцкім двары?.. Гэта будзе слушна і разважна, калі ты ім растлумачыш, чаму адхіляеш даверануюмісію. — Маеш рацыю, ойча! – адказаў я.

У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амэн. Мае панове! Толькі часткова адчуваю я віну за тое, што Бог спаслаў на места Арас. Я быў Ягонаю зброяй і верыў у Ягоную справядлівасьць. Дазвольце, аднак, прызваць у сьведкі нядаўнюю мінуўшчыну – тыя страшныя дні трохгадовае даўніны, калі голад і пошасьць апанавалі нашае места... Думаю, што менавіта там трэба шукаць прычыны, дзеля якой я прызнаў слушнасьць Альбэравых аргумэнтаў.

З надыходам вясны таго году пачало падаць быдла. Сьпярша ў гэтым не было нічога надзвычайнага. Заўсёды так бывае, што пасьля суворае зімы частка быдла худнее, ня есьць і падае бяз дай прычыны. Аднак жа тае вясны, калі памятаеце, таксама не адзін пастух аддаў Богу душу. Мы выйшлі за места з працэсіяй; білі званы. Дні надышлі дажджлівыя, халодныя, але потым зьнянацку неба разьясьнілася, прыгрэла сонца і ў мурох Арасу зьявіліся незьлічоныя хмары жамяры. З звычайна падмоклых лугоў, якія тады раптоўна павысыхалі, жамяра ўпаўзала ў

места. Ніколі раней не здаралася нічога падобнага. Места ахінула смуга туманоў, і ранкам і пры зьмярканьні нельга было разгледзець анічога на адлегласьці выцягнутае рукі. Удзень сонца прыгравала моцна, а ўначы холад зьвінеў сярод муроў. Пачалі паміраць людзі. Спачатку па аднаму, пасьля – па двое, а потым – дзясяткамі. Іхныя целы гнілі неймаверна хутка, былі пачарнелыя і распухлыя. Задуха не дазваляла дыхаць тым, хто рабіў памерлым апошнюю паслугу. Амаль адразу ж пасьля гэтага выбухнулі пажары. Пагарэла багата дабра ў людзей, перадусім жа – запасы харчоў, прыгатаваныя на пераджніўе. У гэты час прыехаў у Арас герцаг Давід. Вітаючы яго перад брамаю, я сказаў між іншым, што мала ёсьць моцных гэтага сьвету, якія праявілі б падобную сьмеласьць. Звычайна ў часіну заразы дастойныя людзі ўцякаюць дзе вочы вядуць, аддаючы на здабычу чэрні ўсё сваё майно. У такія хвіліны найлепей відаць, як мала значаць зямныя даброты перад абліччам пасланае Богам пагрозы сьмерці. Давід выявіў, такім чынам, рэдкі гарт сэрца, прыехаўшы ў апанаваны пошасьцю Арас.
Ён заехаў у муры з раскошнаю сьвітай. Перад ім несьлі рэліквіяр з кропляю крыві сьвятога Эгідыя, якую біскупы утрэхцкія атрымалі некалі ў дар ад графаў Сэн-Жыль.
Аднак жа гэты прыезд, што ўмацаваў сэрцы ўсіх месьцічаў, абярнуўся хутка супроць іх. Давід узяўся правіць сувора. Я не хачу, канечне, сказаць, што меў ён намер загубіць Арас, але шмат хто думаў менавіта так. Пад караю сьмерці загадаў ён паліць усялякі харч, да якога датыкаліся рукі памерлых ад заразы. Калі яго пераконвалі, што гэта вяр'яцтва – спусташаць места нат з тых сьціплых запасаў, якія яшчэ засталіся, ён абвясьціў, што болей давярае прыдворным мэдыкам. Ужо тады ён атачаў сябе гайнёй дармаедаў і ганарліўцаў, што цягаліся за ім уздоўж ды ўпоперак Брабанту і атручвалі ягоны высокі розум баёдамі. Што найгорай – пакідаючы Арас пасьля гэтых дзён суворага праўленьня, ён загадаў зачыніць брамы і выставіў варту ўздоўж муроў.
— Ты асуджаеш нас на выгаладзь! – крычалі сябры Рады.
— Маліцеся! – адказаў ён.
Праўду кажучы, ён не пакінуў нас у бядзе. Штодня багата загружаныя вазы пад'яжджалі да брамаў Арасу. Кожнага ранку было чуваць рыпеньне колаў ды выгукі возьнікаў. Люд зьбіраўся на мурох, а пасланьнікі біскупа апаражнялі вазы.

Потым яны ад'язджалі, страляючы пугамі ды шэпчучы пацеры, а біскупава варта дазваляла нам адчыніць брамы, каб забраць ежу ў места. Дзялілі яе справядліва – немалую ў тым заслугу меў пан дэ Сакс, чалавек вельмі праведны і нязломнага характару. Ды што з таго, калі пошасьць безупынна зьбірала сваё жніво, а голад усё болей даваўся ўсім у знакі. Потым надышлі роспачныя дні. Даведаўшыся пра нашыя няшчасьці, сабраліся пад Арасам усе амаль брабанцкія разбойнікі, банды ўзброеныя і бяз каліва сумленьня. Затаіўшыся сярод лясістых пагоркаў, падпільноўвалі яны ўначы біскупавы вазы ды рабавалі іх. Давід павялічыў ахову, але гэта не дало вынікаў. Лёгкая здабыча ўзбуджала жарсьці ліхадзеяў з усяго герцагства. Яны прыяжджалі ня тоячыся з найдалейшых закуткоў, каб нажыцца пад мурамі гінучага места. Аднойчы здарылася, што грабеж адбываўся на нашых вачох – бо мы назіралі за ўсім з вышыні мураў – цягам трох дзён. Давід плаціў возьнікам золатам і каштоўнымі камянямі, але не знаходзілася зухаў, гатовых пайсьці на сьмерць. У нас, у Арасе, голад дайшоў да жахлівых памераў. Прыходзілася выстаўляць варту на цьвінтарох, бо былі такія, што, пакінуўшы сорам і хрысьціянскасьць, дабіраліся да сьвятых магілаў ды балявалі сярод трупнае задухі. Да нас дайшлі чуткі, што адна кабета задушыла нядаўна народжанае дзіця, згатавала яго ў падсоленай вадзе і зьела, а ўзвар, які застаўся, аддала іншым сваім дзецям. Прыведзеная на Раду, яна прызналася ў сваім учынку. Быў гэта дзень, калі настроі супроць Давіда ў месьце дасягнулі вяршыні. Месьцічы пракліналі ягоную пастанову. «Давід жыўцом нас пахаваў!» – крычалі перад ратушай. Людзі патрабавалі суворае кары для гэтай звыроднай маткі, але былі пераканаыя, што грэх такога чыну ўпадзе на галаву біскупа. Я падзяляў той пагляд і прызнаю гэта бяз боязі...

Мы зьвяршылі суд над кабетай.

— Прысудзі ёй катаваньні! – гукалі месьцічы да Альбэра.

Ён маўчаў доўга. А пасьля сказаў:

— Я не асуджу яе на катаваньні. Няхай Бог вырашае аб ейным чыне.

Таму было вырашана, што яе пакараюць заўтра на золку, хоць места і патрабавала аддаць яе на катаваньні. На рынку сабраўся агромністы натоўп. Сярод галоднае ціжмы толькі асуджаная была сытая. Кат узышоў на масткі зь мячом у руках,

памагатыя прыцягнулі кабету. Яна малілася, поўная пакоры й пагаджэньня зь лёсам. Мы чакалі на адпаведны абрад. Тым часам Альбэр маўчаў. Ён адкінуў галаву і ўтарашчыўся ў неба. Гэта было трохі дзіўна. Мінаў час. Кат марудзіў, нецярпліва паглядаючы на Альбэра. Люд пачаў наракаць, нейкая ўзбуджанасьць ахапіла ўсе сэрцы.
— На што чакаеш, ойча?! – галёкнуў раптам хтосьці з натоўпу. – Давай разграшэньне!
Альбэр маўчаў. Усё тарашчыўся ў неба, нібы выглядаючы знакі. Я падыходжу да яго і гавару ціха:
— Ойча, час пачынаць.
— Няхай пачынаюць! – бурчыць Альбэр. Бачу, што ў яго падрыгвае павека, – адзнака гневу.
— Як жа така́ – кажу. – Трэба ж, каб ты яе разграшыў перад апошняй дарогай...— Не, – кажа Альбэр. – Дай кату знак, каб сьцінаў ёй галаву!— Ойча, – крычу я, – я гэтага рабіць ня буду! Безь віятыка нельга выконваць вырак!— Я зрабіў ласку гэтай жанчыне, – кажа Альбэр. – Яны хацелі яе агнём прыпальваць, у смале качаць... Вылюдкі! Я сказаў на судзе ясна, што абыдзецца без катаваньняў, і няхай Бог вырашае лёс гэтае няшчаснае. Кажы кату рабіць справу...
Мы размаўлялі шэптам, але людзі, што стаялі бліжэй, зразумелі, у чым рэч. Пачуліся гуканьні, потым – плач. Людзі пападалі наўкаленцы вакол эшафоту: усе ўзносілі модлы і прасілі Альбэра, каб праявіў хрысьціянскую літасьць да гэтай няшчаснай кабеты. А яна не адразу зразумела, што адбываецца...
— Ойча! – крычала тады ўжо ў найвялікшай роспачы. – Зьлітуйся!!! Хай мяне жыўцом спаляць, коньмі разьдзяруць, але не адмаўляй мне ў гэтым апошнім суцяшэньні. Я вінаватая, тое праўда, аднак не чыні ж мне такой лютай адплаты!
Фар'я дэ Сакс падбег да Альбэра й схапіў яго за плячо:
— Не насьміхайся з Бога, старча! – крыкнуў ён разьюшана. – Дай разграшэньне гэта няшчаснай, калі жыцьцё табе міла...
Альбэр глянуў, нібы дэ Сакс быў жамярою, што поўзала пад нагамі.— Не вучы мяне, графе, у справе цнот і грахоў, бо ня варты ты мяне павучаць. І сьмерцю мне перад вачыма не пабліскваў, бо я яе не баюся. Яшчэ слова, і я скажу слугам схапіць цябе ды павесіць на сухой галіне...
Дэ Сакс прыкусіў вусны і сказаў ужо спакайней:

— Ойча Альбэру! Ты ўзурпуеш права Божага суду. Без разграшэньня гэтая няшчасная несумненна навекі трапіць у пекла!— Несумненна? – працэдзіў Альбэр, зьдзекліва пасьміхаючыся. – Чаму гэта несумненна?! Ці, можа, ты лічыш, што я склаў з Богам дамову, паводле якой Ён не пасьмее зьмяніць маіх пастановаў? Дык за каго ж ты маеш Бога, дэ Саксе?! Ён жа – ня нейкі купчык генцкі, дурню! Толькі ад Ягонае волі залежыць, ці скіне душу гэтае кабеты ў пекла, ці зьмесьціць пры Сабе, сярод Анёлаў... Ты што ж, нікчэмны чарвяк, думаў, што я, можа, падпісаў дамову з Богам і што зь Ім можна ў гандляваньні ўдавацца?..— Ойча, – прашаптаў дэ Сакс. – Не адмаўляй гэтай кабеце...— Скуголіш, дурню! Усе вы аднолькавыя... Увесь гэты натоўп аднолькавы! Што ж такое! Вам здаецца, што калі я ёй у віятыку адмоўлю, дык яна абавязкова будзе асуджаная на вечную кару?!— Ойча, – сказаў я спакойна, хоць мяне душыў шал і трывога, бо адчуваў я, што дакранаюся да справаў неспазнаных і змрочных. – Сьвятарства дало табе моц дзейнічаць у імя Божае. Бог даверыў табе часьцінку свае волі, і таму ты ў Ягонае Імя зьдзяйсьняеш адпушчэньне грахоў.

Ён ціха засьмяяўся; сівая барада трэслася ў яго на грудзёх.

— Дурні, – буркнуў ён. – Праўда тое, што я – слуга Бога, але ж дзе напісана, што пан абавязаны быць ляяльным да сваіх служак. У галовах вашых явіцца, што я зьвяжу Богу рукі, прымаючы тыя ці іншыя рашэньні! Дык Ён жа – Усёведны і Ўсёмагутны. Ужо тысячу год таму назад захацеў Ён, каб усё гэта сталася... Адыдзі, Яне, і ты таксама, графе дэ Сакс! Хай кат сьцінае галаву гэтай кабеце...

Што я мог зрабіць? Я пайшоў да ката і сказаў яму:

— Чыні свой абавязак...

Ён глянуў на мяне ўважна. У прарэзах каптура я ўбачыў неспакойны бляск яго вачэй.

— Грэх! – мармытнуў ён.

— Не судзі за іншых, – адказаў я цьвёрда.

І пакацілася галава тае кабеты. Вялізны натоўп плакаў, а некаторыя людзі казалі, што Бог пакарае места Арас за гэтакі люты чын. Пасьля таго здарэньня зьмяніліся настроі. Пракліналі ўжо не Давіда, а Альбэра. Давід, зрэшты, выявіўся міласьцівы да места. Праз пэўны час ён сваёю біскупавай уладай адпусьціў грахі скаранай кабеце і вызваліў яе зь пекла.

Я памятаю тую ноч, калі Альбэр даведаўся пра пастанову біскупа.
— У гэтым – увесь Давід! – крычаў ён. – Найбліжэйшы сябра Госпада Бога! Я ўяўляю, што адбываецца ў небе. Богу дакладаюць, што біскуп утрэхцкі адпусьціў грахі гэтай кабеціне. У нябесным палацы беганіна, мітусьня і неспакой. Госпад Бог – няўцешны. Як жа ж я мог такое дапусьціць?! – кажа Ён сам сабе. – Гэткі недагляд! Цяпер біскуп утрэхцкі можа быць незадаволены. А ну як найхутчэй выцягвайце гэтую жанчыну зь пекла і перанясіце яе ў агонь чысцовы. Умысныя анёлы робяць што загадана, а адзін зь іх бяжыць у Гент з пакорным данясеньнем, што ўсё выканана так, як біскуп меў ласку пастанавіць. Але тут анёл мусіць чакаць, бо Ягоная Дастойнасьць заняты якраз бяседаю або выляжанкай... Дурні, дурні, дурні! Яны мяркуюць, што Бог – іхны павернік ці супольнік альбо – супярэчнік у спрэчцы! Але ці бачылі яны Яго? Ці калі-небудзь зь Ім размаўлялі?— Ойча Альбэру, – сказаў я тады. – Існуюць пэўныя прынцыпы, што парадкуюць нашае жыцьцё і збавеньне. Ува ўладзе біскупа – дзейнічаць у імя Божае, і хоць нельга тут дашуквацца дамоўленасьці, аднак усё ж трэба дапусьціць, што Неба чакае ад духоўных асобаў пэўных пастановаў, адпаведных вучэньню Царквы.
— Вучэньне Царквы толькі часткова паходзіць ад Бога, а часткова – гэта тварэньне людзей, – перабіў мяне Альбэр.
— Я з гэтым згодны, ойча... Але трэба памятаць, што без асаблівае міласьці Божага Адкрыцьця Царква не магла б устанаўліваць права...— Гэта ўжо іншая рэч, – буркнуў Альбэр. – І я не хачу дзяліцца з табой маімі думкамі ў такой ступені. Праўду кажучы, ён прамаўляў у той час як гератык. Але, як бы там ні было, ён належаў да тых, каму быў дадзены прывілей набліжацца да герэзіі. Занадта блізка ён знаходзіўся ля Бога, каб у ім не папрарасталі пэўныя сумневы.
Аднак вяртаюся да майго аповеду. У месьце шалела зараза. Брамы былі зачыненыя наглуха, вартавыя выстаўленыя знадворку, і, калі б хто задумаў уцячы зь места, зрабіўся б лёгкай цэллю для іх. Месьцічы былі вельмі ўзбухтораныя. Яны адчувалі сваю пакінутасьць ды няшчаснасьць тым вастрэй, што падмануліся ў людзях, якім так доўга верылі. Герцаг Давід атачыў іх кардонам, празь які немагчыма было прабіцца, і, хоць стараўся аблегчыць лёс места даставамі харчу, усё ж разбойныя

банды пахавалі гэтыя памкненьні. Альбэр жа здрадзіў месту, адмаўляючы ў акце хрысьціянскае літасьці і прабачэньня няшчаснай дзетазабойцы. Таму месьцічы Арасу ўбачылі сябе на самым дне існаваньня. Пачалі шырыцца бунты ды блюзьнерствы, бо людзі прыйшлі да высновы, што сам Бог зь іх насьмяяўся. Яшчэ сто гадоў таму падобныя настроі не былі б, напэўна, магчымыя. У той час сьвет быў занадта пабожны і падлеглы выракам нябесным. А сёньня?! Усё часьцей можна пачуць, што зямля круглая, нібы яблык, і, выяўляецца, не стаіць на месцы. Пагаворваюць таксама, што чалавечае цела мае ў сабе мноства падабенстваў да цела сабакі, ката і нават сьвіньні. Самыя розныя зьвесткі надзвычайна сумяцяць у розумах, і сумневы пракрадаюцца шмат да каго ў душу. Сьвет перажывае нейкую перамену, межы якой плынныя ды невыразныя. Ці ж можна было падумаць сто гадоў таму, што людзі будуць зьбірацца на могілках і аддавацца нейкім дзіўным ды пабожным абрадам, якія славяць сьмерць? У часох нашых дзядоў сьмерць была сьмерцю, і нікога не зьдзіўляў той відавочны факт, што целы нашыя гніюць, пасьля высыхаюць, каб урэшце распасьціся ў прах... Зьвярніце ўвагу, што сёньня людзі гэтым глыбака ўзрушаныя, а страх у абліччы сьмерці напаўняе ўсе хрысьціянскія сэрцы. Ёсьць у гэтым нейкае спаняваральне, нейкае ваганьне, быццам у нашых розумах нарадзілася думка, што з апошнім уздыхам усё гэта скончыцца, што, паміраючы, мы адыходзім у нябыт, у цемру, у нішто, дзе нават не йснуе ўжо ўсьведамленьня гэтае ўсёахопнае пустэчы, а таму й тае пустэчы няма, нічога няма, нічога...
У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амэн. Ці можа спаткаць чалавека нешта горшае за невыносную думку, што Бог – гэта бясконцая цямрэча? Каб ад гэтага вызваліцца, лупцоўнікі высыпаюць на дарогі, задаючы сабе пакуты, сьцякаючы крывёй ды молячы Бога, каб Ён стаўся сьвятлом і быцьцём. Нашая пабожнасьць – крыклівая і змрочная, інакшая, чым у часох сьвятога Францішка, які вучыў людзей, як трэба радавацца сонцу, кветкам ды подыху ветру... Хто ж сёньня, гледзячы ў неба, адчувае радасьць з прычыны зьзяньня зорак або формы хмаркі? Хто адшуквае прыемнасьць у барвах квяцістага лугу? Хто, урэшце, датыкаючыся да кары дрэва, адчувае прыемныя дрыжыкі кантактаваньня з Божым стварэньнем? У задусе чадных паходняў, спасярод дыму кадзілаў, перад абліччам

Усёмагутнага, што прысутны на алтарох, мы б'емся лбамі аб каменныя падлогі нашых бажніцаў. Мы выкрыкваем нашыя грахі, бо нам здаецца, што, называючы свае ўчынкі, мы вызваляемся ад іх цяжару. Быць можа, я моцна памыляюся, але думаю, што мы кіруем да мяжы. Ужо недалёка тая часіна, калі загіне сьвет, а Бог паглыне нас усіх у сябе, каб надалей існаваць самотна, сярод уласнага быцьця. Сапраўды, гэтая думка – жахлівая, хоць нібыта павінна цешыць кожнае хрысьціянскае сэрца.

Як я ўжо казаў, места Арас пакутавала. Тая няшчасная кабета, абезгалоўленая на загад Рады, была не адзінай злачынкаю... Падобныя ліхадзействы множыліся. Людзі ўжо не баяліся пекла і найжахлівейшых катаваньняў – толькі б заспакоіць голад. Жывёльнасьць перамагала чалавечую натуру. Магілы памерлых раскопваліся, квітнела агіднае людажэрства. Здараліся нават выпадкі, што сем'і дабівалі сваіх хворых перад скананьнем, каб падмацавацца сьвежым мясам, вольным ад прысмаку гнілі. Самае разбэшчанае свавольле агарнула места, як гэта і бывае, калі людзі прадчуваюць канец усяго. Узорна цнатлівыя кабеты паводзілі сябе як распусьніцы. Можна было назіраць сцэны неапісальнае непрыстойнасьці, што разыгрываліся пад вольным небам і нават ля касьцельных брамаў. Немагчыма перадаць усяе тае агіднасьці ды жудасьці нашаю ўбогаю моваю. Калі дачка аднаго шляхцюка запала здароўем, ён – заходзячыся плачам і сьмехам – узабраўся на яе, галёкаючы, што нельга, каб яна адышла з гэтага сьвету, не спазнаўшы асалоды зносін з мужчынскім чэлесам. «Бо Бог ня можа быць гэткі бязьлітасны да майго дзіцяці...»

Насталі цяжкія для места часы. Найгоршым было ўсьведамленьне, што няма адкуль чакаць дапамогі. Людзі чуліся жыўцом пахаванымі, пакінутымі выключна на ўласныя сілы і прадпрымальнасьць, што – праўду кажучы – вызваляла з кайданоў, у якія сьвет іх звычайна закоўваў. Бо, паколькі былі яны так моцна асірочаныя, такія пакінутыя валадарамі сьвецкімі й духоўнымі і, несумненна, асуджаныя – прыйшло ім у галаву, што ўсе іхныя ранейшыя повязі са сьветам пазбаўлены вартасьці. У час страшэнных выпрабаваньняў, забіваныя пошасьцю і голадам, яны адчулі сябе нібы на бязьлюднай высьпе, адусюль аточаныя бяздушным, абыякавым і нераплыўным морам. Ды ня толькі гэта ўзьдзейнічала на

іхнае сьветаўспрыманьне. Перад абліччам няшчасьця яны адразу ж зрабіліся амаль усе між сабою роўныя – і руінаю палі асьвечаныя правы. Аднолькава паміралі рамесьнікі, паны й сьвятары, мужчыны й жанчыны, старыя і дзеці. Сьмерць, што ўехала ў мескія брамы, стукалася ўва ўсе дзьверы, не зважаючы на станавую прыналежнасьць. Брыдкія пацукі, цэлыя чароды якіх зьяўляліся ў месьце ў белы дзень, накідаліся на целы памерлых, не разьбіраючы, панскае ці плябейскае было гэта мяса. Фар'я дэ Сакс, у якога гонар быў, здаецца, мацнейшы за прагу жыцьця, пільна дбаў, каб сьціплыя порцыі траплялі пароўну ў кожны рот.

Таму, як я ўжо казаў, сьпярша запанавала нейкая асаблівая, не пазбаўленыя дзікасьці ды вар'яцтваў, роўнасьць… Хтосьці павёў натоўп да кляштару дамініканаў, у якім мніхі вякамі зьбіралі вучоныя кнігі. Невядома зь якой прычыны, натоўп паскладаў пэргаміны ў аграмадны стос і падпаліў, а калі полымя шуганула ўгару – людзі ўзяліся пад рукі і танчылі ў бляску агню ды клубох дыму ажно да позьняе ночы.

Яны нішчылі ўсё, што не надавалася ў ежу. Надышоў час новых каштоўнасьцяў для места, і, дальбог, здавалася, што пры ўсім тым няшчасьці ды горычы людзі дыхалі вальней! Раптоўна амаль усе без выключэньня сталі адчуваць, што папярэдняе іхнае жыцьцё было абцяжарана мноствам непатрэбных дзівацтваў ды мроеньняў. Яны не казалі: «Навошта нам цяпер кнігі ды павучаньні», але: «Навошта ўвогуле кнігі ды павучаньні, калі насуперак нашае волі спаўняецца часіна – і ўсе мы мусім адысьці з гэтага сьвету, не спазнаўшы ані радасьці, ані раскошы, ані нават сапраўдных няшчасьцяў…»

Зьняверыўшыся ў прынцыпах, неўзабаве яны зьняверыліся і ў Богу. З кожным днём рабіўся Ён усё менш патрэбны, бо ня быў тут прысутны, бо сышоў з Арасу, выдаўшы яго на рабунак згаладнелым месьцічам. І вось раптам нашыя целы – блізкія сьмерці, схуднелыя з голаду, якія зь сярэдзіны пякла зараза – набылі найвышэйшае значэньне. Людзі са спагадаю пазіралі на свае твары, плечы, жываты. Нішто апроч цела ўжо не ўяўляла каштоўнасьці і нішто не было болей вартае спачуваньня. Выйшла так, што тыя, хто быў таўсьцейшы ад іншых, спазнавалі асаблівае раскошы й цешыліся павагай, амаль роўнаю ўслаўленьню. Але гэта не цягнулася доўга, бо менавіта тлустыя першымі пайшлі пад нож… Скінутыя з алтароў – яны

адправіліся на стол. Пачалася тыранія худых ды жылістых. Выбухнуў жахлівы тэрор, а дзікасьць сягнула вяршыні.
Якая ж сьмешная натура чалавека! Калі судзілі тую кабету, усім здавалася, што Арас апусьціўся на самае дно няшчасьцяў ды засмучэньня. Але празь нейкі час людзі ўжо згадвалі працэс дзетазабойцы як сьведчаньне даўно мінулай ідыліі. Места, у якім дзейнічаюць суды, устанаўліваюцца законы ды выконваюцца прысуды, яшчэ не пакінута Богам. У Арасе ж, дзе, паводле пазьнейшых падлікаў, кожны трэці насельнік паў ад заразы або голаду, не было ўжо нічога боскага. Мы засталіся сам-насам са сваёю людзкасьцю, з нашымі целамі, з нашым уяўленьнем, якое ажыўлялася толькі страўнікамі.
Было ў гэтым нейкае жахлівае вызваленьне, бо ўсё-такі кожнаму з гэтых людзей, кім бы яны ні былі, спадарожнічала заўсёды ўсёмагутнасьць герархіі. Нельга запярэчыць, што герархія – гэта блаславенства, і таксама нельга запярэчыць, што яна – аброць. О, я зусім ня думаю, што нехта, прыйшоўшы на гэты сьвет селянінам, пакутуе з таго, што ім зьяўляецца, альбо прагне быць кімсьці іншым. Такія мроеньні могуць паўставаць толькі ў вельмі абмежаваных глуздох. Здаецца зразумелым, што мужык ёсьць мужыком, а таму – усё ў ім мужыцкае, кожная часьцінка ягонага цела зьяўляецца мужыцкай, і такі чалавек мусіў бы выйсьці па-за сябе, узьняцца над уласным быцьцём, каб убачыць сваю мужыцкасьць так, як я яе бачу. Гэтак жа і са мною! Усё ўва мне – панскае, і я нат дыхаю як пан, згодна з маім прызначэньнем на гэтым сьвеце. Я ня ведаю, як мысьліць рамесьнік, бо не зьяўляюся ім, а калі б я і паспрабаваў зразумець ягоны спосаб мысьленьня, дык гэта заўсёды будзе разуменьне панскае. Таму я не сьцьвярджаю, што ў гэтыя страшныя дні голаду і заразы селянін адчуваў сваю роўнасьць з панам. Сьпярша менавіта ад паноў чакаў ён апекі і паратунку. Калі ж зразумеў, што нават найболей высакародныя тут бясьсільныя, – пераканаўся, што няма надзеі. Але гэтае самае бясьсільле вышэйшых ад яго, якое спачатку напаўняла яго роспаччу ды спаняверанасьцю, сталася потым крыніцаю нейкай дзіўнай сілы. Паколькі апека заможных не магла задаволіць патрэбы часу, яна страціла ўсю сваю вартасьць. Селянін, пазбавіўшыся дапамогі, рабіўся тым самым самастойным. Гэтак жа і паны, што аглядаліся перш за ўсё на Раду і Царкву, адчулі сябе пакінутымі Радаю і Царквой. Кожны

з нас праз усё жыццё падпарадкоўваўся тым, хто стаяў вышэй, а калі раптам голад ды зараза абрынулі герархічную лесьвіцу ў гной нашае супольнае немачы, мы заўважылі – кожны без выключэньня – сваю адасобленасьць ад сьвету. Мы былі пакінутымі асуджэнцамі, але мы знаходзіліся па-за ўсялякай падначаленасьцю, выключаючы падначаленасьць самім сабе. Апанавала нас страшэнная самота, але было ў ёй нешта ўзьнёслае. Дагэтуль, жывучы й паміраючы, мы ўсе без выключэньня знаходзіліся ў стане падначаленасьці, падпарадкаванасьці. Не сумняваюся, што такі стан поўны слодычы і пачуцьця бясьпекі. Жывучы ў ім, мы чынім намаганьні, каб падабацца іншым, усім тым, хто вышэй і ніжэй за нас. Падначаленасьць ёсьць прыўкрасай нашага існаваньня. Узамен за яе мы атрымліваем апеку і супакой, – адным словам, яна дазваляе нам цешыцца жыцьцём. Безь яе – лёс аддае кожнага на здабычу ўласнае адрознасьці. І вось месьцічы Арасу ў часіну скону, у страшнай пакуце роспачы і юрлівасьці заразом, казалі сабе шэптам: «Я – сын чалавечы. Я – сын чалавечы, і нішто болей!» Быў гэта цяжар, які немагчыма вынесьці, і, быць можа, менавіта таму мы ўпалі тады на самае дно.

Але глузды нашыя дзейнічалі спраўна – наколькі гэта было магчыма ў людзей, да жудасьці галодных. Некаторыя мелі відзежы і размаўлялі зь нябеснымі апекунамі. Можна было назіраць скептычных паноў, звыклых да вытанчаных разважаньняў пра натуру чалавека, якія, праходзячыся вулкамі Арасу, вялі размову з кімсьці нябачным. Ведучы тыя дыспуты, яны захоўвалі вельмі пачцівыя звычаі, пасьміхаліся ды кланяліся свайму суразмоўцу, прыбыламу проста зь неба. Не было ў тым анічога зь містычных парываў, ані з гарачкі ці хваробы. Гэтыя людзі заставаліся сабою ў кожным слове і руху, але праяўляўся ў іх і нехта іншы – спадарожнік жыцьця, які дагэтуль быў зьняволены і маўклівы, але цяпер, у найстрашнейшую часіну, ён ставаўся ім роўны, і яны, ідучы на сьмерць, дапускалі яго да свайго боку. Здаралася таксама, што мніхі, якія змарнавалі доўгія гады ў малітвах, пастох ды пакуце, выбіраліся на сонца са сваіх змрочных кляшторных кельляў, аддаваліся распусьце з кабетамі і ўголас блюзьнерылі супроць Бога. А найболей дзіўным, здаецца, было тое, што кожны чалавек у Арасе меў тады на запас разумнае

тлумачэньне свайго ператварэньня. Мяркую, розум яшчэ ніколі не сьвяткаваў гэткага трыюмфу, як у тыя дні ўсеагульнай страты падставовых каштоўнасьцяў. Для кожнае ўзьнёсласьці або ганебнасьці людзі маглі знайсьці абгрунтаваньне. Знамянальна, што дакладнасьць такіх абгрунтаваньняў рабіла адных болей, а другіх – меней роўнымі. І гэты факт ізноў вяртаў звыклыя меркі нашаму жыцьцю ў Арасе. Бо, як выявілася, нельга існаваць бяз пэўных каштоўнасных мерак – толькі дзеля страўніка, у страўніку, страўнікам… Ён сам, праўда, быў магутнаю меркай, якая, аднак, не задавольвала цалкам. Тое, што ўсе без выключэньня прагнулі ежы, не азначала яшчэ, што яны ўсе без выключэньня аднолькава дрэнныя, добрыя, высакародныя або подлыя. І вось пачала паўставаць у месьце новая герархія сярод схуднелых, роспачных зданяў. Адны навучалі, а іншыя былі іхнымі вучнямі. І зусім не было важна, што зьяўляецца прадметам гэтага навучаньня, – але толькі сам факт новай падначаленасьці, новых сувязяў, якія дазвалялі людзям свабодней несьці цяжар зьніштажэньня.

Усё гэта адбывалася нейкія тры гады таму… Дык ці ж можна зьдзіўляцца ўчынкам месьцічаў Арасу мінулае восені? Калі здавалася, што ўсё страчана і для нас ужо няма аніякай надзеі, пошасьць зьнянацку згасла… Нібы Бог вырашыў, што мы ўжо пакаштавалі пекла… Сьпярша людзі не ўсьведамлялі гэтае перамены лёсу. Дзень пры дні ўсё меней было памерлых, а ў дадатак разбойныя банды адступілі і зноў кожнага ранку рыпелі, нагружаныя харчамі, біскупавы вазы. Гэта было як у сьне. Мы не заўважалі ўласнае сытасьці і здароўя. Надалей працягвалі разыгрывацца блюзьнерчыя ды распусныя сцэны, але паволі жарсьці выгасалі, а разам з тым пачаў прарастаць у Арасе неапісальны сорам. Тыя, што вялі дыспуты са сьвятымі апекунамі, цяперака насьмейваліся зь неба, а тыя, што блюзьнерылі супроць Бога, – лупцаваліся перад брамамі касьцёлаў. Фар’я дэ Сакс не дзяліў больш харчоў, бо было іх ужо даволі. І зноў, як калісьці, просты люд задавальняўся горшым, у той час як паны патрабавалі сабе лепшага. І, як раней, ніхто з гэтым не спрачаўся. Паступова вярталася раўнавага, але ўсё ж хісткая ды кволая, бо пэўныя перажываньні ўкараняюцца ў чалавечай памяці, і хаця ўсе ў пакоры дзякавалі за ацаленьне, аднак ужо не маглі, як некалі,

радавацца жыццю. Хаваючыся ў падданства і супольнасьць, людзі ўсё ж памяталі пра сваю самоту. Для некаторых сорам было цяжэй зьнесьці, чым нат заразу. Хаця ўсеагульнае дараваньне ахапіла места і людзі ўдавалі, нібы не адбылося нічога, што б прыніжала іхны гонар, тым ня менш, ночы ў Арасе былі неспакойныя, поўныя дрэнных сноў, роспачных успамінаў ды прынізьлівых сьлёзаў. Ужо тады Арас прагнуў ачышчэньня, ужо тады шукаў формулу, якая б дала тлумачэньне ўсёй драме.

У дзень, калі расчыніліся брамы, усе званы білі трыюмфальна, а аграмадная працэсія абыходзіла навокал мескія муры. Пад вечар прайшоў дробны дождж, які змыў рэшткі граху. Назаўтра зранку – пад блакітным небам, у сьвятле раньняга сонца – уехаў у места герцаг Давід. Яго прынялі ў пакоры, якая належыцца вялебнаму пастыру, што зьяўляецца каралеўскім сынам, але безь любові, якую звычайна складаюць да ног дабрадзеяў. Калі Давід у суправаджэньні айца Альбэра бласлаўляў натоўп, немалая частка араскіх месьцічаў схіліла галовы, не згінаючы кален. Альбэр сказаў тады ціха: «Выбач ім, Вашая Дастойнасьць, але лёс іх цяжка выпрабаваў і яны зьняверыліся ўва ўсім...» На гэта Давід: «А што мне да іхнай веры й зьняверaньня? Галоўнае, што яны выжылі...»

Праўду кажучы, мяне гэта крыху зачапіла. Бо калі нехта недаацэньвае нашыя зьняверaньні, ён недаацэньвае нас саміх і наш лёс. Але я змаўчаў, бо было б няслушна спрачацца з герцагам.

Падчас ягонага побыту атмасфэра была нейкая вымушаная. Гэта зусім ня значыць, што герцаг перамяніў сваё стаўленьне да места альбо што места адчувала да яго нейкую глыбейшую крыўду. Сытасьць цела хутка паспрыяла заспакаеньню духу, і ўжо тады мала хто ўспамінаў, што ўсё ж на загад біскупа места было адрэзана ад сьвету... Але рэч у тым, што разьбегліся дарогі нашых перажыванняў. Калі мы тут, за мурамі, змагаліся з заразай і голадам, Давід баляваў у Генце. Мне не хацелася б падыходзіць да гэтае справы занадта павярхоўна. Ніхто не сумняваўся ў шчырым спачуваньні герцага і ягоным жаданьні прыйсьці нам на дапамогу, але адна справа – ратаваць, а іншая – быць ратаваным. Адна справа – пакутаваць, а іншая – шкадаваць пакутнікаў. Адна справа, нарэшце, – ведаць, а іншая – спазнаць. Бо герцаг ведаў, што сьмерць існуе, а мы яе

спазналі. Выкараскаўшыся з прорвы, мы адчувалі нешта накшталт тугі па тым пражываньні, якое было нам дадзена і ўзбагаціла нас. Ніхто ў Арасе не ўспамінаў уголас дні пошасьці. Але думалі пра іх часта. Быццам захоўвалі яны нейкае падмацаваньне і таямніцу, даверануюю толькі нам, месьцічам Арасу, якую пераказаць іншым не выпадае.
Напэўна таму герцагавы капрызы ўжо не прымаліся з такой самай, як раней, памяркоўнасьцю. Ён успрыняў гэта як довад нашае непрыязнасьці і быў крыху раззлаваны. Калі ён зафундаваў бяседу, месьцічы Арасу елі мала, а пілі яшчэ менеї; біскупскі ж двор, як гэта заўсёды было ў звычаі, патураў сабе бязь меры. Давід нахіліўся да мяне і сказаў:
— Я бачу, што ў вас у ратох мае харчы разрастаюцца. Што гэта за выбрыкі, Яне? Глядзіце, каб я ня ўзяў гэта за абразу...
— Пане герцагу! – сказаў я тады. – Не судзі нас надта сувора. Мы любім цябе, як і раней, і радуе нас бяседа пры тваім стале. Але іншы сёньня ў яе смак для нас. Кожны шмат мяса спрычыняе нам такое адчуваньне, аб якім брабанцкія паднябеньні ня маюць уявы. Прыманьне ежы зрабілася для нас пражываньнем, зрэшты, ня вельмі прыемным... Што некалі здавалася ў нашых вачох радасьцю – сёньня ня што іншае, як толькі неабходнасьць. Мы не вінаватыя, пане...
— Арас заўсёды быў схільны да нейкіх перабольшаньняў, – адказаў ён. – Гэта места пекных схалястычных традыцыяў, дзе некалі спрачаліся пра колькасьць валасінаў у хвасьце Бэльзэбула. Я не запярэчваю, што вы перанесьлі жахлівыя пакуты, але дзе ж напісана, што гэта прычына для славы?
— Мы ня прагнем славы, Вашая Дастойнасьць, але толькі цішы, бясьпекі ды супакою. Мы не фанабэрымся нашымі пакутамі. Я нават мяркую, што калі мы ўспамінаем нядаўнія дні, дык болей у нас сораму, чым ганарлівасьці. Але ў тым рэч, што гэта нашая неад'емная ўласнасьць. У Арасе немагчыма зрачыся гэтых пакутаў; немагчыма іх камусьці перадаць, немагчыма іх выкараніць. Яны – часьціна нас саміх. Ці я кажу зразумела?
— Кажаш ты зразумела, але гэта не зьмяняе сутнасьці справы, а менавіта – што свьядома ці не, але места Арас змушае мяне сёньня ўзяць удзел у сваіх пражываньнях. Яно падсоўвае мне пад нос свае раны і цьвінтары, у той час як я хачу радавацца жыцьцю ды аддавацца ўцехам. Быць можа, дні голаду і пошасьці вельмі вас ушляхетнілі, але ж тое не прычына, каб усё

гэта сталася ўзорам для іншых. Зараза закранула Арас, але не закранула Генту. Ці гэта дае вам права сьцьвярджаць, што вы лепшыя?
— Мы й ня чуемся лепшымі, Вашая Дастойнасьць...— Ну вядома! – прамовіў ён надзвычай востра, а ягоная даланя ўдарыла аб стол. – Ну вядома! Вы падкрэсьліваеце вашую іншасьць, выводзячы яе з горкіх выпрабаваньняў. Ніхто пад сонцам не падкрэсьлівае свае іншасьці, каб прынізіцца, але кожны робіць гэта, каб узвысіць сябе. Аднак паколькі ўжо вы седзіце пры маім стале, а я вас частую, дык зычу сабе, каб мой смак быў вашым смакам, мая забава – вашаю забавай, а мая нікчэмнасьць – вашаю нікчэмнасьцю...
— Хто ж бы асьмеліўся закідваць нікчэмства Вашай Дастойнасьці?! – выгукнуў я ў зьдзіўленьні.
— Вось, усе тутака... – адказаў ён і абвёў рукою кола, паказваючы на бяседнікаў. Сказаў ён гэта вельмі гучна, і многія яго пачулі...
У тое цяжка паверыць, але я адчуў тады сорам. І не за герцага мне было тады соромна, а за Арас! Бо ўсё ж рацыя была на ягоным баку. Не дзеля таго, што ён казаў, але таму, што быў Давідам. Ён нарадзіўся, каб мець рацыю. І, такім чынам, увесь стол зразумеў у гэты момант, што сьвет вяртаецца ў сваё прадаўнае рэчышча. Збаўленчы статус Боскіх законаў паклаў мяжу нашым сумневам. Па хвіліннай зацішы разьнесьліся выгукі, як тое звычайна бывае на баляваньнях, і ўжо неўзабаве ўсе разбавіліся. Толькі Альбэр заставаўся пахмурны. Седзячы па правай руцэ Давіда, ён нахіліўся да яго і сказаў:
— Пане герцагу! Як люта ты ненавідзіш нашае места!
На што яму Давід:
— Я ненавіджу пакуты, добры ойча...
На тое Альбэр:
— Усё на адно выходзіць, пане!
На што Давід яму:
— Ты пацэліў у яблычак... Хай будзе па-твойму! Я ненавіджу Арас! – і выбухнуў вясёлым сьмехам, нібы ўрэшце ад нечага вызваліўся.
У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амэн. Я ня веру, што Давід тады сказаў праўду. Хутчэй, ён проста выказаў сваю непрыязнасьць да айца Альбэра, гаворачы словы, якія мусілі таго параніць. Бо абсалютна немагчыма, каб такі вялікі пан

ненавідзеў адно са сваіх местаў разам з усімі ягонымі жыхарамі. Я не выключаю, што мы злавалі Давіда горыччу ды глыбінёй перажытых пакутаў. Так ці йнакш, мы перажылі найболей выпрабаваньняў сярод усіх насельнікаў Брабанту, і гэта магло ў душы герцага нарадзіць трывогу, што мы захочам узвысіцца над усімі, а можа, наагул, памкнуцца да тае вышыні, на якой ён сам знаходзіўся. Калі так, дык Давід моцна памыляўся... Бо менавіта ў часе баляваньня ўсе месьцічы прыйшлі да пераканаьня, што добра мець гэтага чалавека – моцнага, цьвёрдага й перапоўненага радасьцю жыцьця – айцом, пастырам ды ўладаром. О, як жа ён нам тады падабаўся... Позьняй ноччу, калі людзі ўжо былі трохі сонныя, герцаг паклікаў у бяседную залю прыдворных артыстаў. Былі там песьняры, паэты, а таксама мім, вельмі распусны і забаўны. Калі яны прыйшлі, Давід кажа ім:
— Што вы нам пакажаце, сябры мае дарагія?
— А чаго жадаеш, Вашая Дастойнасьць? – адказваюць.
На тое Давід:
— Вы мяне ведаеце. Я аніякіх вымогаў ня стаўлю. Вырашайце свабодна, як тое заўсёды бывае на маім двары.
І яны сьпявалі ды гралі тое, што самі хацелі. Я сказаў тады герцагу: — Вашая Дастойнасьць вельмі ласкавы да гэтых людзей. У нас бывае йначай. Айцец Альбэр трымае гэты статак на аброці.
Давід выбухнуў вясёлым сьмехам. — Я артыстам спрыяю, – кажа, – бо я іх не баюся. І нічога ад іх не патрабую. Яны маюць у мяне поўную свабоду. — Мяркую, – адказаў я, – што яны вельмі гэтаму радыя. — Дзе ж там! – гукнуў Давід. – Гэта напаўняе іх страхам, Яне. Яны ня пэўныя ані дня, ані гадзіны. Ня ведаюць, што я трымаю за пазухай, і ўвесь час падазраюць мяне ў нейкім падступстве. — Але ж гэта дзяцінна, – кажу я, – ня будзе ж герцаг супроць іх змовы ладзіць...
Ён прамаўчаў. Зірнуў на мяне з калівам насьмешкі. А праз хвіліну мовіў: — Вып'ем, Яне...
Тыя словы чула сама меней зь дзясятак людзей, што сядзелі зблізку. Мяне ажно дрыжы ўзялі, але людзі нібы толькі памацнелі. Яны былі надта спрагнёныя па моцы ды хвацкасьці. Яны хацелі аддаць сябе ў апеку чалавеку, які б гарантаваў ім бясьпеку. Яны тады палічылі, што варты іхнага даверу ўладар, які мае свае таямніцы. Ужо даўно зьняверыліся яны ў Альбэру.

Ягоныя модлы ды казані не адвярнулі няшчасьцяў. Ён патрабаваў, каб Арас усклаў надзею на неба, але неба засталося абыякавым перад абліччам пошасьці ды голаду. Таму людзі былі гатовыя даверыцца Давіду, які хоць і не абяцаў адпушчэньня грахоў, але быў досыць суворы і магутны, досыць хітры і халодны, каб пакласьці мяжу мучэньням. Арас трохі баяўся, што Давід ухопіць яго за горла, але што, урэшце, гэта значыла ў параўнаньні з сытасьцю ды расчыненымі брамамі места?

Мне здаецца, што менавіта тут трэба шукаць прычыну, дзеля якой месьцічы прыйшлі да мяне, калі павесіўся жыд Цэлюс. Мінула ўжо тры гады пасьля страшных дзён голаду і заразы, але ўсё яшчэ жывыя былі ў нас успаміны ды ўсё яшчэ моцная была надзея, што ў выпадку патрэбы толькі герцаг Давід зможа ўратаваць места. Напраўду, за ўвесь гэты час герцаг толькі двойчы зьяўляўся ў месьце, каб бавіць дні ў бяседах, забавах ды паляваньнях. Але ўжо сама ягоная прысутнасьць спраўляла, што Арас чуўся ў большай бясьпецы. Пасьля дзён пошасьці жыцьцё хутка вярталася на даўнія каляіны. Альбэр ізноў навучаў пра пакору ды бязгрэшнасьць, ізноў заахвочваў да посту і ўстрыманьня, ізноў пераконваў, што мы зьяўляемся выбранымі авечкамі гаспадняга статку. У той час ён вяршыў суды лагодна і справядліва, нібы баючыся зноўку абудзіць гнеў Божы, як гэта, несумненна, было, калі ён адмовіў у віятыку няшчаснай дзетазабойцы. Праўду кажучы, Альбэр пастарэў і змаркотнеў пасьля тых прыкрасьцяў. Згодна з пажаданьнем Давіда, ён перанёс цьвінтар па-за мескія муры, бо біскуп утрэхцкі яму напісаў: «Не трымай месцаў вечнага спачыну ў самай сярэдзіне забудовы, бо гэта памерлых ня збавіць, а жывых атруціць. І пакінь вашых памерлых у супакоі. Не гандлюй імі, як ты маеш звычку чыніць, каб мацней аблытаць жывых навучаньнем аб збаўленьні вечным. Памерлыя ўжо цябе, шляхетны ойча, пазбыліся, сьпяць моцна ў сваіх трунах, танчаць з чарвякамі, а іхныя душы прыняў Госпад Бог і Ён над імі выконвае апеку. Таму стаўляй крыжы над магіламі, але загадай хаваць па-за мурамі. Што я табе сувора загадваю раз і назаўсёды...»

Толькі той допіс атрымалі мы ад герцага на тэму справаў мескіх. Але кожны спадзяваўся, што калі зьвернецца да двара ў цяжкую часіну, дык знойдзе там надзейную абарону. Вось чаму

прыйшлі да мяне месьцічы і гукалі, каб я пасьпяшаў на герцагскі двор і данёс пра вялікую несправядлівасьць да жыда Цэлюса. Але я не паехаў! Я, згодна з пажаданьнямі Альбэра, пайшоў да людзей і сказаў ім наступнае: — Я разважыў справу. Думаў усю ноч, што мне належыць учыніць, і маліўся горача, чакаючы Божае дапамогі. Вы прыйшлі да мяне, узбухтораныя з прычыны ўяўнае ганебнасьці, якую дазволіў сабе пан Альбэр. Гэта сьведчыць, што вы – добрыя хрысьціяне. Аднак жа я падумаў сабе, што вашая высакароднасьць падшыта пыхаю. Ня нашая справа – перакрэсьліваць боскія выракі. Мы павінны падпарадкоўвацца ім у пакоры. Бо няма сумневаў, што жыд Цэлюс кінуў праклён на дом Гервазія. Як жа йначай можна растлумачыць тое, што ў суконьніка паў здаровы конь? Гэта мы сьцьвердзім больш чым напэўна. Але дзеля супакою сумленьня Рада пастанавіла правесьці дэталёвае сьледзтва. Такім чынам, ня вынесена прысуду Цэлюсу й ніхто не прамовіў слова «Вінаваты»! Калі б выявілася, што абвінавачаньне высмактана з пальца, вяровачніка прыцягнулі б да адказнасьці. Пакуль жа, як заўсёды гэта бывае, Цэлюса пасадзілі ў ратушы. Дык дзе ж тутака несправядлівасьць?
Адзін зь месьцічаў перабіў мяне, закрычаўшы: — Цэлюсу не далі права на абарону!
— Яшчэ не было суду, – адказаў я. – Было толькі першае слуханьне. Ён адказваў перад Радаю, якая яго дапытвала. Калі б надышоў час працэсу, яму напэўна б дазволілі бараніцца паводле правоў і звычаяў... Але ён уцёк ад суду і мескае справядлівасьці, пазбаўляючы сябе жыцьця. Гэтым самым ён прызнаў сваю віну. Ці ж чалавек чысты будзе хавацца ў сьмерць ад справядлівасьці? Ён быў нагэтулькі пераканаваны, што віна ягоная будзе даказана, што сам выканаў прысуд.
Тады нехта сказаў: — А можа, ён не давяраў справядлівасьці места Арас і хацеў пазьбегнуць мучэньняў?
Іншы гукнуў: — Таго ня можа быць... Бо асудзіў сябе на мукі вечныя!
Яшчэ іншы крыкнуў у адказ: — Ды ён усё жыцьцё пражыў у паскудным жыдоўстве – значыць, і так ужо быў асуджаны. Ягоныя страхі не былі нашымі страхамі, дык не кажыце пра вечныя мукі... Для жыда Цэлюса, калі ён павесіўся ў ратушы, гэта было ня ўвойсьцем у пекла, а, хутчэй, выхадам зь яго ў нешта, што яму абяцае жыдоўская вера... Таму нельга казаць,

што ён сам сябе пакараў. Можа, ён толькі шукаў цішы ды спакою...
Той, хто гэта казаў, выглядаў на чалавека паважнага і быў добра апрануты. Быў падобны да праўніка, але аказалася, што гэта арандар пана дэ Сакса, якому граф даў колькі год таму тлустыя землі і які зарабіў на іх вялікае багацьце. Я вярнуся яшчэ да ягонай асобы. А тады я запытаў яго: — Значыць, ты мяркуеш, што Цэлюс не давяраў справядлівасьці места Арас?
— Гэтага я не сказаў, – адказаў ён з выразам насьцярожанасьці ў вачох. – Можа, толькі баяўся мучэньняў, а паколькі быў слабым чалавекам, пазбаўленым веры хрысьціянскай, дык адышоў паводле сваёй волі. — Ці, на тваю думку, ён быў вінаваты?
— Я ня быў ягоным судзьдзём, пане, – адказаў ён ганарліва. – І не хацеў бы быць. Бо мяне заўсёды гняце нейкая няпэўнасьць, я заўсёды дапускаю магчымасьць памылкі і таму застаюся на ўзбоччы. Зрэшты, мы прыйшлі да цябе не каб спрачацца пра віну жыда Цэлюса, але з просьбаю быць паслом да герцага Давіда. Ён наш пан, і мы давяраем ягонай мудрасьці...
— Усё так! – выгукнуў я жвава. – Але задумайцеся на момант! Супроць каго вы выклікаеце біскупа ў Арас? Жыд Цэлюс ляжыць мёртвы ў сутарэньнях ратушы. Уваскрасіць яго немагчыма – хіба што Госпад Бог гэтага захоча. А паколькі герцаг мусіць прыехаць у Арас, дык трэба ўказаць яму мэту падарожжа. Дзеля каго ён мае прыехаць і супроць каго?! Якім бы чынам мы ні паказвалі справу, герцаг мусіў бы правесьці суд, дзе з аднаго боку быў бы мёртвы жыд, а з другога – места Арас. Калі рацыя на баку места, дык нашто турбаваць герцага далёкім і цяжкім падарожжам? Калі ж рацыя на баку жыда – дык гора нам! Адзін чалавек гаварыў тут разважна, што адчувае няпэўнасьць і дапускае імавернасьць памылкі. Калі ж ён, аднак, адчувае той цяжар, дык ня можа яго перакладаць на плечы герцага. Герцаг, як і мы ўсе, толькі чалавек. Ці вы лічыце, што Бог заўсёды прамаўляе ягонымі вуснамі? Так думаць можна было сто альбо дзьвесьце гадоў таму – калі сьвет быў цёмны ды, разам з тым, больш узьнёслы, чым сёньня. Мы сьведамыя нашае слабасьці. Я – адзін зь сяброў герцага, што чыніць мне гонар і радасьць. Але я вам адкрыта кажу – бо любоў да праўды мне даражэйшая за ўсё, – што ня варта выклікаць біскупа. Мы не належым да самых любімых авечак зь

ягонага статку. А да таго ж маем прывілеі, якія парушыць было б цяжкім грахом. Места Арас мае ўласную Раду, уласныя суды і ўласную справядлівасьць. Спадзявацца на герцага Давіда азначае ня толькі аддацца яму ў апеку, але й перадаць яму свае правы, якія зьяўляюцца нашым багацьцем. Калі нават мы й несправядлівыя, дык несправядлівыя паводле сваёй меркі і рахунку. Кажаце, што трэба давяраць Давіду... Праўда. А хто яму не давярае?! Ці ёсьцека такія ў месьце? Але ж давер да герцага не павінен перакрэсьліваць ваш давер да саміх сябе. Давідава паняцьце справядлівасьці, можна сказаць, такое ж, як сам Давід. Бог заўсёды такі, якім ёсьць чалавек, што ў Яго верыць. Бо Бог, як вы ведаеце, гэта туга па праўдзе, па любові, па ўзьнёсласьці. Бог – гэта нашая лепшасьць, а вера ў Яго – дарога да дасканаласьці. Але мая лепшасьць адна, другога чалавека – іншая. Кожны мае свае меркі...
Яны слухалі мяне зь нейкім зьдзіўленьнем і нават з крыхою трывогі. Я сам адчуваў блюзьнерчы тон гэтых словаў, але прамаўляў далей, пераканаы, што паколькі стаў у абарону добрае справы і кіруюся да вызначанае мэты, дык магу разьлічваць на ласку неба. — Калі мы знаходзімся блізка Бога? Тады, калі нашыя сумленьні чыстыя. Сапраўды, неўсьведамленьне граху адчыняе брамы нябесныя нават перад грэшнікам. Калі я чыню блага, але думаю, што чыню добра, – дык я чыню добра. А калі чыню добра, думаючы, што грашу, – дык грашу. Царква Божая вучыць нас, што добра, а што – блага, і паказвае нам дарогу да збаўленьня. Але самога Бога мы нясем у нашых сэрцах. І я кажу вам, што ніхто ня ведае майго Бога, а я ня ведаю іншага Бога, апроч майго ўласнага. Я – гэта я. І дзякуючы менавіта таму, што маю майго Бога, які ня ёсьць Богам іншых людзей. Хоць адначасна Ён – Бог Адзіны і Ўсепрысутны... Дык чаго ж вы хочаце? Каб герцаг навязаў месту свае домыслы й пагляды, свае сумленьне й справядлівасьць?! А ці ж Арасу займаць уласнага сумленьня? Ці ж Бог не жыве ў нашых сэрцах і ці ж мы не стараемся кантактаваць зь Ім на нашую мерку, то бо менавіта так, як Ён хоча? Мы такія, якімі Бог нас учыніў. І Бог хоча, каб Арас быў такі, які ён ёсьць, – ані лепшы, ані горшы; ані разумнейшы, ані мудрэйшы... Нашае жыцьцё – гэта таямніца. Яно зьяўляецца каўчэгам запавету, дадзенага нам Богам. Навошта нам чужынцы?! Яны патрэбныя роўна на столькі, каб мы маглі адмовіць. Бо ўсё, што мы робім,

– адмаўленьне. Кожны з нас пярэчыць таму, што ён ня ёсьць сабою. Быць сабою – значыць крычаць безупынна, што ты не зьяўляешся нікім іншым. Праўду кажучы, калі б сюды прыехаў герцаг, адзінай дарогаю для ўрэчаісьненьня нашае тоеснасьці было б непадпарадкаваньне яму! Дык адкуль жа бярэцца ў нас перакананьне, што вера й справядлівасьць герцага лепшыя ад нашае веры й справядлівасьці? Але нават калі й лепшыя, дык яны – ня нашыя! А калі яны ня нашыя – дык ня могуць быць нашаю вераю ды справядлівасьцю. Яны абарочваюцца сваім запярэчаньнем, ператвараюцца ў зьняверaньне і ганебнасьць. Калі Давід сюды прыедзе, Арас страціць сябе. Вяртаючыся ў Гент, герцаг забярэ з сабою ўсё, што вызначае нашае існаваньне. А мы застанемся ў сеціве ваганьняў, граху ды зла – нават калі некаторыя будуць заставацца ў змане, што іх палепшыла праведнасьць і вера герцага. Яшчэ раз кажу вам, што той, хто адмаўляецца ад сваіх правоў ды перакладае сваю веру на іншых, саступаючы ім шуканьне Бога, – той выракаецца збаўленьня...

Яны слухалі мяне ў няпэўнасьці ды трывозе. Я сам пабойваўся, ці не заходжу задалёка. Але ўсё ж я пасеяў у іх сумнеў, бо, калі закончыў, той, хто быў арандаром у пана дэ Сакса, сказаў: — Ну, я не падумаў раней пра некаторыя рэчы. Тое, што мы цяпер пачулі, я лічу вельмі цікавым. На самай справе, герцаг мог бы зрабіць з нашай просьбы далёкасяжныя высновы. Разам з тым, мы, здаецца, маем у сабе даволі праведнасьці, каб падужацца зь лёсам тутака, у нашых мурох, без чужынцаў, нават такіх годных, як наш пан біскуп утрэхцкі. А што датычыць самой справы, яна застаецца адкрытай. Няма такіх словаў, якія б вярнулі Цэлюсу жыцьцё. Але рэч у тым, што трэба вывучыць усе падрабязнасьці. Пан Альбэр не павёў сябе адпаведна і павінен нам даць справаздачу. Мы шануем і любім пана Альбэра, але калі герцаг ня можа за нас вырашаць, дык і пан Альбэр ня мае такога прывілею. Таму няхай здасьць месту справу, а места рассудзіць, ці жыд Цэлюс быў вінаваты ў злачыне.

Калі арандар скончыў, большасьць зь ім пагадзілася. Былі, аднак, і такія, што сышлі незадаволеныя, лічачы, што я іх загаварыў.

Таго дня пачалося ў Арасе кіраваньне надзвычай дэмакратычнае. Альбэр, пэўны, што яму ўжо яму не пагражае прыезд герцага, з ахвотаю дапусьціў плябейскія галасы ў Раду.

Рэшта прыняла новы статус бяз злосьці, але з крыхою зьедлівасьці. Пан дэ Сакс сказаў у той вечар: «Вось як жыдоўская кроў яднае добрых хрысьціянаў. Яна – найлепшае злучыва для нашага места. Шкада толькі, што ў раднай палаце тхне гноем ды сырой воўнай».
Альбэр жа заявіў з годнасьцю й вялікім перакананьнем, якое нават мяне зьдзівіла, што добрай традыцыяй Бургундыі ёсьць выслухоўваць уважна просты люд, і нічога дзіўнага ў тым няма, што зь сёньняшняга дня ў Радзе будуць засядаць месьцічы ўсіх станаў, бо так ужо і даўней бывала, калі герцаг Ян праліў арманьяцкую кроў, каб спадабацца бедным.
Вельмі прыўкрасна гэта гучала. Месьцічы кланяліся нізка Альбэру, стоячы перад ягоным абліччам. І толькі дэ Сакс буркнуў: «Штосьці тут сьмярдзіць... Але смурод нейкі дастойны і айцоўскі, дык я мяркую, што гэта высоканароджаная задніца сапсавала паветра».
У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амэн. Ад таго дня пачалі адбывацца ў Арасе асаблівыя справы. Я зусім не сьцьвярджаю, што трэба гэта прыпісаць ініцыятыве мясцовых цесьляў, суконьнікаў ды кавалёў, якія пачалі засядаць у Радзе. Аднак жа менавіта іхная прысутнасьць ды ўдзел адкрылі цалкам новыя пэрспэктывы. Можна сказаць, што ў месьце сталася нешта падобнае да назіранага часам у прыродзе. Восеньню здараюцца ў Артуа вельмі парывістыя вятры. Адны дзьмуць ад мора ўглыб мацерыка, і насычаны яны вільгацьцю. Другія ж вырываюцца гаманліва ад лясістых пагоркаў, што цягнуцца да Парыжу, і бываюць вельмі сухімі. Яны сутыкаюцца адны з аднымі па-над палямі Артуа і пракочваюцца са сьвістам. Можа з гэтага прыйсьці дождж і восеньская непагадзь, калі ад сьвітаньня да ночы ўзносіцца над местам імглістая завесь; можа таксама прыйсьці надвор'е чыстае ды лагоднае, крыху сьвежаватае... Але часам здараецца, што вецер, які дзьме з мора, паглынае той другі, і тады места накрывае залева; патокі вады нясуцца вуліцамі, а дрэвы пазбаўляюцца рэштак лістоты цягам колькіх гадзінаў; альбо, таксама, той вецер, што вельмі сухі, убірае ў сябе ўсю сілу, і тады пануе некалькі дзён сьпякотнае надвор'е – вельмі непрыемнае ў гэтую пару году. Сады жоўкнуць пад промнямі сонца, вінаграднікі марнеюць, і лазу трэба аддаваць быдлу на корм. Так доўга, пакуль дзьмуць гэтыя два вятры насустрач адзін аднаму, у Артуа каралюе лагодная, хаця й

капрызная восень. Але хай толькі пераможа адзін зь іх – і нам даводзіцца дорага плаціць за гэткі брак раўнавагі.
Падобна было і ў Арасе – ад часу, калі прасталюдзьдзе пачало засядаць у Радзе. Раптам пачало не ставаць незалежнае вулічнае стыхіі – якая мудра ці неразумна, але ўсё ж нейкім чынам рэгулявала ўсе пачынаньні Рады. Наколькі сягае мая памяць, Альбэр і ягонае найбліжэйшае атачэньне адносіліся да месьцічаў так, як мужчына адносіцца да кабеты, якою прагне авалодаць. Крыху пагарды, крыху боязі й крыху гульлівасьці. Цягам дваццацёх зь лішкам гадоў дамагаўся Альбэр прыхільнасьці Арасу. Думаю, гэта стала ўтрымлівала ягоны розум у напружаньні ды неспакоі. Месьцічы ставіліся да яго з баязьлівай пашанай. Але гэта не азначала, што яны схілялі галовы з пакорай ды трымалі вусны на замку. Звычайна яны таксама мелі сваю рацыю, а паколькі йшлося пра справы важныя, дык надрываліся аж да зьнямогі. Іх пераконваць трэба было дбайна, знаходзячы дарогу да гэтых грубых душаў – часам недалёкіх, а часам – надзвычай кемлівых. Гэта залежала ад сытуацыі. Калісьці даўно яны ўпарта хацелі трымацца ангельцаў: ім не прыходзіла да галавы пераняць прыклад Бургундыі і паяднацца з каралём Карлам. Места квітнела пад ангельскай уладаю, бо хоць збройныя банды й чынілі рабаваньні ды гвалты, але ўсё ж месьцічы Арасу ткалі свае выкветныя габелены і выгодна іх прадавалі па другі бок Ля-Маншу. Беднасьць французскага двара была занадта відавочнай, каб рамесьнікі ды купцы з Артуа дазволілі хутка зрабіць сябе хаўрусьнікамі караля Карла. Надарма Альбэр тады даводзіў, што Жанна ёсьць добраю паннай, меч якой блаславіў сам Бог супраць ангельцаў... Яны называлі яе шлюшкай і пракліналі той дзень, калі яна пайшла ў Шынон... Павінна было прамінуць некалькі гадоў, каб яны асвойталіся з новаю сытуацыяй. Тканіны пасьля пачалі слаць у Брусэль, дзе герцаг бургундзкі пераплачваў за кожны локаць саржы, толькі б здабыць Арас для сваёй новай палітыкі. Але места, хоць ізноў квітнела, усё так жа надалей любіла ангельцаў і не любіла французаў.
У тыя гады Альбэр ажыцьцяўляў арцымайстарскія захады, каб перацягнуць Арас на бок двара. І было нямала падобных справаў, калі ён мусіў моцна варушыць глуздамі, каб спадабацца. Месьцічы пільнавалі сваіх прывілеяў, аддзялялі зерне ад пацярухі і заўсёды мелі наўвеце свой асабісты інтэрас.

То бо ўсё было так, як звычайна бывае над Артуа, калі дзьмуць супраціўныя вятры і змагаюцца адзін з адным, што выходзіць на дабро людзям, жывёлам ды расьлінам.
І вось цяпер усё зьмянілася! Вяровачнікі й цесьлі ўвайшлі ў Раду, каб разам кіраваць. Вуліца паглынула вялебнага айца ці, можа, ён паглынуў вуліцу. Не было ўжо супраціўных стыхіяў. Запанавала гармонія. Быў гэта першы праклён нябёсаў, кінуты на Арас.
Мае панове! Калі вы думаеце, што з таго часу паседжаньні Рады ператварыліся ў поле спрэчак і зацятых дыспутаў, дык глыбака памыляецеся. Гляньце, што гэта была за сытуацыя! Раней люд даведваўся пра рашэньні Рады post factum. Бывала, што яны надрывалі горла супроць тых рашэньняў, крычучы: «Не, не і яшчэ раз не! Пане Альбэру, пераглядзі справу, бо мы не згаджаемся і ня хочам чыніць так, як ты пастанавіў... Таму гаворым табе – пераглядзі справу, каб у месьце не было болей гневу». Тады Рада дэбатавала йзноў тое пытаньне, зважаючы, каб яе новыя рашэньні здаліся людзям іншымі – больш лагоднымі або больш суворымі – у кожным разе больш прымальнымі для месьцічаў Арасу. Рэч у тым, што вуліца ніколі ня ўдзельнічала ў прыняцьці рашэньняў. Вуліца была здольная гукаць «Не!» – і ўсё. Гэта змушала Альбэра да вялікіх намаганьняў, але рабіла яго разважным правіцелем. Калі ж вуліца ўвайшла ў Раду, яна сама пачала браць удзел у прыняцьці рашэньняў. Ды на чым гэта грунтавалася?
Хто цесьля ў сваім доме? Цесьля ў сваім доме – гаспадар. Хто цесьля на вуліцы? Цесьля на вуліцы – месьціч. А хто цесьля ў Радзе? Цесьля ў Радзе будзе пакорным маўкліўцам. Бывае, што рыбак, цягнучы невад, мусіць вельмі высільвацца, бо рыба супраціўляецца, б'е хвастом у люстра ракі. Бо яна – у сябе, а ён – сярод чужое стыхіі. Але хай толькі ён выцягне невад на бераг – і ўсё зьмяняецца... Рыбак цьвёрда стаіць на камені, а рыба падрыгвае ўсё слабей, пакуль зусім не зьнерухомее і яе можна бяз боязі ўбіць на ражон.
Тое ж адбылося і з прасталюдзьдзем у Радзе. У іх адабралі іхную стыхію, а што яшчэ горай – адабралі лёгкасьць адмаўленьня. Яны ўжо не маглі галёкаць: «Не, не і яшчэ раз не! Пане Альбэру, мы кажам табе – не!» Бо калі яны хацелі так галёкнуць, ім адказвалі: «Вы маеце права пратэставаць, і мы радыя, што вы з такім гонарам зь яго карыстаеце. Але трэба

прыняць адпаведную пастанову, дык кажыце – што вы думаеце на гэты конт?» І на іх абрынваўся цяжар, аб якім яны ніколі ня мелі ўяўленьня. Яны віліся, як печкуры, і адразу йзноў гукалі: «Не, не, гэтак ня трэба...» – але паколькі былі людзьмі паважнымі ды сумленнымі, дык змаўкалі; пот сьцякаў па іхных карках, заліваў вочы, яны аглядаліся адзін на аднаго ў роспачы ды страху, ажно ўрэшце казалі: «Няхай будзе, як пан Альбэр загадаў!» Ці ж маглі яны паводзіць сябе йначай? Ім бракавала тае напышлівае ўпэўненасьці, якая ўсё жыцьцё суправаджае добранароджаных. Яны адчувалі сябе зьвязанымі вытанчанасьцю ды элегантнасьцю маўленьня, велікапышнасьцю палатаў, мэблі ды строяў. А болей за ўсё іх гняла адказнасьць.

Сапраўды, Альбэр заслужыў сабе вечнае збаўленьне. Калі ня ўчынкамі, дык, несумненна, хітрасьцю. Бо яму ўдалося дасягнуць таго, пра што мараць усе валадары. Саступіўшы частку ўлады прасталюдзьдзю, ён здабыў уладу непадзельную. Дзелячыся ёю з дурнямі, ён цалкам захаваў яе для сябе! Гэта не ўдавалася нават герцагу Давіду – але, можа, таму, што герцаг, легкаважачы ўсё, легкаважыў таксама і ўласную ўладу...

Такім чынам, надышлі часы, што прадвяшчалі гармонію. Ніхто нават не падазраваў, што гэта найвялікшы цяжар, які лёс ускладае на плечы Арасу. Дзіўная рэч – калі мы сабраліся, аніводнага слова на тэму справы Цэлюса не зьляцела з вуснаў прасталюдзьдзя. Нібы яна сама сабою счэзла, адышла ў няпамяць. Я сказаў пану дэ Саксу: — Наколькі кволы той агеньчык справядлівасьці, што гарыць у гэтых душах. Толькі што яны крычалі ў абарону жыда, а вось цяпер стаяць як з зашытымі вуснамі перад абліччам дастойнае Рады і гатовыя аддаць спакой сумленьня за тыя драбочкі, што ўпалі з нашага стала...

Дэ Сакс адказаў: — Праўду кажучы, я ня бачу ў гэтым нічога незвычайнага. Чаму ты чакаеш ад простых людзей большае заўзятасьці ды ўпору ў справах сумленьня, чым гэта можна сустрэць у паноў? Яны заблыталіся – вось і ўсё...

Дэ Сакс быў чалавекам вялікае вытанчанасьці пачуцьцяў, ці ня така́

Але той, хто лічыць, што цень жыда Цэлюса болей не зьяўляўся ў залі Рады, той памыляецца. Цесьлі ды суконьнікі маўчалі, але Альбэр не хацеў маўчаць. Што й выклікала лявіну далейшых

падзеяў.
Прыйшоў у Раду чалавек зь лістом ад жыдоў, якія прасілі ім выдаць цела Цэлюса. Увялі яго. Ён стаяў у цені нізкіх скляпеньняў залі, увесь чорны. У чорнай вопратцы, з чорнай барадою. Ён падаўся мне гнуткім, бы купіна падубу на вятры. Ён маўчаў, пакуль чыталі ліст. Тут жа побач зь ім стаяў возны, чалавек вельмі рослы й каржакаваты. Ён перавышаў жыда на галаву. І я падумаў тады, што гэны жыд усіх нас нейкім асаблівым чынам перарос, бо ён ведае тое, чаго мы яшчэ ня ведаем, і калі мы пакуль у сёньня, ён ужо ў заўтра. Зрэшты, можа, я так і не падумаў, а толькі адчуў неспакой ды холад, нібы да мяне дакранулася птушынае крыло ў лёце.
Мы ўсе спаглядалі на цёмнага жыда, а ён глядзеў толькі на мяне, як нямыя глядзяць на дабрамоўнага альбо разумныя жывёлы – на людзей. Дальбог, гэта было нялёгка...
— Што гэта?! – прамовіў ціха Альбэр. – Жыды дыктуюць свае законы Радзе места Арас?
Той схіліў галаву: — Мы маем найвялікшую пашану да Рады, – кажа. – Мы складаем Радзе нашую пакорлівую просьбу... – І яшчэ ніжэй схіліў галаву.
У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амэн. Як жа жалосна пабудаваны сьвет... Уявіце сабе жыцьцё вала. Ён ідзе ў ярме сярод палёў, зь нізка апушчанай галавою, у чаканьні бізуна. Ідзе на пастронку да бойных пляцаў, а калі хочуць яго зарэзаць – згінае калені. Але хай бы добры лёс учыніў яго быком. Што тады? Дарэмна абцяжарваць яго ярмом. Ён ірве пастронкі і топча кожнае поле. Пяцёра рослых людзей мусяць цягнуць яго на ўбой, дый так ня раз здараецца, што паломіць ён ім косьці, напаўняючы страшэнным рыканьнем паветра. Зусім іншай стаецца натура жывёліны, калі мае яна пачуцьце ўласнае сілы. Так бывае і зь людзьмі! Дзе падзелася памяркоўнасьць высакародных калесьнікаў з Арасу, калі яны паселі на радных лавах? Самотную постаць жыда абляпілі позіркі разьюшаных бугаёў. Ён кепска зрабіў, гаворачы так пакорна, бо ў тую хвіліну нішто не было ім нагэтулькі агідна, як менавіта пакора. Іхныя храпы вынюхвалі пах барбарства. Калі б ён тады кінуў ганарлівыя словы! Але ж не... Ён стаяў нерухома ў паклоне, што ўспрынялі як знак слабасьці і ўшанаваньня. Для людзей пакрою пана дэ Сакса, а таксама для мяне, якія прызвычаіліся да пэўнае чалабітнасьці атачэньня, жыд выглядаў як заўсёды.

Але тыя, што паселі ў Радзе на пажаданьне Альбэра, – упершыню ў жыцьці спазналі гэткае раскошы. Адзін крыкнуў: «Ніжэй схілі карак, жыдзе!» Што той адразу ж і зрабіў... Я зірнуў на Альбэра. Спасярод ускудлачанае барады выглынуў посьмех. — Я ня бачу ў лісьце вашым, – кажа Альбэр, – пашаны, што належыцца Радзе. Ты прыйшоў да нас з просьбаю, а мы мусім цябе вучыць, як складаць паклон. Мы лагодныя, але зважай, каб не перабраць мерку нашае цярпімасьці.
— Пане, – адказаў жыд. – Не віна маіх суродзічаў, што выбралі такога нікчэмнага ды нягоднага пасланца. Калі трэба, я прыму кару з сапраўднаю пашанай, але прашу, каб грамада не адчула вашага гневу, бо не яна вінаватая!
— Вось жа круцель жыдоўскі! – крыкнуў пекар Мэгун, і ўмомант узьняўся паўсюдны гвалт.
Але Альбэр панаваў над гэтым збродам. — *Рах, рах!* – загукаў ён. – Ня годна паддавацца жарсьцям на Радзе!
Пасьціхала. Тады наш вялебны айцец запытаў жыда, як ён завецца. Той адказаў, што Іцхакам. І Альбэр адаслаў яго кіўком рукі. — Пане, – прамовіў Мэгун. – Як тое магчыма, што Рада пускае плазам жыдоўскую абразу?
— Я не заўважыў аніякае абразы, пекару, – адказаў Альбэр. Ізноў закрычалі, але ён іх суцішыў. — Мэгуне, – кажа ён пекару, – ці ты сапраўды лічыш, што гэты жыд сьвядома хацеў прынізіць Раду?
— Я так лічу! – галёкае гэты ёлупень, дыхаючы помстай, увесь чырвоны ад злосьці. — А ты, суконьнік Іванэ? — І я так лічу, – адказвае Іванэ.
Усе па чарзе адказалі аднолькава. Ён скончыў зь імі і зьвярнуўся да мяне: — Добры Яне, сябра, што ты думаеш пра гэта?
— Я лічу, – адказаў я не бяз боязі, – што жыд паводзіў сябе па-грубіянску перад Радай!
Вялебны айцец пасьміхнуўся лагодна і гаворыць пану дэ Саксу: — А ты, мілы графе, што думаеш?
Дэ Сакс фыркнуў, як кот: — Добры пане Альбэру, – адказаў ён, ня тоячы разьлютаваньня. – Я – дэ Сакс! Дык ці можа мяне пакрыўдзіць жыд?! Дзе я, а дзе ён?!
Альбэр прамовіў лагодна: — Усе ведаюць, што графы дэ Сакс – гэта квецень Брабанту. Таму відавочна, што грудка жыдоўскага лайна ня можа запэцкаць твайго плашча!

Я адчуў, як па тых словах вырастае вакол графа мур халоднае непрыязнасьці ды недаверу.
І быў бы гэта ўжо канец Рады, але Альбэр яшчэ сказаў:
— Хрысьціянскае сумленьне мне падказвае, што бедны Цэлюс не вінаваты ў тым, што сёньня адбылося. Таму прашу Раду, каб пастанавіла аддаць цела грамадзе. Няхай яго пахаваюць згодна з жыдоўскімі звычаямі. Што ж датычыць самое грамады, дык мы яшчэ вернемся да гэтае справы.
Рада так і пастанавіла. Яны разыходзіліся да сваіх заняткаў, перапоўненыя сьвятым гневам. Таго дня яны засыналі, расчуленыя ўласнаю дабрынёю і гатовыя вяршыць суд над грамадою. Былі яны чыстыя ды высакародныя, як ніколі дагэтуль. Пры ўзгалоўі кожнага зь іх стаяў анёл сьвятое вайны, якую яны ўжо абвясьцілі.
Што ж да мяне, дык я добра памятаю, як тае начы ня сплюшчыў вока. Мучылі мяне нейкія страхі, якія сёньня я ня змог бы назваць, бо ж ад тых здарэньняў мінула ўжо восень і добры кавалак зімы. Фляндрыйскі сьнег часткова прысыпаў маю памяць, а вятры, што дзьмуць зь Ля-Маншу, вымелі з мае галавы самыя розныя вобразы. Тое, аднак, я ўзгадваю, што, калі сонца ўзышло і троху разьвіднела, я ўрэшце праваліўся ў прыкры сон. Мне сьнілася, што я абыходжу нейкі невядомы край, увесь пусты і нібы выцесаны з аднае каменнае брылы. Мае стопы не пакідалі аніякіх сьлядоў на паверхні зямлі. Навокал не было відаць ні людзей, ні зьвяроў, ні дрэў, ані нават травы. Голы, цьвёрды камень цягнуўся ажно да небакраю – і я быў адзінюткі пад хмарным небам. Цягнулася гэта, пэўна, нядоўга, бо, калі я расплюшчыў вочы, сонца вісела яшчэ нізка над дахамі места, а пранізьлівы холад ночы яшчэ не адступіў. Але нават калі сон быў кароткі ды ўлётны, усё роўна, абудзіўшыся, я зразумеў, што ніколі дагэтуль не кантактаваў гэтак балюча і беспасярэдна з Богам і маёй хрысьціянскаю верай.
Усё жыцьцё мяне суправаджала пачуцьцё самотнасьці, але я ўцякаў ад яго, хаваючыся ў кантактах зь іншымі людзьмі, каб дзякуючы гэтаму жыць жвавей і паўней. Таго ранку я зразумеў, наколькі гэткія намаганьні ўяўныя. І вось тады я ўбачыў сябе такім самотным у гэтым сьвеце, перад абліччам Бога, і зразумеў, які я безабаронны. Ахапіў мяне тады люты страх. Што я значу, думалася мне, у параўнаньні з гэтым вялікім

сьветам, які дадзены мне на жытло? Я – як валацужны сабака, альбо як пакінуты на бездарожжы ды скульгавелы конь, альбо ўвогуле як спалы з галіны ліст. Я сунуся наперад, думаючы, што ведаю дарогу. Але гэта – толькі дурное мроеньне, бо на самай справе я ня маю ўяўленьня, дзе ўсход, захад, поўнач і поўдзень. Я іду зь цяжкасьцю, не пакідаючы нават сьлядоў ног на гэтай зямлі, лютай ды варожай, і, магчыма, увесь час вяртаюся ўсё да таго самага пункту, які не пазначаны і нічым не вылучаецца. Толькі мая ўсёпаглынальная стома дазваляе ўмацоўвацца думкай, што я кудысьці імкнуся, што ўжо нешта пакінуў за сьпінаю, а нешта іншае мяне чакае ў далейшай дарозе. Але калі я разглядаюся навокал альбо гляджу ўперад, назад ці па бакох – заўсёды бачу тое ж самае: неахопную і неапісальную пустэчу, гэткую жудасную, што валасы стаюць дыбарам на галаве, а сэрца трапеча, як злоўленая птушка. Бо няма тут аніякае меркі для маіх намаганьняў – толькі час і прастора, толькі Бог, які напаўняе сабой усё, ды я перад Ягоным каменным абліччам.

Я памятаю той страшны ранак. Устаўшы з пасьцелі, я нарабіў шуму – і на парозе зьявіўся паслужнік. Гэта быў чалавек вельмі нязграбны, я яго трымаў пару гадоў больш праз сваю ляноту, чым з ахвоты. Ён мне заўсёды быў непрыемны з прычыны прыроджанае некультурнасьці ды дурноты. Але ў мяне даволі мяккая натура, і таму я марудзіў з разьвязаньнем гэтае справы. Адсылаць слуг заўсёды непрыемна для пана. Так ён і заставаўся ў маім доме, заўсёды крыху затоены і выстрашаны. Але ўсё, што трэба, ён выконваў старанна, баючыся бізуна. Я ведаў, што гэты слуга мяне ня любіць. Але, калі таго ранку ён зьявіўся на парозе ды зыркнуў з-пад ілба, чакаючы загаду, я раптам адчуў невымоўную радасьць, што ён пры мне. І адразу ж пакінуў мяне страх.

Я ня ведаю, ці іншым сябрам Рады сьніліся тады дрэнныя сны. Але ведаю, што прыйшлі яны апоўдні ў ратушу нейкія неспакойныя ды ўзрушаныя. Я, як заўсёды, сеў каля Альбэра. Затое граф дэ Сакс, пан Мюнье і пан дэ Ўель селі здалёк, як ніколі датуль. Я тады падумаў, што гэта зразумела. І трохі ім пазайздросьціў. Але ці ж можа купіна, прынесеная ветрам на пясчаныя дзюны, раўняцца з дубам або букам? Род дэ Саксаў вырас з глебы Артуа вякі таму. Паны дэ Ўель выводзілі сябе ад рыцараў крыжовых, якіх Рабэр Фляндрыйскі павёў за сабою ў

Сьвятую Зямлю. Пан Мюнье, чалавек неапісальнае старасьці, гадаваў нашага герцага Філіпа, калі той быў яшчэ дзіцянём. Падобна, пан Мюнье зрабіў неацэнныя паслугі Яну Бясстрашнаму ў расправе з арманьякамі... Кім быў у адносінах да тых людзей вялебны Альбэр, як ня нейкім італьянскім прыблудам? Ён утаймаваў Арас сваёю жарсьліваю верай ды ўзорнасьцю жыцьця, але з гэтага нічога не вынікала для гэтых ганарлівых паноў, якія саступілі яму ўладу, пакідаючы сабе незалежнасьць ды пачуцьцё вышэйшасьці. Тады як я быў толькі вучнем вялебнага айца, дасьпяваў у ягоным сьвятле. Некаторыя казалі, што я – лепшая частка Арасу ці ўвогуле ягонае сумленьне. Нат калі й так, дык ці можа існаваць сумленьне без чалавека, а частка бяз цэлага? Вось чаму я, як звычайна, сеў леваруч айца, калі тыя селі здалёк.
Паседжаньне ў той дзень не было доўгім. Пралёг заўсёды кароткі, але зьмястоўны. Ён прадвяшчае тое, што мае адбыцца. Так здарылася й тады. Вялебны наш айцец падняў бровы й сказаў: — Ня мне ганьбіць такіх шляхетнанароджаных паноў, як граф дэ Сакс, пан дэ Ўель і пан Мюнье. І я не зьбіраюся гэтага рабіць. Але не магу пазбыцца зьдзіўленьня, што менавіта сёньня, у такі ўрачысты дзень, найшляхетнейшыя з нашае грамады сядаюць здалёк, як быццам чуюцца нечым даткнутыя ды абражаныя. Гэта, здаецца, павінна быць вельмі прыкра для людзей простых і, пэўна ж, не зьяўляецца ўчынкам па-сапраўднаму хрысьціянскім...
На што граф дэ Сакс адказаў: — Добры ойча Альбэру. Век пана Мюнье апраўдвае яго цалкам. Ня можа ён займаць месца на скразьняку. Што датычыць пана дэ Ўеля, пакутуе ён на скульле – неаднойчы ў часе нарады мусіць праходжвацца. Таму, каб не турбаваць іншых, ён сеў наўзбоч.
Замоўк. На тое Альбэр: — Вельмі добра. А што кіравала табою, мілы дэ Саксе? — Ну, гэта не патрабуе тлумачэньняў, – сказаў дэ Сакс. – Я сядаю заўсёды, дзе мне прыйдзе ахвота. Цяжка паверыць, якая ў мяне капрызьлівая натура. І заўсёды я ёй падпарадкоўваюся. Вось хаця б цяпер... Яшчэ адно слова ў гэтай справе – і капрызная натура дзюбне мяне ў азадак, і я, устаўшы зь месца, выйду на вуліцу, нават ня склаўшы паклону гэтай дастойнай Радзе...
Альбэр, здавалася, вельмі раззлаваўся, але не сказаў больш нічога. А прасталюдзьдзе прыняло гэтае разважаньне пана дэ

Сакса вельмі асабліва. Яны спаглядалі на яго з баязьлівай пашанай, і калі б ён тады высунуў якое-небудзь патрабаваньне, не адмовілі б яму ні ў чым. Але ён прагнуў толькі захаваць сваю ганарлівую адрознасьць.

Урэшце пачалі радзіцца. Не цягнулася гэта доўга. Раней, чым надышоў поўдзень, справы былі скончаныя, або – хто як жадае – адкрытыя на будучыню. Альбэр казаў пра Цэлюса: — Нельга катэгарычна сьцьвярджаць, што гэта ён кінуў праклён на дом Дамаскіна. І тым ня менш, трэба, каб Рада ведала, што колькі год таму, падчас вялікае пошасьці, ня хто іншы, як менавіта Цэлюс пакінуў места пры вельмі падазроных акалічнасьцях. Ён зьехаў з Арасу амаль адразу ж пасьля таго, як палі першыя ахвяры. Пэўныя людзі казалі, што, выходзячы праз браму сьвятога Эгідыя, паўтараў ён дзівосныя словы, а калі прамінуў мост – абярнуўся тройчы да места і ўчыніў таемныя знакі. Неспасьцігальныя суды Гасподнія. Мы выцерпелі шмат, і ніхто з нас не блюзьнерыў супроць неба за гэтыя выпрабаваньні. Бо кожны разумеў, што няшчасьце напаткала Арас з дапамогай шатана. Бог – магутны, але й шатан таксама магутны. Мы стараемся зьнішчыць у месьце ўсё, што магло б спрыяць прысутнасьці пякельных сілаў. Але блюзьнерствам было б меркаваць, што Арас выключна належыць Богу. Ён – як поле бітвы, як абшар, за здабыцьцё якога вядуць барацьбу неба й пекла. Бог мае тутака сваіх прыхільнікаў, гэта пэўна... Але ці ня мае іх таксама й д'ябал? А хто ў Арасе можа быць прыхільнікам ды наймітам шатана, калі ня тыя, што не зьвяртаюцца да Госпада Бога; тыя, што ня слухаюць павучаньняў Сьвятое Царквы ды пагардліва адварочваюцца ад сакрамантаў? Дзе д'ябал найбольш ахвотна расьцягвае свае сеці, як не сярод тых, што зьяўляюцца нашчадкамі фарысейскага насеньня? Калі ў іншых местах Брабанту ды ўсяго герцагства жыды пазбаўлены прывілеяў, у нас яны карыстаюцца свабодай, ці ня большай, чым мы самі. Бо мы схіляем галовы перад абліччам запаветаў Божых, а яны ня гнуць карку нават перад найсьвяцейшымі рэліквіямі... І, нягледзячы на гэта, у часох пошасьці граф дэ Сакс дзяліў ежу пароўну на кожную душу, не зважаючы на паходжаньне. Жыдом не адмаўлялі ані ў апецы, ані нават у прыстойным пахаваньні парэшткаў. Зірніце, што з гэтага выйшла! У Генце ды Утрэхце, дзе грэх стакроць болей пашыраны, чым у Арасе, ня здарылася аніводнага няшчасьця.

Затое мы апынуліся на самым дне. У чым жа прычына? Ці не належыць меркаваць, што мы дазваляем у мурох нашага места існаваць шатану, што мы ставімся да яго з памяркоўнасьцю, якая не падабаецца Богу?! Нас так шмат памерла ад заразы й голаду, што мы не пасьпявалі капаць магілаў. А жыды? Ну, я не пярэчу, што й яны страцілі частку жывых. Але як жа йначай... Казалі, што яны абавязаныя гэтым сваім забабонам. Яны стаіліся ў дамох на ўскрайку места, пры заходняй браме, аддзеленыя вартай. А калі ім давалі ежу, яны чынілі асаблівыя штукі, раней чым яе спажыць. Дзе ж пэўнасьць, што яны не былі пасланцамі заразы, якіх шатан вырашыў уратаваць, каб зрабіць Арас сваёй прыдворнай сталіцай? Уявіце сабе, што ўсё места памерла, а ацалелі толькі яны, гэтая жменька хаўрусьнікаў пекла. Касьцёлы апаганеныя, крыжы растаптаныя, брамы Арасу шырока расчыненыя для ўсялякага граху...
Тады дэ Сакс перапыніў гэты паток красамоўства. — Вялебны ойча, – прамовіў ён вельмі гучна. – Нельга абцяжарваць гэтых людзей віною за выбух заразы. Здаралася, што пошасьць наведвала места, у якім ніколі не было ніводнага жыда. Нішто ня сьведчыць пра іхную адказнасьць за тое, што мы перажылі...
Альбэр паківаў галавой. — Я не раблю іх вінаватымі, – адказаў ён лагодна. – Я толькі кажу, што кожны можа быць прыладаю Бога і кожны можа быць прыладай шатана. Але ці не лягчэй д'яблу аблытаць жыдоўскую душу і ўчыніць зь яе зброю згубы для праўдзівых хрысьціянаў? Ну, адкажы мне на гэта, графе дэ Саксе.
Дэ Сакс спахмурнеў, доўга маўчаў, урэшце прамовіў: — Гэта праўда, што жыд, паколькі ён пазбаўлены навучаньня Царквы Божае, лягчэй паддасца нашэптваньням пекла. Але, тым ня менш, і жыда стварыў Бог-Айцец, а таму й яму належыцца дрaбок нашага даверу...
Пекар Мэгун загукаў: — Казалі, што ў часе пошасьці ля заходняе брамы зьяўляліся трохгаловыя сабакі, зь пекла родам. Яны хапалі хрысьціянаў, якія тудою праходзілі, і насілі іх на бяседы да жыдоў. — Трохгаловыя сабакі, – умяшаўся суконьнік Іванэ, – гэта слугі д'ябла. Бо гэта ж вядома!
А яшчэ іншы дадаў абураным тонам: — Ня можа быць, каб Бог без аніякае прычыны так сувора пакараў добрае места Арас. Гэта ўсё адбылося ня воляю неба, а з прычыны д'ябальскіх штукаў. Хто ж у сьвеце бачыў, каб пабожныя людзі дапускаліся

такіх ганебнасьцяў ды грахоў, як мы ўсе ў год заразы й голаду? Добрыя месьцічы выпускалі адзін аднаму вантробы, каб пад'есьці сьвежага мяса. Ці ж нашыя сэрцы былі б на тое здольныя, калі б ня д'ябальскія сеці, што аблыталі места?! Няшчасная дзетазабойца, абезгалоўленая тады на загад добрага пана Альбэра, была даведзена да вар'яцтва, якога немагчыма зразумець без удзелу сілаў нячыстых. Гляньце сёньня за сябе... Ці ж хтосьці з нас мае да іншага пачуцьці зайздрасьці, гневу або пагарды? Мы добрыя людзі, у нашых сэрцах жыве Ісус Хрыстос. А тады? Кожны вастрыў нож, каб перарэзаць горла суседу... Чым жа гэта можна вытлумачыць, як ня штукамі д'ябальскімі, што авалодалі местам на жыдоўскі праклён...

— Да чаго ты вядзеш? – спытаў Альбэр. — Пане, – адказаў той. – Я баюся, каб з нашае лагоднасьці зноў ня выніклі страшэнныя здарэньні. Ужо раз мы далі паслабленьне д'ябальскім прыхамацям. Кажаш, не даказана, што жыд Цэлюс кінуў праклён на дом суконьніка, ад чаго паў конь вельмі добрай крыві. Але тры гады таму таксама не было даказана, зь якой прычыны мерла нашае быдла. Гаварылі тады, што гэта благі выпадак альбо кара Божая. А за што ж тая кара? Ці места Арас зграшыла? Ці ж не было яно перапоўнена ўзьнёслымі пачуцьцямі ды боязьзю Божай? Ніхто ў той час нават і не падумаў, што быдла можа хварэць з прычыны жыдоўскіх праклёнаў. Палічылі гэта за справу Творцы, за знак лёсу, за прысуд нябесны, якому нельга супрацьставіцца. Мы ўзносілі малітвы і, поўнячыся пакорай, прымалі найцяжэйшыя выпрабаваньні. Ці ж і сёньня мы павінны так чыніць? Ці варта аддаваць места на згубу толькі таму, што мы ня можам даказаць д'ябальскіх чынаў Цэлюса?

І зноў Альбэр сказаў:

— Да чаго ты вядзеш, сябра? Кажы адкрыта!

— Пане, – закрычаў той. – Нельга аддаваць места на здобыч д'яблу. Хай кагал адкажа за ўсе свае благія справы!

— Хай кагал адказвае! – загукалі астатнія, а пекар Мэгун – гучней за ўсіх. Тады Альбэр прамовіў: — А калі выявіцца, што гэта ўчынена не жыдамі і мы сувора пакараем невінаватых?

— Тады Бог нам даруе, бо мы дзейнічалі з намерам збаўленьня нашых душаў... – адказаў зь вялікай сур'ёзнасьцю суконьнік Іванэ.

Альбэр агледзеўся вакол і затрымаў позірк на маім твары. — Яне, мілы дружа, – сказаў ён. – Як ты на гэта глядзіш?
— Добры ойча, – адказаў я. – Іванэ ставіць справу слушна. Што можа быць для хрысьціяніна важней, ніж змаганьне за збаўленьне душы? Калі мы памыляемся, Бог запіша гэта на нашае дабро, бо намеры мы маем высакародныя. І вагаемся... А гэта сьведчыць пра нашую пакору.
Пачуўшы мае словы, дэ Сакс, дэ Ўель і пан Мюнье падняліся і выйшлі з залі. — Няхай ідуць, – сказаў Альбэр. – Яны такія вялікія паны, што й самі, без дапамогі Рады, могуць паклапаціцца аб сваім збаўленьні.
Назаўтра места Арас выставіла рахунак жыдоўскай грамадзе. Дзень распачаўся туманны і даволі пахмурны, што гэтай парой не было дзіўным. Аднак жа менавіта гэты туман паспрыяў таму, што людзі былі схільныя яшчэ больш упарта дашуквацца повязяў з часамі пошасьці. Як я ўжо згадваў, таго году туманы ахутвалі места бесьперастанна; удзень было амаль горача, тады як уначы холад марозіў ваду ў неглыбокіх студнях. Але пошасьць усё ж выбухнула вясною, тады як цяпер стаяла восень, і тое, што ў той час здавалася надзвычайным, цяпер было ў парадку рэчаў. Але чалавечая натура, па сутнасьці, вельмі простая. Яна несупынна і з трывогай шукае знакаў, якія могуць стаць апірышчам для сумленьня. На чым жа, урэшце, грунтуецца нашае жыцьцё, як не на прагненьні апраўдаць кожны свой учынак. А паколькі места палічыла, што трэба ўрэшце пакласьці канец жыдоўскай змове і такім чынам абараніць Арас ад шатана, дык кожны чалавек шукаў вакол сябе падтрымкі, дапамогі, нейкага ўпарадкавальнага прынцыпу. І зусім не кіраваўся ў бок храмаў Гасподніх, быццам бы прадчуваючы, што ў самой веры ён ня знойдзе ўжо апраўданьня. Вера яшчэ цеплілася ў сэрцах, але яна раптам прыціхла, заглушаная патрэбай справядлівасьці й чыну. Сонца ўстала над Арасам бледнае ды халоднае, нібы захінутае хустай. Пашарпаныя хмары плылі нізка над мурамі, і магло здавацца, што да нас прыляцелі чароды вялізных, непрыветных птушак. Быў загад ударыць у званы касьцёлаў, і ўсё места зайшлося гэтым галасам. Але таго дня нават званы білі незвычайна. Напрыклад, звон сьвятога Фіякра, голас якога заўсёды здаваўся чыстым і годным, біў надзвычай пранізьліва й глуха, нібы штосьці яму супраціўлялася. Званары апавядалі потым, што

пры першым удары біла з келіха звону вылецела чародка чорных галак, а пасьля ўпалі на зямлю цельцы забітых птушак. Быў гэта відавочны знак, што цёмныя сілы імкнуліся сьцішыць звон сьвятога Фіякра.

Яшчэ перад поўднем жыд на імя Іцхак палаў як паходня. Па яго прыйшлі людзі розных станаў, спакойныя і поўныя рашучасьці. Усё адбылося бяз крыку ды пагрозаў. Мне распавядалі пазьней, што грамада з пакораю выдала свайго пасланца. А ён пакрочыў у тлуме на карны пляц, ня чынячы аніякага супраціву. Пад слуп напрыносілі дроваў і вецьця. Іцхака прывязалі да слупа ашчадна, каб не задаваць яму лішніх мучэньняў. Аплялі шыю, але лёгка; пасьля – грудзі й плечы; урэшце – лыткі. Калі вогнішча запалала, людзі – іначай, як тое прынята, – маўчалі. Кожны быў узрушаны думкай, што зьяўляецца цяпер сьведкам надзвычайнай хвіліны, калі пазбаўлены цялеснае абалонкі д'ябал павінен вяртацца ў пекла. З полымя быў чуваць страшны голас. Адны казалі, што пазнаюць голас д'ябла, іншыя ў тым сумняваліся. Што да мяне, дык я мяркую, гэта пакутны жыд крычаў у часіну кананьня. Калі вогнішча згасла, агледзелі ягонае цела. Сапраўды, гэта было нешта надзвычайнае. Агонь, здавалася, зусім не крануў жыда. Толькі чаравікі былі спаленыя дазваньня. Апратка, што перад тым была чорнай, зрудзела й выліняла, а барада й валасы на галаве зьніклі, спапялёныя дарэшты. Але на целе не было знакаў агню, толькі дзіўныя чырвоныя плямы – нібы штосьці зь сярэдзіны гэтага чалавека вырвалася. Скура тут і там парэпалася, дык казалі, што д'ябал, які ў ім сядзеў, бадаў рагамі ў грудзі жыда, але ня меў дастаткова сілы, каб вылезьці, і пайшоў у пекла...

У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амэн. Я ня веру ў гэтыя байкі. Таго дня, прызнаюся, я быў гатовы даць ім веры. Але пазьней адбылося так шмат рэчаў людзкіх, у якіх ані Бог, ані шатан, напэўна, ня бралі ўдзелу, што сёньня я пераканаы: Іцхак ня меў зь пеклам анічога супольнага. Калі ж я памыляюся, Бог адпусьціць мне гэты грэх...

Якая страшная ноч настала пасьля гэтага дня. Сонца зайшло зьнянацку; увесь небасхіл, здавалася, занурыўся ў кроў. Падзьмуў парывісты цёплы вецер і прыгнаў цьмяныя хмары. Па зьмярканьні натоўп усё яшчэ перапаўняў вуліцы. Сьвятло паходняў адбівалася на людзкіх тварах, выхопліваючы іх зь цемры белымі, рухавымі плямамі. Здавалася, што менавіта

гэтае ночы наступіць разьвязаньне. Званы білі бесьперапынна, бы ў часе вайны або пошасьці – весьцячы небясьпеку. Ад сьвятога Эгідыя выйшла працэсія са сьпевам. Ёй папярэднічалі гурмы лупцоўнікаў, што выдавалі жудасныя крыкі. Мужчыны і жанчыны былі аголеныя да поясу. Па іхных плячох цякла кроў. Тыя, што ішлі ззаду, хвасталі тых, што перад імі, плеценае раменьне сьвістала ў паветры. Хто падаў, таго білі, пакуль не падымаўся й ня йшоў далей. Працэсія ступала па зямлі, мокрай ад крыві, сярод лямцаватай чырвона-рудой саломы, балоцьця ды камянёў. Жыд Іцхак усё стаяў пры слупе на карным пляцы. Я апынуўся на прыступках касьцёлу і з жахам спаглядаў на гэтае відовішча. Раптам пачуў размову двох людзей, якія прыпыніліся побач, у цені бабінца. Адзін сказаў: — Матэўсе, добры суседзе. Не падабаецца мне тое, што мы робім. Ня ведаю, ці льга забіваць у імя Госпада Бога...
— Змоўкні! – адказаў той другі сувора. – Хто так вагаецца, ня будзе мне добрым суседам...
Тады першы: — Як жа так, Матэўсе... Госпад Ісус цярпеў на крыжы за нас усіх. А канаючы, у пакуце сказаў: «Госпадзе, даруй ім, бо ня ведаюць, што чыняць!» Ці ж слушна, калі Бог прамовіў тыя словы, каб чалавек да сьмерці пакараў іншага чалавека?
Другі мужчына, званы Матэўсам, пагардліва адказаў: — Тое справа Бога – рабіць, што Яму падабаецца. Чалавек жа – нешта іншае. Трэба ачысьціць места Арас ад д'яблаўшчыны. Бо што ж апрача неба можа быць для нас найкаштоўнейшым, як ня нашае места?
Той, што меў сумневы, доўгі час маўчаў, а пасьля прамовіў: — Бачыцца мне, што ты маеш рацыю, Матэўсе. І ня ганьбі мяне за тое, што я сказаў. Я вельмі рады, што ты мяне павучаеш. Не скажу нічога болей.
На што той напышлівым голасам: — І не падумаеш?
— А ўжо ж, Матэўсе. Нават не падумаю. Разьбірае мяне ахвота наплявацьу жыдоўскі гарнушак.
І абодва жвава адышлі.
Ня ведаю, як так здарылася, што я пайшоў за імі. Яны працісквaліся праз натоўп на рынку, а пасьля скіраваліся да заходняе брамы, дзе месьціцца люд жыдоўскі. Яны не былі там адны. Навокал панаваў змрок, але народу сабралася багата. Людзі стаялі моўчкі сярод гасподаў. Дзьверы былі пазачыняныя

наглуха, паўсюль панавала цішыня – нібыта тыя, што хаваліся за імі, баяліся абудзіць няшчасьце. Тады чалавек, якому Матэўс выгаворваў, загукаў голасна: — Дзе старшы кагалу? Няхай выйдзе да жыхароў добрага места Арасу!
Адказам яму было маўчаньне. Тады йзноў загукалі – сьпярша ён, потым некалькі іншых. Гэта было лепей ад ранейшае цішыні. Нешта пачало адбывацца, людзі нібы прабудзіліся, адчулі, што маюць ногі, рукі, галовы, плечы... Некалькі іх рушыла ў вулку, асьвятляючы дарогу паходнямі. Тыя шквырчэлі непрыемна, раз за разам бухалі зь іх жарынкі і дагасалі ў калюжах. Раптам нейкі каўтун высахлага гарахавіньня заняўся полымем; агонь шугануў угару, асьвятліўшы ўсю вуліцу. «Д'ябал, д'ябал!» – галёкнуў нехта ў натоўпе. Галовы адразу ж адсунуліся ў трывозе, потым, нібы марская хваля скрышыла земляны вал, паплылі наперад. — Старшы кагалу! – крычалі паўсюль. – Дзе старшы кагалу?!
Жыдоўскія дамы маўчалі ў трывозе. Ніводнае шаргаценьне не пранікала вонкі. І вось зьнянацку, калі ўва ўзрушаным натоўпе на момант усталявалася цішыня, да нашых вушэй даляцеў тупат каня. У сьвятле агню, што шугануў высока, пабачылі мы вершніка ў цёмнай апанчы, на гнядым кані, які вылецеў з двара і памкнуў да заходняе брамы. Некалькі месьцічаў забегла яму дарогу. Яны схапілі каня за аброць, павісьлі на ягоным карку. Іншыя ж сьцягнулі вершніка на зямлю. Пацягнулі яго па саломе ўздоўж вуліцы, лупячы кулакамі.
— Ён хацеў зьбегчы зь места! – крычалі. – Гэта бягляк, які хацеў аддаць добрае места Арас на здобыч д'яблу!
Жыд маўчаў. Калі яго зацягнулі на рынкавы пляц, ён ужо не выяўляў азнакаў жыцьця. Але ягонае цела ўсё адно прывязалі да слупа – плячо да пляча з Іцхакам – і зноў запалала новае вогнішча. Калі полымя шугануло ўгару, людзі яшчэ крычалі: — Гэта хаўрусьнік шатана, які хацеў адчыніць брамы Арасу для ўсялякага граху!
Месьцічы гвалтам уварваліся ў жыдоўскія двары пры заходняй браме. Неапісальны лямант узьняўся аж да неба, на якім там і тут блішчэлі сонныя зоркі. Я адышоў да касьцёлу сьвятога Эгідыя. Там, у змрочным нэфе, нікога не было. Я ўкленчыў на камяні і пачаў горача маліцца.
У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амэн.
Панове! Разважце, што я вам зараз скажу. У Бруге я прыхадзень

зь іншага сьвету. Ваша места славіцца як узор усялякіх цнотаў, хоць – як вы самі тое кажаце – меней тут любові ды боязі Божай, чым тавараў на продаж. Вы належыце да асаблівага людзкога роду, які дні і ночы праводзіць у цёмных канторах або на рыплівых караблёх у багатым порце. Вы вандруеце па сьвеце – такім вялізным, якога людзі ў Бургундыі нават і ўявіць сабе ня могуць. На вашых сталох поўна асаблівага карэньня, кветак ды пладоў, якія, несумненна, абудзілі б боязь у сэрцах майго разьлеглага герцагства. Вы адпраўляецеся ў далёкія выправы і бачыце насельнікаў зямлі з жоўтым, карычневым, чорным ды блакітным колерам скуры. Вы нагледзеліся гэтак шмат цудаў ды жудасьцяў, што вера ў д'ябла не наведвае вашыя сэрцы. Мы з вамі належым да розных сусьветаў. Калі я прыбыў сюды і ўехаў у брамы места, так гасьцінна перада мной расчыненыя, першыя ж крокі я скіраваў да рэліквіяў сьвятое Ўршулі. І быў я – о дзіва! – адзіным чалавекам за шмат гадоў, які памаліўся пры гэтым сьвятым алтары. Бруге – гэта вельмі шаноўнае места, і я схіляю галаву перад вашаю мудрасьцю, прадпрымальнасьцю ды багацьцем, але паверце мне – мы ніколі не зразумеем адно аднаго да канца! Калі мяне гадавалі сакавітыя лугі Брабанту ды навукі Сьвятое Царквы – вы плавалі па далёкіх морах. Калі я пасьціўся ды адпраўляў пакуту – вы апісвалі свае прыгоды на выспах чарнакніжнікаў, у краіне віхураў альбо ўвогуле на ўскрайках зямлі Каліфа. Калі я верна служыў герцагам, вы мелі ў сабе досыць сілы і адвагі, каб абражаць манархаў. Я ўдзячны вам за прыстанак і поўнюся пакорай, што прыйдзецца мне цяперака жыць у гэтым, найцудоўнейшым пад сонцам, месьце. Але ўсё ж маю я пэўны скарб, што вам ня дадзены. Вось жа: чуў я голас Бога і голас шатана. Я сустракаўся зь небам і пеклам. Я перажыў на сабе, што азначае змаганьне за збаўленьне душы. Я выцерпеў столькі пакутаў, столькі ўзьлётаў ды падзеньняў, што вы проста ня ў стане зразумець, як усё гэта можа месьціцца ў маім сэрцы. Панове! Я ня маю намеру пазбаўляць вас уяваў, але насамрэч вольны ня той, хто такім зьяўляецца, а той, хто такім прагне быць. Бруге – вялікае й багатае места, але Бог захаваў яго ад падзеньня – таму яно ня можа асягнуць і ўзьлёту. Вы верыце ў свае мапы, караблі ды капітанаў. Гэта – добрая вера, але яна не вядзе да поўнага збаўленьня. Я чуў, што ў Бруге разьбіраюць целы памерлых, каб адкрыць, што ў чалавека ўсярэдзіне. Мы ў

Арасе рабілі тое ж, але зь іншымі мэтамі. Намі кіраваў голад, а не цікаўнасьць. І менавіта таму мы ведаем пра чалавека стакроць болей!
Паслухайце мяне ўважна. Бо й вам тое прыдасца – калі ня сёньня, дык заўтра; а як ня заўтра, дык наступнага дня... У тую ноч, калі выбухнулі ў Арасе хваляваньні вялікае разьні, я размаўляў з Богам і д'яблам. У нязыркім сьвятле паходняў ды алівавых лямпаў, самотны й асуджаны, я гутарыў зь імі абодвума.
Цягам усіх тых гадоў Альбэр паўтараў мне, што я мушу адорваць места Арас удзячнасьцю, бо яно ўзьнесла мяне на вяршыню посьпеху. Калі б не яно, быў бы я марным прыдворным Давіда або аблысеў бы на нейкім прыбытковым абацтве. Арас учыніў мяне адным з суправіцеляў над усімі людзьмі, жывёламі, расьлінамі, таварамі ды майном, што знаходзяцца ў ягоных мурох. А ўзамен патрабаваў так няшмат... Толькі каб я заставаўся верны праву ды пільнаваў прывілеі. Дальбог, нязначная гэта цана за такое пекнае жыцьцё.
Добрыя панове! Настаўце зараз вушы... Што для вас значыць места? Чым яно ёсьць у вашых снох? Калі некаму з вас сьніцца Бруге, дык явіцца яно ў рыпеньні карабельных лінаў, пахах водарасьцяў і рыбы. Па-над ягонымі дахамі кружляюць спрытныя кірлі, а ўсё навокал знаходзіцца ў руху ды гомане вечных пошукаў. Бруге нагадвае птушку, у той час як Арас – дрэва. Кожны з тамтэйшых людзей адчувае ў сярэдзіне ягоны корань – гэтак жа, як кожны з вас чуе ў сабе лёгкасьць ды свабоду вандроўнага птаха.
Тае начы ў касьцёле сьвятога Эгідыя мучыла мяне пытаньне – якое ж яно, маё места. Я прагнуў убачыць Арас ува ўсёй велікапышнасьці ягоных грахоў ды цнотаў. Да мяне даносіўся водгалас разьні, і я ўздрыгваў ад страху й пакоры. Вось гэта тваё места, казаў я сабе, але паверце, што гаварыў тое сам Бог. Ды неўзабаве адгукаўся д'ябал. «Няма іншага места, – казаў ён, – апроч места, імя якому Праўда». – «А што такое праўда?» – пытаўся я, напалоханы. І тады зноў чуў голас Божы: «Я казаў Абраму сысьці з Уру й пакінуць уласнае места, каб ён ня меў іншага прагненьня, апроч прагненья Бога. Я вырваў Абрамавы карані зь ягонай уласнай зямлі, каб ён ня меў іншае зямлі, апроч зямлі Божай». – «Што гэта значыць?» – думаў я, б'ючы чалом у халодныя камяні падлогі. І тады зноў пачуў шэпт

д’ябла: «Яне! Пасяліся ў месьце, якому імя Ян». Паходні спакваля згасалі, усю бажніцу напаўняў даўкі пах смалы. Я апынуўся ў цямрэчы, і толькі слабая алівавая лямпадка кідала ад алтара мільгучае сьвятло. Я баяўся, што зараз вось памру і мяне паглыне цемра яшчэ да таго, як я знайду адказ на гэтыя страшэнныя пытаньні. А што тады? Куды паляціць мая душа? Ці той гасьцінец, што вядзе на неба, пачынаецца за мурамі Арасу – а ці, можа, менавіта тутака, спасярод галёканьня маіх суграмадзянаў, у сьвятле распаленага вогнішча, у сумятні ды ржаньні спалоханых коней, у гарачкавым шапаценьні малітвы ды енках лупцоўнікаў ля брамы касьцёлу?
О, я ведаў, што месьцічы Арасу чыняць нядобра і аддаюцца дзікунству. Але ўсё ж я таксама браў удзел у іхнай роспачы і ачышчэньні. Ці ж мог я ставіць сваю праўду над воляю места? Я падумаў, як моцна мне баліць гэтая бясконцая ноч, – і менавіта тая думка прынесла мне супакаеньне. Паколькі я пакутаваў з прычыны заганаў Арасу – значыць, я адчуваў да яго прывязанасьць.
Не судзіце мяне надта сувора. Я чалавек дастаткова разумны, каб магчы адкінуць удзячнасьць. Я любіў Арас не таму, што ён мяне апрануў, напаіў ды накарміў, даючы ў мае рукі вялізны кавалак улады, але з тае прычыны, што быў ён такі несучасны. Калі ты зь местам на яве, дык мусіш разам зь ім пяражыць і сны. Гэта не Арас быў вінаваты, а Бог! «Ісусе Хрысьце! – крычаў я, і сьлёзы цяклі з маіх вачэй. – Уратуй гэтае места. Не пасылай на Арас вялікае трывогі вяршэньня правасудзьдзя, бо нічога ня страшна гэтак, як чыніць суд. Дазволь гэтаму месту, як раней, ткаць шпалеры, гадаваць статкі ды верыць у збаўленьне. Калі яны прыйдуць на тую вуліцу, на якой запалаюць вогнішчы, – у полымі згінуць усе, бо шуканьне апраўданьняў ёсьць жарсьцю, магутнейшай за пажаду кабеты. Хрысьце, захавай места Арас… Хіба што Ты хочаш зрабіць яго ахвяраю свае агіды да роду чалавечага. Але ж ці ў такім разе няма іншых народаў, местаў ды краёў, стакроць болей грахоўных?» Тады здалося мне, што Бог сказаў вельмі лагодна: «Дзе ж пэўнасьць, што Садом быў грахоўны? Жыў жа там праведны Лёт…» – «Не, – казаў я сабе – а можа, гэта д’ябал гаварыў у маім сэрцы, – я ня буду Лётам гэтага Садому. Я дастаткова моцны, каб вынесьці Арас, але я не нагэтулькі моцны, каб вынесьці Бога».
І менавіта тады ўвайшлі ў касьцёл людзі. Быў сярод іх

суконьнік Іванэ. — Вось пан Ян! – загукаў ён, убачыўшы мяне наўколенцах. – Як жа така́... Места хістаецца ў фундамэнтах, а ты хаваешся ў касьцёле? Добры пан Альбэр вяршыць суд над старшым кагалу. Трэба, каб і ты кінуў свой каменьчык...
Такім чынам, я пайшоў зь імі ў ратушу. Там не было графа дэ Сакса, ані пана дэ Ўель, ані пана Мюнье. Іншыя ж сядзелі ды вяршылі суд над старшым кагалу. Калі надышла мая чарга казаць, як я лічу, я тады моцным голасам адказаў, што ён вінаваты. І я не грашыў абсалютна. Цнота вернасьці ня можа абярнуцца супроць збаўленьня.
Але вернемся да справы. Я мушу казаць тут не пра сябе, а пра места Арас ды яго месьцічаў.
Ужо віднела, калі быў вынесены прысуд. Я выйшаў на рынкавы пляц і сустрэў арандара пана дэ Сакса, які чакаў мяне. Ён ціха сказаў: — Граф дэ Сакс просіць пана на размову. — Што здарылася? – спытаў я. — Гэтага я ня ведаю.
Мы пайшлі. Па вуліцах цягаліся людзі. То тут, то там нехта спаў пасьля страшнага высілку гэтае ночы – пад нейкім прыстрэшкам, у сенцах або на сходах касьцёлаў. Ад заходняе брамы патыхала паленым. Там згарэла некалькі дамоў. Ідучы, я наткнуўся на два трупы, бяз вопраткі і моцна пашкоджаныя. Арандар заплюшчыў вочы, на ягоным тлустым твары пабачыў я выраз агіды ды спалоху. Калі мы прыйшлі на месца, арандар адразу зьнік. Фар'я дэ Сакс чакаў у садзе. Высокі мур аддзяляў сядзібу. Панавала тут цішыня, а паветра таго дня здавалася лагодным ды насычаным водарам. — Едзь да біскупа Давіда, – сказаў Фар'я, калі мы праходжваліся па сьцяжыне паміж буйных хмызоў. – Нельга, каб усё гэта адбывалася, а ён ня ведаў. — Места не жадае, каб біскуп прыяжджаў, – адказаў я. Ён зірнуў на мяне з-пад ілба, вельмі засмучана. — Яне! – кажа зноў. – Зьбірайся ў Гент. Так ці йначай, мова йдзе пра вядзьмарства. Без духоўнага правадніка места ня мае права выносіць прысуд. — Сябра дэ Сакс, – кажу я лагодна. – Мы маем тутака свае правы ды прывілеі, якія нельга аддаваць на здабычу біскупавай ненасытнасьці. — Калі б гаварылася пра сады, быдла або збожжа, ты меў бы рацыю, Яне. Але справа датычыць душаў людзкіх. Ніхто не надаваў месту прывілею судзіць за вядзьмарства або герэзію...
Я прамаўчаў, а ён казаў далей: — Я выклікаў цябе, бо хто быў бы лепшым паслом у двары Давіда? Біскуп толькі цябе й

паслухае. І тое таксама ведаю, што ты скажаш яму адкрыта, што думаеш пра ўсе гэтыя ганебнасьці. Я ўжо немалады і разумею, якое цяжкое змаганьне ты вядзеш у сваім сэрцы. Ты багата чым абавязаны месту. Але задумайся толькі... Бог – наш айцец, а Сьвятая Царква – нашая маці. Маці павінна быць асабліва ласкавай да сваіх дзяцей, хоць у той жа час можа здавацца, што яна больш суворая нат за айца. Ці ж можна гэта дапусьціць? Мне данесьлі, што шмат людзей памерла сёньняшняй ноччу, а дамы жыдоўскія спалены. Што яны нам чужыя – гэта праўда. Што болей у іх ліха, чым у сэрцах хрысьціянскіх, – гэта праўда. Але ўсё ж не далучайся да прыхільнікаў гвалту. Вось што я табе кажу!
Тады я прамовіў: — Фар'я, калі тое адбываецца ў Арасе – значыць, павінна адбывацца. Бо гэта сам Бог кіруе нашымі ўчынкамі...
— Не, – выгукнуў ён з гневам і роспаччу. – Ён даў нам розум, волю і боязь. Запытай Бога, Яне, і Ён адкажа табе, што ты можаш застацца ў месьце і далучыцца, але можаш таксама паехаць да Давіда. І будзе гэта твой уласны выбар...
— Надзея ў Богу, – адказаў я ціха.
Фар'я дэ Сакс выняў кароткі нож і пачаў абсякаць ім галінкі альшыны. Ліпкі сок цёк у яго па руках, капаў на зямлю. Ён прагаварыў нібы сам сабе: — Ня ты, Яне, першы, і ня ты апошні... Так бывае пад сонцам. Я чуў пра жанчыну імем Маргарыта, якая жыла ў старадаўнія часы. Яна думала, што ейную душу ахінуў Бог. Яна не магла ўжо грашыць, бо сам Бог кіраваў ейнымі ўчынкамі. Здаецца, гэта была вельмі высакародная кабета, хоць і спалілі яе ў Парыжы за ганебную герэзію. Былі, натуральна, і іншыя. Яны казалі, што так унівечыліся ў Богу, што кожны іхны рух, крок або слова паходзяць з Божае волі. Калі яны пілі – Бог піў іхнымі вуснамі. Калі гвалцілі – Бог кіраваў свавольствам іхных чалёсаў. Калі забівалі – Бог узносіў для ўдару іхныя мячы. Ну скажы сам, ці можна знайсьці больш прыемнае ўнівечаньне? Чалавек дагаджае сабе ўва ўсім, але ўсё адно застаецца чысты, бы дзіця, бо ўсяго толькі служыць Богу прыладаю. Ты кажаш, што гэта з волі неба адбываюцца ў Арасе такія брыдоты. Значыцца, хай Бог перажывае аб праліцьці крыві і сам сабе гэтыя правіны адпусьціць... Як я табе зайздрошчу! Бо што да мяне, дык я пакутую ад кожнага крыку, які далятае з вуліцы. Ці ты

сапраўды думаеш, што ўсё адбываецца без твайго ўдзелу?
— Я знаходжуся ў руках Бога! – адказаў я сувора.
Ён зірнуў на мяне і далей сёк галінкі альшыны. — Але й Ён у тваіх руках, Яне, бо гэтак жа, як ты прагнеш ягонае ласкі, Ён прагне твайго збаўленьня...
— Ты гаворыш як гератык! – гукнуў я пагражальна.
Ён ізноў глянуў на мяне – крыху з увагай, а крыху з журботаю. Потым сказаў: — Ты бачыш Бога з воўчаю пашчай ды вострымі, бы нож, іклямі. Ён цябе спажырае ў сваёй ненаеднасьці, а ты зьяўляешся толькі мясам для ягоных згаладнелых сківіцаў. І ўвесь Арас гэткі. Ён аддаецца ганебнасьцям, а сам застаецца бязгрэшны, бо менавіта ў гэтым бачыць сваё ўнівечаньне. Мы нічога ня значым, кажаце вы адзін аднаму на вуліцах, бо мы ж зьяўляемся толькі мізэрнымі чарвякамі, цацкамі волі Божае. І такім чынам вы перакладаеце ўсе вашыя грахі на плечы Бога. Як гэта лёгка, Яне! Неўзабаве ўжо нічога ў сярэдзіне вас не застанецца, бо вы ўсё саступіце небу.
Тады я бяз слова сышоў. Калі ж азірнуўся – ён глядзеў мне ўсьлед, самотны ў тым садку.
Той дзень цягнуўся бясконца. Апоўдні скаралі старшага кагалу. Людзі зноў рушылі да заходняе брамы. Нейкая ненаеднасьць пякла тады нашыя сэрцы. У кожным месьцічу абудзілася прага служэньня Арасу. Ізноў шуганулі вогнішчам колькі жыдоўскіх сялібаў. Крыкі, модлы ды праклёны перамяшаліся ў паветры. А па-над усім разносілася бомканьне званоў.
Пад вечар сабралася Рада. Альбэр павітаў нас кіўком галавы. Увесь дзень я яго ня бачыў, і ў той момант ён мне здаўся дзіўна змораным, асавелым – нібыта цэлыя гады прамінулі з тае яснае раніцы. Толькі ў ягоных вачох заўважыў я бляск. Ён сказаў тады наступнае: — Няхай Рада выслухае ўважліва. Я зьбіраюся падзяліцца з вамі сваімі думкамі. Напэўна, таму, што сёньняшні дзень для Арасу асаблівы і ўжо ніколі болей не паўторыцца. Я ўжо стары чалавек. Прыехаў у Артуа з далёкага поўдня і ня столькі на патрэбу сэрца, колькі на загад кіраўніцтва. Калі я ўпершыню ўвайшоў у брамы Арасу, я быў яшчэ вельмі малады, а вы, што мяне слухаеце, увогуле былі дзятвою. І вось усё жыцьцё я правёў, навучаючы вас хрысьціянскім цнотам. Хацеў я толькі аднаго – каб места падабалася Богу. Хутка я памру і сыду з гэтага сьвету. Таму сёньняшняга ранку я разважаў, што мне ўдалося, а што – не

ўдалося. Ці Арас сёньня лепшы, чым тады, калі я прыйшоў? Што здабылі вы дзякуючы майму навучаньню ды пакорнаму прыкладу? Ну, здаецца, можна прызнаць, што я прышчапіў вам веру ў Бога й ягоных сьвятых. Пад маёй апекаю вы працерабілі вузкую сьцяжыну да неба. Яна пакручастая, камяністая ды стромкая. Па ёй нялёгка ісьці. Бывае так, што стане чалавек наўзбоч, гляне ўніз і ўгару, жахнецца, як недалёка ён зайшоў. І хоча павярнуць. Бо лягчэй жыць унізе, чым на гары. Там можна патураць кожнаму хаценьню. Тады як падчас узыходжаньня магчыма думаць толькі пра адно – каб ня ўпасьці ды не забіцца на самым нізе. Кажу вам, што ўвесь сьвет змовіўся супроць места, бо ён зайздросьціць нашым адносінам з Богам ды ўсім тым перажываньням, што былі нам дадзеныя. І менавіта таму, калі вазы, што ідуць з саржай у Ліль альбо Кале, вяртаюцца пустымі да брамаў Арасу, людзі нярэдка наракаюць. У шырокім сьвеце паказваецца ім жыцьцё, поўнае ўцех ды спакусаў, што лёгка заспакойваюцца. Тады як у Арасе іх ізноў чакае ўпартае змаганьне за збаўленьне. Таму некаторыя гавораць: «Навошта нам навукі добрага айца Альбэра, калі ў нас ёсьць толькі адно жыцьцё? Іншыя патураюць сабе колькі могуць, а ў гадзіну сьмерці шкадуюць за грахі ды заплюшчваюць вочы ў надзеі, што Бог ім прабачыць». Так кажуць некаторыя месьцічы. І не разумеюць, што гэта д'ябал прамаўляе іхнымі вуснамі. Мы ўчора адпраўлялі суд над жыдоўскім племенем. І што я бачу? Месьцічы прыйшлі да высновы, што выкруцяцца дзякуючы кагалу, што кагал сплаціць усе даўгі Арасу перад небам... Дальбог, немагчыма прыдумаць нічога болей дурнога ды сьмешнага. Бо дзе ж знаходзіцца тое ліха, якое точыць места? Пекар Мэгун мяркуе, што ў жыдох. І я не пярэчу гэтаму. Але скажы, Мэгуне, мілы мой браце, ці вырываючы жыдоўскае ліха, вырываем мы таксама й тыя ягоныя карані, што ўрасьлі ў хрысьціянскія душы? Ці ж можна захінацца жыдом перад абліччам Госпада? Ці ня будзе гэта спробаю ашуканства альбо гульнёю ў косьці з Ісусам Хрыстом? Некаторыя месьцічы спадзяюцца, што змогуць схавацца за жыдоўскія трупы і іх ужо не заўважыць вока Наканаваньня... Няшчасныя дурні! Палячы жыдоўскія дамы, яны цешаць сябе ўявай, што гэты агонь, як у чысцы, адбеліць іхныя душы. Імі кіруе страх, яны кожным коштам хочуць пазьбегнуць справядлівага суду. Тыя, што вінаватыя самі, найлюцей перасьледуюць люд з-пад заходняе

брамы. О, як жа яны прагнуць патапіць у жыдоўскай крыві свае ўласныя правіны! Але Бог не адпускае грахоў, пра якія гаворыш, – толькі тыя, якія паправіш. Ён не задавальняецца словам – жадае толькі ўчынкаў. Мы атачылі Арас мурам жыдоўскіх целаў і думаем, што знаходзімся ў бясьпецы. А на самай справе над намі навіс удар, пра які сьвет дагэтуль нават не падазраваў... Прыходзіў да нас Гервазі Дамаскін і казаў, што жыд Цэлюс кінуў праклён на дом ягоны і гаспадарку. Можа, так і было, а можа, і не... Бо дзе ж напісана, што Богу нельга пакараць чалавека, забіраючы ў яго каня? Гэта ня значыць, што я сьцьвярджаю, нібы Цэлюс быў невінаваты. Я толькі кажу, што з тым жа посьпехам магло абысьціся і без праклёну. Бо Богу не патрэбная жыдоўская дапамога, калі Ён хоча вяршыць суд. Калі на нас прыйшла зараза, Арас ня быў добрым местам. Адбываліся тутака страшныя рэчы. Прагучала на Радзе, што ў Генце, Брэдзе, а мо нават у Парыжы людзі грашаць больш цяжка й ганебна, і тым ня менш, зараза напаткала менавіта нас. Аднак ці мае Рада права судзіць чужыя грахі? А можа, Богу захацелася зьнішчыць Брабант і ўсе іншыя краі, каб захаваць толькі адну вёсачку, як Ён гэта ўжо раз зрабіў з каўчэгам Ноя? Давайце лічыць нашыя грахі ды шукаць уласныя меркі. Узгадайце толькі! Ці ж мала было ў Арасе злоўжываньняў, юру ды дурноты? Ці ж не казалі ў месьце, што пекар Мэгун падмешвае ў муку пілавіньне, а суконьнік Іванэ як ліхадзей абыходзіцца з удавою Пляке, якая служыць у яго пры гаспадарцы? А ці ж найлепшыя сярод нас, як хоць бы граф дэ Сакс, не трымалі пры сабе даступных ангельскіх кабетаў ды не аддаваліся распусьце? Нават найулюбёнейшы мой вучань патураў самым брыдкім жарсьцям на вачох усяго места! Дык няхай жа Рада задумаецца над маімі словамі. Але кажу вам: лёгка раскайвацца за грахі на жыдоўскіх карках, аднак гэта зусім ня мусіць падабацца Богу.

Калі Альбэр скончыў, у залі зрабілася вельмі ціха. Ужо апусьціўся вечар, за вокнамі гарэлі дамы пры заходняй браме; зрэшты, нічога болей... Пекар Мэгун падняўся з лавы, ягоная постаць кідала вялізны цень на сьцяну. — Добры ойча, – кажа пекар, – зграшыў я цяжка, бо праўда тое, што я сыпаў пілавіньне ў муку. Я куплю сто імшаў у касьцёле Найсьвяцейшае Тройцы і дам сячы плечы ў кожны дзень посту. — Добры хрысьціянін сам сабе пакутаў не вызначае, – адказаў

Альбэр.
Мэгун упаў на калені й голасна заплакаў. — Ня плач, – кажа вялебны айцец вельмі лагодным голасам, – бо не надышла твая часіна. Уставай, Мэгуне, і будзем далей раду трымаць...
Тады ён падняўся і сеў на сваё месца.
Цяжка паверыць, наколькі тае ночы мы былі спустошаныя ў думках. Мне здаецца, што кожны чалавек носіць на сабе нейкі цяжар і не адчувае яго залішне. Але надыходзіць хвіліна, калі сьцябло саломінкі, кінутае на ягоныя плечы, згінае яго да самай зямлі, дыханьне робіцца неглыбокім і хуткім, пот залівае вочы, а ўсе пачуцьці зьмяняюцца ў жывёльнае прагненьне адпачынку. Толькі б скінуць цяжар, толькі б вызваліцца ад ярма! Мы ўжо ня памятаем тады, што гняце нас сьцябло саломінкі, і здаецца нам, што гэта ўся зямля і нават усё неба ўскладзены нам на плечы. Кожны тады пачынае аглядацца трывожна, куды б гэты цяжар скінуць, а калі ўгледзіць суседа – прыціскае яго з чыстым сэрцам!
Калі Мэгун сеў, астатнія спаглядалі на яго зьдзекліва ды варожа. Кожны хацеў заплакаць, але Мэгун зрабіў гэта першы, дзякуючы чаму іншыя атрымалі шчопаць спакою. Ён апярэдзіў іх у пакоры, але яны не былі яму ўдзячныя, дакладней, былі ўдзячныя і ненавідзелі разам. Мяне трасца ўзяла, бо я прыгадаў словы Альбэра пра тую ангельскую дзяўчыну, што была шмат гадоў таму, калі я павінен быў працаваць над камэнтаром да твору майстра Герсона. Я сьлізгануў паглядам па тварах прысутных, але ўсе крывілі вусны ў пакорлівай малітве. Іхныя шапаценьні, што трашчалі як полымя, калі яно агорне сухое дрэва, разносіліся па залі. Бог у тую хвіліну, несумненна, меў шмат працы, выслухоўваючы так багата грахоў адначасова. Але ж яны маліліся... Я ніколі ня бачыў людзей у гэткім экстазе. Нібы цэлы кляштар картузіянаў загнязьдзіўся ў ратушы... Я ведаў іх! Лепей, чым сваіх кабыл ды жарабцоў. О, яны зусім не былі дрэннымі людзьмі! Прынамсі, не былі горшымі ад іншых у Бургундыі. Адзінае толькі, што яны так раптоўна, без усялякае падрыхтоўкі, заблыталіся паміж небам ды пеклам. Хто з нас у жыцьці не чыніў зла? Людзі наагул ведаюць, калі грашаць. Але ім рэдка прыходзіць да галавы, што яны могуць зазнаць тыя выпрабаваньні, пра якія гаворыць Сьвятое Пісьмо. Усё тое адбывалася вельмі даўно, а можа, нават не адбывалася ўвогуле. Але гэта ня мае вялікага значэньня. Ці Бог абвяшчаў пра сябе

тым або іншым чынам – ня ёсьць справаю найважнейшай. Вера зьяўляецца часьцінкаю натуры людзкай, а ня боскай. Бог не павінен верыць у сябе, гэта мы абавязаныя ў яго верыць! А таму й тыя людзі верылі аддана, што, аднак, зусім не азначае, што яны кожнага дня заставаліся найвярнейшымі авечкамі Госпада. Яны рабілі так, як гэта звычайна бывае ў жыцьці. Ведалі, што давядзецца плаціць за кожны ўчынак, але ж яны нат не маглі падазраваць, што здарыцца тое менавіта гэнае ночы, у раднай залі, пры сьвятле дагасалых пажараў. Царква вучыць нас, што мы ня знаем ані дня, ні гадзіны – але менавіта таму, што яе ня знаем, мы і можам захоўваць супакой ды каліва годнасьці. А калі тая хвіліна раптоўна прыходзіць, мы чуемся бездапаможнымі і ашуканымі. Гэтак было й тады. У цішыні ратушы я чуў толькі шэпт малітоўных лямантаў. Бо д'ябал, калі ён і быў тады сярод нас, сядзеў бяз шоргату. Хто ведае, чыю ён накінуў апанчу?

Я нахіліўся да Альбэра і сказаў: — Ойча, мне трэба выйсьці з раднае залі!

Ён кіўнуў галавой. Тады я падняўся й пайшоў напіцца вады са студні ў дворыку. Там было халаднавата й вельмі цёмна. Я піў прагна, ледзь не акунаючы твар у цэбрык. Раптам нешта ткнула мяне ў плячо. Я паволі азірнуўся. Паўсюль было пуста. Я йзноў пачаў піць, бо мне ажно паліла вантробы. Пэўна, са страху перад Альбэрам, Радаю, усім местам Арасам. І зноў я адчуў лёгкі дотык на плячы. Я ўпусьціў цэбрык, і ён паляцеў долу на пругкім канапляным шнуры, і ў глыбіні студні плюхнула вада. Аглядаюся вакол – і нічога ня бачу. Толькі далікатныя абрысы ратушных муроў. Раптам – шэпт! Нехта мовіць мне ў вуха, але словы нязнаныя, як бы ў чужой мове, зь якою ніколі раней не сутыкаўся... — Хто тут?! – пытаюся спалохана.

Ізноў голас балбоча дзівосныя словы, якіх я б нават паўтарыць ня здолеў. Словы бяз вуснаў, мова без чалавека, дотык без далоні, частка бяз цэлага. Нешта лупанула мяне ў грудзі – як кулаком. Я кінуўся наўцёкі, увесь абліваючыся потам. А тады адчуў на сядальне ўдар абутае нагі. Тое д'ябал гнаў мяне высьпяткамі ажно да парогу раднае залі... Я ўлятаю ўсярэдзіну, усе пагляды на мяне зьвернутыя – відаць, твар у мяне быў бледны, як у мерцьвяка, а позірк зусім непрытомны. — Д'ябал у ратушы! – загукаў я страшным голасам і апошнім высілкам з трэскам зачыніў дзьверы залі. Усе пападалі наўколенцы,

валасы паўставалі дыбарам у іх на галовах. Нават Альбэр, здавалася, быў неспакойны. Ён падышоў да дзьвярэй і жагнаў іх знакам крыжа. Я чуў, як ён мармытаў сам сабе: «Д'ябал у ратушы… Д'ябал у ратушы. Хто ведае?!»
У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амэн. Панове! Нават цяперака на згадку, як я піў ваду ў дворыку, адчуваю я дрыжы ў касьцях. Над Бруге зьзяе раньневясновае сонца; я бачу за акном шырокі прасьцяг вады, а на вадзе – карабель з разгорнутымі ветразямі. Вашыя твары – спакойныя й шляхетныя, на сьнеданьне мы мелі выдатны індычны паштэт ды сьцягно цяляці. Навокал усё, здаецца, засынае ў сытасьці ды бясьпецы. Але, тым ня менш я зноўку чую ў гэтую хвіліну смагу і прашу даць мне сьвежае вады, каб выпаласкаць з горла даўнія страхі… Панове! Калі мяне хто спытае, ці бачыў я д'ябла, адкажу: «Не». Але калі хто спытае, ці я яго чуў ды ці адчуваў ягоны дотык, скажу: «Так», – бо яшчэ цяперака баліць мне сядальна.
О, гэта зусім ня значыць, быццам я кажу, нібы ўсё, што адбывалася ў Арасе мінулае восені, было спраўлена сіламі нячыстымі. Але д'ябал круціўся там безупынна – даймаў, разьдзьмуваў дагасалае на вогнішчах полымя, каламуціў нашыя думкі ды штурхаў нас да згубы. І безь яго мы апусьціліся б на дно, але, можа, ня так хутка.
Вяртаюся да справы. Тае ночы Рада патрабавала, каб Альбэр узяў пад арышт Фар'ю дэ Сакса. Ён доўга адмаўляўся. «Гэта найшляхетней уроджаны пан ува ўсім Арасе!» – паўтараў ён упарта. Але Рада не хацела адступіцца. Суконьнік Іванэ пераконваў, што граф дэ Сакс чыніў ліха й лютасьці ў год заразы. Відаць, быў у змове з жыдамі, калі так шчодра іх карміў, тым часам як іншыя ня мелі што ў рот укласьці. На тое Альбэр: «Пакіньце ў спакоі жыдоў! Яны сплацілі ўсё, што павінны былі сплаціць. Калі б нашае ліха й няшчасьці бралі пачатак толькі з жыдоўскага насеньня, места Арас было б стакроць болей шчасьлівым. Але ж не! Дык жа шукайце грахоў ува ўласных сэрцах. Жыдоўскія ж пакіньце ў супакоі!»
Няцяжка было давесьці, што дэ Сакс належаў да закаранелых грэшнікаў. Хто ж, як ня ён, на працягу гадоў кпіў з павучаньня вялебнага айца? Выявілася, што ён прывёз з Вормсу мэдыка і ўначы, пры сьвятле лучыны, яны рэзалі зьвярыныя трупы. Фар'я дэ Сакс лавіў яшчарак у ярох, што цягнуцца да Лілю, зьдзіраў зь іх скуру і вывучаў вантробы. Лавіў таксама птушак, а яшчэ

казалі – і не бяз рацыі, – што калісьці, як дзяліў мяса здохлага каня, дык сабе пакінуў сэрца. Але ня зьеў яго, а вывучаў, узважваў, рэзаў ды разглядаў. Усе ведалі, што Фар'я дэ Сакс нудзіўся неміласэрна ў Арасе і загадваў адпраўляць сьвятую імшу ў сваіх пакоях уначы, бо ўдзень паляваў з сокаламі. Спавядаўся ён надзвычай ляніва, і бывала, што й драмаў пры тым, а сьвяты айцец мусіў яго штуршкамі схіляць да жалю за грахі. А калі ён прымаў Хрыста, скалынаўся ўсім целам ды пазяхаў працягла... Без усялякага сумневу было сьцьверджана, што ён трымаў у сябе прадажных кабетаў і кожнае ночы жадаў іншай, як арабскі каліф. Найважнейшым жа было тое, што ён не шанаваў Рады, паводзіў сябе на Радзе як вялікі пан і за нішто меў павучаньні вялебнага айца. Гэтаму наймацней ён даў прыклад у апошні раз, калі простыя людзі пачалі засядаць у Радзе, а ён імі пагардзеў і не захацеў зь імі радзіцца. Я мяркую, шляхетныя панове, граф дэ Сакс, несумненна, меў рацыю, але ня варта было так яўна паказваць гэта ўсёй грамадзе. Дык урэшце Альбэр саступіў. Ён кіўнуў галавою і сказаў ціха: — Паколькі такая воля Рады, я пакорліва далучаюся. Правядзем суд над графам дэ Саксам, што, магчыма, прынясе нам міласьць неба. Бо яшчэ раз кажу вам, улюбёныя мае суграмадзяне: хто так багата пражыў, ужо ня можа заставацца чыстым. Адпушчэньне грахоў даравана толькі недасьведчаным ды няведным. Час голаду й заразы збрудзіў нашыя душы. Напэўна, было б варта спаліць места Арас у полымі пакутаў, каб яно йзноў стала сабою. Кожны крок аддаляў нас ад належнай дарогі. І чым далей, тым больш мы загразалі ў балоце. Нам патрэбна сёньня дзіцячая вера, каб зноўку выйсьці на шлях цноты. Перад тым як пошасьць прыйшла ў места, тут было болей стараньня аб пекных тканінах ды саржы, канёх ды садох, дукатах ды бондах віна, ніж аб збаўленьні. Зараза раскрыла нам вочы на тое, што на самай справе важна для чалавека. Але калі яна мінула – грэх ізноў пасяліўся ў мурох Арасу. Ізноў гандлююць палотнамі ды льном, коньмі ды каровамі, а ў бок Кале пацягнуліся вазы, поўныя тавараў. Места пачала разьядаць прага аздобнага начыньня ды вытанчаных страваў, шпаркіх скакуноў ды дойных кароваў. Людзі больш ні пра што не размаўлялі, як толькі пра сокалаў або пра чаравікі ды капелюшы. І толькі жменька самых сьмелых адважвалася гукаць пра патрэбу Бога. Людзі так нізка

палі ў сваёй празе ўзбагачэньня, што нават самыя годныя чынілі ганебнасьці. Быў бо ў Арасе й такі, што ўвайшоў у змову з разбойнікамі. На ягоны загад яны, затаіўшыся сярод пагоркаў пры дарозе ў Ліль, рабавалі нашыя тавары. Былі гэта тыя самыя людзі, што падчас пошасьці прыходзілі пад муры, каб раскрадаць харчы. — Вялебны ойча! – закрычаў Мэгун. – Хто быў той чалавек, што наймаў разбойнікаў?!
— Гэтага я не скажу, – адказаў Альбэр.
Тады Рада пачала голасна сварыцца, што ёй адмаўляюць у даверы, і зноўку людзі пападалі наўколенцы, а іхныя гучныя малітвы біліся аб столь. Тады ўрэшце Альбэр ціха і як бы з намаганьнем сказаў, што быў гэта граф дэ Сакс. — Пекла! – галёкнуў Іванэ, а іншыя яму падтаквалі. — Так, – адказаў Альбэр. – Пекла ёсьць ува ўсіх нас...
Тады я падумаў, але нікому не сказаў, што сапраўды пекла знаходзіцца ў нас саміх, ды, аднак, стакроць горшае тое, якое мы ствараем вонкі.
Панове! Вядома вам, што графа дэ Сакса спалілі мінулае восені на вогнішчы ў Арасе. Але невядома вам, як моцна блюзьнерыў ён перад сьмерцю і што з гэтага вынікла для нашага места. Калі графа пасадзілі ў сутарэньне ратушы, зьявіўся перад Радаю ягоны арандар, на імя Дзюранс, якога я раней ужо згадваў, і паведаміў, што хоча бараніць свайго гаспадара. «Бо ён не рабіў таго, у чым яго абвінавачваюць!» Гэты Дзюранс заўсёды быў чалавекам незвычайным. Бывала, што ён паводзіў сябе як апошні нягоднік. Яшчэ перад выбухам заразы Дзюранс адбыў далёкае падарожжа па справах ажно ў даліну Роны. А вярнуўшыся, распавядаў, як дзёр шкуру з тамтэйшых людзей. Быў там да тае ступені жорсткі, што сам герцаг Філіп мусіў слухаць у Брусэлі скаргі на ягоныя чыны. Тады ён выкруціўся, бо знаходзіўся пад апекай графа дэ Сакса, які цешыўся прыхільнасьцю герцага. Іншым разам жа праславіўся, ахвяраваўшы сто дукатаў на кляштар картузіянаў. Увогуле, быў ён чалавекам шчодрым – нават болей, чым магло б здавацца. Распавядалі, што ён зафундаваў падарункі ангельскім мнішкам у Бэдфардзе і сам адвёз іх за мора на нанятым чаўне. Апекаваўся ўдовамі ды сіротамі. А то зноў жа пускаў з торбаю даўжніка. Ён меў рэдкі дар красамоўства і гэткую ж ладную паставу. Як чалавек вельмі заможны, ён, пэўна, пераўзыходзіў багацьцем самога Фар'ю дэ Сакса, але тым ня менш служыў

яму надалей і ня раз бывала, што ўласнаручна сыпаў зерне ягоным коням, хаця ўласным не рабіў гэтага ніколі – бо меў канюшага і колькіх стайнікаў. Часам жыў як узорны хрысьціянін, пасьціўся ды маліўся, каб пасьля, іншым разам, зноў аддавацца гульбе, пра якую потым гаварыла ўсё места. Трымаў у сябе папа і дзьвюх выляжанак. Казалі, што аднаго разу ўзяў папа да сябе на ноч, а ранкам спавядаўся тым жанкам. Ніхто ня ведаў, што ў гэтага чалавека на самай справе сядзіць усярэдзіне. Некаторыя яго крыху пабойваліся.
Калі ён прыйшоў у Раду, выглядаў ён нібы вычасаны з каменю. Прамаўляў зь велізарнай пыхай. Ён ведаў, што, паколькі бароніць графа дэ Сакса, да пэўнага часу яму ўсё дазволена, – таму карыстаў з жыцьця без утрыму. — Дык чаго вы хочаце ад шляхетнага пана дэ Сакса?! З чыіх гэта рук вы бралі жарло для сябе ды сваіх байструкоў падчас голаду й заразы? Вы ж самі тады гарлалі, што няма больш справядлівага ды шляхетнага пана ўва ўсім Арасе. Альбэру! Паслухай мяне. Калі сапраўды нас сёньня выпрабоўвае лёс гэтымі беднымі жыдамі ды панам дэ Саксам – а нешта мне здаецца, што на ім гэтае дурноцьце ня скончыцца, – дык віну трэба хутчэй у табе шукаць. Памятаеш крык кабеты, якой ты адмовіў у суцяшэньні на эшафоце?! Калі забыўся, Бог табе прыпомніць... Людзі! Каго вы слухаеце? Зірніце на гэтага старэчу на чале стала. Вы гаворыце пра яго «айцец вялебны», а я вам кажу, што гэта сьмярдзючы плюгавец, якому набрыдла жыцьцё, а разам зь ім – і ўвесь людзкі род. Чаго ён хоча? Калі мы цешымся сонцам і дажджом, квеценьню і лістотай, ён думае пра смалу й д'ябальскія вілы. Яшчэ да пошасьці места нямала ад яго выпакутавала. Тут магло не ставаць зерня, але ніколі не бракавала кадзідла. Магло не ставаць канопляў, але ніколі не бракавала сутанаў. Усялякі чалавечы голас заміраў у гэтым месьце. Адны малітвы ляцелі да неба. Забагата тут было веры, а замала розуму. Ці Бог гэтага хоча? Мы ягоныя дзеці – дык як Ён можа жадаць нашага прыніжэньня й нэндзы? Няхай гэны сівы маркач ідзе прэч з добрага места Арас. Аддайце кіраўніцтва ў рукі асьвечаных людзей, якія здолеюць лучыць пабожнасьць са здаровым розумам. Інакш стары такое пекла вам зладзіць, што каменя на камені ад Арасу не застанецца!
Альбэр слухаў і маўчаў. Калі Дзюранс скончыў, айцец прамовіў толькі: — Месьцічы. Рассудзіце самі, што належыць рабіць!

Рада загадала арандару ісьці прэч. І ўжо было зразумела, што ён наступны паўстане перад судом.
Ад пана дэ Сакса прасталюдзьдзе ў Радзе патрабавала, каб шкадаваў за грахі. Але ён адмовіў. Ці мог ён зрабіць іначай? Я пайшоў да яго ўвечары і сказаў, што, калі ён прызнае свае правіны ды выкажа скруху, Рада гатова асудзіць яго толькі на выгнаньне зь места. У іншым жа разе зноў запалае вогнішча. Дэ Сакс пасьміхнуўся змрочна. — Паслухай, Яне, – адказаў ён тады. – Я ведаю, чаго жадае сёньня места. Яно жадае змаганьня. Людзям мроіцца, што калі яны разадзьмуць змаганьне, дык знойдуць у ім ачышчэньне. Яны нясуць гвалт іншым, каб вызваліцца ад кашмару, які прыціснуў Арас. Нават калі іхныя памкненьні высакародныя, дык і тады яны аблытаныя д'ябальскай сеткай. Калі я ім сёньня скажу, што зграшыў, змаўляючыся з разбойнікамі ды блюзьнерачы супроць Госпада, дык зраблюся хаўрусьнікам усяго гэтага вар'яцтва. Лепей загінуць, чым прыкласьці да гэтага руку. Я зусім ня ймкнуся быць пакутнікам, але ведаю, што ня можа чалавеку надарыцца анічога горшага пад сонцам за прызнаньне ў няўчыненых грахах. Бо гэта іншым перакрыжоўвае сьцежку да цноты. Хто любіць Бога і чалавека, той не паддасца гэткім д'ябальскім пажаданьням. — Калі ня выкажаш пакоры – заўтра загінеш, – сказаў я глуха.
Ён паглядзеў на мяне ўважліва. Пэўна, бачыў толькі абрысы майго твару, бо ў лёху было цёмна. — Ведаю, – кажа дэ Сакс. – Але я ўжо немалады. Кожны калі-небудзь памрэ... Бог мне прабачыць, бо бачыць маё сэрца... Яно чыстае, Яне...
— Сябра дэ Сакс, – кажу я яму тады палка. – Ты ведаеш, наколькі ты мне блізкі. Альбэр мне як айцец, а ты заўсёды быў мне братам. Павер мне. Твая сьмерць не пераменіць гэтага места. Ты загінеш бессэнсоўна!
— Так можа стацца, – адказаў ён ціха. – Але калі застануся пры жыцьці, тады шмат што зьменіцца. Людзі прыйдуць да пераканаьня, што мелі рацыю, і ўяўленьне пра грэх будзе скрыўленае, як нацягнутая цеціва лука. Але ж чалавечы розум – гэта не цеціва, і яго нельга так нацягваць. Калі ён перарвецца – Арас патоне ў вар'яцтве. Гэта добрае места, Яне, і яно заслугоўвае лепшае долі. Я не хачу быць ка́там гэтага места. Хай ужо лепей яно будзе маім ка́там.
Так ён казаў увесь час. Гэта было зусім неразумна. Выходзячы з

каморы, я думаў, што граф ашуквае сябе. Як высока ён цаніў годнасьць! Да тае ступені, што я знаходзіў у ім грэх пыхі.
Была ўжо ноч, калі я йшоў дадому. Места заснула, пажары згасьлі, навокал панавала ціша. Лагодны пошум ветру ў каронах дрэў ды чыстае неба над маёй галавою – хіба першага разу ў тую восень. Я йшоў жвавым крокам. Вось мае ногі, думаў я, вось мае ступакі, калені, галёнкі, сьцёгны. Яны рухаюцца мерна, бо я так хачу, хоць адмыслова я ім і не загадваю. Яны самі ведаюць, што рабіць. Якое ж цудоўна незразумелае ёсьць жыцьцё, а перадусім – жывое чалавечае цела. Здраднікам будзе той, хто ўласнае цела выдасьць на здабычу полымю. Вось мой жывот, думаў я, вось мае плечы, галава, вочы, вусны, валасы. Кожная мая валасінка адчувае подых ветру. Калі ідзе дождж, мае валасы робяцца мокрымі і зь любасьцю паддаюцца пяшчоце пальцаў. Дый пальцы знаходзяць радасьць, кранаючы гэтую шорсткую вільгаць. Кожная мая часьцінка жыве асобна, і, тым ня менш, усе разам яны зьяўляюцца адной асобай. Гэта сапраўдны цуд стварэньня! Калі я бягу – я адчуваю іншасьць кожнае часткі цела. Сьпярша пачынае пячы ступакі, але сам я – вясёлы й бадзёры. Потым, калі бягу далей, лагодныя дрыжыкі ахопліваюць лыткі, паволі прасоўваюцца да каленяў, якія паглынаюць гэтае дрыжаньне. І вось ужо ўсе мае ногі робяцца важкімі, лянотнымі, як цяжарная кабета. У той жа час жывот, плечы і сьпіна ўсё яшчэ схільныя ўдзельнічаць у бегу. Але яшчэ хвіліна – і дыханьне ў грудзях робіцца плыткім, у горле перасыхае, галава трашчыць ад болю. І тады ногі адмаўляюцца мяне слухаць. Я надарма загадваю, каб яны рухаліся хутчэй. Яны ўжо настолькі існуюць асобна, што іх нібы адсекла сякерай. Аднак дастаткова толькі хвіліны адпачынку, глытку сьвежае вады, каб яны зноў зрасьліся з рэштаю цела і вырушылі ў далейшую дарогу, такія паслухмяныя, пэўныя ды надзейныя... Мае добрыя ногі, думаў я, мае ўлюбёныя плечы, далоні ды вантробы. Ці ж наважыўся б я выдаць вас на згубу ды зьнішчэньне?! Я ваш гаспадар і слуга, сябра й каханак, дабрачынца й тыран. Трымайцеся мяне, і разам мы вынесем усе выпрабаваньні лёсу. І нішто нагэтулькі ня можа быць важным, як тое выжыцьцё.
Я ішоў дадому і думаў, што зранку ўзыдзе сонца, а ўсё неба раскошна заружавее. Потым ружовасьць зьнікне, каб даць Арасу выкупацца ў залатых прамянёх. Можа наляцець вецер,

сварысты і непрыемны, і ён разварушыць лісьце, адхвастае полымя на вогнішчы Фар'і дэ Сакса, скрадзе які капялюш або вяхотку саломы. У поўдзень я буду піць малако, як і штодня. Прыслужнік паднясе мне кубак цёплага малака, толькі што выцаджанага з каровінай цыцкі, а я, усеўшыся ўтульна, буду яго піць. Пасьля пайду на Раду, а ўвечары загадаю падаць сабе сьцягенца баранчыка, піва, сыр, садавіну й зноўку цёплае малако з позьняга надою. Калі ж скончыцца дзень, я пакладу свае ногі, плечы, сьпіну, жывот і галаву ў пасьцель ды паклічу якую з кабет майго дому, каб яна мяне задаволіла.

Ці ж можа быць нешта нагэтулькі ж высакароднае, як выжыцьцё? Ці Бог стварыў нас толькі дзеля таго, каб мы зьнішчалі самі сябе ў імя самых разнастайных мрояў? У наш час вельмі многія разважаюць на тэму вольнасьці. У часох жа нашых продкаў разважалі паўсюль пра рыцарскі гонар. Мой стрыечны дзед у маладосьці ўбачыў партрэт аднае дамы й прысягнуў служыць ёй. Ён вандраваў на працягу трох дзясяткаў гадоў, вёў жыцьцё пастуха, спаў пад голым небам, сілкаваўся адным гарохам ды рэдзькай. Дзе б толькі ён ні зьяўляўся, распавядаў неймаверныя гісторыі пра гэтую пані ды біўся на турнірах. У яго былі пераламаныя і балелі ўсе косткі, але ён застаўся верны прысязе. Даведаўшыся ўрэшце, дзе шукаць сваёй каханай, ён сеў на карабель і паплыў у Бэнэвэнт. Там яго прывітала высахлая старая, сьмярдзючая, як купа гною, і вельмі ўсхваляваная гэткімі праявамі рыцарскасьці. Мой стрыечны дзед памёр на ейных руках, сказаўшы перад сконам, што ён вельмі рады, бо не змарнаваў жыцьця і ўбачыў нарэшце даму свайго сэрца. Калі зь яго зьнялі дасьпехі, на целе ў яго было, мусіць, трыццаць ранаў, якія ён атрымаў у баёх за тую пані. Гэты аповед вельмі мяне расчульваў у маладым веку, але калі я вырас, дык паразумнеў. У той час, як мой дзед вандраваў па сьвеце, гэная шлюха з Бэнэвэнту пасьпела займець трох мужоў ды дванаццаць сыноў. Што ж, вельмі цудоўна! А найгоршае ж тое, што ніхто не змушаў таго рыцара ганяцца за гэтай спарахнелай баляваньніцай.

Аднак жа тое адбывалася даўней, а сёньня мы толькі зьедліва пасьміхаемся пры ўспаміне пра падобныя блазнаваньні. Ды, тым ня менш, ці не гадуем мы ў сэрцах іншых блазнаваньняў? Вольнасьць! Я заўсёды быў за вольнасьць. Пра гэта я ўжо згадваў. Але калі нехта ў сёньняшнім нашым сьвеце гаворыць

пра пашану да чалавека, пра свабоду сумленьня, пошукаў і думак, я крычу так голасна, як толькі магу, пра вольнасьць маіх сьцёгнаў, плячэй, кален, валасоў, языка, жывата, ноздраў, пальцаў, вуснаў, вушэй, ступакоў, лакцей, вантробаў, зубоў, касьцей, анальнага праходу... О, далібог, панове, яно ўсё зьяўляецца маім так страшліва й балюча, як нішто іншае маім быць ня можа! Сам Творца даверыў мне гэтае цела, каб я бараніў яго правы на існаваньне.
Я ведаю, што граф дэ Сакс здрадзіў свайму целу, а значыць – асобе, дадзенай яму Богам. Госпадзе, усьвяці ягоную душу, але ўсё ж зграшыў ён цяжка...
Горш за ўсё, што, калі яго вялі на пакараньне, ён крычаў люду, які сабраўся на вуліцах, што ён невінаваты і памірае, каб абудзіць добрае места Арас. «Няхай вам усім Бог адпусьціць гэты грэх, як я адпускаю!» – гукаў ён, што кожны разумны чалавек успрымаў як яўнае блюзьнерства. Бо такія словы былі годныя Госпада Ісуса, але ніяк ня графа дэ Сакса, які быў закаранелым грэшнікам. Таму людзі бралі камяні і кідалі ў яго; падымалі грудкі высахлага бруду і кідалі, а таксама – конскае лайно ды казіныя кулькі. А ён насуперак усяму захоўваў сур'ёзнасьць і прывабную годнасьць. Калі яго прывязвалі, ён сказаў гучна кату, каб усе чулі: «Майстар, спраўся добра. Дарую табе дукат за гэтую работу...» Той пакланіўся нізка й пацалаваў графаў чаравік, хоць той быў увесь запэцканы лайном. І справіўся з працаю добра. Я б нават сказаў – занадта добра, бо з тае прычыны нядоўга радаваўся дукату.
Прывязаўшы графа да слупа, ён падпаліў вогнішча, а калі полымя шуганула, надзычай спрытным рухам увагнаў нож у ягонае сэрца, ажно па самыя тронкі. Граф дэ Сакс енкнуў і адразу ж аддаў духа, так што агонь жор ужо адно нячулае цела. Але ўбачылі гэта людзі, што стаялі паблізу; яны данесьлі Радзе, і праз пэўны час кат места Арасу, калі споўнілася ягоная гадзіна, паклаў галаву пад сякеру. Напраўду, памёр ён радасны, бо за той дукат ягоная жонка набыла ладны дамок ля брамы Трынітэ і была, такім чынам, добра забясьпечаная.
У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амэн. Тады, на пляцы, я перажываў вельмі нялёгкія хвіліны. З аграмаднаю цяжкасьцю стрымліваў я ўсхліп, што рваўся з маіх грудзей. Вось, адышоў з гэтага сьвету вялікі і шляхетны пан, адзін з маіх высакародных сяброў і апекуноў. Я апошні размаўляў зь ім сам-насам. Пасьля

маіх адведзінаў у лёху яго адразу ж павялі на Раду, дзе ён не захацеў выказаць скрухі ды заклікаў апамятацца. Такім чынам, я магу лічыць сябе перадсьмяротным павернікам Фар'і дэ Сакса. Я горача маліўся, каб Бог прыняў на неба гэтую заблукалую душу. Але менавіта тады, падчас малітвы, сярод белага дня, на пляцы, дзе шугалі ўгару языкі полымя на вогнішчы, наведалі мяне сумневы. Я быў ужо гэтак блізка, каб пагадзіцца з усім, што дзеялася навокал, але тут раптам працяла мяне страшная думка. Я ўбачыў твар Хрыста Ўкрыжаванага – бледны і скрыўлены пакутаю. І адразу ж потым – твар Понцкага Пілата, які выракся Госпада. Ужо аднойчы раней я меў падобную відзежу. Мы тады палявалі з Шастэлем у лясох непадалёк Генту.

Гэта было яшчэ ў часы маёй маладосьці, калі ангельцы панавалі над усім, без малога, узьбярэжжам. Памятаю, Шастэль упаў з каня й так пабіўся, што ўжо ніхто ня верыў, што ён выжыве. Мы спыніліся ў селяніна, што жыў на ўскрайку лесу. Паклалі Шастэля на гарахавіньне. Ён гукаў, каб далі піць, дык прыслужнік пабег да студні. Тады я кажу старому сяброку: — Шастэль мой наймілейшы. Трэба табе спаведніка. Я загадаю селяніну паклікаць айца ад якабінаў. — Не рабі гэтага, – кажа Шастэль і пасьміхаецца празь сілу. – Я не хачу споведзі... Відаць, па маім паглядзе ён убачыў, што я лічу яго вар'ятам, таму гаворыць далей: — Я ня думаў, што мне выпадзе паміраць у тваёй прысутнасьці, здалёк ад сталых векам сяброў. Але лёс не выбіраюць. Дык вось, не хачу я тутака аніякіх папоў. Ты знаеш мяне, хлопча ўлюбёны, і ведаеш, што заўсёды я з завядзёнак хрысьціянскіх насьмейваўся, божыя запаведзі ні ў што ня ставіў... Не таму, што я такі благі. Што не – то не! Але я ня веру ў Бога. Я ніколі не хадзіў у царкву, ніколі ня біў чалом перад алтарамі, ніколі не вызнаваў грахоў. Я ня веру ўва ўсё гэта...

Я зьмярцьвеў ад жаху. Праўду кажучы, па двары генцкім хадзіла пагалоска пра бязбожніцтва Шастэля, і нават не адзін вяльможны пан яго ў гэтым пераймаў. Сам герцаг Філіп казаў, што Шастэль вельмі велікадушны ды шляхетны, а таму Бог шмат губляе ад таго, што такі чалавек ня хоча ў Яго верыць... Ну, але ж усё тое было на гэтым беразе, а цяперака Шастэля хутка несла да берагу процілеглага, дзе ўжо няма месца на позы ды выкрунтасы. Таму я лічыў, што няма чаго марудзіць і

трэба клікаць спаведніка. Аднак ён не адпускаў маёй рукі. — Паслухай, што я табе скажу, хлопча! – шаптаў ён зь цяжкасьцю. – Не было ў маім сэрцы малаверства, але толькі ўпэўненасьць, што я ў прах абярнуся, што правалюся ў цямрэчу бязь межаў, дзе няма сэнсу шукаць якога-колечы быцьця. Таму нават цяпер, калі ў маёй галаве б'ецца нязвыклая думка – а раптам усё ж там нешта ёсьць? – тым болей я жадаю вытрываць у вернасьці. Калі Бога няма, дык навошта мне айцец ад якабінаў? А калі ўсё ж ёсьць – дык што ён тады пра мяне падумае? Што я са страху ў апошнюю хвіліну ўпаў перад ім на калені? Калі Ён ёсьць – Ён мудры й вялікі. А калі Ён мудры й вялікі – дык пагарджае дурнямі й маладушнымі. І менавіта таму я ня выйду Яму насустрач!

Вярнуўся слуга з вадою. Я не паслаў селяніна ў кляштар. Шастэль усю ноч праляжаў у душным пакоі. Нават не стагнаў. Я сядзеў ля парогу, прыслухоўваючыся да ягонага дыханьня. Ноч была вельмі халодная, і ўсе мае чалёсы трымцелі, а нейкі жахлівы перапуд сьціскаў маё сэрца. І менавіта тады ўпершыню я ўбачыў гэтую дзіўную тройцу. Госпада нашага Ісуса Хрыста, Пілата і Пятра... Другі раз яны явіліся мне мінулае восені, калі паміраў Фар'я дэ Сакс. Што б гэта магло значыць – я, далібог, ня ведаю. Але ведаю тое, што гэта відзежа сее ўва мне вялікі непакой, а што найгорай – адбірае яснасьць думкі. Я нібы ператвараюся ў начыньне, зь якога выцякае каштоўная вадкасьць. Ня раз прыходзіла мне да галавы пытаньне, адкуль бяруцца ў чалавеку сьмеласьць ды развага. Можна, відаць, прыняць найпрасьцейшае разьвязаньне, а менавіта – што адных Бог адорвае адвагаю чынаў і думкі, а іншых – не. Але каго адорвае? Кажуць, што высоканароджаных, але я ў тое ня веру, бо бачыў у жыцьці столькі надзеленых санам заечых сэрцаў, што проста вымушаны сумнявацца. Возьмем хаця б таго ж Дзюранса, арандара пана дэ Сакса, і паставім поруч з кавалерам дзю Лёш. Пра гэтага я яшчэ не казаў. Бо і ўвогуле ня варта! Прыведзены на Раду, ён учыніў сапраўдны спэктакль. Мэгун пералічаў ягоныя правіны, а ён галёкаў гучна:

— А як жа, дастойная Рада, а як жа! Зграшыў я найгнюсьней у сьвеце!

А калі яму перасталі называць благія ўчынкі, ён сам дадаў шмат іншых, і так сябе ў лайне выкачаў, што нават прасталюдзьдзе адварочвала галовы. Урэшце Альбэр пытае:

— Ці гэта ўсё, дзю Лёш?
А ён, адразу падтакнуўшы, задумваецца паслужліва, нібы нешта сабе ўсільна прыпамінае, а праз момант выкрыквае:
— Дастойная Рада! У дзяцінстве я меў зносіны з казой...
Тады нават Альбэр выбухнуў сьмехам. Я думаў, што гэты дзю Лёш кпіць з нас, але ён так каяўся з патрэбы сэрца. Пралічыўся, бедачына! Ён спадзяваўся, што, віляючы хвастом, выстараецца сабе адных бізуноў. Ды Рада, насьмяяўшыся ўволю, загадала сьцяць яму галаву. Пачуўшы тое, ён заліўся сьлязьмі ды валяўся на зямлі, хапаючы за ногі пекара Мэгуна, які быў ягоным абвінаваўцам. Тады адбылася рэч страшлівая, бо пекар сказаў: — Пане дзю Лёш! Не забывайся пра сваё паходжаньне. Ня годна тое, калі рыцар абдымае лыткі пекара.
Калі гэтага чалавека абезгаловілі, ніхто ў Арасе ня ўспомніў нат імя дзю Лёша. А Дзюранс, хоць і нізкага паходжаньня, меў, аднак, адвагу ісьці на сьмерць з высока ўзьнятаю галавою. Ён праклінаў Альбэра, пляваў яму пад ногі і нават у тую хвіліну, калі полымя лізала ягонае цела, крычаў вялебнаму айцу: — Падыдзі, стары плюгавец, каб я мог набзьдзець табе ў твар! Дык у чым жа тут справа, калі гаварыць пра сьмеласьць і развагу? Калі няма ў тым Бога, значыць, абавязкова павінна быць нешта людзкае. Шастэль казаў мне: «Будзь гаспадаром свайго лёсу!» О, я ведаю, што толькі пра тое і гамонка. Але магу сказаць цяперака, што я не насыціўся. Часам я быў гаспадаром, часам – не. Некалі мяне мучыла патрэба крычаць без увагі на тое, што можа здарыцца, і тым ня менш я маўчаў. А іншым разам біла зь мяне нейкая зьнішчальная сіла, і я быў гатовы даць галаву пад сякеру, толькі б уратаваць нешта, імя чаго я ня ведаю. Панове! Ці ж сэнс ня ў тым, каб падабацца самому сабе? Больш нават, чым Богу?
Я бачу з вашых твараў, што вы трохі занудзіліся маім аповедам. Гэта тым болей зразумела, калі ўзяць пад увагу, як мая мова розьніцца ад мовы месьцічаў Бруге. Калі разьдзіраецца маё сэрца, вам гэта здаецца толькі малачэньнем саломы. Дык вяртаймася да нашых брабанцкіх бараноў.
Не прамінула й двух дзён ад сьмерці графа дэ Сакса, як увесь Арас напоўніўся дзікунствам ды забойствамі. Працэсы аб вядзьмарстве, герэзіі ды найганебнейшыя збачэньні агарнулі места. Ніхто ня быў пэўны ані дня, ані гадзіны. Гервазі Дамаскін, у якога паў конь ад Цэлюсавага праклёну, быў

выцягнуты з дому даўжнікамі і зацеляпаўся на шнуры. Ягоныя стайні пайшлі дымам.
Альбэр сказаў на Радзе, што толькі простыя людзі ўзыдуць на неба, і гэта адразу абярнулася супраць усіх шляхетнароджаных. Ня думайце, што з гэтага пачаліся плябейскія хваляваньні! Нічога падобнага ў Арасе здарыцца не магло. Бо занадта лянівыя глузды ў тамтэйшых месьцічаў. Папросту людзям здавалася, што той, хто стаіць вышэй, болей заблытаўся ў д'ябальскіх спакусах. Ніхто ў тыя дні ў Арасе не гаварыў пра роўнасьць. Затое многія захацелі піць з панскіх кубкаў і апранацца ў панскую адзежу. Найпрыстойнейшыя людзі, як, прыкладам, здаўна мне знаны калесьнік імем Кульгавы Тамаш, узяліся за разбой. Гэты калесьнік уварваўся з грамадою чэлядзі ў пакоі пана дэ Ўеля, прывязаў яго пад стольлю на бэльцы і дапытваў як судзьдзя. — У чым ты блюзьнерыў?
— Я не блюзьнерыў, – кажа пан дэ Ўель. — Калі я кажу, што блюзьнерыў, значыцца, так і было. — Я не блюзьнерыў, – упарціцца пан. — Цяперака ўсё адно гладка табе ня сыдзе, – гаворыць Тамаш. – Пан Альбэр перадаў чыненьне справядлівасьці простым людзям места Арасу. Мы найгарачэй кахаем Бога і не даруем грахоў. — Які ж зь цябе просты чалавек, калесьніку? – адказаў дэ Ўель, які быў вельмі сьмелы. – Ты зарабляеш ліхвярствам ды катуеш чаляднікаў. Ці мала яны прыходзілі да мяне са сьлязьмі?
Тамаш ударыў яго ў твар ды загалёкаў: — Не твая справа, грэшнік. І зь імі я яшчэ разьлічуся. Цяперака рыхтуйся да сьмерці, але найперш скажы, дзе ты трымаеш свае дукаты?
Але пан дэ Ўель не сказаў. Калі яго забілі, шукалі па ўсім доме. Аказалася, што быў ён бедны і апроч паходжаньня ды гонару небагата меў. Дык яны пусьцілі дымам ягоную сялібу.
Іншага ж дня надышла чарга жанок. Спалілі тады сем кабетаў, вінавацячы іх у чараваньні. Дзьве шляхцянкі, а тыя астатнія – з простага люду.
У дзень сьвятога Амброзія пекар Мэгун, які цяпер вёў рэй сярод грамады, сказаў, што я цягам многіх гадоў зносіўся з дваром у Генце ды замахваўся на прывілеі места Арасу. Ён першы закрычаў: — Пан Ян ня любіць нашага места нагэтулькі, наколькі варта!
Потым казалі іншыя. Колькі ж у іх было зацятасьці... І чаго толькі я пра сябе не даведаўся!

Панове! Чалавеку здаецца, што ён жыве ў чатырох сьценах свайго дому, па-за сьветам, добра схаваны ад вуха й вока бліжняга. Але гэта ня так! Кожны з нас носіць у сэрцы самыя розныя крыўды, якім не дазваляе разьнявольвацца ў галаве. Калі, аднак жа, надыдзе часіна, тады яны ўсе складуцца – каменьчык да каменьчыка, каліўца да каліўца, – і паўстане страшэзны вобраз. Я нат часьцінкі свайго жыцьця не памятаю, але яны памяталі ўсё цалкам. Дальбог, я ня маю ўяўленьня, чаму яны так прагнулі мае галавы! Што я ім зрабіў? Я быў у гэтым месьце нібы тварог, які мясіла рука Альбэра на ягоны вобраз ды падабенства. Я верна служыў, пэўны ўзнагароды. А яны крычалі, што мяне трэба паслаць на вогнішча! — Які ж гэта разумны ў нас пан Ян! – галёкалі яны. – Занадта разумны, каб і надалей жыць у нашым месьце. Мы прагнем чыстае ды відочнае веры, прагнем адданасьці нябёсам і не жадаем тут мець розных мудрагелаў, якія нас абражаюць вычварнасьцю мовы і думкі. Нашыя далоні зацьвярдзелі ад цяжкое працы. Мы давяраем толькі нашым далоням ды навучаньню Сьвятое Царквы. Тады як пан Ян марнуе дні й гады на дыспутах ды ўзвышае розум, які ёсьць алтаром шатана.

Я ўжо быў гатовы да сьмерці, калі голас узяў Альбэр: — Не скажу, каб усё, што рабіў пан Ян, заслугоўвала воплескаў. Зграшыў ён цяжка перад местам, бо, нягледзячы на многія гады навучаньня, усё яшчэ складаецца з адных ваганьняў ды сумненьняў. Калі я вам кажу, што гарачыя сэрцы хрысьціянаў могуць горы зьвярнуць, ён адразу ж улазіць са сваім поглядам, паводле якога сэрца ня мае рук ды ног, каб магчы зьвярнуць што-колечы. Калі я гукаю да вас, што праз прагненьне можна асягнуць усяго, ён ня тоіць сумневу, даводзячы, што й развага паходзіць ад Бога. Тут гаварылася, што розум – гэта прылада д'ябла. Няпраўда тое. Але затое праўда, што д'ябал можа пасяліцца толькі ў розуме, ды ніколі – у сэрцы чалавека. Я ня ў стане адказаць на пытаньне, ці пан Ян вінаваты! Ягоная герэзія грунтуецца, галоўным чынам, на тым, што яму бракуе веры – нягледзячы на добрыя стараньні. Ён пастаянна паддаецца нейкім дзівачым падшэптам. Іх крыніцаю можа быць д'ябал; але таксама можа быць і слабасьць. Нашым жа клопатам хутчэй павінна быць збаўленьне, чым асуджэньне гэтае душы. Я думаю, што трэба пана Яна вывесьці з Рады, каб даць яму час на мэдытацыю і малітву. А пасьля паглядзім...

Выходзячы з раднага пакою, я гучна й выразна прагаласіў, што зьяўляюся і заўсёды застануся верны месту Арас. Пекар Мэгун зьедліва засьмяяўся. Тады я бачыў яго апошні раз. Назаўтра нейкі чалавек, у якога Мэгун спакусіў дачку, пазбавіў яго жыцьця.

Гэтак вось я апынуўся ў сваім доме, здалёк ад мескіх справаў. Наступныя дні правёў я ў поўнай самоце, прыслухоўваючыся да шуму страшных парахункаў. Я на самай справе аддаўся мэдытацыям. Становішча, у якім я апынуўся, было жахлівае. Напачатку магло б здавацца, што Арас выракся маёй асобы, аднак гэта толькі здавалася. Па сутнасьці, я сам выкінуў места з свайго сэрца. О, мяне не абразілі прысуды Рады. Я ніколі не надаваў увагі таму, што думае прасталюдзьдзе. Альбэр жа ўжо здаваўся мне як бы апантаным. Напраўду, я не падазраваў яго ў вар'яцтве і хутчэй інтуітыўна адчуваў нейкую думку, якую ён не хацеў адкрыць іншым. Таму я зусім не адчуваў сябе абражаным гэтым выключэньнем з Рады. Я нават знаходзіў у гэтым пэўную выгаду. У апошнія дні мне даводзілася ўдзельнічаць у справах, пра патрэбу якіх я ня меў упэўненасьці. Калі Арас жадае апусьціцца на дно, думаў я, няхай робіць гэта без майго ўдзелу. Тым лепей, што я сяджу дома, хаця й ізаляваны, але ж ужо напэўна без уплыву на бег падзей. Таму не прысуд Рады быў мне агідны, а сама Рада. Прызнаюся, я адчуваў горыч ад думкі, што толькі пасьля такога доўгага часу я разгледзеў яе сапраўднае аблічча. Гэта блага сьведчыла пра здароўе майго розуму.

Недалёкія галовы схільныя, напэўна, меркаваць, што ў мяне расплюшчыліся вочы толькі перад абліччам небясьпекі, якая мне пагражала. Пакуль я быў наверсе – дык дазваляў сабе несьціся па плыні разам з усім местам. А калі раптам мяне накрыла хваляй – зазнаў прасьвятленьне... Дык жа ж такое меркаваньне няслушнае, мае панове! Рэч не была гэткаю адназначнаю. Хаця і такое ўспрыманьне не пазбаўленае зерня рацыі. Аднак у жыцьці чалавечым амаль заўсёды так і бывае, і ня варта сварыцца тады на вецер, што дзьме ў бок порту. Вы лепей пра гэта ведаеце, бо блізка зьвязаныя з морам.

Ці ж разважлівы чалавек не перажывае свае адасобленасьці як найвялікшае пакуты? Таварыства Бога – хоць нават Ён і найлепшы за ўсіх – прыносіць нам болей пакуты, чым радасьці. Бо, па сутнасьці, мы й надалей застаемся самотнымі.

Пустэльніцтва! Як я заўсёды гэтым пагарджаў... Трэба дазваньня пазбыцца людзкага, каб весьці жыцьцё ўдалечыні ад усяго сьвету, сярод непраходных лясоў альбо на вяршынях недаступных гор. Гамонка не пра тое, што чалавек сілкуецца карэньчыкамі ды крынічнай вадою. Але дзе мерка ягоных учынкаў? Некалі распавядалі пра пэўнага пустэльніка з Артуа, які там жыў шмат вякоў таму і навучаў Эвангельлю дзікіх зьвяроў. Я думаю, што ён быў вар'ят. Сьпярша яму магло здавацца, што ваўкі, лісы ды куніцы слухаюць яго ўважліва і нават намагаюцца кіравацца навукамі Сьвятога Пісьма. Але пасьля натура воўчая мусіла ўзяць верх, і вось ужо зьвяры кажуць яму дабрадушна: «Перапыні, высакародны ойча, сваю казань, бо мы чуем голад і мусім пайсьці ў лес, каб зарэзаць аленя...» Потым, я думаю, сам пустэльнік пачаў хадзіць зь імі ў нетры лясоў. Сьпярша проста глядзеў, потым – еў, а ўрэшце – і паляваў. Ня маючы ані моцных іклаў, ані вострых кіпцюроў, ён забіваў найжахлівей з усяе гэтай дзікай грамады. І толькі тады ён змог стаць правадыром статку.

Быў у мяне, мае панове, старэйшы брат, які зачыніўся ў картузіянаў тры дзясяткі год таму. На працягу доўгага часу ён ня бачыў іншага чалавека і кантактаваў толькі са сваёй верай. Так і звар'яцеў дазваньня. Кажу вам, мусяць быць нейкія меркі для нашых учынкаў і думак, а таксама і для нашай любові да Бога. Нават калі б Бог увогуле не існаваў, а быў бы толькі нашым прагненьнем Яго – і тое мусіла б яна вымярацца паміж адным і другім чалавечым сэрцам.

Мне неаднойчы здавалася, што я вынурыўся са змрочных лясоў, дзе існаваў так, як імхі, лісьце або як вавёркі. Тады я яшчэ ня ведаў, што існую. Але калі я дазнаў ведаў пра самога сябе, раптоўна пачаў шукаць пункт аднясеньня. І пытаўся: дзе ён?

Калі з Бруге адплывае ў далёкае падарожжа карабель, людзі, якія сабраліся на палубе, ведаюць толькі тое, што яны адны ў сьвеце, сярод сшалелых стыхіяў акіяну. Яны спаглядаюць на свайго капітана, і кожны матрос давярае яму болей, чым самому Богу. Дастаткова аднаго няўважнага руху, каб чалавек апынуўся за бортам, у адзіноце ды небясьпецы. Усе пра гэта ведаюць і таму трымаюцца разам. Разам хапаюцца за вёслы, і разам згортваюць ветразі. Калі адзін зьняверыцца, яму дастаткова зірнуць на моцныя плечы таварышаў, каб ізноў

адчуць сябе больш бадзёра. А калі яны плывуць сярод меляў ды падводных скалаў, дык не спускаюць вачэй з свайго капітана. О, я чуў, як цяжка людзям на вашых караблёх. Найагіднейшыя чарвякі, скупы харч, жудасная праца ды бізуны наглядчыкаў. Хто ўзбунтуецца, таго павесяць на рэі. Людзі клянуць свой лёс і, бывае, ненавідзяць карабель. Але пры думцы, што ён можа напароцца на скалы, разьбіцца й пайсьці на дно, іх прабірае страх. Сустракаюцца такія, што перажылі падобныя выпадкі. Яны ўратаваліся на нейкім чоўніку, па некалькі тыдняў застаючыся забаўкай мора. Самотныя, паміж небам і вадой, яны са слодыччу ўспаміналі свой карабель, таварышаў, капітана і нават лютых наглядчыкаў. На палубе яны, нягледзячы ні на што, усё ж былі людзьмі, тады як пазьней зрабіліся адно цацкай шалёнае стыхіі...
Быць асобаю азначае ня быць нікім іншым. І гэта ўсё. Але ня быць нікім іншым магчыма толькі сярод іншых. Вось навошта я засядаў у Радзе і заставаўся ў Арасе.
Ну, гэта праўда – хоць, можа, толькі частковая. Бо калі мяне ўстаронілі, я зразумеў, што і я не безь віны. Яне, казаў я сабе, чаму ж ты не бараніў Фар'ю дэ Сакса? Бо ён не заслугоўваў абароны, адказваў адразу я. Ён ня ўмеў цаніць свайго жыцьця, а таму добра здарылася, што ён загінуў! Але зараз жа пачынала мяне турбаваць новая думка. Калі тыя выказваліся за сьмяротнае пакараньне Фар'і дэ Сакса, дык трэ было гэтаму супрацівіцца, каб застацца кімсьці іншым. Прагненьне аднадумства, адказваў я тады, здаецца, ёсьць мацнейшае за прагненьне праўды. Бо ня з праўды мы чэрпаем пачуцьцё нашае бясьпекі, але з супольнасьці. Арас – вось тое, што нас лучыць на дабро і зло. І нічога апроч Арасу мы ня маем. А вера? – пытаўся я трывожна. І адказваў адразу ж: вера – гэта зерне, тады як Арас – глеба. Бяз гэтага места зьдзеклівы вецер разьвее нашую веру па чужых палетках і мы застанемся жабракамі ля зачыненых дзьвярэй бажніцы.
Мае панове! Калі цяпер я распавядаю вам пра свае думкі зь мінулае восені, я ўнутрана астылы і спакойны. Але тады перажываў я роспачныя ўзьлёты і падзеньні, матляўся па доме, як матыль у сьвятле паходні, і ня мог зазнаць ані хвіліны спачынку. У мяне зьніклі ўсе свавольныя думкі, я ўжо нават не хацеў жанчыны, хоць і мог яе мець, бо былі ў маім доме служэбныя кабеты, гатовыя на першы знак. На працягу колькіх

дзён ды начэй я шукаў нейкага выйсьця, а места ў той час крывавіла, нібы адкрытая рана. Да мяне прыбягалі даверaныя і распавядалі страшныя рэчы. Было зусім ня так, як некалькі гадоў таму падчас пошасьці. Тады Арас змагаўся за жыцьцё. Цяпер жа гамонка была толькі пра зьвядзеньне нізкіх парахункаў. На кожнай вуліцы кружлялі даносчыкі, падслухоўваючы, што гавораць іншыя. Потым беглі ў Раду. І ў самой Радзе дзеяліся благія рэчы, бо ўсе глядзелі адзін на аднаго ваўкамі. Калесьнік Тамаш, які абрабаваў дом пана дэ Ўеля, абвінаваціў Раду ў тайных перамовах з Давідам. Спачатку яго высьмеялі, але ён быў досыць спрытны і злучыў вакол сябе грамадку найгоршых у месьце гультаёў. Таму Альбэр прыняў яго ў Раду, каб ён меў голас у кіраўніцтве. Гэты калесьнік меў багата глуздоў у галаве. «Не, – кажа, – нельга так, каб кожны самастойна вяршыў справядлівасьць. Для гэтага ёсьць Рада зь вялебным айцом Альбэрам на чале. До разбояў на вуліцах, до рэзаць горлы! Хто мае парахункі зь іншым, хай прыходзіць да Рады...» Да яго прыслухаліся зь вялікаю радасьцю, бо прыстойныя людзі пасьля зьмярканьня баяліся высунуць нос на вуліцу. Усе думалі, што Кульгавы Тамаш навядзе парадак. Ну й даў ён ім той парадак! Прыходзіць да яго сябрук і кажа:
— Тамашу, шляхетны сябра! Я ня ў злагадзе з панам Аструцам, які мне пазычыў дукат, а я не хачу яго вяртаць. Зрабі што-небудзь у гэтай справе.
Тамаш шкрабе патыліцу і кажа: — Падай абвінавачаньне на пана Аструца. — А ў чым я павінен яго абвінаваціць? – пытае сябрук. — Там будзе відаць, – адказвае Тамаш. – Прыходзь да мяне ўвечары, і я табе скажу.
Было выраблена абвінавачаньне супроць пана Аструца, што ён абразіў Найсьвяцейшую Тройцу. Аструц быў заікам, і, калі ён адмаўляў пацеры, яму хапала мовы на Айца і Сына, але ён заўсёды спатыкаўся на Сьвятым Духу і мусіў пераводзіць дых. Ён быў да тае ступені заікасты, што нават калі пад ім запалілі вогнішча і ён маліўся, дык таксама ня мог Сьвятога Духа гладка вымавіць.
Аднойчы апоўдні прыйшоў да мяне Пётра дэ Муае, сябра выпрабаваны, які ўсё яшчэ засядаў у Радзе. — Яне, – кажа, калі мы засталіся адны, – супроць цябе пададзена абвінавачаньне, і ты будзеш арыштаваны.
— Ня можа быць! – закрычаў я, ахоплены трывогаю. – А што на

тое Альбэр?
— Альбэр пад націскам Рады згадзіўся, – кажа дэ Муае. — Хто галасаваў супраць? – пытаюся сябрука. — Не было галасоў супраціўных, – адказаў ён і крыху пасмутнеў. Але зараз жа дадаў: – Тым хутчэй я паведаміў табе пра рашэньне Рады.
Калі ён выходзіў з майго дому, дык уважліва разгледзеўся па бакох. Быў гэта вельмі шляхетны чалавек, хоць і слабы духам... Калі я застаўся сам, да мяне адразу ж вярнуўся супакой. Значыць, яны былі аднадумныя, не заўважаючы зла, якое наносілі. Яны аддалі свае сумленьні статку, як бараны, як вылюдкі праклятыя. І ніхто зь іх нават не падумаў, што няма ў сьвеце больш тыранічнае тыраніі, чым аднадумнасьць, і няма цямнейшае цемры, чым аднадумнасьць, і няма дурнейшае дурноты, чым аднадумнасьць! Яны хваліся ў яе – надзяваючы сабе пятлю на шыю. О, я моцна пакутаваў з прычыны сваёй самоты, але адначасна быў горды, што не бяру ўва ўсім гэтым удзелу. Менавіта тады я прыняў рашэньне. Я паклікаў даверанага чалавека ды кажу яму: — Асядлай найлепшага скакуна і адвядзі яго да брамы Сьвятога Эгідыя. Я прыйду туды апоўначы...
— Пане, – кажа слуга, – варта пільнуе ўсе выхады. — Я ведаю пра тое. Пайду ўзброены. Мне няма чаго губляць. Калі спатрэбіцца, праб'юся праз варту і ўцяку да герцага Давіда...
— Места будзе бласлаўляць цябе! – выгукнуў ён. – Каб толькі герцаг сюды прыехаў, адразу б гэтае д'яблаваньне скончылася.
— Я гэтак жа думаю, – кажу. – Я ня буду сядзець спакойна, калі коцяцца галовы нявінных месьцічаў...
Слуга выйшаў, але адразу ж вярнуўся. — Пане, – гаворыць, – я баюся за тваё жыцьцё. Калі трэба, я пайду з табою. Я ўмею валодаць зброяй. — Я падумаю над гэтым, – адказаў я і адаслаў слугу, каб ён не заўважыў, што мае вочы поўныя сьлёз.
Які ж я тады быў рады, што мяне любяць. І няма розьніцы, што менавіта гэты чалавек данёс Радзе аб маім намеры, пра што я даведаўся пазьней...
У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амэн. Я баяўся страшэнна. Бо лепей ад іншых ведаў, што чакае сьмельчака, схопленага вартай. Арас у гэтым сэнсе вельмі жорсткі, бо высока цэніць прывязанасьць месьцічаў. Катаваньні будуць доўжыцца найменей ад усходу й да захаду сонца. Я сам быў сярод аўтараў гэтага закону, абвешчанага месьцічам у год, калі

ўгасла зараза. Пэўным суцяшэньнем для мяне была думка, што стаіць глыбокая восень. Сярод лета катаваньні былі больш суровыя і трывалі даўжэй. Але я й так зразумеў, што рызыка вялікая. Мне не хацелася нават думаць пра тое, што будзе са мной, калі мяне схопяць...

Я выйшаў з дому перад поўначчу. Час быў найзручнейшы. Цёмная ноч, і неба зацягнута хмарамі, ані сьледу месяца ці зор. Места спала, і толькі здалёк даносіўся водгук харальнае малітвы ў касьцёле Сьвятое Тройцы. Я накінуў каптур і захінуўся ў плашч. Узяў з сабой нож са зручнай асадкай, вельмі вузкі й востры, які з аднаго ўдару можа паразіць сэрца. Ішоў я павольна, каб не прыцягваць увагі. Слуга чакаў непадалёк ад брамы сьвятога Эгідыя. Гэта мяне вельмі ўзбадзёрыла, бо я разьлічваў на дапамогу. Я ня бачыў у цемры ягонага твару, але быў рады, што ён са мною. — Ці ты ўзяў зброю? – пытаюся паціху. — Узяў, – адказвае ён такім слабым голасам, што я ажно жахнуўся. Я глянуў у бок брамы і бачу, што яна шырока расчынена, а варта гуляе ў косьці... Такога раней ніколі не здаралася. Заўсёды са змрокам места Арас шчыльна зачынялася, каб з усходам сонца зноў адчыніць брамы перад усім сьветам. Таму я лічыў, што мне давядзецца спускацца па муры, і дзеля гэтага меў прытарнаваныя да сядла моцныя канапляныя шнуры. Равы павысыхалі ўжо даўно, бо не было дажджу, і таму за мурамі цягнулася брыдкая багна, якую, аднак, нескладана было перайсьці, хай і папэцкаўшы ногі да кален. Я прыдумаў, што калі апынуся з другога боку, дык адчыню таемную фортку, якую высеклі падчас заразы, і слуга правядзе празь яе каня. Фортка тая была зачынена звонку, бо біскуп загадаў прасячы яе на патрэбы вартаўнікоў, якія жылі тады зь іншага боку муроў вакол усяго места...

Так я задумваў свае ўцёкі, калі раптам высьветлілася, што брама шырока расчыненая. Тады слуга мне кажа шэптам: — Пане, прабач маю маладушнасьць, але ахапіў мяне перапуд і я не пайду з табою. — Як такá – кажу яму. – Ты ж сам напрасіўся мне ў дапамогу...

— Я ведаю, – адказаў слуга, – але ў мяне стукацяць зубы ад аднае думкі, што будзе, калі нас схопяць. Зьдзяруць скуру, па чарзе паадсякаюць усе чалёсы, вырвуць язык, выпаляць вочы, а потым паступова...

— Змоўкні, дурны чурбак! – перабіў я нягодніка, бо валасы ў

мяне на галаве сталі дыбарам.
Дык ён змоўк. Я глядзеў у бок брамы. Там ішоў мніх ад цыстэрцыянаў, абапіраючыся на кульбу. На яго нат ніхто й не зірнуў... Быў гэта чужы чалавек, бо ў нас цыстэрцыяны не жылі ніколі. Я падумаў, што калі ён разумны, дык павінен паведаміць герцагу, што адбываецца ў месьце. Я кажу слугу: — Завядзі скакуна ў стайню, а сам кладзіся спаць.
І нават не азірнуўся – нібы яго й няма.
У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амэн. Я ўжо казаў, што места Арас выкінула са мною д'ябальскі жарт. Як жа я мог адысьці пры адчыненых брамах? Іншая справа – адольваючы цяжкасьці альбо ўвогуле ведучы змаганьне з вартаю не на жыцьцё, а на сьмерць. Але гэтака́! Агалошваючы вырак, Рада ня ведала, што Альбэр захоча мне стварыць жахлівую спакусу. Гэтага вечара не зачыняліся брамы.
Вярнуўшыся дадому, я адчуваў, што зрабіў як трэба. Калі гэтае места звар'яцела, дык хай хоць я буду ў ім прытомны. Калі яно благое, дык хай хоць я буду ў ім добры. Альбэр хацеў мяне паланіць даверам. Добра, думаў я зь нейкім расчуленьнем, я адплачу яму гэтым жа самым, хаця й ведаю, што буду жорстка пакутаваць. І калі Арас прагне, каб я ўдзельнічаў ува ўсеагульным зьніштажэньні, дык я буду тутака для ўсіх дакорам сумленьня.
Вы не паверыце, панове, але тае ночы я пайшоў спаць, – і спаў добра. Абудзіла мяне сонца, калі ўжо высока стаяла ў небе. Першая мая думка была пра таго цыстэрцыяна, якога я бачыў на мосьце. Калі ён хоць на каліва выкажа хрысьціянскую любоў, дык напэўна адправіцца ў Гент. Ці ж не зьяўляецца гэта ягоным абавязкам? Да таго ж я ведаў, што цыстэрцыяны ня любяць Альбэра, бо ён заўсёды іх высьмейваў, узносячы да неба дамініканаў. Гэта было зразумела, калі ўзяць пад увагу прапаведніцкія схільнасьці вялебнага айца, а таксама падпарадкаванасьць цыстэрцыянаў біскупскай уладзе. Таму я меў надзею, што гэты мніх пойдзе проста ў Гент. Я ліхаманкава падлічваў, колькі часу пройдзе, перш чым герцаг Давід зьявіцца перад брамамі Арасу. Гэты падлік не выглядаў надта суцяшальна, бо варта магла прыйсьці па мяне кожнае хвіліны. Такім вось чынам сышоў цэлы дзень у турбаваньні, уважлівым прыслухоўваньні да крокаў на двары ды пільнаваньні прыходу варты. Я ўвесь час пасылаў даверанага на вуліцу, каб ён прынёс

зьвесткі, а ён заўсёды вяртаўся, кажучы: «Пуста, вяльможны пане, адно толькі парсюкі чухаюцца ля плоту...»
Ажно нарэшце, позна пасьля захаду сонца, калі алівавая лямпка ўжо дагасала, пачуўся рух ля ўваходу і ўбег слуга ды кажа, што прыехаў вялебны айцец. Я прывітаў яго на парозе. Увайшоўшы, ён ня даў мне на пацалунак рукі, але закрычаў, што я не люблю места Арас і ягоных месьцічаў. Я запярэчыў. — Ты хацеў зьбегчы ўначы на біскупаў двор і нам на шыю Давіда прывесьці!
Я запярэчыў. Ён у адказ сьмяяўся. Я бачыў, што ён адчувае слабасьць, распух увесь і мучаюць яго воды ўва ўсім целе, якіх з кожным днём усё большала. Таму я запрасіў яго ў пакоі, паклікаў слугу й кажу падаць нам найлепшага гатунку трунак. — Я нічога не хачу ў гэтым доме! – крычыць ён гнеўна. І зноў гаворыць, што я задумаў даць цягу зь места. — Няпраўда... – адказваю з націскам.
Тады ён кліча слугу, якога я пасылаў з скакуном да брамы. — Кажы, што ты мне ўчора зранку даносіў! – загадвае.
Слуга прызнаўся ўва ўсім, фанабэрыста гледзячы на мяне. Гэтак вось я ўбачыў, што выгадаваў на ўласных грудзёх вужаку, якая прывяла мяне да згубы.
Калі мы з Альбэрам засталіся адны, я сказаў: — Ойча, выслухай мяне! Гэта праўда, што я хацеў ісьці да біскупа, бо ўжо не магу бачыць тых жорсткасьцяў. Час з гэтым пакончыць! Час, каб места зьвярнулася да свайго сумленьня і ўчыніла скруху...
Ён хацеў перабіць мяне, але я гаварыў далей, бо ведаў, што змагаюся за сваё жыцьцё: — І таму я вырашыў ісьці да Давіда. Але ўсё ж не пайшоў, адступіўся ў апошнюю хвіліну, бо гэта маё места і я не хачу яму здрадзіць, нават дзеля добрае справы!
Альбэр засьмяяўся гэтак халодна й жудасна, што ў мяне ажно падагнуліся ногі. «Ілжэш», – кажа ён з посьвістам, а сьліна цячэ ў яго па барадзе. — Ілжэш, Яне! Ты адступіўся ад намеру ўцячы не дзеля любові да Арасу, але праз хітрае баязьліўства. Калі б цябе слуга не пакінуў, ты пайшоў бы праз браму, атакуючы варту. Але цябе ўжо там чакалі. Бо я цябе правяраў. Але ты перахітрыў мяне. Разумны ты й вельмі брыдкі... Ты ведаў, што цябе чакае ад ката ў выпадку, калі ты пападзешся. Тады б ужо не было аніякага паратунку...
Калі ён усё гэта казаў, у маім сэрцы зацеплілася надзея. Але ён хутка яе згасіў: — Ты пойдзеш пад меч! Але абыдзецца без

катаваньняў. — Ойча! – кажу я. – Ты ня зробіш гэтага з сваім самым верным вучнем. Чаго ж хочаш ты ад мяне й ад гэтага места? Які д'ябал кіруе табою і куды ты імкнеш, распальваючы вогнішчы ды аддаючы кату найшляхетнейшых людзей?
Тады ён крыкнуў і занёс руку, нібы хочучы мяне ўдарыць, але зьнянацку ўсё ў ім неяк здрузьлела і ён бязь сілаў апусьціўся на лаву. Гляджу на яго і нічога не разумею, бо бачу – ён плача. Сьлёзы цяклі па ягоных старэчых шчаках, напухлых ад хваробы, капалі на белую бараду. Ён увесь тросься, нібы куст на ветры. Я пляснуў у далоні і, калі зьявіўся прыслужнік, загадаў прынесьці збан вінаграднае бражкі. — Ня трэба, – ціха сказаў Альбэр. Але потым піў прагна. І зноў заплакаў.
Я сеў ля яго. Ува мне, як закаптураны сокал, білася надзея, а таксама горкі жаль перапаўняў маё сэрца. Бо гэта быў мой шматгадовы апякун і настаўнік, найгаднейшы і наймужнейшы чалавек пад сонцам, які трымаў у паслушэнстве на працягу дваццацёх гадоў вялікае места, а цяпер вось плакаў як дзіця і ня мог вымавіць ані слова. — Ойча Альбэру, – сказаў я мякка. – Супакойся... Усё будзе добра!
І, кажучы тое, я верыў, што так і будзе. Я пачаў гаварыць да яго, як суцяшаюць малое дзіця, і нават хацеў схапіць ягоную далонь, каб пацалаваць, ды раптам узгадаў, што дзеецца навокал, – і стрымаўся.
Тады ён зірнуў на мяне з-пад набрынялых павекаў, і мне здалося, што так глядзяць толькі вочы невідушчага. Але ён бачыў. — Ці ты думаеш, Яне, што мне лёгка ў гэтым месьце? Няўжо ж у мяне каменнае сэрца, а розум апантаны варожасьцю да роду чалавечага? Я пакутую так страшэнна. Як не пакутуе ніхто ў Арасе!
— Да чаго ты імкнешся, ойча?
— Каб іх вызваліць! – адказаў ён зь нечаканай сілай. – Каб адкрыць ім сьвятло ў гэтай жахлівай цямрэчы...
Цяпер ужо ён казаў гучней, а сьлёзы на ягоным твары высахлі. Ды толькі ня думайце, панове, што было ў ім нейкае звышнатуральнае натхненьне альбо д'ябальская іскра. Нічога падобнага! Калі й было там нешта пад шалупіньнем словаў, дык адно надзвычайная цьвярозасьць розуму, які ўсё ўзважыў, суаднёс і праясьніў ажно да самага дна. І менавіта таму ягоныя словы гучалі яшчэ больш страшна. — Яне, – сказаў ён мне, – я хацеў бачыць цябе сваім наступнікам. Бо ведаю, што самому

мне не дайсьці да мэты. Дарога вельмі далёкая і патрабуе неабыякое мужнасьці. Падумай пра гэтае няшчаснае места. Як моцна яно прагне вызваленьня! Людзей выгналі з раю, і яны адчуваюць, што гэты сьвет – ня іхны, і яны чуюцца чужымі, ім цяжка, дрэнна і брыдка. Яны нараджаюцца й паміраюць у марнай калаверці справаў, паміж стрыжэньнем авечак, мачэньнем канопляў ды тканьнем саржы. Яны нараджаюцца й паміраюць, ня ведаючы, навошта яны прыйшлі на гэты сьвет. Бо ня можа быць мэтаю чалавечага існаваньня стрыжэньне авечак, мачэньне канопляў ды тканьне саржы. Як таксама ня мэта – спаць з жанчынай, есьці, даіць кароваў, падкоўваць коней і паляваць на лясную зьвярыну. Дзе ж быў той рай, які яны страцілі яшчэ да свайго зьяўленьня на сьвет, і дзе яны павінны яго шукаць, каб знайсьці хоць каліва сэнсу ў гэтым вар'яцкім млыне? Некалькі гадоў таму прыйшла да іх страшэнная пошасьць. Яны рэзалі адзін аднаму горлы і жэрлі чалавечае мяса. Пекла! А калі зараза згасла, яны зноў вярнуліся да саржы ды канопляў; яны апусьціліся і зьняверыліся, іхныя сэрцы высахлі, як трэскі. Калі трутавік точыць магутны камель, дык патрэбная сякера й моцная рука, каб яго адсекчы. Часам і гэтага замала, і зь неба мусіць ударыць вогненны пярун, выпаліць усё навокал, зваліць дрэва. Перамяніць яго ў вогненны слуп, каб на другі год прарасло на папялішчы здаровае зерне... Ля заходняе брамы, дзе жывуць жыды, ёсьць невялічкі ставок, увесь пакрыты раскаю ды воднымі лілеямі. Час бяжыць, а ставок зарастае ўсё болей. Калі я прыехаў сюды шмат гадоў таму, я бачыў там чыстую ваду і процьму тлустых карпаў у глыбіні. Але час мінаў, раска шырылася ад берагу, лілеі перарасталі ў зялёны кажух пражэрлівых і ненасытных расьлінаў. Карпы ўсплывалі дагары з уздутымі шчэлепамі. Не было там ужо ім магчымасьці жыць. І гэта мяне страшэнна мучыла. Чаму няма сьвятла для гэтых няшчасных рыбаў у глыбіні? Ці павінны яны зьнікнуць без паратунку? Я неаднойчы хадзіў туды і кідаў камяні ў тоўшчу вады. Увесь зялёны кажух люта надзімаўся, па паверхні прабягала нейкае варушэньне, і раска трэслася, лілеі зьвіваліся ды распляшчваліся, а ўгару біў струмень чыстае вады з глыбінь. Аднойчы я наняў людзей, каб разам са мною кідалі камяні. Яны лічылі, што я звар'яцеў. Бо ня кожны разумее любоў. І што тады было на тым стаўку?.. Сапраўдная бездань пякельная. Як хацеў бы я выпаліць агнём

усе гэтыя лілеі ды парасткі, каб адхінуць люстра вады і адкрыць яго сонечным промням. Калі людзі кідалі каменьне, штосьці там у глыбіні зрушвалася і нейкае ажыўленьне ўваходзіла ў ваду, нібы ўвесь ставок урэшце абуджаўся. Я загадаў людзям хвастаць лілеі розгамі, і яны іх хвасталі. А лілеі тыя ажно віліся ад болю, разьюшана падскоквалі, але там, дзе дасягалі ўдары, адкрывалася люстра чыстае вады…
Яне! Заклінаю, даверся мне! Гэтае места трэ адхвастаць да крыві, падпаліць з чатырох бакоў, перамяніць у логава шэльмаў, каб адхінулася сапраўднае аблічча чалавека. Людзі тутака нічога так моцна не жадалі, як зьменаў! Няхай гэта быў бы жахлівы боль – яны прагнулі і яго, бо ўсё, што хоць нешта значыла ў іхным жыцьці, было пустое, невыразнае, сьмярдзючае, недарэчнае й нясмачнае. Высунь язык у туман – і што адчуеш? Нічога! Увесь Арас быў адным вялікім языком, высунутым у туман. Яны нават паміралі бяз жалю і страху – такія былі бясколерныя і ніякія. О, ты думаеш, што я хацеў зрабіць гэтых людзей анёламі? Ты моцна памыляешся. Я хацеў толькі, каб яны зрабіліся больш чалавечымі, чым былі дагэтуль. Яне, скажы мне, сыне! Калі можна спазнаць слодыч цнотаў? Калі спазнаеш горыч грахоў! Калі можна зразумець сэнс супакою? Калі ведаеш, што такое турбота і страх! Калі можна жадаць Бога? Калі пакаштуеш д'ябальства! Калі можна палюбіць простае жыцьцё? Калі сутыкнешся зь сьмерцю! Калі можна ацаніць ежу, вопратку, скакуноў, вымя каровы, прыгажосьць тканіны й дотык вытанчанай саржы? Калі ўдзень і ўначы цябе паліць роспач, боль і страшэнная трывога! Урэшце, калі можна пераканацца ў трываласьці пэўных вартасьцяў? Калі падаеш на дно, дзе ўжо нічога няма ані трывалага, ані вартага… Такім вось шляхам вяду я гэтае места да сапраўднае вольнасьці…
Ён змоўк, а я глядзеў на яго і думаў, што айцец звар'яцеў. Ён гэта адчуў. — Лічыш мяне вар'ятам, така́ Ну, дык пакажы іншы шлях, лепшы, больш годны чалавечае асобы. Колькі стаіць сьвет, людзі бязьмерна пакутуюць. Да іх прыходзяць прарокі і гавораць: «Ідзіце за мной, я павяду вас у рай!» І людзі з пакораю ідуць, бо нічога чалавек так моцна ня прагне, як ісьці… І ня важна, куды ён ідзе, важна толькі тое, што ён знаходзіцца ў руху. Вучню, даверся мне! Нічога няма цяжэйшага, як прыцягнуць на свой бок Бога. У пагоні за Ім

людзі йдуць зь няпамятных часоў, заўсёды наперад сярод незьлічонае колькасьці мерцьвякоў ды калек, у гомане ваенных воклічаў і сярод разьні, забойстваў ды пажараў. О, як нястомна ганяюцца яны за гэтай вялікай тугою. І дрэнна робіць той, хто спрабуе іх затрымаць. Бо нашае прызначэньне – ісьці. Толькі тады людзі чуюцца вольнымі...— Вольнымі! – прамовіў я зьдзекліва, забыўшыся пра сваё страшнае становішча. – І ў чым жа тая вольнасьць, якую ты даў Арасу?! Гэта ж найлюцейшая няволя гвалту, даносчыцтва, вогнішчаў, закляцьцяў ды нікчэмных мроеньняў...

Ён пасьміхнуўся на тыя словы. — Яне, – кажа. – Ня тое важна, чым рэч зьяўляецца, але тое, якое яна найменьне носіць. Усё ёсьць тым, чым ёсьць яго найменьне. Калі Госпад Бог явіўся Майсею на гары Харэб, а Майсей спытаў: «Госпадзе, як імя Тваё?» – тады Бог адказаў: «Я той, хто ёсьць!» Ты кажаш пра няволю гвалту ды мроеньняў, у якую трапіла места. Ты мылішся! Чым будзе гвалт, калі ты назавеш яго карай? Ён і будзе карай! А чым – мроя, якую назавеш верай у збаўленьне? Яна будзе вераю ў збаўленьне! Табе здаецца, што чалавек утвораны з чынаў ды задумаў, тады як на самай справе ён утвораны яшчэ і са словаў. Ня ты першы паддаешся той зьдзіўляльнай лёгкасьці, якая грунтуецца на самай наіўнай ілюзіі чалавечага розуму, нібы сусьвет можна пазнаць і зьмяніць бяз словаў. Як жа ты яго пазнаеш і зьменіш бяз мовы, якая была табе дадзеная, каб ты ёю называў?! Што ня мае назвы – не йснуе. А што існуе – дык толькі дзякуючы свайму найменьню.

Тады, жахнуўшыся да глыбіні сэрца, выгукнуў я: — Ойча Альбэру! Д'ябал прамаўляе тваімі вуснамі...

А ён ізноў засьмяяўся ціха:

— Вось ты і назваў, Яне! Цябе навучылі мове, і ты яе ўжываеш. Ты кажаш – д'ябал! Дык варухні ж глуздамі. Дай гэтаму іншае найменьне, і адразу пачуеш нешта іншае. Ты гаворыш «я» – і, калі кажаш гэта, адасабляешся. Гаворыш «мы» – і, кажучы тое, робішся часткаю. Я сьцьвярджаю, што, калі ты гаворыш «я», ты грашыш, і паколькі я так кажу – ты сапраўды грашыш! Я даў найменьне тваёй мове. Так я даю найменьні ўсім учынкам гэтага места. І яны робяцца тым, чым ёсьць іхнае найменьне. Тое, што цяпер дзеецца ў Арасе, я назваў вольнасьцю, і іншыя на мой прыклад назвалі гэта вольнасьцю – дык значыць, гэта ня

што іншае, як толькі вольнасьць. Я змусіў места, каб яно чыніла тое, што чыніць, і яно хоча чыніць тое, што мусіць чыніць. Калі ты ня бачыш у гэтым гармоніі і адзінага шляху да збаўленьня – дык ты сьляпы, глухі і нямы. Я бяру на сябе ўвесь цяжар грахоў гэтага места і гатовы пакутаваць за яго, як ніхто яшчэ ніколі не пакутаваў. Я прымусіў іх рабіць тое, што я загадваю, а яны знаходзяць у гэтым уласнае жаданьне і радасьць. Калі ўжо гэта не зьяўляецца вольнасьцю, дык нішто вольнасьцю ня будзе. І скажы мне, урэшце, хто мацней за мяне любіць гэтае места? Я асуджаю сябе на вечнае пакараньне, каб толькі спазнаў Арас раскошы называць рэчы ды ўчынкі паводле ўласнае мовы.

Ён падняўся і пазіраў на мяне трыюмфальна. А я прамовіў: — Ойча, даруй мне! Але пачуў я словы страшныя, якія, несумненна, усіх прывядуць да згубы...

— А калі нават і так, – сказаў ён і зноў пасьміхнуўся, – дык што з таго? Калі чалавек стаіць, ён баіцца сьмерці. Але калі йдзе, дык нават ня ведае, што памірае... Арас цяпер знаходзіцца ў дарозе, Яне! Кожны тутака памрэ зь лёгкім сэрцам. Нават ты!

Я задрыжэў. — Не турбуйся, – сказаў ён. – Я сыходжу. На сьвітанку прыйдзе па цябе варта, бо будзеш арыштаваны і пастаўлены перад абліччам Рады. Тое табе скажу, што ты асуджаны. Але памрэш ты лагодна і без пакутаў. Бо ты той, каго ў гэтым месьце я любіў найболей. Але ты хацеў паўстрымаць ягоны паход, і таму мусіш панесьці кару.

Так сказаў ён і выйшаў з майго дому, а я схапіў збан з бражкай, хапліва піў аж да дна, а пасьля разьбіў збан аб сьцяну і плакаў ад страху перад сьмерцю.

У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амэн. Мае панове, грамадзяне слаўнага места Бруге, якія мяне так гасьцінна прымаеце. Вырашайце самі, ці быў вялебны айцец вялікім думаньнікам! Дык значыцца, найменьне! Аніводнага быцьця не йснуе, калі яно не названае. Я той, кім ёсьць Ян, і вось, дзякуючы гэтаму, зьяўляюся чалавекам. А таму, калі б я сказаў вам, што места Бруге сее рыбаў, а вы б ухвалілі мае словы, тады б усе месьцічы пайшлі б у мора зь сярпамі, каб жаць рыбаў. Многія б патанулі, але вялікая грамада вярнулася б на бераг, несучы з сабою кашы зрэзаных рыбінаў. Цэлыя сем'і выходзілі б у мора, як выходзяць у поле, і часалі б сярпамі пену хваляў. А мімаплыўны карабель абавязкова разьбіўся б аб

скалы, бо ўсе матросы пры адным паглядзе на вас павар'яцелі б. А найболей мяне захапляе думка, што знайшліся б у Бруге людзі шляхетныя, шанаваныя, якія зьяўляюцца айцамі сямействаў і пабожна справуюць свае інтарэсы, і яны знаходзілі б ганарлівую радасьць у гэтым марскім жніве і штоночы вастрылі б сярпы, каб на сьвітанку зноў ісьці жаць рыбу. А хто сказаў бы, што належыць браць невад або сець, той абавязкова быў бы выгнаны зь места за расьсяваньне малаверства і неспакою.

Мае панове! Зважайце, што значаць словы вашае дастойнае Рады, бо можа надысьці дзень, калі ў Бруге рыбы пачнуць сьпяваць, птушак стануць лавіць на вуду, жарабцоў будуць даіць дзеля добрага малака, а кароваў сядлаць для наездкі. Бо зьява – ня тое, чым яна ёсьць, але тое, як яна мянуецца! Кажучы гэта, адчуваю я трывогу, што сьціскае мне горла.

Такім чынам, гэнага вечару прыйшла па мяне варта. Я не супраціўляўся. Толькі сказаў старшаму:

— Пачакай на парозе, я цяплей апрануся, бо ў лёху вельмі халодна.

На што ён: — Гэта праўда. Ды вазьмі з сабою бутлю бражкі, бо вартавыя ахвотна п'юць, гуляюць зь вязьнямі ў косьці і супольна весяляцца.

Я зрабіў, як ён радзіў. Яны вялі мяне ў ратушу праз добры кавалак места, і месьцічы бачылі, у якім становішчы я апынуўся. Але не выказвалі спачуваньня. Увогуле, яны здаліся мне стомленымі, і тое быў знак, што агонь, які спусташаў места, паволі згасаў. Гэта суцяшала.

Мяне зачынілі ў лёху, зь якім я быў добра абазнаны, бо шмат гадоў апекаваўся ратушным будынкам. Каморка была цёмнаю і вільготнаю, але я знайшоў там лаву ды вяхотку саломы. Мяне не прыкоўвалі да сьцяны, бо я яшчэ ня быў прызнаны вінаватым, а толькі чакаў разгляду справы Радай. Увогуле, я мушу прызнацца, што вартавыя са мною абыходзіліся з асьцярогай і нейкай пашанай. Відаць, айцец Альбэр загадаў, каб са мной нічога ня здарылася. Апусьцілася ноч, і прыслужнікі запалілі дзьве лучыны. Адзін зь іх кажа: — Добры пане. Ці згуляеш з намі ў косьці?

— Зь вялікай ахвотай, – кажу я.

У выніку мы гулялі ў косьці, пакуль на вежы не прабіла поўнач, а пасьля я паклаўся на лаву і заснуў. У гэты час адбывалася са

мною нешта дзіўнае, бо хоць я і быў сьвядомы блізкае сьмерці, але зусім не губляў спакою і нават нейкага гумору духа. Я падазраваў, што гэта асаблівы від вар'яцтва, бо я нібы насуперак самому сабе хаваўся ўва ўтрапеньне пры адной думцы аб лютым канцы. У кожным разе ад тае хвіліны, калі я заплакаў пасьля сыходу Альбэра, болей ужо я ня плакаў, а нават момантамі чуў весялосьць. Калі я гуляў у косьці з прыслужнікамі, дык вельмі хацеў выйграць – ажно да тае ступені, што злаваў мяне кожны няўдалы кідок; пры ўдалым жа я выбухаў сьмехам. Аднак гэта мне дало тое, што, калі я ўжо засынаў, данёсься да маіх вушэй голас аднаго з прыслужнікаў, які казаў: «Вось дзе сапраўды вялікі пан, які не баіцца сьмерці...»

Так перабыў я ў лёху два спакойныя дні, каторыя нат сёньня ўспамінаю бяз жалю. Аж аднойчы прыйшоў да мяне чалавек з варты, каб выпіць глыток бражкі. Убіўся ён у пакойчык, ды гаворыць ціха: — Добры пане! Рыхтуйся да сьмерці. Я ведаю, у чым цябе будуць вінаваціць.

— Дык не маўчы ж! – кажу я яму. — Ужо ўсё места ведае, што ты змаўляўся з графам дэ Саксам супроць прывілеяў. Калі ты прыходзіў у лёх паразмаўляць зь ім перад экзэкуцыяй, ён перадаў табе ліст да герцага Давіда і герцага Філіпа. — Як жа ён мог перадаць мне ліст, калі сядзеў у цямрэчы ды ня меў ані пэргаміну, ані пёраў! – выгукнуў я, пачуўшы тое.

А вартавы кажа: — Гэтага я ня ведаю. Але без усялякага сумневу, ён перадаў табе лісты да герцага Давіда. — Дык дзе ж яны цяперака? Хай мне пакажуць доказы. — Я чуў у месьце, што яны зьніклі, – адказаў вартавы. – І невядома, дзе знаходзяцца. Але кожны ведае, што граф дэ Сакс напісаў, а ты схаваў лісты, каб перадаць іх біскупу. — Скуль жа вы можаце пра гэта ведаць?! – закрычаў я ў роспачы. – Падумай, чалавеча, ці ж у каморы такой, як гэта, можна пісаць лісты?

— Я ня ўмею пісаць! – адказаў ён спакойна. – І ня ведаю, як гэта робіцца. Але граф напісаў, а ты схаваў...

На тое я сказаў: — Ты – конь. Паўставай на дыбкі ды ржы! Ён глянуў на мяне, не разумеючы. Таму я паўтарыў: — Я ж кажу табе. Паўстань на дыбкі ды ржы, бо ты – конь. — Я ня конь, – сказаў ён. — Памыляешся, – гукнуў я гнеўна. – Усё места ведае, што ты конь. Цябе аб'явіў пан дэ Муае і справіў табе багатую збрую. Але ты быў непаслухмяны, таму цябе

аддалі ў запрэг, і цяпер ты цягнеш вазы з саржай...
— Я ня конь... – выціснуў ён, на што я адпавёў цьвёрда: — Дык дакажы гэта!
Ён выбег з маёй каморы. Думаю, што калі ён апынуўся на двары перад ратушай, дык заржаў і пусьціўся наўскач проста да каваля.
Вось так я даведаўся, што Рада для мяне рыхтуе. Не было ўжо для мяне паратунку, і мусіў я рыхтавацца да сьмерці. Але я знаходзіў суцеху ў тым, што абыдзецца без катаваньняў. Відаць, Альбэр утаіў ад Рады справу маіх начных уцёкаў. Я пахваліў сябе за выказаную тады развагу. Добра, што я павярнуў назад ад брамы сьвятога Эгідыя. Яны толькі й чакалі, каб я выхінуўся зь ценю і зрабіў крок да муроў. Я б трапіў у пастку! Ад усходу й да захаду сонца цярпеў бы я тады неапісальныя мукі. Цяпер жа мне пагражаў толькі меч.
Ізноў мінаў час. Я ня меў аніякага ўяўленьня, ці цяпер на сьвеце золак, дзень, падвячорак або ноч. У маёй каморы заўсёды было цёмна і вільготна. Таму я пытаўся ў вартавых, і яны мне ветліва адказвалі. Урэшце прыйшоў служка, які некалі мне прыслужваў, – яшчэ да таго, як я аддаў яго ў ратушу, – дый кажа:
— Добры пане, я прынёс табе вельмі смачную вячэру, бо гэтае ночы ты станеш перад Радаю, а калі ўзыдзе сонца – аддасі галаву пад меч. Гэта твая апошняя ноч, дык я зараз памалюся за цябе.
І ён пайшоў, пакінуўшы мне шчодры падмацунак. Пазьней я даведаўся, што прыгатавалі яго мае слугі, і гэта, несумненна, было пераканаўчым доказам іхнае любові й сьмеласьці, бо за падобныя жэсты ў Арасе можна было заплаціць галавой.
Дык я паклікаў варту, і мы разам паелі. Быў там выдатны паштэт, вэнджаны сьвіны кумпяк вельмі тонкага смаку, а таксама дразды. Апроч таго – гарлач бражкі ды збан піва. За ежаю кажу да вартавых: — Значыцца, добрыя мае людзі, заўтра на ўзыходзе сонца я ўжо адпраўлюся да Бога. — Такая воля нябёсаў, – адказаў адзін зь іх.
Я на тое:
— Але, думаю, што будзе з гэтым неабыякі клопат, бо ж араскі кат склаў галаву. Хто ж мяне пакарае?
На гэта той чалавек кажа: — Ня будзе ніякага клопату, бо я сёньня быў у Радзе і, просячы пакорна, сказаў, што я адсяку

галаву вяльможнаму пану...
Я ледзь не падавіўся паштэтам, калі ён гэта сказаў. Гляджу на яго ў зьдзіўленьні. — Дык гэта ты будзеш?
— Я, пане!
— Пакажы руку.
Ён падняўся зь зямлі, скінуў кашулю і агаліўся да пояса. Ён сапраўды быў ладны. Я крануў магутныя вузлы цягліцаў, што пружыліся пад скурай, і мяне закалаціла. А потым кажу: — Чаму ж ты прасіў, каб табе дазволілі? Ты знаеш мяне?
— Ня знаю, добры пане. Але Рада плаціць за тваю галаву тры дукаты. — Тры дукаты, – паўтарыў я ў задуменьні. – Я нат і ня ведаў, што так шмат каштую...
Заставалася яшчэ багата харчу, але ў мяне зьнік апэтыт. Як ні зірну на руку гэтага чалавека, мяне пачынае трэсьці. Яны дапілі да канца піва і ўрэшце сышлі, забраўшы паходню. Мяне ахінула поўная цямрэча. Я сядзеў, абапёршыся сьпінаю аб халодны мур, і ўслухоўваўся ў біцьцё свайго сэрца.
У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амэн. Прызнаюся, я жудасна баяўся сьмерці. Бо я – вельмі грэшны чалавек. Але цемра й цішыня, здавалася, суцішалі страх. Так, быццам бы я ўжо не існаваў, знаходзіўся па-за сьветам і людзьмі. Я чуў стук свайго сэрца й посьвіст дыханьня. Я датыкаўся сквапнай даланёй цела. Ужо нічога апроч мяне не існавала. Я напаўняў увесь сьвет сваёй асобай. Калі сьмерць такая, дык яна не выглядае вельмі жудаснай. Так трываў я ў чаканьні й прагнуў толькі аднаго. Каб ня бачыць болей людзкіх твараў, дрэў, неба і сонца. Калі б яны маглі ўбіць мяне ў зямлю ў гэтай каморы, на самым дне ратушы, безь сьвятла, у поўнай цішы – я б дасягнуў лагоднага зьніштажэньня. І разам з гэтаю думкай зразумеў я ўсю жахлівасьць сьмяротнага пакараньня.
Час мінаў у дзіўным атупеньні, якое чаргавалася з выбухамі роспачных думак. Можа, я занураўся ў сон; можа, прабуджаўся; аднак жа агарнула мяне нейкая вялікая нязрушанасьць, і мне не хацелася яе спудзіць. Можна сказаць, што я патроху вучыўся паміраць.
Раптам даляцеў да мяне нейкі гоман, а потым углыбі лёхаў зазьзяў агеньчык. Я вырашыў мужна чакаць канца. Па мяне ўжо ішлі, каб выцягнуць ды паставіць перад абліччам Рады, а адтуль – адразу на ўсходзе сонца – на карны пляц. Мне не хацелася мець ні вачэй, ні вушэй, ні языка, ні нюху, ні

адчувальнасьці. Але я ўсё гэта меў. І ў такім жахлівым збытку, што аж ня выказаць словамі.
Паходня палымнела ўжо амаль побач. Крокі набліжаліся. Я паволі падняўся на ногі. Перада мною стаяў той чалавек, што меўся мне сьцяць галаву. — Добры пане! – загукаў ён. – Герцаг біскуп утрэхцкі ўвайшоў у места праз браму Трынітэ! – І ён упаў наўколенцы. – Даруй мне, што паквапіўся я на тры дукаты, бо я вельмі бедны чалавек...
— Трымай паходню, бо згасьне! – прыкрыкнуў я. – І вядзі мяне да герцага...
Вось дзе цудоўнае ўратаваньне, мае панове! Нібы ў прыпавесьці пра злых цмокаў і добрых рыцараў. У момант, калі ўжо ўзьняўся люты меч, звышнатуральная сіла супыняе яго ў лёце, а добры Бог узнагароджвае асуджанага за вернасьць і пакуты. Калі я пасьпешліва крочыў па падземным калідоры за неадбытым катам з паходняй, я перажыў вельмі незвычайныя хвіліны. Мною да тае ступені авалодала радаснае зьдзіўленьне, што я гатовы быў паверыць у цуд, выслужаны ў Бога дзякуючы сваёй пастаце. Але калі нават мой розум часам і правальваецца ў гэтыя дзюры – дык усё ж ненадоўга! Выйшаўшы на ратушны дзядзінец, я апрытомнеў. Ноч была халаднаватая, але ў лёху я адчуваў такую пранізьлівую халаднечу, што цяпер скардзіцца не выпадала. У дворыку сабралася крыху прасталюдзінаў, а сярод іх і колькі паноў. Тыя прывіталі мяне вельмі далікатна, я б нават сказаў – рабалепна. Бо ж увесь Арас ведаў, што я сябра герцага.
Нікога з Рады паблізу не было, бо яны пайшлі да брамы Трынітэ. Дык мы сталі чакаць. Агонь паходні асьвятляў твары. Я ня бачыў на іх ні палёгкі, ні страху, ні радасьці. Хутчэй заспанасьць. Толькі ў гэты момант зразумеў я, што набліжаецца поўнач і што паратунак надышоў усяго за колькі гадзінаў да канца.
Давід уехаў на дзядзінец конна, у маўклівым суправаджэньні Рады. Я заўважыў, што Альбэр рухаецца зь цяжкасьцю, а іншыя яго падтрымліваюць. Убачыўшы мяне, герцаг паўстрымаў каня і гукнуў: — Яне! Як я рады цябе бачыць... – а пасьля расчуліўся з прычыны майго благога выгляду.
Мы зь ім прайшлі ў пакоі, тады як іншыя засталіся знадворку. Маімі першымі словамі былі наступныя: — Вашая Дастойнасьць, ты пасьпеў у самы час. На золку мне павінны

былі сьцяць галаву...
— Ты выплыў зь віру, – адказаў ён і абняў мяне. – А цяпер распавядай мне ўсё, што адбылося ў Арасе.
Мае панове! Што я мог сказаць? Ці магчыма пераказаць усе тыя беды ды няшчасьці ў некалькіх словах? З чаго пачаць і чым скончыць? Здалося мне раптам, што, каб адпаведна апісаць тутэйшыя здарэньні, мушу я пачаць ад стварэньня сьвету. Таму я сказаў: — Выбач, пане герцагу, але занадта я стомлены, каб распавядаць цяпер. Яшчэ нядаўна я сядзеў у ратушным лёху, рыхтуючыся да сьмерці. Дазволь жа мне сысьці, каб я мог вярнуцца. — Маеш рацыю, – кажа Давід. – Ідзі і адпачні. А калі будзеш у стане мяне адведаць, дык я заўсёды буду рады цябе бачыць...
Такім чынам, я выйшаў і зноў апынуўся на дзядзінцы. Там было пуста. Усе вярнуліся да сваіх дамоў, нібы нічога надзвычайнага не адбылося тае ночы. Дый сапраўды, зь іншымі нічога не адбылося. Толькі я адзін перажыў сваё ўваскрэшаньне. Я адчуў вялікую стому і санлівасьць, але ўсё ж сабраў сябе ў кулак і пашукаў чалавека, які меўся стаць маім катам. Ён сядзеў, скурчыўшыся, у вартоўні. Убачыўшы яго, я сказаў:
— Табе абяцалі тры дукаты за маю галаву. Вось табе тры дукаты, – і я зьняў з пальца пекны пярсьцёнак.
Ён адмаўляўся, баючыся нейкага падступства. Тады я сказаў:— Ня бойся. Вазьмі пярсьцёнак, бо я хачу, каб і ты так цешыўся жыцьцём, як я ім цешуся.
Тады ён узяў пярсьцёнак і пацалаваў мне руку.
З ратушы я пайшоў дадому. Але ішоў вельмі павольна. Ноч ужо была на сыходзе. Неба, спачатку чорнае й бязьлітаснае, паволі стала нагадваць саржу, якую кепска выпралі. Як бы празрыстыя падцёкі пазьяўляліся тут і там, нібы бяз шолаху разьдзіралася заслона. Я зьмярцьвеў: вось у гэтую хвіліну вялі б мяне з раднае залі да дзьвярэй касьцёлу Найсьвяцейшае Тройцы. Вартавыя б спаволілі крок, чуйна ўглядаючыся ў неба. Яшчэ трохі зарана... Затрымаймася! Падзьмуў вецер, зашумеў у голых кронах дрэў. Разам зь ім прыляцеў пах вільготных лугоў, што прасьціраюцца адразу за мурамі. Вартавыя зноўку вядуць мяне ўперад. Неба на ўсходзе разьдзіраецца ўсё болей. Раптам запяяў певень. Недзе застукалі па замерзлай зямлі конскія капыты. Вось ужо выхінаецца са змроку і касьцёл Сьвятой Тройцы. Холад прабраў мяне аж да касьцей. Дзе ж паходні ў

нэфе? Дзе сьпевы? Прыехаў герцаг, і таму не запалена для мяне сьвятла ды ніхто не разьвітваецца са мною псальмамі. Дзякуй табе, пане герцагу! А вось і першы праменьчык сонца, дзесьці ніжэй дахаў. Я хутчэй адчуваю яго, чым бачу. Іду каля эшафоту. Там, угары, відзён пень. Удзень зрудзелы ад крыві, ён цяпер здаецца чорнай каржакаватай постацьцю.
Калі ружовыя прамяні коса падаюць на дах майго дому, я ўжо стаю на парозе. У гэты момант мела зьляцець мая галава. Я чула дакранаюся да яе. Яна моцна сядзіць на карку.
Я ўвайшоў у сенцы, а потым – праз унутраны дворык – у пакой, дзе жыла мая чэлядзь. Я ведаў, што яны застануцца дома, бо надта шмат рабіў я ім міласьці, каб хацелася ім цяпер глядзець на сьмерць свайго пана. Калі яны пабачылі мяне на парозе, дык пападалі наўколенцы са страху, думаючы, што гэта мой дух вярнуўся ў гасподу. Але хутка зразумелі, што я жывы і цешуся свабодаю. Тады яны ўзьнялі радасны гоман. А я шукаў поглядам толькі аднаго. Дык ён і быў тут. Зьмеркаваў адразу, што яго чакае, і хацеў уцячы, але яму не далі. Тады я сказаў:— Ведайце ж усе, што гэта ён выдаў мяне на сьмерць. Як Юда! Я гіджуся ім і не дакрануся да яго. Але вы можаце зрабіць зь ім што захочаце. – І выйшаў з пакою.
Яшчэ не дайшоў я да сваіх палатаў, як данёсься да мяне страшэнны крык. Адзін, другі, трэці... А пасьля настала цішыня. Празь нейкі момант прыйшоў лёкай, каб прыслужваць мне перад сном. Гляджу, а ў яго далоні чырвоныя ад крыві.— Памыйся, – кажу, – і не дакранайся да майго адзеньня.
Ён адышоў, а я паклаўся спаць.
Так скончылася страшная ноч маёй кары.
У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амэн. Назаўтра апоўдні прыехаў да мяне Шастэль зь весткаю, што вялебны айцец Альбэр вельмі слабы і жадае мяне бачыць. Я не хацеў ісьці, але Шастэль дадаў, што такая і воля біскупа. Таму я адправіўся да Альбэра дадому. Пры ім быў дамініканін з Генту, які прыехаў у Арас з герцагам і якраз прымаў споведзь вялебнага айца. Я чакаў у іншым пакоі, ля прычыненых дзьвярэй. Да мяне даляталі прыглушаныя шэпты. Цягнулася гэта досыць доўга. Нарэшце на парозе зьявіўся дамініканін, захінаючы нос рукавом сутаны.
— Стары моцна сьмярдзіць... – буркнуў ён і выйшаў.
Я ўвайшоў у пакой да хворага. Мы былі зусім адны. Альбэр

паглядзеў на мяне, а я – на яго. Было відаць, што ён дажывае апошнія хвіліны. І сапраўды, ён вельмі смуродзіў. Я прысеў ля ягонага ложа ды маўчу. А ён робіць знак рукой, каб я бліжэй нахіліўся. Ён ужо ня мог гаварыць. Быў увесь апухлы і зь цяжкасьцю варочаў у роце языком.— Яне, вучню мой, – кажа шэптам. – Вось я і паміраю. Я прыняў Бога ў сваё сэрца, і мне цяпер радасна. Адпушчаны мне мае грахі. Таму я цябе і паклікаў – сказаць, што я таксама адпускаю...— Што адпускаеш, ойча? – пытаюся я, надзвычай зьдзіўлены.— Я табе заўсёды казаў, Яне, што я – гэта Арас, а Арас – гэта я. І так будзе, пакуль я жывы. Таму я адпускаю табе віны перад гэтым местам. І іншым месьцічам скажы, што ім я таксама адпускаю віны перад гэтым местам. Яны не захавалі яму вернасьці, каб аж да канца, і прыйдзецца ім яшчэ праз тое плакаць, але я ім адпускаю...

Я прамаўчаў, бо мяне ўзяла злосьць на гэтага старычыну. А ён казаў далей:

— Ня ўсё, ува што верыць чалавек, ёсьць прыемным Богу. Але заўсёды вера ёсьць лепшая за няверaньне. Некаторым людзям у Арасе здавалася, што на прыклад герцагаў ды біскупаў трэба аддаваць розум вышэйшай філязофіі ды пазнаньню сьвету. Тады як перш за ўсё іхнаю справаю было верыць...— Ойча Альбэру, – перабіў яго я, не хаваючы насьмешкі. – Як жа можа быць агульная вера ў тых, што ўнізе, і тых, што ўгары?! Тых, якія судзяць, і тых, якіх судзяць?

Ён хацеў заплюшчыць вочы, але ягоныя павекі так набрынялі, што я і надалей бачыў ягоныя зрэнкі. Ён нічога не адказаў. Нібы пад канец, у апошнюю хвілю жыцьця, нарэшце зразумеў, што не да таго чалавека зьвяртаўся, да якога хацеў і думаў, што зьвяртаецца.

О, мае панове, як моцна ён мусіў пакутаваць, калі зразумеў гэта! Столькі гадоў ён чыніў намаганьні, каб вылепіць мяне на свой вобраз і падабенства і перадаць мне сваю спадчыну. І вось раптам, у хвіліну скону, даўмеўся ён, як неразважна ўклаў свае надзеі. Я ведаў, што ён пакутуе з гэтае прычыны. Але ці мог я падманваць яго перад абліччам Госпада Бога? Няўжо я быў павінен удаваць няпраўду, як нікчэмны актор? Не! Так я зрабіць ня мог. Без сумневу, я спачуваў Альбэру, але ці сам я не заслугоўваў спачуваньня, а больш за тое, клопату, якім хутчэй трэба ахінаць жывых, чым памерлых?

Нашыя дарогі з гэтым старцам разышліся – і зусім ня ў той момант, калі я сядзеў ля ягонага ложка, а нашмат гадоў раней. І мы абодва пра гэта ведалі. Адно, што ён намагаўся ўмацоўваць ілюзіі, а я – не!

Ён ужо болей увогуле не загаварыў. Толькі глядзеў з-пад прыплюшчаных павекаў, а вочы меў як камяні, якімі мяне каменаваў. Але я яшчэ вычакаў пэўны час, а пасьля ціха выйшаў з пакою.

У той дзень ён памёр, а тыя, хто быў зь ім да канца, распавядалі потым, што апошнімі ягонымі словамі былі: «Верыць і трываць!»

Таго ж самага дня паклікаў мяне да сябе герцаг і пытаўся, пра што гаварылі мы з Альбэрам, калі ён быў на ложы сьмерці. Ён выглядаў вельмі зацікаўленым і ня мог гэтага ўтаіць. Таму кажу я Давіду:

— Ваша Дастойнасьць, мы размаўлялі на тэму веры.

Ён засьмяяўся вельмі кпліва.

— Так і бачу вас двух, як вы гамоніце пра справы веры... Кажы, мілы Яне, усю праўду!— Пане герцагу, – адказаў я. – Ніколі б я не насьмеліўся хлусіць табе. Павер, што цябе ў той размове ня ўзгадвалі аніводным словам. Добра гэта ці кепска, але ня ўзгадвалі!

Ён наморшчыў бровы, быццам бы трохі расчараваны. Я падумаў тады, што яму вельмі хацелася быць на вуснах Альбэра перад сьмерцю. Для такога чалавека, як Давід, гэта мела сваю вартасьць. Але, дальбог, такога роду слабасьці я зусім не разумею.

У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амэн.

Мае панове! Зараз я вам коратка распавяду, што адбывалася ў Арасе пасьля прыезду герцага ды сьмерці вялебнага айца. Незвычайныя падзеі разыгрываліся цягам многіх дзён, але найважнейшай была нядзеля, называная нядзеляй прабачэньня, выкрасьленьня ды забываньня. Таму я распавяду пра той важны дзень і пра ўсё, што з гэтага вынікла пазьней. І менавіта гэтым скончу свае вызнаньні.

Тае нядзелі ад сьвітаньня вялася падрыхтоўка. У месьце стаяў дзень вятрысты, але ясны, як гэта часам бывае на схіле восені. Па небе праносіліся драпежныя хмаркі, наскрозь прасьветленыя сонечным зьзяньнем. У паветры адчуваўся холад, але нейкі надзвычай здаровы і бадзёры. Ува ўсіх дамох –

невядома адкуль – пазьяўляліся гірлянды сухіх кветак, зрэзаныя пад мурамі галінкі бязь лісьця і нават багата аеру ды зьвітых водных лілеяў, што зьвісалі долу на гасподах, бы пацучыныя хвасты. Сярод ацалелых жыдоў віраваў агромністы рух. Старшыя загадалі выбеліць вуліцу да заходняй брамы, празь якую меў праехаць герцаг. Бо герцаг паведаміў аб сваім намеры наведаць кагал, што надарылася, пэўна, упершыню зь няпомных часоў. Дзьверы ў сьвятога Эгідыя былі расчынены як найшырэй, а алтар зырка сьвяціўся незьлічонаю колькасьцю агеньчыкаў. Каля яго ажно нельга было дыхаць – так круціла ў наздрох. На мурох расквітнелі гербавыя штандары ўсіх нашых добрых герцагаў, то бо герцага Філіпа і герцага Давіда, а яшчэ – штандар караля Людовіка, новага пана ў Парыжы. Пакуль мы ў Арасе змагаліся з сумленьнем, Бог паклікаў да сябе караля Карла, а ягоны дастойны сын, які быў так моцна зьненавіджаны бацькам, што мусіў аддацца пад апеку бургундцаў і шмат гадоў жыць на брусэльскім двары, урэшце вярнуўся ў французскія ўладаньні зь вялікаю сьвітай герцага Філіпа, які яму пакланіўся ля брамаў Парыжу і ахвяраваў прыязную службу ад імя ўсяе Бургундыі.

Арас выглядаў велікапышна спасярод мноства зеляніны, штандараў ды сьвяточна апранутага люду. Ува ўсіх касьцёлах білі званы, а на вуліцах пяклі аграмадных быкоў, ягнят ды птушак, якімі Давід абдарыў места. Але ўсё ж мушу прызнацца, што ня бачыў я тады радасных ды шчасьлівых твараў. Ізноў гэты вялікі воз вяртаўся на свае даўнія каляіны, каб з рыпеньнем пакаціцца наперад – невядома куды і навошта, пэўна толькі, што – да найбліжэйшае бездані, якую яму лёс падрыхтаваў. Араскія месьцічы зь вялікаю дбайнасьцю прымалі герцага ды ягоны двор; былі нават такія, што чакалі пасьля гэтага візыту шчасьлівых пераменаў, але большасьць рабіла тое хутчэй дзякуючы добраму выхаваньню.

Я памятаю, што, калі Давід прыехаў да нас пасьля выгасаньня вялікае заразы й голаду, людзі прынялі яго бяз шчырасьці, але ўсё ж з надзеяй. Падчас тае бяседы, калі ён сароміў нас за пыху, што нарадзілася зь нядаўніх пакутаў, усе былі яму ўдзячныя і радыя ягонай асобе. Але гэтыя часы даўно мінулі… Больш за тое, у год пошасьці ўсе месьцічы разумелі, што гэта сам Бог ці мо д’ябал спасылае на іх цяжкі лёс. Зараза не была створана намі, тады як апошнія падзеі, ахвяраю якіх пала так

шмат нашых найшляхетнейшых суродзічаў, мы павінны былі прыпісаць самі сабе. Праўда, то тут то там узносіліся галасы, што гэтага ня можа быць; што, без сумневу, нейкая страшэнная хвароба наведала Арас ды паблытала глузды месьцічам. Аднак большасьць не хацела гэтага чуць. Мы ўжо мелі досыць шуканьня прычынаў нашых няшчасьцяў ды ліха, якое падточвала места. Аднаго разу гэта была зараза, іншым жа разам – выракі боскія альбо д'ябальскае круцельства, ці, зноўку, таямнічая хвароба. Мы стаміліся ад усяго гэтага і схільныя былі меркаваць, што проста мы такія, якія ёсьць, а значыцца, дурні й недарэкі. Мы такія, што паддаюцца слодычы пустых словаў ды лютасьці хітрага падступства. Нічога ўжо ня будзе з Арасу! Места зьнікне, пакінутае Богам, д'яблам і нават сваімі герцагамі – аддадзенае на здабычу нямоцы ды самай слабай веры, якая толькі месьцілася ў чалавечых сэрцах. Мы асуджаныя, але прымаем гэны прысуд спакойна, гатовыя і далей жыць згодна з нашым прызначэньнем, ткаць шпалеры, прадаваць саржу, гадаваць тлустых пікардыйскіх быкоў. Але гэта зусім не азначае, што нам калі-небудзь удасца знайсьці радасьць у нашым існаваньні або пазбавіцца страху перад уласнай натурай. Бо прыйдзе такі дзень, калі мы йзноў пачнем рэзаць адзін аднаму горлы...

Такім чынам, гэтае места звонку было сьвяточным, але ў людзкіх сэрцах усё большала журба ды трывога.

Тае нядзелі апоўдні Давід уехаў конна на рынак. Пад ім быў конь гнядое масьці, збруя – срэбная, а плюмаж на галаве ў каня – фіялетавы. Герцаг устаў на страмёнах; конь біў капытом зямлю. Так яны замерлі на імгненьне, а ўвесь сабраны навокал люд укленчыў пакорна. Потым Давід сышоў з каня, але ягоная нага заблыталася ў стрэмені і ён тузаў яе злосна, пакуль не падбег прыслужнік ды не дапамог пану. Некаторыя палічылі гэта за благі знак, але бальшыня ўжо ня верыла ні ў якія знакі. Званы білі гучна, а наймацней – звон са сьвятога Фіякра, той самы, што раней веставаў няшчасьце. Герцаг ішоў да касьцёлу, жагнаючы людзей знакам крыжа. Калі ён зьнік у нэфе, ягоны конь заржаў моцна, а чырвоныя храпы ягоныя разьдзьмуліся й пакрыліся пенаю. І зноў адны казалі, што гэта добры знак, а іншыя маўчалі ў засмучэньні.

Пасьля распачалася вялікая імша ў сьвятым Эгідыі і доўжылася гадзінаў пяць. Сьпявалі псальмы і ўсе малітвы. Людзі моцна

плакалі, сьлёзы ліліся з многіх вачэй, але мне здаецца, што сэрцы засталіся халодныя. Нават калі біскуп зьявіўся на бабінцы з Найсьвяцейшым Сакрамантам, падтрымліваны пад локці дастойнымі айцамі з Генту, не зрабіла гэта на месьцічаў вялікага ўражаньня. Бо колькі разоў яны сузіралі Сакрамант, колькі разоў прымалі ў сябе Хрыста, ахвяруючы Яму ўсю сваю веру, а што з таго?

Ажно ўрэшце надышоў момант найзначнейшы. Давід адпусьціў месту грахі і блаславіў яго; ён скасаваў усе працэсы як пачатыя ў благой веры, блюзьнерскія ды грахоўныя. Сваёю біскупавай уладай ён перакрэсьліў працэс жыда Іцхака і старэйшыны кагалу, працэс пана дэ Сакса і пана дзю Лёш, працэс ката места Арасу і ўсе працэсы вядзьмарак. Ён сказаў:

— Што сталася, таго ня сталася; а што было, таго не было! – і зноў блаславіў места, якому вымаліў у Госпада Бога адпушчэньне грахоў ды дараваньне ўсіх правінаў.

Званы білі так гучна, што цэлыя чароды птушак разьляталіся над Арасам у неапісальнай трывозе. Пот залівaў званарам вочы, але Давід шчодра заплаціў ім і яны працавалі колькі хапала сілаў. Зь іхных далоняў цякла кроў, а адзін упаў з вышыні і паламаў сабе косьці.

Сонца ўжо зайшло, калі герцаг, ужо зноў апрануты ў рыцарскі строй, з капелюшом на галаве, у плашчы, шытым фіялетавай ды срэбнай ніткамі, выехаў конна на вуліцу да заходняе брамы. Там яго прывітаў, б'ючы паклоны, жыдоўскі кагал. Плач велізарны ўзьняўся пад неба, калі старэйшына кагалу пацалаваў герцагу руку, а той сказаў:

— Жывіце ў гэтым месьце ў супакоі ды сытасьці... Я бяру вас пад апеку, як усіх тутэйшых месьцічаў.

Увечары герцаг загадаў месту, каб весялілася. Ніколі яшчэ ў Арасе ня спальвалася столькі смольных лучынаў. Як сказаў дастойны пан Рален, які, нягледзячы на сівы век, прыехаў з Брусэлю, каб убачыць урачыстасьці, пайшло тае начы без малога трыццаць быкоў, сто тушаў ягнят і гэтулькі птушак, што ажно зьлічыць немагчыма. Былі выстаўлены бочкі зь півам і бражкай.

Герцаг баляваў у ратушы разам са сваім дваром ды грамадою тутэйшых паноў. Мы йзноў былі ў той самай залі, што і тры гады таму; ізноў месьцічы Арасу елі мала, тады як увесь двор абжорся бязь меры. Але Давід ужо ніякіх вымоваў нам не чыніў.

І сам здаваўся маркотным. Ня цешыла яго нават адсутнасьць Альбэра, гэтага заўзятага ворага, які нарэшце адышоў назаўжды.
Герцаг сядзеў паміж мною і Шастэлем.
Мае панове! Гэта сапраўды сьмешна... Колькі разоў я баляваў у такім таварыстве на генцкім двары! Бо я ж быў блізкім сябрам Давіда. Ён ня раз аддаваў мне сваіх кабет або пазычаў сокалаў. Што ж датычыць Шастэля, дык ён у гадох маёй маладосьці быў мне мэнтарам ды апекуном, і ўсім, што ёсьць у маёй натуры ад арла або быка, я абавязаны яму, падобна як усім, што ў маёй натуры ёсьць ад рыбы або вужакі, я абавязаны Альбэру. А тым ня менш падчас гэтае апошняе бяседы мы былі адзін аднаму зусім чужыя. У пэўны момант, п'ючы са мною, Давід сказаў: — Ведаю, Яне, што ты нешчасьлівы. Але й я нешчасьлівы таксама. Дый кожны з нас...
У яго былі вельмі стомленыя вочы, як у вала пасьля пашы. Увесь ягоны твар набыў мяккі выраз; у ім зьявілася нейкая жаноцкасьць, якая, аднак, здалася мне вельмі непрыемнай пры ягоным звычайна такім цьвёрдым і насьмешлівым абліччы. Шастэль, найстарэйшы з нас і, напэўна, найразумнейшы, паківаў галавою. Гэты выдатны жлукта ды гуляка, пра якога распавядалі па ўсёй Бургундыі на працягу дзесяцігодзьдзяў, выглядаў як спарахнелы пень ці, яшчэ горай, як прадзіраўлены пухір. У ім ужо нічога не засталося. Адны толькі мроі.
Перш чым я перайду да бяседы, мушу прыпомніць, што адбывалася ў месьце, калі герцаг прыехаў у Арас і загадаў адчыніць брамы. Я ведаю пра гэтыя падзеі з аповедаў розных асобаў, бо сам, як вы ўжо чулі, сядзеў тады пад ратушай і рыхтаваўся да сьмерці.
Дык вось, сярод ночы было данесена Альбэру, які знаходзіўся на малітве, што да муроў пад'ехаў пасланец біскупа утрэхцкага і патрабуе, каб адчынілі ўсе брамы. Альбэр як найхутчэй склікаў сваю Раду. Радныя прыбылі ў ратушу, выцягнутыя служкамі зь цёплага сну. Пётра дэ Муае распавядаў мне, што яны болей нагадвалі вяхоцьці саломы, чым жывых людзей. Іхныя твары былі напухлыя ад стомы ды ўнутранае напружанасьці, і вочы набрынялі крывёй, а ўсе чалёсы былі друзлыя ды пазбаўленыя сіл. Яны цяжка сядзелі на лавах і не казалі нічога. Альбэр, які тады ўжо дагасаў і быў гэтак страшна разьдзьмуты пухлінаю, прамовіў: — Давід прыяжджае ў

гасьціну і загадвае нам адчыніць брамы. Ягоныя пасланцы чакаюць ля Трынітэ. Ён сам знаходзіцца за гадзіну дарогі ад Арасу і шыбуе да нас хуткім маршам. Радзьце, што нам рабіць...
Яны далей маўчалі, а Альбэр дадаў спакойна:
— Мы ня можам бараніцца ад герцага, бо гэта быў бы найцяжэйшы грэх. І яшчэ тое вам скажу, што мы б ня вытрымалі аблогі.
Калі дэ Муае ня схлусіў і было так, як ён мне распавёў, дык трэба схіліць галаву перад Радай. Ніхто ня кляў і ня плакаў. Сярод іх панаваў супакой. Моўчкі аглядаліся яны адзін на аднаго. — Цяперака прыйдзецца нам памерці! – сказаў з развагай калесьнік Тамаш. Суконьнік Іванэ паківаў моўчкі галавой. Яны былі бледныя і нібы на хвіліну зьнерухомелі. Можа, чакалі цуду? Але нічога ня здарылася.
Мне шкада, што іх тады ніхто ня бачыў. Пётра дэ Муае апавёў пра ўсё ў такіх вось словах: «Было чуваць, як унізе таўчэцца радны возны пры куратніках. На дзядзінцы нейкая птушка кудахнула, і зноў настала ціша. Відаць, возны схапіў куру і зноў увапхнуў яе сярод іншых. Кульгавы Тамаш сказаў: — Рада, рыхтуй галаву пад меч!
А ўсе іншыя маўчалі. Тады Альбэр прамовіў: — Памолімся аб зьмілаваньні Божым.
А Тамаш на тое вельмі спакойна:
— Пане Альбэру. Няма такога Бога, які б нам дараваў...
Таму йзноў загаварыў вялебны айцец: — Бог заўсёды адзін і той самы.
А Іванэ на тое кажа: — Супакойся ўжо са сваімі павучаньнямі, ойча. Яны нас болей ня цешаць. – Але казаў ён гэта вельмі спакойна, бяз жалю.
Мінаў час. Яны сядзелі ў маўчаньні, рыхтуючыся да сьмерці. Цяжка паверыць, што так шмат было ў іх годнасьці. Ды прыманьня лёсу. Раптоўна нейкі гоман даляцеў з дворыка, і ў палату ўвайшоў радны возны. — Спавяшчаюць ад брамы Трынітэ, што герцаг ужо пад'яжджае. Ня ведаюць, што рабіць. Тады Альбэр падняў вочы на кожнага па чарзе і сказаў: — Вырашайце, месьцічы, бо ўжо час!
Першы падняўся з лавы Тамаш. Усе глядзелі на яго, хоць кожны ведаў, што пачуе. Тамаш дакрануўся даланёю да горла, прыплюшчыў вочы ды кажа: — Трэба адчыніць брамы герцагу!

За ім узяў слова Іванэ: — Адчыніць брамы, – кажа. – І пойдзем паклонімся герцагу, як належыць...
Іншыя казалі тое самае. Калі чарга дайшла да мяне, я ня мог гуку выціснуць з горла, дык толькі кіўнуў галавою, але Тамаш сказаў ціха і зь вялікім спакоем: — Пане дэ Муае, рушай жа языком, так, як іншыя. Ты заўсёды быў вялікім маўчуном, дык пагражае табе – дай Божа – толькі бізун ды выгнаньне, а нічога болей. Таму скажы гучна!
Я зноў кіўнуў і сказаў, што трэба адчыніць брамы. Тады возны выбег з палаты, а мы ўсе, з Альбэрам на чале, пайшлі за ім. Места спала мёртвым сном, ня знаючы сваёго лёсу. Я падтрымліваў Альбэра пад локаць з правага боку, а бандар Норт – зь левага. Айцец ледзьве перастаўляў ногі, такі быў слабы й цяжкі ад водаў, які аж хлюпалі ў ім. Мы йшлі ў маўчаньні, і кожны думаў пра тое ж. Але я ня бачыў, каб хтосьці маліўся.
Ля брамы сабралася колькі вартавых, усе былі спалоханыя. З-за муроў чуцён быў рух шматлікіх узброеных людзей, пырханьне коней ды нецярплівыя выгукі. Я ўзышоў на вежу, глянуў уніз – і ў мяне ажно ў галаве закруцілася. Куды ні кінь вокам – уздоўж муроў палымнеюць паходні, а ў іх сьвятле відаць незьлічоная колькасьць рыцарства ў ваенных дасьпехах. Там, дзе зьзяла найболей паходняў, убачыў я герцага Давіда на гнядым скакуне. Герцаг быў без дасьпехаў, толькі ў плашчы ды з капелюшом на галаве. Калі я спусьціўся ўніз, браму Трынітэ ўжо адчынілі. Рада моўчкі стаяла ў сьвятле аднае паходні. Мы прыслухоўваліся да бразгаценьня жалеза, калі варта расчыняла першыя вароты. Пасьля раздалося працяглае рыпеньне ланцугоў на калаўроце і мост паволі стаў апускацца. Тады я зірнуў на суконьніка Іванэ, які стаяў найбліжэй, і пабачыў сьлёзы, што цяклі ў яго па твары. Але не дачуўся ніводнага енку. Мяне ахапіла трывога, і я сабраўся ўпасьці на калені, але ўсё ж стаяў нерухома, бо й іншыя стаялі. З таго боку распачаўся рух, коні прысядалі на задох, гучна пырхалі. Гэта людзі герцага стваралі яму зручны праход. Ён першы ўзьехаў на мост. Па бакох ягонага скакуна ішлі служкі з паходнямі. Конскія капыты глуха грукаталі па мосьце. За герцагам рушыла ягоная дружына, але было яе так шмат, што частка засталася з таго боку. Герцаг супыніў каня і сышоў на зямлю. Ніхто з Рады ня ўкленчыў, мы толькі схілілі галовы ў паклоне. Я зноў

падтрымліваў Альбэра пад локаць, бо без дапамогі ён не трымаўся на нагах. — Чаму Рада мяне не вітае? – сказаў ціха герцаг. – Я прыехаў уначы і, пэўна, ня ў час, але я вельмі здарожыўся і не зьбіраюся доўга чакаць павітаньня...
Тады выступіў з нашае грамады Тамаш, пакланіўся яшчэ ніжэй і сказаў выразна: — Места Арас вітае цябе, Вашая Дастойнасьць, пане герцагу, і аддае сябе пад тваю апеку!
Тады Давід падышоў на адзін крок і кажа: — Хто ты такі?
— Я калесьнік Тамаш, званы Кульгавым з прычыны мае кульгі. Я належу да Рады добрага места Арас.
На тое герцаг:
— Дай табе Бог здароўя, Тамашу! – і зноў сеў на каня, а ўжо сеўшы, гукнуў больш бадзёрым голасам: – Адвядзіце мяне туды, дзе я магу адпачыць!
І мы праводзілі яго ў ратушу, паўз два спаленыя дамы ды зрабаваную сядзібу пана дэ Ўеля. Калі ён там праяжджаў, дык спытаўся:
— Ці пан дэ Ўель жывы?
На што Тамаш, які вёў ягонага каня за аброць, адказаў мужна:
— Пан дэ Ўель не жыве, бо паў ахвяраю вялікае злосьці ў Арасе.
Герцаг кіўнуў галавою і пасмутнеў. І болей ужо ні пра што не пытаўся...
Вось што мне распавёў Пётра дэ Муае, які ўдзельнічаў у Радзе тае ночы.
У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амэн. Панове!
Паспрабуйце сабе ўявіць думкі гэтых людзей, калі яны чакалі ля брамы Трынітэ, а потым праводзілі герцага ў ратушу. Несумненна, як толькі надышла вестка пра прыезд Давіда, зразумелі яны, што ўжо нічога іх не ўратуе. А значыцца, узялі на сябе ўсё гэтае д'яблаваньне.
Калі чалавек робіць ліхое або добрае, ім можа кіраваць ласка Божая альбо спакусы д'ябальскія. Але ў тую часіну, калі даводзіцца яму плаціць за свае ўчынкі, застаецца ён сам-насам з сабою, пакінуты небам і пеклам. Гэтак жа й Рада Арасу ішла ад брамы Трынітэ да ратушы, несучы на сваіх плячох усе зьдзейсьненыя злачынствы. І ніхто не збаяўся, ніхто не вымольваў зьлітаваньня, ніхто не адпіраўся ад зробленага. А маглі ж, маглі ж! Калі яны ў тыя лютыя дні спасылаліся на сваю веру, дык безь ніякага прыніжэньня маглі б гэта зрабіць і

перад абліччам герцага. Аднак яны не зрабілі гэтага. Відаць, яны страцілі ўсялякую веру і зразумелі перад сьмерцю, што Госпад Бог разам з д'яблам сумесна зь іх насьмяяліся, аддаючы на зьдзек сьвету. Столькі дзён і начэй трымалі яны ў сваіх руках шчыт Божага Промыслу, упэўненыя, што ён іх ад усяго абароніць. Але калі гэты шчыт аказаўся простай ільняной анучай, набрынялай нявіннай крывёю, яны адкінулі яго прэч, каб самотна супернічаць з далейшаю экзыстэнцыяй.
І што з таго, што былі яны вінаватыя, калі былі яны вінаватымі настолькі роспачна і адзінока? Яны не маглі спазнаць большага пакараньня, чым усё гэтае ашуканства ўяўных прызначэньняў, якім яны кіраваліся ў добрай веры. Ля брамы Трынітэ стаялі яны аголеныя і да такое ступені зраненыя, што ня мелі ўжо жаданьня вызнаць у пакоры свае грахі. Я нават думаю, што яны ня чуліся вінаватымі ў тым сэнсе, якога мог бы дамысьлівацца чалавек чужы. Бо яны адчувалі віну не за свае чыны, а хутчэй за тую добрую веру, якой кіраваліся. Калі яны гаварылі са сваім сэрцам, дык не пыталіся: «Чаму я забіваў нявінных?», а, напэўна: «Чаму я верыў, што трэба забіваць у Арасе іншых людзей?» І для іх ужо не было важна, ці той няшчасны Цэлюс сапраўды кінуў праклён на дом Дамаскіна, – але толькі тое, ці трэба было гэтак жорстка абыходзіцца з Цэлюсам...
О панове! Гэтыя людзі з Рады ніколі не былі такімі мужнымі ды прыгожымі, як менавіта ў тую ноч, калі была адчынена брама Трынітэ і Давід уехаў у муры Арасу. Хоць тады яны яшчэ зусім не разумелі, якая кара іх напаткала.
Яны чакалі яе доўга, да зьнясіленьня змагаючыся з сабою. Давід прыехаў у места і ўжо назаўтра зраньня папярэдзіў, што ў найбліжэйшую нядзелю будзе адпраўлена ўрачыстая сьвятая імша, а разам зь ёй – адпушчэньне грахоў. Таму Арас рыхтаваўся да гэтае ўрачыстасьці, а сябры Рады разумелі, што прыйдзецца ім пазьней адказваць на біскупавым судзе. Пакуль што яны хадзілі вольна, а праўду кажучы, іх нідзе відно не было. Яны пахаваліся па сваіх сялібах, замкнулі наглуха дзьверы, і кожны быў вельмі самотны.
Але ў першую нядзелю ўрачыстасьці не адбылося, бо напярэдадні вялебны Альбэр аддаў Богу душу. Як ён паміраў, я ўжо вам распавёў.
Такім чынам, гэты дзень, хаця і меўся быць радасным, стаўся жалобным. Давід загадаў учыніць вельмі пышнае пахаваньне. І

што вы, панове, скажаце на тое, што разьвітацца з Альбэрам прыйшлі незьлічоныя гурмы народу. «Вось адышоў пан, які памыляўся, але верыў», – казалі людзі. Пахавалі вялебнага айца ў Найсьвяцейшай Тройцы, у нішы непадалёк вялікага алтару. Ягонае цела зрабілася вялізным і, хоць надышлі вельмі халодныя дні (да тае ступені, што ўначы трымаўся лёгкі мароз, а намаразь пакрывала дахі касьцёлаў), усё ж вельмі смуродзіла і адпадала кавалкамі. Брыдкая вадкасьць тачылася з усіх чалёсаў Альбэра. Некаторыя людзі казалі, што гэта д'ябал шукае сабе выйсьця, але ніхто таго ня слухаў. «Пан Альбэр, – пагаворвалі месьцічы, – быў вельмі няшчасны чалавек, бо занадта моцна верыў...» Так што хавалі яго з пашанай. Не было там любові, ані засмучэньня, але менавіта пашана і нейкае вялікае засяроджаньне ўсяго места Арасу, якога чужыя людзі ніколі не зразумеюць.

Цела Альбэра замуравалі ў нішы пры алтары. Зрабіць гэтую працу прыйшлі людзі, якіх у месьце не любілі і якія жылі за мурамі, здалёк ад іншых. Кудлатыя, з даўгімі бародамі, у льняных кашулях ды басанож. Але гэтага разу йначай, як у іншых выпадках: ніхто іх не пазьбягаў ды не жагнаўся сьвятым крыжам, калі яны праходзілі блізка. Некаторыя месьцічы нат давалі грошы тым муляром, кажучы: «Муруйце як належыць, бо гэта быў бедны і вельмі нешчасьлівы пан, дык хай ён спачывае ўтульна». Калі яны замуроўвалі нішу, білі званы, а натоўп у маўчаньні прамаўляў сам сабе пацеры.

Таму толькі другое нядзелі адправіў Давід вялікую імшу ды агалосіў скасаваньне працэсаў; а надвячоркам была зладжаная бяседа. І менавіта тады ён піў са мною ды казаў, што ніхто не зьяўляецца шчасьлівым. Я разумеў, да чаго ён вядзе. Ён меўся да поўначы правесьці суд над сябрамі Рады. Ім было загадана прыбыць на ратушны дзядзінец, аднак усе прыйшлі вольна, без аніякае варты.

Урэшце герцаг падняўся і сказаў, каб мы разам зь ім выйшлі на галерэю, бо ён будзе прамаўляць да Рады места Арасу. Мы выйшлі. Ноч была халодная, уся расьсьветленая паланьнем паходняў. Ад рынку даносіўся прыглушаны гоман прасталюдзьдзя, якому было загадана есьці, піць ды весяліцца. У дворыку стаялі людзі з Рады. Быў там Пётра дэ Муае, Кульгавы Тамаш, суконьнік Іванэ і яшчэ пяцёра іншых, бо тыя толькі засталіся жывыя. Я іх выразна бачыў у сьвятле лучынаў,

што паліліся вакол дворыка на сукаватых палях.
Давід пазіраў на іх доўга. Позірк у яго быў важкі, і я чуў ягонае дыханьне, такое плыткае, нібы на грудзёх у яго ляжаў вялізны камень. Шастэль, які стаяў побач, шапнуў мне: «Благая ноч, Яне!» Ды я гэта ведаў і безь яго.
Час доўжыўся, раўнамерна сьцякаючы пры ўсеагульным маўчаньні. Там, дзе сядзелі бяседнікі, настала ціша, бо людзі, якія сабраліся пры сталох, хацелі пачуць, што герцаг скажа Радзе. Паветра поўнілася адно стрымліваным дыханьнем шматлікіх людзей. Браўся лёгкі мароз, і мы былі ахутаныя празрыстай смугою, а наверсе вежы я заўважыў побліск шэрані.
Аж урэшце біскуп утрэхцкі сказаў:
— Колькі ж цярпеньняў могуць зьмясьціць муры гэтага места і колькі – сэрцы яго месьцічаў?! Я ня ведаю, бо я – не адзін з вас. Я толькі чую вялікі жаль з прычыны няшчасьцяў, якія напаткалі маё места Арас. Але я тое ведаю, што гэтыя няшчасьці паходзяць болей з глупства, чым ад злога сэрца. Тутака знаходзяцца дурныя ды найдурнейшыя. Вы, што засядалі ў Радзе, належыце да тых апошніх. Бо ня здолелі даверыцца развазе і стапталі розум чалавека. Але Бог бачыць, што такое не ўпершыню дзеецца ў сьвеце. Дый не ў апошні раз... Таму я толькі тое вам скажу! Сыдзіце з гэтага места назаўсёды, забраўшы сваіх жанок, быдла і майно. І няхай вядзе вас Бог па дарогах разважлівасьці. Бо зноў кажу тое, што казаў апоўдні: што здарылася – не здаралася, а што было – не было! Верце ў сябе, грашыце ў меру і маліцеся аб збаўленьні душ вашых!
І зрабіў над усёй Радай знак сьвятога крыжа, а пасьля стомленаю хадою вярнуўся ў залю. Тыя ж засталіся на панадворку, застылыя, нібы ў іх ударыў пярун.
Я доўга глядзеў на іх, схаваўшыся ў цені. Яны ня кленчылі ды ня дзякавалі Богу за гэтае надзвычайнае збаўленьне. Разыходзіліся ў поўным маўчаньні, кожны паасобку, нібы ўсе думкі ды ўчынкі, якія яны сумесна зьдзяйсьнялі, цяпер іх разьдзялялі. І кожны пайшоў у свой бок. А я вярнуўся за стол. І менавіта тады выбухнуў ува мне такі неапісальны жаль, такая страшэнная горыч ды заняпад духу, што мне хацелася крычаць і выць з роспачы за гэтае места, за сябе, за ўвесь сьвет, урэшце... Я цяжка сеў побач з герцагам і ўтаропіўся ў сьцяну... Шастэль мне нешта казаў, але я яго ня чуў. Толькі калі герцаг узяў мяне за руку, я ціха прашаптаў:

— Вашая Дастойнасьць! Гэта ўсё так страшна...
— Маеш рацыю, Яне, – кажа біскуп, – але трэба пагаджацца зь лёсам, які нам дадзены, у кожным выпадку. Я зрабіў Радзе ласкавасьць...
— І менавіта гэта страшней за ўсё! – перабіў я яго запальчыва, чаго ў адносінах да такога вялікага пана ніколі не чыніў. — Страшней за ўсё? – зьдзіўлена перапытаўся Давід. – Табе ў галаве нешта памяшалася... Кажу табе, што страшнай ёсьць толькі сьмерць чалавека, дый тое не свая, а іншага. Ты ведаеш, як я бавіў час у тыя апошнія тыдні, калі ты гарбеў у Арасе пры боку Альбэра? Дык я табе скажу. Паклікалі мяне да ложа кавалера Сэн-Амэр, пляменьніка майго. Ён быў амаль дзіця. Паміраў доўга й пакутліва. У душных палатах, пад малітву мніха, які пры ім сядзеў удзень і ўначы. «Пане герцагу, – казаў мне гэты хлапец з тварам нявінным і прагным жыцьця, – я не хачу паміраць. Скажы Богу, хай Ён мне падаруе яшчэ нейкі час, а я буду жыць узорна і дам пяць дукатаў на капліцу». Што я мог яму адказаць? Што Бог такіх просьбаў ня слухае? Я пайшоў з палаты хворага ў касьцёл. Укленчыў і зьвяртаюся да Ўкрыжаванага, каб выказаў крыху літасьці. А Ён глядзіць на мяне і маўчыць. Як заўсёды! Я ж вельмі любіў гэтага хлопца. Ён мне быў бліжэйшы за іншых, дзякуючы сваёй ветласьці, даверу і пакоры. Бедны Сэн-Амэр памёр, і мы пахавалі яго ў Генце, як належыць. Я тады плакаў. Калі ты думаеш, што я маліўся, дык памыляешся. Бог маіх малітваў ужо даўно ня слухае, і я таксама не хачу часу марнаваць. Мы абодва з Госпадам Богам знаходзімся ў вялікай нязгодзе, бо я сумняваюся ў Ім, а Ён сумняваецца ўва мне. І неяк сабе даем рады без гарачае любові. Тады, калі паміраў Сэн-Амэр, я ўжо не ўпершыню думаў, што марная ўся гэтая мітусьня, марныя маленьні, вера, просьбы ды блюзьнерствы. Прыходзіць пэўная гадзіна – і ты мусіш адысьці прэч! Ні для кога не было, няма й ня будзе літасьці. Мала што мы самі сыходзім, дык яшчэ Бог змушае нас расставацца з тымі, каго мы любім! Як падумаеш пра гэткую жорсткасьць, дык валасы паўстаюць дыбарам. Сьпярша ён дае нам жыцьцё, а пасьля рабуе. Сьпярша ўводзіць нас у спакусу, а пасьля кідае ў найцямнейшую роспач. Да чаго чалавек ні дакранецца – усё паміраe. Таму я і не дзіўлюся, што ён мусіць шукаць суцяшэньня. Адзін раз – тут, другі – там, і абы толькі ў нешта верыць, абы адагнаць ад сябе сьмерць, абы яе перахітрыць. Калі

нам блага, дык мы кажам, што такі вырак неба. Калі чынім ліха, кажам, што гэта Бог нам загадвае менавіта такім чынам змагацца за збаўленьне. Мы ня любім заставацца сам-насам; нам заўсёды патрэбна нешта па-за намі – нейкая нянашая сіла, якая паглыне сэрца, зьняволіць яго, аблытае, падушыць у мязгу, як падкаваны абцас трушчыць зерне. І тады здаецца нам, што мы ўратаваліся ад сьмерці, што мы ўжо вольныя і можам надалей жыць бяз страху. Але няпраўда ўсё гэта, мілы Яне, бо надыходзіць дзень – той найлюцейшы і адзіна важны, – калі трэба адысьці прэч! Тады ўсё перамяняецца ў купу гною, бо ўжо нішто ня можа супыніць кастлявіцу, калі яна пагрукала ў нашыя дзьверы. І няма ўжо побач з намі ані Бога, ані д'ябла, ані нічога па-за намі – толькі мы самі, высмактаныя страхам няшчасныя шкарупкі, пацукі, мухі ці ўвогуле істоткі такія малыя, што вокам іх убачыць немагчыма. Калі памёр малады Сэн-Амэр, я запытаў сябе: дзе ж цяперака зьзяюць зоры гэтага дзіця? Ну так, яны згасьлі назаўсёды. У яго былі іншыя зоры, чым у мяне, хоць і тыя самыя. Ягонае сонца ўжо не сьвяціла, ягоныя вятрыскі ўжо ня веялі па сьвеце, ягоны дождж ужо не спадаў на палеткі, а ягоныя дрэвы ўжо не шумелі. Усё зьнікла разам з Богам, у якога ён верыў, якога любіў і баяўся. А я застаўся з маім сонцам, ветрам, дажджом ды дрэвамі. Што ж да Бога, дык Ён ужо не йснаваў. Калі я мушу пайсьці ў цямрэчу, дык хай Ён ідзе папарадзе мяне і там чакае. Можа, дачакаецца. Навошта ж мне атручвацца чаканьнем і навошта безупынна разьвітвацца з усім, што памірае на маіх вачох... Радзе мроілася, што калі яна паверыць як мага гарачэй у Бога ды павучаньні вялебнага айца Альбэра пра вечнае збаўленьне, дык у гэтых мурох паселяцца супакой і вольнасьць. О, мілы Яне, чаму ім так сьпяшылася з радасьцю ды шчасьцем? Ці ж ня лепей было сядзець спакойна на бяседах, паляваць з сокаламі ды ўслухоўвацца, як халодная абыякавасьць да гэтага сьвету пракрадаецца ў душы? Не прывітаўшы дня, ня мусіш зь ім разьвітвацца. Ня ўзрадаваўшыся ўзыходу сонца, ня мусіш смуткаваць, што яно зайшло. Калі ты не кахаеш, ты вольны ад роспачы. А калі ня прагнеш збаўленьня, дык цябе ня страшыць пекла. Лепшы сьвет, Яне?! Нат калі ён і дасягальны, дык толькі ў нас саміх, а не па-за намі. Тыя людзі з Рады моцна памыліліся. Але я ня буду ім судзьдзём. Надта вялікую адчуваю стому, каб караць чужыя грахі. Болей за тое, калі яны так

моцна прагнуць, дык няхай насыцяцца. Гэта ня мой воз цягнулі яны па бездарожжы. Калі я сам шукаю для сябе належнае свабоды, дык і ім ня буду адмаўляць у праве выбару. Хай кожны йдзе ўласнай сьцяжынкай. Не для мяне сьцежкі дурняў, але й выпросташ іх я не зьбіраюся, бо нічога з гэтага ня будзе. Няхай цьвярозыя застануцца са сваёй цьвярозасьцю, а шалёныя – са сваім шаленствам.

Так казаў Давід, а я слухаў з усё большаю роспаччу ды злосьцю. А калі ён скончыў, я выгукнуў: — Пане герцагу! Трэба, аднак, прызнаць, што ў іхным шаленстве была й нейкая сьвятасьць!

Тады ён выбухнуў сьмехам. І сьмяяўся так доўга ды гучна, што іншыя за сталамі папаварочвалі галовы і спазіралі на нас уважліва.

— Ня сьмейся, Вашая Дастойнасьць, бо гэтым ты абражаеш памяць усіх тых, што аддалі жыцьцё... – прамовіў я зь неапісальнай напышлівасьцю.

Ён на тое, ужо зусім вясёлым тонам: — Я выбачаю табе, мілы Яне, бо ты, пэўна, упіўся...

— Я ня п'яны, пане, – кажу зноў, – але я ведаю, што ганебныя твае прысуды, якія скасавалі працэс у Арасе. Гэта нядобра казаць, як ты сказаў: што сталася – ня сталася, а што было – не было. Ты, Вашая Дастойнасьць, мяркуеш, што дастаткова ўчыніць знак рукою – і павысыхаюць сьлёзы, зьнікнуць плямы крыві, а сумленьні зноў зробяцца белыя, як сьнег. Але гэта няпраўда! Усе мы тутака, у Арасе, пакрытыя шэрасьцю граху і хутчэй нагадваем лён, чым сьнег, альбо хутчэй чарназём, чым лёд. Але якраз гэта й добра, бо зь зямлі можа вырасьці зерне, тады як ад лёду б'е толькі холадам. І можна апрануцца ў кашулю зь лёну, але немагчыма сагрэць аголеных чалёсаў накрыўкай са сьнегу. Табе здаецца, пане герцагу, што ты вельмі добры й памяркоўны, але ж гэта ня так! Бо брак міласэрнасьці забівае, але й яе празьмернасьць – таксама! Што ж ты зрабіў з Радай? Ты загадаў ім пакінуць места – не папракаючы іх і не караючы нікога, быццам тутака напраўду нічога ня здарылася. Але ж гэта ня так! І хаця ты вельмі шчыра жадаеш, каб таго, што было, – не было, але ж на самай справе ўсё зусім іначай. Ты, Вашая Дастойнасьць, можаш махнуць рукою на ўсё, бо ты – чужы! А мы?! Значыцца, увесь гэты брыдкі грэх павінен перамяніцца ў нішто? А ўся гэтая жудасьць стаць небыліцай?! Значыцца, дзеля таго места Арас патанула ў смуродным гноі

сваіх злачынстваў ды грахоў, каб пасьля высьветлілася, што яно ані на крок не пасунулася наперад?! Ці ж дзеля таго мы запальвалі вогнішчы, мучылі жыдоў і просты люд, шляхту і сьвятароў, каб пачуць ад цябе, што ўсё гэта няпраўда, лухта; што гэта толькі мроі нашых бедных органаў пачуцьцяў? Ты кажаш, што няма збаўленьня і лепшага быцьця для Арасу дый для ўсяго сьвету? Дык навошта ж тады сын выдаваў бацьку мескім служкам, навошта паліліся жыдоўскія гасподы, навошта мы разьдзіралі на кавалкі целы тых, каго лічылі гератыкамі?! Каб узвысіцца, мы апусьціліся на самае дно, а ты цяпер, пане герцагу, кажаш нам, што гэта – марная праца! Так ня можа быць на сьвеце, створаным Богам. А нават як ня Богам, дык д'яблам. А нават як ня д'яблам, дык намі самімі! Май жа літасьць, Вашая Дастойнасьць, да гэтага няшчаснага места, якое прагна шукала сваёй дарогі, і не кажы яму, што адзіная дарога, якая засталася чалавеку, вядзе на паляваньне з сокаламі або ў бяседную залю... Бо так быць ня можа. Тады б увесь сьвет заняпаў, зоры б згасьлі, дрэвы б пассыхалі. Так быць ня можа, ня можа, ня можа...

У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амэн. Я плакаў тады, як ніколі ў сваім жыцьці. Сьлёзы цяклі з маіх вачэй ад неапісальнага жалю. А разам са мною плакалі прысутныя на бяседзе месьцічы Арасу. Герцагскі ж двор маўчаў, вельмі засмучаны і ўражаны. Усе чакалі, што скажа біскуп утрэхцкі, пра якога ведалі, што ён мой сябра. Але я моцна яго абразіў – так, як ніхто ў Генце ніколі б не насьмеліўся, – а таму людзі меркавалі, што мяне напаткае суворая кара. Прызнаюся, панове, я й сам так думаў.

Давід глядзеў на мяне зь дзіўным выразам на твары – адначасова чула й з насьмешкай.

— Яне, мілы дружа! – кажа ён урэшце. – Мне цябе шкада. А самае горшае тое, што сказанае мной сёньня ты і сам зразумееш зь цягам гадоў. Усё тваё жыцьцё было вельмі разважнае і пазбаўленае ўсялякіх спакусаў шукаць мроі па-за ўласнай асобай. Але ў апошні час ты вельмі шмат перажыў; ты быў блізкі страшнае сьмерці і разважаў пра свой лёс зь незнаёмай табе раней тугою... – ён на момант перапыніўся і засьмяяўся не без іроніі. – А што мне здаецца найболей забаўным у тваіх словах, я скажу табе на вуха.

І, нахіліўшыся да мяне, прашаптаў, так моцна душачыся

сьмехам, што я мусіў добра напружыць слых, каб яго зразумець.— Яне, – сказаў ён. – Ты поскудзь! Я дасканала ведаю, што ты думаеш, як я, і адчуваеш, як я! І заўсёды так будзе, але што ты ў сабе сёньня разграшаеш, тое ўва мне асуджаеш! Бо ад валадароў гэтага сьвету ты патрабуеш вялікае веры ды ўзьнёсласьці сэрцаў, у той час як такім, як сам, дазваляеш кпіць з усяго...— Гэта няпраўда, пане герцагу! – сказаў я ціха, але ўжо сьлёзы павысыхалі ў маіх вачох. – Ты абражаеш мяне гэткім падазрэньнем...— Я ведаю цябе, гультая, – адказаў ён, усё яшчэ схілены да майго вуха. – Ты хацеў бы зваліць герцагам на плечы ўсе цяжары чалавецтва, каб самому магчы пасьвіставаць свабодна. Ты кажаш, што дзеля таго ўладар і зьяўляецца ўладаром, каб нас усіх збавіць і ўчыніць лепшымі. Ты ж сам засядаў у Радзе, дык ведаеш, чаго ад уладароў можна чакаць! Ты патрабуеш ад іх ня толькі сьвятога пераканаьня, але таксама й гарачых сэрцаў – тады як сам прагнеш заставацца халодным. Але ж і прайдзісьвет зь цябе, мілы Яне! Будзь маім блазнам у Генце!
Тады я ўстаў ад стала, хоць ніхто ніколі не насьмельваўся чыніць такога пры Давіду безь ягонага дазволу. А ўстаўшы, сказаў:— Не выпадае мне слухаць такія словы з вуснаў Вашае Дастойнасьці. Паколькі ты асуджаеш Арас на пакуту поўнае пусткі, дык дазволь жа мне адсюль сысьці гэтак, як Рада сышла. На што Давід крыкнуў:— А йдзі ж ты да ка́та, ты мяне нудзіш... Тады я выйшаў зь бяседнае залі й пайшоў дадому. Рэшту ночы я рыхтаваўся ў дарогу, і сьвітанак засьпеў мяне пры дарожных вазох, на якія слугі грузілі ўвесь мой здабытак. З узыходам сонца на парозе майго дому зьявіўся стары Шастэль.— Мяне прыслаў Давід, – паведаміў ён, – каб сказаць табе, што біскуп прабачае табе ўсё, што здарылася на бяседзе. Калі хочаш – дык заставайся ў Арасе, а калі маеш жаданьне пасяліцца ў Генце або Утрэхце, заўсёды будзеш вітаны як стары сябра.
На гэта я адказаў:— Наймілейшы сябра. Перадай біскупу, што я яго вельмі шаную й люблю, але ўсё ж вырашыў назаўсёды адысьці з бургундзкіх местаў. Дальбог, я сам ня ведаю, чаму я так раблю, але што ўчыню так – дык тое напэўна...
Тады Шастэль абняў мяне і разьвітаўся, а сыходзячы, даў пярсьцёнак ад Давіда і сказаў:
— Гэта табе пасылае герцаг на выпадак, калі ты вырашыш адысьці назаўсёды. І яшчэ загадаў сказаць, што калі ты

адыдзеш – дык ты яшчэ ня страчаны для самога сябе!
З гэтымі словамі ён выйшаў. Я ж вярнуўся на двор назіраць за вазамі.
Я выехаў з Арасу брамаю сьвятога Эгідыя, той самай, якою ўпершыню ў жыцьці ўвайшоў у места. Дзень быў амаль марозны, з конскіх храпаў вырываліся клубы пары. Рыпелі вазы, а ў паветры далёка разносіліся пакрыкваньні возьнікаў. У Арасе я пакінуў вернага слугу, каб ён скончыў мае справы. Калі ён пытаўся, куды я еду, я ня мог адказаць.
Выехаўшы па-за муры, я сышоў з каня і нізка пакланіўся месту Арас.
Мае панове! Гэтае места не было мудрым або добрым. Але, безумоўна, мела на тое права дзеля сваіх няшчасьцяў. Быў яму спасланы цяжкі лёс, і таму яно грашыла... Мудрасьць ніколі ня йдзе ў пары з засмучанасьцю.
Так я ад'ехаў з Арасу, абіраючы такі кірунак, які мне лёс пакажа. Я вырашыў, што пайду ў той бок, куды дзьме вецер. Але зноўку сьвет выкінуў са мною штуку, бо, калі я збочыў на поўдзень, вецер раптоўна зьмяніў кірунак і пачаў дзьмуць мне ў твар. Таму я загадаў разьвярнуць вазы на поўнач. А калі возьнікі тое ўчынілі, я сказаў сам сабе: «Дурніца! Ня будзь цацкаю супраціўных вятроў...» Тады я й вырашыў ехаць у Бруге, якое ёсьць разважлівым местам і не залежыць ні ад кога. Ізноў стрэлілі возьнікі пугамі, а коні пацягнулі вазы ў бароздах сьцьвярдзелае ад холаду зямлі. Я ехаў на скакуне добрае крыві ды пазіраў на муры Арасу, якія зьнікалі ўдалечыні. Мне было дзіўна, што я адыходжу менавіта цяпер. Чаму я не пайшоў з Арасу прэч, калі судзілі Цэлюса, а йду сёньня? – пытаўся я ў сябе, крыху смутны. Чаму я не бунтаваўся супраць Альбэра зь ягонаю Радай, ахопленай вар'яцтвам, але бунтую сёньня супраць герцага, разважлівасьць якога шанаваў усё жыцьцё?
Я даў астрогай каню, і ён адразу ж памкнуў навыскач, выбіваючы капытамі грудкі замерзлае зямлі. Вецер біў мяне ў твар. Я чуў за сабою крыкі возьнікаў, якія намагаліся пасьпець за мною. Але я звольніў аброць, бо мне хацелася, каб конь нёс мяне яшчэ хутчэй – толькі б далей ад места.
У імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа. Амэн. Я ўжо ведаў, панове, што раблю. Кожнага калі-нікалі спатыкае патрэба вялікага бунту. Рэч у тым, каб чалавек выбраў адпаведную часіну. Калі б я сышоў з Арасу падчас вар'яваньня, я б уратаваў толькі сваю

развагу, якой, зрэшты, у мяне ніколі не бракавала. А адыходзячы пасьля ўсяго, я ацаліў шчопаць веры. Гэта няшмат, але дастаткова, каб яшчэ пажыць на гэтым найлепшым з усіх сьвеце.

Кажучы гэта, маю я наўвеце слаўнае места Бруге ды ўсіх тутэйшых месьцічаў.

Варшава, верасень 1968 – лістапад 1970

З польскай пераклаў Лаўрэн Юрага паводле:

Andrzej Szczypiorski. Msza za miasto Arras. Poznań: SAWW, 1989.

Нататкі на палёх раману (Паслоўе перакладніка)

[image]

[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2005/1/17**

[image]

Сяргей Балахонаў Entlarvung адзінокага ў пустэльні

Я адчыніў акно, дзень асьвятліў мне шчокі.
Я вызьверваўся, я сядзеў ды плакаў.

«Гільгамэш»

Якая ціша тут! Застыла ўсё нібыта.
Ні мітусьні бязглуздай, ні фальшывых крыкаў.
Але дзеля чаго ты, брат, мяне паклікаў?

Францішка Ўршуля Радзівіл. «Гульня фартуны»

Стралялі ў Маскве, як і зазвычай, з мосту.

Віктар Пялевін. «Пакаленьне П»
У 2001 годзе
гарадзенец

Даніла Жукоўскі шэрагам сваіх артыкулаў[1] вызначыў вузел, а лепей – цэлы комплекс вузлоў, у якія зьвязаліся размаітыя праблемы сучаснага беларускага літаратурнага жыцьця. Чынілася гэта з добрым спадзевам на тое, што шырокае кола пісьменьнікаў, крытыкаў і проста зацікаўленых асобаў далучацца да дыскусіі. Яна, на задуму шаноўнага спадара Данілы, мусіла ўтварыць на

нашай
культурнай
прасторы
своеасаблівы
эфэкт рэха,
які ўжо
самсобку
спрычыніўся
б да таго,
што пра
беларускую
літаратуру
(кепская яна
ці добрая) у
Беларусі
сталі б
гаварыць
ледзьве не
на кожным
кроку. А ад
перагукваньня
носьбітаў
розных
меркаваньняў
чакалася
здабыць
больш яснае
разуменьне
далейшых
магістральных
шляхоў
разьвіцьця
беларускае
літаратуры.

Як надзіва, амаль ніхто, акром вашага пакорлівага слугі, гэтага выкліку не прыняў. Перабягаючы з «Нашай Нівы» ў «ARCHE», наша з Данілам спрэчка пра родны постмадэрнізм (а гэтая праблема мяне закранула найбольш) зацягнулася на колькі год. І нават мой водгук на артыкул «Штурханьне ў бок»

Аляксея Бацюкова, які паспрабаваў-такі падлучыцца да нашага двубою, быў больш скіраваны да ўсё таго ж пачэсьлівага крытыка з Горадні. Наколькі правакацыйнымі былі артыкулы маіх паважаных апанэнтаў, нагэтулькі правакацыйным даводзілася быць і мне асабіста. Мушу прызнацца, што ў пераліку дасягненьняў нашага постмадэрнізму сям-там даводзілася выпісваць некаторым літаратарам «аванс» у чаканьні ад іх больш якасных тэкстаў. Чаго, на жаль, практычна не адбылося. Пэўныя прозьвішчы былі ўлучаны ў сьпіс постмадэрністаў, як той казаў, *ад балды*. Проста вельмі карцела даведацца, як стануць яны рэагаваць на прыпісаную ім постмадэрнісцкасьць. Рэакцыя – нулявая, прынамсі, прылюдных голасных паясьненьняў сваіх пазыцыяў зарэгістраваць не ўдалося. Які тут эфэкт рэха? Крыкнеш – чутна глуха-глуха! *Все странно молчат*. І літаратары, і літаратуразнаўцы. Напэўна, кагосьці надта ж страшыць недзяржаўны статус і трывала незалежная пазыцыя часопісу «ARCHE» ўва многіх пытаньнях нашае сучаснасьці й мінуўшчыны. Нехта, мабыць, лічыць ніжэйшым за свой прафэсійны (ці які там яшчэ?) гонар зьнепадаць да спрэчкі на роўных зь нейкімі там інжынэрам гарадзенскай гуты ды гомельскім настаўнікам гісторыі. Але, відавочна, большая частка адпаведнай аўдыторыі, што калі-нікалі зазіраюць на старонкі названых выданьняў, кіруюцца застарэлым прынцыпам: «Не твая палоса – ня суй носа». Маўляў, калі палемізуюць аўтары «ARCHE», дык хай яны міжсобку й высьвятляюцца, хоць задушацца, а мы будзем (ці ня будзем) дыскутаваць толькі на сваіх дзялянках. Назвы дзялянак вядомыя – «Маладосць», «Полымя», «Дзеяслоў»...

«Ніхто нават не пакрыўдуе публічна», – наракае Данііл Жукоўскі[2] і трошкі памыляецца. Крыўдуюць і публічна, але нейкай дзіўнаю крыўдай. Во, напрыклад, Зьміцер Вішнёў прагаласіў сваю бязьмежную крыўду на «разумнікаў з «ННЦ» і «ARCHE», а заразом і на «былых функцыянэраў СБП», ARCHE, што не заўважаюць яго ды іншых «непаслухмяных літаратараў»[3]. Прозьвішчы ўсіх гэных дзядзек і цётак не называюцца. Але ёсьць зусім новая трохпавярховая лаяначка: «шараговы беларускі пэўдадзяяч». Хто ня памятае, нагадаю – спадара Вішнёва з усёй эке-бумбамлітаўскай грамадою ў нас прынята аўтаматычна залічваць да постмадэрністаў. Чаўтара году таму гэта было нават сьцьвярджана на шматлюдным

2 Жукоўскі Д. У лабірынце з постмадэрністам // ARCHE. 2004. № 1. С. 90.

3 Маладосць. 2003. № 6. С. 140.

4 Рублевская Л. Под серым солнцем таэика жили постмодернизм по-белорусски // Советская Белоруссия. 2002. 4 кастрычніка. Між іншым, давялося там бачыць і свае словы з

аўдыторыі Беларусі і Расіі, а таксама ў Польшчы, Германіі, Швейцарыі, Злучаных Штатах Амерыкі і Канадзе. Пры гэтым, на жаль, далейшым неаднакроць падкрэслівалася, што ПМ – гэта «постмадэрнізм без постмадэрнізму»4. Што ж, такі падыход, відаць, можна назваць арыгінальным, але ці ён адпавядае сапраўднасці? Вось Ігар Бабкоў, спасылаючыся на Ліпавецкага, піша: «Постмадэрнізм – гэта ўсё, што адбываецца пасля постмадэрнізму»5. Гэта, безумоўна, вельмі арыгінальна, але ці можна такім чынам вызначыць сапраўдны змест з'явы? Мяркуем, што не. Таму, на нашу думку, для азначэння характару іхнай творчасьці больш дакладнае для азначэння характару іхнай творчасьці іншае паймо – «постдэкаданс». Робіцца гэта, мабыць, не бяз згоды саміх аўтараў. Так і вынікае, што ўчорашнія грымоткія (грымелі ж тазікамі!) постмадэрністы ацэньваюць свой папярэдні этап творчасьці як пэрыяд дэкадансу (то бок заняпадніцтва), але ніяк ня постмадэрнізму! Гэта нагадвае прыкрую показку пра пацыента, які ў сваёй картцы да дыягназу «насмарк» сьціпленька дапісаў «французкі». Віка Трэнас ад спрэчкі пра існаваньне постмадэрнізму ў Беларусі пасьпешліва адхрышчваецца, заўважаючы толькі, што ў яго цяпер «Хадановіч гуляецца»5.

Увогуле ж адкат ад постмадэрнісцкіх пазыцыяў назіраецца і ў іншых аўтараў. Ігар Бабкоў кажа, што ПМ ня вырашыў тых праблем, якія стаялі перад культурай і грамадзтвам. Сам сябе бацька Адама Клакоцкага цяпер называе «постмадэрністам». Гучыць неяк какетліва і сьмешна, выклікаючы алюзіі на рэклямнае «яшчэ больш арэхаў, нугі і шакаладу» або армейскае «двойчы яфрэйтар унутраных войскаў». Між іншым, школьны падручнік па курсе «Чалавек. Грамадзтва. Дзяржава» для 11 клясы проста з мосту абрынае на ПМ бязьлітасны танкавы агонь, нават не спрабуючы дазволіць вучням адчуць неадназначнасьць праблемы і шматлікасьць поглядаў на яе:

Постмодернизм *считает любое самовыражение человека предметом, порождающим бесчисленное количество толкований. Отсюда утверждается, что чем непонятнее произведение, тем более продуктивно работает воображение зрителя. […] Однако такое равнодушие к ценностной направленности своей деятельности рано или поздно, но приводит художника к эстетизации безобразного. Поскольку тот, кто творит по принципу «что получится», часто выплескивает далеко не лучшее содержание своего сознания. Это же происходит и в отражении искусством реалий жизни. Оно все чаще начинает выбирать не идеальные, а худшие ее*

5 Там жа. С. 147–148. *Сам Ліпавецкі* [illegible]

стороны[6].

Няўжо ж практычны інтарэс да постмадэрнізму зышоў
упоглум? Як паглянеш на гэта, дык і марным здаецца
па часе высілак Данілы Жукоўскага справакаваць-такі
палеміку празь цьверджаньне, што ў Беларусі толькі два
постмадэрністы «ў поўным сэнсе гэтага слова» – апалятыкі
Валянцін Акудовіч і пісьменьнік Сяргей Балахонаў. «Два дык
два», – прамармульчаць нашыя «постдэкадэнты» і «выключныя
беларускія супэрдзеячы». Але ні я, ні Даніла, ні бальшыня з вас,
шаноўныя чытачы, гэтага не пачуем. Не пачулі ж мы покуль
хоць якога голасу пра сапраўды найлепшы беларускі ПМ-твор
2003 году – раман Людмілы Шчэрбы «Ўладар рыбаў»
(«Маладосць», 2003. № 11–12), які асабіста мяне прыемна
ўразіў летась ня менш, чым беларускі пераклад «Выхаваньня
дзяўчат у Чэхіі» Міхала Вівэга («ARCHE», 2003. № 4–5). Чаму
пра яго не гавораць ані на кожным кроку, ані на бачынах
паважных нашых выданьняў?

Украінская літаратура як літаратура посткаляніяльная ня мае пакуль ані паўнавартаснага мэханізму грамадзкага функцыянаваньня, ані, зрэшты, паўнавартаснага чытача, якім ёсьць (уласна, меў бы быць) перадусім чытач сталічны, зь вялікага гораду, асьвечаны, прыналежны да апініятворчых асяродзьдзяў інтэлігенцыі. «Дыяспарны» статус украінскай літаратуры ўва Ўкраіне ёсьць, з гэтага гледзішча, адно мэтафараю яе каляніяльнай маргіналізаванасьці, грамадзкай дысфункцыянальнасьці. У гэтых варунках нават найгеніяльнейшыя тэксты ня могуць мець вырашальнага ўплыву на выхад гэтай літаратуры за межы ўкраінскамоўнага гета,

– адзначыў добра знаны чытачам «ARCHE» ўкраінскі інтэлектуал Мікола Рабчук. З пэўнымі агаворкамі мы можам агледзець тутака і нашу беларускаую сытуацыю. Да той пары, покуль беларушчына існуе толькі ў гета, а ня ў масах, няма рацыі гаварыць пра масавага чытача беларускай літаратурнай прадукцыі. Дзеля таго даводзіцца ўнікаць пайма *шараговы чытач беларускай літаратуры*. За сёньняшняй русіфікацыйнай сытуацыяй *шараговы чытач* у пераважнай сваёй бальшыні ня

6 Ў
Обществ
Гісуадрусь
Мінск,
2002. С. 89–90.

будзе чытаць па-беларуску, бо ня ведае ні мовы, ні імёнаў. Куды прасьцей яму ўзяць «панятнаязычных» і раскручаных Пялевіна з Акуніным. Спарадычная цікавасьць дзяржаўных і прадзяржаўных мас-мэдыяў да літаратараў, што пішуць па-беларуску, праблемы не вырашае. Яны глядзяць на белмоўных нібыта на індзейцаў і гэткі погляд навязваюць сваім спажыўцам.

Менавіта таму ў артыкуле «Ізноў пра кляты постмадэрнізм» (2001) я падкрэсьліў пільную патрэбу «заваёвы» літаратарамі (а шырэй – нацыянальна арыентаванымі дзеячамі культуры) тэлебачаньня. Кагосьці сапраўды даводзілася бачыць на экране. І што ж? Нямала зьдзівіўся, як паэтка Джэці (Вера Бурлак), якая абсалютна разьняволена пачуваецца на публіцы, перад камэрай не магла два словы зьвязаць. Гэта не папіканьне з майго боку, а канстатацыя факту: ёсьць жаданьне быць на TV, але няма досьведу таго, што там рабіць, а галоўнае – што сказаць *шараговаму тэлегледачу*. А сказаць жа трэба, каб сапраўды вылучацца на агульным шэрым тле разумнасьцю і таленавітасьцю, каб той самы глядач чакаў пачуць ад «арыстакратаў духу» штосьці важнае для яго, а ня проста «Хай, бледналіцыя!». І калі нашыя музыкі, у тым ліку беларускамоўныя, да тэлекамэр прызвычаіліся і нават у караценькіх інтэрвію могуць сфармуляваць патрэбны *message*, то літаратары, па вялікім рахунку, застаюцца па-за ўвагай тэлебачаньня.

Зь іншага боку, параўнаньне з музыкамі дае магчымасьць зразумець дзяржаўную палітыку і ў галіне літаратуры. Дзе мы ведаем, што нашы т. зв. нацыянальныя гіт-парады складаюцца пераважна з расейскамоўных песень. У этэр радыёстанцыяў стаўляюць таксама *айчынных* выканаўцаў на *неайчынных* мовах, і дзяржава ніяк сытуацыю выпраўляць не зьбіраецца, сама заварыла ўсю гэтую кашу ды ў прынцыпе мусіць абараняць беларушчыну. Не абараняе. І пісьменьнік, што пішуць па-беларуску, – гэта толькі лішняе раздражненьне для дзяржавы, якая загрузла ў папушчэнстве стыхійнай і сацыяльнай дэбіларусізацыі. Шукаецца расейскамоўная літаратура сучаснае Беларусі. А як толькі нейкі літаратар знаходзіцца, то адразу ж абвяшчаецца народналюбімым і модным. Адзін з

7 Дыскуссія. Белоруссия. 2004. 23 сакавіка.

8 Звязда. 2004. 22, 25–27 траўня.

аўтараў рубрыкі «Культура» ў «Советской Белоруссии» Валянцін Пепяляеў рассыпаецца ў падобных камплімэнтах да Натальлі Батраковай, аўтаркі раману «Территория души». Мілая жанчына не прэтэндуе называцца пісьменьніцай. Але Пепяляеў ператварыў інтэрвію зь ёю практычна ў маналёг прарока-ўнівэрсала ад літаратуры. Закранутыя тэмы: цэнтар і пэрыфэрыя, сяброўства і зайздрасьць, комплексы і любоў да іх, новая беларуская літаратура. «Белорусскую литературу надо развивать и защищать», – цьвердзіць Батракова, не тлумачачы сэнсу першых двух словаў і не даючы рэцэптаў разьвіцьця ды абароны[7]. Пра беларускую мову – nihil. Толькі ўскосна праблема мовы закраналася ў дыскусіі рэдактараў голдынгавых выданьняў «Без літаратуры няма народу, няма дзяржавы»[8].

Во які лябірынт з найноўшым лёдавым пакрыцьцём.

[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2005/1/17**
[image]

ВІТАЛЬ ЗАЙКА

Віталь Зайка
Няскончаная вайна

Martin Dean. *Collaboration in the Holocaust. Crimes of the Local Police in Belorussia and Ukraine, 1941–1944.* New York: St. Martin's Press, 2000. 241 p.

Peter Duffy. *The Belski Brothers. The True Story of Three Men Who Defied the Nazis, Saved 1,200 Jews and Built a Village in the Forest.* New York: Harper Collins Publishers, 2003. 302 p.
Antonio Munoz, Oleg Romanko. *Hitler's White Russians: Collaboration, Extermination and Anti-Partizan Warfare in Byelorussia, 1941–1944.* New York: Europa Books, 2003. 512 p.
Andreas Hollender (Gest.) *«Existiert das Ghetto noch?» Weissrussland: Juedisches Ueberleben gegen nationalsozialistische Herrschaft.* Berlin: Assoziation A, 2003. 319 s.
Другая сусьветная вайна ў Рэспубліцы Беларусі яшчэ ня скончылася. У грамадзкай сьвядомасьці і калектыўнай памяці яна сталася найбольш значнай і векапомнай падзеяй, фактычна

галоўнай падзеяй наагул у гісторыі народу – у той ступені, у якой сам народ сябе памятае. Грамадзтва застаецца падзеленым у стаўленьні да гэтай вайны. Стаўленьне адлюстроўвае сьветапогляд, успрыманьне Эўропы і Захаду. Апошнія працягваюць у масавай сьвядомасьці асацыявацца з фашызмам, пакутамі ваеннага часу. Пры гэтым сымптаматычным зьяўляецца ўжыванье тэрміну «фашыст» у штодзённым дыскурсе. Тэрмін у гэтым кантэксьце ня мае нічога ад нацыянал-сацыялісцкай ідэалёгіі або прыналежнасьці да вайсковых ці іншых структураў нацысцкага акупацыйнага рэжыму. Для ўжывальнікаў гэтага тэрміну ён азначае анамальнасьць, прыналежнасьць аб'екта менаваньня да іншага сьветапогляднага космасу, выпадзеньне зь мясцовага савецка-тутэйшага кантынууму, чужароднасьць і часта – пэрвэрсію. Гэты тэрмін называе Іншага і цалкам супрацьлежыць тэрмінам «наш», «свой». Мэтадычна ўжываны ў прапагандысцкіх мэтах, тэрмін гэты, як і адпаведны стэрэатып, замацаваўся за беларускімі незалежніцкімі сіламі. І быў эфэктыўна скарыстаны савецкімі й постсавецкімі ўладамі ў Беларусі, каб не дапусьціць пранікненьня беларусацэнтрычнага «адраджэнскага» сьветапогляду ў беларускія масы, у масавую сьвядомасьць. Міты пра «фашыстаў» з БНФ і «паліцая» Пазьняка, а пазьней – пра «літаратурнае калябаранцтва» Васіля Быкава, што трымаюць грамадзкую сьвядомасьць у расейска-савецкай арбіце, ёсьць адлюстраваньнем і практычным прытарнаваньнем гэтага тэрміну-фэномэну. Яго ігнараваньне, брак мэтадычнага адэкватнага адказу з боку беларускіх незалежніцкіх сілаў шмат у чым спрычыніліся да перамогі антынацыянальных сілаў у 1990-я гады і іх знаходжаньня дасюль пры ўладзе.

Між тым, дэталёвы разгляд і аналіз падзеяў другой сусьветнай вайны ў Беларусі з пункту гледжаньня беларускіх інтарэсаў можа даць пераканаўчыя аргумэнты на карысьць незалежнасьці, разьвіцьця дачыненьняў з Эўропай і вольным сьветам, падтрымкі сваіх нацыянальных каштоўнасьцяў, у тым ліку мовы і культуры. Чаго вартая, напрыклад, нядаўна агучаная Аляксеем Каўкам тэза пра тое, што «Расея кінула Беларусь у 1941 годзе» (а так фактычна і адбылося; можна яшчэ дадаць: «у 1812, 1915, 1921-м»). Небясьпеку аб'ектыўнага разгляду падзеяў вайны адчуваюць і антынацыянальныя сілы, жорстка абмяжоўваючы мажлівасьць правядзеньня незалежных

дасьледаваньняў і публікаваньння нецэнзураваных тэкстаў, датычных вайны. Юбілейныя даты «перамогі над фашызмам» па-майстэрску скарыстоўвае рэжым, што паставіў свой лёс у залежнасьць ад падтрымкі не беларускіх, а расейскіх або ўнівэрсалісцка-савецкіх каштоўнасьцяў. Але рэсурс «перамогі над фашызмам» абмежаваны. Дэмаграфічна зьмяншаецца кола безумоўных *падтрымальнікаў*, што ўспрымаюць «перамогу над фашызмам» як элемэнт рэлігійны, не падлеглы сумневам і аналізу. Рэжым ня здольны ўлучыць у свой актыў новыя дасьледаваньні пра вайну, бо гэта можа паставіць пад пагрозу складзеную ў пасьляваенныя гады і пазьней да бляску адпаліраваную савецкую інтэрпрэтацыю яе ходу і вынікаў. Кожны рэальны дакумэнт і вуснае сьведчаньне могуць пакінуць драпіну на гэтай паліроўцы, выклікаць «нязручныя» пытаньні. Апроч таго, савецкія ўнівэрсалісцкія каштоўнасьці ў расейскім «изводе» далёка не заўсёды стасуюцца да сёньняшняй Рэспублікі Беларусі. У вайне, згодна з афіцыйнымі фармулёўкамі, перамог «савецкі народ». Задача тлумачэньня таго, што гэта за народ такі і наколькі ён актуальны – разам са сваімі перамогамі, – для сёньняшніх жыхароў Рэспублікі Беларусі будзе з часам усё больш ускладняцца.

Значнасьць вайны 1939–1944 гг. у Беларусі будзе паступова зьмяншацца ў сьвядомасьці. І хоць, напэўна, яна ніколі ня сыдзе да рангу, скажам, забытых расейска-турэцкай (1877–1878) ці польска-савецкай (1920) войнаў, у якіх таксама бралі ўдзел беларусы, але фэномэн «перамогі над фашызмам» усё ж нагадвае шчыгрынавую скуру, якая можа толькі сьціскацца. Такім чынам, вайна застаецца адной з найбольш важных пляцовак змаганьня паміж нацыянальнай і антынацыянальнай тэндэнцыямі ў грамадзкім жыцьці Беларусі. На жаль, асартымэнт публікацыяў, колькасьць і якасьць іх у Беларусі, у спалучэньні са спэцыфічнымі ўмовамі тутэйшай навуковай і выдавецкай дзейнасьці, вымушаюць чакаць лепшых часоў. Разгледзім таму, так бы мовіць, «другі фронт» – замежныя публікацыі, датычныя падзеяў вайны ў Беларусі[1].

Галакост габраяў у Беларусі – бадай, найбольш асьветленая тэма, дасьледаваная з выкарыстаньнем сучаснай навуковай мэтадалёгіі. Гэта свайго кшталту «паралельная гісторыя» вайны, так як гісторыя беларускіх габраяў – гэта гісторыя космасу, паралельнага беларускаму.

[1] Тут і ўсюды ў тэксьце, дзе ня ўказана іншае, пераклад Шалома

Разгляданыя тут кнігі пра другую сусьветную вайну ў Беларусі з ёсьць прыкладам прадукцыі, якая зьяўляецца на кнігавым рынку вольнага сьвету і якую можна скатэгарызаваць наступным чынам: навуковыя выданьні (кніга Марціна Дына), папулярныя выданьні (кніга Пітэра Дафі), успаміны, сьведчаньні (А. Голендэр), дапаможнікі для калекцыянэраў (А. Муньяс – А. Раманько). Тры з чатырох разгляданых прадаў прысьвечаныя катастрофе габраяў, і гэта таксама адлюстроўвае агульную тэндэнцыю: большасьць кніг, што выходзяць пра Беларусь па-за межамі Беларусі, прысьвечаныя розным аспэктам Галакосту.

Галакост уяўляе сабою навуковую праблему ў галіне гісторыі, што зьявілася і стала актыўна распрацоўвацца адносна нядаўна. Аднак нямала матэрыялаў пра лёс габраяў, пачало выходзіць яшчэ ў час вайны. Галакост, які сёньня лічыцца найбольш дакумэнтаванай падзеяй у гісторыі, тым ня менш уздымае сярод гісторыкаў адвечныя прафэсійныя пытаньні пра магчымасьць або немагчымасьць аб’ектыўнага аналізу, слушнасьць выкарыстаньня крыніцаў, прапарцыйных суадносінаў ужываньня нацысцкіх дакумэнтаў і сьведчаньняў ахвяраў і г. д. Дыскусіі пра гэта цягнуцца дасюль[2].

Ху Беларусі з Ізраілю, напрыклад: Shalom Cholawsky. The Jews of Belorussia during World War II. Amsterdam: Harwood Academic publishers, 1998; кнігі нямецкіх дасьледнікаў, напрыклад Вэрнгарда К’яры, а таксама працу, напісаную збольшага з савецкіх пазыцыяў: Grenkevich Leonid D. The Soviet partisan movement, 1941–1944: a critical historiographical analysis. Edited with a foreword by David M. Glantz. London; Portland, OR:

Тэматыка Галакосту ўвайшла ў *мэйнстрым* навуковай і мастацкай літаратуры на Захадзе ў канцы 1980-х і ў 1990-я гады. Адной з працаў, што выклікалі асаблівую зацікаўленасць, зьявілася кніга Дэніэла Гольдгагена «Добраахвотныя катаваньнікі Гітлера» (1996), у якой праводзіцца тэза пра ўхваленне ахвотны ўдзел у ажыцьцяўленьні Галакосту ўсяго нямецкага грамадзтва. Аўтар сьцьвярджае, што адвечны антысэмітызм немцаў і падтрымка нацысцкіх расавых тэорыяў былі матывамі, што натуральным чынам зрабілі немцаў заўзятымі выканаўцамі плянаў Гітлера па вынішчэньні габраяў. Кніга выклікала дыскусію і была ўрэшце раскрытыкаваная за неабгрунтаванасьць абагульненьні, якія ня здолелі растлумачыць усёй разнастайнасьці рэакцыяў на Галакост з боку нямецкіх грамадзянаў.

Праца Марціна Дына «Суўдзел у Галакосьце: Злачынствы мясцовай паліцыі ў Беларусі і Ўкраіне, 1941–1944» у пэўным сэнсе ідзе сьлядамі кнігі Гольдгагена і скіраваная на разгляд матываў і мясцовых умоваў у дзейнасьці дапаможнай паліцыі і ахоўнай службы (*шуцманшафт*) – паліцэйскіх фармаваньняў, што ствараліся на акупаваных Нямеччынай тэрыторыях Усходняй Эўропы, у дадзеным выпадку – у Беларусі і Ўкраіне. Перад кнігай ставілася мэта разгледзець удзел мясцовых паліцэйскіх структураў у зьнішчэньні габраяў. Аўтар сьцьвярджае, што масавыя расстрэлы і ўдзел у іх прадстаўнікоў мясцовага насельніцтва надаюць Галакосту ўнікальныя рысы на гэтых, як аўтар называе Беларусь і Ўкраіну, «усходніх тэрыторыях». Ён слушна зазначае, што Галакост на ўсходзе адбываўся не ізалявана, а як частка дынамічных адносінаў паміж акупацыйнымі сіламі й мясцовым насельніцтвам.

Праца збудаваная на храналягічным аналізе падзеяў вайны ў Беларусі. У першым і другім разьдзелах разглядаецца савецкая акупацыя «ўсходняй Польшчы» і далучэньне Заходняй Беларусі й Заходняй Ўкраіны да Савецкага Саюзу, затым – апэрацыя «Барбароса», пачатак нямецка-савецкай («вялікай айчыннай»)

Frank Cass Publishers, 1999. xv, 368 p.

2 Набліжэньне: John Knesch, Viewing the Holocaust, Yale UP, New Haven CT, 2001; Raul Hilberg. Sources of Holocaust Research: An Analysis. Ivan R. Dee, Chicago, 2001 // Holocaust and Genocide Studies, vol. 17, no.1, Spring 2003.

вайны. Наступныя разьдзелы прысьвечаныя дзейнасьці айнзацгрупаў і масавым вынішчэньням увосень 1941 г., ліквідацыі гетаў у 1942–1943 гг., арганізацыі мясцовай паліцыі і функцыянаваньню мясцовай адміністрацыі, а таксама партызанцы 1942–1944 гг. Асобна разглядаюцца паваенныя лёсы калябарантаў і габраяў, што перажылі Галакост. Нарэшце, у апошнім разьдзеле даецца падсумаваньне дзейнасьці мясцовых калябарантаў у спрыяньні правядзеньню Галакосту. Напісаная жывой мовай і ясным стылем, зь лягічнай падачай дыскусійных момантаў, кніга добра чытаецца і зьмяшчае ў сабе шмат важных фактаў, пераважна з матэрыялаў (успамінаў, інтэрвію), сабраных у выніку дасьледаваньняў, якія ладзіліся сьледчымі аддзелу брытанскай паліцыі ў справах ваенных злачынстваў (WCU, War Crimes Unit). Аўтар асобна не агаворвае крыніцаў, якія былі скарыстаныя падчас працы над кнігай, аднак агляд спасылак паказвае, што найбольш інтэнсіўна выкарыстоўваліся матэрыялы WCU, нямецкага Фэдэральнага і вайсковага архіву ў Фрайбургу і матэрыялы судовага працэсу ў справе Сямёна Серафіновіча ў Доркінгу (Сарэй, Англія). Сярод іншых матэрыялаў скарыстаныя дакумэнты з архіваў Польшчы, Украіны, Расейскай Фэдэрацыі, Латвіі ды іншых краінаў. Зь беларускіх крыніцаў прыводзяцца дакумэнты Нацыянальнага архіву, Берасьцейскага і Менскага абласных архіваў, Архіву ўправы КДБ у Менску. Як вынікае са сьпісу скарыстанай літаратуры, уся яна – па-ангельску і па-нямецку. Тое, што аўтар пакінуў па-за сваёй увагай вялікі корпус літаратуры на ўсходнеэўрапейскіх мовах, у тым ліку працы такіх прызнаных навукоўцаў у разгляданай галіне, як Юры Туронак і Аляксей Літвін, ёсьць велізарнаю хібаю кнігі. Гэта кідае цень на яе высновы, абясцэньвае вартасьць дасьледаваньняў наагул.

Тым ня менш, праца можа быць павучальнай для дасьледнікаў вайны, у прыватнасьці, пры разглядзе матывацыі дзеяньняў у межах пэўных катэгорыяў удзельнікаў падзеяў: мясцовай паліцыі (удзел у зьнішчэньні габраяў і сем'яў партызанаў), габраяў (пасіўнасьць большасьці), негабрайскага насельніцтва (дапамога або адмаўленьне ў дапамозе габраям), партызанаў (адмовы прымаць габраяў, спарадычныя забойствы ўцекачоў з гета). Аўтар імкнецца быць аб'ектыўным, хоць ягоная праца ў

WCU (галоўным чынам у сувязі са справай былога камэнданта мясцовай паліцыі ў Міры) накладае сваю пячатку як на выбар крыніцаў і ілюстрацыйнае месца дзейнасьці мясцовай паліцыі (Мір), так і на высновы дасьледаваньняў. Плённым зьяўляецца параўнаньне манеры правядзеньня Галакосту на ўсход і на захад ад Берасьця. Так, слушна падкрэсьліваецца публічнасьць Галакосту на ўсходзе, калі зьнішчэньне (напрыклад, масавыя расстрэлы) людзей адбывалася паблізу – або нават у межах – населеных пунктаў і часта было адкрытае для назіраньня ня толькі нямецкім цывілістам і вайскоўцам, але і мясцоваму негабрайскаму насельніцтву.

Аўтар дэталёва разглядае паўставаньне і дзейнасьць мясцовай паліцыі (*шуцманшафт*) на прыкладзе паліцыі Мірскага раёну. Ён бачыць два этапы ў яе дзейнасьці: на пачатку акупацыі, калі яна набіралася з добраахвотнікаў і была адносна невялікай колькасна, і ад лета 1942 году, калі пачаўся прымусовы набор мясцовага насельніцтва, асабліва для вартавой службы, у сувязі з пашырэньнем актыўнасьці партызанаў. Аўтар дае інфармацыю колькаснага складу паліцыянтаў і падафіцэраў Мірскай паліцыі ў розны час і аналізуе працэс набору асабовага складу. Сярод матываў, якімі кіраваліся добраахвотнікі, што ўступалі ў паліцыю, аўтар падае асабістыя амбіцыі, помсьлівасьць, антысацыяльныя схільнасьці. Калі пачаўся прымусовы набор і выбар для чалавека прызыўнога ўзросту быў або паліцыя, або партызаны, значная колькасьць выбірала паліцыю, па-першае, дзеля гарантаванага пайка і аплаты, па-другое, каб пазьбегнуць дэпартацыі сям'і і, па-трэцяе, дзеля антысавецкіх і/або нацыяналістычных перакананьняў. Але матыў пераважнай большасьці быў – выжыць.

Аўтар прыводзіць факты пра імкненьне мясцовага польскага падпольля апанаваць паліцыю на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Пры фармаваньні паліцэйскіх адзінак палякам давала перавагу тое, што сярод іх было больш афіцэраў і падафіцэраў і яны мелі вышэйшы адукацыйны ўзровень. Аднак гэтыя памкненьні былі заўважаныя немцамі, і ў выніку ў Мірскай паліцыі былі звольненыя ўсе паліцыянты, якія падалі нацыянальнасьць «паляк». Гэта, між іншым, паспрыяла таму, што значная колькасьць палякаў пачалі запісвацца ў афіцыйных заявах

беларусамі.

У кнізе таксама разглядаюцца абавязкі, якія выконвалі паліцыянты: гэта ахоўная і вартавая служба, удзел у антыпартызанскіх апэрацыях, ачапленьне абшару і прачэсваньне гета падчас акцыяў па зьнішчэньні габраяў. На пачатку акупацыі паліцыя таксама займалася сваёй звычайнай справай – барацьбой з крадзяжамі і рабаваньнямі, але з эскаляцыяй партызанскай вайны гэта было спынена. Аўтар адзначае, што ў большасьці выпадкаў паліцыянты з *шуцманшафт* не прыцягваліся непасрэдна да правядзеньня расстрэлаў, але добраахвотнікі зь мясцовай паліцыі бралі ўдзел у расстрэлах разам са службоўцамі паліцыі бясьпекі, паліцыі парадку, жандармэрыі і СС. У выпадках, калі мясцовая паліцыя атрымлівала загад на правядзеньне т. зв. «спэцакцыяў», на непасрэднае выкананьне расстрэлаў, згодна з М. Дынам, накіроўваліся добраахвотнікі, а рэшта ажыцьцяўляла ахову пэрымэтру і канвой да месца экзэкуцыі. Аўтар прыводзіць шматлікія жудасныя сьведчаньні зьнішчэньня габраяў у беларускіх гарадох ды мястэчках (у Міры й ваколіцах, Нясьвіжы, Турцы, Стоўпцах, Наваградку, Мёрах, Глыбокім, Слоніме ды інш.). Згодна з цытаванымі матэрыяламі, асабліва шчыравала мясцовая паліцыя падчас прачэсваньня гета пасьля ліквідацыяў. Значная колькасьць сьведкаў – габраяў і негабраяў – адзначаюць зацятасьць, зь якой гэта рабілася. У Снове, ля Нясьвіжу і ў Хвайнікох мясцовая паліцыя брала ўдзел у зьнішчэньні цыганоў.

Разглядаючы матывы добраахвотнага ўдзелу ў забойствах, аўтар адзначае, што антысэмітызм не вытлумачвае ўсяго спэктру паводзінаў мясцовай паліцыі. Аўтар тут аддае перавагу дасьледаваньню Крыстафэра Браўнінга пра рэзэрвовы паліцэйскі батальён 101, дзе прасочваецца бруталізацыя паводзінаў і ператварэньне «звычайных людзей» у забойцаў, адаптаваньне іх да працэсу забойства. У М. Дына таксама паказваецца ператварэньне часткі жыхароў Міра ў забойцаў, што пачалі вынішчаць сваіх суседзяў. Разам з тым згадваюцца выпадкі, калі паліцыянты дапамагалі габраям або прынамсі дазвалялі ўцячы.

Вельмі істотным зьяўляецца разьдзел пра партызанскую вайну 1942–1944 гадоў, калі дзякуючы намаганьням падкантрольных Маскве савецкіх партызанаў, бязглуздай і самазабойчай палітыцы нямецкіх акупацыйных уладаў, а таксама дзейнасьці польскага падпольля і Арміі Краёвай абшар Беларусі ператварыўся ў пекла, дзе чалавек мог выжыць, толькі далучыўшыся да адной з асноўных сілаў у канфлікце.

Габраям было ў гэтых абставінах горш за ўсіх. Пераважна гарадзкія жыхары, бяз досьведу сельскагаспадарчай працы, яны часта вылучаліся з астатняга насельніцтва акцэнтам ды вонкавым выглядам і ня мелі шмат шанцаў выжыць па-за межамі гета, куды былі сагнаныя з дапамогай мясцовых даносчыкаў. Ня ў гета габраяў магла чакаць сьмерць ня толькі ад немцаў і мясцовай паліцыі, але і ад рук партызанаў – як польскіх, так і савецкіх. Разам з тым, уцекачы з гета арганізоўвалі свае ўзброеныя аддзелы, а ў савецкіх атрадах імкнуліся пераканаць кіраўніцтва ў неабходнасьці дазволіць іхным супляменьнікам далучацца да савецкіх партызанаў.

Пра гэта ў крыху бэлетрызаванай форме апавядаецца ў кнізе Пітэра Дафі «Браты Бельскія», напісанай не прафэсійным гісторыкам, а журналістам, далёкім ад рэаліяў як Усходняй Эўропы, так і партызанскага руху часоў другой сусьветнай вайны. Пэўна, будзе слушна дапусьціць, што аўтара прывабіла, з аднаго боку, сэнсацыйнасьць матэрыялу, а з другога – даволі трывалы попыт на літаратуру пра Галакост. Напачатку аўтар дае некаторыя зьвесткі з гісторыі габраяў ды іхнага штодзённага жыцьця ў міжваеннай Беларусі (першы разьдзел мае характэрную назву «Ад цара да фюрэра») і спыняецца на гісторыі сям'і Бельскіх, якая дала чатырох братоў – арганізатараў габрайскага партызанскага руху. Аўтар, які асабіста пазнаёміўся з прадстаўнікамі сям'і Бельскіх у Нью-Ёрку падчас падрыхтоўкі артыкулу для «Нью-Ёрк Таймз», напісаў кнігу, заснаваўшы яе на аповедах, пачутых непасрэдна ад відавочцаў, а таксама скарыстаўшы адпаведную літаратуру па тэме і архіўныя матэрыялы, у тым ліку неапублікаваныя ўспаміны Тувіі Бельскага. Як і Марцін Дын, Пітэр Дафі закранае ў сваёй кнізе пытаньні нямецкай палітыкі ў дачыненьні да габраяў, пытаньні ўзаемаадносінаў паміж

габраямі й мясцовым насельніцтвам, стаўленьня да габраяў з боку савецкіх і польскіх партызанаў. Аўтар падае гісторыю стварэньня габрайскага партызанскага аддзелу, які налічваў у сваіх шэрагах пад канец вайны больш за тысячу чалавек. Наступныя разьдзелы падаюць храналягічнае апісаньне падзеяў і носяць адпаведныя назвы накшталт «Кастрычнік 1942 – люты 1943», «Ліпень 1943 – верасень 1943». Зь іх чытач даведваецца, што сям'я млынара Бельскага жыла ў вёсцы паміж Лідай і Наваградкам, тры браты даглядалі некалькі млыноў, што належалі сям'і. З пачаткам другой сусьветнай вайны і прыходам Саветаў сямейны бізнэс быў ліквідаваны, а перад тым як пачалася нямецка-савецкая вайна, тры браты былі мабілізаваныя ў Чырвоную Армію. Яны неўзабаве вярнуліся дахаты і адчулі на сабе рэпрэсіі. Два малодшыя загінулі ад рук нацыстаў, а трое старэйшых – Тувія, што служыў у польскім войску, Зуся і Ашаэл – заснавалі ў лесе групу, першапачатковай мэтай якой было забясьпечыць выжываньне. Група пачала павялічвацца, пераважна за кошт уцекачоў з навакольных гета. У меру павелічэньня групы яе кіраўнік Тувія Бельскі, былы капрал польскага войска і найстарэйшы з братоў, прапанаваў далучыцца да савецкіх партызанаў і назвацца атрадам імя Жукава, пра якога ён чуў у маскоўскім радыё. Гэта было зроблена не дзеля камуністычных перакананьняў або сымпатыяў да Саветаў, а ў прагматычных мэтах выжываньня і барацьбы з супольным ворагам – нацызмам. Першая небясьпека, што напаткала навастворaны атрад, зыходзіла, як піша П. Дафі, не ад немцаў ці палякаў, а ад савецкіх партызанаў. Падчас першага кантакту зь імі атрад Бельскіх быў абвінавачаны ў рабаваньні мясцовых сялянаў і паўстала пагроза яго раззбраеньня. Тувія здолеў пераканаць партызанскае кіраўніцтва ў тым, што габраі хочуць змагацца, а не пераседзець вайну ў лесе. Атрад дзейнічаў у Налібоцкай пушчы, і пасьля зьмены назвы з Жукава на Арджанікідзэ быў улучаны ў склад брыгады імя Кірава, што падпарадкоўвалася баранавіцкаму падпольнаму абкаму КП(б)Б. Пазьней ён быў падзелены на два аддзелы – баявы (Арджанікідзэ) і сямейны (Калініна). Браты таксама былі разьведзеныя па розных адзінках.

У кнізе распавядаецца пра баявую дзейнасьць і розныя аспэкты

штодзённага жыцьця ў атрадзе: акцыі помсты мясцоваму насельніцтву, рэквізыцыі, полавыя ўзаемаадносіны, праблемы з асобым аддзелам брыгады ды іншыя пытаньні, якія не закраналіся ў афіцыйнай савецкай гістарыяграфіі. Пры ўсім тым атрад Бельскіх быў, хутчэй за ўсё, «нармальным» партызанскім атрадам, і ўсе зьявы, уласьцівыя савецкім партызанам, не абмінулі і партызанаў габрайскіх – у прыватнасьці, жорсткія пакараньні калябарантаў ды іхных сем'яў, улучна з малымі дзецьмі, і забойствы байцоў атраду за рэальныя і ўяўныя правіны. У атрадзе назіралася барацьба за ўладу паміж асобамі й групоўкамі. Тым ня менш, атрад зрабіўся, поруч з падобнымі фармаваньнямі ў іншых рэгіёнах, напрыклад атрадам Зорына ў ваколіцах Менску, асноўным ратаўніком габраяў рукамі габраяў. Яго дзейнасьць абвергла пракаветны міт пра жыдоўскую нацыю як нацыю баязьліўцаў, няздольных узяцца за зброю. У пэўным сэнсе яна рэабілітавала і надала годнасьці пакутам соцень тысяч ахвяраў гітлераўскага генацыду.

Кніга Дафі чытаецца месцамі як захапляльная прыгодніцкая кніга пра экзатычныя мясьціны, якія мала нагадваюць Беларусь. Даволі часта ўзгадваюцца пакуты мясцовых сялянаў ад рук «людзей са стрэльбамі» з самых розных нацыянальных і палітычных фармаваньняў. Пры гэтым на памяць прыходзяць радкі Тадэвуша Канвіцкага пра тое, што ўся вайна і партызанка ў Беларусі адбывалася «ў двары беларускага селяніна, які цярпеў за невядомыя сабе самому правіны».

Цікавым прадуктам спалучэньня калекцыянэрскага запалу і прэтэнзіі на навуковы падыход да падзеяў другой сусьветнай вайны зьяўляецца кніга А. Муньяса і А. Раманько пад кідкай і не зусім адэкватнай назвай «Гітлеравы беларусы: Калябарацыя, вынішчэньне і антыпартызанскія баявыя дзеяньні ў Беларусі, 1941–1944». Кніга выйшла ў выдавецтве «Эўропа Букс», што спэцыялізуецца на літаратуры па ваеннай гісторыі Трэцяга Райху. Тэкст напісаны пераважна ўкраінскім гісторыкам Алегам Раманьком і перакладзены на ангельскую, з прадмовай і дапаўненьнямі энтузіяста ваеннай гісторыі Антоніё Муньяса. Як відаць з прадмовы й спасылак, у тэксьце шырока скарыстаныя матэрыялы і фатаздымкі з архіваў Беларусі,

Украіны, Расеі, Нямеччыны, ЗША, Ізраілю ды іншых краінаў, падаюцца шматлікія зьвесткі па структурным і колькасным складзе вайсковых фармаваньняў, кшталце ўзбраеньня, храналёгіі апэрацыяў, камандзірах адзінак ды інш. Кніга падае агляд калябаранцкіх арганізацыяў і вайсковых фармаваньняў у Беларусі, а таксама кароткі нарыс найноўшай беларускай гісторыі. Падрабязна разглядаюцца нямецкія вайсковыя й паліцыйныя структуры і фармаваньні іншых народаў на нямецкай службе ў Беларусі падчас вайны. Дэталёва апісваюцца эпізоды антыпартызанскай вайны і карныя апэрацыі зь пералікам прыцягнутых да іх сілаў. Аднак адсутнасьць назваў разьдзелаў і няўцямная структура кнігі робяць яе не зусім выразнай кампіляцыяй значнага паводле аб'ёму матэрыялу. Тым ня менш, вялікая праца па зьвядзеньні разам зьвестак пра нямецкія, калябаранцкія і партызанскія сілы, разгляд працэсу вынішчэньня габраяў і наагул нямецкай палітыкі ў дачыненьні да насельніцтва акупаванага абшару Беларусі ў спалучэньні са значнай колькасьцю візуальнага матэрыялу (фатаздымкі, мапы, дыяграмы, табліцы рангаў і знакаў вайсковай ідэнтыфікацыі) можа быць каштоўным даведачным рэсурсам па гісторыі Беларусі ў другой сусьветнай вайне. У дадатку прыводзяцца кароткія біяграфіі кіраўнікоў акупацыйных сілаў і вайсковых дзеячоў, як нямецкіх, так і калябаранцкіх беларускіх, сьпіс нямецкіх вайсковых тэрмінаў, бібліяграфія пытаньня і шмат чаго іншага. Разам з тым, дзеля фактычных памылак, неадпаведна атрыбутаваных фатаздымкаў, непасьлядоўнай транскрыпцыі і іншых хібаў з гэтага рэсурсу трэба чэрпаць з асьцярогай. Асабліва дзіўным зьяўляецца паралельнае бессыстэмнае ўжываньне тэрмінаў «Byelorussia/Byelorussian» і «White Russia/White Russian», а таксама выразаў кшталту «Central and White Russian».

Значным дасягненьнем у асьвятленьні Галакосту і наагул падзеяў вайны ў Беларусі можна лічыць выдадзены ў Нямеччыне зборнік «Ці існуе яшчэ гета? Беларусь: выпрабаваньні на долю габраяў падчас панаваньня нацызму». Выданьне падрыхтаванае Праектнай групай «Беларусь» з Кёльну, якая на працягу 1999–2001 гг. правяла сэрыю інтэрвію з адзінаццацьцю беларускімі габраямі, якія перажылі Галакост, і адной беларускай – сьведкай падзеяў, якая са свайго пункту

гледжаньня ўспамінае час вайны й антысэміцкі перасьлед. Акцэнт у інтэрвію рабіўся на ўспрыманьні вязьнямі гета штодзённага гвалту і сьмерці, барацьбе з голадам, спробах уратавацца (у сховах-малінах). Асобна разглядалася раней табуяваная тэма гвалту над жанчынамі. Кожнае з дванаццаці інтэрвію – гэта жудасны аповед пра чалавечую гнюсьбу і высакароднасьць, пра сьмерць і выратаваньне. Кожны з аповедаў дадае да разуменьня жахлівага існаваньня і вынішчэньня габраяў у час акупацыі, прыводзіць маленькія дэталі штодзённага жыцьця і лёсавызначальных момантаў, бязь веданьня якіх цяжка спасьцігнуць вайну і Галакост у Беларусі ўва ўсёй паўнаце і складанасьці.

У другой частцы кнігі даецца падборка артыкулаў пра Галакост у Беларусі, напісаных навукоўцамі й сьведкамі падзеяў. Да апошніх належаць вязьні Менскага гета Фэлікс Ліпскі й Гайнц Розэнбэрг, дэпартаваны ў Менск з Гамбургу. Крыстыян Герлах закранае эканамічныя інтарэсы і акупацыйную палітыку Нямеччыны ў Беларусі ў сувязі з вынішчэньнем габраяў. Паўль Коль разглядае стварэньне і дзейнасьць лягеру сьмерці ў Трасьцянцы. Дыяна Зібэрт і Леанід Сьмілавіцкі аналізуюць жыцьцё беларускіх габраяў адпаведна да і пасьля другой сусьветнай вайны і Галакосту. Андрэас Галендэр, рэдактар зборніку, дасьледуе самасьцьвярджэньне і волю да супраціву сярод беларускіх габраяў. Гайнэр Ліхтэнштайн разглядае пытаньні пакараньня нацысцкіх злачынцаў пасьля вайны ў ФРГ і ГДР. Надзвычай цікавым зьяўляецца артыкул пра Менскае гета Данілы Раманоўскага з Габрайскага ўнівэрсытэту – аўтарытэтнага дасьледніка Галакосту на Смаленшчыне, Браншчыне й Ўсходняй Беларусі. Ён сьцісла і зьмястоўна разглядае гісторыю гета, сацыяльныя дачыненьні і штодзённае жыцьцё, адносіны зь негабраямі, актыўны і пасіўны супраціў, «гамбурскае» гета для дэпартаваных з Цэнтральнай Эўропы. Кароткія нататкі Натальлі Яцкевіч і Ганны Кляйн (чамусьці не пазначаныя ў зьмесьце) таксама дадаюць да разуменьня асобных аспэктаў і структураў Галакосту ў Беларусі.

У тэксьце сустракаецца шэраг памылак, зробленых пры перакладзе на нямецкую мову. Як і ўва ўсіх разгляданых тут кнігах, аўтары маюць блытаніну ў разьмежаваньні паняцьцяў

беларускі/расейскі што да мясцовага негабрайскага насельніцтва. Але ўвогуле кніга ёсьць несумненнай удачай і можа быць захапляльным (хоць і дэпрэсіўным!) чытвом для ўсіх, хто цікавіцца ваенным пэрыядам. Кніга шмат дадае да разуменьня вайны, Галакосту і – што найбольш важна для аўтара гэтых радкоў – да разуменьня беларускага народу і аналізу групавых паводзінаў у экстрэмальных абставінах. Гэтаму разуменьню, дарэчы, маглі б паспрыяць сыстэматычныя праекты па фіксаваньні вуснай гісторыі ваеннага часу, а таксама часу да- і пасьляваеннага. Спарадычныя запісы ад паасобных сьведкаў без захаваньня належных умоваў фіксаваньня інфармацыі (прагляд і подпіс пад транскрыптам, умовы ананімнасьці/галоснасьці і г. д.), што праводзіліся і праводзяцца дагэтуль, ня могуць адлюстраваць падзеяў ува ўсёй паўнаце і праз гэта ня могуць даць аб'ектыўнага аналізу апошняй вайны. Час сыходзіць, і такая аб'ектыўнасьць, напэўна, ужо ня стане рэальнасьцю. Між тым, без максымальна аб'ектыўнага разгляду падзеяў вайны, без адкрытай дыскусіі пра яе немажліва гэтую вайну «закончыць», г. зн. зрабіць адпаведны аналіз і падвесьці вынікі ў разглядзе паводзінаў вялікай сацыяльнай групы (народу) на «пераломе», а затым адпаведна выкарыстаць гэты аналіз і вынікі, прыстасаваныя да бягучых і будучых падзеяў у нашай краіне. Яна ня скончыцца, пакуль ня стане вядомай уся праўда.

А пакуль можна адзначыць, што ў кожнай з разгледжаных тут кніг пра вайну і Галакост ёсьць згадкі пра беларусаў, якія ратавалі суайчыньнікаў-габраяў, рызыкуючы жыцьцём сваім і сваіх крэўных. І ня мужныя выведнікі й адважныя падрыўнікі, а менавіта яны, гэтыя выратавальнікі, людзі зь іхнымі неімпазантнымі, някідкімі ўчынкамі, ёсьць сапраўднымі героямі гэтай няскончанай яшчэ вайны.

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/1/17
[image]

Уладзіслаў Белавусаў Троху пра зьмены ў Лукалэндзе

Contemporary Change in Belarus. Baltic and East European Studies 2. Södertörns högskola, 2004.

Англамоўны зборнік «Сучасныя зьмены ў Беларусі», у які ўвайшлі даклады, агучаныя падчас сэмінару ў «Балцка-Ўсходнеэўрапейскай школе» швэдзкага ўнівэрсытэту Садэрторнз, можа служыць добрай ілюстрацыяй росту цікавасьці да Беларусі ў сьвеце. Чатыры аўтары рэпрэзэнтуюць чатыры акадэмічныя бэкграўнды – канадзкі (Дэвід Марплз), швэдзкі (Барбара Торнквіст-Плева), беларускі (швэдзка-беларускі кампаратывіст Андрэй Катлярчук) ды польскі/цэнтральнаэўрапейскі (выпускніца Цэнтральнаэўрапейскага

УЛАДЗІСЛАЎ БЕЛАВУСАЎ нарадзіўся ў 1984 годзе ў Гомелі. Навучаецца на аддзяленьні міжнароднага права факультэту міжнародных стасункаў БДУ.

ўнівэрсытэту ў Будапэшце Ганна Бжазоўска); чатыры аб'екты аналізу – інстытуты ўлады, беларуска-расейскі зьвяз у кантэксьце няскончанае нацыятворчасьці, гістарыяграфічны канфлікт вакол дзяржаватворнага міту ды вытокі геапалітычнае арыентацыі Беларусі.
Зборнік распачынаецца артыкулам прафэсара гісторыі ўнівэрсытэту канадзкага гораду Альбэрту, «славіста ад паліталёгіі» Дэвіда Марплза. Аўтар нясьпешна ўводзіць чытача ў суворую палітычную рэчаіснасьць Лукалэнду апісаньнем «нечаканай» трансфармацыі БССР у незалежную дзяржаву, хуткай паразы кволых парасткаў дэмакратыі на тутэйшых абшарах ды ўтрываленьня «апошняга квазіаўтарытарнага рэжыму Эўропы». Апошняму паспрыяла, калі верыць Марплзу, стратэгічная памылка апазыцыі, якая адразу пасьля перамогі А. Лукашэнкі на выбарах 1994 году абвесьціла стодзённы мараторый на крытыку новаабранага прэзыдэнта – тэрмін, за які ён манапалізаваў дзяржаўныя СМІ і пачаў дыскрэдытацыю нацыянальнай сымболікі. Паводле вэрсіі Марплза, у гэты час галоўным ворагам Лукашэнкі быў Пазьняк, а рэфэрэндум 1995 году сымбалічна прамаркіраваў перамогу ўлады над лягерам незалежнікаў. Пераходзячы да рэфэрэндуму 1996 году, аўтар слушна адзначае зусім непрыглядную ролю ў ім Расеі. Прыезд Віктара Чарнамырдзіна ў Менск у лістападзе 1996-га як пасярэдніка перакуліў балянс сілаў на беларускай палітсцэне, якая, у традыцыйнай трактоўцы Марплза, была прадстаўлена двума галоўнымі акторамі – прэзыдэнтам (балбатлівым капрызным папулістам, сымпатыкам адыёзных рэжымаў) ды апазыцыяй (БНФ, АГП ды камуністамі). Сацыял-дэмакраты й іншыя дэмакратычна арыентаваныя дэпутацкія групы ў гэты сьпіс чамусьці ня трапілі. Спэцыяльна адзначаецца, што людзі ў правінцыі ніколі асабліва не задумваліся над розьніцай паміж рознымі палітычнымі сіламі і не разумелі сутнасьці антыўрадавых пратэстаў. У той жа час нічога не гаворыцца пра прычыны іх нізкае палітычнай сьвядомасьці, напрыклад пра маніпуляцыі манапалізаванага тэле- ды радыёвяшчаньня, дваістую ролю расейскіх СМІ і перасьлед незалежнае прэсы. Пасьля Марплз коратка апісвае трансфармацыю ролі менскай місіі АБСЭ пад кіраўніцтвам Г. Г. Віка «ад распаўсюдніцы дэмакратыі да дарадцы апазыцыі» і пераходзіць да стасункаў з Расеяй. На яго думку, пасьля выказваньня Пуціна пра «мухі і

катлеты» Лукашэнка, гэты «бізун нацыянальна-сьвядомых беларусаў», перайшоў да нязвыклай ролі абаронцы нацыянальных інтарэсаў Беларусі. Дасьледнік таксама заклікае разьвітацца з хімэрай «расейскага дэмакратызавальнага ўплыву» на Беларусь. Нягледзячы на рэвэрансы ў бок Амэрыкі, Расея афіцыйна прызнала, што выбары 2001 году адпавядалі дэмакратычным стандартам, і вітала пераабраньне А. Лукашэнкі на другі тэрмін. З улікам фігуры аўтара, які кансультуе ў пытаньні Ўкраіны і Беларусі ўрады ЗША і Канады, выступае з палітычнымі аналізамі ў Палаце прадстаўнікоў, Белым доме, унівэрсытэтах Гарварду і Стэнфарду, такую пазыцыю трэба прызнаць важкай.

Заканчваецца тэкст шкадаваньнямі пра адсутнасьць трывалага інтарэсу Захаду (за выняткам Нямеччыны) да нашай краіны і нараканьнямі на разбуральныя тэндэнцыі ў лягеры апазыцыі ды адсутнасьць у ім папулярнага лідэра (у процівагу папулярнаму ўкраінскаму дэмпалітыку Віктару Юшчанку).

Намесьніца дырэктара швэдзкага Цэнтру эўрапеістыкі, выкладчыца ўнівэрсытэту Люнду Барбара Торнквіст-Плева аб'ектам дасьледаваньня ўзяла беларуска-расейскі зьвяз, які разгледзела праз прызму праблематыкі фармаваньня нацыянальнае ідэнтычнасьці беларусаў. Яна аналізуе два паралельныя шляхі палітычнае эвалюцыі краіны з 1994 году – «шлях да дыктатуры» і «шлях да зьвязу з Расеяй». Высновы пра відавочную ўзаемасувязь паўстаюць самі сабой: ташкенцкія пагадненьні аб калектыўнай бясьпецы і рэфэрэндум 1995 году, інтэграцыйная дамова ў красавіку 1996 і блаславеньне патрыярха Аляксія II (які чамусьці называецца Аляксіем III), крамлёўскія фобіі адносна пашырэньня NATO ды раскансэрвацыя расейскіх вайсковых базаў на захадзе Беларусі, адкрытая падтрымка шэрагам папулярных у Беларусі расейскіх мэдыяў Лукашэнкі й непатапляльнасьць яго рэжыму.

На думку дасьледніцы, трэба гаварыць пра вырашальнае значэньне стану беларускае ідэнтычнасьці для разуменьня спэцыфічнага характару беларускага разьвіцьця. Калі параўноўваць сытуацыю ў Беларусі зь літоўскай ці ўкраінскай, кідаецца ў вочы, што слабасьць грамадзянскае супольнасьці, адсутнасьць дэмакратычных традыцыяў альбо эканамічная залежнасьць ад Расеі ня могуць наўпрост растлумачыць падзеі ў Беларусі 90-х гадоў.

У аналізе беларускае ідэнтычнасьці сьцьвярджаецца, што протаганісты беларускае ідэнтычнасьці (Каліноўскі, Багушэвіч, Ластоўскі, Купала) не адчувалі выразнай беларускай дзяржаўнай традыцыі і выразнай этнічнай супольнасьці, каб збудаваць зь яе нацыю (у якасьці аргумэнту прыводзіцца крыўска-беларуская дылема з саманазвай, але пры гэтым ніякім чынам ня згадваюцца праекты «ліцьвінства», «русінства», «вялікалітоўства»); што да XIX стагодзьдзя не выпадае гаварыць ня толькі пра беларускую нацыянальную ідэнтычнасьць, але й пра беларускую этнічную ідэнтычнасьць (праўда, а ці выпадае наагул гаварыць пра нацыянальную ідэнтычнасьць да XIX ст.?); што дамадэрная этнічная ідэнтычнасьць беларусаў – «руская», у сэнсе супольнасьці з тагачаснымі расейцамі ды ўкраінцамі, і ўзьнікла яна ўва ўсходніх славянаў у Кіеўскай Русі, якая існавала з IX ст. да 1240 г. (яе маркеры, адпаведна, праваслаўе ды царкоўнаславянская як супольная пісьмовая мова). «Пачуцьцё рускасьці зьбераглося... і пасьля літоўскае заваёвы Беларусі з Украінай, а потым і ў Рэчы Паспалітай», зразумела, «польска-літоўскай дзяржаве». Далей ідзе традыцыйнае апісаньне ўзьнікненьня русінскай ідэнтычнасьці, якая мацавалася пісьмовай рускай мовай і ўніяцкай царквой. Антырасейскія паўстаньні 1830 ды 1863 гадоў прэзэнтуюцца як польскія, праўда, «з удзелам русінскай шляхты». Пасьля іх задушэньня адна яе частка атаясаміла сябе з пальшчызнай, другая – з расейшчынай, а трэцяя «пад уплывам рамантызму ды зьяўленьня нацыянальных ідэалёгіяў суседніх народаў» сфармулявала «новую беларускую нацыянальную ідэалёгію». Падчас фармаваньня нацыянальных элітаў выявіліся супярэчнасьці паміж каталікамі (якія першымі ўсьвядомілі сваю асаблівую, адрозную ад расейскай, ідэнтычнасьць) ды праваслаўнымі (якім было цяжэй эмансыпавацца ад расейскасьці). У 90-я г. XIX ст. беларуская эліта паўтарыла шлях эліт суседніх нацыяў, зрабіўшы мову галоўным элемэнтам ідэнтычнасьці. Гэтым яны зрабілі памылку, бо «беларуская мова ніколі не ўспрымалася як выразны маркер адрознасьці паміж беларусамі ды суседнімі народамі. Беларусы насялялі абшары, дзе выкарыстоўвалася шмат славянскіх гаворак. На такіх тэрыторыях цяжка правесьці адрозьненьні паміж рознымі мовамі». Сярод прычынаў цяжкога прасоўваньня літаратурнай мовы згадваюцца супярэчнасьці ўнутры элітаў,

падабенства з расейскай ды польскай, жорсткая завязанасьць каталіцтва і праваслаўя на пальшчызну ды расейшчыну, а таксама няўменьне наладзіць простую камунікацыю паміж нацыянальнай элітай і масамі. Схематычна, але дастаткова падрабязна апісваюцца беларусізацыя 1920-х гадоў ды карані сёньняшняе моўнае сытуацыі. Торнквіст-Плева ўважае за памылку пасавецкае вяртаньне да мадэлі нацыяналізму канца XIX ст., бо саветы ўжо пасьпелі прышчапіць беларусам падвойную ідэнтычнасьць – «эмацыйную самаідэнтыфікацыю больш чым з адной культурай». Адпаведна, вынікі рэфэрэндуму 1995 году давялі, што этналінгвістычная канцэпцыя беларускае нацыі «анахранічная і нежыцьцяздольная». (Пытаньне гэтага рэфэрэндуму заслугоўвае асаблівага камэнтару практычна ўва ўсіх замежных аўтараў зборніку, і мы вернемся да яго ніжэй.)
Крытыка нацыянальных элітаў заканчваецца канстатацыяй «неабходнасьці пошуку сымбаляў, здольных выконваць адрозьнівальную ды аб'яднальную функцыю» ў беларускім грамадзтве, зь якімі масы могуць сябе ідэнтыфікаваць – што неабходна для іх палітычнай мабілізацыі. Інакш кажучы, «трэба стварыць такую палітычную праграму, якая пераканае беларусаў, што, зьбярогшы незалежнасьць, яны выйграюць палітычна і эканамічна», нават за кошт білінгвізму і бінацыянальнай ідэнтычнасьці.
У наступным артыкуле імпануе акурат спосаб падачы фактаў: вялікая колькасьць інтэрвіюераў падзяляецца паводле двух базавых крытэраў – мовы і прафэсіі. Фактар мовы, які часта недаацэньваюць замежныя дасьледнікі, у сёньняшняй Беларусі бывае больш характэрным ідэнтыфікатарам палітычных прыхільнасьцяў, чым сацыяльны статус, гадавы даход, пол, сэксуальная арыентацыя. Ганна Бжазоўска вывучала міжнародныя адносіны і літаратуразнаўства, таму яе дасьледаваньне сумяшчае ідэі, узятыя з розных тэарэтычных абсягаў. Яны і ўвасобіліся ў артыкуле, «які спрабуе зразумець міжнародную арыентацыю Беларусі».
Цэнтральным паняткам у вызначэньні дыскурсу «ўлада – апазыцыя» паўстае «здаровы розум», альбо, дакладней, канфлікт вакол яго: «першы праект (Лукашэнкаўскі наратыў) падтрымліваецца народам, бо не закранае істотных пунктаў яго жыцьцёвага досьведу, у той час як другі (апазыцыйны, ці, больш дакладна, наратыў нацыянальна-лібэральнай эліты) не

ўкладаецца ў рамкі здаровага розуму». У 1994 годзе да ўлады прыйшоў «выпадковы чалавек», які, аднак, цешыўся папулярнасьцю ў вялікай часткі выбарцаў. Пасьля Бжазоўска дублюе словы Торнквіст-Плевы: «Рэфэрэндум у траўні 1995 году быў, згодна з назіральнікамі, выйграны Лукашэнкам без усялякіх падтасовак і суправаджаўся вялікай ступеньню грамадзкага энтузіязму».
Гэта вельмі дзіўнае сьцьверджаньне. Адразу пасьля рэфэрэндуму 1995 году міжнародныя назіральнікі выказвалі іншыя погляды. Дэлегацыя Парлямэнцкай Асамблеі АБСЭ заявіла, што ён «не адпавядаў усім міжнародным нормам вольнага й справядлівага галасаваньня». Адмысловую заяву зрабіў і Дзярждэпартамэнт ЗША, выказаўшы шкадаваньне з таго, «якім чынам і ў якой абстаноўцы кіраўніцтва Беларусі правяло выбары і рэфэрэндум».
Пры абмеркаваньні паняцьця «народ» у традыцыйным беларускім разуменьні і яго канфэсійнай прыроды аўтарка цалкам сур'ёзна абапіраецца на разважаньні нейкага «А. Т., паэта, беларускамоўнага, верасень 2001 г., Менск», якія ў адваротным перакладзе гучаць так:
...праваслаўе нашмат лепшае [за каталіцтва й пратэстантызм]. Таму што яно вучыць быць заўсёды задаволеным, але гэта можа здацца ня дужа натуральным, таму што чалавек заўсёды прагне барацьбы... дзеля лепшых умоваў, напрыклад. І ўсё ж праваслаўе абяцае Табе бясьпеку, меней праблемаў у жыцьці.
На думку Бжазоўскай, параза беларускіх інтэлектуалаў у дыялёгу «эліта – народ» тлумачыцца ўласьцівым масавай сьвядомасьці адмоўным стаўленьнем да інтэлігентаў – выхадцаў зь вёскі, што пасьля гарадзкога навучаньня выракаліся роднага на карысьць пальшчызны альбо расейшчыны. Спэцыфіка стаўленьня расчараванай «эліты» да «народу» ў тым; «што нідзе так не адчуваецца адсутнасьць усялякае павагі да вёскі, як у Беларусі. Балтыйскія нацыі, напрыклад, рабілі з фальклёру сьвятыню і, калі надышлі часы пратэсту, вярнуліся да яго як сродку нацыянальнай інтэграцыі. Фольк-фэсты сталіся формаю рэвалюцыі. Падобным жа чынам ува Ўкраіне міт пра казаччыну – так бы мовіць, шляхту сялянскага паходжаньня – заахвочваў прагу волі». На аснове гэтае спэцыфікі акрэсьліваюцца «ўладныя ідэалы» беларусаў:

каб-з-народу-але-не-інтэлігент і да т. п.
У аналізе кампанэнтаў сучаснае беларускае «народнае» ідэнтычнасьці Бжазоўска вылучае «савецкасьць», «спадчыну вайны» (гэты фэномэн тлумачыцца афіцыйна легітымізаваным «ператварэньнем беларуса ўпершыню з суб'екта гісторыі ў героя»), «талерантнасьць». З гэтых кампанэнтаў выводзяцца чыньнікі замежнапалітычнае арыентацыі беларусаў – гіпэртрафаванае ўспрыняцьце пагрозы (поле для маніпуляцыяў шляхам артыкуляцыі траўмаў зь недалёкага мінулага), народны лідэр – моцная рука, антыамэрыканізм, жаданьне «спакою й парадку на зямлі», субстытут клясавай пагрозы (насьцярожанасьць да рынкавых рэформаў у суседзяў). Падрабязна разглядаецца мэханізм прыўлашчваньня ўладамі фактаў, падзеяў і гістарычных асобаў у выгадным для сябе ракурсе (напрыклад, роля К. Каліноўскага ці сакралізацыя гісторыі БССР). Вось жа, маніпулюючы «здаровым розумам масаў, Лукашэнка разгарнуў замежнапалітычную арыентацыю Беларусі ў выключна ўсходнім кірунку». Заканчвае свой артыкул Бжазоўска на аптымістычны лад: за апошнія гады ў Беларусі вырасла новае пакаленьне, якое зусім іншымі вачыма глядзіць на замежную палітыку. Да таго ж, сам «замежнапалітычны дыскурс Лукашэнкі… будзе паступова інкарпараваць новыя элемэнты, зьмяняючыся да непазнавальнасьці ў будучыні».
Нарэшце, аўтар артыкулу «Традыцыя беларускай дзяржаўнасьці: спрэчкі пра мінулае Беларусі» ў асаблівай прэзэнтацыі чытачу ня мае патрэбы. Андрэй Катлярчук пры дапамозе паралельнага аналізу афіцыйных і незалежніцкіх трактовак адных і тых жа гістарычных працэсаў тлумачыць асаблівасьці сёньняшняе ідэалягічнае барацьбы. Варта асабліва адзначыць вялікую колькасьць прыведзеных інтэрнэт-спасылак. Для замежніка, што грунтоўна адкрывае для сябе «краіну Беларусь», гэта, безумоўна, вельмі каштоўная крыніца.
І пра дробязь, якую мы ўважаем істотнай. Ува ўсіх аўтараў (акрамя А. Катлярчука) напісаньне беларускіх уласных імёнаў вельмі непасьлядоўнае: яно скача ад беларускай лацінкі да нейкіх сумнеўных спосабаў трансьлітараваць імёны і прозьвішчы на слых. Разам апынаюцца K. Kalinovski і F. Bahusevic, Lukashenka і Masherov, Paznyak і Suskevic, etc. У той жа час назва Беларусі і яе тытульнай нацыі прэзэнтуюцца

вельмі пасьлядоўна: Belarus, Belarusian. Годзе пашыраць неразьбярыху!
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/1/17
[image]